ARCHE Зьмест № 3’02 АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

1. Зьмест / Уводзіны
2. Прадмова. Андрэй Скурко ў ARCHE 3(23)-2002. "…"
3. Беларусь сёньня. Валер Булгакаў у ARCHE 3(23)-2002. "…"
4. Палеміка Ўладзімера Арлова, Сяргея Дубаўца і Сяргея Ярша з Валерам Булгакавым у ARCHE 3(23)-2002. "…"
5. “Пішу для адукаваных вар’ятаў”. Гутарка Сьвятланы Курс з Андрэем Хадановічам у ARCHE 3(23)-2002. "…"
6. Альбы і сырвэнты. Андрэй Хадановіч у ARCHE 3(23)-2002. "…"
7. “Эўропа, разумееш?..”. Канстанцін Міхееў у ARCHE 3(23)-2002. "…"
8. Сэнс беларускага нонсэнсу. Марыя Мартысевіч у ARCHE 3(23)-2002. "…"
9. Мне прысьніўся Хадановіч. Уладзімер Арлоў у ARCHE 3(23)-2002. "…"
10. Мэтапаэзія і какетлівы дзявочы суіцыд. Андрэй Хадановіч у ARCHE 3(23)-2002. "…"
11. Андрэй Хадановіч і перавагі акупацыйнага рэжыму. Юры Андруховіч у ARCHE 3(23)-2002. "…"
12. Ліставаньне з клясыкамі. Віталь Панамароў у ARCHE 3(23)-2002. "…"
13. У Бадлеравым абліччы. Лявон Баршчэўскі ў ARCHE 3(23)-2002. "…"
14. Эпітафія Віёна. Франсуа Віён у ARCHE 3(23)-2002. "…"
15. Танец сьмерці. Шарль Бадлер у ARCHE 3(23)-2002. "…"
16. Баль шыбенікаў. Арцюр Рэмбо ў ARCHE 3(23)-2002. "…"
17. Пабудова дэмакратыі ў Беларусі. Ганс-Георг Вік у ARCHE 3(23)-2002. "…"
18. Беларуская палітыка Польшчы. Павал Казанэцкі ў ARCHE 3(23)-2002. "…"
19. Развагі аб гейскім пытаньні. Уладзь Гарбацкі ў ARCHE 3(23)-2002. "…"
20. Малы Апакаліпсыс. Тадэвуш Канвіцкі ў ARCHE 3(23)-2002.

"…"
21. Лісты Яна Станкевіча да Антона Адамовіча ў ARCHE 3(23)-2002. "…"
22. Вечна жывы Купала. Анатоль Сідарэвіч у ARCHE 3(23)-2002. "…"
23. Погляд сьпераду і погляд ззаду. Даніла Жукоўскі ў ARCHE 3(23)-2002. "Адціснутая біялогіяй з пазіцыі навукі нумар адзін, фізіка апошнім часам збліжаецца з філасофіяй. Адклаўшы ўбок інтэгральныя раўнанні, “яйкагаловыя” заняліся агульнымі пытаннямі развіцця і эвалюцыі, вылучыўшы, між іншым, азначэнне панятку ПАДЗЕІ, аднолькава прыдатнае да выкарыстання што ў дакладных навуках, што ў гуманістыцы…"
24. Выканаўца жаданьняў. Андрэй Курэйчык у ARCHE 3(23)-2002. "…"

З ь м е с т

Андрэй Скурко. **Прадмова**
Беларусь сёньня
Валер Булгакаў. **Пра клясычныя і неклясычныя нацыяналізмы**
Палеміка
Андрэй Хадановіч
“Пішу для адукаваных вар’ятаў”. Гутарка Сьвятланы Курс з Андрэем Хадановічам
Андрэй Хадановіч. **Альбы і сырвэнты**
Канстанцін Міхееў. **“Эўропа, разумееш?..”**
Марыя Мартысевіч. **Сэнс беларускага нонсэнсу**
Уладзімер Арлоў. **Мне прысьніўся Хадановіч**
Андрэй Хадановіч. **Мэтапаэзія і какетлівы дзявочы суіцыд**
Юры Андруховіч. **Андрэй Хадановіч і перавагі акупацыйнага рэжыму**
Віталь Панамароў. **Ліставаньне з клясыкамі**
Лявон Баршчэўскі. **У Бадлеравым абліччы**
пераклады
Франсуа Віён. **Эпітафія Віёна**
Шарль Бадлер. **Танец сьмерці**
Арцюр Рэмбо. **Баль шыбенікаў**
палітыка
Ганс-Георг Вік. **Пабудова дэмакратыі ў Беларусі**
Павал Казанэцкі. **Беларуская палітыка Польшчы**
рэцэнзія

Уладзь Гарбацкі. **Развагі аб гейскім пытаньні**
кніга
Тадэвуш Канвіцкі. **Малы Апакаліпсыс**
ліставаньне
Лісты Яна Станкевіча да Антона Адамовіча
крытыка
Анатоль Сідарэвіч. **Вечна жывы Купала**
Даніла Жукоўскі. **Погляд сьпераду і погляд ззаду**
п’еса
Андрэй Курэйчык. **Выканаўца жаданьняў**

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн і майстраваньне: **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/03
[image]

Андрэй Скурко

Прадмова

Пазваніўшы ў дзьверы, Хадановіч заўжды крыху адступаецца назад, каб той, хто адмыкае, мог праз вочка ацаніць ягоную манумэнтальнасьць.
Хадановіч любіць кагор і слоўнае штукарства. Два гэтыя паняткі непадзельныя: ягоныя санэты й актавы нашмат лепш успрымаюцца пасьля шклянкі-другой цёмнага напою з купаламі-цыбулінамі на цэтліку. Яшчэ Хадановіч любіць вандраваць. За мяжой яго ўжо ведаюць лепей, чым у нас, — у Кіеве, прынамсі, пазнаюць на вуліцы. Грошай пакуль ня просяць. Сэмінары, імпрэзы, паэтычныя чытаньні — родная стыхія Хадановіча. Ён умее прысутнічаць адначасова на дзьвюх-трох канфэрэнцыях у розных месцах, досыць аддаленых адно ад аднаго. Кажуць нават, быццам Хадановічаў некалькі. Заваяваны ім (імі?) абшар супадае пакуль зь межамі Сярэдняй Эўропы (да якой, як вядома, належаць усе краіны, якія лічаць, што цэнтар Эўропы — на іхнай тэрыторыі). Зрэшты, ня думаю, каб Хадановіч адмовіўся ад запрашэньня нават у Антарктыду. Потым удзячныя пінгвіны плылі б за ім аж да выспы Вялікадня. Прынамсі, ён сам бы так распавядаў.

Хадановіч умее нармальна сьмяяцца. Мала каму зь літаратараў гэта ўдаецца — збольшага даводзіцца чуць здушанае пахехекваньне. А Хадановіч аглушае цябе рогатам, ад якога ледзьве не развальваецца тэлефонная слухаўка.
З прычыны пастаянных Хадановічавых бадзяньняў немаведама дзе кантактаваць зь ім ды атрымліваць новыя вершы можна хіба праз электронную пошту. Калі асьцярожна. Бо мэйл ад Хадановіча — сапраўднае выпрабаваньне на сталасьць для антывіруснае праграмы кампутара.
А яшчэ кажуць, што ніякі ён не Хадановіч. Ён Іва Хада́навіч з Прышціны, жаўнер Іншаземнага легіёну, якога пасьля канфліктаў у Малі і на Мадагаскары ўзнагародзілі за асабістае зьверства спакойнай працай — выправілі ахоўваць бібліятэку французскай Акадэміі. Там ён і пазнаёміўся зь вялікай беларускай літаратурай. Колас з Купалам так запалі хлопцу ў душу, што пасьля заканчэньня тэрміну службы ён назваўся Андрэем Хадано́вічам, атрымаў адпаведныя дакумэнты і паехаў у Менск, дзе адразу ж здаў экстэрнам дзяржаўныя іспыты і атрымаў дыплём на філфаку БДУ. Толькі вэтэранскае пасьведчаньне выратавала яго ад разьмеркаваньня ў Жабінкаўскі раён.
З тае пары ён выкладае ва ўнівэрсытэце замежную літаратуру і вайсковую падрыхтоўку, перапісваецца з паэткай-наркаманкай Далілай Самасыс, вучыць дзяцей (пакуль што чужых) складаць вершы ды час ад часу робіць набегі (нашы продкі казалі — наезды) на рэдакцыі газэтаў і часопісаў. Пазваніўшы ў дзьверы, ён заўжды крыху адступаецца назад, каб праз вочка можна было ацаніць ягоную манумэнтальную постаць, якая ўсім сваім выглядам нібыта кажа: адмыкайце — прыйшоў Хадановіч.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2003/01/03
[image]

Валер Булгакаў

Пра клясычныя і неклясычныя нацыяналізмы

Публікацыі, якія абгаворваюцца ў гэтым артыкуле:
Уладзімер Арлоў. *Незалежнасьць — гэта...* // Уладзімер Арлоў. *Мой радавод да пятага калена.* Менск: ВЦ Бацькаўшчына, 1993.
Сяргей Дубавец. *Практыкаваньні.* Менск: Мастацкая літаратура, 1992.
Аляксандар Лукашук. *Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста.* Менск: Наша Ніва, 1997.
Сяргей Дубавец. *Дзёньнік прыватнага чалавека.* Менск: БГАКЦ, 1998.
Сергей Дубавец. *Русская книга.* Менск: БГАКЦ, 1998.
Сяргей Ёрш. *Усевалад Родзька. Правадыр беларускіх нацыяналістаў.* Менск: Голас Краю, 2001.
Беларускі нацыяналізм. Даведнік. Менск: Голас Краю, 2001.
Леанід Лыч. *Міжнацыянальныя дачыненні ва ўмовах нацысцкай акупацыі* // Спадчына. 2002. № 1.
Ryszard Radzik. *Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową. Biał·orusini na tle przemian narodowych w Europie Środkowo-*

Wschodniej XIX stulecia. Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skl·odowskiej, 2000.

Словы “нацыя”, “нацыянальны”, “нацыяналізм” — сёньня частыя госьці на старонках айчыннага друку. Аднак яшчэ за часоў савецкай Беларусі імі стараліся не злоўжываць і пагатоў не арыгінальнічаць зь імі, — каб не наклікаць на сябе нездаровую цікавасьць кантрольных органаў і ідэалягічных службаў у краіне, дзе “нацыянальнае пытаньне” афіцыйна лічылася вырашаным. Крызыс камуністычнай ідэалёгіі і здабыцьцё Беларусяй незалежнасьці стварылі якасна новую сытуацыю. Тэма нацыяналізму, ці то ў ягонай “паліткарэктнай” іпастасі — “нацыянальнай самасьвядомасьці”, “нацыянальнай ідэі”, “нацыянальнага сьветапогляду”, ці то ў навукападобнай трактоўцы як “пошуку нацыянальнай ідэнтычнасьці”, пачынае дамінаваць у мысьленьні ня толькі нацыяналістычна настроеных беларускіх элітаў, г.зн. пераважна пісьменьнікаў і навукоўцаў-гуманітарнікаў малодшага і сярэдняга пакаленьняў, але і найвышэйшых дзяржаўных урадоўцаў. У нейкі момант нават пачынае здавацца, што, на якую б тэму ні пісалі беларускія аўтары, іх насамрэч галоўны клопат — гэта быцьцё нацыі. “Нацыянальная тэма” стаецца абавязковай удзельніцай шматлікіх дыскусій і канфэрэнцый, ёй прысьвячаюць артыкулы і манаграфіі, яе выносяць у назвы кніг.

1

Адным з найбольш папулярных твораў перабудовачнае пары на тэму нацыянальнага стала эсэ Ўладзімера Арлова “Незалежнасьць — гэта...”. Яно было напісанае ў лютым 1990 году і прыпала на час актыўнага пошуку самабытнага “нацыянальнага шляху” ня толькі ў нас, але і ў суседніх зь Беларусяй рэспубліках па гэты і той бок мяжы СССР. Невыпадкова, што тэкст быў цёпла сустрэты грамадзкасьцю сумежных краін і вокамгненна перакладзены на прыбалтыйскія мовы, на расійскую, а таксама прынамсі двойчы апублікаваны на польскай.

Аўтар публікацыі выступае за незалежнасьць сваёй Бацькаўшчыны. Для яго, тагачаснага грамадзяніна змрочнай таталітарнай імпэрыі, гэтая незалежнасьць асацыюецца нават ня столькі з “нацыянальным выбарам” краіны, колькі зь яе эўрапеізацыяй і дэмакратызацыяй. Арлоў ня бачыць Беларусі ў

найбліжэйшай будучыні дзяржавай, у якой будзе агрэсіўна дамінаваць культура тытульнай нацыі, і таму сур'ёзна гаворыць, што пры незалежнасьці беларускіх дзетак у Беларусі будуць вучыць па-беларуску, польскіх — па-польску, жыдоўскіх — па-жыдоўску, *"і дзеля гэтага тваім тату й маме ня трэба будзе ўсё лета зьбіраць па кватэрах заявы бацькоў"*.
У палітычным вымеры незалежнасьць надыходзіць тады, *"калі з тэлеперадач і газэт раптам зьнікаюць лісты нястомна-таямнічых вэтэранаў і вусьцішныя паведамленьні пра нацыяналістаў і экстрэмістаў", "калі ты пазбаўлены магчымасьці пачуць, як твой прэзыдэнт вучыць з экрану суайчыньнікаў: "Хто как хаціт, той так і гаварыт"*, бо твой прэзыдэнт — чалавек пісьменны і хоць адну мову ўсё ж ведае" (няма сумневу, беларускую — **Аўт.**). І, натуральна, незалежнасьць гэтая ёсьць перадусім незалежнасьцю ад Расіі зь яе побытавай неўладкаванасьцю (*"каб купіць малому малака, трэба займаць чаргу а пятай гадзіне раніцы"*) і нязьмернымі імпэрскімі амбіцыямі (*"калі ніхто ня страшыць цябе, што твой народ ня зможа выжыць безь вялікага старэйшага брата"*).
Карацей, "незалежнасьць" паводле Арлова — гэта камуністычнае "сьветлае заўтра" наадварот, час, калі цудоўным, але нікому пакуль невядомым чынам будуць выпраўленыя асноўныя заганы масавага савецка-беларускага грамадзтва і Беларусь з паўночна-заходняй ускраіны імпэрыі ператворыцца ў арганічную частку Эўропы.
Арлоў выбудоўвае сваю нацыяналістычную ўтопію, не ўсьведамляючы, што яе правобразам выступае сучасная яму марксісцка-ленінская камуністычная тэлеалёгія зь яе аднесеным у неакрэсьленую будучыню грамадзтвам усеагульнага дабрабыту, у якім будуць вырашаныя асноўныя палітычныя, сацыяльныя, нацыянальныя і іншыя супярэчнасьці і ў гістарычна абумоўлены надыход якога трэба беззасьцярожна **верыць**. У сваю ўтопію верыць і сам аўтар, пра што ён сакрамэнтальна заяўляе пры канцы свайго эсэ, пабудаванага ў форме пэдагагічнай гутаркі з падрастаючым пакаленьнем: *"Я веру, што калі-небудзь так будзе. Бо йначай проста ня варта жыць"*.
Бальшыня "замалёвак з будучыні" Арлова, дзеля сваёй утапічнасьці, ужо сёньня ўспрымаецца зь вялікай доляй іроніі. Здабыцьцё незалежнасьці не дало Беларусі прапусткі ў сям'ю

эўрапейскіх нацый, дый сама гэтая незалежнасьць выйшла нейкая малакроўная, неэўрапейская, хутчэй мо афрыканская (менавіта ў Афрыцы здабыцьцё незалежнасьці ад мэтраполіі за рэдкім выняткам адзначалася рэзкім пагаршэньнем узроўню жыцьця). Шараговы беларус па-ранейшаму ня мае шанцаў выехаць на выхадныя ў Вену, каб выпіць кавы *“насупраць палацу Шонбрун”*, спэцслужбы як раней усюдыісныя і падкантрольныя толькі кіраўнічай кліцы, а таму ў любы момант могуць выклікаць цябе для прафіляктычнай гутаркі, у школе на ўроках гісторыі гавораць і пра Лядовае пабоішча, а ня толькі Грунвальдзкую бітву, а на Дзяды ніхто не гарантуе, што ты не атрымаеш сваёй порцыі сьлезацечнага газу і што “новая мадэль гумовага дручка” ня будзе апрабаваная на тваёй галаве. Нарэшце, у радзільні, у якой зьяўляюцца на сьвет нашы дзеткі, як і ўперад, у вялікай колькасьці вядуцца прусакі, а радыё і тэлебачаньне запаланілі адыёзныя прапагандысцкія перадачкі, проці якіх свавольныя штукарствы савецкіх вэтэранаў выглядаюць няйначай як дзіцячае лепятаньне. І што самае фатальнае, ладная частка беларусаў успрымае пару, якая папярэднічала здабыцьцю незалежнасьці, як своеасаблівы “залаты век”, калі іх матэрыяльныя і духоўныя запыты задавальняліся куды больш гарманічна.

Гады незалежнасьці азначыліся таксама відавочным зьдзічэньнем палітычных элітаў, якіх грамадзтва надзяліла абавязкам ажыцьцяўленьня палітычнай улады ў краіне. Пазбаўленыя ранейшых, хай сабе эфэмэрных маральна-этычных стрымак, яны ня гідзяцца самых брудных сродкаў пры дасягненьні сваіх палітычных мэтаў. Для беларускай палітыкі ўжо каторы год звыклымі рэчамі зьяўляецца публічнае хамства і нецярпімасьць да іншадумства, закулісныя інтрыгі і ўстараненьне палітычных праціўнікаў незаконнымі мэтадамі. Можна падумаць, што адзіны недагляд пісьменьніка Арлова — гэта недагляд, так бы мовіць, з **краінай прызначэньня незалежнасьці** — маўляў, падставіць бы на месца Беларусі Польшчу або Эстонію, і ўсё адразу стане на свае месцы. Але за гэтым недаглядам стаіць нешта большае: ён сьведчыць пра неразуменьне бягучых сацыяльна-палітычных працэсаў беларускай інтэлігенцыяй канца 80-х — пачатку 90-х гадоў XX стагодзьдзя, яе хваравітую цягу да абсалютызацыі адных зь іх і ігнараваньня другіх. Беларускія інтэлігенты верылі, што

крызыс камуністычнай ідэалёгіі ў краіне, у якой адсутнічаюць традыцыі палітычнай культуры, мэханічна прывядзе ня толькі да дэцэнтралізацыі і развалу Савецкага Саюзу, але і да эўрапеізацыі нашай Бацькаўшчыны.
Першыя гады незалежнасьці паставілі беларускую інтэлігенцыю на мяжу фізычнага выжываньня. Рэзкае зьніжэньне даходаў беларускага інтэлігента суправаджалася непрадказальнымі зыгзагамі культурнай палітыкі дзяржавы, якая ахвотна фінансавала адно тыя культурныя ініцыятывы, якія давалі імгненны прапагандысцкі эфэкт. Адчуўшы пэрманэнтныя матэрыяльныя цяжкасьці, былыя трыбуны БНФ і аракулы ТБМ масава адышлі на пэнсію або выехалі ў эміграцыю, пераквалiфікаваліся ў работнікаў трэцяга сэктару ці нават звычайных школьных настаўнікаў.
Чаму? Мо таму, што ўсе яны марылі пра ідэальную незалежнасьць з гіпэртрафавана беларускай дзяржавай, якая ў адпаведнасьці з прынятым “Законам аб адукацыі” перавядзе навучаньне ў школах і ўнівэрсытэтах на беларускую мову, стварыўшы тым самым новыя працоўныя вакансіі для носьбітаў матчынай мовы, павялічыць выданьне беларускамоўных кніг, выплачваючы завоблачныя ганарары беларускім пісьменьнікам і іншым работнікам беларускага слова, адным махам забясьпечыць інфармацыйны сувэрэнітэт краіны і г.д., — адным словам, пра гэткую сабе незалежнасьць з рэзкім павелічэньнем магчымасьцяў кар’ернага росту. Рэальная ж незалежнасьць і насталая пры ёй капіталізацыя беларускай эканомікі прынесла і ў культурнае жыцьцё краіны дух канкурэнцыі, запатрабавала новай этыкі працы і жыцьця. Для дасягненьня посьпеху раптам стала замала быць шчырым беларускім патрыётам або незаплямленым дэмакратычным апазыцыянэрам.

2

Сяргей Дубавец, шматгадовы рэдактар газэты “Наша Ніва”, у канцы 80-х —90-х гадох XX стагодзьдзя атрымаў прызнаньне як ідэоляг беларускага нацыяналізму, ці — гэты выраз часта страчаецца ў яго публікацыях — беларускага шляху*. Дубаўцоў зборнік “Практыкаванні”, выдадзены ў 1992-м, уяўляе сабой важны і павучальны зрэз яго рэфлексіяў на тэмы нацыі і нацыяналізму на самым пярэдадні і падчас здабыцьця незалежнасьці.

Уласна “рэфлексійны” блёк “Практыкаваньняў”, разьдзел “Эсэ” (агулам кніга мае тры разьдзелы — “Проза”, “Эсэ”, “Крытыка”), пачынаецца з артыкулу пад назовам “Мова”, у якім аж роіцца ад стандартных, “тэбээмаўскіх” фармулёвак накшталт *“Свая мова — гэта інтымная рэч нацыі, дарагая і неабходная толькі ёй. Без інтымнага (патаемнага) і чалавек, і нацыя — назвы, абалонкі, напхатыя немаведама чым, толькі не сабою”*. Або: *“Стагоддзямі адбіралі ў нас мову. То цалкам, то па сказе, па слове, па гуку”*. На гэтую тэму аўтар разважае доўга і ахвотна. Будучы прапагандыстам моўнага нацыяналізму, С. Дубавец азартна крытыкуе культурную палітыку БССР. Прадметам крытыкі стаецца, у прыватнасьці, Саюз пісьменьнікаў Беларусі (*“сталінскае дзецішча сталінскага гарту”*), а таксама заселыя ў ім *“літаратурныя адміралы”* накшталт Івана Навуменкі, якія ўсяляк душаць сваіх маладзейшых калегаў “па пяру”. 80-я гады ХХ стагодзьдзя — гэта час, калі беларускія нацыяналісты мабілізаваліся пераважна зь літаратурнага асяродзьдзя, таму ў нататках Дубаўца часам не адчуваецца дыстанцыі паміж тагачасным нацыянальным і літаратурным рухам. Дарэчы, акурат розныя драбніцы зь літаратурнага жыцьця робяць Дубаўцовы “Практыкаванні” кнігай, якую зь неабходнасьцю давядзецца прачытаць будучым гісторыкам беларускае літаратуры: напрыклад, што работнікі выдавецтва “Мастацкая літаратура” не хацелі прапускаць аўтарскай назвы першай паэтычнай кнігі Адама Глёбуса “Парк” і намаўлялі перайменаваць яе ў якія-небудзь “Гронкі радасьці”, або як пры канцы 70-х аднаго маладога беларускамоўнага паэта моцна хвалілі ў друку за тое, што ён валодае беларускай мовай, або як цкавалі паэтычны геній Алеся Разанава...

Канчаюцца “Практыкаванні” тэкстам-маніфэстам *“Новая культурная сітуацыя. Тэзісы новых кніг”*, навеяным абвяшчэньнем незалежнасьці. У гэтым артыкуле многа гаворыцца пра патрэбу выбудовы беларускае Беларусі на прагматычнай аснове. Разам з гэтым С. Дубавец публічна адмаўляецца верыць, што беларуская дзяржава можа стаць маторам беларусізацыі грамадзтва: *“Беларуская культура не стане грамадскай з’явай ад таго толькі, што ўсе школы і дзяржаўныя інстытуты будуць пераведзеныя на беларускую мову*”. Ад чаго ж тады стане беларускай Беларусь? Ад пісаньняў тутэйшых культуролягаў і ад маніфэстацыяў

палітычна актыўнай часткі грамадзтва? Што гэта — адгалосак спэцыфічна расійскага разнавіду нігілізму або своеасаблівая інтэлектуальная поза, — мабыць, мы так ніколі і не даведаемся. Магчыма, тады, у 1992 годзе, гэткае выказваньне ўспрымалася іначай.

Далей С. Дубавец з халоднай безуважнасьцю выстаўляе трывожны дыягназ бягучай культурнай сытуацыі. Ён гаворыць пра хранічную культурную анэмію беларусаў: *“Беларуская культура не распрацоўвае жыццёвыя праекты і сітуацыі, яна ўжо не стварае самабытныя беларускія краявіды. Тое, чаго не робіць беларуская культура, ёсць нормай культуры, праз якую самасцвярджаюцца нацыянальны светапогляд і мова”*. Палітычныя падзеі сярэдзіны 90-х з усёй відавочнасьцю пацьвердзяць яго абгрунтаванасьць.

Па азнаямленьні з Дубаўцовымі рэфлексіямі ў чытача ўзьнікае дваістае ўражаньне. Так, яны напоўненыя геніяльнымі здагадкамі і інтрыгоўнымі хадамі, адзначаюцца вышуканай мовай і філігранным стылем. Але ўсё гэта датычыць Дубаўца-пісьменьніка. Як ідэоляг ён часта аказваецца бездапаможны. Ён няздольны на падагульненьні і ўнівэрсальныя высновы, бо ўсе яго развагі на тэмы нацыі грунтуюцца выключна на яго асабістым досьведзе. Больш за тое, у распрацоўцы інтэлектуальнага апарату беларускай нацыянальнай ідэалёгіі, наагул у разуменьні нацыянальнага праекту Дубавец сваім бескампрамісным сьцьверджаньнем багацьця беларускай мовы не пайшоў далей за Францішка Багушэвіча. Прычыны гэтага ляжаць у гуманітарнай сфэры. Напярэдадні распаду СССР у краіне толькі-толькі пачалі зьяўляцца пераклады сучаснага заходняга мысьленьня, а таксама фармавацца мода — сьпярша вельмі плыткая і несур’ёзная — на заходніх інтэлектуалаў.

У якасьці сваіх духоўных настаўнікаў Дубавец — ідэоляг беларускага нацыяналізму бярэ першае-лепшае, разрэклямаванае менска-маскоўскімі выдаўцамі і акадэмічнымі інтэрпрэтатарамі, — французскі экзыстэнцыялізм сярэдзіны XX стагодзьдзя (Жан-Поль Сартр, Альбэр Камю) і нямецкую філязофію жыцьця канца XIX стагодзьдзя (Фрыдрых Ніцшэ). Самыя схематычныя тэксты “Практыкаванняў” акурат і прысьвечаныя гэтым постацям (эсэ “Фрыдрых Ніцшэ — гіпсавы мысляр” і “Тлумачэнне Сартра”, якое грашыць хадульнымі высновамі ў духу *“Пра Сартра кажуць, што ён адвучвае верыць*

у Бога і прывучвае верыць у чалавека. Гэта праўда.”).
У канцавым рахунку інтэлектуальная неперабарлівасьць Дубаўца (пра сьвядомую спробу злучыць французскі экзыстэнцыялізм зь беларускім нацыяналізмам гаварыць не выпадае) і абумовіла яго слабасьць як нацыянальнага ідэоляга. Застаецца спадзявацца, што аўтаравы наступнікі і сам аўтар улічаць гэты досьвед і зьвернуць нарэшце ўвагу на творы Бэнэдыкта Андэрсана, Міраслава Гроха, Эрнэста Гельнэра, Энтані Д. Сміта, Эрыка Дж. Гобсбаўма.

3

У адрозьненьне ад Уладзімера Арлова або Сяргея Дубаўца, Аляксандар Лукашук ня робіць стаўкі на “нацыяналістычны ўтапізм” або “моўны нацыяналізм”. Ён хоча даць нацыі сваіх герояў. Таму інтэлектуальную стратэгію, якую ён адстойвае ў сваёй кнізе, можна акрэсьліць як “распрацоўку і стварэньне нацыянальнага героя”.
Кожны нацыяналізм стварае пантэон сваіх герояў. Ладная іх частка — гэта “вечна жывыя” гістарычныя пэрсанажы, якія ў нацыянальнай гістарыяграфіі асэнсоўваюцца як вестуны нацыянальнай дзяржаўнасьці або абароньнікі нацыянальных інтарэсаў — нягледзячы на свой экстэрытарыяльны і наднацыянальны статус, як, напрыклад, у выпадку Сьцяпана Батуры, Ягайлы або нават Тадэвуша Касьцюшкі, які дагэтуль свой прынамсі для беларусаў, украінцаў, палякаў і літоўцаў. Праблема, аднак, палягае ў тым, што ўсе гэтыя гістарычныя дзеячы ніколі не валодалі канкрэтна беларускай, польскай або літоўскай нацыянальнай сьвядомасьцяй (якая ёсьць зьявай мадэрных часоў, то бок у строгім сэнсе пра яе можна гаварыць толькі пачынаючы з XIX стагодзьдзя), і таму нацыянальны ідэоляг патрабуе ўключэньня ў нацыянальны пантэон таксама і сучасных нацыяналістаў, г.зн. такіх, якія і важнае значэньне нацыянальнае мовы разумелі, і сапраўдныя межы сваёй краіны правільна ўяўлялі, і чужынцам супраціў чынілі.
Пантэон беларускіх нацыянальных герояў родам з XIX—XX стагодзьдзяў складаецца амаль з адных пісьменьнікаў і выдаўцоў, якія часта паміралі ў росквіце сілаў ад невылечных хваробаў і цяжкіх варункаў працы. Гартаеш старонкі паваенных эміграцыйных часопісаў (у тым ліку і “Моладзі”, якую выдаваў Янка Філістовіч) і дзівішся, які малы культурны капітал

назапасіла нацыя: усе яны поўняцца просталінейным узьвелічэньнем Мацея Бурачка, Максіма Багдановіча, Івана Луцкевіча або Янкі Купалы. Культ вайсковых герояў, як, напрыклад, у палякаў зь іх Юзафам Пілсудзкім або Эдвардам Рыдз-Сьміглым, не разьвіўся ў нас зусім (Кастусь Каліноўскі не ўваходзіць у рахубу, бо яго нацыянальная сьвядомасьць не была “беларускай” — гэта пазьнейшая мадэрнізацыя). Дый скуль яму ўзяцца, калі ўласна беларускія нацыянальныя дзеячы зьяўляюцца параўнальна позна, толькі на зломе XIX і XX стагодзьдзяў, і рэкрутуюцца пераважна зь літаратурна-выдавецкага асяродзьдзя.

Аляксандар Лукашук у сваім творы (аўтарскае жанравае азначэньне — радыёп’еса) робіць спробу запоўніць гэтую галу ў нацыянальным пантэоне герояў вяртаньнем зь нябыту постаці беларускага ваякі Янкі Філістовіча.

Янка Філістовіч нарадзіўся 14 студзеня 1926 году ў сяле Паняцічы, што на Вялейшчыне. Увосень 1943 году быў мабілізаваны ў 13-ы батальён войскаў СД, які быў сьпярша разьмешчаны ў Вялейцы, пасьля — у Менску (дзе, паводле прыведзенага ў п’есе сьведчаньня, *“батальён выконваў розныя заданьні, у іх ліку і па канвоі габрэяў з гета ў шталяг 32, вядомы лягер сьмерці ў ваколіцах Менску”*). Служыў у ім да заняцьця тэрыторыі Беларусі Чырвонай арміяй, пасьля быў прыкамандзіраваны да 30-й дывізіі СС і ў складзе гэтай вайсковай адзінкі быў перакінуты праз Польшчу ў Італію, адкуль быў пераведзены ў Чэхію, дзе засьпеў канец вайны. Пасьля вайны без асаблівага посьпеху вучыўся ў парыскай Сарбоне і Лювэнскім каталіцкім універсытэце (Бэльгія). Супрацоўнічаў з амэрыканскай выведкай, пры дапамозе якой быў дэсантаваны на тэрыторыю Беларусі 9 верасьня 1951 году. За год свайго пабыту ў краіне з групай аднадумцаў выдаў адозву “Жыве Беларусь”. Быў бяз бою арыштаваны і пасьля паўгадавога сьледзтва расстраляны. Ось і ўся гераічная гісторыя.

Трэба прызнаць, што Лукашукова спроба ўдалася толькі часткова. З аднаго боку, аўтар, як ён сам прызнаецца, з падачы Вінцука Вячоркі і Сяргея Навумчыка стварыў па-свойму незабыўны вобраз беларускага паўстанца-нацыяналіста, які цалкам сьвядома паклаў сваё жыцьцё на алтар Бацькаўшчыны. Гэты амаль хрысьціянскі матыў самаахвярнасьці, хай сабе ў імя

Бацькаўшчыны, а не нябеснага Валадарства, праходзіць скрозь усю кнігу і няяўна выступае галоўнай падставай для залічэньня Філістовіча ў корпус нацыянальных герояў. Пры вострым дэфіцыце апошніх можна заплюшчыць вочы на тое, што гэты ваяка пасьля дэсантаваньня ня вёў ніякіх вайсковых дзеяньняў, а таму гераізм яго быў выключна духоўнай прыроды і апісваецца ў мэтафарычных тэрмінах *“не скарыўся”, “ня паў духам”, “высока трымаў сьцяг беларушчыны”*. З другога боку, нельга заплюшчваць вочы на тое, што ў якасьці нацыянальнага героя выбраны калябарант, заплямлены самім фактам удзелу ў фашыстоўскіх парамілітарных фармаваньнях і які, да ўсяго ж, мог мець дачыненьне да вынішчэньня жыдоў (у п’есе Філістовіч адкідае абвінавачаньне ў ваенных злачынствах, сьцьвярджаючы, што ў ягоным батальёне служыў іншы Іван Філістовіч, старэйшы). Як мы неўзабаве пабачым, акурат гэтая лінія гераізацыі калябаранта-вайскоўца беларускіх паравайсковых фармаваньняў часоў другой сусьветнай вайны атрымае ў дамаслых тэарэтыкаў нацыяналізму энэргічны працяг.

Аляксандар Лукашук, пішучы сваю кнігу, выкарыстоўваў зьвесткі з розных крыніц (лісты, публікацыі ў часопісе “Моладзь”, успаміны, пратаколы допытаў). Відаць, гэтай неабсяжнай шматстайнасьцю фактаў і зьвестак, якія давялося апрацаваць падчас працы над п’есай, тлумачыцца прыкры недагляд, які лучыў у яе: на пачатку кнігі гаворыцца, што Філістовіча *“затрымалі недалёка ад Горадні”*, але пасьля аказваецца, што арышт праводзіла Маладэчанская ўправа МГБ у суседняй зь вёскай Вязынь вёсцы Ярмолічы (і першая, і другая знаходзяцца ў Маладэчанска-Вялейскім рэгіёне) і што арыштаваны Філістовіч быў у хаце свайго былога аднаклясьніка Пятра Соніча...

4

“Русская книга” Сяргея Дубаўца пабачыла сьвет неўзабаве пасьля шырака- і сумнавядомых падзеяў у грамадзка-палітычным жыцьці краіны: абраньня прэзыдэнтам савецкага папуліста Аляксандра Лукашэнкі і рэзкага зьмяненьня палітычнага курсу краіны. На чацьверты год лукашэнкаўшчыны нацыянальна-дэмакратычныя сілы краіны ўяўляюць сабой сумнае відовішча: яны разгромленыя і выціснутыя за борт

палітычнага жыцьця. Горыч паразы ўзмацняецца ад барбарскай замены нацыянальнай сымболікі і імклівай дэбеларусізацыі сыстэмы асьветы і інфармацыйнага рынку краіны. Гэтая горыч няўзнак перарасьце ў дэмаралізаванасьць зь яе навязьлівай думкай, што кожная акцыя нацыянальна-дэмакратычных сілаў загадзя вырачаная на няўдачу.

Храналягічна “Русской книге” (зьбертыя ў ёй тэксты пабачылі сьвет у расійскамоўных выданьнях Беларусі і Расіі ў сярэдзіне 90-х) папярэднічаў зборнік апавяданьняў, імпрэсіяў і эсэ “Дзёньнік прыватнага чалавека”, які ствараўся паміж 1989 і 1998 гадамі, а значыць, быў беспасярэднім працягам вышэйпамянёных “Практыкаванняў”. З “Практыкаваннямі” “Дзёньнік...” лучаць тэмы, стыль, характар мысьленьня. Нязьменна прысутнічаюць французскія экзыстэнцыялісты і раманісты пяцідзесяцігадовай і большай даўніны (*“праціўнік сьмяротнае кары Альбэр Камю”, “Я падобны да Марсэля Пруста, які па дарозе да Свана шукае страчаны час”*), тэма мовы (*“мова, якой няма, але...”*), беларускага шляху (*“парадокс, уласьцівы й сучаснаму пашпартнаму беларусу, — дзьве крайнасьці сыходзяцца ў ім: нацыянальная індыфэрэнцыя й патрэба нацыянальнае ідэнтыфікацыі”* [толькі хіба *“патрэба нацыянальнае ідэнтыфікацыі”* — гэта крайнасьць? — **Аўт**.] і г.д. Адным словам, як у выпадку “Практыкаванняў”, сэнсавая нэрва “Дзёньніка...” — гэта нацыянальнае пытаньне. Пры яго асэнсаваньні Дубавец выкарыстоўвае якасна іншы досьвед: калі да 1991-га разважаць пра незалежнасьць можна было толькі ўва ўмоўным ладзе, абапіраючыся на ўласныя інтуіцыі, асабістыя ідэалы і абстрактныя сусьветныя заканамернасьці, то пасьля 1991-га гэтая незалежнасьць абрасла рэальнымі фактамі і падзеямі. Сапраўдная незалежнасьць, рэальная палітычная гісторыя незалежнай Беларусі дае падставу Дубаўцу сьцьвярджаць а) слабасьць нацыянальнага руху (*“заняпад беларускай ідэі ёсьць, і ён нераадолены ў тых формах, у якіх гэтая ідэя йснавала ды йснуе”*), б) цьмянасьць і нераспрацаванасьць ідэалёгіі беларускага нацыяналізму (*“... беларушчына — гэта творчасьць. Шматгадовыя ваганьні й прыблізны сэнс адраджэнства склаліся ў адзіную прычыну паразы на пераможным шляху”*), в) прадажнасьць і непрадукцыйнасьць дэмакратычнай апазыцыі (*“Бог даў Беларусі ня толькі самае горшае ў сьвеце начальства, але й самых*

нікчэмных патрыётаў, самых баязьлівых палітыкаў, самых бязвольных змагароў”), г) нераспрацаванасьць і нявызначанасьць альтэрнатыўнай дзяржаўнай культурнай палітыкі беларускіх культурных элітаў (*“так і ня ўзгоднены адраджэнцамі правапіс роднай мовы, ня створана дзяржаўная ідэалёгія беларускага парадку”*). Наступная інвэктыва няўзнак абарочваецца супраць стратэгіі “распрацоўкі і стварэньня нацыянальнага героя”, якую мы прыпісалі былі Аляксандру Лукашуку: *“Яшчэ гадоў 10 таму фатакопіі твораў Луцкевіча, Станкевіча, Варонкі... прыносілі асалоду здабыткаў. Але сёньня самая ідэя вяртаньня — гэта прафанацыя”*.
Сам Сяргей Дубавец з 1991 году стала жыве ў Вільні, і таму вобраз праэўрапейскай Літвы прысутнічае на гарызонце яго твораў як пазытыўная альтэрнатыва прарасійскай Беларусі:

Літва, нібы адмыслова дзеля Беларусі, стварае хрэстаматыйныя ілюстрацыі — узоры быту нацыянальнай дзяржавы. Літва — выдатніца ў школе постсавецкіх народаў, акуратная й старанная, прагная да вучобы, яна пераходзіць з клясы ў клясу, павялічваючы адлегласьць ад трэцягодніцы-Беларусі, якая прагульвае ўрокі, як прагульвае іх неахайная дзяўчынка ў зношанай школьнай форме — прагульвае не дзеля кіно ці нейкіх іншых забаваў, а дзеля самога прагульваньня. І гэтаксама, як дзяўчынка-трэцягодніца, Беларусь недалюблівае Літву, пазьбягае гэтай стараньніцы, якая марыць паступіць ва ўнівэрсытэт аб’яднанай Эўропы, бо сама Беларусь ня марыць ні пра што.
Чым гэтта кіруецца Дубавец? Відавочна, ня станам эканомікі абедзьвюх краін, які, ведама, адрозны, але не настолькі, каб даваць грунт для такой змрочнай ацэнкі. Пагатоў што меншы паказьнік ВУП у пераліку на адзінку насельніцтва ў Беларусі ў пэўнай меры кампэнсуецца значна меншай вонкавай запазычанасьцю, а значыць, значна меншымі выдаткамі зь дзяржаўнага бюджэту на яе абслугоўваньне. Інакш кажучы, яўнага разрыву ўва ўзроўні жыцьця сярэдняга беларуса і сярэдняга літоўца не было і няма. Відаць, Дубавец схільны ўспрымаць лукашэнкаўскі праект незалежнасьці сама меней як акт нацыянальнага прыніжэньня, а мо нават як нацыянальны крах. І сапраўды, як інакш рэагаваць нацыянальнаму ідэолягу на беларускую рэальнасьць часоў Лукашэнкі зь яе крахам усіх

ранейшых нацыяналістычных утопіяў, зь яе нізкапаклонствам перад зьненавіджанай Расіяй і ледзяной абыякавасьцю да Захаду?

На жаль, аўтар “Дзёньніка…” ў сваёй кнізе абмяжоўваецца толькі пастаноўкай нацыянальных праблемаў. Да іх тэарэтычнага вырашэньня ён зьвернецца ў “Русской книге”. Цяжка сказаць, каму была адрасаваная гэтая выдадзеная на расійскай мове кніга. Яна настолькі насычаная беларускімі культурнымі рэаліямі, што звычайны расіец з Расійскай Фэдэрацыі наўрад ці патрапіць прадзерціся скрозь іх дрымучыя нетразі. Магчыма, кніга была прызначаная расійскамоўным беларусам? Але аўтарскі тэкст мае досыць гермэтычны характар, а яго наклад абмяжоўваецца 500 асобнікамі. Застаецца адзін верагодны адказ: тутэйшай расійскамоўнай інтэлігенцыі, якая дагэтуль ніяк не прасякнецца гаючымі ідэямі нацыянальнага адраджэньня.

Пачынае Дубавец здалёку, і ў гэтым “далёку” чуецца водгульле дыскусій у асяродзьдзі літоўскай інтэлігенцыі часоў “Саюдзісу”. Яшчэ ў “Дзёньніку” аўтар хінецца да думкі, што нацыянальная нясьпеласьць беларусаў тлумачыцца ня ўнутранымі прычынамі, а вонкавымі, у прыватнасьці, несупыннымі чужынскімі акупацыямі. На думку Дубаўца, калі прызнаём французскую або нямецкую акупацыю Беларусі, трэба прызнаваць і расійскую, бо яны валодаюць аднолькавым *“шэрагам тыпалягічных прыкметаў”*. Гэты тэзыс будзе разьвіты ў “Русской книге” ў духу “этнічнага нацыяналізму”, згодна зь якім адказнасьць за цяжкасьці этнічных супольнасьцяў з выбудовай мадэрнай нацыі кладзецца на зламысны чужаземны элемэнт.

Не прапаноўваючы свайго тэарэтычнага асэнсаваньня расійскай калянізацыі Беларусі, Дубавец, тым ня менш, стварае ўласную тыпалёгію расійскага апанаваньня Беларусі. Ударнай сілай расійскай пятай калёны ў Беларусі выступаюць расійскія вайсковыя пэнсіянэры, якія прышчапляюць грамадзтву ня толькі сацыяльна дэфэктыўныя вартасьці, але і ўкараняюць лад жыцьця, непрымальны з гледзішча нацыянальнага сьветапогляду. (*“Кто-то из современников назвал Беларусь “страной отставников”. Это правда. Ведь до последнего времени офицеры советской армии, уходя в отставку и выбирая себе место жительства, отдавали нашему краю абсолютное*

предпочтение”.) Іх бязьбеднае існаваньне ў Беларусі, сваёй чаргой, робіцца магчымым дзеля надзейнага тылу ў выглядзе былой савецкай вайсковай інфраструктуры. (*“Кстати, о военных городках. Некоторые считают, что именно из этих лепрозориев расползлась по нашей земле проказа пренебрежения к крестьянскому труду, а заодно и ко всему белорусскому”.*) Падступныя расійцы, каб дасягнуць стратэгічнага кантролю над краінай, не абмежаваліся патураньнем сваім вайсковым пэнсіянэрам і пабудовай вайсковых гарадкоў, а апанавалі дзяржаўны апарат. (*“200 лет мы, белорусы, с ними живем, под ними обретаемся, от них терпим. Нашествие этих чиновников “из центральных губерний” началось в прошлом* (у XIX — **Аўт.**) *столетии. Тогда десятки тысяч администраторов хлынули на захваченные земли, чтобы возглавить тут новые военные и цивильные учреждения, школы и церкви”.*) Апошняя хваля расійскага пранікненьня ў Беларусь і выпхнула на палітычны алімп А.Лукашэнку. (*“Последней волной такого приезда из России и отмечен период правления Лукашенко”.*)

Этнічны нацыяналізм Дубаўца ўступае ў супярэчнасьць з афіцыйнай ідэалёгіяй лукашэнкаўскага рэжыму, але і канфрантуе з ідэалёгіямі нацыянальных дзяржаваў эўрапейскага Захаду, напрыклад Францыі. Апошняя будавалася шляхам пераадоленьня этнічных сэпаратызмаў і сьціраньня рэгіянальных адметнасьцяў. Статус законапаслухмянага грамадзяніна нацыянальнай дзяржавы даваў значна большы сацыяльны аванс, чымся статус прадстаўніка лякальнай супольнасьці або пэрыфэрыйнай этнічнай групы, таму ўжо ў XIX стагодзьдзі ў Францыі масава адміраюць рэгіянальныя мовы і культуры.

Бадай, Беларусь ня будзе выняткам з гэтага эўрапейскага правіла. Пры пабудове ў краіне нацыянальнай дзяржавы, палітычным элітам volens nolens давядзецца стварыць варункі для хуткай і бязбольнай інтэграцыі ў нацыю ўсіх этнічных групаў, якія жывуць у нас. І чым хутчэй і лягчэй адбудзецца асыміляцыя этнічных расійцаў, найбольшай этнічнай меншыні, тым будзе лепей для супольнай нацыянальнай справы. Але для гэтага трэба мець прынамсі разьвітую, “канкурэнтаздольную” нацыянальную культуру і цьвёрдую палітычную волю.

Заўважым у дыскусійным парадку, што побыт у фармальна фэдэрацыйнай дзяржаве, Савецкім Саюзе, даваў беларусам

пэўныя магчымасьці для захаваньня нацыянальнай культуры — іншая рэч, што нацыя не карысталася імі ў поўным аб'ёме, як тыя ж прыбалты. Калі ж уявіць, што пасьля другой сусьветнай вайны Беларусь цалкам увайшла б у склад Польшчы, нармальнай, г.зн. унітарнай нацыянальнай дзяржавы, ніякай бы беларускай незалежнасьці мы не дачакалі, бо польская дзяржаўная машына куды больш эфэктыўна працавала на асыміляцыю этнічных мяншыняў.

Зрэшты, "этнічны нацыяналізм" Дубаўца ўзьнік не на голым месцы, а быў нацыяналістычным адказам на выклік, кінуты лукашэнкаўскім рэжымам незалежнаму беларускаму грамадзтву, выклік, які палягаў у аднаўленьні былой каляніяльнай практыкі ператварэньня беларусаў у моўную і культурную меншыню ў краіне, у якой яны фармальна зьяўляюцца тытульнай нацыяй. Выразная перавага нацыянальных крыўдаў і фрустрацый над палітычным прагматызмам і фармальнай паліткарэктнасьцю тут сьведчыць перадусім пра тое, наколькі сьвежыя і глыбокія былі яшчэ раны. Але зь цягам часу яны загояцца, і ў 2002 годзе Сяргей Дубавец будзе заклікаць да асьцярожнага супрацоўніцтва з лукашэнкаўцамі ў справе абароны беларускай незалежнасьці. Абвінавачаньне тутэйшых расійцаў у нацыянальнай катастрофе беларусаў не дае поўнага адказу на пытаньне, як і чаму ў першай дэкадзе постсавецкай Беларусі нацыяналістычная ідэалёгія аказалася ня ў стане канкураваць з сваёй савецкай інтэрнацыянацыялістычнай адпаведніцай. Прыклад Украіны, дзе расійская этнічная меншыня складае да 25% ад усёй папуляцыі, але вонкавая палітыка якой значна больш антырасійская, пераканаўча сьведчыць, што такая інтэрпрэтацыйная мадэль мае больш супольнага з выдумкай, чымся з праўдай. У нявырабленасьці і непрывабнасьці нацыянальнай ідэалёгіі вінаватыя перадусім нацыянальныя ідэолягі, а не ананімныя "жыхары вайсковых гарадкоў" і шкадлівыя "вайсковыя пэнсіянэры". І наагул, палітыку робяць ня масы (хай сабе этнічна чужыя), а колькасна нешматлікая палітычная кляса, што ў сваіх палітычных паводзінах кіруецца бягучай палітычнай рацыянальнасьцю, якая недвухсэнсоўна санкцыянуе адно (напрыклад, зьнішчэньне беларускамоўнага школьніцтва) і забараняе іншае (антырасійскую гістэрыю ў дзяржаўных мэдыях, да нядаўняга часу).

Нягледзячы на свой этнічны антырасійскі нацыяналізм, Дубавец карыстаецца надзіва русіфікаваным тэрміналягічным апаратам. Расійцы не ўспрымаюць ўведзенага заходняй нацыялёгіяй разьмежаваньня этнасу/народу як групы, якая ўва ўмовах капіталістычнай гаспадаркі і адпаведных ёй формаў міжасабовай камунікацыі самаакрэсьліваецца пры дапамозе супольнай мовы, культуры, узвычаеньняў і тэрыторыі пражываньня, і нацыі як рукатворнай, створанай элітамі культурна-палітычнай супольнасьці, чальцоўства ў якой легітымізуецца стандартызаванай мовай і ўніфікаванай культурай, вырабамі ўсё тых жа элітаў, і не прадугледжвае адзінага этнічнага паходжаньня. Дубавец ужывае ўласьцівае расійцам паняцьце нацыі як этнічнай супольнасьці (*“нацыя — гэта пэўная культура, пародa [можа, груба, але ў ratio найбольш дакладна] дадзенай супольнасьці”*) без засьцярогаў, інтэлектуальна застаючыся ў савецкім мінулым. Напрыклад, сярод чыньнікаў, якія ствараюць *“нацыянальную спэцыфіку прадстаўніка кожнай нацыі”*, Дубавец цалкам у рэчышчы расійскай традыцыі называе *“кроў (генэтычную памяць), прыроду, клімат, традыцыі”*. Відаць, усё тыя ж расійскія гісторыкі культуры, пачынаючы зь Мікалая Данілеўскага, прышчапілі Дубаўцу разуменьне нацыянальнага шляху як *“свайго тыпу цывілізацыі”*. *“Немцы, итальянцы, шведы на основе собственных культур создали свои типы цивилизации — немецкий, итальянский, шведский”*, — піша Дубавец, і нам няма нічога да гэтага дадаць.

У шматмоўнай і шматкультурнай Беларусі Дубаўцова пропаведзь этнічнага нацыяналізму не дала яму надзейных пасьлядоўнікаў, здольных да сыстэматычнага выкладу свайго ідэйнага крэда. Гэтага, аднак, нельга сказаць пра ўжо апісаную нацыяналістычную стратэгію гераізацыі нацыянальнай мінуўшчыны, якая на зломе стагодзьдзяў была вернутая да жыцьця.

5

Брашура маладога гісторыка Сяргея Ярша, прысьвечаная ваяку Ўсеваладу Родзьку, пабачыла сьвет у афіцыйна не зарэгістраваным выдавецтве “Голас Краю”, якое саматужна вырабляе кніжную прадукцыю нацыяналістычнага зьместу. Толькі за апошнія паўгоду ў ім выйшлі брашуркі

“Нацыянальнае пакліканьне”, “Нацыяналізм у сьвеце. Мінулае, сучаснасьць, пэрспэктывы”, “Песьні краю. Сьпеўнік” і, нарэшце, нарыс нейкага Яна Каваля “Генэрал вызвольнага фронту”, прысьвечаны Родзькаваму паплечніку Дзімітру Касмовічу. Усе гэтыя выданьні друкуюцца на офіснай друкарцы і распаўсюджваюцца ў вузкім асяродзьдзі. Якісь сур’язьнейшы дасьледнік ня ўзяўся б іх разглядаць зусім: нашто ж калупацца ў дылентанцтве і аматаршчыне? Нас жа яны зацікавілі тым, што па-свойму адбіваюць ідэйную эвалюцыю беларускага нацыяналізму ў сучасных умовах.

“Усевалад Родзька. Правадыр беларускіх нацыяналістаў” — гэта ня першая буйная публікацыя Сяргея Ярша. У 1998 годзе ён выдаў кнігу “Вяртаньне БНП”, дзе асьвятлялася дзейнасьць падпольнай Беларускай незалежніцкай партыі часоў другой сусьветнай вайны, “правадыром” якой быў усё той жа Ўсевалад Родзька. Прысьвечаны яму нарыс заснаваны фактычна на ранейшых фактах і дакумэнтах, але вылучаецца хіба вастрэйшымі ацэнкамі асобы і дзейнасьці гэтага “правадыра”. Хто ж такі Ўсевалад Родзька? Ня хто іншы, як яшчэ адзін узор чалавека-калябаранта.

Усевалад Родзька нарадзіўся ў 1920 годзе (Ёрш не падае дакладнай даты) у вёсцы Чучэвічы на Лунінеччыне. Вучыўся ў польскай гімназіі імя А. Міцкевіча ў Наваградку. Падчас польска-нямецкай вайны 1939 году трапіў у нямецкі палон, здолеў зацікавіць сабой нямецкае камандаваньне, якое прызначыла яго кіраўніком філіі варшаўскага Беларускага камітэту ў Кракаве. Пасьля акупацыі Нямеччынай Беларусі працуе бургамістрам Віцебску, у мэтах, як піша Ёрш, *“беларусізацыі горада... супрацоўнічае з абвэрам (нямецкай вайсковай выведкай і контрвыведкай)”*. У студзені 1944 году немцы кааптуюць Родзьку ў прэзыдыюм Беларускай цэнтральнай рады. Пасьля ўцёкаў зь Беларусі ўлетку 1944-га Родзька апынаецца ўва Ўсходняй Прусіі, дзе стварае *“спэцыяльны дэсантны батальён “Дальвіц”*, які рыхтаваў дывэрсантаў і самалётамі закідваў іх у Беларусь. Заканчэньне вайны батальён “Дальвіц” разам з Родзькам сустракае ў Чэхіі, дзе яго бясслаўна раззбройваюць чэскія партызаны. Далей будуць арышт Родзькі ў Беластоку, дзе ён жыве пад імем Яна Ермаловіча, сьледзтва, падчас якога Родзька, баючыся за сваё жыцьцё, *“заламаўся”* і выдаў сваіх супольнікаў, суд і, нарэшце,

пакараньне сьмерцю.
Для Сяргея Ярша Ўсевалад Родзька — нацыянальны герой, і да гэтай высновы ён не падводзіць чытача ў заключных радках сваёй брашуры, а сьцьвярджае гэта адразу амаль зь дзіцячай непасрэднасьцю. Нават кампазыцыйна яго брашура складаецца зь дзьвюх частак — “Шлях героя” і “Дадатак”.
Каб давесьці Родзькаў гераізм, Ёрш ня грэбуе ніякімі сродкамі. Найбольш ахвотна для “распрацоўкі і ўкараненьня свайго нацыянальнага героя” ён сягае да абмежаванай толькі рамкамі сваёй фантазіі мітатворчасьці. Як і ў выпадку Янкі Філістовіча, геройскі чын Родзькі апісваецца ў мэтафарычных тэрмінах — *“няспынна змагаўся за вызваленьне бацькаўшчыны”, “энэргічна арганізоўваў беларускія вайсковыя адзінкі”, “чыніў супраціў польскаму ўплыву ў Беларусі”*, — за якімі ў найлепшым выпадку стаяць элемэнтарныя нацяжкі, у найгоршым — сьвядомае перакручваньне і фальшаваньне гістарычных фактаў. Ёрш бяз жадных згрызотаў сумленьня гаворыць пра анэкдатычную падрыхтоўку антынямецкага паўстаньня Родзькам у чэрвені 1944-га з мэтай абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі (паўстаньне сарвалося таму, што немцы не далі вагонаў, а палякі пастралялі яго будучых удзельнікаў).
Брашура мае больш супольнага з казкамі для малодшага і сярэдняга школьнага веку, чымся з гістарычнай навукай. Эфэкт гераізацыі нацыянальнай мінуўшчыны дасягаецца коштам прымітывізацыі, крайне спрошчанага і адначасна тэндэнцыйнага трактаваньня адвольна ўзятых гістарычных падзеяў. У дадатак да ўсяго, аўтар сьвядома адмаўляецца ад навуковай мэтадалёгіі, кладучы ў аснову свайго нарысу не гістарычныя факты, а вусныя аповеды неназваных наратараў. Зрэшты, усё гэта — лягічны працяг стратэгіі “нацыяналістычнай гераізацыі”, якая ўнікае рацыянальнай пазыцыі ў дачыненьні да мінуўшчыны і сучаснасьці. Як і ў розныя рэлігійныя дактрыны, у такую карціну нацыянальнай гісторыі належыцца верыць, перажываючы хвалявальны эмацыйны ўздым. Каб нэафіт адчуў непаўторны водар гісторыі, Ёрш насычае матэрыю свайго тэксту тэрміналёгіяй, наўпрост запазычанай зь беларускіх калябарацыйных выданьняў часоў апошняй вайны. *“Бальшавіцкія акупанты”* тут суседнічаюць з *“сваімі Героямі і Абаронцамі”*, *“бальшавіцкія банды”* — з *“акупанцкім прыгнётам”* і *“нацыянальнымі правадырамі”*.

Праўда, за таталітарнай тэрміналёгіяй прыходзіць чарод і таталітарнай манеры мысьленьня, якое не схаваеш за прызнаньнямі любові да Бацькаўшчыны. *“У школе абвэра, —* піша малады гісторык у 2001 годзе, *— беларускія нацыяналісты праходзілі дывэрсійную падрыхтоўку, каб пасьля вярнуцца на Бацькаўшчыну й змагацца за вольную Беларусь”.*
Такім чынам, стратэгія вырабу і шырокай дыстрыбуцыі нацыянальных герояў пайшла ў народ, а значыцца, сталася больш вульгарнаю і менш вытанчанаю. Іншай яна і не магла быць — каб зрабіцца масавай, то бок каб прадукавацца не адным асобна ўзятым нацыянальным ідэолягам, а фактычна любым носьбітам нацыянальнай сьвядомасьці з гуманітарнай адукацыяй, яе прыхільнікам давялося адмовіцца ад хоць нейкай навукападобнасьці, цалкам сьвядома зрабіўшы стаўку на ўкараненьне новых вераньняў сярод тутэйшых тубыльцаў. Засмучае адно: захапіўшыся адраджэньнем нацыянальных герояў, нашы маладыя ды верныя сыны Бацькаўшчыны самі не заўважылі, якую неацэнную паслугу зрабілі лукашэнкаўскай прапагандзе. Лукашэнкаўскія, а да іх савецкія ідэолягі і прапагандысты з ног зьбіваліся, каб убіць у масавую сьвядомасьць беларусаў знак роўнасьці паміж паняцьцем “беларускі нацыяналіст” і “фашысцкі паслугач-калябарант”. І, трэба сказаць, небеспасьпяхова, — нарэшце гэтую ўстаноўку засвоіла і новая хваля беларускіх адраджэнцаў.
Гэта, між іншым, відаць зь іншай “краёўскай” брашуры “Беларускі нацыяналізм. Даведнік”, укладальнік якой схаваўся пад псэўданім “Пятро Казак”. Як і мае быць, галоўнымі беларускімі нацыяналістамі ў ёй выстаўленыя ўсё тыя ж калябаранты. За годнасьць нацыянальных абуджальнікаў у ёй спаборнічаюць не культурныя дзеячы, якія і прыдумалі саму “беларускую нацыю”, акрэсьліўшы прыкладны сэнсавы зьмест “беларускай ідэі”, а адыёзныя Фабіян Акінчыц з Уладзіславам Казлоўскім, Міхась Ганько з “генэралам” Міхалам Вітушкам (які быў забіты праз два месяцы пасьля свайго дэсантаваньня ў Беларусі ў лістападзе 1944 году, але, паводле словаў укладальніка, здолеў-такі арганізаваць партызанскі аддзел “Чорны Кот”, *“праводзіў акцыі на чыгункі, узрываючы або захопліваючы цягнікі, рабіў напады на савецкія склады й гарнізоны, на вёскі, мястэчкі й гарады, вызваляў вязьняў з турмаў і канцлягераў”*), Дзімітры Касмовіч з загадкавым

атаманам Дзяргачом і, нарэшце, усё той жа Ўсевалад Родзька з батальёнам “Дальвіц”, які, як сказана ў брашуры, *“адыграў выключную ролю ў падрыхтоўцы каманднага складу для беларускага партызанскага руху. Ягоныя дэсантнікі здолелі часткова аб’яднаць стыхійную партызанку й аформіць яе ў арганізацыйныя рамкі”.*
Біяграфічным нататкам пра гэтых і іншых дзеячоў, сярод якіх зрэдзьчас трапляюцца сапраўды годныя людзі, накшталт Яна Станкевіча або Кастуся Каліноўскага, папярэднічае азначэньне “беларускага нацыяналізму”:

Беларускі нацыяналізм — гэта вызвольны, аб’яднаўчы грамадзка-палітычны рух, які на аснове яднаньня ў суцэльны фронт усіх паборнікаў дзяржаўнай самастойнасьці мабілізуе найшырэйшыя народныя масы да барацьбы за волю народа й чалавека, за нацыянальную, палітычную ды сацыяльную справядлівасьць, за аднаўленьне на беларускіх этнічных землях Беларускай Незалежнай Нацыянальнай Дзяржавы — адзінага гаранта існаваньня й працьвітаньня нацыі.
Кожная складовая частка гэтага азначэньня паказвае на невуцтва яго складальніка, а таксама дэмаскуе таталітарна-мэтафарычны склад яго мысьленьня. На беларускіх этнічных землях ніколі не існавала Беларускай Незалежнай Нацыянальнай Дзяржавы — хаця б таму, што мадэрная беларуская нацыя дагэтуль перабывае ў працэсе фармаваньня, дзеля чаго гаварыць пра аднаўленьне гэтай дзяржавы можа толькі самаўпэўнены вар’ят. У сваю чаргу, Незалежная Нацыянальная Дзяржава ня ёсьць і ніколі не была адзінай зарукай працьвітаньня нацыі — пра гэта вымоўна сьведчыць досьвед нацысцкай Нямеччыны або камуністычнай Альбаніі. Нельга пра беларускі нацыяналізм у яго дагэтулешніх рэдакцыях гаварыць і як пра аб’яднаўчы грамадзка-палітычны рух, паколькі ён заўсёды дамагаўся асаблівых культурных і іншых правоў для беларусаў, што зазвычай выклікала хваравітую рэакцыю з боку іншанацыянальных элітаў, асымілятарскія і імпэрскія амбіцыі якіх задавальняла толькі такое становішча, пры якім беларусы заставаліся па сутнасьці этнічнай нацыяй зь немадэрнізаванай, сацыяльна непрэстыжнай культурай. Не вычэрпваецца любы эўрапейскі нацыяналізм толькі адстойваньнем дзяржаўнай

самастойнасьці, наадварот, пасьля яе дасягненьня ён часта з канструктыўнага культурнага ператвараецца ў дэструктыўны грамадзкі рух. Да таго ж, у Беларусі “паборнікамі дзяржаўнай самастойнасьці” ўжо цяпер выступаюць усе лукашэнкаўцы пагалоўна, якіх ніяк не западозрыш у беларускім нацыяналізьме ў яго клясычнай рэдакцыі. І нарэшце, нацыяналізм ня мае ніякага дачыненьня да *“мабілізацыі найшырэйшых народных масаў да барацьбы за волю народа й чалавека, за нацыянальную, палітычную ды сацыяльную справядлівасьць”*. Эўрапейская і сусьветная гісторыя поўняцца бясконцымі прыкладамі таго, як у імя абстрактнай нацыі зьнішчаліся цэлыя народы і масава парушаліся правы чалавека. Узяць бы сёньняшнюю Беларусь, у якой у імя захаваньня нацыянальнага міру і спакою, а фактычна дзеля забесьпячэньня дамінантнага становішча расійскамоўных рэгулярна парушаюцца правы беларускамоўнай лінгвістычнай або польскай нацыянальнай меншыні. Што ж да *“нацыянальнай і палітычнай справядлівасьці”*, то нацыяналістычныя ўрады ўва ўсім сьвеце грашаць ірэдэнтысцкімі прэтэнзіямі, то бок дамагаюцца пашырыць сваю палітычную юрысдыкцыю на носьбітаў дадзенай нацыянальнасьці, якія пражываюць у сумежных краінах. Лёзунгі ж *“барацьбы за волю народу і чалавека”* і *“ўстанаўленьня нацыянальнай, палітычнай і сацыяльнай справядлівасьці”*, як паказвае эўрапейская гісторыя XX ст., характэрныя больш для сацыялістычных і марксісцкіх дактрынаў, адкуль, відаць, і былі запазычаныя эфэмэрычным “Пятром Казаком”.

Трэба сказаць, што маладзейшыя гісторыкі не засталіся самотнымі ў сваёй спробе абяліць і ўзьвесьці на нацыянальны пантэон колішніх калябарантаў. Пасільную дапамогу ў гэтай справе ім аказваюць іх старэйшыя калегі. У першым сёлетнім нумары часопісу “Спадчына” ў рубрыцы “Памяць мінулае вайны” апублікаваны артыкул акадэмічнага гісторыка Леаніда Лыча “Міжнацыянальныя дачыненні ва ўмовах нацысцкай акупацыі”. Яго агульны сэнс зводзіцца да наступных тэзысаў: беларусы напярэдадні нацысцкай агрэсіі знаходзіліся ў стане нацыянальнай разьяднанасьці (яны падзяляліся на *“людзей свядомых”, “асобаў антыбальшавіцкай накіраванасці”* і *“тых, хто меў арыентацыю на Масквy”*) і таму з прыходам нямецкіх войскаў усе моцна захваляваліся, ці не зашкодзіць гэта

нацыянальнаму жыццю. Але страхі аказаліся дарэмнымі, бо *“на здзіўленне не толькі песімістаў, але і аптымістаў, пашырэнню беларускай нацыянальнай ідэі акупацыйныя ўлады не пярэчылі”*. Пабачыўшы, што *“нацысцкая акупацыя не вяла да згортвання, забароны беларускай нацыянальнай духоўнай дзейнасці”*, яшчэ нядаўна разгубленымі беларусамі *“ўсцяж, дзе толькі былі для гэтага магчымасці, пачалася мэтанакіраваная ідэалагічная праца па прапагандзе беларускай нацыянальнай ідэі”*. Як канкрэтна вялася гэтая праца, Леанід Лыч не гаворыць, але шматлікія фашысцкія прапагандысцкія плякаты і ўлёткі, зьмешчаныя ў тым самым нумары “Спадчыны”, не пакідаюць найменшага сумневу ў яе асноўным кірунку. Далей аўтар акрэсьлівае рэальную пагрозу, якая тады навісла над нацыяй. Аказваецца, што падчас другой сусьветнай вайны беларусам найбольш пагражала не фізычнае вынішчэньне або масавыя дэпартацыі на прымусовыя работы ў Нямеччыну, а... германізацыя. У пацьверджаньне свае тэзы Леанід Лыч паважна гаворыць пра інтэлігентаў, якія *“лічылі за гонар пераКінуцца і некалькімі нямецкімі фразамі”*.

У адказ на гэты выклік беларуская інтэлігенцыя вырашыла згуртавацца і *“як праз вуснае, так і пісьмовае слова”* заклікаць народ да нацыянальнай кансалідацыі. Напрыклад, таму, што тагачасны рэдактар “Беларускай газэты” Ўладзіслаў Казлоўскі цалкам у духу расісцкай дактрыны нямецкага нацызму выступаў супраць мяшаных шлюбаў, аказваецца, можна даць тлумачэньне ў нацыянальным духу: *“...лёгка зразумець, чаго яму хацелася дасягнуць ад гэтага: узрастання ролі сем’яў у фармаванні нацыянальнай сведамасці беларускае моладзі”*. Увогуле, працягвае Леанід Лыч, *“асноўны акцэнт беларускія журналісты імкнуліся рабіць на выкрыццё злачынстваў бальшавізму”*, і ён пералічвае шэраг публікацыяў, у якіх антыбальшавіцкая прапаганда звычайна пераціналася з антыжыдоўскай і антыпольскай. Дарэчы, і сам аўтар схільны да разьдзьмухваньня беларуска-польскіх супярэчнасьцяў. На яго думку, якая мае шмат супольнага з этнічным нацыяналізмам, толькі гэтым разам антыпольскай скіраванасьці, палякі падчас вайны ставілі варожыя да беларусаў мэты, *“не збіраліся здаваць беларусам без бою адказныя пасады ў акупацыйных адміністрацыйных органах”*.

На заканчэньне публікацыі Леанід Лыч называе парамілітарнае

калябарацыйнае фармаваньне “Беларуская Краёвая Абарона” беларускім войскам (якому, паводле прыведзенага ў артыкуле сьведчаньня ўжо вядомага нам Усевалада Родзькі, перашкаджалі зламысныя палякі) і на розны лад гаворыць пра *“этнічную і нацыянальную кансалідацыю беларускага народу”*, дасягнутую падчас нямецкай акупацыі дзякуючы самаахвярнай працы беларускіх калябарантаў.

Мэтадалягічна публікацыя Леаніда Лыча мала чым адрозьніваецца ад безьлічы працаў савецкіх беларускіх гісторыкаў пра падзеі апошняе вайны ў Беларусі. Як і ў яго савецкіх папярэднікаў, у Лыча вельмі шмат ідэалёгіі і параўнальна мала ўласна гістарычнага аналізу. Дзеля гэтага ён вымушаны задавальняцца чыста фармальнай пераацэнкай грамадзка-палітычнага і нацыянальна-культурнага значэньня тых ці іншых гістарычных постацяў. Самі падыходы сутнасна не зьмяняюцца: як раней савецкія партызаны і падпольшчыкі ўсяляк набліжалі перамогу над гітлераўскай Нямеччынай, так цяпер колішнія калябаранты з усіх сілаў дбаюць пра адраджэньне Бацькаўшчыны, спрыяюць пашырэньню беларускай ідэі ў шырокіх народных масах. Як раней савецкія гісторыкі замоўчвалі з тых ці іншых прычынаў нязручныя падзеі мінуўшчыны, так і цяпер па-за рамкамі дасьледаваньня апынаюцца істотныя праблемныя аспэкты разгляданае тэмы. У артыкуле ня знойдзеш адказу на пытаньне, чаму за часоў нямецкай акупацыі асноўным культурным дасягненьнем нацыі стала ператварэньне беларускай мовы ў мову гітлераўскай прапаганды або чаму немцы пярэчылі адкрыцьцю ўстановаў вышэйшае асьветы.

Нарысы аўтарства Сяргея Ярша або Леаніда Лыча маюць адну кідкую супольную рысу: дзякуючы сваёй вульгарна-нацыяналістычнай заангажаванасьці яны неўпрыцям для чытача навязваюць яму ўяўленьне пра “малы залаты век” беларускага адраджэньня, у дадзеным выпадку тры гады нямецкай акупацыі. Адзіная рэч, што такая нацыяналістычная ўтопія існуе толькі ў сьвеце ўявы і не вытрымлівае найменшага сутыкненьня з рэчаіснасьцю.

6

Праца Рышарда Радзіка “Паміж этнічнай групай і нацыянальнай супольнасьцю. Беларусы на фоне нацыянальных

ператварэньняў у Сярэдне-Ўсходняй Эўропе XIX стагодзьдзя” асновасяжна розьніцца ад усіх вышэй памянёных публікацыяў найперш тым, што ўяўляе сабой позірк звонку на пытаньне нацыянальнага станаўленьня беларусаў, кінуты прафэсійна кампэтэнтным навукоўцам. Іншымі словамі, гэта навуковая кніга, а не публіцыстычная, эсэістычная або мастацкая літаратура. Жанр гуманітарнага дасьледаваньня абумовіў большую аб’ектыўнасьць польскага дасьледніка: у адрозьненьне ад беларускіх аўтараў (бэлетрыстаў, публіцыстаў або маладых гісторыкаў), якія ў сваіх творах намагаліся не адрэфлексаваць паняцьце беларускага нацыяналізму, а прышчапіць яго ў сваёй пэўнай іпастасі (этнічнага, моўнага або эсхаталягічнага, а ля Арлоў, нацыяналізму) нацыянальна несьвядомым масам, а таму напару зьбіваліся да самага прымітыўнага нацыяналістычнага мітабудаваньня, Рышард Радзік ніяк не заангажаваны ў беларускі нацыянальны рух. Сам гэты рух, асабліва яго пачаткі ў XIX стагодзьдзі, цікавіць навукоўца выключна як прадмет строга навуковага дасьледаваньня, безуважнага да якіх-любя сантымэнтаў. Праца ўяўляе сабой першы сыстэматычны выклад перадгісторыі беларускага нацыяналізму XIX стагодзьдзя з пазыцыі гістарычнай сацыялёгіі (часам вельмі набліжанай да культурнай антрапалёгіі) і ня мае сваіх папярэдніцаў у польскай гуманітарнай навуцы. У прадмове аўтар не бяз прыкрасьці канстатуе, што *“веды пра гісторыю і культуру беларускага грамадзтва ў Польшчы ледзьве не сымбалічныя”*, а *“ў СССР ажыцьцяўленьне якасных навуковых дасьледаваньняў, прысьвечаных фармаваньню беларускай нацыянальнай адметнасьці, было немагчымым як з палітычных, так і з ідэалягічных прычынаў”*. На думку аўтара, становішча істотна не зьмянілася і ў апошнія гады, *“працаў, прысьвечаных нацыянальнай праблематыцы, вельмі мала”*, дзеля чаго *“ў беларускай навуковай літаратуры беларускія нацыянальныя інтэнцыі досыць свабодна прыпісваюцца людзям, якія ня маюць нічога супольнага з мысьленьнем у гэтых катэгорыях”*.

Рышард Радзік. Нацыяналізм і камунізм: Расія, Украіна,

Пераходзячы да ўласна беларускага нацыяналізму, Р. Радзік канстатуе, што як рух ён разьвіўся ў XX стагодзьдзі і быў адным з самых позьніх і найбольш слабых нацыяналізмаў у Эўропе. Перадумовы ж яго ўзьнікненьня ён бачыць у XIX стагодзьдзі, хаця толькі гэтым матэрыялам кніга

вычэрпваецца. Яе адкрывае разьдзел *“Паміж этнічным грамадзтвам і нацыянальнай супольнасьцю”*, у якім выкладаецца распрацовак малавядомых у Беларусі польскіх сацыёлягаў і гісторыкаў (Флярыяна Знанэцкага, Станіслава Анаўскага, Яна Абрэмскага і г.д.), прапаноўваецца навукова карысная дасьведчаньне этнасу/народу і нацыі. Першы характарызуе звычаёвая лучнасьць (więź nawykowa), другую — ідэалягічная (więź ideologiczna). Гэтую ідэалягічную лучнасьць, якая ўстае сярод індывідаў дзякуючы ўкарэненай у іх сьвядомасьці супольнай *“ідэалягічнай айчыны”*, Радзік зусім у духу Бенэдыкта Андэрсана трактуе як уяўленую супольнасьць, зь якой і самаатаясамляецца канкрэтны індывід.

Білорусь та Польща / Імперія та нація з історичного досвіду України, Росії, Польщі та Білорусі. Київ, 2000. С. 189.

Другі разьдзел Радзікавай кнігі мае назоў *“Фармаваньне нацыяў у Сярэдне-Ўсходняй Эўропе”*. У ім прасочваецца інтэлектуальная гісторыя паняцьця “нацыя” ад антычнасьці і да часоў разьдзелаў Рэчы Паспалітай. Шмат месца Радзік адводзіць разгляду катэгорыі “этнічнасьці”, асабліва ў сувязі з аналізам архаічнай візіі паняцьця “нацыя”, пашыранага за часоў існаваньня Рэчы Паспалітай. Ход разважаньняў Радзіка прыкладна такі: у дамадэрных грамадзтвах сацыяльная ідэнтыфікацыя важыла больш за нацыянальную ідэнтыфікацыю індывіда. На працягу апошніх стагодзьдзяў зьмянілася не намэнклятура паказьнікаў, на аснове якіх адбываецца самаідэнтыфікацыя індывіда (мова, пол, канфэсія, сям’я, прафэсія і г.д.), а адносная важнасьць гэтых паказьнікаў, у прыватнасьці, значна ўзрасла роля этнічнасьці пры індывідуальнай ідэнтыфікацыі.

Трэці разьдзел кнігі, *“Нацыянальная эвалюцыя польскай супольнасьці ў Беларусі (пад ціскам расійшчыны)”,* — найбольш цяжкі для разуменьня беларускаму чытачу, паколькі ён цалкам заснаваны на польскім культурным досьведзе. Прыблізны сэнс Радзікавых разважаньняў такі: стваральнікі (Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Францішак Багушэвіч і г.д.) мадэрнага беларускага нацыяналізму, які да канца XIX стагодзьдзя вылучаўся перадусім сваім культурным характарам, мелі шляхецкае паходжаньне і каталіцкае веравызнаньне. Дзеля гэтага, на думку аўтара, яны былі часткай польскай палітычнай нацыі, якую ён разумее ў надэтнічных катэгорыях. Падчас навалы расійскага імпэрыялізму ў XIX стагодзьдзі гэтыя палітычныя палякі зь беларускім этнічным паходжаньнем

знайшлі ў сабе змогу выпрацаваць свой трэці шлях — шлях беларускага нацыяналізму. Гэты тэзыс можна прыняць, толькі перафармуляваўшы яго так: для фармаваньня мадэрнай беларускай нацыянальнай сьвядомасьці сучасны ёй польскі нацыяналізм быў асноўнай, хаця і не адзінай інсьпірацыяй. Радзік пры гэтым надта не заглыбляецца ў пытаньне ідэйнай эвалюцыі польскага нацыяналізму канца XVIII — XIX стагодзьдзяў. Але, калі згадзіцца з вышэй пададзенай тэзай пра вызначальны ўплыў польскага нацыяналізму на ўзьніклы ў XIX стагодзьдзі беларускі, яно набывае вельмі важны характар.
На момант свайго краху Рэч Паспалітая была *“аддаленай культурнай правінцыяй рамана-германскай Эўропы”** і таму нацыяй у гэтай дзяржаве сябе ўсьведамлялі кіраўнічыя эліты, якія мелі пэўныя адміністрацыйныя, інстытуцыйныя і іншыя магчымасьці для запачаткаваньня нацыянальнага праекту. Ува ўмовах безьдзяржаўнасьці іх ня стала, але іх функцыянальную ролю перанялі польскія літаратурныя колы, перадусім так званыя “польскія рамантыкі”, якія далі моцны імпульс нацыятворчаму працэсу. Іх сьветапогляд быў у значнай меры інсьпіраваны апалёгіяй роднай старонкі, паэтыкай барацьбы дабра са злом, ідэалам вызваленчага змаганьня супраць захопнікаў. Рамантычная эстэтыка прымусіла іх інакш зірнуць на ранейшыя стасункі паміж панскім дваром і сялянскай хатай. На месца ранейшага адчужэньня, пачуцьця дыстанцыі паміж прадстаўнікамі розных сацыяльных слаёў прыходзіць замілаваньне чалавекам працы і яго непаўторным культурным асяродзьдзем — фальклёрам, індывідуальнай мовай, патрыярхальным ладам жыцьця. У польскіх рамантыкаў вобраз прадстаўніка патрыярхальнай культуры перастае асэнсоўвацца пры дапамозе “нізавога” сьмехавога дыскурсу і зазнае нават пэўную ідэалізацыю як носьбіта сацыяльна значных маральных вартасьцяў і этычных ідэалаў. Гэта рыхтавала “змычку” паміж сацыяльнымі вярхамі і *“людзьмі подлымі”*, спрыяла ўцягваньню ў працэс нацыятварэньня шырэйшых сацыяльных масаў. Характэрна, што пры гэтым нікога асабліва не цікавіла этнічнае паходжаньне гэтых масаў — у аснову была пакладзена супольная культурная тоеснасьць.
Шмат зрабіў для трансфармацыі паняцьця нацыі ў польскім інтэлектуальным кантэксьце Адам Міцкевіч: пропаведзьдзю любові да сваёй малой радзімы “Літвы” ён на эмацыйным

узроўні спрыяў таму, каб гістарычныя ліцьвіны (насельнікі Цэнтральнай і Заходняй Беларусі і сучаснай Літвы ў цяперашнім разуменьні) адчулі “адзінства лёсу” з гістарычнымі палякамі. Для ўзмацненьня псыхаэмацыйнай прыцягальнасьці новай польскай нацыянальнай супольнасьці польскія рамантыкі прапагандавалі ідэю надзвычайнай цывілізацыйнай місіі Польшчы, яе мэсіянскае пакліканьне. Некаторыя дасьледнікі нават прыпісваюць Адаму Міцкевічу новае паняцьце — “мэсіянізм”, якое асабліва рэльефна выявілася ў адным зь першых паэтавых твораў эміграцыйнага пэрыяду — “Кнігах народу польскага і польскага пілігрымства”. Для польскага нацыяналіста XIX стагодзьдзя вера ўва ўваскрашэньне Хрыста натуральным чынам спалучалася зь верай ува ўваскрашэньне Польшчы. Таму ўсё, што спрыяе адраджэньню бацькаўшчыны, мае пазытыўную маральную вартасьць. Міцкевіч быў перакананы, што паколькі на зьмену *“міталягічным эпохам”* (дахрысьціянскай і хрысьціянскай) ідзе новая, калі галоўнай дзейнай асобай стане нацыя, то якраз Польшча, названая ім у першай лекцыі з цыклу прачытаных у 1840—1844 гадах у парыскім Collиge de France *“Капэрнікам новай маралі”*, закладае такім *“нацыяцэнтрычным”* маральным кодэксам падваліны новай цывілізацыі.

Такім чынам, пашыранае ў першай палове XIX стагодзьдзя сярод польскіх элітаў паняцьце нацыі ня мела ярка выражанай этнічнай або моўнай дамінанты. Асновай для яднаньня станавілася дэмакратычная ідэалёгія адзінства культурных і гістарычных лёсаў былых насельнікаў Рэчы Паспалітай пры затушоўваньні яе гіерархічна-станавай прыроды. Адначасна культурнае адзінства прадугледжвала момант супольнай рэлігійнай тоеснасьці.

Далейшай рэакцыяй на “прабуксоўваньне” ў першыя дзесяцігодзьдзі XIX стагодзьдзя ранейшай, “элітарнай” “рэдакцыі” польскага нацыянальнага праекту стала інтэлектуальнае крэда польскага рэвалюцыйнага дэмакратызму, якое пачало фармавацца ў 40-я гады XIX стагодзьдзя (яго ўплыў перажыў Францішак Багушэвіч). Адсталая сацыяльная структура польскага грамадзтва прывяла да таго, што паміж элітамі грамадзтва і народнымі масамі заставалася непераадольная дыстанцыя. У адрозьненьне ад эўрапейскага Захаду, тут так і не разьвіўся да канца трэці стан,

не адбылося іншых, адбытых на Захадзе, значных сацыяльных трансфармацыяў. Польскае грамадзтва захоўвала дамадэрную сацыяльную структуру, таму пераадоленьне гэтага адчужэньня паміж нацыянальнымі, часам разнароднага этнічнага паходжаньня, масамі і нацыянальнымі элітамі разумелася як пераадоленьне станавых разьмежаваньняў, паяднаньня другіх зь першымі (Р. Шпарлюк, напрыклад, параўноўвае польскіх сялянаў з рабамі ў сацыяльнай гіерархіі Паўночнай Амэрыкі). У польскіх рэвалюцыйных дэмакратаў "народ" становіцца прадметам узьвелічэньня і *"служэньня"*. Неўзабаве такая пазыцыя будзе асвоеная і беларускім культурным нацыяналістам Францішкам Багушэвічам.

Радзік прыводзіць надзвычай цікавае сьведчаньне таго, як яшчэ напярэдадні распаду Рэчы Паспалітай, у другой палавіне XVIII стагодзьдзя, сярод польскіх культурных элітаў пачынае пашырацца канцэпцыя палітычнай нацыі, падобная да заходнеэўрапейскай. Ён цытуе Францішка Язерскага, польскага "рэспубліканца", які даў наступную дэфініцыю: *"Нацыя — гэта супольнасьць людзей, якія маюць адну мову, норавы і ўзвычаеньні, зацьверджаныя адзіным і супольным для ўсіх грамадзянаў заканадаўствам"*.

Інтрыгуе і прыведзенае Радзікам выказваньне Тадэвуша Касьцюшкі, які ў нашай нацыянальнай гістарыяграфіі традыцыйна асэнсоўваецца як "правадыр беларускіх паўстанцаў". Яшчэ ў 1789 годзе, падкрэсьліваючы важнае значэньне мовы для станаўленьня польскай нацыі і польскага нацыянальнага адзінства, Касьцюшка пісаў аб "русінах" (сёньняшніх беларусах і ўкраінцах): *"Прызвычайваць іх трэба да польскай мовы, хай у польскай мове ўсе іх набажэнствы будуць. З часам дух польскі ўвойдзе ў іх. Непрыяцелем абвясьціць таго потым трэба, хто б ня ведаў нацыянальнай мовы"*.

Трансфармацыю паняцьця "нацыі" сярод элітаў Рэчы Паспалітай часоў яе заняпаду Радзік падмацоўвае цытатамі з польскага сацыёляга Юзафа Шацкага (*"Бяру на сябе рызыку сьцьвердзіць, што польскае Асьветніцтва наблізілася да разуменьня нацыі ня толькі ў прасторы, але і — калі карыстацца выразам Бёрка — як лучнасьці ў часе. Людзей зьвязвае ня толькі "айчына", але і "нацыянальнасьць", якая зьяўляецца іх супольнай гістарычнай спадчынай, а ня толькі зьбегам акалічнасьцяў, зь якімі трэба лічыцца заканадаўцу. Некаторыя аўтары, зрэшты,*

падкрэсьліваюць, што польскае Асьветніцтва было значна менш "касмапалітычным" за французскае") і Анджэя Валіцкага (*"Шляхецкая ідэя нацыі-сувэрэна лёгка паддавалася мабілізацыі: досыць было адкінуць атаясамленьне нацыі з шляхтай, каб уся рэшта шляхецкай рэспубліканскай ідэалёгіі станавілася сугучнай мадэрнаму рэспубліканізму"*).

Гэтаму разьдзелу дасьледаваньня польскага навукоўца падводзіць рысу думка вядомага дасьледніка нацыяналізму Ісаі Бэрліна аб тым, што пасьля разьдзелаў Рэчы Паспалітай ідэя нацыі, узятая на ўзброеньне польскімі элітамі, выконвала свайго роду ролю *"групавой тэрапіі"*: *"Ідэя нацыі як найвышэйшага аўтарытэту, часам насычаная містычным або мэсіянскім духам, якая заступае Царкву, сувэрэна, вяршэнства права або іншыя крыніцы абсалютных вартасьцяў, загойвала траўмы калектыўнай сьвядомасьці, незалежна ад таго, хто іх прычыніў — чужы вораг, айчынныя капіталісты, імпэрыялістычныя эксплюататары або накінутая зьверху бяздушная бюракратыя"*.

Радзік асобна спыняецца на асаблівасьцях успрыняцьця паняцьця нацыі тагачаснымі расійскімі элітамі. Запачаткаваны ў Расіі ў першай палове XIX стагодзьдзя працэс фармаваньня новай нацыянальнай ідэнтычнасьці моцна гамавалі традыцыі расійскай жа палітычнай культуры, якія мелі эўрапейска-азіяцкае паходжаньне, а таксама эканамічная адсталасьць краіны, дзе да рэформы 1861 году, зьдзейсьненай Аляксандрам II, існаваў прыгон — фактычна дамадэрная форма рабства. Аўтарытарна-азіяцкія карэньні Расійскай імпэрыі ўваходзілі ў супярэчнасьць як з узьніклым у Францыі паняцьцем палітычнай нацыі (бо патрабавалася маштабная мадэрнізацыя сацыяльнага і эканамічнага жыцьця імпэрыі, ператварэньня падданых у грамадзянаў), так і з культываваным у Нямеччыне паняцьцем нацыі культурнай (бо сфэра пашырэньня высокай расійскай культуры была невялікая і абмяжоўвалася пераважна імпэрскімі адміністрацыйнымі асяродкамі). Ува ўмовах адсутнасьці ці недастатковасьці палітычных, эканамічных, сацыяльных і культурных перадумоваў для выбудовы расійскай мадэрнай нацыі нацыяналістычна настроеныя расійскія эліты спрабавалі інтэлектуальна абгрунтаваць *"апрычоны"* характар разьвіцьця расійскага народу, які не ўкладаўся ў прыняты ў Эўропе інтэлектуальны дыскурс. Распрацоўвалася канцэпцыя

“особого российского пути”, пры гэтым сам наратыў “особого пути”, як пераконліва даводзіць Ален Бэзансон, быў запазычаны ад нямецкіх рамантыкаў*.
Радзік прыводзіць цытату з польскага гісторыка Маўрыцага Махнацкага, які ў выдадзенай яшчэ ў 30-х гадах XIX стагодзьдзя кнізе “Powstanie narodu polskiego w roku 1830 i 1831” улавіў неадпаведнасьць паміж наднацыянальным характарам Расійскай імпэрыі і станам нацыянальнай самасьвядомасьці расійцаў: *“Масква, Прусія і Аўстрыя ў сёньняшняй Эўропе ўтвараюць вялізную сыстэму разнародных палітычных арганізмаў. Гэтыя дзяржавы, ня будучы грамадзкімі цэламі, ня будучы народамі, існуючы толькі дзякуючы сіле сваіх урадаў, перастануць існаваць пасьля ўнутраных ці вонкавых узрушэньняў, якія зьменяць форму гэтых урадаў. Завядзі ў Маскве рэспубліку, увядзі ў Аўстрыі і Прусіі канстытуцыйную манархію, і гэтыя краіны адразу распадуцца на часткі, зь якіх паўсталі... У Эўропе ёсьць іншыя дзяржавы, таксама моцныя, як і гэтыя тры аглямэраты, больш арганічныя, чымся яны, бо не складаюцца з разнародных частак або сьцёрлі гэтую разнароднасьць у сабе, як, напрыклад, Францыя і Англія. Не выпадае, напрыклад, гаварыць, што ёсьць* ***аўстрыйская нацыя****”*.
З гэтага апісаньня Расія паўстае не як нацыянальная дзяржава, а як палітычная юрысдыкцыя сваіх шматнацыянальных падданых, няздольная эфэктыўна навязваць усім ім супольную, “уніфікаваную” форму нацыянальнае сьвядомасьці.
Увесь гэты эмпірычны матэрыял можна падсумаваць наступным чынам: на зломе XVIII і XIX стагодзьдзяў інтэнсіўныя працэсы нацыятварэньня разгарнуліся на Захадзе эўрапейскага кантынэнту, дзе ў розных гістарычных варунках узьніклі дзьве канцэпцыі нацыі — дзяржаўнай, або палітычнай нацыі, прыклад якой дала Францыя, і культурнай нацыі, якая разьвілася сьпярша ў раздробленай на 38 княстваў Нямеччыне. Важны досьвед пабудовы “культурнай” нацыі дае падзеленая паміж Расіяй, Аўстра-Вугоршчынай і Прусіяй Польшча. Нацыяналістычна настроеныя польскія нацыянальныя эліты, на якіх вялікі ўплыў аказаў прыклад Нямеччыны, дзе нацыяналізм давёў сваю здольнасьць эфэктыўна вырашаць палітычныя задачы, у прыватнасьці, аб’яднаць раздробленую на асобныя тэрыторыі нацыю ў супольную дзяржаву, фармулююць такую нацыянальную ідэалёгію, якая пасьля акажацца вельмі

прыцягальнай для ўкраінскіх і беларускіх элітаў, свайго роду прыкладам для перайманьня. Што да расійскіх інтэлектуальных элітаў, то бальшыня іх прадстаўнікоў вызнавала ўтапічныя пагляды на прыроду нацыі, палічыўшы эканамічную адсталасьць Расійскай імпэрыі перадумовай яе асаблівага гістарычнага шляху і тым самым не прапанаваўшы вырашэньня нацыянальнай праблемы, якая ў краіне з кожным годам абвастралася. Іншымі словамі, трэба канстатаваць **залежнасьць** формаў нацыянальнай і сацыяльнай сьвядомасьці “нерасійскіх” грамадзтваў эўрапейскай часткі Расійскай імпэрыі ад інтэлектуальных і сацыяльных працэсаў ува ўсёй Эўропе.

Чацьверты разьдзел кнігі, які мае досыць дзіўны загаловак — *“Lud”* (што на беларускую мову можна перакласьці ня толькі як “Народ”, але і як “Насельніцтва” або “Папуляцыя”), мае пераважна сацыялягічнае значэньне і прысьвечаны такім тэмам, як структура беларускага грамадзтва, а таксама працэсам яго палянізацыі і русіфікацыі, якія параўнальна няблага разгледжаныя ў адпаведнай беларускай навуковай літаратуры. Радзік таксама шмат гаворыць пра гістарычную і этнічную сьвядомасьць беларусаў XIX стагодзьдзя, іх стаўленьне да ўласнай мовы, разглядае рэлігійны фактар у кантэксьце фармаваньня мадэрнай беларускай нацыі.

Пяты і апошні разьдзел манаграфіі — *“Пратаганісты беларускасьці XIX стагодзьдзя”* — адзначаецца тым, што ў ім польскі дасьледнік пасьлядоўна выступае супраць прыпісваньня беларускай нацыянальнай сьвядомасьці Кастусю Каліноўскаму, Францішку Багушэвічу і Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу. *“Дарма што ў беларускай літаратуры Каліноўскі,* — піша Радзік, — *досыць катэгарычна прызнаецца беларускім нацыянальным дзеячом, творцам беларускасьці ў ейным палітычным вымеры, у яго творах цяжка дашукацца мадэрнай беларускай ідэалёгіі”*. Радзік указвае на тое, што ў творах Каліноўскага “нацыя” трактуецца як палітычная катэгорыя, а не культурная. Таму, на думку аўтара, Канстанцін Каліноўскі быў палітычным палякам, схільным, аднак, да рэгіянальнага сэпаратызму.

Аб Францішку Багушэвічу Радзік гаворыць як аб дзеячу, які застаўся паміж традыцыйнай палітычна-культурнай польскасьцю і этнічна-культурнай беларускасьцю. Радзік ні

слова не гаворыць пра ўплыў украінскага нацыянальнага руху на фармаваньне нацыянальнага сьветапогляду Багушэвіча і тым самым паказвае павярхоўнасьць свайго знаёмства з творчасьцяй гэтага “пратаганіста беларускасьці”.
Тымчасам Багушэвічаву рэдакцыю беларускага нацыяналізму памылкова зводзіць толькі да польскіх інсьпірацыяў. Злучальным вязьмом паміж “беларускім” і “польскім” нацыяналізмам Багушэвіча быў беспасярэдне — зь першакрыніцы — успрыняты, пераняты і разьвіты ўкраінскі досьвед нацыятварэньня. Тое, што Багушэвіч добра ведаў украінскую мову і наагул цікавіўся ўкраінскім жыцьцём, пацьвярджае ў сваіх успамінах, датаваных 1938 годам, і ўкраінскі нацыянальны дзеяч першай паловы XX стагодзьдзя Дмітро Дарашэнка, які падчас навучаньня ў Віленскай гімназіі ў 90-х гадах XIX стагодзьдзя колькі разоў сустракаўся з Багушэвічам*.
Украінскі ўплыў адбываўся ня толькі на Багушэвічаву паэзію, але і, шырэй, на фармаваньне яго сьветагляду. Але на паэтычным узроўні яго прасачыць значна прасьцей, бо тут ён падмацоўваецца фактамі. Прафэсар Мюнстэрскага ўнівэрсытэту Фрыдрых Шольц** пераканаўча давёў уплыў вэрсыфікацыі Тараса Шаўчэнкі на вэрсыфікацыю Францішка Багушэвіча. Ёсьць таксама мноства іншых сьведчаньняў таго, што станаўленьне Багушэвіча як “пратаганіста беларускасьці XIX стагодзьдзя” адбывалася пад моцным украінскім уплывам.
На заканчэньне сваёй манаграфіі Радзік вызначае прычыны слабасьці беларускага нацыянальнага руху (адна зь іх выглядае ў яго трактаваньні так: мадэрны беларускі нацыяналізм узьнік у асяродзьдзі каталіцкай шляхты, якая захоўвала і сацыяльную, і рэлігійную дыстанцыю ад пераважна сялянскага і праваслаўнага беларускага насельніцтва) і дае змрочную ацэнку яго сучаснага стану: культурна Беларусь застаецца значна бліжэйшая Расіі, чымся Польшчы, бо беларускія эліты так і не збудавалі сучаснай беларускай нацыі.
Нягледзячы на пэўны навуковы канфармізм і пэўную канцэптуальную праблематычнасьць (аўтар разглядае неклясычны беларускі нацыяналізм у духу Аляксандра Лукашэнкі як крах беларускага нацыяналізму), манаграфія Рышарда Радзіка заслугоўвае высокай ацэнкі з шмат якіх пазыцый. Яна зьмяшчае ўнікальны фактаграфічны матэрыял,

пераважна недаступны беларускім дасьледнікам, вылучаецца мэтадалягічнай стройнасьцю і культурай мысьленьня. Беларусам застаецца толькі зьлёгку пашкадаваць, што першая салідная манаграфія, прысьвечаная беларускаму нацыяналізму, выйшла з-пад пяра польскага сацыёляга і пабачыла сьвет у люблінскім выдавецтве ўнівэрсытэту Марыі Складоўскай-Кюры. Зрэшты, беларускі нацыяналізм генэруе такое праблемнае поле, якое ня вычарпаць і дзясяткам падобных манаграфіяў.

7

Мы прасачылі, як эвалюцыянавала ідэя беларускага нацыяналізму ў сьвядомасьці айчынных аўтараў (назавём гэта нацыяналістычным мысьленьнем), а таксама прадставілі пазыцыю польскага інтэрпрэтатара (назавём гэта мысьленьнем пра нацыяналізм). Як і варта было чакаць, беларускі нацыяналізм застаецца праблемным паняцьцем як на ўзроўні тэорыі, так і на ўзроўні практыкі.

Уплывы, якія прадвызначылі кірунак нацыяналістычнага мысьленьня Ўладзімера Арлова і Сяргея Дубаўца, паказваюць, што яшчэ нейкія 10—15 гадоў таму Беларусь цалкам знаходзілася ў зоне расійскага культурнага ўплыву і фактычна ня мела сваёй традыцыі гуманітарнай думкі. Тэксты, створаныя Сяргеем Яршом і Леанідам Лычом, сьведчаць, што пасьля 1991 году Беларусь стала ня столькі незалежнай, колькі самаізаляванай краінай, дзе так і не адбылося абнаўленьня гуманітарнай адукацыі.

Асноўнае разыходжаньне тэорыі і практыкі беларускага нацыяналізму палягае ў тым, што дагэтуль тэарэтычнае асэнсаваньне атрымлівалі далёка ня самыя ўплывовыя яго разнавіднасьці (этнічная, культурная або “эсхаталягічная”). Самы масавы від беларускага нацыяналізму, які залежна ад кантэксту можна акрэсьліць як “крэольскі”, “грамадзянскі” або “эканамічны”, да сёньня ня цешыцца ўвагай і прызнаньнем айчынных тэарэтыкаў. Гэты нацыяналізм не ўспрымае беларускую нацыю як адзінства, заснаванае на крыві і супольнай культуры і якое да таго ж гаворыць на адной мове. Падставай для нацыянальнага атаясамленьня ў гэтым выпадку выступае беларуская дзяржава, яе палітычная юрысдыкцыя і міжнародная правасуб’ектнасьць, іншыя чыньнікі. Фактарам, які мацуе нацыянальную ідэнтычнасьць, тут зьяўляецца

ўсьведамленьне таго, што незалежнасьць Беларусі сапраўды “сьвятая”, бо дазваляе куды больш пасьпяхова рэалізоўваць эканамічныя, палітычныя, культурныя і іншыя інтарэсы краіны. Увогуле, залежнасьць разьвіцьця Беларусі ад яе фармальнага дзяржаўна-адміністрацыйнага статусу зь вялікай сілай увідавочнілася яшчэ за часоў СССР, у якім саюзныя рэспублікі мелі значна больш прывілеяваны эканамічны статус у параўнаньні з аўтаномнымі рэспублікамі або краямі. Незалежная Беларусь асуджаная на пашырэньне нацыяналістычных настрояў. Незавершанасьць іх тэарэтычнага асэнсаваньня нясе, аднак, пагрозу таго, што яны будуць разьвівацца стыхійна і, магчыма, у дэструктыўным рэчышчы. Адкрытым застаецца таксама пытаньне, ці здолее нейкі зь цяпер наяўных разнавідаў беларускага нацыяналізму ў чыстым выглядзе здабыць сабе перамогу або ў будучыні нас чакае яго прыйсьце ў зборным, інтэграваным выглядзе.
Пакуль жа гэтае пытаньне застаецца адкрытым, гаварыць пра нацыянальнае самавызначэньне Беларусі заўчасна.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

Уладзімер Арлоў

* * *

Найперш хачу выказаць Валеру Булгакаву шчырую падзяку за даўнюю прыхільнасьць да маёй літаратурна-мастацкай творчасьці. Якраз гэтае цёплае стаўленьне, як мне ўяўляецца, і змусіла аўтара капітальнай працы “Пра клясычныя і неклясычныя нацыяналізмы” згадаць маё эсэ памерам на стандартную старонку (яно ледзь ня ўсё зь любасьцю працытаванае В. Булгакавым) у адным сьпісе з палітычнымі дасьледаваньнямі, зборнікамі артыкулаў, гістарычна-біяграфічнымі нарысамі ды нават манаграфіяй.
Дагэтуль я сьціпла меркаваў, што імпрэсія “Незалежнасьць — гэта…” (напісаная ў 1990-м для адмысловага выпуску газэты “Свабода”, які прысьвячаўся ўгодкам абвяшчэньня БНР) — ня больш як своеасаблівая ўлётка. Напэўна, мяне ўвёў у зман літаратуразнаўца Міхась Тычына, які ў свой час залічыў згаданы тэкст менавіта да гэтага “жанру”.
Падыход В. Булгакава мне імпануе, безумоўна, значна болей, хоць, трэба прызнаць, свае аргумэнты мае і М. Тычына. Іначай “Незалежнасьць…” наўрад ці хуценька пераклалі б на дзясятак моваў, а потым, як кануў у нябыт СССР, з дазволу, а пераважна

без дазволу аўтара надрукавалі ці не ва ўсіх айчынных выданьнях (апагеем гэтага трыюмфальнага шэсьця сталася публікацыя ў газэце “Піянэр Беларусі”).
“Бальшыня “замалёвак з будучыні” Арлова… — цалкам слушна адзначае В. Булгакаў, — *ужо сёньня ўспрымаецца зь вялікай доляй іроніі”*. У сваю чаргу заўважу, што аўтар трактату пра нацыяналізм таксама надзелены шчасьлівым талентам ужо сёньня выклікаць шмат якімі цьверджаньнямі ня меншую долю іроніі. Чаго варты хоць бы бліскучы пасаж пра тое, што *“Арлоў выбудоўвае сваю нацыяналістычную ўтопію, не ўсьведамляючы, што яе правобразам выступае сучасная яму марксысцка-ленінская камуністычная тэлеалёгія зь яе аднесеным у неакрэсьленую будучыню грамадзтвам усеагульнага дабрабыту, у якім будуць вырашаныя асноўныя палітычныя, сацыяльныя, нацыянальныя і іншыя супяэчнасьці…”* Тут Булгакаў, апрача ўсяго, спрытна прыкідваецца былым двоечнікам, які ніколі ня чуў, што ўтопіі бываюць ня толькі камуністычныя і што да Маркса — Энгельса — Леніна пра “сьветлае заўтра” ўтрапёна марылі, да прыкладу, новазапаветныя апосталы. (Дарэчы, гэтаксама спрытна ён робіць выгляд, быццам ня ведае пра існаваньне Зянона Пазьняка ды ягоных працаў па нацыянальным пытаньні.)
Альбо возьмем назіраньне В. Булгакава, датычнае афрыканскіх краінаў, якое вытанчана праектуецца на беларускую сытуацыю. Аказваецца, ня дзе-небудзь, а якраз у Афрыцы *“здабыцьцё незалежнасьці ад мэтраполіі… за рэдкім выняткам адзначалася рэзкім пагаршэньнем узроўню жыцьця”*. Чытачу, маўляў, добра вядома, як квітнеюць Малдова або Арменія ці Ўкраіна. (Немаведама чаму прыходзіць на думку сьветлай памяці “Бум-Бам-Літ”, сябры якога зацята зьбіралі грошы на вандроўку ў шматпакутную Афрыку.)
В. Булгакаў элегантна падштурхоўвае чытача да высновы, нібыта Арлоў разам зь іншымі беларускімі інтэлігентамі верыў, што *“крызыс камуністычнай ідэалёгіі ў краіне, у якой адсутнічаюць традыцыі палітычнай культуры,* ***мэханічна*** (выдзелена мной — **У. А.**) *прывядзе… да эўрапеізацыі нашай Бацькаўшчыны”*. Калі ж надзеі на *“завоблачныя ганарары”* ды ўсе іншыя даброты, што мусілі мэханічна абрынуцца на галовы наіўна-дурнаватых інтэлігентаў, чамусьці ляснуліся, яны (а канкрэтна, як піша В. Булгакаў, *“былыя трыбуны БНФ і аракулы*

ТБМ”) узялі ды *“масава адышлі на пэнсію або выехалі ў эміграцыю, пераквалiфікаваліся ў работнікаў трэцяга сэктару ці нават звычайных школьных настаўнікаў”*.
Паколькі я ні ў водную зь пералічаных катэгорыяў ня трапіў, наважуся выказаць страшную здагадку. Можа, якраз гэтыя настаўнікі-перараджэнцы, дапамагаючы “лукашэнкаўскай прапагандзе”, і ўбілі ў масавую сьвядомасьць (а за адным разам, як выглядае, і ў сьвядомасьць самога В. Булгакава) “знак роўнасьці паміж паняцьцем “беларускі нацыяналіст” і *“фашысцкі паслугач-калябарант”*. Апрача нас, маладзейшых, пашанцавала ці не аднаму К. Каліноўскаму, які таксама здолеў разьмінуцца зь нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў часе.
Але тут пачынаецца ўжо зусім іншая гісторыя.

Сяргей Дубавец

* * *

Нацыяналізм як самастойны прадмет гутаркі ў цяперашнім часе не намацваецца. Таму тэма, заяўленая ў назьве артыкулу, гучыць рудымэнтарна, “як за савецкім часам”. Такая пастаноўка пасавала б сёньня хіба новаму Эжэну Ёнэско. На маю думку, ператварэньне Беларусі ў незалежную краіну, у суб’ект палітыкі, эканомікі, культуры люстэркава сталася ператварэньнем нацыяналізму з назоўніка ў прыметнік. Таму я прачытваю загаловак дадзенага тэксту як “клясычнае і неклясычнае” *сваё,* або *беларускае*. Менавіта ў такім ракурсе могуць разглядацца нацыяналістычныя праявы ў эканоміцы, палітыцы ды іншых сфэрах жыцьця краіны і нацыі. Мы кажам пра тое, якім чынам выяўляецца сваё, беларускае ў параўнаньні з чужым, замежным: ва ўзаемадзеяньні з чужым, замежным і ў супрацьстаяньні з чужым, замежным. Нацыяналізм становіцца суб’ектам дасьледаваньня, калі існуе процілеглы суб’ект акупацыі ці каляніялізму. Але калі *няма* гэтага другога, *няма* і першага. Верагодна, беларускі нацыяналізм можа стаць

суб’ектам на супрацьлеглым баку глябалізацыі. Але і такі суб’ект сёньня ў Беларусі не намацваецца. Зрэшты, думаю, гэта быў бы ўжо і іншага кшталту нацыяналізм.
Ня так даўна, год ці два таму, мне даводзілася “актуалізаваць” беларускі нацыяналізм у цяперашнім часе зьмененае краіны і істотна зьмененага сьветапогляду нацыі, калі слова “нацыяналізм” перастала “пісацца крывёю сэрца” і запатрабавала больш адэкватнага і зразумелага тлумачэньня. Менавіта каб вярнуць яму намацвальнасьць, я і прапанаваў атаясаміць яго з арыстакратызмам. Але арыстакратызм ня можа быць ні клясычным, ні неклясычным. Вось жа і сучасны нацыяналізм, у маім разуменьні, не адгукаецца на гэтыя характарыстыкі.
Што да прапанаванага артыкулу, дык выбар тэкстаў для яго, магчыма, надаваўся б для рэтраспэкцыі “нацыяналістычнае думкі” ў Беларусі (ніяк не сучаснасьці), калі б ня быў настолькі хаатычны. Да прыкладу, імпрэсія У. Арлова, абсалютна пачуцьцёвая і вартая разгляду хіба з гледзішча паэтыкі (ніяк не паліталёгіі). А біяграфічныя нарысы А. Лукашука і С. Ярша маюць значэньне толькі як такія і мусілі б разглядацца ў доўгім шэрагу падобных з гледзішча найноўшае гісторыі, а не, зноў жа, паліталёгіі. Неадэкватнасьць тут такая самая, як бы гэты прапанаваны тэкст уключыць у аналіз беларускага балету ці беларускай сьвінагадоўлі.
Неўспрыманьне жанравай спэцыфікі робіць аўтара сьмешным і тады, калі ён разглядае мае публікацыі. Дзіўна, што ў сыстэму агляду “беларускага нацыяналізму” ня трапілі пасажы пра тараканаў, якія лётаюць у цемры, або пра гіпсавыя скульптуры Ніцшэ, што часьцяком трапляюцца на вочы ў Менску. Тое, што пішацца ў канонах паэтыкі, ніяк не надаецца для паліталягічнага разгляду. Тут спроба спалучыць неспалучальнае бясконца разбурае сам прапанаваны тэкст — прыводзіць аўтара да падмены паняткаў, блытаніны ў фактах, а ўрэшце — да сьведамага скажэньня іх. Толькі адзін прыклад. Аўтар піша: “...у 2002 годзе Сяргей Дубавец будзе заклікаць да асьцярожнага супрацоўніцтва з лукашэнкаўцамі ў справе абароны беларускай незалежнасьці”. Праўда, на тое, каб сьцьвердзіць гэта, цытаты не знайшлося. А калі б яна пашукалася, знайшоўся б цэлы мой артыкул, дзе я кажу пра недапушчальнасьць супрацоўніцтва з рэжымам. Ніякага

супрацоўніцтва! Спаборніцтва — так. Гэта значыць, барацьба ў набліжэньні, змаганьне за вынік, а не супрацоўніцтва альбо глухое адмаўленьне.
На жаль, амаль кожная “інтэрпрэтацыя” аўтарам артыкулу маіх тэзаў (і тэзаў маіх калегаў) мае такі непразарлівы, няўважлівы, неахайны, а ў выніку хлусьлівы выгляд. Аўтар раз-пораз уступае ў нібыта палеміку з аб’ектамі свайго агляду, дзе асноўныя яго аргумэнты зводзяцца ўрэшце да неадпаведнасьці той “інтэлектуальнай базы”, на якой ствараюць свае тэксты абраныя для аналізу аўтары. Выглядае, што такая выснова і была галоўным стымулам напісаньня артыкулу, але, на жаль, не прагучала годным пераможным фіналам аўтарскага тэксту. Дзясяткі выпадковых пасылаў, невыразных закідаў і неразьвітых намёкаў накрылі ўрэшце тую выснову густою балотнаю раскаю, прымусіўшы мяне згадаць дэфініцыю жанру артыкулу, завучаную некалі на тэорыі журналістыкі: *артыкул* — гэта яснае разьвіцьцё строга пэўнай думкі.

Сяргей Ёрш

Чытач сам разьбярэцца, хто мае рацыю

У сваім артыкуле “Пра клясычныя і неклясычныя нацыяналізмы” Валер Булгакаў спрабуе ўзьняць сапраўды вострыя, дыскусійныя тэмы. Ён слушна заўважае, што “*незалежная Беларусь асуджаная на пашырэньне нацыяналістычных настрояў*”, але тэарэтычнае асэнсаваньне іх не завершана. Вазьму на сябе сьмеласьць зазначыць, што яно, фактычна, толькі пачалося. Спробы некалькіх “*айчынных тэарэтыкаў*”, у тым ліку некаторых з названых Булгакавым ды самога Булгакава, на жаль, не дацягваюць да належнага ўзроўню. Сапраўды, у “*нявырабленасьці і непрывабнасьці нацыянальнай ідэалёгіі*” вінаватыя самі нацыянальныя ідэолягі,

шмат хто зь іх зьдзіўляе бездапаможнасьцю і просталінейнасьцю. Застаецца спадзявацца на зьяўленьне ў найбліжэйшай пэрспэктыве новых імёнаў, тэорыяў, працаў. Спынюся, аднак, на “выкрытай” В. Булгакавым “*нацыяналістычнай стратэгіі гераізацыі нацыянальнай мінуўшчыны*”, якая нібыта была заснаваная Аляксандрам Лукашуком, а нядаўна была адроджаная Сяргеем Яршом. На думку Булгакава, праз гэтую стратэгію гераізуюцца “калябаранты” часоў другой сусьветнай вайны. Наагул, тэма калябарацыі, як відаць з артыкулу, захапіла аўтара, і ён раздае ярлыкі “калябарантаў” налева і направа, без абгрунтаваньняў і аналізу гісторыі пытаньня.

Калябарант (ад фр. collaboration — супраца) — чалавек, які супрацоўнічае з акупацыйным рэжымам. Гэта значыць працуе ў акупацыйнай адміністрацыі, паліцыі, служыць у дазволеных акупантамі вайсковых аддзелах. Калябарантамі, аднак, не лічыліся тыя людзі, якія працавалі ў названых структурах, але супрацоўнічалі з падпольлем альбо ад пачатку былі ім туды засланыя.

Напрыклад, паэт Валянцін Таўлай падчас нямецкай акупацыі працаваў у беларускай адміністрацыі, друкаваў свае вершы ў акупацыйных выданьнях, але рэпрэсаваны савецкай уладай ня быў, бо перадаваў зьвесткі спэцгрупе НКГБ. Значыць, быў не нямецкім калябарантам, а савецкім выведнікам. Паэт Іван Міско (Анатоль Іверс) працаваў у Слонімскай раённай управе, але перадаваў інфармацыю савецкім партызанам, таму і яго пасьля вайны савецкая дзяржбясьпека не рэпрэсавала. Настаўніца Еўдакія Казлова працавала ў Беларускай Цэнтральнай Радзе ў Радаслава Астроўскага. Але вынікае, што і яна не калябарантка, бо выконвала заданьне савецкіх партызанаў. І такіх прыкладаў, калі беларускія інтэлігенты супрацоўнічалі ў часе нямецкай акупацыі з савецкай выведкай, шмат.

Адпаведна, нельга лічыць калябарантамі й удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху Супраціву. Вядомы беларускі гісторык Галіна Кнацько яшчэ ў 1994 годзе пісала: “*Беларускае нацыянальнае падполье знаходзілася ў найбольш уразьлівым стане. Нярэдка ягоныя лідэры легалізаваліся, знаходзячыся на службе акупантаў, выношвалі ідэі барацьбы за незалежнасьць*”. (Кнацько Г. Листопадовцы // Народная газета. 1994. 25

жніўня.). Гісторык Юры Туронак ня лічыць калябарантам бурмістра Менску Вацлава Іваноўскага, бо той быў адным зь лідэраў падпольнай Арганізацыі беларускіх нацыяналістаў, дапамагаў польскай выведцы. Ці можна назваць калябарантам Усевалада Родзьку? Ведаючы, што ён быў супрацоўнікам абвэру, служыў бурмістрам Віцебску, быў віцэ-прэзыдэнтам Беларускай Цэнтральнай Рады, афіцэрам БКА, — так. Але ведаючы пра іншы напрамак ягонай дзейнасьці — актыўны ўдзел у нацыянальным антыфашыстоўскім падпольлі, — не. Праблему неабходнасьці падзелу сьвядомых калябарантаў і патрыётаў-падпольшчыкаў яшчэ ў першыя пасьляваенныя гады ўздымалі беларускія публіцысты-эмігранты. “*Беларуская нацыянальная праца павінна была раздвоіцца і пайсьці двумя шляхамі: адзін шлях быў падпольнай работы з мэтаю падрыванья як нямецкай, так і супроцьбеларускай бальшавіцкай акцыі, вядзеньне аружнага партызанскага змаганьня зь немцамі і бальшавіцкімі бандамі, другім быў шлях легальнае работы, каб, пралезшы ў адміністрацыю і іншыя дзялянкі легальнае працы, прыкрываць падпольле, бараніць народ ад фізычнага вынішчэньня і ў любой форме мабілізаваць і вырашчываць нацыянальныя сілы для будучых падзеяў. Гэтае раздваеньне нацыянальнае дзейнасьці было толькі на вонкі, бо фактычна паміж легальнай і падпольнай работай існавала поўнае ўзгадненьне, а часта асобы, што займалі афіцыйныя становішчы, былі адначасна актыўнымі ўдзельнікамі і кіраўнікамі падпольнае работы*”, — пісаў вядомы эмігрыцыйны дзяяч Станіслаў Станкевіч (пад псэўданімам “Язэп Каранеўскі” ў часопісе “Ruch” (Заходняя Нямеччына). 1946. № 1, красавік.).

Гэткую тэму ўздымае і беларускі літаратар, вэтэран нацыянальнага руху Янка Жамойцін з Варшавы ў часопісе “Białoruskie Zeszyty Historyczne” (№ 17, 2002) ды адзначае, што “*ў такой складанай сытуацыі не магло абысьціся бяз здраднікаў, калабарантаў — прыслужнікаў акупацыйнага рэжыму*” (с. 253). Але нацыянальнае падпольле імкнулася абясшкодзіць іх пранямецкую дзейнасьць. Напрыклад, вядомае забойства кіраўніка беларускіх нацыянал-сацыялістаў Фабіяна Акінчыца, піша Жамойцін.

Булгакава засмучае тое, што, “*захапіўшыся адраджэньнем нацыянальных герояў, нашы маладыя ды верныя сыны Бацькаўшчыны самі не заўважылі, якую неацэнную паслугу*

зрабілі лукашэнкаўскай прапагандзе. Лукашэнкаўскія, а да іх савецкія ідэолягі і прапагандысты з ног зьбіваліся, каб убіць у масавую сьвядомасьць беларусаў знак роўнасьці паміж паняцьцем "беларускі нацыяналіст" і "фашысцкі паслугач-калябарант". Але тут ён, як кажуць, трапіў не па адрасе. Насамрэч, пішучы ўжо амаль дзесяць гадоў пра існаваньне падчас нямецкай акупацыі беларускага нацыянальнага руху Супраціву, я гэты міт не мацую, а, наадварот, выкрываю (яшчэ ў 1995 годзе было надрукаванае маё дасьледаваньне "*Беларускі нацыянальны рэзыстанс у гады Другой сусьветнай вайны*" (Пагоня. 1995. № 33, 34, 36, 37). Калісьці ў пачатку 1990-х вялікую шкоду зрабіў (у тым ліку і сабе) адзін дзяяч нацыянальнага руху, калі, з падачы Ю. Туронка, пачаў на сустрэчах з выбарцамі распавядаць пра тое, як прыхільна ставіўся да беларушчыны нямецкі акупант В. Кубэ. У той час украінцы, прыбалты актыўна прапагандавалі гісторыю свайго Супраціву, як антыбальшавіцкага, так і антынямецкага. А ў нас, аказваецца, абаронцам беларускага народу быў гаўляйтэр Кубэ… Некаторыя яго й сёньня згадваюць добрым словам, а шэраг незалежных беларускіх выданьняў масава перадрукоўваюць нямецкія прапагандысцкія плякаты. Зь якой мэтай? Напэўна, яны й самі ня ведаюць. Але факт, што дагэтуль не перавыдадзены беларускі антыфашыстоўскі падпольны друк. Іншы аспэкт праблемы калябарацыі — калябарацыя нацыі, якая на той час ня мела свае дзяржаўнасьці. Безумоўна, неабходныя скрупулёзныя, грунтоўныя дасьледаваньні гэтай тэмы, якіх пакуль у нас няма.

* * *

Валер Булгакаў, галоўны рэдактар часопісу ARCHE, дэманструе сваё дылетанцтва ў друкарскай справе: ён ня можа адрозьніць брашураў, якія выраблены ў друкарні, на рызографе і на "*офіснай друкарцы*". А разгляданыя ім дзьве брашуры "Голасу Краю" выйшлі якраз у легальных друкарнях, хоць і неафіцыйна. Булгакаў закідае гэтай друкаванай прадукцыі "*дылетанцтва і аматаршчыну*". Вядома, супрацоўнікам незарэгістраванага выдавецтва яшчэ не стае досьведу і ведаў, але гэта справа часу (напрыклад, у верасьні 2002-га ў выдавецтве выйшла грунтоўнае дасьледаваньне маладога гісторыка Алеся Гелагаева "Беларускія нацыянальныя вайсковыя фармацыі ў

часе другое сусьветнае вайны”). Галоўнае, што гэтыя маладыя людзі шчыра вераць у свае ідэалы, умеюць арганізаваць працу (ад падрыхтоўкі выданьня да яго рэалізацыі), імкнуцца да яе прафэсіяналізацыі. Дык мо ўсё ж вітаць трэба зьяўленьне новага незалежнага выдавецтва?

* * *

Гаворачы пра нібыта *“сьвядомае перакручваньне і фальшаваньне гістарычных фактаў”* у брашуры, прысьвечанай У. Родзьку, Булгакаў не абцяжарвае сябе прывядзеньнем канкрэтных прыкладаў. Затое дапускае памылкі пры цытаваньні названай брашуры. Так, Булгакаў піша: “*Пасьля акупацыі Нямеччынай Беларусі* [Родзька] *працуе бургамістрам Віцебску, у мэтах, як піша Ёрш, “беларусізацыі гораду… супрацоўнічае з абвэрам (нямецкай вайсковай выведкай і контравыведкай)”*. Насамрэч у арыгінале чытаем: “На Беларусі Родзька… стварае падпольныя групы, вядзе працу па структурным афармленьні БНП. Для прыкрыцьця падпольнай працы ён працуе бурмістрам Віцебску, праводзіць беларусізацыю гораду. У гэтых жа мэтах Родзька супрацоўнічае з абвэрам (нямецкай вайсковай выведкай і контравыведкай)”. Розьніца відавочная. Пайшоў Родзька на супрацу з абвэрам альбо на працу бургамістрам не для таго, каб беларусізаваць Віцебск. Яго паслала туды нацыянальнае падпольле для прыкрыцьця падпольных структураў. І такія недарэчнасьці з цытатамі ў Булгакава здараюцца неаднойчы. Ён піша, што “*аўтар сьвядома адмаўляецца ад навуковай мэтадалёгіі, кладучы ў аснову свайго нарысу не гістарычныя факты, а вусныя аповеды неназваных наратараў*”. Насамрэч брашура грунтуецца ня толькі на ўспамінах удзельнікаў тых падзеяў (аўтары ўспамінаў называюцца, за выключэньнем аднаго), але й на архіўных матэрыялах, якіх Булгакаў адмыслова не заўважыў — яны ня ўпісваліся ў ягоную канцэпцыю. Сама ж брашура меркавалася не як навуковая праца, а як невялікі зборнік дакумэнтаў і ўспамінаў пра адну асобу беларускага нацыяналістычнага руху. Чытач, азнаёміўшыся з дакумэнтальнымі матэрыяламі, мог зрабіць для сябе выснову, хто ж такі быў Родзька, не абавязкова згаджаючыся з пазыцыяй аўтара, выкладзенай у першай частцы брашуры.

* * *

Падымае В. Булгакаў і пытаньне тэрміналёгіі. На ягоную думку, тэрмін “бальшавіцкія акупанты” пазычаны “*зь беларускіх калябарацыйных выданьняў часоў апошняй вайны*”. Бярэ ён пад сумнеў і тэзыс Дубаўца, што “*калі прызнаём французскую або нямецкую акупацыю Беларусі, трэба прызнаваць і расійскую*”. У адрозьненьне ад прыбалтыйскіх вызвольных рухаў, якія пры канцы 1980-х гадоў паднялі сьцяг змаганьня супраць савецкай акупацыі, беларускі нацыянальны рух змагаўся толькі супраць камуністычнага рэжыму ў Менску. Тэзыс пра “расейскі імпэрыялізм” будзе агучаны Пазьняком толькі ў пачатку 1994-га. Але й дагэтуль нацыянальны рух і ягоныя лідэры ня выпрацавалі цьвёрдай пазыцыі што да ацэнкі часу савецкага панаваньня ў Беларусі. Вось і Дубавец піша: “*трэба прызнаваць*”, што была савецкая акупацыя. Дагэтуль не прызналі. Цяпер ужо кажуць — “расейская акупацыя”.

* * *

В. Булгакаў згадвае “*пра анэкдатычную падрыхтоўку антынямецкага паўстаньня Родзькам у чэрвені 1944-га з мэтай абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі*”. Пакінем гэтую характарыстыку на сумленьні аўтара. Падрыхтоўка вясной — летам 1944-га антынямецкага паўстаньня ў Менску Беларускай незалежніцкай партыяй — факт пакуль малавядомы і камусьці можа падасца выдумкай эмігрантаў, якія хацелі апраўдаць сваю дзейнасьць (альбо бязьдзейнасьць) падчас нямецкай акупацыі. Насамрэч факт гэты праўдзівы, пацьвярджаецца дакумэнтальна дзеячамі БНП, арыштаванымі савецкай дзяржбясьпекай. Пакуль гэтыя матэрыялы, якія захоўваюцца ў архіве КДБ Беларусі, не надрукаваныя, спашлёмся на іншыя, ужо выдадзеныя крыніцы. Пра падрыхтоўку да паўстаньня, якое задумаў Родзька, сьведчыць сябра ЦК БНП Барыс Рагуля, які цяпер жыве ў Канадзе. Калі Булгакаў мае недавер да маіх публікацыяў, дык спашлюся на чужы артыкул — “Сем капеек за кулю” (“Наша Ніва” ад 30 чэрвеня 1997 г.). Калі б Булгакаў лічыў Рагулю выдумляльнікам, то наўрад ці друкаваў бы пра яго кнігу, што напісаў Лявон Юрэвіч (Жыцьцё пад агнём. Менск: Бібліятэка

часопісу ARCHE. 1999.). Сьведчаць пра падрыхтоўку да паўстаньня Ўладзіслаў Рыжы-Рыскі, Язэп Сажыч, Віктар Сікора, напісалі ўспаміны сьв. пам. Міхась Зуй і Сяргей Кажан ды інш. Уладзіслаў Рыжы-Рыскі пісаў на эміграцыі: “*Падчас [Другога Ўсебеларускага] Кангрэсу існавалі, як ведама, дзьве тэндэнцыі: афіцыяльная — БЦР і нелегальная — БНП. Беларуская Цэнтральная Рада імкнулася правесьці Кангрэс бяз збройнага канфлікту зь немцамі. БНП-ж мела намер надаць Кангрэсу рэвалюцыйны характар у адносінах да немцаў. Я, як сябра БНП, быў староньнікам другой формы, аднак сёньня, гледзячы на мінулае з далейшай пэрспэктывы, мушу прызнаць, што першы мэтад быў безумоўна адзіным слушным і практычным, бо-ж ашчадзіў нам шмат патрэбных патрыятычных сілаў, якія напэўна былі-б зьнішчаны ў выпадку магчымага канфлікту зь немцамі*” (Незалежная Беларусь (Заходняя Нямеччына). 1953. № 5 (11), чэрвень.).

Сапраўды, ідэя антынямецкага паўстаньня ў Менску належала патрыятычнай моладзі (кіраўніку БНП Усеваладу Родзьку было тады толькі 24 гады), якая рвалася да барацьбы, на барыкады (многія старэйшыя беларускія дзеячы ўжо думалі пра эміграцыю ды сядзелі на валізах). Аднак гэта не была проста ідэя — існаваў распрацаваны плян, з красавіка 1944 году ішла падрыхтоўка. Калі б удалося сьцягнуць у Менск усе баёўкі БНП і некаторыя аддзелы БКА, ачольваныя сябрамі гэтай партыі, то ў паўстаньні ўзялі б удзел некалькі тысяч узброеных чалавек. Гэта мусіла быць найперш прапагандысцкая акцыя: праз захопленыя радыёстанцыі была б перададзеная вестка пра аднаўленьне незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі, пасьля чаго паўстанцы мусілі пакінуць горад, сысьці ў лес альбо загінулі б у баях (сілы былі няроўныя).

Аднак 23 чэрвеня 1944 году пачалася апэрацыя “Багратыён” і савецкія войскі імкліва набліжаліся да Менску. На нарадзе ЦК БНП была прынятая прапанова старэйшых: паўстаньне супраць немцаў дзеля прапагандысцкіх мэтаў не падымаць, каб захаваць свае нешматлікія кадры для антыбальшавіцкай барацьбы. Гэтую прапанову прынялі й маладыя. Антынямецкага паўстаньня не адбылося. Варшаўскае паўстаньне, якое пачалося празь месяц, таксама было асуджанае на паразу. Але ж яно адбылося, і яго не маглі замоўчваць савецкія прапагандысты. Кіруючыся лёгікай Булгакава, можна назваць “анэкдатычным”

абвяшчэньне Радай БНР 25 сакавіка 1918 году дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі. Тады група беларускіх дзеячоў зьдзейсьніла гэты акт, ня маючы вялікай падтрымкі ў грамадзтве і амаль ніякай мілітарнай сілы, ды яшчэ пад нямецкай акупацыяй. Аднак жа сьвяткуем гэты дзень, шануем аўтараў Акту 25 Сакавіка, адзначаем іх сьмеласьць. Дык ня будзем зьдзекавацца зь беларускіх патрыётаў, якія хацелі паўтарыць гэты ўчынак, але не змаглі. Многія зь іх пасьля заплацілі жыцьцём за свой патрыятызм, загінуўшы ад рук немцаў і бальшавікоў.

* * *

Думаю, чытач сам разьбярэцца, хто ліе ваду на лукашэнкаўскі млын: той, хто прапагандуе гісторыю беларускага нацыянальнага антыфашыстоўскага Супраціву, ці той, хто аблівае яго брудам.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (23) – 2002**
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image]
[image]

Бацька паходзіць з Гомельшчыны, з Чачэрску, адкуль прыехаў у Менск 16-гадовым, шукаючы сябе ў журналістыцы і паэзіі. Пісаў расейскаю моваю, якая падавалася яму больш пэрспэктыўнай. Тата займеў шмат прафэсій, бо перабудова прымусіла шмат каго кінуць адзін род заняткаў і заняцца іншым — бізнэсам, напрыклад. Хаця бізнэс — таксама творчасьць. Бацька лічыць сябе паэтам і не пакідае надзеі выдаць тоўстую кніжку. Я — дзіця літаратурных кантактаў, бо старэйшы брат маёй маці таксама складаў вершы. Знаёмства дзядзькі з бацькам на глебе любові да паэзіі прывяло да спатканьня, каханьня і шлюбу маіх бацькоў.

С.К.: А чыё ў Вас прозьвішча?

А.Х.: Бацькава. Беларускае.

С.К.: Тут я ўсьсяду на свайго канька і скажу, што Хадановіч — шляхецкае прозьвішча. Вашыя продкі пацьвердзілі сваю шляхетнасьць нават перад Расеяй у 1831 годзе. А ці ёсьць у Вас маёнтак?

А.Х.: Калі можна лічыць маёнткам двухпакаёвую кватэру ў Менску, дзе я жыву з маці, жонкаю і коткай Глафірай, — такое насельніцтва маёнтку. Дадам яшчэ бабулін-дзедаў дом у Чачэрску, дзе я пасьля Чарнобылю амаль не бываю, а таксама дом жончыных бацькоў у Пружанах, дзе я зьяўляюся пераважна падчас капаньня бульбы.

С.К.: Якім было Вашае дзяцінства? У якую школу хадзілі?

А.Х.: Мяне падалі ў звычайную школу № 113 па месцы жыхарства. Пасьля пераезду пайшоў у 162-ю. Гэта былі школы з французскай мовай навучаньня і спартовай клясай. Я быў ня надта спартовым дзіцем, і мой бацька вырашыў аддаць мяне ў спартовую клясу, каб я рос дужы. А таму я ў дзяцінстве зьмяніў некалькі відаў спорту: розныя віды лёгкай атлетыкі, спартовая хада, акадэмічнае веславаньне, быў крыху знаёмы з нашай алімпійскай чэмпіёнкай Кацярынай Хадатовіч. Сёй-той нават блытаў нас, бо падобныя прозьвішчы. Цяпер яна Карстэн, ужо ня зблытаеш. На фармаваньне майго характару паўплываў той факт, што я адзіны з клясы не выхоўваўся разам з усімі ў адным садку. Я прыйшоў у сфармаваны калектыў, што жыў па сваіх законах і меў строгую гіерархію: была міс гэтай клясы і быў містэр гэтай клясы, як былі й віцэ-містэр зь віцэ-міс, а калі з гадамі зьявіліся першыя закаханасьці, пары ўкладаліся

паводле нябачнай табэлі аб рангах: № 1 мусіў паяднацца з № 1, № 2 — з № 2 і г.д. Мне хацелася гэтыя законы парушаць. Я сімпатызаваў самым прыгожым дзяўчатам. А кляса спрабавала мяне ставіць на месца. Гэта, відаць, таксама адбілася на маім порсткім і ўпартым характары. Раней я шмат каго з аднаклясьнікаў не любіў, а цяпер я стаўлюся да іх з сымпатыяй, бо яны зрабілі мяне такім.

С.К.: Ці былі Вы школьным паэтам?

А.Х.: Рэдка і толькі па вялікіх вонкавых запатрабаваньнях: зрабіць этапную насьценгазэту, выкрыць нейкую грамадзкую язву — кепскія адзнакі ці ляноту. Гэтыя шэдэўры захаваліся фрагмэнтарна ў маёй памяці, але яны проста насьледуюць творчасьці Маршака ці Міхалкова.

С.К.: А калі Вы сталіся, сфармулюйма так, энцыкляпэдычна адукаваным калямбурыстам?

А.Х.: Энцыкляпэдычна адукаваным так і не зрабіўся. Гэта стан, да якога недурны чалавек імкнецца ўсё жыцьцё, а пры канцы жыцьця разумее, што ён нічога не разумее. З калямбурыстыкай так: я імкнуўся быць дасьціпным, любіў браць удзел у слоўных перапалках і цешыўся, калі апошняе слова было за мною. І цяпер цешуся, калі ўдаецца вострым слоўцам раскатурхаць кампанію.

С.К.: Хто зрабіў на Вас найбольшы ўплыў? Я маю на ўвазе і жывых людзей, і асобаў з кніжак: аўтары, героі…

А.Х.: Натуральна, бацькі. Нейкія статыстыкі рабілі ў ЗША апытаньне пра кумірaў. Зь вялікім адрывам на другім месцы ішлі лінкальны і вашынгтоны, а на першым была — МАМА. Я тут нічога не дадам: люблю, багомлю і шаную, хаця не заўжды бываю ўдзячным і выхаваным. Я ня самы просты чалавек для суіснаваньня, у кантактах. Ад мамы я засвоіў, магчыма, не найлепшую рысу: маючы патрабавальнасьць да сябе, маю патрабавальнасьць і да іншых. Літаратурныя куміры… У падлеткавым веку маё кола чытаньня нічым не адрозьнівалася ад чытанкі маіх равесьнікаў: прыгодніцкія раманы Майн Рыда, Жуля Вэрна, Аляксандра Дзюма-старэйшага. Пры канцы 70-х выбухнуў савецкі блякбастэр “Д’Артаньян і тры мушкецёры”, і ў старшых групках садка ўсе гулялі ў мушкецёраў.

С.К.: Я дык была Атосам. А Вы?

А.Х.: Камплекцыя падказвае, што мне найчасьцей даставалася роля Партоса, хаця роля Атоса па жыцьці мне значна

бліжэйшая, а пачэрпнутая зь фільму фраза “Для Атоса это слишком много, а для графа Де Ля Фер, увы, слишком мало” дагэтуль у маім слоўніку, ёю я тлумачу адмовы ад нейкіх спакусьлівых прапановаў. Страшэнна падабаліся героі спорту, міты, дзе савецкія людзі-волаты дабіваліся рэкордаў. Любіў кніжкі пра бегуноў і весьляроў, якія пераадольвалі сябе, ставячы сусьветныя рэкорды і сьцьвярджаючы сваю чалавечую годнасьць. Наіўны, просты чытач любіць атаесамляць сябе з героем, прымяраць на сябе чужыя залатыя мэдалі. Я падазраю, што і да літаратуры падыходжу як да свайго роду спорту: хочацца пісаць калі ня лепш за ўсіх, то лепш, чым ты рабіў гэта ўчора. Толькі літаратура больш тонкая штука і таму меней справядлівая: у спорце ёсьць шкала, паводле якой вымяраюцца дасягненьні. Мы, літаратары, знаходзімся ў рухомым сьвеце, дзе ўсё страшэнна суб’ектыўна, дзе на цікавых аўтараў гадамі і дзесяцігодзьдзямі не зьвяртаюць увагі. Адна надзея, што праз гады іх адкапаюць у пыльных архівах. Самае жахлівае, што шмат геніяў былі так і ня знойдзеныя. Суцяшэньне адно: напэўна, у тых творцаў ёсьць іншыя чытачы альбо Чытач, і ім вядома болей. Хаця, магчыма, тыя чытачы ці Чытач маюць заняткі больш цікавыя і больш сур’ёзныя, чым прыгожае пісьменства.

Ва ўнівэрсытэце я захапіўся Шарлем Бадлерам. Гэта была жарсьць (сказаць любоў — недастаткова, каханьне зь першай лыжкі). Пасьля я палюбіў усю французскую паэзію сымбалізму канца XIX стагодзьдзя: акрамя Бадлера, гэта Арцюр Рэмбо, Стэфан Малярмэ, таямнічы граф дэ Лятрэамон — абсалютна слушна, выклятыя паэты. Мне падабалася выступаць на студэнцкіх канфэрэнцыях і аналізаваць таемную структуру таго ці іншага французскага верша. Пасьля я паступіў у асьпірантуру, але дасюль не магу разабрацца з дысэртацыяй па творчасьці Бадлера. І ў пэўны момант я падумаў: чаму не паспрабаваць заняцца паэтычным перакладам? Абеларусіць гэта ўсё (а гэта страшэнна не абеларушана: куды ні ткні пальцам — паўсюль белыя плямы). Бадлер — тры-чатыры вершы перакладзена, з Рэмбо — два-тры, хаця “П’яны карабель” існуе ў трох вэрсіях. Больш пашчасьціла Вэрлену — дзякуй Максіму Багдановічу і Алегу Лойку, — але якраз Вэрлен з усіх згаданых паэтаў пакідае мяне амаль абыякавым. Нягледзячы на ўсю сьпеўнасьць, ён для мяне задурнаваты. Паэзія мусіць чараваць

ня толькі формаю — тым, як яна прыгожа чытаецца, пяецца, як насычаная мэтафарамі, — але і сэнсавымі празарэньнямі. Шмат якія беларускія паэты, як Вэрлен, пакутуюць на сэнсавую пустату, якая хаваецца за сьпеўнасьцю, багацьцем формы, маляўнічасьцю. Прызнаюся ў нечым, за што будуць "біць": ніколі ня меў беларускамоўных літаратурных куміраў. Сярод расейскіх паэтаў таксама амаль ня меў, апрача Восіпа Мандэльштама ды Ёсіфа Бродзкага. Дзякуючы маім выкладчыкам і ўнівэрсытэцкім сябрам, я выхоўваўся на замежнай, перадусім заходнеэўрапейскай літаратуры. Тут абавязкова згадаю Галіну Сінілу — Выкладчыцу зь вялікай літары. Ёй удалося сабраць вакол сябе студэнтаў розных курсаў, таленавітых людзей, якія займаліся самай далёкай, самай хімэрнай як для нашых рэаліяў замежнай паэзіяй — да прыкладу, ейнымі ўлюбёнымі Рыльке ці Гёльдэрлінам. На паэтычным сэмінары спадарыні Сінілы я пазнаёміўся з Канстанцінам Міхеевым — мабыць, найлепшым беларускім паэтам сярод тых, хто піша па-расейску. Калі я навучыўся складаць вершы, то я абавязаны гэтым Косьцю.

С.К.: Вы скончылі расейскае аддзяленьне філфаку БДУ. Як атрымалася, што Вы сталі беларускім паэтам?
А.Х.: Шмат якія рэчы я рабіў насуперак, месцамі зь нейкай казьлінай упартасьцю. Напрыклад, у нашай школе клясны кіраўнік неяк распавёў пра глябалізацыю і паступовае зьнікненьне моваў. І што хутка ня будзе беларускай мовы, а застануцца ангельская і расейская, якая будзе панаваць на гэтых абшарах. Тады на ўсіх прадметах я стаў адказваць па-беларуску. Напінаючыся, падбіраючы словы. Потым у мяне было першае каханьне. Дзяўчына жыла ў адным пад'езьдзе зь Зянонам Пазьняком, я сутыкаўся зь ім у ліфце і бачыў непарадны бок гэтага чалавека. Ён абіраўся ў дэпутаты ў нашым раёне. І я хадзіў за апазыцыяй па дварох. Цяпер згадваю пісьменьніка Ўладзімера Арлова з мэгафонам ля рудой барады і пад бел-чырвона-белым сьцягам. Гэта выглядала прыгожа каля вінных аддзелаў у нашым падворку, куды сьцякаліся самыя-самыя простыя людзі. Зянон Станіслававіч не пажадаў абірацца па месцы працы, дзе была больш інтэлігентная публіка, а абіраўся на Герасіменкі і Ангарскай. Мінакі раўлі: "Зяноне, я цябе люблю, дай сказаць у мікрафон!" Ён ставіўся да

гэтага са стаічнай мудрасьцю. Ён тады перамог, і гэта дадало мне беларускай эўфарыі. На пачатку 90-х я да гэтага астыў, бо ўсё гэта сталася мэйнстрымам, беларускасьць пачынала ператварацца ў добры тон. Я бачыў, што людзі пайшлі туды. Наступная хваля беларускасьці накрыла мяне ў сярэдзіне 90-х, у вядомых абставінах. Ізноў хацелася рабіць нешта насуперак: “Ах, так?!” Увогуле, пытаньне беларускасьці шмат залежыць ад абставінаў, якія складаюцца стыхійна: знайшоў падлетак у старшых клясах васьмітомнік Караткевіча ці не? Я яго знайшоў і пасіўна быў гатовы да пераходу. Ёсьць аўтары, якія мусяць быць прачытаныя ў падлеткавым веку, бо потым ня будзе такога моцнага ўражаньня.

Вялікі штуршок мне дало знаёмства зь Юрасём Бушляковым. Мы пазнаёміліся ў Любліне, працягнулі знаёмства ў Варшаве, дзе разам жылі, карыстаючыся з курсаў польскай культуры, стажаў, якія атрымлівалі ад польскіх фундацыяў падтрымкі навукі. У 1996 годзе мы ўдвух месяц пражылі на кватэры ў Жалібожы — раёне Варшавы. Юрась прамаўляў да мяне беларускаю, я адказваў расейскаю. На мяне абрынулася вялізная колькасьць словаў са слоўнікаў Станкевіча, Байкова-Некрашэвіча, Ластоўскага. Пра існаваньне *такое* беларускае мовы я нават не падазраваў. І я гэта пасіўна ўсмоктваў. Юрась, між іншага, працаваў для часопісу “Крыніца”, які тады ня сорамна было чытаць і ў якім ня сорамна было друкавацца. Ён рыхтаваў падборку набэліста Чэслава Мілаша. Юрась цудоўны знаўца польскай і беларускай культуры, але яму было цяжкавата з хімэрным, тонкім Мілашавым рытмам. І мы вырашылі паяднаць свае высілкі — беларускамоўнага знаўцы польскасьці і расейскамоўнага паэта. Гэта як гісторыя пра бязногага і сьляпога, якія разам зладзілі вандроўку. Я дагэтуль люблю перачытваць плён нашых супольных высілкаў — трагічны верш “Campo di fiori” пра лёсы Джардана Бруна і габрэяў варшаўскага гета, таямніча і заканамерна паяднаныя ў адзін вузел Мілашам. І па гэтым мяне “прабіў” Мілашаў верш “Родная мова”. Вядзецца ў ім пра польскую мову як апошні прытулак эмігранта. Там ёсьць просьценькі кранальны радочак: “Можа, гэта я мушу цябе ратаваць?” Я разумею, што гэта гучыць, можа, сьмешна, патасна і беспадстаўна, але… Вечарамі мы зь Юрасём любілі разважаць пра сваё, беларускае, і мне падалася нейкай крывой мая пазыцыя назіральніка. Нібыта

прыязнага, але пабочнага. Прасьцей за ўсё казаць: “Казлы, дурні, ня могуць зрабіць нармальную краіну, не сфармавалася інтэлігенцыя, няма нармальных інтэлектуалаў і нармальнай апазыцыі. Усё дрэнна, і літаратура пакідае жадаць лепшага”. Але што ты асабіста зрабіў, каб сытуацыя палепшала? Я сам сабе гэта пытаньне задаў, і яно эмацыйна мяне ўразіла. Апошняй кропляй сталіся кантакты з паэтам Сержам Мінскевічам. Мы жылі ў суседніх дамох на Ангарскай, цягам вучобы ва ўнівэрсытэце ведалі адзін пра аднаго, але не віталіся, стоячы побач на прыпынку. Згадваецца Блок: “Там жили поэты, и каждый встречал другого надменной улыбкой…” Абодва, здаецца, трымаліся невысокай думкі адзін пра аднаго, пакуль не сутыкнуліся ў той самай Варшаве ў тым самым 1996-м. Некалькі месяцаў мы перабывалі ў адным пакоі зь Сержам, чалавекам страшэннай эксцэнтрычнасьці, выбуховага тэмпэрамэнту, слупом Бум-бам-літу, як ён сам сябе называе. І я часам слупянеў, знаёмячыся зь ягонымі творамі. Ён іграў свае песьні, якія я з другога разу запамінаў, чым яго дзівіў. Ён і быў апошняй кропляй у мой чэрап. Дарабіў зь мяне беларуса досыць брутальна: не папярэдзіўшы мяне, ён праз тэлефон дамовіўся, што разам зь беларускім бардам Андрэем Хадановічам паедзе з выступамі па Беласточчыне. Ніякага беларускага барда Хадановіча не існавала, я за жыцьцё не напісаў ніводнага беларускага радка. А тут мусіў за пару дзён прыдумаць сабе рэпэртуар на паўканцэрту. Давялося напісаць некалькі песень і вершаў, пару зь якіх мяне да гэтага часу цешаць. Яны атрымаліся ўдалымі нагэтулькі, што мне захацелася займацца гэтым далей. Мы павінны былі выступаць у Гайнаўскім ліцэі й Беластоку. Пасьля я даведваюся, што беластоцкі канцэрт мусіць адбыцца ў przedszkolu — дзіцячым садку, для пяці- шасьцігадовых слухачыкаў. Для іх я напісаў антыкалыханку “Кажаны, або Калыханка для дрэнных дзяцей”. Праўда, я напалохаў іх значна меней, чым яны мяне сваёй колькасьцю. Але мы з кажанамі вытрымалі. Слухачыкі аказаліся шалёна мілымі, песьня была рытмічная, і дзеткі (не такія затарможаныя і закамплексаваныя, як нашы малыя і дарослыя) зь першых тактаў пачалі брацца за ручкі і разгойдвацца. Не хапала толькі запальнічак.

Я не дакончыў музычнае школы. Скласьці мэлёдыю мне складана. Таму я займаюся інтэлектуальным крадзяжом —

бяру гатовыя мэлёдыі і раблю новы тэкст. Апошнім часам ад мяне церпіць клясыка сусьветнага року: мы разам зь Сержам стварылі альтэрнатыўны варыянт беларускага гімну на мэлёдыю “Yellow submarine”. Тэкст вельмі просьценькі і кранальны, у духу Барадуліна (“*Я ведаю, што ён ужо гатоў — Указ чарговы, як заўсёды, сьмелы, — Што трэба перафарбаваць буслоў, Бо кожны бусел — бел-чырвона-белы”*), дык прыпеў — там, дзе *“елаў сабмарын, елаў сабмарын”,* — будзе: *“Бел-чырвона-белы бусел-патрыёт разам з намі крочыць у паход”.* Пасьля зьяўляецца бел-чырвона-белы вожык-патрыёт, а тады бел-чырвона-белы трактар-патрыёт і ў пераможным паходзе вядзе за сабою ўсіх беларускіх энтузіястаў. Чамусьці мы зь Сержам сьціпла не прапанавалі свайго цудоўнага твору на гімнавы конкурс.

Яшчэ я скарыстаўся мэлёдыяй “Гатэль Каліфорнія”, а тэкст з кавалачкаў сабраў — з самых падставовых, вядомых са школы цытатаў. Заміж *“Welcome to the hotel California”* пяецца *“Мой родны кут, як ты мне мілы!”* і г.д. Аднак гэта хутчэй хобі. Мой галоўны занятак — вершаскладаньне й пераклады.

З прыемнасьцю згадваю сваю працу ў “Крыніцы”. Як я любіў яе ранейшую! Фармат А4 і — Богам абраны народ ня дасьць схлусіць — тэксты бы ў Талмудзе: усярэдзіне — асноўны тэкст, унізе — камэнтар да тэксту, на маргінэзе — камэнтар да камэнтару. І, чытаючы на адной старонцы тры розныя тэксты, ты атрымліваў патрэбную стэрэафанічнасьць жывой культуры! І была сыстэма постацяў: аўтар прэзэнтаваўся з усіх бакоў, ня толькі ён сам, але і пра яго, поруч зь перакладамі можна было друкаваць свае літаратуразнаўчыя спробы.

Я ўдзячны лёсу за знаёмства з Валянцінам Акудовічам, якога, з аднаго боку, быццам няма, а зь іншага — куды ні ткніся, паўсюль Акудовіч: у эсэістыцы — калі ласка, у філязофіі — калі ласка, выкладчык Беларускага калегіюму, самы вядомы ў Менску кладаўшчык, што працуе на складзе турыстычнага інвэнтару! Інтэлектуалы ходзяць у паломніцтва на той склад на рагу Машэрава й Мельнікайтэ. Я з гэтай нагоды нават лімэрык колісь накрэмзаў:

У мазгох мысьляра зь Мельнікайтэ
Розных думак ляжаць мэгабайты.
Сёньня мае выклад —

Кліча вучняў на склад,
І “арбайтэн, арбайтэн, арбайтэн!”
Вось жа, Акудовіч — інтэлектуал, якому ня трэба тлумачыць, навошта нам яшчэ ў дадатак да беларускай — замежная паэзія. Ён стаўся правадніком маіх ідэяў у “Крыніцы”, дзякуючы якому я за паўгоду высілкаў намаляваў постаць Шарля Бадлера, з маімі перакладамі, потым — постаць Уільяма Батлера Ейтса, што мы рабілі разам з маёй жонкаю Марынай (яна дасьледуе ангельска-ірляндзкую паэзію). Потым былі Стэфан Малярмэ і Эзра Паўнд, апошні аб’яднаў высілкі некалькіх інтэлектуалаў: Міхась Баярын, гермэтычны паэт, пераклаў некалькі блізкіх яму кантас Паўнда, да працы спрычыніўся жывы клясык беларускага перакладу Лявон Баршчэўскі, я прыклаў свае сьціплыя намаганьні.

С.К.: Мяне ўражвае, што такі залаты часопіс меў наклад у межах тысячы асобнікаў. Спажыўцоў беларускага культпрадукту ня так шмат, як хацелася б. Ні славы, ні грошай на беларускай культуры не заробіш. Дый перакладаюць няшмат. Ці не было Вам спакусы ўкінуцца ў іншую культуру ды асвойтацца там?

А.Х.: Я б не атаясамліваў спажыўцоў беларускага слова з носьбітамі беларускага слова. Тое, што ствараю я, адрасавана адукаваным вар’ятам, якія захавалі патрэбу ў паэзіі. Я думаю, ладная частка маіх чытачоў у жыцьці карыстаюцца расейскаю мовай. Дый хто сказаў, што не перакладаюць? Сёньня існуе моцны адмоўны стэрэатып, што мастацкае слова і слоўная мастацкая камунікацыя — непэрспэктыўны жанр: ёсьць тэлевізія, Інтэрнэт, і ўвогуле ўсё паб’е рэкляма, як сьцьвярджае Пялевін. Але ёсьць людзі, якія захавалі сантымэнт да чытаньня — прычым не з экрана манітора, а трымаючы кніжку ў руках. І, як выяўляецца, можна змагацца са стэрэатыпам пра нізкі прэстыж слова, і ў прыватнасьці, беларускага слова. Гэта ж ня тая паэзія, якая намуляла нам яшчэ ў школе дый да таго ж была сапсаваная кепскімі настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры (дзякуй Богу, мяне гэты лёс мінуў). Ёсьць патрэба ў літаратуры, якая функцыянавала б як жывая зьява. З чаго наша літаратура пачыналася? З травэстыйных, бурлескных паэм, перапрацовак высокіх сюжэтаў, зь перакуленага з ног на галаву Вэргілія й “Тараса на Парнасе”, які менш за ўсё скардзіцца на сваю долю ці змагаецца за лёс беларускай мовы.

Дзякуй тым, хто запачаткаваў такую літаратуру. Але далей пачаліся суцэльныя “Лісты з–пад шыбеніцы”, суворыя творы барацьбітоў і змагароў. Здавалася, што, калі ты сёньня пачнеш ствараць такія вершы, заўтра па цябе прыйдуць. А літаратура мае ўласьцівасьць праграмаваць лёс аўтараў. У нашай краіне, што праўда, дагэтуль тэрарызуюць аўтараў і пісьменьнік можа адседзець у вязьніцы за слова. Але, тым ня менш, хаця ў мяне ёсьць палітычная пазыцыя, я выказваю яе інакш. Усё адно мяне больш цікавіць сьмехавая рэакцыя публікі, іронія і самаіронія творцы, разбурэньне стэрэатыпаў, расштурхоўваньне чытачоў. Таму кніга, якая выйшла ў мяне пару месяцаў таму па-ўкраінску, мае падкрэсьлена палемічную назву. Досыць “Лістоў з-пад шыбеніцы”, няхай жывуць “Лісты з-пад коўдры”. Лірычны герой набывае негераічнае аблічча. Гэта герой у сваім прыватным існаваньні. Гэта чалавек, які прамаўляе важныя, унівэрсальныя рэчы, але бяз патасу, адначасна іранізуючы з важнасьці ці псэўдаважнасьці сваёй паставы.

Я ўвогуле, мабыць, унікальны беларускі аўтар, бо яшчэ ня выдаў кніжкі па-беларуску, а ўжо маю кніжку па-ўкраінску. Кіеўскае выдавецтва “Факт” рызыкнула, і рызыка, здаецца, апраўдваецца, бо падчас сэрыі прэзэнтацыяў у Івана-Франкоўску, Львове, Кіеве (маю да Харкава шчэ даехаць) шыхтаваліся чэргі па аўтографы, людзі куплялі за свае кроўна зароблены грыўні гэтую кніжачку. Спадзяюся, выдавецтва акупіць свае высілкі і грошы.

Мне ўдалося зьбіць вакол сябе “нявелькую, але бардза пажондную” кампанію, якая ўлучае ў сябе найбольш знанага ўкраінскага пісьменьніка Юр’я Андруховіча, што напісаў прадмову пад назовам “Андрэй Хадановіч, або Перавагі акупацыйнага рэжыму” (меншая палова прадмовы — пра Хадановіча, а большая — пра перавагі акупацыйнага рэжыму). У маёй кампаніі — лідэр маладой украінскай паэзіі Сяргей Жадан, шмат у чым блізкі мне (украінскія рэцэнзэнты называюць мяне беларускім Жаданом), клясык перакладу Максім Стрыха — апошнім ягоным перакладам была “Боская камэдыя” Дантэ, цяпер вось “Лісты з-пад коўдры” Хадановіча. Някепская кампанія. Гэта таксама таленавітыя львоўскія паэты Іван Лучук і Мар’яна Саўка, кіяўлянка Дзьвінка Маціяш, якая зрабіла агульную рэдактуру і была рухавіком усяго праекту.

Гэта Ўладзімер Арлоў, уласнай пэрсонай, што напісаў верш-пасьлямоўе “Мне прысьніўся Хадановіч”, які выклікаў нязьменныя выбухі рогату на кожнай прэзэнтацыі. Гэта Пабла Пікаса, чыя карціна апынулася на вокладцы.
Крыху адрэдагую Багушэвіча: беларуская паэзія “такая ж людзкая” і можа быць цікавай каму заўгодна. Справа ў недастатковай прамоцыі ды ў расхістанасьці кантактаў. Ня трэба чакаць, калі Саюз пісьменьнікаў пачне цэнтралізавана займацца выпускам анталёгій ды арганізацыяй супольных фэстываляў. Творчыя людзі самі павінны знаходзіць адзін аднаго, пагатоў цяпер Інтэрнэт дае такія магчымасьці. Істотна, каб аўтар з пэўнай краіны знаходзіў за мяжою аднадумцаў — людзей, зь якімі ён мог бы ажыцьцяўляць супольныя праекты, якіх ён перакладаў бы і якія перакладалі б яго. Супастаўнага сабе творцу — талентам, інтарэсамі, сьветапоглядам, каб абодва атрымалі перакладніцкі кайф. Элемэнтарны прыклад: я плённа перакладаю Сяргея Жадана, лічачы, што такім чынам узбагачаю беларускую паэзію. Ён робіць тое ж самае, што беларускія вэрлібрысты, але трошачкі лепей. Думаю, калегі ў Беларусі з прыемнасьцю прачытаюць паэтычныя тэксты Жадана й, магчыма, скарыстаюць зь ягонага досьведу.
С.К.: Як Вы думаеце, што азначае гэтае нашэсьце трыццацігадовых? Маю на ўвазе — у ачольнікі літпрацэсу. Андрэй Дынько ачоліў ПЭН-цэнтар, Алесь Пашкевіч — Саюз пісьменьнікаў, Вы са сьцягам і барабанам ведзяце наперад беларускую паэзію…
А.Х.: Ня думаю, што гэта тлумачыцца нейкай заслугаю трыццацігадовых. Гэта хутчэй вынік фантастычнай інэртнасьці, пасіўнасьці сталых літаратараў. І, відаць, шмат хто вырашыў гэтай адказнасьці ўнікнуць. Мае шанаваньні Андрэю Дыньку — чалавеку, які менш як у трыццацігадовым веку выявіўся найсталейшым і найдаросьлейшлым, і якімі ж пасіўнымі выглядаюць на ягоным фоне яго старэйшыя калегі! Гэта дакор той праслойцы, якая існуе паміж нашымі найстарэйшымі й наймаладзейшымі літаратарамі. Найстарэйшыя прызвычаіліся несьці адказнасьць. А пакаленьне сарака- … пяцідзесяцігадовых проста выпадае. Болей на гэтае месца ніхто не прэтэндаваў. Тое ж самае з Алесем Пашкевічам. Ягоныя калегі здрэйфілі: маўляў, хай маладыя набіваюць гузакі, а мы пасьля першыя тыцнем пальцамі — “Якія ж яны няздары!”.

С.К.: Як Вы лічыце, ці ёсьць шанец, што замест некаторых абрыдлых постацяў са школьных хрэстаматыяў зьявяцца новыя, найперш маладыя творцы?

А.Х.: У гэтым сэнсе я зайздрошчу ўкраінскім калегам. Мае раўналеткі патрапілі ў школьныя праграмы. Ці будзе гэта ў нас? У нас маладосьць выглядае падазрона і заганна. Пісьменьнік да пяцідзесяці гадоў ходзіць у пачаткоўцах. А пасьля як пачатковец са стажам атрымлівае пэнсію. Вось апошні артыкул, які я чытаў пра сябе, названы маім радком "Хрызаліда, кукалка, каўшанка". У ім уся крытыка зводзіцца да таго, што я малады: вось пачакайце, ён выправіцца, прыйдзе тая сталасьць, тыя глыбіні. А цяпер ён плэйбой ад шыкоўнага рыфмаваньня і экстравагантных паэтычных паводзінаў. Але маладосьць, як вядома, — загана, якая хутка мінае. Я зычу ўсім трыццацігадовым калі мяняцца, то ў лепшы бок.

С.К.: На адным з форумаў напаткала рэпліку, што Вы для беларускай літаратуры граеце тую ж ролю, што для расейскай адыграў Пушкін. Маўляў, да яго былі няўцямныя паэты кшталту Сумарокава ці Кантэміра, а пасьля Пушкіна ўсё пайшло як трэба…

А.Х.: Дзякуй беларускім форумам! Сьціпла не адкажаш! Па-першае, я вельмі шаную папярэднікаў. Я фармаваўся пад іхнім уплывам, тым ня менш аддаю бязьмежную даніну пашаны народнаму паэту Беларусі Рыгору Барадуліну, Алесю Разанаву, з пашанай стаўлюся да філязофска-мэдытацыйнай лірыкі Алега Мінкіна, Ігара Бабкова, да Міхася Баярына, які маладзейшы за мяне, але раней стартаваў у літаратуры і застаецца адным з найцікавейшых аўтараў. Калі б я адгадаваў нейкія кучаравыя бакенбарды, то стаўся б трохі больш падобны да Пушкіна, а калі ўжо доўжыць гэты шэраг параўнаньняў, то Баярына можна назваць Лермантавым — пагатоў ён Міхась, сын Юр'я. Для мяне Міхась Баярын ёсьць паказьнікам максымальна дазволенага паэту гермэтызму (як Стэфан Малярмэ ў Францыі). Калі я чытаю такі сэнсава насычаны й перанасычаны верш, я думаю: вось да гэтай мяжы ісьці можна, а далей — стоп, пачынаецца поўная няўцямнасьць. Канчаткова разрываць кантакт паміж тымі, хто піша, і тымі, хто чытае, — мне здаецца, няварта. Добра, што ў нашай літаратуры зьявіўся такі аўтар, максымальна дыстанцыяваны ад чытачоў і слухачоў. Але далей такая дыстанцыя, на маю сьціплую думку, павінна

скарачацца. Калі ж зусім сур'ёзна, то параўнаньне дзьвюх такіх розных літаратур — беларускай і расейскай — непазьбежна "кульгае". Пушкін — зьява ўнікальная й самадастатковая і ніякіх супастаўленьняў не патрабуе. Чаму б і Хадановічу не нагадваць выключна… Хадановіча?

С.К.: Ці запрашаюць Вас на тэлевізію вершы пачытаць, сябе паказаць…

А.Х.: Мабыць, я не тэлегенічны. Калі разумею, што мяне здымаюць, мне адразу хочацца здавацца ня тым, кім я ёсьць насамрэч. Да таго ж я ня ўпэўнены, што нашая тэлевізія — гэта той магічны ліхтар, да якога з усіх бакоў лятуць матылькі, згараючы ад любові да беларускага тэлебачаньня. Нядаўна я вярнуўся зь Вільні й Друскенікаў, дзе быў на фэстывалі "Паэтычная восень". Я наведаў свайго сябра й раўналетка літоўскага празаіка Марыюса Івашкявічуса. Яго, дарэчы, друкавала па-беларуску "ARCHE". Празь некалькі хвілін майго перабываньня ў ягоным доме Марыюс умыкнуў тэлевізар, і я пабачыў яго ўжо ў тэлескрыні. Ну й ну, падумаў я. Літоўская тэлевізія штодня робіць праграмы пра сучасных творцаў, літаратараў, мастакоў, музыкаў — тых, хто ў нас прарываецца на экран дужа эпізадычна. У нас дагэтуль больш любяць нацыянальныя строі, сьпевы фальклёрнага гатунку. Я ў захапленьні ад беларускага фальклёру, але ёсьць іншыя праявы беларускай культуры й мастацтва. Я рэдка бачу сымпатычнага мне Курэйчыка на тэлеэкране, але гэта адна зь першых ластавак. Маладых творцаў ня песьцяць увагай. Яны могуць існаваць на радыё, у газэтах, але БТ — сьвятая сьвятых. Асадзі назад! Вы яшчэ не дарасьлі, трэба спраўдзіць, што з вас будзе. Хай выступаюць шаноўныя патрыярхі — прэзыдэнт скажа сваё слова, літаратар скажа сваё слова — усе ведаюць, якіх літаратараў я маю на ўвазе.

С.К.: Пагаварылі пра Вас як пра параход, цяпер пагаворым пра чалавека. Людзі цікавяцца, з кім Вы жанаты…

А.Х.: Хто цікавіцца?

С.К.: Сяброўкі клюбу аматарак лімэрыкаў з мае працы. Мы ў абедзенны перапынак лімэрыкі складаем і чытаем. Асабліва добры гэты:

Шматпакутная дзеўка з Багданава
за расейца выходзіць бяштаннага.

Нават мае пасаг,
ды жаніх у трусах
патрабуе выключна прыданага.

А.Х.: Ну, калі так… Калі я ўпершыню прыйшоў на выклад у заручальным пярсьцёнку, мой выклад быў практычна сарваны. Мяне ніхто ня слухаў, усе дзяўчаты шушукаліся і тыцкалі пальцамі ў мой пярсьцёнак. Урэшце яны зьмірыліся з такой стратай. Нейкі такі добры кантакт са сваімі студэнтамі мне ўдаецца трымаць. У гэты нелітаратурны час людзі прыходзяць на філфак, вывучаюць літаратуру, слухаюць пра Вальтэра і Дыдро, Бальзака і Гюго абсалютна бескарысьліва… Але вернемся да самага прыемнага — шлюбу. У мяне цудоўная жонка, якая, яшчэ ня будучы жонкаю, вучылася са мною на філфаку, пасьля ў асьпірантуры. Займалася ангельска-ірляндзкай паэзіяй. Як я змагаюся ў няроўным змаганьні з Бадлерам, так яна змагаецца з Уільямам Батлерам Ейтсам. Нядаўна падчас выступу ў Івана-Франкоўску мяне запыталі, як каханьне ўплывае на маю творчасьць. Я схапіўся за галаву: у мяне няма вершаў непасрэдна ПРА ГЭТА. Я сказаў: гарманізатарам сямейных стасункаў стаўся кампутар. Два чалавекі, кожны з прэтэнзіямі творцы, кожны думае, быццам менавіта тое, што ён робіць, ёсьць найважнейшым. Таму вакол ствараецца выбуханебясьпечная атмасфэра. Толькі набыцьцё ноўтбука паставіла ўсё ў сямейных стасунках на свае месцы. Адносіны зноў набылі гарманічнасьць. Каханьне — стыхія, што мяжуе з паэзіяй. І на мяжы каханьня з паэзіяй адбываюцца цікавыя рэчы. Але, знаходзячыся на мяжы, нам нельга блытаць гэтыя тэрыторыі, і калі-нікалі выпадае рабіць паміж імі выбар. Я ўжо казаў, што часам кладуся спаць вельмі позна. І гэта ў той ці іншай ступені выбар, які робіцца паміж паэзіяй і ўладарствам каханьня. І я бязьмежна ўдзячны жонцы за разуменьне інтарэсаў мае памежнае дзяржавы.

Жанчына — гэта люстра, у якім па-новаму бачыш і адкрываеш сябе. Стасункі зь ёй — гэта тое, пасьля чаго ты не застаешся сабой ранейшым, а непазьбежна робішся сабою новым. За такія зьмены можна таксама быць толькі ўдзячным. Вось так. Казаць пра жанчын і каханьне я магу толькі цнатлівымі пэрыфразамі.

С.К.: Гэта імпануе… А котку Глафіру Вы, відаць, атрымалі ў якасьці пасагу ці прыданага?

А.Х.: Котка Глафіра — гэта душэўны боль. Кацянятка я

прыцягнуў у шапцы ў красавіку 1994 году. Маці закрычала: нізавошта ня будзем трываць такое стварэньне ў доме. Але ўжо празь некалькі хвілінаў перанялася лёсам коткі і ўзяла на сябе адказнасьць. Котка мела страшэннае імя АІДА. Пры ўсёй маёй сымпатыі да Вэрдзі й опэрнага мастацтва, мы мусілі адразу перахрысьціць яе. Але ў характары Глафіра шмат у чым засталася АІДАЙ. Яна трохі дзікаватая, страшэнна ня любіць кампаніі і ведае толькі адну гаспадыню — маю маці. Да мяне ставіцца з падазрэньнем. Колісь я прысьвяціў котцы верш, але ён не дасягнуў сваёй мэты: стасункі зь ёй не пацяплелі. Толькі часам, калі ў яе пачынаецца росквіт эмоцыяў да істот супрацьлеглага полу, яна згадвае пра маё існаваньне. Мабыць, мая мужчынскасьць праз усе біялягічныя адрозьненьні ўсё-такі ўзьнімае мяне ў ейных вачох. Яна тыдзень не дае мне праходу, пасьля, нібыта помсьцячы за маю абыякавасьць, адказвае тым самым доўгія месяцы.

С.К.: Апроч сям'і, літаратуры, выкладаньня й спорту, чым Вы цікавіцеся?

А.Х.: Пяць-шэсьць гадоў таму я пачаў займацца інтэлектуальнымі гульнямі кшталту "Што? Дзе? Калі?". Цікава калектыўна шукаць адказ на пытаньне. Яшчэ больш мне падабаецца роля запытальніка. Я імкнуся абеларусіць гульню, падшукаць пытаньні з нашых рэаліяў. Часам гэта атрымліваецца, і нашыя гульцы-інтэлектуалы згадваюць, што яны беларусы.

Яшчэ вельмі люблю паесьці. (Падаецца, гэта адзін са сьмяротных грахоў?) Адзінае, чаго не люблю, — кашаў. Гэта засмучае маіх хатніх, якія ведаюць, што чалавек зранку мусіць есьці аўсянку, каб быць здаровым. Але тут маёй талерантнасьці настае крэс. Я хачу есьці на сьняданак нешта мясное, у найгоршым выпадку — нешта бульбянае, і варыянт дзьвюх-трох эўрапейкіх канапак з каваю са мною не праходзіць. Мабыць, таму я так ем, што ў мяне няправільны расклад дня. Бо, калі мне ня трэба зранку на лекцыі, я працую да сярэдзіны ночы, а пасьля да сярэдзіны дня магу высыпацца.

Люблю бяседы з добрымі кампаніямі і добрымі напоямі. Страшэнна люблю кагор. Да гарэлкі стаўлюся з мужным беларускім стаіцызмам: ёсьць такі напой, які цэмэнтуе кампанію і нармалізуе чалавечыя кантакты. Апошнім часам дачыніўся да нераспаўсюджаных у Беларусі напояў: мая

прыяцелька прывезла з Чэхіі пляшку абсэнту ў гонар выхаду кніжкі. Чэхія — адна зь нешматлікіх краінаў, дзе продаж абсэнту дазволены. І я меў клопат, як гэта спажываецца. Лазілі з жонкай на адпаведны сайт www.abcent.ru. Расейскія калегі навучылі, як правільна ўжываць цукар, фільтруючы небясьпечнае рэчыва, што ёсьць у абсэнце. Седзячы ў віленскіх кавярнях, я паспытаў таго, што яны шавіністычна называюць “крупнікас”. Калі разабрацца, то гэта наш беларускі крупнік — пра яго чытаў яшчэ ў школе, у “Пінскай шляхце” (“Ну, панове, шляхта-брацьця…”). Аказваецца, у яго травяны супэрбукет — непаўторны смак Вялікага Княства Літоўскага.

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

Андрэй Хадановіч

Альбы і сырвэнты

дэжа вю

ажываюць пэрсанажы анэкдотаў
з падсьвядомасьці выходзяць на пленэр
зноў матросаў закрывае дзіркі дотаў
зноўку бацьку падстаўляе піянэр

льецца песьня на далёкім пагранiччы
у чальцоў КПСС пайшоў працэс
мудры чукча запалярны паляўнічы
стаў на лыжы з групэнфюрэрам эсэс

падрывае партызан цягнік варожы
ў акупантаў пэрманэнтны пераляк
іх чакаюць ваяры на раздарожжы
тры танкісты рускі немец і паляк

прыхадзеце сёньня ў танку будуць танцы
баявік ужо ўзышоў на бранявік

пралятае на тачанцы-растаўчанцы
кат катоўскі энэргічны сілавік

камікадзэ супраць шашкі скача боса
куля-дура камандарма не чапай
ардынарац пецька тройчы выдаў боса
крыкнуў певень і на дно пайшоў чапай

але прывід камунізму тут ня вымер
ён глядзіць з чырвоных зорак п'яны ў дым
і ваван валодзя вовачка ўладзімер
назаўсёды застанецца маладым

арляняты гэй шыхтуйся ў шчыльны шэраг
паляцім куды ня ходзіць наш цягнік
як ня згубімся? элемэнтарна шэрлак
нас чакае дасканалы праваднік

верным шляхам запаветамі дэ сада
верным шлюхам не застацца сёньня збоч
па вальпургіевай ночы шахразада
будзе вам варфаламееўская ноч

хто ідзе? штандартэнфюрэр із штандарам
прапар з прапарам выходзіць на прасьцяг
шпаркім крокам проста ў будучыню шпарым
па кастрышчах па касьцёлах па касьцях

ананасы із шампанскім будуць нашы
хто ня з намі пасьмяротна стане наш
ажываюць пэрсанажы пэрсанажы
трыюмфуе неўміручы пэрсанаж

сто дваццаць год садому

сто дваццаты год няспыннай "даўніны"
той якая знаеш сам ад слова "даўн"
зранку плюшчацца бабулькі й пацаны
гары потэр клара цэткін ева браўн

у этэры заікаецца ды-джэй
у аблоках завіхаецца пілёт
шчасьце нашае блукае ўсё бліжэй
паміж пушчаў і балот балот балот

пахмяляюцца гарэлкай землякі
арыштанты машуць кветкамі з-за крат
у нябёсах дэманстрацыя й парад
сэрафімы бэтээры гвазьдзікі

усьміхаецца навокал добры люд
паліць флягі і халяўную траву
расквітае ў небе радасны салют
дваццаць залпаў і кантрольны ў галаву

мы пасьля загорнем целы ў цэляфан
бо наперадзе каханьне і любоў
знэрваваны дачакаецца нірван
заклапочаны пазбавіцца клапоў

хай раскіданае ўшчэнт гняздо тваё
пакрысе ператварылася ў дурдом
ды казаў адзін асьвечаны мусьё
трэба дружа апрацоўваць наш садом

гэта заўтра а пакуль аўфвідэрзэйн
добрай ночы любы хлопча баю-бай
хай прысьняцца пакемоны і хусэйн
я жартую сьпі спакойна разьдзяўбай
6—8 ліпеня 2002

ратавальнік

ён гадаваўся на ўзьбярэжжы кубы
багоміў бокс і пляжны валейбол
замест “дабрыдзень” цалаваў у губы
і мінакі шукалі валідол

штовечар неабачлівых дзяўчатак
высочваў у цукровым трысьнягу
каханьнем не займаўся без пальчатак
і набываў цыгары на вагу

глядзеў па тэлевізары навіны
браў з пальмы сакавіты ананас
свой шлях зямны прайшоў да палавіны
а потым перабраўся жыць да нас

ён палюбіў легенды і паданьні
краіны што дала яму жытло
ласуючыся бульбай на сьняданьне
ўздыхаў: няма таго што раньш было

уночы быў нястрымным у інтымным
працуючы як электрычны прас
гімнастыкай займаўся з раньнім гімнам
і змучана валіўся на матрац

лічыўся між кабет гарачым мача
гарлаў “бэсса мэ мучос” пад фаршмак
для ўсіх неабазнаных растлумачу:
цалуй мяне таварыш узасмак

аднак умеў сказаць “да пабачэньня”
красуням ад паненак да бабуль
бо памятаў што мае прызначэньне
вялікае пакліканьне й пакуль

сусьветную тугу глушыў у кнайпе
й казаў сабе ў люстэрка “будзь здароў!”
бо ён куляў
ён быў зацяты снайпэр
ён ведаў што аднойчы будзе кроў

сэанс самаўнушэньня
Мы памром не ў Парыжы…
Н. Білацарківец

можаш куляць і паліць цыгарэты
можаш марнець сярод пыльных тамоў
можаш юначым каханьнем сагрэты
цэлую ноч не вяртацца дамоў

знаць што існуюць мілосьць і кунега
жарсьць і пяшчоту браць і даваць
толькі нікому ня можна бо нельга
нашых народных мас турбаваць

можна зь сяброваk здымаць нагавіцы
можна спадніцы з шатляндзкіх хлапцоў
крочыць па вене да віды і віцы
за дапамогай стэрыльных шпрыцоў
зладзіць касьцёр піянэрскі ў аўшвіцы
толькі гульня пераможа гульцоў

можна прагортваць гады як бачыны
у архітэктара зьехаў дахаў
ходзяць па сьвеце жанчыны жанчыны
найпрыгажэйшых ты нават кахаў

кожная цяміць у выспах і воспах
робіць прышчэпкі супраць прышчоў
попай здабыла заслужаны посьпех
трушчачы ёю ў траўні хрушчоў

можна быць сьмелым нахабным і ўвішным
можна зьбіраць у вязьніцу харчы
можна быць іншым тым болей што іншым
лепшымі іншымі быць не змагчы

як там было? мы памром не ад грыжы?
вершы паэта стаяць уваччу
я не хачу памірaць у парыжы
я наагул памірaць не хачу

вальс на тры цвэрці сыграць дасканала

перашкаджала лішняя чвэрць
вальс дагучэў дасканаласьць сканала
кожны чацьверты дайшоў да фіналу
мэтры
зьмярканьне
сымэтрыя
сьмерць

можна гарлаць партызанскія песьні
кідаць сызыфа ў чужы агарод
можна падохнуць у брудзе і плесьні
нельга абразамі ганіць народ

можна падацца ў вар'яты самохаць
ложак паскудзіць словам "краваць"
толькі ня трэба народ наш палохаць
толькі ня трэба мас турбаваць

* * *

Не жалею, не зову, не плачу
С. Ясенін
Ня вер, ня бойся, не прасі
Зь няпісаных правілаў савецкіх зэкаў

апрануты ў рымскую тогу
між пустак балот і пяскоў
брыду і пытаю дарогу
палохаючы мінакоў

плюю на прымхлівую ўдачу
не цераз плячо а ў душу
шкадую і клічу і плачу
і веру й баюся й прашу

адзін зь нешматлікіх прыдуркаў
што гоняць і ўлетку пургу
катрынкаю сонных катурхаў
а тыя ў адказ ні гу-гу

хто стане спрачацца пра густы?
на ўсё свой адум і надум
ці думаеш пра беларусь ты
ці проста гуляеш у “дум”

узроўняў адолена восем
дзявяты выразна відзён
баімся і верым і просім
піць аж да сёньняшніх дзён

засьпелі сябе на гарачым
цяпер адбываем турму
шкадуем і клічам і плачам
ужо невядома чаму

каго абыходзіць твой лямант?
(ці ўголас рыдай ці ў лісьце)
бо ты адмарозак ты мамант
што ў вечнай даўно мерзлаце

бо ты тут істота чужая
стаіш на шляху
балазе
на дурняў народ не зважае
і неяк паўз вас папаўзе

яму не дадуць заняпасьці
даб’ецца ўсяго ў барацьбе
тут будзе агульнае шчасьце
й на шчасьце ня будзе цябе

тут будуць канторы й кантары
вэлкам ту страчаны рай
ня плач пра мяне май кантры
доўнт край фо мі родны край

гарадзкі раманс
у год дваццаць восьмы як ты нараджэньнем пацешыў айчыну
амаль выпадкова ты стрэціў дзяўчыну дакладней жанчыну
вы стрэліся зь ёю на лесьвічнай клетцы на сёмым паверсе

шыкоўныя ногі й даруй мовазнаўца адметныя персі

такое здарэньне такая падзея такая прыгода
між сёмым і шостым дакладней паверхам ля сьмецьцеправоду
яна была роўнай блукаючай зорцы вандроўнай камэце
калі грацыёзна цябе абмінула выносячы сьмецьце

бязь лішніх ілюзій бяз марных спадзеваў бяз подумкі задняй
яе ты праводзіў амаль да пярэдняй вітальні дакладней
ты крочыў у спальню з трымценьнем хлапечым з дрыготкай
юначай
нічога такога ня меў ты і ў думках ды выйшла іначай

яна цалавала пяшчотней ад сонца за ветрык лагодней
ты зь ёй сустракаўся штодзённа а часам і двойчы на содні
ты быў шараговым амаль выпадковым і зрэшты чарговым
каханкам красуні ў цагляным будынку сяміпавярховым

а сэрца пяшчотай бруілася ўпотай дакладней каханьнем
якое багомім кунежым і песьцім руйнуем і ганім
зь юрлівых і ўвішных зьбірае Ўсявышні нявернасьці чынш і
цьвітуць ужо вішні а потым віншую зьяўляецца іншы

падводзячы вынік мілосным турботам нядзелям суботам
а потым няпруха а потым запоі а потым а потым
а потым з балькону зрываешся долу амаль выпадкова
і лічыш паверхі і дзякуеш лёсу сяміпавярхова

фантазіі ў манеры віктара жыбуля
каб ня сьпёрлі…

брэша сабака ў будцы
вые на поўню месяца
у футбаліста бутсы
сьпёрлі
мабыць павесіцца

у сэксапільнай кралі
мілага сэрцу хлопца
дзеўкі чужыя скралі
мабыць цяпер утопіцца

ў шыбеніка вяроўку
у п'янюгі гарэліцу
ў снайпэра сьпёрлі вінтоўку
знойдзе чым дык застрэліцца

у хакеіста клюшку
у інваліда мыліцы
у фатографа птушку
мо таксама засіліцца

круцяцца ў небе сузор'і
грошы брудныя круцяцца
ў гідрамэтцэнтры надвор'е
сьпёрлі
мо ўсе атруцяцца

кот марцовую котку
сьпевам на даху вабіць
я сьцягнуў тваю фотку
не атруцішся мабыць

альба альбарутэніка

я стаю пры тваім акенцы
і пяю табе сэрэнаду
ты ў акне ў празрыстай сукенцы
мне гаворыш *мальчык ня нада*

я ж чаканю рым дубальтовы
й не пайду да ранку дамоў
на ўсіх мовах пяяць гатовы
(ты ня ведаеш гэтых моў)

па-японску як такубоку
па-кітайску як сам лі бо
я кахаю цябе глыбока
ты прымі гэту альбу альбо

засьпяваю новыя альбы
я давёў іх сёньня да ладу
перайду для цябе цераз альпы
і складу ня альбу баляду

эх пакласьці цябе на раяль бы
і належаць табе наўсуцэль бы
я цябе апяваю ў альбе
гэта як сустрэча на эльбе

мы хаўрусьнікі па мілосьці
ў пацалунку зьліемся палкім
дарагая ня трэба злосьці
“наўсуцэль” гэта значыць “цалкам”

гэта варта вершаў і прозы
й трызьняць альбаю ў неспакоі
альбіносы і альбатросы
альбігоі і проста гоі

напісаць пранізьлівы вершык
пра любоў пад мастом мірабом
зрымаваць традыцыйна зь “вершнік”
і пакінуць табе ў альбом

падбіраць беларускія словы
і крычаць іх адно табе
зразумелыя да паловы
і ня ўсім жыхарам эрбэ

у парыве літаратурным
барукацца зь дзявочым сном
трубадурам не трубадурнем
пад тваім замкнёным акном

падарожжа

схіліўшыся ўначы да офіснае лямпы
што некалі правёў у кожны дом ільіч
глядзець на манітор дзе штампы штампы штампы
і кожны дабл клік як ваяўнічы кліч

сусьветнае лайно прымаючы варожа
як пералётны птах сапсець на правадах
а потым карабель пачатак падарожжа
сьпярша суцэльны жах а потым зьедзе дах

а навакольны сьвет хоць ты яшчэ падлетак
ня грэбуе табой і пад сябе грабе
сьціскаеш у кулак камяк нэрвовых клетак
і пераймае дых і вусьцішна табе

бяссоньніца гулец у словы словы словы
засмучаны габрэй вяршуе за сталом
ты сьпісак шындлера прагледзеў да паловы
і кожнаму з мужоў пасьпеў сказаць шалом

ня чуюць мерцьвякі а пераможцы сьвіньні
як скажа адысэй вярнуўшыся дамоў
каханьне багавіц патоне ў багавіньні
разьюшаным багам не да тваіх прамоў

раўнівыя мужы няверная галена
як сьцвердзіў буалё ламаючы кастыль:
п'яному караблю сем футаў па калена
парыскаму арго пасуе ўсякі штыль

і гумбэрт на вадзе й лаліта ў залюстроўі
паветраны пацук кажан на караблі
ты страціў наўсуцэль псыхічнае здароўе
ня ведаеш чаму і немавед калі

што ты гекубе й што табе да той гекубы
нябога геракліт стаячая вада
траянскаму каню не зазірай у зубы

як гаварыў кароль паўцарства за дада

гуляюць у футбол аякс і макавеі
бязногі ахілес ганяе чарапах
спакусьлівая плоць бяз скуры ружавее
й зіяюць пустатой вачніцы ў чарапах

нам троя й картаген дзіцячаю пляцоўкай
узброены амур нам проста авадзень
багіня-карабель з крывавай распальцоўкай
зь цямрэчы паўстае вітайма новы дзень

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]

Канстанцін Міхееў

“Эўропа, разумееш?..”

КАНСТАНЦІН МІХЕЕЎ (нар. 1972) — паэт, перакладчык паэзіі, эсэіст, выкладчык літаратуры ў БДУ. Аўтар паэтычных кніг “Гиперборея”, “Стихи Мнемозине”. У ARCHE друкуецца упершыню.

Андрэй Хадановіч пачынаў пісаць па-расійску. У яго гэта выходзіла. Прычым добра. Настолькі, што па Менску ўжо бадзяюцца дзесятка паўтара эпігонаў, імкнучыся атрымаць спадчынныя правы на літаратурную ўласнасць, якая страціла свайго гаспадара пасля пераходу Андрэя на беларускую. Ну і д’ябал з імі. Няхай звіваюць свае немудрагелістыя вянкі іранічных санетаў і сплаўляюць на Купалле па Свіслачы — а раптам некалі даплывуць да сутокаў з буйнейшымі рэкамі? Андрэй Хадановіч стаў пісаць па-беларуску. Дзесятка паўтара маладых беларускіх паэтаў усумніліся ў шчырасці гэтага пераходу і, агаломшаныя вострым моўным пурызмам невядомага ім паходжання, узяліся (ледзь не з рэктараманаскопамі) даследаваць тэзаўрус паэта наконт адпаведнасці сапраўднай беларускай мове, прынагодна збіраючы даведкі, а ці напраўду Андрэй чытаў Бертрана дэ Борна і Сэн-Жона Пэрса. Паклаўшы руку на сэрца, як гэта цяпер прынята рабіць, пацвярджаю: чытаў. Так і не ўклаўшы пальцаў у раны літаратурнага “перабежніка” і “двурушніка”,

літаратары-пачаткоўцы супакоіліся і таксама паціху сталі наследаваць Андрэю. Суцяшае тое, што некаторыя з іх у выніку ўсё-такі даведаліся, хто такі Сэн-Жон Пэрс.
Думаецца, пераход цераз моўныя Альпы адбыўся не дарэмна. Шчасліва ўнікнуўшы долі магістра менскага аддзялення паўночна-заходняе філіі Ордэну Куртуазных Маньерыстаў, Андрэй унёс у беларускую літаратуру новы досвед рэфлексіі, іроніі і самаіроніі. Ствараць культуру і жыць у культуры — гэта дзве прынцыпова розныя рэчы, асабліва ў Беларусі. Атавістычныя хібы наіўнага народніцтва векавой даўніны да сёння заміналі нашым літаратарам звярнуць прасветленыя погляды на саміх сябе, на традыцыю — тую традыцыю, у якой яны рэальна існуюць, і тую, прыналежнасць да якой з гонарам маніфестуюць (“*Еўропа, разумееш?! — Ніхт ферштэйн!*”). Традыцыйны беларускі дыскурс у сваім імкненні да вытокаў падобны да аўстралійскага бумеранга, але адрозніваецца ад апошняга тым, што, вяртаючыся, б’е па лбе не толькі таго, хто яго запусціў, але і значную колькасць абсалютна нявінных людзей — ледзьве не кожнага чацвёртага.
Рахункі і каштоўнасці, сапраўдныя і ўяўныя, што бытуюць у культуры ці прыпісваюцца ёй, спраўджваюцца адно такім чынам, як гэта робіць Андрэй Хадановіч — іроніяй, самаіроніяй, здольнасць да якой у найвышэйшай ступені ўласцівая такім яго персанажам, як “*гандлёвец, здраднік, хлус, інтэлігент*” ды іншыя “*жыды, касмапаліты, еўрапейцы*”. Часам аднаго каламбуру досыць, каб выцягнуць з родных суглінкаў нейкі архетып, што пакутліва выспяваў у глыбінных пластах культуры — ад часоў Усяслава Чарадзея да эпохі аднайменнага напою.
Пакруціўшы ў руках сваю культуралагічную знаходку, нібы караняплод, папсаваны каларадскім жуком ды сістэмаю перакрыжаванага субсідавання, паэт здольны не толькі задацца пытаннем “*З чаго пачынаецца Жодзіна?*”, але і даць на яго разгорнуты, аргументаваны і паліткарэктны адказ. Пры такім падыходзе ажывае і сама мова, набываючы здольнасць спараджаць новыя стылістычныя і семантычныя адценні, якія не зводзяцца ні да грувасткай двухсэнсоўнасці газетных перадавіц, ні да наіўнага какецтва тэлевізійных бландзінак. Апошнім часам лірыка Андрэя сталася больш жорсткаю, але і танчэйшаю. Банальна, аднак гэта прыкмета сталасці,

упэўненасці ў сваім светаадчуванні, у сваім паэтычным інструментарыі, мудрасці, нарэшце: “*Ты ведаеш, Платон мне камарад, ды ісціна ў глытку тваёй цыкуты*”. Покуль паэт здольны не толькі не блытаць вышэйзгаданых субстанцыяў з іншымі моцнымі напоямі, але і разрозніваць іх між сабою, у ім жыве мова, на якой ён піша.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

Марыя Мартысевіч

Сэнс беларускага нонсэнсу (лімерыкі А. Хадановіча)

МАРЫЯ МАРТЫСЕВІЧ (нар. 1982) — перакладніца паэзіі, эсэістка. Вучыцца ў ВДУ ім. Беларускім Калегіюме. У “ARCHE” друкуецца ўпершыню.

I

Pызыкоўныя гоншчыкі з Ліды
выпрабоўвалі супербаліды…
Сёння кожны жыхар
хлопцаў ведае ў твар:
гераічныя ў іх інваліды!

Гэты і іншыя беларускія лімерыкі — дасціпныя вершы, вытрыманыя ў традыцыях англійскага класічнага абсурду, — з’явіліся ў друку прыкладна два гады таму і былі прыязна прынятыя чытачамі. Усцешыла перадусім тое, што такі спецыфічны жанр, як лімерык, вядомы раней расійскамоўным беларусам адно па дзіцячых вершах Самуіла Маршака ды расійскіх гумарыстычных часопісах, нарэшце паўстаў і ў нашай літаратуры. Прыйшліся яны даспадобы і з тае прычыны, што іх аўтар, паэт Андрэй Хадановіч, у кожным з іх згадаў які-небудзь беларускі горад ці мястэчка і паказаў жыхароў нашай з вамі

краіны. Як адзначае сам Хадановіч, яму *“падалося цікавым насяліць псеўдаанглійскім нонсэнсам беларускія гарады і вёсачкі, родныя, прыветныя, аддаючы даніну павагі вельмішаноўным землякам”*.
Монастрафічнымі жанрамі, уласцівымі іншым літаратурам свету, нашыя паэты цікавіліся ўжо даўно. Беларускімі хайку, танка, рубаі ды іншай экзотыкай цяпер нікога не здзівіш, а вось згадкі пра беларускі лімерык я не знайшла нават у “Паэтычным слоўніку” Рагойшы, гэтым малітоўніку паэта-пачаткоўца. Цяпер у спадара Рагойшы з’явілася падстава ўключыць артыкул “Л**і**мерык ” у новую рэдакцыю ягонага “Слоўніка”, балазе адгэтуль у яго не будзе нястачы ў ілюстрацыйным матэрыяле. Іміграваўшы ў беларускую літаратуру, лімерык атрымаў у ёй іншы статус. Гэты жанр паўстаў у англійскай літаратуры XIX стагоддзя і быў, перадусім, прызначаны для дзяцей, хоць шанаваўся не толькі імі і разам з іншымі творамі іх “першаадкрывальніка” Эдварда Ліра і дзвюма кералаўскімі “Алісамі” быў вызначаны дарослымі аматарамі як класічны англійскі абсурд. А вось Хадановічавы лімерыкі нельга аднесці ні да дзіцячае, ні да абсурднае паэзіі. На маю думку, тут мае месца досыць заканамерная метамарфоза: у беларускім кантэксце і нонсэнс набывае сэнс. Даследчыкі адмаўляюць лімерыкам як жанру абсурду ў дыдактычнасці, дый сам аўтар беларускіх лімерыкаў ставіцца да іх хутчэй як да літаратурнага эксперыменту. Мне ж падаецца, што і яны не пазбягаюць адвечнага наканавання літаратуры — *цешачы, навучаць*.
З аднаго боку, рэдактары “Нашай Нівы” змясцілі лімерыкі на апошняй старонцы, — там, дзе звычайна друкуюць сатырычныя замалёўкі з сучаснага жыцця. З іншага — у прадмове да “Лімерыкаў беларускіх” аўтар адсылае чытача да першакрыніцы — англійскіх лімерыкаў Ліра, абвяшчаючы працяг традыцыі ў беларускай літаратуры. (Кажучы пра гэта на адной з паэтычных вечарын, Хадановіч перайначыў расійскага класіка: “*Я Лира посвятил народу своему*”…)

II

Класічны лімерык — гэта напісаная анапестам пяцірадковая страфа з рыфмоўкай *aabba*, дзе першы, другі і пяты радкі складаюцца з трох стопаў, а трэці і чацверты — з дзвюх.
У першым радку паведамляецца, пра каго ідзе гаворка, у

другім — пра недарэчнасць у выглядзе альбо паводзінах героя, а ў трох апошніх — пра нешта дзіўнае ці бязглуздае, што ён робіць:

У паненкі адной капялюшык
Брудны быў, бо прываблівaў птушак.
А яна: “Не пярэчу
Супраць гэтай малечы —
Хай сядае на мой капялюшык!”
Лімерык такога кшталту досыць тыповы для ліраўскай “Кнігі бязглуздзіцаў”, хаця больш вядомай і больш улюбёнай паслядоўнікамі Ліра сталася іншая форма, тая, у якой першай (і, адпаведна, пятай) рыфмай стаецца геаграфічная назва:

Быў дзядок у мястэчку Кілкені,
Ён ніколі не меў больш за пені;
Ды штодня да бабулі
Йшоў па мёд і цыбулі
Той капрызны дзядок у Кілкені.
(абодва лімерыкі прыводжу ва ўласным перакладзе — **М. М.**)
Андрэй Хадановіч абірае для сваіх лімерыкаў менавіта такі варыянт:

Рэстаранны музыка ў Вялейцы
Баха граў на электражалейцы.
А Яган Себасцьян
меў шыкоўны баян
і шабашыў на вузкакалейцы.
Як можна бачыць, у Хадановіча “развязка сюжэту” наступае ў пятым радку і таму з тапонімам рыфмуюцца два словы, а не адно (англійскія словы карацейшыя ад беларускіх, што спрыяе больш дынамічнаму “развіццю падзеяў” у англійскіх лімерыках).
Розняцца і прынцыпы падбору тапонімаў. У Ліра гэта маглі быць брытанскія гарады і мястэчкі (Кілкені — горад у Ірландыі), але часцей за ўсё ён сяліў сваіх герояў у экзатычныя для ангельцаў гарады і краіны. Да таго ж, у Ліра тапонім звычайна не нёс цяжару нейкага сэнсу і падбіраўся па рыфме. Хадановіч жа свядома абірае першай рыфмай беларускія паселішчы. Можна меркаваць, што такім чынам аўтар імкнецца

не столькі надаць сваім лімерыкам вонкавы нацыянальны каларыт, колькі працягнуць тую традыцыю беларускай літаратуры, у якой горад — гэта пэўны сімвал, метафара дзяржавы.

III

Горад заўсёды быў сімвалам цэнтру, стрыжнем, які нітуе эпохі, воссю, вакол якой круціцца жыццё краю альбо краіны. Гарады ўспрымаліся як выспы, па якіх пазнаюць народ. Вось як вызначае сутнасць гораду Алесь Разанаў:
Горад… — бесперапыннае пераўтварэнне дольняга ў "горняе", мінулага ў "градучае", ён — іхнія народзіны, і таму ўсе позіркі скіроўваюцца да яго, і таму ўсе дарогі сыходзяцца ў ім, і таму ўсім крывічам і радзімічам ён, нібы ўзнагарода, родны і дарагі. (…) Да гораду горнуцца вёскі, лясы, пасады, палі, агароды, і ён з'ядноўвае іх у радзіму, а разнаістую грамаду — смердаў, рамеснікаў, гандляроў — гартуе ў народ.
Толькі наяўнасць у чалавека малой радзімы, месца ці, хутчэй, *места*, дарагога ягонаму сэрцу, робіць яго патрыётам краіны, у якой ён жыве. Канцэпт "гораду" як сродку барацьбы з "тутэйшасцю" нашыя асветнікі ўсвядомілі яшчэ ў XIX стагоддзі. Прыгадайма, напрыклад, "мужыцкія псеўданімы" Кастуся Каліноўскага і Францішка Багушэвіча — *Яська-гаспадар з-пад Вільні* і *Сымон Рэўка з-пад Барысава*. Прыгадайма таксама прадмову Багушэвіча да яго зборніка "Дудка беларуская". Вось якімі словамі яна заканчваецца: *"Можа хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Віцебску за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Менск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак…"*
Панятак "Беларусь", шмат для каго з адрасатаў Багушэвічавых вершаў няясны і абстрактны, тлумачыцца тут між іншага і праз пэўныя пункты на мапе і ў свядомасці.
У наш час, кім бы ні адчуваў сябе беларус — "тутэйшым" ці "савецкім чалавекам", — горад ці мястэчка, у якім ці ля якога ён жыве, ён успрымае як нешта сваё, блізкае. Але часцей за ўсё ў яго ўяўленні паняцці "роднае места" і "родная краіна" ніяк не звязаныя. Мне падаецца, Хадановіч імкнецца ўзнавіць гэтую сувязь праз свае лімерыкі.

IV

У беларускім лімерыку Хадановіча горад — гэта вузел, на якім трымаюцца ўсе пяць радкоў. Складанне лімерыка можна параўнаць з бурымэ, бо задача творцы — падабраць дзве рыфмы да назвы гораду. Варта ўзгадаць Добруш, Глуск, Чачэрск альбо Баранавічы з Асіповічамі, каб зразумець, што гэта не такая лёгкая справа. Да таго ж, рыфмы мусяць быць нечаканымі, бо на іх часта палягае досціп, які месціцца ў лімерыку, і ў той жа час вельмі дакладнымі, бо грувасткая форма замінае чытачу (а тым больш — слухачу) успрымаць змест. Трэба аддаць належнае: Хадановіч бездакорна "інструментуе" кожны вершык. А што да арыгінальнасці, то сустракаецца ў яго нават тройка каламбурных рыфмаў:

Абяцанкам палітыка з Горадні
не даюць болей веры ні горад, ні
сужаніца, ні дзеці.
Ой, што робіцца ў свеце!
Ой, відаць, пачынаюцца гора дні!

Лімерыкі Хадановіча ёсць беларускімі не толькі сваёй моваю і месцам падзеяў. У кожным пяцірадковым вершыку-аповедзе перад чытачом паўстаюць землякі. Шмат якія з вобразаў узятыя з беларускай сучаснасці альбо мінуўшчыны, далёкай і не вельмі. Ёсць тут, канечне ж, і "свядомыя" жыхары, з якіх аўтар, як і з іншых сваіх герояў, кпіць і іранізуе:

Патрыётка ад мужа з Драгічына
патрабуе праўдзівага вычыну:
"Страшна кінуць ва ўрад
самаробны снарад —
хоць прыбі да падлогі маснічыну!"

Але сустракаюцца й іншыя прадстаўнікі беларускага грамадства. Напрыклад, такая гістарычная асоба, як *чарнасоценец з Доўску* і яго больш сучасны паплечнік — *РНЕшнік-суворавец* (натуральна, з Кобрыня). З імі таксама адбываюцца розныя непрыемныя рэчы:

У сям'і чарнасоценца з Доўску
сын у сне гаварыў па-жыдоўску.
Бацька помсціць гатоў,
закрычэў: "Бі жыдоў!.."

А пасьля дараваў па-бацькоўску.
У лімерыках Хадановіча Беларусь паўстае краінай не толькі высока-:

Пачатковец-празаік з Нясвіжу
пенталогію склаў для прэстыжу.
Як назваць? “Пентагон”?
Можа, “Пентамерон”?
Перавагу аддаў “Пяцікніжжу”,
— але і шматкультурнай. Сярод герояў прысутны *педантычны раскольнік з-пад Веткі*, а дапаўняюць карціну местачковы габрэй і супярэчлівы (на першы погляд) вобраз беларускага мусульманіна:

Самы праведны рэзнік з Лагойску
стаў рабіць абсалютна па-гойску:
праз сваю дабрыню
забівае свінню,
бо сыны ва Ўкраіне, у войску.
Ісламіст-бээнэфавец з Іўя
кажа: “З ласкі Алаха адкрыў я
рэлігійны сакрэт:
пуп зямлі — мінарэт,
а навокал — свабодная Крыўя!”
Астатнія насельнікі беларускіх гарадоў і мястэчак у лімерыках вядуць актыўны лад жыцця, здзяйсняючы самыя розныя па ступені бязглуздасці ўчынкі. Асабліва “экстрэмальна” паводзяць сябе героі апошняга цыклу лімэрыкаў, якія Андрэй Хадановіч назваў “Цынічнымі”:

Тры сястры-
камікадзэ з
Расонаў
з даху скочылі
без парасонаў.
Тры дурных
галавы!..
Іх цяпер ад
травы
аддзірае
касільнік

газонаў.

І, нарэшце, Хадановіч не быў бы Хадановічам, калі б у яго вершах, хай і такіх спецыфічных, не прысутнічалі “вандроўныя”, вечныя сюжэты літаратуры, якія мы пазнаём нават у зыначаным аўтарам выглядзе:

Сенбернар у
папа з
Маларыты
меў вялізарныя
габарыты,
бачыў смачныя
сны
пра кавалак
мясны
й памятаў, дзе
калега зарыты.

V

Вось жа, два гады таму лімерык увайшоў у беларускую літаратуру як новы, экзатычны жанр. Сёння, дзякуючы перадусім Андрэю Хадановічу, жанр гэты трывала атабарыўся на нашай культурнай прасторы. Я бачу гэтаму два пацверджанні. Па-першае, з’яўляюцца і іншыя складальнікі беларускіх лімерыкаў (напрыклад, Сяргей Балахонаў з ягонымі “Гомельскімі лімерыкамі”). Па-другое, цяпер мы маем поўны пераклад “Кнігі бязглуздзіцаў” Эдварда Ліра, зроблены Максімам Шчуром (прачытаць яго можна на сайце www.knihi.com). Чытачу засталося зусім няшмат: прызвычаіцца правільна ставіць націск у назве ірландскага порту, у якім пару стагоддзяў таму пачалі складаць жартаўлівыя песенькі з куплетамі ў пяць радкоў.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**

майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]

Уладзімер Арлоў

Мне прысьніўся Хадановіч

Мне прысьніўся Хадановіч:
Велічны, нібы сэнатар,
Недарэзаны Нэронам,
Іранічны, як Свэтоні,
Заклапочаны, як Брут.
Можа, сам каго зарэзаў,
Можа, вершык марыў скласьці,
А магчыма, проста піва
Прагнуў выпіць насупроць
Камітэту дзяржбясьпекі,
Дзе цікавяцца здаўна
Нашым паэтычным словам
І напэўна нездарма.
Ён ішоў па вулцы Маркса
Ў Менску, стомленым і сонным,
Між кавярняй “Эльдарада”
І ангельскай амбасадай
(Там у будцы мент сядзіць).
Рухаўся накіравана,

Не хістаўся, не губляўся,
Павітаўся з нарпаэтам
З рэдкім іменем на “Н”,
Даўганогай прыгажуні
Мімаходзь прызначыў стрэлку
І сказаў бамжу: “Банжур!”
Ён ішоў. Гракі крычалі
Ў навакольлі Нацтэатру.
(Ну чаму не круганы?)
Бомж чытаў паэта Ніцку,
Плакаў, языком мянціў.
Даўганогая бляндынка
Набыла кантрацэптыў,
Бо навокал СНІД лютуе,
А Андрэй — за ўсіх мудрэйшы.
Я прачнуўся і падумаў:
Вось прысьніцца Хадановіч
Цёмнай ночкай на Каляды,
Без усякіх там прыколаў
Заклапочаны, як Брут.
Будзе йсьці па вулцы Маркса
З томам Малярмэ ў партфэлі,
І часопісам “Arche”,
І з сухім ляшчом пад пахай.
Што адгэтуль вынікае?
Што паэту трэба муза,
А часамі прагне піва
Ўкрай асьмяглы арганізм.
І ляшчы яшчэ вядуцца
У вірох маёй Радзімы.
КДБ шануе мову,
І “Arche” выходзіць спраўна.
А бамжы чытаюць кнігі,
Знойдзеныя на памыйках.
Гэта значыць, што пісьменства
Наша краснае — жыве!

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]

Андрэй Хадановіч

Мэтапаэзія і какетлівы дзявочы суіцыд

Што сёньня ўяўляе **“беларуская маладая паэзія”**?
Існуе заганная беларуская завядзёнка лічыць маладымі творцаў ажно да пяцідзесяці, нібыта ўсе яны належаць да слабога полу й хаваюць свой сапраўдны век. Я прапаную грубаваты, але ж практычна прыдатны й просты ўва ўжытку спосаб клясыфікацыі. Маладая паэзія — гэта калі на ўнівэрсытэцкім іспыце па літаратуры студэнт расказвае выкладчыку пра сваю ўласную творчасьць. Сучасная клясыка — гэта калі на тым самым іспыце студэнт расказвае выкладчыку пра ягоную творчасьць. Межы паміж катэгорыямі досыць рухомыя, бо студэнты маюць кепскую звычку ператварацца ў прафэсараў літаратуры. Да гонару тых паэтаў, пра якіх пойдзе гаворка ў гэтым артыкуле, адзначым, што ўсе яны студэнты ўнівэрсытэтаў, асьпіранты ў розных асьпірантурах альбо навучэнцы ў Беларускім калегіюме. Так што перад вамі маладая беларуская літаратура ў хімічна чыстым выглядзе. У адрозьненьне ад праграмнай школьнай літаратуры, яе можна

назваць **неабавязковым чытаньнем**.
Сучасны аўтар мае абсалютную свабоду самавыяўленьня. Але і ўвага да ягонай творчасьці, безумоўна, меншая, чым дваццаць гадоў таму. Гэта можна тлумачыць рознымі прычынамі. Па-першае, сама інфармацыйная прастора Беларусі сталася больш насычанаю. Па-другое, панізіўся статус сур'ёзнай літаратуры, у тым ліку паэзіі. У Беларусі на гэта накладаецца шчэ й адмоўны стэрэатып беларускае літаратуры наагул і беларускае паэзіі ў прыватнасьці. Чаго варты хаця б такі прыклад. Вядучая тэлепраграмы "5х5" (на вялікі жаль, любімай падлеткамі), гаворачы пра літаратуру, шчыра захацела зрабіць "раскрутку" дзьвюм беларускамоўным кніжкам — зборніку вершаў Багдановіча й раману Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім". "Гэта вельмі добрыя кнігі, — сказала яна, — хоць і беларускія". Раней беларуская савецкая літаратура — нацыянальная паводле формы й сацыялістычная паводле зьместу — існавала ў сытуацыі, калі літаратура была чымсьці большым, чым проста літаратура. Бо мела вялікі крэдыт чытацкага даверу і ад яе, апроч чыста мастацкіх функцыяў, чакалі выкананьня іншых задач: ідэалягічнай, маральнай, рэлігійнай, навукова-папулярнай і г.д. Калі ж камуністычная ідэалёгія збанкрутавала (ці, прынамсі, аптымістам так здалося); калі раптам высьветлілася, што асваеньне космасу й расшчапленьне атаму не зрабіла чалавека шчасьлівейшым; калі выявілася, што дабро й прыгажосьць — розныя рэчы, што зь сяўбой "разумнага, добрага, вечнага" лепей спраўляецца сьвятар-казаньнік, чым паэт-трыбун, і пісьменьнікам ня варта прэтэндаваць на чужыя сфэры ўплыву — тады адразу некалькі пакаленьняў чытачоў адчулі сябе падманутымі, у тым ліку літаратарамі, якія доўгія гады проста дурылі ім галаву. Нацыянальная форма па-ранейшаму асацыявалася ў чытача з сацыялістычным зьместам, таму ўстойлівы стэрэатып быў сфармаваны: беларускае — значыць ідэалягічна няўежнае і глыбока анахранічнае. Стэрэатып гэты дастаўся ў спадчыну й сёньняшняй маладой беларускай літаратуры. Яна павінна альбо зьнішчыць яго — альбо сама збанкрутаваць.

Ніякага заняпаду беларускай літаратуры няма. Частыя размовы пра заняпад маюць прычынай прызвычаенасьць да былой ненатуральна разьдзьмутай цікавасьці да літаратуры ўсіх і

кожнага. Сёньня ківач проста гайдануўся ў адваротны бок, і колькасьць спажыўцоў краснага пісьменства ў нас пачала набліжацца да сярэднестатыстычнага ў сьвеце. Але мяркую, што й сёньня літаратура (і нават паэзія) застаецца ў нас больш запатрабаванаю, чым ва ўсходніх альбо заходніх суседзяў. Бо й сёньня літаратура ў нас працягвае выконваць функцыі захаваньня гістарычнай памяці й нацыянальнай ідэнтычнасьці, захаваньня самой мовы, нарэшце, яна яўна ці прыхавана супрацьстаіць сёньняшняму рэжыму.

Як жа паводзіць сябе ў сёньняшніх умовах маладая паэзія? Спыняючыся на вершах маладых, заўважаеш іх засяроджанасьць на дзьвюх магістральных тэмах. Першую можна было б умоўна акрэсьліць як **мэта-паэтычную**. Гэта паэзія пра паэзію, пра пошук свайго месца ў паэтычнай традыцыі, пра ўласныя спробы на фоне творчасьці знакамітых папярэднікаў:

Няўжо ж і мы, ня вартыя пазногця
Шэксьпіра, патрапім-такі ў клясыкі?
Няўжо ж абагаўляцьмуць нас? Авохці
нам тады ўсім, прыхільнікам схалястыкі

ў навуцы паэтычнай, малаверным,
ня здатным да страфы нетрывіяльнае…
Ды ў некаторых з нас ужо цяпер нам
прымройваецца штосьці геніяльнае.
(Максім Шчур) [1]

Гэтыя творы могуць быць як надзвычай патаснымі, так і наскрозь несур'ёзнымі. Уласная мізэрнасьць перад тытанамі можа выклікаць трагічную роспач, а можа — тонкую самаіронію, можа абуджаць дэкадэнцкія настроі стомы, а можа — нахабнае жаданьне згуляць з традыцыяй у дзіцячы канструктар. Гэтыя тэндэнцыі, як у фокусе, сыходзяцца ў паэзіі Міхася Баярына. У адным і тым самым творы (ягоны вялікі памер гэта дазваляе!) паэт то робіць акцэнт на заняпадзе, зьмізарнеласьці, дэградацыі, стомленасьці, і мы чытаем:

надыходзіць восень буцьвее лістота ў парках
моўкнасьць засохлых руж у бутэльках ад пэпсы-колы
зялёнае паліто вісіць на гарышчы ў пыле

[1] **Цыт. паводле: Крыніца. № 1 (72), 2002. С. 159.**

[2] **Цыт. паводле: Крыніца. № 9 (55), 1999. С. 158—159.**

гаспадар памірае ніжэй паверхам
адысэі ж вяртаюцца анёлы падаюць долу
людзі ходзяць па сьметніках у пошуку нейкай ежы /…/
вось і вясна прылятаюць чужыя птушкі
холадна неяк на скразьняку ў калідоры
хто бы сказаў якое стагодзьдзе вонках
што за дынастыя зараз пануе у Паднябёснай
тое што было модным сталася зараз сьмецьцем
а тое што размаўляла змоўкла цяпер навечна
парваць на кавалкі дзёньнік раскідаць па ўсім раёне [2];
то спрабуе гуляць у дэміюрга, і тут ужо зьяўляюцца іранічныя інтанацыі й элемэнты пародыі:

стварыць гамэра ня так складана як падаецца на першы погляд
патрэбны толькі выдатны густ і крыху трываньня
нажніцы знойдуцца ёсьць жа краіны нікому амаль не вядомыя
калі ўжо няма дык ніхто ўсіх слоў ня ведае цалкам прыгожых імён дастаткова
і безумоўна ёсьць шмат паэтаў усімі забытых ёсьць шмат архіваў
мінімум тыдзень максімум паўстагодзьдзя зойме мантаж і жыцьцё
за гэты ж час сфармуецца кола невылечна бязвокіх вар'ятаў
усе будуць думаць што гэта школа на высьпе родас ці высьпе хіос
варта ўсе гэта зрабіць таямніцай а злашча той лёзунг
усё лепшае для гамэра тады ўсё атрымаецца добра [3].

Магічнае слова прамоўлена, ключавое імя паведамлена. "Стварыць Гамэра!", "Усё найлепшае — для Гамэра!" — мог бы напісаць на сваіх сьцягах не адзін малады паэт — нягледзячы на тое, што сёй-той зь іх не чытаў ня толькі "Іліяды", але й тэкстаў Баярына. Так і глядзяць на сьвет — праз "шырока заплюшчаныя вочы" Гамэра.

Асабліва кранальнымі выглядаюць рэфлексіі пра сваю заглыбленасьць у культуру як пра нешта непаўнавартаснае, ад чаго трэба камплексаваць, за што трэба прасіць прабачэньня; усе гэтыя спробы пабудаваць трагічную антыномію: паэзія альбо жыцьцё, літаратурныя эмоцыі альбо праўдзівыя пачуцьці. Дазволю сабе працытаваць верш Віктара Сьлінка, паўдзела "Глінянага Вялеса-2002":

[3] **Тамсама. С. 157.**

[4] **Цыт. паводле Віктар Слінко. Штольні**

Паэзія
Грэць камень,
Каб потым
Сагрэцца ля каменя?

Але побач са мною
Замярзаеш ты, —
А я
Нашу ў вежы цела
Каменнае сэрца,
Гляджу, як ты замярзаеш,
Праз байніцы вачэй.

Узыдзе загінуць
Рунь.
Расьцьвіце завянуць
Кітайская ружа.

Грэць камень,
Каб потым
Сагрэцца ля каменя?

А ты
Укленчыла, дзякуеш:
“Божа, які ты добры,
Які ласкавы
Да камянёў!..” [4]

вясны. — Менск, 2001. С. 66—67.

Іншы папулярны ў нашай маладой паэзіі матыў — рэфлексіі на тэму сваёй сьмяротнасьці. Запанавала сапраўдная мода, ***“какетлівы дзявочы суіцыд”***. Карціны ўласнага скону, самагубства ў рыфмаваных спробах сяміклясьніц-выдатніц уражваюць. Магчыма, яны не палохалі б так, калі б былі суцэльнай графаманіяй. Але гэта найярчэйшыя, найталенавіцейшыя радкі ў гэтых вучнёўскіх падборках. Ёсьць тут нешта ад наіўнай мары Тома Соера пабываць на ўласным пахаваньні, але такога тлумачэньня недастаткова.

Колісь Эдгар По напісаў, што сьмерць прыгожай жанчыны — самы паэтычны сюжэт у сьвеце. Тым больш калі іншыя спосабы дасягнуць патасу сучаснай літаратураю збольшага вычарпаныя...

Выхаваныя ў дыскурсе “памерці за…”, “ахвяраваць сабою дзеля…”, беларускія паэты раптам страцілі высакародную мэту самаахвярнасьці. Але ж інэрцыя гатоўнасьці да скону засталася, засталося цьмянае адчуваньне, што толькі сьмерць ёсьць тэмаю, вартаю прыгожых паэтычных пабудоваў. Пакутуючы без барыкадаў, на якіх можна было гераічна загінуць, малады лірычны герой усё часьцей углядаецца ў адкрытае акно. І вось, як іхныя папярэднікі, што гукалі вясну ў вышываных народных строях, паэты апранаюцца ў чорныя кашулі, выклікаючы сьмерць. Добра, што покуль справа абмяжоўваецца адно паэтычнымі мэтафарамі!
Толькі лянівы не абвінавачваў маладой беларускай паэзіі ў непапраўным інфантылізьме. Я б паставіў адваротны дыягназ — “заўчасная старасьць” маладых паэтаў. Напраўду, што шчэ аб’ядноўвае такіх розных ува ўсім іншым аўтараў, як Віктар Сьлінко й Міхась Баярын? (Дарэчы, адна з баярынскіх паэмаў называецца “Senectutes”, г.зн. старасьць.) Здаецца, яны й нарадзіліся з той раньняй хваравітай мудрасьцю, якая да звычайных людзей прыходзіць з гадамі й жыцьцёвымі расчараваньнямі.

Мы надта маладыя,
каб жыць,
і старыя, каб
ісьці на вайну.
Наш занятак —
хутчэй астыць.
Наша справа —
пайсьці ка дну.
(Вальжына Морт)
Ад літаратараў, што існуюць паводле прынцыпу memento mori, чытач ратуецца, натуральна, шукаючы ў паэзіі інфантылізму. І якія ж антыдоты ён знаходзіць?

Мінскевіч. Гэты літаратар сам перайменаваў сябе, назваўшыся Мінскевічам. Толькі адна драбніца турбуе: а раптам пераможа законны гістарычны назоў роднага гораду Сяргея — “Менск”? Што тады? Перайменавацца самому? Але ж варыянт “Мянскевіч” яўна саступае ў мілагучнасьці. Дый губляецца сугучнасьць зь імем літаратурнага папярэдніка — Адама

Міцкевіча.
Выбраўшы псэўданім, Серж Мінскевіч самохаць абраў сабе нябеснага патрона. Зорка геніяльнага рамантыка сьвеціць Сержу спадарожным сьвятлом. Наагул, стасункі Мінскевіча з папярэдняй традыцыяй пазбаўленыя тыповага для маладой літаратуры налёту пэсымізму й уласнай непаўнавартасьці. Жадаючы ашчасьлівіць сьвет сваімі ўрачыстымі санэтамі, паэт дазнаецца, што перад ім ужо быў Міцкевіч з “Крымскімі санэтамі”. Які ўдар ад клясыка! Але талерантны постмадэрніст заўсёды гатовы падставіць і другую шчаку — і пасьлядоўна, твор за творам, перапісвае Міцкевіча, робячы папраўку на новую эпоху й менскую гарадзкую тапаграфію. Сучасная эстэтыка дыктуе новыя правілы гульні: цяпер літаратурны плягіят не караецца, а, наадварот, горача вітаецца. Цытаваньне, стылізацыя, алюзіі й рэмінісцэнцыі — сучаснейшаю можа быць хіба толькі рэканструкцыя Гамэра! І рамантычныя топасы ажываюць у нас на вачах, увекавечваючы родны горад. Хто пасьля Сержа наважыцца сказаць, што Менск — гэта горад, якога няма?
Так, паэт бачыць абмежаванасьць уласных магчымасьцяў, але ня робіць з гэтага трагедыі. Зусім як у вядомым афарызьме, ён мог бы параўнаць сябе з карлікамі, што стаяць на плячах гігантаў — і таму бачаць далей. Паэту ўласьцівая самаіронія, таму зь цьвярозага пагляду на рэальнасьць не вынікае мізантропіі. Ён разумее сьціплае месца паэта ў сёньняшнім антыпаэтычным сьвеце. Яго герой чытае свае вершы на сьметніку, бо ў горадзе Менску, калі верыць аўтару, на кожным сьметніку сядзіць па паэту. “Грамадзкія адкіды”, — сказаў бы скептык. “Дух гораду, яго непаўторны твар”, — адказаў бы наш аўтар.
Эканомячы айчыннай мэталюргіі медзь і бронзу, сьціплы Серж у сваёй вядомай каліграме сам грае ролю ўласнага помніка, шырока разьвёўшы ногі й высока ўзьняўшы голаў. І гэтак мусіць стаяць, і будзе стаяць, *“і прастаіць яшчэ тысячу лет”*. І ўдзячныя *“таварышы нашчадкі”*, для якіх цяперашнія экспэрымэнтатары ў паэзіі з часам стануцца адназначнаю клясыкай, якія будуць цытаваць Сержа Мінскевіча, як ён сёньня цытуе аўтара перакладзеных ім жа “Дзядоў”, пабачаць гэты манумэнт і адчуюць радасьць пазнаваньня. Глядзіце, гэта ён, помнік і чалавек, вечны юнак беларускай паэзіі, genius loci

роднага гораду, хадзячы доказ пераемнасьці культуры, бяздомны паэта, о крый яго, Божа!

Жыбуль. Самы скандальны сярод маладых паэтаў і адначасова найпапулярнейшы ў далёкай ад паэзіі публікі аўтар — Віктар Жыбуль. Ён ня монстар, не злачынец і не псыхічна хворы. Хутчэй наадварот — ціхі, стрыманы малады чалавек з дыплёмам філёляга. Але ўражаньне інтэлігентнасьці імкліва разьвейваецца, калі ён пачынае чытаць свае тэксты. Часам здаецца, што паэт паставіў сабе мэтаю перайсьці ўсе магчымыя межы непрыстойнасьці й парушыць усе існыя ў цнатлівай дагэтуль беларускай паэзіі табу. Вы любіце духоўнасьць у літаратуры й шануеце таямніцу сьмерці? Тады вам спадабаецца сэанс нэкрафіліі ў выкананьні ягонага лірычнага героя. Вы пазьбягаеце ўсіх згадак цялеснага “нізу”? Тады лірычны герой Жыбуля пацешыць вас, расказаўшы, як любіць здаваць аналіз калу. Неяк падчас паэтычнай імпрэзы адна аматарка клясычнай лірыкі стамілася ад вэрлібраў ды супэрсучасных экспэрымэнтаў. Ёй захацелася чагосьці сьветлага й чыстага, патаснага й патрыятычнага. “А хто з вас шануе паэтычную традыцыю?” — зьвярнулася яна да ўдзельнікаў. Звычайна павольны Жыбуль зрэагаваў вокамгненна: “Я!” — падняў руку, устаў… і прадэклямаваў традыцыйна рымаваны верш пра тое, як беларускі хлопчык Ігнат бязьлітасна закатаваў гліста. Безьліч жудасьцяў, агіднасьцяў ды цынічных прызнаньняў з пэўнасьцю палохала б і бянтэжыла б чытача, каб не вялізарная іранічная дыстанцыя паміж аўтарам і ягонымі героямі. Пачвары паэта пры бліжэйшым разглядзе выглядаюць досыць сымпатычнымі, а кроў, што шчодра ліецца з ахвяраў, выяўляецца бяскрыўдным журавінавым сокам. Тэксты, відавочна, разьлічаныя на камічны эфэкт, і спажыўцы ўдзячна плацяць Жыбулю голасным рогатам. Вершаваны радок паэта лёгкі, культура вэрсыфікацыі высокая, а іранічны сюжэт інтрыгуе неспадзяванкамі. Паэтычная тэхніка аўтара дазваляе яму экспэрымэнтаваць у такім складаным жанры, як паліндромны верш і паэма, якіх ён напісаў удосталь. Іранічную манеру Жыбуля ахвотна пераймаюць пачаткоўцы, спакушаныя яго падманнай лёгкасьцю. Толькі вось з паліндромамі чамусь не даюць рады.

Жыбуля з прыемнасьцю слухаюць у клюбах, дзе ён выступае

разам з папулярнымі рок-гуртамі. Яго паэзію ахвотна абмяркоўваюць на інтэрнэт-форумах. Але посьпех мае й адваротны, небясьпечны для паэта бок. Прывучаны да сьмехавай рэакцыі залі на свае тэксты, паэт страціў іншыя крытэры ацэнкі ўласнай прадукцыі і абсалютна шчыра лічыць найлепшымі адно тыя творы, якія сустракаюцца гучным рогатам. У выніку нашумелая кніга паэта “Прыкры крык” выйшла няроўнай, і бясспрэчныя ўдачы чаргуюцца ў ёй з сапраўднымі “прыкрасьцямі”.
Да ліку ўдач належаць вершы пра паэзію й творы пацыфісцкага зьместу. У адрозьненьне ад іншых аўтараў паэзіі пра паэтаў, Жыбуль не спрабуе клянаваць Гамэра, а хутчэй зводзіць рахункі зь беларускай культурнай традыцыяй. У бадзёрым рытме дзіцячай лічылкі аўтар “высьцёбвае” штампы беларускай культуры псэўданародніцкага гатунку, але адначасова стварае й зьнішчальны партрэт новага “культурнага героя”, здольнага адно дулі паказваць. Што да пацыфізму й супраціву рэпрэсіўнай дзяржаве, дык абмяжуемся адным прыкладам:

З рагаткі я прыцэліўся ў варону,
А трапіў у міністра абароны.
Варонаў шмат, міністраў мала.
Даўно мне так не шанцавала.

Морт. Крохкая дзяўчынка, якую хочацца ўзяць на рукі й захінуць ад варожага сьвету, поўнага сэрыйных забойцаў, гвалтаўнікоў і людзей, абыякавых да паэзіі. А вось яе публічныя выступы — гэта выбух энэргіі, выклік, правакацыя, яўнае хуліганства, ледзь ня зьдзек з публікі — калі сядзіш агаломшаны, глыбока ўражаны, каб не сказаць “абражаны” — і хочацца крычаць: “Яшчэ! Яшчэ!”
Яе сапраўднае прозьвішча, Мартынава, нагадвае пра трагічны фінал Лермантава. Ейны псэўданім перакладаецца з французскай мовы як “мёртвая” (дасьціпны Юрась Барысевіч тлумачыць гэта тым, што ў школе яе пераехала Максімам Танкам). Да ўсяго, гэта яна прышчапіла нашай паэзіі новы стыль, які мы акрэсьлілі як “какетлівы дзявочы суіцыд”. Эстэтыка скандальных і трагічных расейскіх рок-паэтак — усіх гэтых Дзягілевых, Арэф’евых і Зэмфір — выгадна атабарылася ў вальжыніных вершах, якія проста просяцца на музыку. Гэта яна

знайшла адказ на балючае пытаньне Станіслава Ежы Леца: “Ну, добра. Ты праб’еш галавою дзірку ў сьцяне. Але што ты будзеш рабіць у суседняй камэры?” Знайшла, стварыўшы тэкст “Больніца” — самы знакаміты твор маладой беларускай паэзіі. Пакінуўшы пасьля сябе некалькіх эпігонак, яна, здаецца, астыла да вершаскладаньня й адчула ў сабе сталасьць, дастатковую для пісаньня прозы. Што ж, як на празаіка, яна паранейшаму выглядае ненармальна юнай дзяўчынкаю й паранейшаму выклікае жаданьне насіць яе на руках і абараняць ад варожага сьвету.

Сьлінка. Пра Таню Сьлінку можна гаварыць бясконца. Можна й бясконца казаць ёй камплімэнты. Абмяжуюся адным: яна дакладна ведае, чаго хоча ад літаратуры. Рызыкну сьцьвердзіць: досьведу тагасьветнага. Таня — рамантычная энтузіястка XXI стагодзьдзя ў гофманаўскім сэнсе слова. Іншасьвет вабіць паэтку люстраной паверхняй вады й плыўкай паверхняй люстэрка. І яна прагне зазірнуць за заслону й апынуцца з таго боку, імкнецца

Дадому за цагляную сьцену
дзе няма асфальту
дзе няма нічога апроч сьвятла
па-той бок люстэрка

Маленькая Алеся выпраўляецца ў Залюстроўе, і, здаецца, усе Люісы Кэралы ў сьвеце застылі з фотаапаратамі й схіліліся над нататнікамі. Зараз адбудзецца падзея. Зараз будзе палёт, і абпаленыя крылы, і падзеньне долу. Пэрформанс дзяўчынкі-Ікара, якая працуе без страхоўкі, бо дакладна ведае: усё, што з гэтага боку люстэрка, — адно генэральная рэпэтыцыя. Тацяна друкавала свае тэксты пад двума прозьвішчамі — “Сьлінка” й “Копыцева”. Непасьвечаныя могуць не атаясамліваць іх між сабою, і невыпадкова. Бо Таня — гэта Пратэй, чыя прырода — пераўвасабленьне. Яе невычарпальнай энэргіі зь лішкам хапіла б на некалькіх аўтараў; яе нястомнасьць і арганізацыйныя здольнасьці ўражваюць. За кароткі адцінак часу яна стварыла рэкордную колькасьць літаратурных маніфэстаў, арганізавала сама й узяла ўдзел у рэкорднай колькасьці пэрформансаў, і некаторыя з агучаных ёю лёзунгаў і мастацкіх жэстаў ужо разышліся на цытаты. Яна

выступіла ў іпастасі перакладчыка літаратуры й філязофіі, і пераклады яе выглядаюць падазрона прафэсійнымі. Яна нават пабывала галоўнай рэдактаркай аднаго часопісу. Некалі яна абавязкова напіша падручнік “Асновы навуковага нігілізму”, які будзе вывучацца ў школе пад прымусам. У далёкай пэрспэктыве яна бачыцца мне старшынёю Саюзу пісьменьнікаў Беларусі — і тады беларускае пісьменства пабачыць неба ў алмазах! Я пайду да яе ў намесьнікі, і час ад часу яна будзе праганяць мяне за кансэрватызм у густах і службовыя злоўжываньні. Але цэх літаратараў не разваліцца, бо за Таняю кожны ягоны ўдзельнік будзе дакладна ведаць, чаго ён хоча ад літаратуры.

Лайкоў. Вершаваныя рэфлексіі паэта пра паэзію, усе гэтыя “плаваньні” ў пошуках страчанага Гамэра могуць сустракацца й цесна пераплятацца з другою накрэсьленаю тут магістральнаю тэмай — тэмаю сьмерці. І мы атрымаем добраахвотны сыход у найлепшы сьвет — у краіну вандроўных сюжэтаў і вечных вобразаў, топасаў і архетыпаў. Гамэр-самазабойца выяўляецца Квінтам Гарацыем Флякам, дакладней — гарацыеўскім лебедзем. Сталеючы, брыдкае качаня беларускай паэзіі можа дарасьці да сустрэчы з антычнай Ледаю — і народзіцца прыўкрасная Алена, і выкрадуць яе траянцы, і будзе дзесяць гадоў вайна і яшчэ дзесяць гадоў — вяртаньне дадому. Але ж качаня-аксэлерат можа выбраць і іншы шлях ініцыяцыі, і тады яно згадвае пра сваю прысьвечанасьць богу Апалёну, сягае высока ў нябёсы й пяе апошнюю, лебядзіную песьню — праходзіць празь сьмерць, каб паспрабаваць сягнуць да несьмяротнасьці. Такімі амбіцыямі — ні болей ні меней! — апантаны лірычны герой Янкі Лайкова.
І неістотна, ці прачытаў наш вясковы малец усіх гэтых Гарацыяў і Бадлераў, Малярмэ й Рыльке, у чым мы яго мімаходзь абвінавацілі. Істотней іншае — агульныя, універсальныя законы мысьленьня, сьвядомага й падсьвядомага, якія няўхільна спрацоўваюць. Зьдзейсьніць самагубства — кінуцца ў водныя глыбіні, як “Тытанік”, як Гамункул, як бедная Ліза, як падводная каманда Жака-Іва Кусто, каб выйсьці сухім з вады й адрадзіцца ў новай якасьці. Мабыць, тапельцу Лайкова такі пашчасьціла, як тапельцу, бо ён не затрымаўся ў воднай стыхіі, і магутная

крылатая істота — не, нават ня лебедзь Гарацыя, а хутчэй незнаёмы старажытным рымлянам бамбардавальнік! — завісае над горадам і сьветам, і паэт абвяшчае: urbi et orbi — “*я — вольны птах*!”.

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]

Юры Андруховіч

Андрэй Хадановіч і перавагі акупацыйнага рэжыму

Андрей Хаданович. Листи з-під ковдри. — Київ, 2002.

ЮРЫ АНДРУХОВІЧ — пісьменьнік, лідэр сучаснай украінскай літаратуры. Празаік, паэт, эсэіст, аўтар трох паэтычных зборнікаў і трох раманаў. Аўтар літаратуразнаўчае дысэртацыі пра творчасьць Багдана-Ігара Антоныча. Жыве й працуе у Івана-Франкоўску. Апошнія творы, апублікаваныя у нашым часопісе,— эсэ "Shevchenko is OK" і раман "Маскавіяда"

Пра Рэспубліку Беларусь у нашых колах вядома тое, што там пераважна горш (ну добра, толькі *трохі* горш, да таго ж гэтае эфэмэрнае *трохі* з кожным палітычным сэзонам звужаецца да бясконца малой шчыліны). І ўсё-ткі, пра Рэспубліку Беларусь нам вядома тое, што там зусім трохі горш, чым у нас. І прэзыдэнт ня проста такі сабе аўтарытарны жартаўнік з моцнымі сантымэнтамі да дыктатарства, а сапраўдны дыктатар, да таго ж сыстэмны. І ягоныя пацаны — не якіясь там рамантычныя *орлы боевые*, як у нашага, а сапраўдныя злавесныя *эскадроны сьмерці*. (…) І сьцяг у іх яшчэ той

дарэвалюцыйны. І хітраватая прыстасаванка (а часам і ўтрыманка) апазыцыя, дарэчы, *трохі* больш ад нашай разрозьненая. І расійская мова ў іх — не якісьці нам ад аблівы жаргон міжнацыянальных кантактаў, а менавіта *сродак*, адзіны магчымы *сродак* ня быць раптоўна затрыманым добра трэніраванымі пацанамі ў цывільным. Вось толькі вы-мова (гэта калі з аднае мовы іншая так і вы-лазіць) падступна выдае партызанскае мінулае. І беспрацоўя ў іх няма, што сьведчыць пра суцэльна затарможаную — калі не каматозную — эканоміку. І бярозаў у іх значна больш. І куды ні зірні — усе параўнаньні на нашую карысьць.
Украінская рэфлексія што да ўсяго гэтага джэнтэльмэнскага набору найупарцейшых фактаў, як заўсёды, на вышыні: добра, што хоць у іх горш. Трохі горш, але ўсё-ткі.
Улетку 2000 году Менск запомніўся мне несамавітай чысьцінёю вуліц, узорна-паказальнаю дысцыплінай мінакоў, панаваньнем савецкай абрадавасьці, фальшыва-фальклёрнымі ансамблямі і — выразна выпісанай на чалавечых тварах ды рухах непрыязнаю апатыяй. Апроч таго, былі гатэльныя прастытуткі — усе чамусь атлетычныя, самыя навязьлівыя на ўсёй постсавецкай прасторы. Зь вечару яны проста бралі пад кантроль усе калідоры, і немагчыма было паўзь іх прасьлізнуць, ня страціўшы цнатлівасьці. Запомнілася таксама паўгадзіннае стаяньне ў спатнела-агрэсіўнай чарзе ў абменны пункт дзеля таго, каб нарэшце атрымаць замест сваіх дваццаці баксаў нейкія падазроныя мільёны, у якіх сам чорт галаву скруціць і ад якіх — на ўзроўні рэфлексу — хацелася як мага хучэй вызваліцца. Пасьля яшчэ былі юныя піянэры, якія на станцыі Берасьце чыталі вершаваны мантаж пра росквіт роднай Беларусі роднаю ж расійскаю мовай, — памятаю паэта-баска, левака й экстрэміста, які пляваўся на ўсе бакі й паўтараў “I hate this place! Гэтыя народныя аркестры, гэтыя прамовы, а галоўнае — гэтыя дзеці!.. У нас такое было за часамі Франка!”

Якога д’ябла там наагул, у гэтым запаведніку зь любоўна захаваным духам залатых сямідзясятых, узяўся нейкі баск?
А такога, якога і я, і ўсе мы — паўтары сотні пісьменьнікаў і журналістаў з усёй Эўропы. Называлася гэта “Літаратурны экспрэс’2000”, і не было на тое рады — наш цягнік мусіў зрабіць і такі прыпынак. Пройдзе нейкі месяц, нашае

падарожжа больш-менш пасьпяхова скончыцца ў Бэрліне, мы *ўсе разьбяжымся* па збольшага *нерусіфікаваных гарадох*, а пасьля пачнецца пара і-мэйлавага экстазу — усе да ўсіх пачнуць нешта пісаць, а найбольш — загадкавая фінка, жахліва дасьціпная спадарыня ў саламяным капелюшы з шырокімі палямі. Яна разашле на ўсе адрасы свой экспромт з бліскавічнымі сполахамі згадак пра кожны з гарадоў, у якіх мы пабывалі: “Лісабон — гэта дрэвы, якія квітнелі лілёвымі птушкамі… Бардо — так шмат віна… Парыж сьцякаў залатымі бруямі ад сьпёкі… Дортмунд — найлепшы з гатэляў… Рыга — вада й вада й вада й дождж і пахмельле… Менск — awful food…”

Ежа й сапраўды была жахліваю — зрэшты, гэта была тая самая ежа, па якой дагэтуль так тужаць мільёны суайчыньнікаў, то бок ежа, што пахла ўсімі тымі сямідзясятымі. Ёй цалкам адпавядала й піва на сьвяце народнага паэта Янкі Купалы, куды зьехаліся тысячы працоўных — перадусім у надзеі скарыстацца паслугамі *сьвяточнага выязнога гандлю па зьніжаных у гонар народнага паэта цэнах*, а таксама незьлічоныя й разрозьненыя купкі ўсялякіх *нацыяналістаў* (яны ж *дэмакраты*) зь бел-чырвона-белымі сьцягамі. Час ад часу міліцыянты, а хутчэй міліцаі, вышморгвалі зь іхных астраўных купаў аднаго-двух занадта самаахвярных і выводзілі прэч са сьвята, высокапрафэсійна заламаўшы за сьпіну рукі. Паміж заходнімі пісьменьнікамі пачало лунаць слова “фашызм”. Хаця мы, усходнія, называлі гэта куды прасьцей — “камунізмам”. Як кажуць у такіх выпадках — *на жаль, і першыя, і другія цалкам мелі рацыю*.

Але ў супрацьвагу гэтаму асабліваму стану (як бы яго акрэсьліць — можа, успамінаў пра будучыню?) нам трапілася ў гэтыя дні ў Менску й нешта зусім іншае — таварыства вельмі жывых маладых інтэлектуалаў. І ўсе яны выявіліся рэдактарамі й выдаўцамі нейкіх адчайна сафістыкаваных, да непрыстойнасьці тоўстых часопісаў, а таксама прамоўтарамі ўсялякіх іншых радыкальна сфармуляваных праектаў, якія маглі датычыць усяго на сьвеце: музыкі, моды, габрэяў, Цэнтральнай Эўропы, глябалізацыі, панславізму, парнаграфіі. Было страшэнна цікава й карысна — на некалькі доўгіх гадзін патрапіць у гэтым горадзе пад іхную лагодную апеку. Дзіўным чынам у гэтым таварыстве нават мясцовае піва, ужо ня раз да

таго голасна й бязьлітасна асьвістанае намі, набыло адметную якасьць. І нам адкрыўся нібыта іншы бок Месяца, зусім іншы Менск: маляўнічыя руіны, старыя дрэвы на гістарычных задворках, вынырнула нават цалкам прыстойная кавярня…

Таму, калі праз год я пазнаёміўся з паэтам Андрэем Хадановічам, я ўжо ведаў, што ён ня проста так, ня проста такі сабе змучаны госьць з краіны зь *ніжэйшым узроўнем дэмакратыі*, а самадастатковы герой, адзін з ключавых пэрсанажаў таго цудоўнага асяродзьдзя, якое на фоне ўсіх спэцыфічна айчынных умоваў творыць сучасную гарадзкую беларускую беларускамоўную культуру. Пра якую мы ў Маскве ведалі адно з кантрабандных музычных касэтаў Стрыха-лад, “NRM”. А можа, Хадановіч ужо й ня мае дачынення да гэтых зьяваў і тых касэтаў? Можа, дарэмна я прыплятаю сюды безумоўна вясёлую постаць да суворага мастацтва самаспаленьняў і грамадзянскіх пратэстаў? За колькі дзён да яго зьяўленьня ў надзіва сьпякотнай звонкай ад гермэнэўтычных дыскусіяў Ярэмчы, дзе я ўжо пабываў й трывала ў трохі запаволеным ад згаданай сьпёкі летняя перакладніцкая школа, мяне ўжо рыхтавалі да зьяўленьня Максім Стрыха [1], які між іншым абазваў мяне постмадэрністам і, магчыма, не памыліўся. Я пішу “магчыма”, бо сумняюся ня ў Стрыху, а ў постмадэрнізьме. Постмадэрнасьць Хадановіча, уласна кажучы, ляжыць на паверхні, дакладней — аж крычыць зь яе. Найперш падкрэсьленая каляжнасьць, цытатнасьць, пародыяцэнтрычнасьць. Ёсьць сэнс казаць нават пра жангляваньне ў старой добрай ірванцоўскай [2] сэнсавай вэрсіі — гэта рыса, якая недвухсэнсоўна яднае яго з “бубабізмам” [3], таму я ледзь пазьбягаю спакусы вынесьці ў назву гэтых сваіх нататак пра яго нешта накшталт “*Дэканструкцыя беларускага бубабізму*”. Уражваюць некаторыя пэрсанажы — супадзеньні й зьбегі, як, скажам, “*толькі ня трэба турбаваць*” у Хадановіча з “*Турбацыяй мас*” у Ірвановіча. Нібыта нібы адкрыцьцё ў фізыцы таго самага закону, зьдзейсьненае двума кабінэтнымі геніямі на двух супрацьлеглых канцах зямной паверхні (у школьных праграмах падкрэсьліваюць: *незалежна адзін ад аднаго*). Але й *адзін да аднаго* таксама дадаць да школьных праграмаў. О, гэтыя гульні ў постмадэрнізм…

[1] **Максім Стрыха** — **навукоўец, публіцыст, паэт, перакладчык. Зь беларускай перакладаў Славамір Адамовіча, Адама Глёбуса, Андрэя Хадановіча. Ягоныя артыкулы друкаваліся ў часопісе “ARCHE”.**

[2] **Аляксандар Ірванец — пісьменьнік, найбольшыя дасягненьні ягоныя — раманы “Дзеці Ра” і “Перакладчыкі вораў**

сэнсам і наадварот, дзе *страйк* на тытунёвай фабрыцы — усё не звычайны, а *лакі-страйк*, дзе згаданыя вышэйчасоі апынаюцца зусім побач з таксама, здаецца, ужо згаданымі, *баксамі,* дзе пісьменьнікі *Высьпяньскі* і *Астроўскі* — блізьняты, *сібірскага цырульніка* варта насамрэч трактаваць як *ЦРУльніка*, а чыста лінгвістычны тэрмін *амонімы* ў дыскусіі беларускіх абставінах пачынае ўнутрана перагукацца з *амонаўцамі*.

Словам, перад намі — стопрацэнтны віртуоз, марыўлас, лавэлас (апошняе — калі ўсур'ёз прымаць сьцьвердзаньні пэўных экспэртаў пра магчымасьць эратычнага пераканаўчага мовы).

Нехта менш зычлівы заўважыць у гэтым адно эстэтыку *слоўніка-жартоўніка*, згодна зь якой, напрыклад, *прадмоўжала* — гэта перакладчык з мовы хінды. Калі зьбегі такога кшталту выклікаюць у каго-небудзь з чытачоў раздражненьне, дык ім хутчэй ня варта занурацца ў суплёты Хадановіча як строфаў.

друкавалі ў часопісах "ARCHE", "Дзеяслоў". З Ад "Бу-Ба-Бу", скарочанае ад "Бурлеск, балаган, буфанада", — творчае групы, што абъядноўвала ўкраінскіх пісьменьнікаў Юр'я Андруховіча, Аляксандра Ірванца, Віктара Небарака.

Аднак разуменьне постмадэрнага як суцэльнай цытатнасьці, каляжнасьці ды гульлівасьці — настолькі павярхоўнае, на зубох навязлае й відавочнае, што так і хочацца яго ўшчэнт абвергнуць. Бо нішто занадта відавочнае ня можа быць праўдзівым, хочацца мне прадубляваць чыюсьці адвечную максыму.

Затое гаворка — і наагул, і ў выпадку Хадановіча — пра "постмадэрнізм" як самадастатковую самарэфлексію, вечнае распазнаваньне сябе й свайго месца асуджаная на няўдачу праз канчатковую размытасьць якіх-колечы каардынат, але толькі таму й цудоўнае. Гаворка пра эскапізм і самаабарону, пра тое, што (як бы гэта цішэй сказаць?) ісьціна даецца толькі ў момантах і можа быць зьяўленай нават на мытні пры старым замку. Гаворка пра бел-чырвона-белыя плямы на мапе згвалчанай Эўропы — вобраз, вакол якога можна дыскутаваць дванаццаць дзён і начэй. Але менавіта ў тым ягоная сіла, што якая заўгодна дыскусія выявіцца ніжэйшаю, чым ён сам.

І на заканчэньне — нешта ўжо цалкам камплімэнтарнае.

Сталася так, што дзякуючы яго, Андрэя Хадановіча, беларускамоўным намаганьням гэтая кніжка — безумоўна ўдалы перакладніцкі парад сучасных украінскіх паэтаў, прычым адразу некалькіх пакаленьняў і школаў (Стрыха! Жадан! Лучук! зрэдку Мар'яна Саўка! і вельмі пераканаўчы дэбют Дзьвеніславы Маціяш!). Перакладаньне з блізкай мовы, асабліва клясычна (у фармальным разуменьні) арганізаваных вершаў, — гэта такое жахлівае катаржніцтва з налётам мазахізму! Сам Хадановіч ня дасьць схлусіць… Але ж сталася. Наагул жа, калі б усе мы жылі зь ім сёньня ў нейкай такой вольнай Балта-Чарнаморскай канфэдэрацыі, дык варта было б выдаваць яго ва Ўкраіне не перакладаючы. Перавагі акупацыйнага рэжыму яшчэ і ў тым, што цяпер ён гаворыць з намі ўкраінскай — і ўсе мы робімся на аднаго паэта багацейшыя. Ці нават маладзейшыя?

Пераклала з украінскай
Марына Шода
паводле: Андрей Хаданович. Листи з-під ковдри. — Київ, 2002.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]

ВІТАЛЬ ПАНАМАРОЎ (нар. 1955) — кіеўскі філёзаф, эсэіст. Вялікі сябар Беларусі. Гэты тэкст быў спэцыяльна напісаны для часопіса “ARCHE”.

Віталь Панамароў

Ліставаньне з клясыкамі

Сваю Кіеўскую прамову 14 сакавіка 2002 году Андрэй Хадановіч распачаў канцэптуальным пытаньнем “А можна я ня буду выбачацца за тое, што гаварыцьму па-беларуску?”. Гэтым ён адразу нарысаваў магічнае кола для абароны ад дэманаў і пазначыў сваю “апошнюю тэрыторыю”. Ад Усходу паэт адмежаваў яе “Выбранымі месцамі зь ліставаньня Івана Жахлівага і Н. К. Крупскай”, ад Захаду — “Бабілёнскім праектам”.

Ідэя эпісталярнага дасьледаваньня падставаў расейскасьці даўно лунае ў наасфэры. Яшчэ чвэрць стагодзьдзя таму малады кіеўскі філёзаф Сяргей Кліновы разрабляў яе ў “Выбраных месцах зь ліставаньня Аляксандра Блока з Грыгорыем Распуціным”. З увагі на тагачаснае *Міністэрства любові* твор ня быў запісаны й загінуў разам з аўтарам. Ня дзіва, што і Кліновы, і Хадановіч угледжваюць асновы эўразійскай мэнтальнасьці ў спалучэньні інтэлігенцкага экстрэмізму з агрэсіўнасьцяй плебсу ды з абагаўленьнем сваволі нічым не абмежаванай дзяржаўнай улады.

Паводле Хадановіча, у царстве Жахлівага нават каляндар рэгулярна адсылае да Папрышчына — чаго вартае адно толькі сьвята *8 зэкавіка (8 кадеберезня)*! Час традыцыйнага грамадзтва рушыць па коле, “*і ваван володзя вовачка уладзімер // назаўсёды застанецца маладым*”. І няма на тое рады, апроч дэканструкцыі: кожны, хто глядзіць на гэную неаглядную раўніну з боку Міжмор’я, мімаволі пачуваецца маркізам дэ Кюстынам, нацыянальным дэмакратам, буржуазным нацыяналістам ці, нарэшце, перакладнікам Юр’я Андруховіча. Але ж з Захаду ў адказ на згадкі паэта пра *“каштоўны скарб Старога Сьвету”*, залатыя шляхецкія вольнасьці ды казацкі індывідуалізм чуваць толькі *“ніхт фэрштэйн”*. Правы чалавека? Нацыянальнае самавызначэньне? — Гэта, маўляў, палітнекарэктнасьць і вар’яцкі сэпаратызм, — ніхт фэрштэйн! Мабыць, паэт з цэнтру Эўропы проста вырачаны вечна чуць адусюль тыя добразычлівыя парады сьпяваць лепей “про Матрёшу, про Парашу, радость нашу”, пра ваганьне індэксу Доў Джонса ды правы сэкс-мяншыняў.

Заміж гэтага Хадановіч сьпявае свой слынны эпас пра пераможны паход *“бел-чырвона-белага вожыка-патрыёта”*.
У ягоных лістах на свабоду ідзецца пра бел-чырвона-белыя плямы на мапе Сярэдняй Эўропы, ужо амаль раздушанай ў каханьні Захаду да Расеі. А ягоныя пругкія “альбы альбарутэніка” (*“шыкоўныя ногі й даруй мовазнаўца адметныя персі”*) напэўна будуць выкрытыя на Далёкім Захадзе як праявы сэксызму, пасьля чаго гэты Сталкер рызыкуе стаць неўязным у Шэнгенскую Зону.
Аднак найлепей удаецца Хадановічу ліставаньне з клясыкамі. Адказваючы Цёмнаму Філёзафу з Эфэса, ён, здаецца, першым у эўрапейскай традыцыі заўважае, што вада ў гэтай гераклітавай плыні даўно застаялася. Зьмяшчаючы Лаліту ў Залюстроўі, паэт папярэджвае Ўладзімера Набокава, Гумбэрта Гумбэрта, Люіса Керала ды выкапнёвага птаха Дадо пра занадта хуткае вырастаньне дзяўчынак. Ды й каралеве ды Трыстану Тцара таксама не зашкодзіць пісьмова нагадаць пра іхныя абяцаньні аддаць *паўцарства за дада*. І вось — *“з пошты тупае палкоўнік: // Нарэшце ліст…”*
На пытаньне ў лістах зь Менску “Ще не вмерла Україна?” ў Кіеве прывычна адказваюць “Жыве Беларусь!”. Бо яна і

сапраўды не памерла, пакуль на заклік Аляксандра Ірванца “маси турбувати” Андрэй Хадановіч *“унушае сябе”*: *“толькі ня трэба мас турбаваць”*. Бо яна насамрэч жыве, пакуль між Мюнхенам ды Ялтаю гэты менскі перакладнік Малярмэ, Бэзансона і Бадлера адказвае Наталцы Білацэрківец: “*Я не хачу памірaць у Парыжы // я наагул памірaць не хачу*”.

З украінскай пераклаў
Алесь Пяткевіч

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

Лявон Баршчэўскі

У Бадлеравым абліччы

ЛЯВОН БАРШЧЭЎСКІ (нар. 1958) — перакладчык, пэдагог, палітычны дзеяч. Працуе ў Беларускім гуманітарным ліцэі.

У сярэдзіне 1990-х шмат хто, падмацоўваючыся досыць пераканаўчымі аргумэнтамі, пачаў сьцьвярджаць, што, маўляў, час новага беларускага Адраджэньня прамінуў, што гэтае Адраджэньне, пачаўшыся пры канцы 80-х гадоў мінулага стагодзьдзя, цяпер канчаткова скончылася. Спрачацца з гэткага кшталту цьверджаньнямі тут, напэўна, не выпадае. Аднак для мяне асабіста прыкметы сапраўднага беларускага Адраджэньня асацыююцца зь сярэдзінай 70-х, калі набыло вядомасьць па-за пісьменьніцка-крытычным ды філялягічна-студэнцкім асяродзьдзем сёе-тое з караткевічаўскай прозы (зборнік “Вока тайфуна”); аповесьці Быкава сталі перакладацца ня толькі ў Савецкім Саюзе ды сацкраінах, але й на Захадзе; нарэшце, выйшлі “Фаўст” Гётэ ў перакладзе Васіля Сёмухі ды зборнік выбранае лірыкі Фрэдэрыка Гарсія Лёркі, перакладзены Рыгорам Барадуліным пры грунтоўнай тэксталягічнай падрыхтоўцы Карласа Шэрмана. Прыкладна з таго самага часу выдавецтва “Мастацкая літаратура” пачало выпускаць спачатку па пятнаццаць, потым па дваццаць, а пасля па трыццаць і болей

перакладных кніг штогод, сярод якіх паступова ўсё больш важнае месца пачалі займаць пераклады ня толькі дзяжурна-абавязковых і ўхваленых прапагандай “вялікіх сяброў Савецкага Саюзу”. Прыкметныя сваім перакладчыцкім унёскам заставаліся найперш тыя ж Барадулін і Сёмуха, а таксама Янка Брыль, Максім Танк, Язэп Семяжон, Ніл Гілевіч, Янка Сіпакоў, Іван Пташнікаў, Сяргей Панізьнік... Тады ж актыўна далучаліся да перакладчыцкай справы літаратурна адораныя філёлягі Валянцін Рабкевіч, Сямён Дорскі, Уладзімер Чапега, Вадзім Небышынец, Анатоль Клышка, Якуб Лапатка, маладзейшыя Зьміцер Колас, Сяргей Шупа, Алесь Істомін, Галіна Дубянецкая, Сяргей Мурашка, Ірына Сьляповіч (Ідэльчык), Уладзімер Шчасны, Алесь Міхальчук...

Пасьля надышла тая самая славутая “перабудовачная” ды “постперабудовачная” пара. Узгадайма, што тады ж пра сябе заявілі новыя асобы ня толькі ў беларускай паэзіі ды прозе (што бывала й раней), але й у нацыянальнай палітыцы, розных мастацтвах, навуках. Натуральна, што ў гэты самы час запатрабаванасьць у беларускім мастацкім перакладзе таксама пачала рэальна расьці: шэраг выкладчыкаў замежнай літаратуры на факультэтах беларускае філялёгіі пачалі чытаць лекцыі па-беларуску, замежныя аўтары зьявіліся ў праграмах сярэдняй школы па беларускай літаратуры, у значнай колькасьці — у праграмах навастворанага Беларускага гуманітарнага ліцэю. І што ж? Менавіта ў гэтыя самыя гады ў фінансавай пятлі задушыліся спачатку гадавік “Далягляды”, потым — кніжныя сэрыі “Паэзія народаў свету”, “Бібліятэка замежнай прозы”, пазьней — “Скарбы сусветнай літаратуры”. Але галоўная праблема палягала ў тым, што, па сутнасьці, адпачатку “новае” Адраджэньне, насуперак усім спадзевам, не выводзіла ў шырокі сьвет новых імёнаў прафэсійных перакладчыкаў, прынамсі клясычнай паэзіі. Таленавітыя працы Алега Мінкіна (зборнікі вершаў Цыпрыяна Норвіда, Баляслава Лесьмяна, Леапольда Стафа) — якога ўжо ніяк нельга было назваць “маладым” альбо “пачаткоўцам” — збольшага выглядалі як забава ў параўнаньні з галоўным заняткам — стварэньнем уласных вершаў.
Інакш кажучы, наш мастацкі пераклад чакаў зьяўлення новага Сёмухі альбо Семяжона, Барадуліна альбо Разанава. І вось

прыйшоў Андрэй Хадановіч, якога асабіста я адкрыў для сябе ў ягоным Бадлеру, пра што мне і хацелася б крыху тут распавесьці.
Недзе ў канцы 1990 году ў букіністычнай кнігарні мне ўдалося прыдбаць (за тагачасную савецкую “дзясятку”) томік выбранай паэзіі Бадлера, выдадзены ў клясычнай сэрыі парыскага выдавецтва “Garnier”. Хацелася думаць, што калі-небудзь у самога стане сілаў ды часу зрабіць па-беларуску “Выбранае” з аднаго са сваіх улюбёных паэтаў. Час ішоў, а адвагі браццa за Бадлера так і не хапала. Аж, нарэшце, я прачытаў слыннага “Альбатроса” ў вэрсіі Хадановіча. У вочы адразу кінулася, што Андрэй не пайшоў сьледам за абсалютнай бальшынёй расійскіх перакладчыкаў Бадлера: рыфмы, якая, што называецца, “ляжыць на паверхні”, *“матросаў” — “альбатросаў”*, **у яго не было**!

Каб падмануць тугу, матросы ловяць часам
Тых альбатросаў, тых марскіх правадыроў,
Што ў моры з караблём страчаюцца сам-насам
І ў горкай бездані заўжды ля лаштыроў...

Souvent, pour s’amuser, les hommes d’équipage
Prennent des albatros, vastes oiseaux des mers,
Qui suivent, indolents compagnons de voyage,
Le navire glissant sur les gouffres amers.

Далейшае чытаньне падборак Хадановічавага Бадлера (у “Крыніцы”, “Першацвеце”, двух гадавіках “Annus Albaruthenicus”) канчаткова пераканалі мяне ў тым, што мне трэба браццa за кагосьці іншага з паэтаў-клясыкаў, а Бадлер па-беларуску ўжо адбыўся! Ня буду тут рабіць спробы рэцэнзаваць гэтыя пераклады, а замест гэтага прапаную атрымаць асалоду, пачытаўшы (пажадана ўголас) некаторыя выбраныя строфы зь іх.
У Бадлера:

...Tes yeux, où rien ne se révèle
De doux ni d’amer,
Sont deux bijoux froids où se mêle
L’or avec le fer.

A te voir marcher en cadence,
Belle d’abandon,
On dirait un serpent qui danse
Au bout d’un bâton...

У Хадановіча:
...Ні слодычы,
ані гаркоты
ў
вачэй глыбіні,
Адно серабро й
пазалота
ў
халоднай
гульні.

Рытмічныя
зьвівы такія
І
постаць твая
Чаруюць,
нібыта ля кія
Танцуе
зьмяя...
(“Танец
зьмяі”).

У Бадлера:

...Il te faut, pour gagner ton pain de chaque soir,
Comme un enfant de coeur, jouer de l’encensoir,
Chanter des *Te Deum* auxquels tu ne crois guère,

Ou, saltimbanque à jeun, étaler tes appas
Et ton rire trempé de pleurs qu’on ne voit pas,
Pour faire épanouir la rate du vulgaire.

У Хадановіча:

...Каб зарабіць свой хлеб, як служка пры царкве,
Што ладан там кадзіць і з гэтага жыве,
Амаль ня верачы, штодня пяеш *Te Deum*;
Ці агаляешся, спрабуючы насьпех
Крыўляцца й выціскаць зь нябачных сьлёзаў сьмех,
І блазанкай служыць заможным дабрадзеям.
(“Прадажная муза”).
У Бадлера:

O toison, moutonnant jusque sur l’encolure!
O boucles! O parfum chargé de nonchaloir!
Extase! Pour peupler ce soir l’alcôve obscure
Des souvenirs dormant dans cette chevelure,
Je la veux agiter dans l’air comme un mouchoir!

La langoureuse Asie et la brùlante Afrique,
Tout un monde lointain, absent, presque défunt,
Vit dans tes profondeurs, forêt aromatique!
Comme d’autres esprits voguent sur la musique,
Le mien, ô on amour! Nage sur ton parfum...
У Хадановіча:

О, лёканаў каскад, што падае на сьпіну!
О, пекнага руна найчараўнейшы пах!
Крануся іх красы, як водарнай хусьціны —
І прыцемны алькоў прасякнуць успаміны,
Схаваныя ў тваіх духмяных валасах!

І сьпёка Афрыкі, і ўсе аздобы Ўсходу,
Амаль забыты сьвет у новым харастве
Зьнячэўку паўстае, падняўшыся са споду.
Як людзі ў музыцы шукаюць асалоды,
Мой дух, нібы ў вадзе, у водары плыве...
(“Валасы”).

Цяпер зьвернемся да Хадановічавага перакладу аднаго з Бадлеравых вершаў у прозе з цыклу “Парыскі сплін” і паспрабуем параўнаць гэты пераклад з апублікаванай яшчэ ў 1983 годзе беларускай вэрсіяй добра вядомага літаратурнага перакладчыка з французскае мовы Зьмітра Коласа.

Арыгінал:
VIII
Le chien et le flacon
“— Mon beau chien, mon bon chien, mon cher toutou, approchez et venez respirer un excellent parfum acheté chez le meilleur parfumeur de la ville.”
Et le chien, en frétillant de la queue, ce qui est, je crois, chez ces pauvres êtres, le signe correspondant du rire et du sourire, s’approche et pose curieusement son nez humide sur le flacon débouché; puis reculant soudainement avec effroi, il aboie contre moi, en maniére de reproche.
“— Ah! misérable chien, si je vous avais offert un paquet d’excréments, vous l’auriez flairé avec délices et peut-être dévoré. Ainsi, vous-même, indigne compagnon de ma triste vie, vous ressemblez au public, à qui il ne faut jamais présenter des parfums délicats qui l’exaspérent, mais des ordures soigneusement choisies.”
Пераклад Зьмітра Коласа:
Сабака й парфума
— Сабачка міленькі, шчаня прыгожае, кудлацік добры мой, хадзі сюды, хадзі, нюхні дзівоснае парфумы, што я купіў у найлепшай парфумэрні гарадка.
І сабака, віхляючы хвастом — што ў гэтых небарак, па-мойму, адпавядае сьмеху ды ўсьмешцы, — падыходзіць і кладзе цікаўна свой вільготны нос на рыльца адкаркаванага флякона, але раптам з жахам кідаецца ўбок і пачынае на мяне брахаць, нібы з папрокам.
— Ах! Няшчасны мой сабака, калі б табе паднесьлі ў скрыначцы г[аўна], ты нюхаў бы яго з такою асалодай і нават, мабыць, зжэр. І ў гэтым ты, нікчэмны спадарожнік майго журботнага жыцьця, падобны да той публікі, якой ніколі не патрэбныя тонкія парфумы — яны яе занадта раздражняюць, — ёй трэба падаваць старанна згатаваную брыдоту”.

Пераклад Андрэя Хадановіча:
Сабака й флякон
“Мой мілы сабачка, мой добры сабачка, любы мой, хадзі сюды й панюхай, якую выдатную парфуму набыў я ў найлепшага ў месьце парфумніка”.
І сабака, матляючы хвастом, што, як мне ведама, у гэтых бедных істотаў адпавядае нашым сьмеху й усьмешцы,

падыходзіць і зь цікавасьцю тыцкае вільготным носам у адкрыты флякон; пасьля раптоўна ў страху падаецца задам і пачынае брахаць на мяне, нібы з дакорам.
“Ах ты, нікчэмны сабака! Калі б я прынёс табе пакунак з лайном, ты з асалодаю нюхаў бы яго, а магчыма б, і зжэр. Гэтым ты, нягодны паплечнік майго смутнага жыцця, падобны да публікі, якой патрэбныя ня вытанчаныя водары, што адно раздражняюць яе, а старанна падабраныя гідкасьці”.
Напэўна, пераклад Хадановіча крыху прайграе праз адсутнасьць у ім такіх перакладчыцкіх знаходак, якія ёсьць у Зьмітра Коласа: *“у найлепшай парфумэрні гарадка”*, альбо: *“кудлацік мой”*. Напэўна, больш дакладна адпавядае французскаму першаўзору Коласава *“...у гэтых небарак, **па-мойму**, адпавядае сьмеху і ўсьмешцы”*, чым, як у Хадановіча, *“...як мне ведама, у гэтых бедных істотаў адпавядае нашым смеху й усьмешцы*”. Відаць, *“старанна згатаваная брыдота”* (у Коласа) па-беларуску гучыць больш арганічна, чым *“старанна падабраныя гідкасьці”* (у Хадановіча). Але затое, на маю думку, пераклад Хадановіча лепш упарадкаваны рытмічна і ў гэтым сэнсе лепш чытаецца.
Андрэй Хадановіч не баіцца ў перакладзе паспаборнічаць і з самім Максімам Багдановічам. Гэтак, ён зрабіў другі пасьля нашага клясыка паэзіі пераклад з лаціны оды Гарацыя “Да Мэльпамэны” (у Багдановічавым перакладзе — “Памятнік”). Мушу сказаць, што пераклад Андрэя ў сваёй паэтычнасьці наўрад ці прайграе клясычнаму. У Хадановіча, відаць, больш дакладна перададзены Гарацыевы выразы “*aere perennius*” — “трывалéйшы за медзь” (хоць націск у слове *трывалейшы* выклікае сумнеў), “*innumerabilis| annorum series*” — “ані бясконцы бег/ Незьлічоных гадоў”, “*qua violens| obstrepit Aufidus| et qua pauper aquae| Daunus agrestium| regnavit populor(um)*” — “дзе ў бязводным краі стэпавым людам Даўн / Валадарыў, дзе мчыць воды свае Аўфід” (хоць інвэрсія тут крыху парушае дасканаласьць паэтычнае вымовы). Што праўда, у новым перакладзе ёсьць і страты: маю на ўвазе інтэрпрэтацыі такіх Гарацыевых выразаў, як “*aquilo impotens*”, “*vitabit Libitin(am)*”, “*usque ego postera| crescam laude recens*”. Зрэшты, пра свае цяжкасьці пры перакладзе гэтага верша Андрэй Хадановіч сам распавёў у 45-м выпуску “Крыніцы”, пары яе квітненьня.
Думаю, што Андрэй Хадановіч-перакладчык ужо зрабіў свой

пэўны ўнёсак у наша *літаратурна-моўнае пашырэньне*. Здаецца, асабліва яскрава гэта выяўляецца ў ягоных перакладах з Малярмэ (*нязмога, нязможны, сінец, наўскід, кунежніца, беліня, павернік, багоміць, саладзіня, сьвятоўны, насамрэчны, зьнежывелы, ахарона, заклікач* і інш.), Ейтса (*шкумацьцё, старэчасьць, сіг, зьліва, саміца* і інш.)

Мабыць, кожны, хто прачытае гэтыя радкі, пагодзіцца са мною: у паэтычных перакладах Андрэя Хадановіча — як згаданых тут, гэтак і не згаданых (Ж. дэ Нэрваля, Э. Дыкенсан, Г. Апалінэра, У.Х. Одэна, Сэн-Жона Пэрса, Э. Паўнда, Ч. Мілаша, Ю. Андруховіча ды інш.) — ёсьць самае галоўнае: бездакорны густ і здаровая самапавага да свайго паэтычнага чуцьця. Ставячыся да клясыкі з пашанотаю, ён, разам з тым, "не ламае шапку" перад знакамітымі паэтамі, а давяраецца сваёй творчай інтуіцыі, якая амаль ніколі яго не падводзіць. Натуральна, можна спрачацца з тымі альбо іншымі інтэрпрэтацыямі клясычных вобразаў, зробленымі Андрэем. Аднак пры гэтым нельга не заўважыць аднаго: Хадановіч падсьвечвае кожную сваю перакладчыцкую працу ўласным паэтычным талентам, а таксама сваёй літаратуразнаўчай эрудыцыяй.

З прыходам у беларускі паэтычны пераклад Андрэя Хадановіча ў мяне (і, спадзяюся, ня толькі ў мяне) на душы зрабілася лягчэй ды спакайней. Адно каб не надумаўся Андрэй аддаць поўную перавагу ўласнай вершатворчасьці.

Хачу тут патлумачыць прычыну гэтае свае занепакоенасьці. Сёньня Беларусь дажыла да такога стану, што дзяржаўныя выдавецтвы не друкуюць кніжак сусьветнай клясыкі, прафэсійна перакладзеных з моваў арыгіналу — пагатоў кніжак беларускіх перакладаў паэзіі. Гэтак, ужо даўно, з раманамі Кляўса Мана, Штэфана Гайма, Патрыка Зюскінда, аповесьцямі Э.Т.А. Гофмана, "у стале" ў Васіля Сёмухі ляжыць "Кніга гадзінаў" Райнэра Марыя Рылькэ. Аўтар гэтых радкоў спрабаваў пашукаць фундатараў на яе выданьне, а таксама на выданьне паэзіі Бадлера ў перакладзе Андрэя Хадановіча, але выніку ніякага не дамогся. І ўсё-такі ёсьць спадзеў, што гэтаксама, як здолелі знайсьціся прыватныя фундатары для выданьня шматпакутнага зборніка французскіх паэтаў Плеяды ў перакладзе Ніны Мацяш (у якім таксама ёсьць і перамогі, і паразы перакладчыцы), гэтак знойдуцца яны й для таго, каб бліжэйшым часам у кніжным выглядзе зьявіліся агучаныя па-

беларуску Андрэем Хадановічам Бадлер і Малярмэ, Ейтс і Апалінэр, Мілаш і Андруховіч...

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]

Франсуа Віён

Эпітафія Віёна (Баляда шыбенікаў)

Пачцівыя, спагадлівыя людзі,
Браты, што нас перажылі, нябог,
Хто да няшчасных літасьцівым будзе,
З таго калісьці зьлітуецца Бог!
Вось мы ў пятлі ўпяцёх альбо ўшасьцёх,
А цела хорам, колісь дагляданы,
Дазваньня зруйнаваны, пажыраны
І жменькай пылу зробіцца ў свой час.
Тут не дарэчы зьдзек і гумар танны:
Малецеся Ўсявышняму за нас!

Няўжо з пагардаю ці ў перапудзе
Забудзеце аб ветраных братох?
Няхай нас пакарала Правасудзьдзе,
Ды хто зь людзей спакусу перамог?
Пусьцеце міласэрнасьць на парог,
Каб справядлівы сын Марыі Панны

Нам дараваў правіны і заганы
І ўратаваньне душаў нам прыпас.
Спакой памерлых варты вашай шаны,
Малецеся Ўсявышняму за нас!

Мы парахнеем у брыдзе і брудзе
На ростанях усіх зямных дарог,
Нам зьлівы да касьцей прамылі грудзі,
Птах выдзеўб нашы вочы, як гарох,
Бароды й бровы скуб, як толькі мог.
Нас не чакае супакой жаданы:
Туды-сюды вятрыска несьціханы
Нас гойдае, астатнім напаказ.
Дык пашкадуйце, людзі, нашы раны,
Малецеся Ўсявышняму за нас!

Ісусе, Збаўца, ўсімі шанаваны,
Хай лёс пякельны, нам наканаваны,
Ахвяраў абміне на гэты раз!
Хто з нас сьмяецца, будзе пакараны!
Малецеся Ўсявышняму за нас!
Пераклаў Андрэй Хадановіч

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

Шарль Бадлер

Танец сьмерці

Зграбнюткая хада, пальчаткі, вэлюм, кветкі,
Спакусьлівы пагляд і таямнічы ўздых,
Багаты арсэнал дасьведчанай какеткі —
Усё як у людзей, усё як у жывых.

Хіба танчэйшы стан ты сустракаў на балі?
А каралеўскі строй дзівоснай шырыні?
Ці ж ножкі лепшыя калісьці абувалі
Ў малыя туфлікі? Ня бачыў? Дык зірні!

Паўзьверх худых ключыц, пастаўлены на варту
Цнатлівае красы, бруіцца лёгкі руш:
Ад жарсных позіркаў ці ад ліхога жарту
Прывабнасьці схаваў, якіх, глядзі, ня руш!

У глыбіні вачэй сутоньне й паражнеча,
Вянок на чэрапе — ну чым не валасы! —
На крохкіх пазванках гайдаецца й трапеча.
О, вытанчаны бляск магільнае красы!

Хтось іншы назаве брыдой цябе, магчыма:
Тым, хто багоміць плоць, не зразумець, чаму
Я на цябе гляджу прыязнымі вачыма,
Чым спадабалася так сэрцу ты майму!

Ці ты прыйшла сюды, каб сапсаваць ім сьвята
Усьмешкаю з труны? Альбо спакусы зноў
У зман цябе ўвядуць, і кінешся зацята
Прыемнасьці лавіць на шабасе лгуноў?

Ці спадзяешся ты, што ў оргіях вірлівых
Пагасіш пекла жар, запалены ў душы?
Што ў сьвечак полымі й скрыпічных пералівах
Свой зьдзеклівы кашмар забудзеш? Не сьмяшы!

О, перагонны куб дурноты і пакуты,
Дзе дыстылюе боль самаахвярны кат!
Я чую, як сычыць, між рэбрамі закуты,
Ў сярэдзіне цябе узгадаваны гад!

Прывабнасьці твае — не для мужчын тутэйшых,
Жахліваю красой іх цьвеліш ты дарма.
Усё ідзе на глум, бо толькі наймацнейшых
Чаруе вусьцішнасьць, а тут такіх няма!

Адвечнаю жудой твае сьвідруюць вочы —
Тут цяжка не самлець; і кавалер любы
Ледзь-ледзь стрымае млосьць, пабачыўшы жаночы
Какетлівы ашчэр на трыццаць два зубы.

А зрэшты, хто ня браў нябожчыка ў абдымкі
І хто з жывых людзей ня выкармак труны?
Хто пудры не ўжываў? А штучнае радзімкі?
Таксама і яна. Дык што, прыгажуны?..

Царыца паталух, бязносая гітана,
Да скакуноў ідзі й скажы ім напрамкі:
“Нягледзячы на ўсе парфумы і румяны,
Вы ўжо адчулі сьмерць! Амаль што мерцьвякі

Ты, лысы Лявэляс, юрлівы ашуканец,
Ты, Антыной сівы, сапселы пакрысе, —
Разьюшаная Сьмерць вас зацягнула ў танец
І немавед куды нясе, нясе, нясе!

На Сэны берагох і на сьпякотным Гангу
Сьмяротных чарада гарэзіць да пары,
Ня бачыць, што бяда стаіць ужо на ганку
Й Анёльская труба ўжо зеўрыць угары.

Пацешны род людзкі, з камэдыяй няшчырай
Па ўсіх зямных краёх крыўляйся і скачы:
Глядачкай будзе Сьмерць, надушаная мірай,
Іронію сваю ў твой шал дадаючы!”
Пераклаў Андрэй Хадановіч

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]

Арцюр Рэмбо

Баль шыбенікаў

Вялебны
Вэльзэвул
валадаром на
балі:
Крыўлякаў, што
ў пятлі
блюзьнераць
задарма,
Б'е туфляю па
лбах, каб
весялей скакалі
Пад
акампанэмэнт
каляднага
псальма.

І кожны
ачмурэў,
страсае ў танцы
косьці,

Аб грудзі б’е
грудзьмі, бы
грукае ў
тамтам,
Прыпадачна
хрыпіць у
вычварнай
мілосьці,
Хоць колісь
прыпадаў да
вытанчаных
дам.

Агромністы
памост дае
танцорам
шанец —
Гоп! — весела
скакаць бязь
мяса і вантроб!
І ўжо не
зразумець, ці
гэта бой, ці
танец!
Рве струны
Вэльзэвул,
вядомы
філянтроп!

Кашуляў
скураных
пазбыліся
амаль што,
Абутак не псуе
ім лёгкае
ступы,
Ня муляе даўно
шляхетных
шыяў гальштук,
А сьнег

капелюшы
напнуў на
чарапы.

Крумкач, нібы
султан, сядае
на галовы.
Вісіць на
барадзе шматок
былой шчакі.
Здаецца,
ваяром,
расьцятым да
паловы,
Кардоннага
мяча ня
выпусьціць з
рукі.

Ад гойсаньня
ўваччу
хістаюцца
нябёсы,
Лілёвыя лясы
працяў ваўчыны
сквіл,
Вісельня, як
арган, скавыча
шматгалоса
Й пякельнай
чырваньню
палае небасхіл.

А ну, хутчэй
скакаць,
здыхляціна
старая,
Што лашчыць
неўпрыкмет
ружанец

пазванкоў,
Нібыта пацеркі
манах
перабірае:
Тут вам не
манастыр, а
кодла
мерцьвякоў!

Ах! вунь,
сапселы ўшчэнт
ад замагільных
скокаў,
Вялізарны
шкілет узьняўся
на дыбкі,
Узьвіўся ў
вышыню,
шчасьліва
загалёкаў,
Ды раптам зноў
адчуў пятлі
прыгнёт цяжкі,

І зь енкамі, што
так падобныя
да кпінаў,
Сьціскаючы ў
кулак
нявыслаўлены
жаль,
Як блазан, што
на міг свой
балаган
пакінуў,
Пад музыку
касьцей
вяртаецца на
баль.

На шыбеніцы
апантана
Ўсё танчаць,
танчаць, вісячы,
Шкілеты з
воінства
Шатана,
Пякельныя
паслугачы.

На шыбеніцы апантана
Ўсё танчаць, танчаць, вісячы,
Шкілеты з воінства Шатана,
Пякельныя паслугачы.

Пераклаў Андрэй Хадановіч

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

[image]
A R C H E Пачатак № 3 (23) – 2002
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image]
[image]

межаў — зыходзяць імпульсы дэмакратызацыі. Пасьля шматгадовай бясплённай барацьбы зь Вярхоўным Саветам 13-га скліканьня, дэмакратычна абраным ў 1995—1996 гадах на аснове дэмакратычнай канстытуцыі 1994 году, Аляксандар Лукашэнка дамогся прыняцьця на спрэчным рэфэрэндуме ў лістападзе 1996 году аўтарытарнай канстытуцыі, якая гарантавала амаль усім прэзыдэнту кантроль над усёй дзяржаўнай уладай[1]. Канстытуцыя скасавала падзел уладаў і змаргіналізавала значэньне такіх незалежных структур, як палітычныя партыі, недзяржаўныя арганізацыі і незалежныя СМІ[1].

Расейская Фэдэрацыя і іншыя дзяржавы — удзельніцы СНД, пагадзіліся са скасаваньнем дэмакратычнай канстытуцыі, зьдзейсьненым шляхам бяскроўнага дзяржаўнага перавароту. Гэта азначае, што дзяржавы — удзельніцы СНД будуюць супрацоўніцтва не на аснове прынцыпаў, якія яны выбралі як сябры НБСЭ * (пазьней АБСЭ), падпісаўшы Капэнгагенскі і Парыскія дакумэнты НБСЭ 1990 году, а на аснове неўмяшаньня ў ўнутраныя справы дзяржаваў-удзельніц. СНД, такім чынам, не ўяўляе сабой супольнасьці, што грунтуецца на агульных вартасьцях (правы чалавека, дэмакратыя, вяршэнства права), як таго патрабуе, напрыклад, Эўразьвяз, а ёсьць толькі эканамічны аб'яднаньнем незалежных дзяржаваў на грунце бінарных супольных інтарэсаў. Можна нават гаварыць пра адзінства інтарэсаў гэтых дзяржаваў у дачыненьні да АБСЭ, якія разыходзяцца са спробамі балышыні краінаў — удзельніц АБСЭ ўзмацніць працэсы дэмакратычнай трансфармацыі ў дзяржавах СНД.

Двайныя стандарты?

Па 11 верасьня 2001 году, у сьвятле барацьбы зь міжнародным тэрарызмам, ачоленай перадусім ЗША пры падтрымцы Расеі і некаторых цэнтральнаазіяцкіх дзяржаваў, спрыяньне працэсам дэмакратычнай трансфармацыі гэтых краінаў з боку эўрапейскіх структураў, у тым ліку АБСЭ, згубіла свой ранейшы прыярытэт. Беларусь спрабавала скарыстаць гэтага разьвіцьця падзеяў і энэргічна патрабавала ад Захаду “раўнапраўнасьці”. Беларусь абвінавачвае заходніх краінаў ў палітыцы двайных стандартаў: Захад глядзіць на ўзмацненьне “канцэнтрацыі ўсёй паўнаты ўлады ў руках прэзыдэнта”, здушэньне апазыцыі, а таксама грубае

[1] **Astrid Sahm. Schleichender Staatsstreich in Belarus’. Hintergründe und Konsequenzen des Verfassungsreferendums vom November 1996 // Osteuropa. 1997. № 5. S. 475–487.**

[*] **Нарадзіна ў выніку бясконцых супрацоўніцтва ў Эўропе (маўв. перакладчыка).**

[2] **Заходніх краінаў назвалі ўзаконіць беларускіх**

фальсыфікацыі выбараў у цэнтральнаазіяцкіх дзяржавах і закаўкаскіх рэспубліках, не дапускаючы абмежаванняў статусу гэтых дзяржаваў у эўрапейскіх арганізацыях, у тым ліку парушэньні ў Беларусі, на думку заходніх арганізацый, апраўдваюць падаўжэньне ўведзеных ў 1996 годзе санкцый.[2] На першы погляд, аргумэнтацыя Беларусі падаецца пераканаўчай. Аднак пад увагу не бярэцца тое, што з 1991 да 1996 году Беларусь актыўна будавала дзяржаву, заснаваную на дэмакратычных прынцыпах, у якой лібэральная (ЗША) мадэль падзелаў уладаў, вяршэнствам права і захаваньнем правоў чалавека сталася “дзяржаватворнай філязофіяй”. “Канстытуцыйны пераварот” Лукашэнкі паклаў гэтаму канец. Адбылося вяртаньне да такой мадэлі дэмакратыі, якую вызначыць як папулісцкую, да вэртыкальнай канцэнтрацыі ўлады, парушэньня правоў чалавека, перадусім права на свабоды слова і сходаў. Патрабаваньне эўрапейскіх інстытуцыяў да Лукашэнкавага рэжыму вярнуць дэмакратычную канстытуцыю 1994 году паступова трансфармавалася ў патрабаваньне зрабіць пэўныя крокі ў ізноў увесьці дэмакратыю паводле стандартаў АБСЭ. Умовай правядзеньня гэтых захадаў, якія можна было вынайсьці ў аднабаковым парадку, або шляхам перамоваў з дэмакратычнай апазыцыяй, было абяцана аднавіць былы статус Беларусі ў эўрапейскіх арганізацыях, забясьпечыўшы:

• удзел нацыянальнага сходу ў працы Парлямэнцкай Асамблеі АБСЭ;

• наданьне краіне статусу спэцыяльна запрошанай у Раду Эўропы — статусу, які быў нададзены яшчэ ў пачатку дзевяностых гадоў, але быў прыпынены пасьля канстытуцыйнага пераваротy ў лістападзе 1996 году;

• ратыфікацыю “Дамовы паміж Эўрапейскім Зьвязам і Беларусяй аб супрацоўніцтве і партнэрстве”, якая была ўкладзеная яшчэ да пераваротy, а ў некаторых дзяржавах — удзельніцах ЭЗ нават ратыфікаваная. Дамова агаворвала дэмакратызацыю як адну зь перадумоваў супрацоўніцтва. Такім чынам, пазыцыя эўрапейскіх арганізацыяў што да Беларусі па зразумелых прычынах адрозьніваецца ад пазыцыі Захаду што да цэнтральнаазіяцкага і закаўкаскага рэгіёнаў.

Беларусь як выпрабаваньне на трываласьць для АБСЭ

удзельніцах ЭЗ нават ратыфікаваная. Дамова агаворвала дэмакратызацыю як адну зь перадумоваў супрацоўніцтва. Такім чынам, пазыцыя эўрапейскіх арганізацыяў што да Беларусі па зразумелых прычынах адрозьніваецца ад пазыцыі Захаду што да цэнтральнаазіяцкага і закаўкаскага рэгіёнаў.

Беларусь як выпрабаваньне на трываласьць для АБСЭ

[2] Напрыклад, так зрабіла Ўстаноўчая сэсія Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ ў бундэстагу 12 кастрычніка 2001 г. Ўдзельнікі сэсіі прамовы ў бундэстагу выказаліся сьвяроўкай нямецкай дэлегацыі і ў БДІПЧ АБСЭ. Ужо ў Рабочай групы да Беларусі Парлямэнцкага сходу АБСЭ; http://www.spd-offenbach.de/varia/Berlin/reden/20001012.htm.

У лістападзе 2000 году Расея і Беларусь не дапусцілі прыняцьця супольнай заявы па выніках канфэрэнцыі міністраў замежных справаў краінаў — удзельніц АБСЭ ў Вене, у якой давалася крытычная ацэнка расейскай палітыцы ў Чачэніі, а таксама пазыцыі беларускага кіраўніцтва што да праблемы дэмакратызацыі ў краіне. У сьнежні 2001 году на канфэрэнцыі міністраў замежных справаў краінаў — удзельніц АБСЭ ў Бухарэсьце гаворка ішла ў першую чаргу аб супрацьдзеяньні тэрарызму. Таксама вырашана прыняць не адну ўсёабсяжную заяву, якая ахоплівала ўсе крытычныя пытаньні, а шэраг асобных заяваў па пякучых праблемах — за выняткам праблемы Беларусі. Беларускі міністар замежных справаў Міхаіл Хвастоў заявіў потым, што, маўляў, на парадку дня АБСЭ беларускае пытаньне больш не стаіць[3].

У сапраўднасьці ўсё было інакш: на карту была пастаўлена імавернасьць і дзеяздольнасьць АБСЭ як ініцыятара дэмакратычных працэсаў і сілаў у дзяржавах — удзельніцах Арганізацыі.

На канфэрэнцыі міністраў замежных справаў краінаў — удзельніц АБСЭ ў Бухарэсьце Расея дамаглася чарговага абмежаваньня мандату місіі АБСЭ па чачэнскім канфлікце. Адначасова ёй давялося пагадзіцца са сканчэньнем мандатаў АБСЭ ў Латвіі і Эстоніі — місій, пакліканых перадусім паляпшаць раўнапраўе грамадзянаў расейскага паходжаньня ў Латвіі і Эстоніі. У Расеі, місіі ня выканалі свайго заданьня ў належнай меры. Беларусь ня здолела дамагчыся абмежаваньня часу перабываньня місіі АБСЭ ў Беларусі. Але сваёй адмовай выдаць візы сябрам місіі беларускае кіраўніцтва халадней выкліча падрывае эфэктыўнасьць і аўтарытэт місіі ў прыватнасьці і АБСЭ ў цэлым. Ці можа Беларусь рабіць гэта бесьпакарана? Наўрад ці.

Але ці здольная АБСЭ да ўзгодненых дзеяньняў супраць Беларусі, яшчэ няясна. Парадак прыняцьця рашэньняў АБСЭ грунтуецца на прынцыпе аднагалоснасьці “мінус адзін” — калі выключаецца голас краіны, якая ў адпаведным спрэчным выпадку выступае закранутым бокам. Дзеля таго што з боку дзяржаваў — удзельніц СНД нарастае супраціў тэндэнцыі АБСЭ пераключыць сваю асноўную актыўнасьць з Балканаў на ўкараненьне заходняй мадэлі дэмакратыі і абарону правоў

[3] Так сказаў міністар замежных справаў краіны Хвастоў на прэсавай канфэрэнцыі ў Менску 11.12.2001 г.

Стенограмма пресс-конференции Министра иностранных дел Республики Беларусь М.М. Хвостова для представителей белорусских и зарубежных СМИ, состоявшейся в МИД Беларуси 11 декабря 2001 года; www.mfa.gov.by.

чалавека ў краінах — спадкаемцах СССР, паўстаюць тры важныя пытаньні. Ці можа АБСЭ разьлічваць на падтрымку дзяржавамі — удзельніцамі СНД сваёй пазыцыі што да Беларусі і сваёй заангажаванасьці ў пабудову дэмакратыі ў гэтай краіне? Ці будзе ў сувязі з гэтым магчымы працяг дзейнасьці Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЭ ў той самай форме, у якой яна ажыцьцяўлялася ў 1997—2001 гадох пры падтрымцы эўрапейскіх арганізацыяў і адмысловых фінансавых унёскаў асобных дзяржаваў-удзельніц — шляхам дыялёгу з урадам, апазыцыяй і няўрадавымі арганізацыямі — і дасягнула значных вынікаў? Ці не падрывае палітыка канструктыўнай заангажаванасьці ў Беларусь унутраную цэльнасьць АБСЭ і тым самым ці ня ставіць пад сумнеў ейнае існаваньне? У любым выпадку відавочна: Беларусь сталася для АБСЭ выпрабаваньнем на трываласьць. Адначасова Беларусь зьяўляецца лякмусавай паперкай зацікаўленасьці дзяржаваў — удзельніц СНД у дэмакратызацыі сваіх краінаў. АБСЭ ня здолела дамагчыся прыняцьця стандартаў АБСЭ у грамадзянскай супольнасьці ў бальшыні краінаў СНД, хоць трэба адцеміць, што ў некаторых дзяржавах — у прыватнасьці, Расейскай Фэдэрацыі, Украіне, Грузіі, а таксама Арменіі — ёсьць спадзеўныя пачаткі ўкараненьня дэмакратычных прынцыпаў у дзяржаўных структурах і ў грамадзянскай супольнасьці.

Дзяржавы СНД дагэтуль ня выявіліся прыхільніцамі разьвіцьця дэмакратыі ў Беларусі. Гэта азначае, што, нягледзячы на ўзятыя на сябе абавязаньні, зьвязаныя зь сяброўствам у АБСЭ, дзяржавы СНД яшчэ не кіруюцца паняцьцем плюралістычнай, незалежнай ад дзяржавы грамадзянскай супольнасьці, як таго патрабуюць і што заахвочваюць эўрапейскія арганізацыі. У Маскве публічныя дэбаты аб палітычнай ролі недзяржаўных арганізацыяў у дэмакратычным разьвіцьці краіны адбыліся толькі пры канцы 2001 году[4].

Прыхільнасьць Расеі да шматпартыйнай дэмакратыі, што ўрэшце вядзе да ўтварэньня палітычных альтэрнатываў кіроўнаму прэзыдэнту, дагэтуль яшчэ не пашыраецца ёсьць зь іншымі дзяржавамі СНД.

Аб гэтым сьведчаць паводзіны Расеі ў дачыненьні да Беларусі. Калі напярэдадні беларускіх прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году ўтварылася кааліцыя пераважна дэмакратычных партыяў і

[4] Ellen Fein: Zivilgesellschaftlicher Paradigmenwechsel oder BR-Aktion? Zum ersten Grussischen "Bürgerfotum" im Kreml // Osteuropa, 2002. № 2. S. 158—179.

[5] Heinz Timmermann. Moskau: Auf Suche nach Alternativen zu Lukaschenko? // Belarus-News. Sommer 2001. S. 6—7; Heinz

грамадзкіх структураў, якая дамовілася аб вылучэнні адзінага кандыдата, Масква не пайшла на тое, каб шляхам публічнага асьвятленьня ў сваіх электронных СМІ дзейнасьці апазыцыі даць бакоў паказаць грамадзянам Беларусі, што Масква ня будзе з павагай ставіцца да дэмакратычнага волевыяўленьня грамадзянаў, калі яно будзе скіраванае на зьмену ўладаў. Асноўныя палітычныя акторы Расеі і Беларусі, якія ў гэтым рэжыме Лукашэнкі найлепшую гарантыю сваіх інтарэсаў (узброеныя сілы, спэцслужбы і службы бясьпекі, асобныя галіны прамысловасьці і сэгмэнты банкаўскага сэктару), стварылі падчас выбарчай кампаніі публіцыстычны і палітычны імідж выбараў на расейскіх тэлеканалах[5].

На будучых парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбарах Маскве давядзецца зноў сутыкнуцца з гэтым пытаньнем. Будзе выпрабоўвацца сіла і трываласьць дэмакратычнай і грамадзкай альтэрнатывы Лукашэнку і будуць зробленыя адпаведныя высновы.

АБСЭ і Беларусь: курс на канфрантацыю

Прызначэньне місіі АБСЭ ў Беларусь Сталай Радай АБСЭ 18 верасьня 1997 году было беспрэцэдэнтным актам: упершыню місія АБСЭ атрымлівала выразнае заданьне спрыяць дэмакратызацыі[6].

Тады Расея параіла беларускаму кіраўніцтву прыняць гэтую місію. Як пазьнейшыя дзеяньні расейскіх прадстаўнікоў, так і выказваньні ды манера паводзінаў беларускага кіраўніцтва схіляюць да думкі, што мэта была ў тым, каб прымусіць Беларусь прыняцьця місіі, а таксама касмэтычных зьменаў у заканадаўстве і ў некаторых законах дасягнуць міжнароднага прызнаньня Беларусі зь ейным аўтарытарным, недэмакратычным дзяржаўным ладам як дэмакратычнага сябра міжнароднай супольнасьці і, у прыватнасьці, АБСЭ. Тады, згодна з гэтым плянам, будзе хутка забыты канстытуцыйны пераварот 1996 году. Але гэты разьлік ня спраўдзіўся.

З 1997 па 2000 год усе спробы дасягнуць сутнасных зьменаў у кірунку дэмакратызацыі скончыліся правалам. Пачынаючы з простых перамоваў КНГ АБСЭ, Парлямэнцкай Тройкі, Эўрапейскай Тройкі, якая складалася з прадстаўнікоў Эўразьвязу, альбо перамоваў экспэртаў бюро АБСЭ ў справах дэмакратычных інстытуаў і правоў чалавека (БДІПЧ)[7] і

Timmermann. Moskaus Entscheidung für Lukaschenko // Belarus News. Winter 2001. S. 7–8.

6. АБСЭ, Сталая Рада, 129. Пляцовачную місію ў Беларусі: Journal № 129, пастанова № 185, PC.DEC/185, 18.9.1997; Memorandum of Understanding between the Government of Belarus and the Organization for Security and Co-Operation in

беларускімі ўладамі, а таксама перамоваў паміж урадам і апазыцыяй. Толькі аднойчы, у 1999 годзе, падчас сустрэчы паміж прадстаўнікамі апазыцыі і прадстаўніком прэзідэнта Міхаілам Сазонавым, якія адбыліся пад эгідай АБСЕ, удалося дасягнуць дамоўленасьці аб доступе апазыцыі да дзяржаўных СМІ. Аднак дамоўленасьць гэтая была празь некалькі тыдняў дэзавуяваная Лукашэнкам, а сам Сазонаў адпраўлены ў адстаўку.

Затое дзейнасьць місіі АБСЭ пры падтрымцы эўрапейскіх арганізацыяў і асобных дзяржаваў — сяброў АБСЭ — прывяла нават да стварэньня дэмакратычнай альтэрнатывы ў беларускай грамадзянскай супольнасьці. Гэта была прынята Лукашэнкам як надзвычайная пагроза рэжыму, і пачалася Лукашэнкі абвясьціў АБСЭ вайну — таму што ягоная мэта забясьпечваецца толькі шляхам запалохваньня грамадзянаў і фальшаваньня выбараў. Расейская Фэдэрацыя з шэрагам засьцярогамі падтрымлівала гэты паварот Лукашэнкі. Так адбылося пасьля парлямэнцкіх выбараў 2000 году, якія былі прызнаныя Расейскай Фэдэрацыяй і большынёй дзяржаваў — удзельніц СНД дэмакратычна праведзенымі выбарамі. Беларуская апазыцыя і эўрапейскія арганізацыі не прызналі вынікаў выбараў. Да таго ж незадоўга да выбараў Эўрапейскія арганізацыі адмовіліся накіроўваць арганізаванную міжнародную групу назіральнікаў з прычыны адсутнасьці належных умоваў для назіраньня. Парлямэнцкая Тройка эўрапейскіх установаў (Эўрапейскага Парлямэнту, Парлямэнцкіх Сходаў АБСЭ і Рады Эўропы) адмовілася прызнаць дэмакратычнай працэдуру правядзеньня выбараў і таму запярэчыла беларускаму парлямэнту ў месцы ў Парлямэнцкім Сходзе АБСЭ, а таксама ў вяртанні яго статусу адмыслова запрошанай у Раду Эўропы. Эўрапарлямэнт таксама адмовіўся скасаваць санкцыі, уведзеныя ў 1997 годзе. Створаная пры падтрымцы місіі АБСЭ ў Беларусі сетка незалежных назіральнікаў за выбарамі дакумэнтальна зафіксавала вялікую колькасьць парушэньняў выбарчымі камісіямі закону аб выбарах і іншых адпаведных заканадаўчых актаў. У прыватнасьці, назіральнікі скардзіліся на частае ўмяшаньне дзяржаўных органаў у выбарчы працэс, а таксама на фальсыфікацыю вынікаў выбараў[8].

Прэзыдэнт Лукашэнка назваў гэтых незалежных назіральнікаў

Europe in the OSCE Advisory Group in Belarus, Kopenhagen, 19.12.1997, Абзац ўра Беларусь (22) дэкабрыцы Самміту АБСЭ ад 19 ўістапада 1999 г. Прынята таксама: Hans-Georg Wieck. Die Rolle der OSZE in Belarus // OSZE-Jahrbuch 1999. Baden-Baden, 1999. S. 209—219.

7 Office for Democratic Institutions and Human Rights, штабкватэра ў Варшаве.

8 Гл. дакумэнты

за выбарамі аплачанай з-за мяжы тэрарыстычнай бандай, якая імкнецца адхіліць яго ад улады. Падзеі ў Бялградзе, што прывялі да падзеньня рэжыму Мілошавіча ўвосень 2000 году пасьля прэзыдэнцкіх выбараў, паслужылі Лукашэнку зачэпкай для рэзкай крытыкі датычнасьці місіі АБСЭ да стварэньня агульнанацыянальнай сеткі назіраньня за выбарамі[8].

Пасьля доўгага ваганьня летам 2001 году беларускія ўлады выдалі ўязныя візы толькі назіральнікам зь міжнароднай арганізацыі назіральнікаў за выбарамі, якім было даручана вывучыць ход прэзыдэнцкімі выбарамі пастановай эўрапейскіх органаў ад 15 ліпеня 2001 году, — нягледзячы на тое або нават дзякуючы таму, што ўмовы выбараў не адпавядалі стандартам АБСЭ і патрабаваньням Рады Эўропы. З крытычнай ацэнкай прэзыдэнцкіх выбараў Тройкай эўрапейскіх арганізацый — БДІПЧ — у якой разам з крытыкай умоваў выбараў было падкрэсьлена, што ў грамадзянскай супольнасьці Беларусі ўпершыню зьявіліся дэмакратычныя структуры, якія могуць разьвіваць, і што (добраахвотная) ізаляцыя не спрыяе дэмакратычнаму разьвіцьцю краіны[10],— афіцыйныя прадстаўнікі Беларусі зрабілі свае высновы: эўрапейскія арганізацыі павінны спыніць ізаляцыю Беларусі, скасаваць санкцыі і даць у эўрапейскіх органах месца прадстаўнікам гэтага дэмакратычна абранага прэзыдэнта і ягонага дэмакратычна абранага парлямэнту.

Эўрапейскія структуры ніколі ня пойдуць на гэта, пакуль ад Беларусі спачатку сур'ёзных крокаў у чатырох галінах працэсу дэмакратызацыі паводле стандартаў АБСЭ, якія з 1999 году разглядаюцца як абавязковая ўмова збліжэньня з Эўропай ліку, гаворка ідзе пра рэформу выбарчага права, прыняцьця заканадаўства аб СМІ, у прыватнасьці, скасаваньня манаполіі на электронныя СМІ; пра парлямэнцкую рэформу, пашырэньнем правоў парлямэнту; а таксама пра спыненьне адміністрацыйнага і крымінальнага перасьледу апанэнтаў.

Яшчэ ў сьнежні 2000 году падчас зацьверджаньня праграмы АБСЭ на 2001 год Беларусь пры падтрымцы Расейскай Фэдэрацыі спрабавала дамагчыся, каб у будучыні ўдзел ажыцьцяўлялі праекты — як бы яны ні фінансаваліся, з бюджэту або з добраахвотных унёскаў дзяржаваў-удзельніц, — выключна са згоды ўраду адпаведнай краіны. Сталі гэта

[8] **Parliamentary Elections in Belarus 2000. Report of the Independent Observer Organizations. Minsk, 2000.**

[9] **Прэзыдэнт Лукашэнка ацэньвае гэтую крытыку 27 студзеня 2001 г. на беларускім тэлебачаньні ў праграме "Панарама".**

[10] **Палажэньні Хэльсынскага дакумэнту 1992 г. і Парыскай хартыі для новай Эўропы, прынятай у лістападзе 1990 г. Беларусь, як і ўсе краіны-ўдзельніцы АБСЭ, ёсьць іхнімі падпісантамі.**

АБСЭ ў Вене адхіліла гэтую прапанову, але пагадзілася з тым, што пры ажыццяўленьні такіх праектаў неабходна правесці кансультацыі з урадам адпаведнай краіны. Пры гэтым, натуральна, вынік кансультацыяў павінен быць пераканальны для місіяў. Гэтая працэдура была апрабавана ў Беларусі падчас правядзеньня некаторых пілётных праектаў. Калі ж АБСЭ не адрэагавала на абвінавачаньне ўладаў у спрыянні незалежнаму назіраньню за выбарамі, арганізаваным рознымі няўрадавых арганізацыяў, урад у студзені 2002 г. аб'явіў пра прыпыніў супрацоўніцтва зь місіяй. Пасьля гэтага структуры байкатавалі працу місіі. Да таго ж прадстаўнікі даў распараджэньне ўраду не абяцаць больш ніякіх заахвочваньняў выбарчым заканадаўстве, перадусім тых, на якіх настойвалі міжнародныя арганізацыі. Лукашэнка выдаў шэраг указаў, якія істотна пагоршылі ўмовы ўдзелу кандыдатаў у выбарах:

- кандыдаты на пасаду прэзыдэнта былі абавязаны прадставіць дакумэнты аб сваіх даходах, а таксама аб даходах блізкіх сваякоў ды іншых родзічаў;
- было забаронена замежнае фінансаваньне мерапрыемстваў, зьвязаных з выбарамі;
- было яшчэ больш ускладнена правядзеньне публічных акцыяў[11].

У зьвязку з дэманстрацыйнай адмовай беларускага боку ад супрацоўніцтва зь місіяй АБСЭ эўрапейскія арганізацыі вылучылі апошнім часам патрабаваньне свабоды дзеяньняў для місіі на чале зь яе новым кіраўніком, амбасадарам Нідэрляндаў Эбэргардам Гайкенам, у тым ліку і бязь зьмены яе назвы. Апрача таго, Рада Эўропы настойвае на прыпыненьні скасаваньні сьмяротнага пакараньня.

Калі не лічыць усё новых і новых заяваў аб палітычных і эканамічных рэформах, беларускае кіраўніцтва дагэтуль не зрабіла ніякіх значных пераўтварэньняў у гэтых важных для краіны сфэрах. Ствараецца ўражаньне, што Лукашэнка фармуе свае палітычныя прыярытэты, зыходзячы з патрэбы, якія вынікаюць са складаных стасункаў з Масквой: з аднаго боку, Лукашэнка залежыць ад палітычнай, эканамічнай і ваеннай падтрымкі Масквы; зь іншага — выяўляецца, што ён не сяроднетэрміновай пэрспэктывы ён пераацэньвае ваеннае Беларусі для Расейскай Фэдэрацыі. Яго палітычная будучыня залежыць ад таго, ці здолее ён застацца прэзыдэнтам

**узяліся за ім, калі ён назаві кіраўніцтва краіны, — гэтым самым, Беларусь, ягоныя кіраўніцтва ўладаў, ягоныя ўлады, ягоныя ўлады, ягоныя ўлады

Беларусі пасьля сканчэньня ў 2006 годзе “другога тэрміну паўнамоцтваў” паводле навязанай ім у лістападзе 1996 году напісанай на скорую руку канстытуцыі.

Масква ўжо моўчкі згадзілася з падаўжэньнем тэрмінаў прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў звыш прадугледжанага канстытуцыямі іншых краін СНД часу. Чаму б не прадавіць талерантнасьць у гэтым пытаньні датычна Беларусі, пакуль ня зьявіцца вартая даверу альтэрнатыва? Масква дагэтуль ня надта актыўна спрыяла дэмакратызацыі ў іншых краінах СНД. Калі стала ясна, што канфрантацыяй і санкцыямі немагчыма дабіцца зьмены палітыкі беларускага рэжыму, на Захадзе пачалася вельмі сур’ёзная дыскусія наконт пытаньня, ці можна падштурхнуць рэжым Лукашэнкі да рэформаў, пайшоўшы яму насустрач[12].

Таксама раздаваліся галасы з прапановай не падаўжаць мандату місіі. Трэба адзначыць, што ў Менску некаторыя кіраўнікі місіі зь ліку дзяржаваў — удзельніц Эўрапейскага Зьвязу, якія згодна са сваімі паўнамоцтвамі займаюцца таксама пытаньнем двухбаковых адносінаў, ужо доўгі час выступаюць за гэты шлях. У выніку ўсё ж падчас абмеркаваньня дзеяў палітыкі ў дачыненьні да Беларусі ўвесну 2002 году ЭЗ прыйшоў на высновы, што дыялёг нельга пачынаць ці спыняць і трэба весьці пакрокава. Пры гэтым трэба спрыяць разьвіцьцю грамадзянскай супольнасьці. Але ці прадугледжанага таксама працяг падтрымкі палітычна рэлевантных структураў грамадзянскай супольнасьці, яшчэ ня вызначана. Некаторыя кампанэнту падтрымка палітычнай альтэрнатывы будзе аддадзеная на водкуп Злучаным Штатам. Гэта зьмена ставіла б пазыцыю Захаду што да Беларусі. Адмова ад гэтага кампанэнту азначала б адыход ад ранейшай пазыцыі і ўразрэз з палітыкай ЭЗ у падобных сытуацыях у мінулых гадох у Міжземнамор’і і ў апошнія гады на Балканах. Лукашэнка дасягнуў бы сваёй галоўнай мэты — вызваленьня эўрапейскіх арганізацыяў з працэсу дэмакратызацыі сваёй краіны. Страта даверу да эўрапейскіх арганізацыяў у той часткі беларускага насельніцтва, якое зьвязвае з Захадам сваё лепшае, была б недапушчальнай.

September 2001. Final Report, 4.10.2001; www.osce.org/odihr.

11. Декрет Президента Республики Беларусь от 12 марта 2001 года № 8 “О некоторых мерах по совершенствованию порядка получения и использования иностранной безвозмездной помощи”. Декрет Президента Республики Беларусь от 7 мая 2001 года № 11 “О

некоторых мерах по совершенствованию порядка проведения собраний, митингов, уличных шествий, демонстраций, иных массовых мероприятий и пикетирования в Республике Беларусь”. Декрет Президента Республики Беларусь от 26 июня 2001 года № 20 “Об обязательном декларировании доходов и имущества кандидата в Президенты Республики Беларусь, его близких родственников, супруги (супруга) и ее (его) родителей и некоторых мерах, направленных

на проведение открытых, свободных и честных выборов”, усё пад адрасам www.president.gov.by

[12] Пар. з прамовай Уты Цапф у Нямецкім бундэстагу (заўвага 2). Пра гэта таксама Rolf Schütte: Neue Politik gegenüber Belarus? // Belarus-News. Frühling 2002. S. 2—4.

Спрыяньне пабудове грамадзянскай супольнасьці

На саміце, які адбыўся 19 лістапада 1999 году ў Стамбуле, кіраўнікі дзяржаваў і ўрадаў дзяржаваў — удзельніцаў АБСЭ ня толькі падтрымалі працу КНГ АБСЭ ў Беларусі, але і падоўжылі мандат групы ад 19 верасьня 1997 году. У 22-м абзацы заявы, прынятай на саміце АБСЭ, было адзначана: “Мы настойліва падтрымліваем працу КНГ АБСЭ ў Беларусі, якая дасягнула супрацоўнічае з уладамі Беларусі, а таксама з апазіцыйнымі партыямі, іх кіраўніцтвам і недзяржаўнымі арганізацыямі ў справе разьвіцьця дэмакратычных інстытуцыяў і стварэньня абавязаньняў АБСЭ ды такім чынам спрыяе вырашэньню канстытуцыйнага канфлікту ў Беларусі. Мы падкрэсьліваем

[13] Дэкларацыя, прынятая на саміце АБСЭ ў Стамбуле, SUM.DOC/2/99, 19 лістапада

што толькі палітычны дыялёг зможа пракласьці шлях да свабодных і дэмакратычных выбараў, якія, у сваю чаргу, зьяўляюцца асновай для разьвіцьця сапраўднай дэмакратыі”[13]. КНГ АБСЭ супрацоўнічала ня толькі непасрэдна зь дзяржаўнымі структурамі, але і з апазыцыйнымі партыямі ды дзеячамі грамадзянскай супольнасьці. Гэта мела і мае надзвычай важнае значэньне для пераадоленьня канстытуцыйнага канфлікту і закладаньня салідных асноваў для дэмакратычных выбараў. Місія АБСЭ, якая складалася зь пяці замежных сяброў і штабу высокакваліфікаваных і самаадданых беларускіх супрацоўнікаў, актыўна дзейнічала ў наступных кірунках:

- назіраньне за станам правоў чалавека і станам сьвабодаў;
- юрыдычнае кансультаваньне сем’яў, пацярпелых за палітычную дзейнасьць сваіх сямейнікаў, адсочваньне цыдовых перасьледу па палітычных матывах і ўмяшаньне ў выпадку парушэньняў правоў;
- гуманітарная дапамога палітычным ахвярам адміністрацыйнага ці крымінальнага перасьледу ўладаў;
- нарошчваньне здольнасьці партыяў да сумеснай дзейнасьці, павышэньне дзеяздольнасьці партыяў;
- стварэньне кааліцыі партыяў і грамадзкіх сілаў;
- назіраньне за выбарамі;
- праекты ўмацаваньня грамадзянскай супольнасьці.

Гэтая рознабаковая дзейнасьць місіі АБСЭ па спрыяньні грамадзянскай супольнасьці разьвівалася паступова і дынесла значныя посьпехі. Улетку 1999 году ўдалося стварыць Кансультацыйную раду апазыцыйных палітычных партыяў[14]. Яна выпрацавала пагадненьне аб супольных пазыцыях і дачыненьнях з рэжымам, аб перамовах з урадам, аб стаўленьні да Масквы, эўрапейскіх арганізацыяў і Захаду. Пры Кансультацыйнай радзе створаны шэраг экспэртных групаў. Праўда, у яе пакуль няма сакратарыяту і рабочых прадаў для супрацоўніцтва з грамадзкімі арганізацыямі, праз якія можна выйсьці на выбарцаў.

Пры пасярэдніцтве і падтрымцы КНГ АБСЭ сталася магчымым стварэньне кааліцыі для ўдзелу ў прэзыдэнцкіх выбарах 2001 году, у якой узялі ўдзел прафсаюзы, жаночыя і моладзевыя аганізацыі, аб’яднаньні па інтарэсах і групы правалеўскага накшталт Беларускага Хельсынскага камітэту. Спартыя праціх

[14] **У Кансультацыйную раду апазыцыйных палітычных партыяў уваходзяць: БНФ (Вінцук Вячорка), камуністы (Сяргей Калякін), Сацыял-дэмакратычная грамада (Станіслаў Шушкевіч), Сацыял-дэмакратычная партыя “Народная грамада” (Міхаіла Статкевіч), Партыя жанчын (Валянціна Палевікова), Партыя працы**

прэтэндэнтаў з гэтага кола быў вылучаны кандыдат у прэзыдэнты, альтэрнатыўны Лукашэнку. Магчымасці будучых мясцовых і парлямэнцкіх выбараў таксама дасягнута дамоўленасьць аб стварэньні кааліцыі. Цягам апошніх гадоў значная частка апазыцыйных партыяў байкатавала мясцовыя і парлямэнцкія выбары. У ўмяшаньня дзяржаўнага апарату бальшыня незалежных кандыдатаў ад апазыцыйных партыяў (сацыял-дэмакратычнай пад кіраўніцтвам Міколы Статкевіча) і ад апазыцыйных недзяржаўных арганізацыяў, якія ўдзельнічалі ў выбарах, не былі зарэгістраваны або дзякуючы фальсыфікацыям выбараў не атрымалі дэпутацкага мандату. Каб нават зусім прадухіліць гэтую недэмакратычную практыку, у ўсёй краіне ў супрацоўніцтве зь мясцовымі недзяржаўнымі арганізацыямі была створаная сетка незалежных назіральнікаў за выбарамі[15].

Яны назіралі за ўсім выбарчым працэсам пачынаючы ад утварэньня выбарчых камісіяў, рэгістрацыі кандыдатаў і канчаючы ўласна выбарамі, рэгістравалі і дакумэнтавалі парушэньні выбарчага заканадаўства і падліку галасоў. З 1999 да 2001 году на выкананьне гэтых заданьняў была выдаткавана каля аднаго мільёна эўра.

Нарэшце, Кансультацыйна-назіральная група АБСЭ таксама ажыцьцяўляла канкрэтныя праекты па разьвіцьці грамадзянскай супольнасьці. Так, быў створаны “Цэнтар эўрапейскіх і трансантлянтычных дасьледаваньняў” ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце ў Менску, распрацавана рэформа пэнітэнцыярнай сыстэмы, навучальныя курсы і трэнінгі па вырашэньні канфліктаў тэме “Моладзь і дэмакратыя”, па мясцовым самакіраваньні, таксама па падтрымцы незалежнай прэсы. Вышэйпералічаныя праекты ажыцьцяўляюцца на аснове дамовы памiж Эўрапейскай Камісіяй і БДІПЧ. У 2000—2001 гадох на гэтыя праекты выдаткавана каля 600 000 эўра. Ёсьць таксама новыя зацьверджаныя праекты на пэрыяд з 2002 да 2004 году.

Урэшце, спрыяньне грамадзянскай супольнасьці з боку АБСЭ прывяло да канфрантацыі з рэжымам. Калі ў асабістага ўмяшаньня Лукашэнкі і ягонай адмовы вытаргаваную з Сазонавым дамоўленасьць аб дапушчэньні палітычны дыялёг з апазыцыяй быў абарваны, рэпрэсіі

[15] Удзел у назіральні за выбарамі пад старшынствам Мечыслава Грыба (Рух за свабодныя выборы) і Алеся Бяляцкага (Вясна’96) узяліся назваць наступныя ГА і арганізацыі:

(Аляксандар Бухвостаў), Аб’яднаная грамадзянская партыя (Анатоль Лябедзька), Ліберальна-дэмакратычная партыя (Сяргей Гайдукевіч), Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ (Зянон Пазьняк і Юрась Беленькі) і Рады Беларускага Народнага Фронту (Вячаслаў Сіўчык).

забараніў дзяржаўным органам супрацоўнічаць з КНГ АБСЭ. Напярэдадні парлямэнцкіх выбараў у кастрычніку 2000 году беларускі ўрад пачаў сваю атаку супраць палітычнай ролі КНГ АБСЭ. Гэтая пазыцыя рэжыму была выкліканая:

- тым, што рэжым бачыць у гэтым утварэньне новай, апазыцыйнай аўтарытарнай паліцыйнай дзяржаўнай плыні, якая пагражае ўтрыманьню ўлады і прапаноўвае грамадзянам альтэрнатыўную арыентацыю ва ўнутранай і замежнай палітыцы;
- тым, што рэжым уважае палітычна значную дзейнасьць міжнароднай групы ў Беларусі, якая ажыцьцяўляе дзейнасьць узгадненьня і нават насуперак мэтам аўтарытарнай дзяржавы, за несумяшчальную з уласным разуменьнем сувэрэнітэту;
- тым, што рэжым прынцыпова адхіляе мадэль дэмакратыі паводле АБСЭ для палітычнага і эканамічнага развіцьця краіны;
- тым, што рэжым схільны ацэньваць гэта як утварэньне міжнароднай, але ўнутрыпалітычна значнай сілы, альтэрнатыўнай прэзыдэнту.

У асноўным гэты стан рэчаў ёсьць прадуктам стратэгіі прэзыдэнта і ягоных піярнікаў па навязваньні вобразу ворага. Згодна з апытаньнямі менскага Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (НІСЭПД), рэйтынг місіі АБСЭ ў апошнія гады рос хутчэй, чым усіх дзяржаўных установаў, апрача войска[16].

Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 9 верасьня 2001 году па ўсёй краіне было бясплатна распаўсюджана 3,6 мільёна асобнікаў спэцыяльнага выпуску найбуйнейшай штодзённай газэты “Советская Белоруссия” з артыкулам пра (уяўныя) пляны місіі АБСЭ і Амбасады ЗША шляхам абнародаваньня ў дзень выбараў фальшывых вынікаў выбараў адхіліць прэзыдэнта ад улады[17], але гэта прывяло толькі да павышэньня аўтарытэту АБСЭ і ЗША сярод грамадзкасьці.

Укараненьне вартасьцяў плюралістычнай дэмакратыі ў грамадзянскай супольнасьці ўскосна віталася шматлікімі прадстаўнікамі намэнклятуры. Намэнклятура спадзяецца, што пры дапамозе ініцыяваных АБСЭ рэформаў і ўзмацненьня грамадзянскай супольнасьці сама сыстэма зможа стаць рэфармоўнай. Гэткай, безумоўна, была канцэпцыя міністра замежных справаў Івана Антановіча (знаходзіўся на пасадзе з

Беларускі Хельсінскі камітэт (Тацяна Працька), Фундацыя Лява Сапегі (Міраслаў Кобаса), Нацыянальнае абсталяваньне выбараў (Уладзімер Гудзееў), Свабодныя прафсаюзы (Генадзь Быкаў), а таксама адна жаночая і адна моладзевая арганізацыі.

[16] **КНГ ОБСЕ в Беларуси: миссия**

1997 да 1998 году), у меншай ступені — ягонага намесніка Ўрала Латыпава (знаходзіўся на пасадзе з 1998 да 2003 году). Найменш выразна яна выяўляецца ў цяперашняй дзейнасці замежных справаў Міхаіла Хвастова, які, будучы тэрытарыяльнікам “моцнай дзяржавы”, лічыць, што дзейнасць місіі АБСЕ падрывае адстойваную ім стабільнасць краіны, бо тут патрэбна моцная рука прэзыдэнта.

Прыкметы пераменаў у палітычнай культуры краіны

У апытаньнях грамадзкай думкі, якія праводзяцца сацыялягічнымі інстытутамі, палітычныя партыі і іхныя лідэры не карыстаюцца вялікай павагай. Тым ня менш, кандыдаты апазыцыйных і дэмакратычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў, старшыня фэдэрацыі прафсаюзаў Уладзімер Ганчарык, на прэзыдэнцкіх выбарах атрымаў каля 30-40% галасоў, калі грунтавацца на апытаньнях грамадзкай думкі без меркаваным уплыве маніпуляцыі ўлады на выбаршчыкаў[18]. Улічваючы вялікія цяжкасьці, зь якімі сутыкнулася апазыцыя, гэта быў значны посьпех. Відавочна, не хапала фінансавых сродкаў, дзяржаўны апарат усяляк перашкаджаў правядзеньню выбарчай кампаніі, адсутнічаў нармальны доступ да беларускіх тэлеканалаў, якія істотна ўплывалі на настроі большасьці выбарцаў.

У апытаньнях грамадзкай думкі напярэдадні выбараў была адзначана гатовасьць вялікага адсотку выбарцаў аддаць свой голас незалежнаму, не зьвязанаму партыйнай прыналежнасьцю кандыдату. Гэта пазыцыя адлюстроўвае ўсё яшчэ пашыранае ў постсавецкім грамадзтве жаданьне мець на чале дзяржавы “моцную” і незалежную асобу. Так, **15,65%, а**

невозможна? www.kprf.ru. Главная тема ежемесячных бюллетеней НІСЭПД.

17 Операция “Белый Аист” (Иностранные спецслужбы — против Беларуси) // Советская Белоруссия 2001. 5 сентября.

18 Hans-Georg Wieck Förderung demokratischer Institutionen in Belarus. Vier Jahre OSZE-Beobachtergruppe // Belarus Newsletter 2001. S. 4—6. Первый официальных данных, у Ганчарык набраў

уяўленьням падчас прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году аўтсайдэр Аляксандар Лукашэнка. Аднак ягоная зорка ўжо некалькі гадоў заходзіць; з дапамогай дзяржаўнай машыны запалохваньня ў часе выбараў ён здолеў фармальна пераадолець гэтую тэндэнцыю і дасягнуць (занадта) добрага і тым самым неймавернага выніку выбараў. Ён і ягоныя дарадцы ведаюць лепш за ўсіх староньніх назіральнікаў, наколькі ён насамрэч папулярны ў краіне. Ён таксама ведае, што ягоны рэйтынг у Беларусі значна саступае рэйтынгу Пуціна. На гэтым фоне камандзе Лукашэнкі важна дэманстраваць вялікую блізіню з Пуціным — ці то ў пытаньнях саюзу дзьвюх дзяржаваў, ці то ў стаўленьні да антытэрарыстычнай кааліцыі, а цяпер нават і да NATO ды ЗША — натуральна, толькі на словах.

Увесну 2002 году рэйтынг Лукашэнкі дасягнуў нараней адзнакі — яго падтрымалі 30 % грамадзянаў, што ўпершыню апытаньні[19].

Кааліцыя нацыянальных і дэмакратычных сілаў супраць дзейнага прэзыдэнта — новы фэномэн беларускай палітычнай культуры. Каб гэтая ідэя набыла большы эфэкт, неабходна прапагандаваць гэтую кааліцыю толькі падчас прэзыдэнцкіх выбараў. Тым часам ідэя ўтварэньня кааліцыі стала ледзь ня першай жа магутнай ідэяй аб'яднаньня і згуртаваньня грамадзянаў краіны, як і пашыранае жаданьне бачыць дасканалую апазіцыю асобу на чале дзяржавы — працэс, які сьпярша быў зь вялікім скепсысам сустрэты партыямі, грамадзкімі аб'яднаньнямі, а таксама палітолягамі ды незалежнай прэсай краіны.

Калі тройка эўрапейскіх парлямэнцкіх арганізацыяў яшчэ падчас выбараў у парлямэнт 2000 году адзначыла, што ў беларускім палітычным клімаце, які вызначаўся застоем і штучнай стабільнасьцю, адчуваюцца павевы пераменаў, то назіральнікі ад гэтых структураў пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году адназначна пацьвердзілі гэта. Яны канстатавалі ўзьнікненьне дэмакратычных структураў у грамадзянскай супольнасьці, якія, праўда, зь вялікай цяжкасьцю могуць разьвівацца ва ўмовах ізаляцыі краіны. Гэтай заўвагай назіральнікі і аналітыкі далі зразумець, што дэмакратычныя структуры ў сёньняшняй аўтарытарнай беларускай дзяржаве ня змогуць існаваць без падтрымкі звонку.

"Ці можна і ці варта аказваць такую падтрымку? — пытаюцца

А.Лукашэнка — 76,65%
таксама

[19] **Опрос: Впервые за время правления А.Лукашенко его рейтинг упал до 30% / Айпатаныча НІСЭПД прадэманстраваў 2002 году**
адрасам www.iiseps.by.

многія назіральнікі. — Ці ня будзе апазыцыя дзякуючы гэтай падтрымцы выстаўленая агентам замежных структур?" І сапраўды, такая падтрымка павінна аказвацца ў сувязі зь дзейнасьцю КНГ па назіраньні за выбарамі праз самі структуры грамадзянскай супольнасьці, нягледзячы на тую акалічнасьць, што ў Беларусі — як было даведзена — дзяржава заўсёды ўмешваецца ў правядзеньне выбараў, і таму сам урад ня ў стане забясьпечыць іх карэктнага правядзеньня. Парушэньні выбарчага заканадаўства беларускім урадам і Цэнтральнай выбарчай камісіяй падчас выбараў прэзыдэнта былі зафіксаваныя міжнароднымі назіральнікамі з "Association of Central and Eastern European Election Officers (ACEEEO)", у якую ўваходзіць таксама старшыня Цэнтравыбаркаму Расейскай Фэдэрацыі.

Новыя незалежныя дзяржавы — удзельніцы АБСЭ, якія сёньня павінны распачаць дэмакратычную трансфармацыю сваіх грамадстваў савецкага кшталту, ня могуць і ня хочуць спрыяць разьвіцьцю няўрадавых структураў. Таму эўрапейскім арганізацыям — Радзе Эўропы, АБСЭ і ЭЗ — сьлед аказваць ім дапамогу. Гэтыя арганізацыі павінны стаць апекунамі і заступнікамі дэмакратычных працэсаў ды асабістых правоў чалавека ў пераходных краінах. Яны ня могуць спрыяць дэмакратызацыі, калі ў гэтых краінах урадам не стае волі, а бюджэтам — сродкаў для падтрыманьня плюралістычнага грамадзтва, грамадзянскай супольнасьці, пры якой у грамадзянаў павінна абудзіцца ініцыятыўнасьць, адказнасьць, воля да дзеяньня. Эўрапейская Камісія, між іншым, загадвае фондамі падтрымкі дэмакратыі, якія маюць дастаткова сродкаў, каб зь іх дапамогай — незалежна ад ураду — ажыцьцяўляць праекты дэмакратызацыі ў амаль што ста краінах, у тым ліку і ў Беларусі.

У Эўропе, акрамя Балканаў, няма іншага такога рэгіёну, якому ў падобным аб'ёме патрабуюцца інвэстыцыі ў дэмакратыю, як постсавецкія краіны. Да іх ліку належыць і Беларусь. Няма недахопу ў спэцыфічных праграмах супрацоўніцтва на ўзроўні няўрадавых арганізацыяў у гуманітарнай і прававой сфэрах ці ў сфэры мас-мэдыяў. У абсягу палітыкі адсутнічае кансэнсус паміж дзяржаўнымі і недзяржаўнымі грантадаўцамі. Яны пазьбягаюць палітычных тэмаў, да якіх яны ўжо залічаюць і назіраньне за выбарамі — за выняткам амэрыканскіх

арганізацыяў “International Republican Institute” (IRI) і “National Democratic Institute” (NDI). Нават Бюро АБСЭ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека не сьпяшаецца падтрымліваць стварэньне сетак незалежных назіральнікаў за выбарамі ў краінах — спадкаемцах Савецкага Саюзу, ня кажучы ўжо пра дапамогу палітычным партыям у выбарчай барацьбе. На жаль, дзяржаўныя структуры ў Беларусі не адказваюць сваёй стрыманасьцю на стрыманасьць заходніх арганізацыяў, падтрымліваючы “сваіх” кандыдатаў на мясцовых і парлямэнцкіх выбарах, а тым больш на выбарах прэзыдэнта. Эўрапейскія арганізацыі маюць абавязак і нясуць адказнасьць за тое, каб у належным аб’ёме аказваць дапамогу дэмакратычным сілам у антыдэмакратычных аўтарытарных умовах. Гэтая дапамога павінна адпавядаць іх кодэксу каштоўнасьцяў і іх настойлівасьці разьвіваць плюралістычнае грамадзтва ў дзяржавах СНД, якую падзяляюць амаль усе дзяржавы — удзельніцы АБСЭ. Дэмакратычная трансфармацыя ня церпіць палавіністасьці, яна заклікае да арыентаванага на вынік супрацоўніцтва эўрапейскіх арганізацыяў, якія нясуць галоўную адказнасьць за дзеяньні ў гэтым кірунку, за якім ідзе спрыяньне дзяржаваў — удзельніц АБСЭ і грамадзянскіх супольнасьцяў у Эўропе.

Кансультацыйна-назіральная група ў Беларусі кіравалася гэткімі меркаваньнямі. Саміт кіраўнікоў краінаў і ўрадаў АБСЭ, адбыты ў лістападзе 1999 году, выразна падкрэсьліў у Стамбульскай дэклярацыі сваю адданасьць выбудове грамадзянскай супольнасьці. Паколькі сёньня Беларусь з шэрагу прычынаў не зьяўляецца прыярытэтам на міжнародным парадку дня, існуе небясьпека, што абавязак АБСЭ і іншых эўрапейскіх інстытуцыяў спрыяць гэтай адбудове можа быць забыты. Гэта, пры недастатковай увазе міжнароднай грамадзкасьці, створыць беларускаму недэмакратычнаму рэжыму магчымасьць ізноў разбурыць толькі-толькі паўсталыя дэмакратычныя структуры грамадзянскай супольнасьці. Ігнараваньне Беларусі з боку эўрапейскіх арганізацыяў пазбавіла б дэмакратычныя структуры грамадзянскай супольнасьці магчымасьці разьвівацца далей — з-за нястачы міжнароднай фінансавай падтрымкі, неабходнай гэтай апазыцыі, што складаецца з партыяў і грамадзкіх аб’яданьняў, для таго каб заяўляць пра сябе на ўвесь сьвет.

Высновы

Бальшыня кіроўных элітаў у краінах — спадкаемцах Савецкага Саюзу праінтэрпрэтавала плюралістычную структуру дэмакратыі паводле стандартаў АБСЭ, уціснуўшы яе ў пракрустава ложа аўтарытарнай прэзыдэнцкай дэмакратыі. Гэтая прэзыдэнцкая дэмакратыя ў такой краіне, як Беларусь, а таксама краінах Цэнтральнай Азіі набывае структуру той "народнай дэмакратыі", што праіснавала ва ўсходнеэўрапейскіх дзяржавах — сатэлітах Савецкага Саюзу да часу ягонага распаду, пры якой апазыцыйныя палітычныя партыі былі забароненыя.

АБСЭ, дзейная ўва ўсёй Эўропе арганізацыя — пасярэдніца ў працэсе пераходу да дэмакратыі і ў адбудове яе пасьля грамадзянскіх войнаў (як на Балканах), змагаецца за справу, здавалася б, безнадзейную ва ўсіх тых выпадках, калі кіраўнічыя структуры падтрымліваюць прыняцьце стандартаў АБСЭ толькі вонкава, а ня сутнасна. Якраз такім выпадкам ёсьць Беларусь.

У надзвычайных абставінах цягам апошніх гадоў у Беларусі ў ходзе сутыкненьня зь недэмакратычным рэжымам і ягонай патрэбай у міжнародным прызнаньні, дзякуючы супрацоўніцтву часткова зь дзяржаўнымі структурамі, часткова з апазыцыяй гэтым дзяржаўным органам з боку грамадзянскай супольнасьці, стварылася дзеяздольная структура для дэмакратычнай альтэрнатывы на цэнтральным узроўні грамадзтва (кааліцыя на прэзыдэнцкіх выбарах і Кансультацыйная рада апазыцыйных партыяў), а таксама ў самім грамадзтве (назіральнікі за выбарамі). Гэтай дэмакратычнай сіле яшчэ не стае шырокай падтрымкі ў грамадзтве, якое павольна вызваляецца ад ідэі моцнай рукі. З дапамогай Фэдэрацыі прафсаюзаў, якія па сутнасьці зьяўляюцца дзяржаўнымі інстытутамі, а таксама моладзевых аб'яднаньняў і часткі жаночых арганізацыяў удалося выйсьці на засталыя з савецкай эры ляяльныя дзяржаве і падпарадкаваныя ёй масавыя грамадзкія арганізацыі. Калі эўрапейскія арганізацыі страцяць інтарэс да Беларусі, існуе небясьпека, што кааліцыя дэмакратаў і іншых апанэнтаў прэзыдэнта Лукашэнкі распадзецца ад нястачы матэрыяльных сродкаў якраз у той момант, калі папулярнасьць Лукашэнкі ў краіне дасягне свайго найменшага ўзроўню.

У сьпісе прыярытэтаў заходніх канцылярыяў і, бадай, эўрапейскіх арганізацыяў Беларусь займае адно з апошніх месцаў. Нават толькі беручы пад увагу значэньне будучага разьвіцьця дэмакратыі ўва ўсё больш схільных да аўтарытарызму краінах — пераемніцах Савецкага Саюзу, эўрапейскія інстытуты павінны ўзяць на сябе адказнасьць за падтрыманьне сур'ёзнага дыялёгу з рэжымам — калі гэта сёньня яшчэ магчыма, — а таксама за спрыяньне палітычным структурам грамадзянскай супольнасьці, што ўзьнікаюць на нашых вачах, прычым рабіць гэта варта шляхам каапэрацыі з тымі дзяржавамі — удзельніцамі АБСЭ, якія да гэтага гатовыя. Палітычныя структуры грамадзянскай супольнасьці павінны быць створаны пры міжнародным спрыяньні; яны павінны быць здольныя супольна выконваць асноўныя задачы апазыцыі пры захаваньні асобных партыйных структураў і адметных палітычных мэтаў. Яны павінны быць адкрыты для новых палітычных сілаў, такіх, як моладзь і жанчыны, а таксама для супрацоўніцтва з асобнымі пластамі намэнклятуры. Яны павінны шукаць доступу да выбарцаў шляхам цеснага хаўрусу з грамадзкімі арганізацыямі. Вынік, здабыты дэмакратычным кандыдатам Уладзімерам Ганчарыкам падчас прэзыдэнцкіх выбараў, дае падставы спадзявацца на лепшае. Людзі галасавалі за кампраміснага кандыдата, а не за асобу з моцнай харызматычнай аўрай. Яны галасавалі за чалавека, які прадэманстраваў гатовасьць, працуючы ў адной камандзе з партнэрамі па кааліцыі, процістаяць Лукашэнку, чыя ўлада трымаецца на сілавых структурах, якога болей баяцца, чым паважаюць і любяць, і ў якога адсутнічае бачаньне свабоды і дэмакратыі — паняцьцяў, што зьяўляюцца знакамі часу для ўсёй Эўропы і для Беларусі ў прыватнасьці.

Зь нямецкай мовы пераклаў
Яўген Казінец паводле: Osteuropa. 2002. № 7.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

[image]
ARCHE Пачатак № 3 (23) – 2002
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image]
[image]

на яе месца ў Беларусі.
Вялікай праблемай для Эўразьвязу і ўвогуле эўрапейскіх дзяржаваў было тое, што пасьля канстытуцыйнага крызысу 1996 году яны страцілі ў Беларусі партнэра для дыялёгу. Эўрапейскія дзяржавы занялі пазыцыю, што адзінай законнай канстытуцыяй у Беларусі застаецца Канстытуцыя 1994 году, а зьмены, уведзеныя рэфэрэндумам 1996 году, — нелегітымныя, як і сфармаваны неўзабаве парлямэнт. Аднак уся дзейная ўлада была сканцэнтраваная ў таго самага зьненавіднага прэзыдэнта Лукашэнкі, легітымнасьць якога на падставе Канстытуцыі 1994 году доўжылася да чэрвеня 1999 году. Ад чэрвеня 1999-га кантакты з прэзыдэнтам Лукашэнкам адназначна супярэчылі прынятай дыпляматычнай дактрыне. Але паступова паміж эўрапейскімі краінамі ўзьніклі непаразуменьні, што выклікалі пэўны крызыс: ніхто ня ведаў, якую палітыку трэба праводзіць у дачыненьні да Беларусі. Таму сваёй галоўнай мэтай місія АБСЭ бачыла падрыхтоўку дэмакратычных выбараў, якія б далі магчымасьць утварыць законны, дэмакратычна абраны парлямэнт — легітымнага партнэра для перамоваў. Аднак гэтая стратэгія аказалася памылковая, і парлямэнцкія выбары ў 2000 годзе, як і пазьнейшыя прэзыдэнцкія выбары 2001 году, прайшлі з парушэньнем усіх выбарчых стандартаў. На сёньня ніводная з галінаў улады ў Беларусі, калі разважаць з пункту гледжаньня старой дыпляматычнай дактрыны, не легітымная. Эўрапейскія краіны сутыкнуліся з праблемай: яны ня хочуць прыпыненьня дыпляматычных адносінаў зь Беларусяй, бо гэта азначала б страту міжнароднай правасуб'ектнасьці Беларусі і адначасовую здачу Беларусі ў абдымкі Расеі. Аднак дактрына, якою кіраваліся аж да выбараў 2001 году, аказалася нядзейсная, а пасьля выбараў не было распрацавана ніводнай новай схемы працы зь Беларусяй.

Тут можна задаць сабе пытаньне: чаму так сталася і чаго Эўразьвяз ды эўрапейскія краіны хацелі дасягнуць тымі захадамі, якія рабіла місія АБСЭ? Беларускія ўлады часта падаюць справу гэтак, быццам галоўнай задачай місіі была ліквідацыя рэжыму, скіданьне прэзыдэнта. Асабіста я думаю, што Эўропа ні ў якім разе не імкнулася да гэтага і тым больш гэткае задачы ня ставіла перад сабой Нямеччына, якая

кантралявала місію АБСЭ. Мяркую, што галоўным заданьнем Нямеччыны была легітымізацыя прэзыдэнта Лукашэнкі як партнэра для дыялёгу, тым больш што ён здаваўся для Эўропы гарантам стабільнасьці ў рэгіёне ў цэлым і ў Беларусі ў прыватнасьці.

І што ж мы маем на сёньня? Няма пасьлядоўнай палітыкі Эўропы ў дачыненьні да Беларусі, няма ніякай новай канцэпцыі, якая б дазваляла ісьці наперад у дыпляматычных адносінах з гэтай краінай. Лукашэнка ўжо не прызнае місіі АБСЭ ў якасьці партнэра. Пасла АБСЭ не пусьцілі ў Беларусь. Месяц таму * была прапанаваная новая ініцыятыва. Пра яе гаварылі як пра “візыт апошняга шанцу”. Гэта меўся быць візыт прадстаўнікоў Эўрапарлямэнту, які павінен быў даць шанец самому Лукашэнку выйсьці з тупіковай сытуацыі. Візыт прадстаўнікоў Эўразьвязу даваў для Лукашэнкі магчымасьць своеасаблівага “ходу канём” — абмінуўшы пытаньне КНГ АБСЭ, выйсьці на дыпляматычныя кантакты з эўрапейскімі краінамі паводле новай формулы.

Аднак ці выкарыстае гэты шанец Лукашэнка, ці прывабіць Беларусь такі варыянт? Каб адказаць на гэтае пытаньне, трэба разабрацца, якую палітыку цяпер вядзе ў дачыненьні да Беларусі Расея. І ўзьнікае новая загадка.

Верагодна, адкрываецца новы разьдзел у беларуска-расейскіх адносінах. Цяжка прагназаваць, у якім напрамку яны будуць разьвівацца. Да гэтага году Расея адназначна падтрымлівала Лукашэнку, прызнавала ўсе выбары сапраўднымі, а абраныя на іх улады — прадстаўнічымі органамі беларускай дзяржавы. Першыя прыкметы таго, што Расея, магчыма, не да канца задаволеная Лукашэнкам, зьявіліся ў чэрвені 2001 году, калі Масква ня выказала выразнай падтрымкі Лукашэнкі перад выбарамі. Яна нібы прыглядалася да меркаваньня беларусаў, спрабуючы зарыентавацца, а ці ня знойдзецца канкурэнт, здольны пазмагацца з Лукашэнкам на роўных. Ліпень вельмі хутка гэтыя сумненьні разьвеяў, і Лукашэнка атрымаў вялікі крэдыт з Масквы. Аднак 2002 год паказаў, што Расея больш не зьбіраецца ўхваляць усіх дзеяньняў Лукашэнкі суздром, як гэта было раней. Канфлікт тлее. Найбольш яскравай прыкметай яго сталі вынікі апошніх сустрэчаў Лукашэнкі з Пуціным і чэрвеньская заява апошняга пра тое, што ня можа быць гаворкі аб стварэньні нейкага міждзяржаўнага аб’яднаньня Беларусі і

* **Тэкст датаваны пачаткам верасьня.**

Расеі, а трэба, уласна кажучы, гаварыць пра інкарпарацыю Беларусі ў Расею. Цяжка меркаваць, ці такія пляны Пуцін выношвае на самай справе, але за гэтымі словамі стаіць рашучае адмаўленьне Лукашэнкавых прэтэнзій на раўнапраўнае партнэрства ў справе стварэньня новай дзяржавы. Лукашэнка адрэагаваў на прапановы Пуціна рашучым "не". Мне здаецца, у такой сытуацыі прапанова з боку Эўразьвязу была б для Лукашэнкі вельмі добрым выйсьцем з досыць цяжкога становішча. Поўная фінансавая залежнасьць і рост патрабаваньняў з боку Расеі робяць яго залежным і ставяць у пазыцыю, якой ён ніколі не прымаў, — у пазыцыю хутчэй губэрнатара, чым роўнага партнэра.

Ці пойдзе Лукашэнка насустрач прапановам Эўропы? Думаю, што найбліжэйшыя два месяцы гэта пакажуць. Магчыма, мы станем сьведкамі новага "флірту" Лукашэнкі з эўрапейскімі краінамі альбо канца гэтага рэжыму. Функцыянаваньне рэжыму-банкруту без эўрапейскіх грошай ці з "кароткімі" расейскімі грашыма выкліча яго падзеньне цягам найбліжэйшых двух гадоў.
Ёсьць і іншыя моманты, якія могуць увайсьці ў супярэчнасьць з шанцамі на дыялёг паміж адміністрацыяй Лукашэнкі і Эўразьвязам. Ужо два месяцы ідуць гаворкі пра тое, што Лукашэнка можа адмяніць мясцовыя выбары, заплянаваныя на наступны год. Адмена гэтых выбараў азначала б страту яшчэ адной магчымасьці зьмяніць сытуацыю ў Беларусі законным, дэмакратычным шляхам. Тую ж пагрозу нясуць пляны рэфэрэндуму, на які былі б вынесеныя пытаньні аб далейшай інтэграцыі з Расеяй, але адным з пунктаў якога стала б і пытаньне аб зьменах у канстытуцыю, што дазволілі б Лукашэнку балятавацца ў прэзыдэнты Беларусі на трэці тэрмін. Цяперашняя Канстытуцыя, зацьверджаная на рэфэрэндуме 1996 году, абмяжоўвае прэзыдэнцтва двума тэрмінамі, а паколькі цяперашні тэрмін — другі, трэці бязь зьменаў у канстытуцыі немагчымы.
На такім шырокім фоне я хацеў бы ўзьняць пытаньне пра ролю Польшчы ў гэтым працэсе. Эўразьвяз і эўрапейскія краіны насамрэч ня маюць канцэпцыі таго, што рабіць зь Беларусяй. Апошнія чатыры гады выразна засьведчылі, што пазыцыя Эўразьвязу вельмі непасьлядоўная, што яна мяняецца пад

уплывам розных чыньнікаў, якія датычаць як унутранай сытуацыі ў Беларусі, так і міжнароднай увогуле. Можна нават сказаць, што эўрапейскія краіны зусім не цікавяцца Беларусяй, якая не ўяўляецца ім сур'ёзнай палітычнай праблемай. Для Польшчы ж Беларусь — непасрэдны сусед, адсюль важнасьць гэтай праблемы. Роля Польшчы ў рэгіёне істотная. Тым ня менш, аналізуючы беларускую палітыку цяперашняга ўраду, можна канстатаваць, што і яна непасьлядоўная.
З аднаго боку, Польшча выступіла зь дзьвюма сур'ёзнымі ініцыятывамі: аб згаданым вышэй "візыце апошняга шанцу", ідэя якога была распрацаваная не без удзелу польскіх дыпляматаў, а таксама пра скліканьне польска-расейскай камісіі па Беларусі. (Гэтая тэма абмяркоўвалася падчас візыту Пуціна ў Варшаву. Вялікае значэньне мае само прызнаньне Расеяй таго факту, што ў Польшчы ёсьць свае інтарэсы ў Беларусі.) Зь іншага боку, ствараецца ўражаньне, што цэльнай канцэпцыі дзеяньняў у дачыненьні да Беларусі афіцыйная Варшава ня мае. Спачатку міністар Цімашэвіч сустракаецца зь міністрам замежных справаў Беларусі Хвастовым — што нібыта сьведчыць пра спробы нейкага кантакту з рэжымам, пераадоленьня ізаляцыі. А трохі пазьней — неабдуманыя дыпляматычныя ноты, перадусім апошняя, з нагоды адцэнзураванай перадачы радыё "Палёнія" на беларускім радыё "Сталіца" (калі як зь яе выразалі выступ міністра замежных справаў Польшчы Цімашэвіча). Міністэрства адрэагавала завостра, нашмат вастрэй, чым таго патрабавала сытуацыя, бо гэтае выказваньне ўсяго толькі не адпавядала таму фармату праграмы, які на самым пачатку быў узгоднены зь беларускім радыё.

Што Польшча магла б зрабіць у дачыненьні да Беларусі? З чаго магло б складацца так званае "ўсходняе вымярэньне" — польская стратэгія замежнай палітыкі ў дачыненьні да суседніх краінаў?
Эўропа не цікавіцца ня толькі Беларусяй, яна таксама ня мае распрацаванай канцэпцыі стаўленьня да дынамічнай і зьменлівай сытуацыі ва Ўкраіне, як і ня мае канцэпцыі наконт Расеі, калі гаварыць пра доўгатэрміновае, стратэгічнае супрацоўніцтва зь ёю. Што да Польшчы, дык калі праз год яна ўвойдзе ў Эўразьвяз, галоўнай праблемай замежнай палітыкі

для яе стануць адносіны з усходнімі суседзямі. У той жа час, стаўшы ўдзельніцай Эўразьвязу, яна таксама зможа ўплываць на ўсходнюю палітыку ўсяго Зьвязу. Галоўным канкурэнтам Польшчы ў гэтым выступае Нямеччына, якая выразна прадчувае будучае суперніцтва. Прынамсі, увесь апошні год нямецкія дыпляматы крытыкавалі як дзейнасьць польскіх няўрадавых арганізацыяў на тэрыторыі Ўкраіны і Беларусі, так і некаторыя крокі польскай дыпляматыі. Нямеччына імкнецца падкрэсьліць, што права фармаваць усходнюю палітыку адзінае Эўропы — за ёй. Для Польшчы гэта сур'ёзны выклік, што вымагае задумацца над тым, якую ролю павінна адыгрываць у гэтай сфэры Польшча. У такой канкурэнцыі мы маем адну перавагу — падтрымку Злучаных Штатаў, якія зацікаўлены ў моцнай пазыцыі Польшчы ў яе рэгіёне і правядзеньні празь яе сваёй палітыкі ў дачыненьні да Беларусі і Ўкраіны. Умелая гульня нашага МЗС і стварэньне раўнавагі паміж зацікаўленасьцю ЗША і інтарэсамі Эўразьвязу маглі б узмацніць нашу вагу ў вызначэньні ўсходняй стратэгіі ўсяго Эўразьвязу.
Якая павінна быць палітыка ў дачыненьні да Беларусі ў гэтым кантэксьце? Перадусім гэта павінна быць доўгатэрміновая палітыка. Усялякія кароткатэрміновыя захады, кшталту тых, зь якімі выступаў Эўразьвяз, папросту не даюць ніякага выніку. Нават зьмена Лукашэнкі на пасадзе прэзыдэнта іншым палітыкам, якая, здавалася б, павінна была б стварыць прастору для палітычных зьменаў, насамрэч не паўплывала б радыкальна на сытуацыю ў Беларусі, галоўным чынам дзеля пазыцыі самога грамадзтва, яго кансэрватызму. Толькі доўгатэрміновыя дзеяньні могуць нешта зьмяніць у гэтай краіне. Эўропа не гатовая да такіх дзеяньняў, таму захады Польшчы могуць адыграць важную ролю. Калі ня ўдасца распрацаваць такую стратэгію, то альтэрнатывай будзе толькі аддаць Беларусь Расеі, пад эканамічным кантролем якой яна і так цяпер знаходзіцца. Расейцам застаецца толькі ўстанавіць поўны палітычны кантроль і ажыцьцявіць інкарпарацыю. Але ці ж адпавядае такое рашэньне інтарэсам Польшчы?

Другі пункт, які я хацеў бы вылучыць, аналізуючы палітыку ў дачыненьні да Беларусі, гэта тое, што палітыка павінна праводзіцца двума шляхамі. Першы шлях — супрацоўніцтва з

самімі ўладамі Беларусі. Асабіста я лічу правільным тое, што польскія ўлады пачалі наладжваць кантакты з лукашэнкаўскай адміністрацыяй. Ёсьць сумненьні толькі наконт таго, ці павінны яны пачынацца на такім высокім ўзроўні? Напэўна, лепей было б пачынаць ад супрацоўніцтва зь мясцовымі ўладамі, а не выходзіць адразу на прэзыдэнцкую адміністрацыю. Аднак мне здаецца, што адзіны шанец прарваць блякаду, створаную зь беларускага боку, — вельмі цярплівыя і пасьлядоўныя спробы перамоваў, разумных кантактаў — г. зн. “ня даць адкусіць сабе пальца”.

І другі кірунак правядзеньня палітыкі, на якім я хацеў бы падрабязьней спыніцца, — гэта праца над грамадзкімі зьменамі ў Беларусі, галоўным чынам празь дзейнасьць у галіне эканомікі і дапамогу няўрадавым арганізацыям. Гэта адзіная магчымая доўгатэрміновая палітыка на ўсходзе. Дарэчы, калі параўноўваць польскія напрацоўкі ў гэтым кірунку зь нямецкімі, то тут мы лепшыя. Мы занялі акрэсьленую пазыцыю як ва Ўкраіне, так і ў Беларусі, займаючыся досыць актыўнай грамадзкай дзейнасьцю ў гэтых краінах, у той час як Нямеччына абмяжоўваецца дабрачыннай дапамогай з боку пратэстанцкіх цэркваў, на што не заўсёды добра глядзяць ня толькі беларускія ўлады, але і само грамадзтва, пераважна праваслаўнае.

Польшча павінна зрабіць у Беларусі, а таксама ва Ўкраіне й Расеі (асабліва ў галіне эканомікі) нашмат больш, чым дагэтуль было зроблена. Відавочна, мы ня зможам канкураваць зь вялікім капіталам, і, вядома, расейскі або нямецкі капітал у Беларусі будзе дамінаваць. Расейскі — дзякуючы традыцыйным эканамічным кантактам Расеі зь Беларусяй. Нямецкі — дзякуючы большым інвэстыцыйным магчымасьцям і ўжо падрыхтаванай нямецкай стратэгіі інвэстыцыяў у Беларусі праз расейска-нямецкія акцыянэрныя таварыствы, у якіх ёсьць распрацаваны плян удзелу ў прыватызацыі розных прадпрыемстваў Беларусі. Польшча можа адыграць ролю ў іншай галіне — найперш у сфэры малога і сярэдняга бізнэсу. Наш найбольшы посьпех за час рэформаў, асабліва ў параўнаньні з Чэхіяй, — стварэньне моцнай сфэры малога і сярэдняга бізнэсу. І беручы пад увагу спэцыфіку Беларусі, дзе дагэтуль няма алігархаў накшталт тых, якія кіруюць расейскай і ўкраінскай эканомікай, можна было б бачыць пэрспэктыўнае

поле дзеяньняў і разьвіцьця менавіта такога віду прадпрымальніцтва. Гэта магло б паўплываць на сацыяльную структуру Беларусі і прывесьці да фармаваньня сярэдняе клясы, здольнай стаць базай для дэмакратычных пераўтварэньняў. Беларусь — малая краіна, і малыя дзеяньні маюць адносна вялікі ўплыў на агульную сытуацыю ў краіне.

Што да працы зь беларускім грамадзтвам, дык у доўгатэрміновай палітыкі такога кшталту павінны быць дзьве мэты.
Першая — гэта прарыў культурнай, цывілізацыйнай і адміністрацыйнай ізаляцыі. Небясьпекі выявяцца тады, калі мы далучымся да Шэнгенскага пагадненьня. Увядзеньне візаў з часам можа абмежаваць трансгранічны рух. Гаспадарчыя зьмены ў Польшчы ідуць хуткімі тэмпамі, а ў Беларусі — марудна, і гэтая цывілізацыйная прорва будзе паглыбляцца.
Другая мэта — “суб’ектывацыя грамадзтва”. Немагчыма стварыць дэмакратычную сыстэму ў Беларусі (і ў Расеі, Украіне таксама) без удзелу грамадзтва, якое патрабавала б такой сыстэмы. Стварэньне моцнай грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі — адзіны шанец стварыць краіну, якая ня будзе баяцца Польшчы, будзе разумець працэсы, што адбываюцца ў нас, і будзе мець той самы кірунак разьвіцьця. Могуць быць некалькі крокаў у гэтай сфэры. Найперш гэта дзеяньні, накіраваныя на ўмацаваньне мясцовых супольнасьцяў і ўсялякіх сацыяльных групаў, якія спрыяюць самаарганізацыі грамадзтва, разьвіцьцё навуковых, моладзевых абменаў. Польская дзяржава пакуль не падтрымлівае такіх ініцыятываў, абмяжоўваючыся працай з польскай меншасьцю. Але такім шляхам можна было б адносна малым коштам стварыць значную прапольскую эліту, зацікаўленую ў рэформах. Вельмі важнай падаецца мне і падтрымка беларускіх СМІ, рэкляма Польшчы, прадстаўленьне польскага досьведу эканамічных і палітычных рэформаў, іх пазытыўнага і нэгатыўнага досьведу, каб беларускія чыноўнікі ды грамадзтва ў цэлым не баяліся першага кроку да рэформаў. Інфармацыйная блякада і неразуменьне працэсаў, што адбываюцца ў Польшчы, — сур’ёзны псыхалягічны бар’ер, адна з прычынаў кансэрвацыі цяперашняга стану ў Беларусі. Нарэшце, прапаганда праз культуру. Прычым не такім шляхам,

як гэта робіцца сёньня, — не празь фінансаваньне польскай меншасьці, а сучасным шляхам так званай “народнай дыпляматыі”.
На сёньня МЗС Польшчы ня мае пасьлядоўнай канцэпцыі супрацоўніцтва з польскімі няўрадавымі арганізацыямі, палі дзейнасьці якіх ахопліваюць і Беларусь. Гэта вялізны прабел польскай замежнай палітыкі. Увесь час яна абапіраецца на традыцыйны яшчэ з XIX стагодзьдзя прынцып вядзеньня дыпляматыі — на ўзроўні чыноўнікаў.
Адсутнасьць польскае канцэпцыі ўсходняй палітыкі Эўразьвязу і пасіўная пазыцыя польскай дзяржавы ў дачыненьні да краінаў Усходняй Эўропы непазьбежна вядуць да здачы Ўкраіны й Беларусі пад расейскі ўплыў. Абыякавасьць Польшчы да гэтых краінаў пры такім жа падыходзе з боку Літвы, Чэхіі і Славаччыны будзе азначаць сапраўдную ізаляцыю паміж дзьвюма часткамі Эўропы.
З польскай мовы пераклаў Антось Кузьміч

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]

УЛАДЗЬ ГАРБАЦКІ — палітоляг, выпускнік Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту. Жыве ў Віцебску.

Уладзь Гарбацкі

Развагі аб гейскім пытаньні

Didier Eribon. Réflexion sur la question gay. — Paris: Fayard, 1999.

Гомасэксуальнай асобай не нараджаюцца — ёю навучаюцца, быць.
М. Полак [1]

Нарэшце пачалі зьяўляцца фундамэнтальныя інтэлектуальныя развагі аб гэтак званым “гейскім пытаньні”. Пасьля стагодзьдзяў, цягам якіх пра гомасэксуальнасьць ствараліся толькі маралісцка-эмацыйныя опусы, чалавецтва дачакалася ня проста твораў-дыягназаў, твораў-апісаньняў, а твораў-стратэгіяў, якія дапамагаюць геям і лесьбіянкам быць, жыць у сучасным грамадзтве.

Эсэ французскага пісьменьніка й літаратурнага крытыка Дыд’е Эрыбона “Развагі аб гейскім пытаньні”, якое ўбачыла сьвет у

[1] **Michael Pollak, L’homosexualité masculine, Ou le bonheur dans le ghetto // Sexualités occidentales / пад кір. Philippe Ariès і Andre Bejin. Paris: Seuil, 1982, С. 59.**

1999 годзе, пераконвае чытача ў тым, што гомасэксуальнасьць, ці, паводле аўтара, “гейскасьць”, — справа ня толькі інтымная, індывідуальная, але перш-наперш супольная, публічная. Безумоўна, Д. Эрыбон ня першы, хто апісаў, якім чынам гомасэксуальнасьць у заходніх грамадзтвах сталася сынонімам анамаліі, хваробы, непаўнавартасьці, недасканаласьці. Да яго процьма гісторыкаў і філёзафаў стварылі сапраўдную бібліятэку твораў-змаганьняў, якія даказваюць банальнасьць, нармальнасьць гомасэксуальнасьці. Напрыклад, працы Мішэля Фуко — найгрунтоўнейшыя ў гэтым рэчышчы. Ды, здаецца, Д. Эрыбон не прэтэндуе на ролю першаадкрывальніка тэмы гееўскай загнанасьці. Абапіраючыся на творы выбітных філёзафаў і сацыялёгаў — Ж.-П. Сартра, С. дэ Бавуар, М. Фуко, М. Полака, Р. Арона, ён разважае не “чаму маргіналізаваныя”, а “як хутчэй выйсьці” з катэгорыі маргіналізаваных і адрынутых. Гэткім чынам, у аснове эсэ — выпрацоўка пэўнай стратэгіі дасягненьня таго, каб гейскасьць сталі ўспрымаць як нешта нармальнае і самі геі, і гетэрасэксуальная большасьць насельніцтва.

Як жа дасягнуць таго жаданага пераходу гейскасьці ў разрад нормы? Сцэнараў шмат, аднак, паводле Д. Эрыбона, асаблівай увагі заслугоўвае дзейная й вядомая практыка *coming out*’у, ці, кажучы нашаю моваю, публічнага прызнаньня ўласнай гейскасьці. Бо каб стаць звычайным, трэба быць бачным, вядомым, публічным. Рашыцца на прызнаньне — значыць рашыцца адкрыць усім свае прыхільнасьці ў сэксе. Безумоўна, такія выпадкі надзвычай папулярныя, модныя на Захадзе й цалкам адсутныя ў нас. Практыка публічнага прызнаньня мае свае адмоўныя й станоўчыя бакі. Нават ва ўмовах, калі гейскасьці максымальна спрыяльных для адкрыцьця ўласнай гейскасьці (напрыклад, у мэгаполісе), ёсьць рызыка сутыкнуцца з усюдыпрысутнай і часьцяком падсподнай гамафобіяй. Акрамя датычыць станоўчых бакоў адкрыцьця сваёй гейскасьці, гэта перш-наперш вызваленьне ад сталага моцнага псыхалягічнага напружаньня, у якім вымушаныя жыць геі і лесьбіянкі. Таксама “адкрыцьцё сябе” сьведчыць пра шчырасьць у дачыненьні да самога сябе, разьвітаньне з заўсёднай незадаволенасьцю, няўпэўненасьцю, напаўасалодай, напаўжыцьцём нарэшце. Альбо, паводле лёгікі Ж.-П. Сартра, зь

2. Didier Eribon. Dire ou ne pas dire // Nouvel Observateur, juillet 1999. С. 10.

“неаўтэнтычнасьцю” [2] жыцьця. У пэўнай ступені адкрыцьцё ўласнай гейскай тоеснасьці — першы крок у фармаваньні “афіцыйнай гейскасьці”, гэта значыць гейскасьці, зразумелай і прымальнай усяму насельніцтву.
Зразумела, што Беларусь наўрад ці можна аднесьці да краінаў са спрыяльным кліматам для публічнага прызнаньня. Падаецца, што і ў Менску геі й лесьбіянкі жывуць нібы прусакі ў норцы. Бо, на жаль, па сёньня “гейскасьці” ў Беларусі не існуе, ёсьць толькі “гомасэксуалізм” як “псыхічная паталёгія”. Пры гэтым трэба адзначыць, што часьцяком існаваньне гомасэксуалізму ставіцца пад сумнеў афіцыйнымі беларускімі асобамі (у памяці застаецца заява У. Замяталіна наконт “неўласьцівасьці гомасэксуальнасьці беларускаму народу”). Гэткім чынам, фэномэн публічнага прызнаньня — складаны. Нельга адназначна сказаць, дзейсны ён ці не. Усё залежыць ад канкрэтнай сытуацыі, канкрэтнай асобы: зразумела, што ў беларускай вёсцы адкрыцьцё сваёй гейскай тоеснасьці — вялікая рызыка. Хаця выйсьце з зачараванага кола нябачнасьці, аднаўленьне гейскасьці мажліва толькі дзякуючы моцнаму й скандальнаму *coming out*’у.
Вернемся цяпер да праблемы гамафобіі, якая складае адну з асноўных тэмаў кнігі Д. Эрыбона, а таксама асноўны матор сучасных рухаў геяў і лесьбіянак.

Зразумець гамафобію можна толькі ў сувязі з існаваньнем гейскасьці. Няма геяў і лесьбіянак — няма гамафобіі. Але ж, дзякуй богу, людзкі сьвет разнастайны: побач з гетэрасэксуаламі ёсьць геі, лесьбіянкі, бісэксуалы й г.д. Існуе рэакцыя на гэтую самую разнастайнасьць — гамафобія: нянавісьць і/ці спалох, якія разьвіваюцца ад няведаньня негетэрасэксуальнага ладу жыцьця.
“Норма й інстытуцыі — гамафобныя” [3], — сьцьвярджае францускі мысьляр Эрыбон, яны ствараюць панятак публічнай гамафобіі, яны выклікаюць індывідуальную гамафобію — адлюстраваньне публічнай нянавісьці да геяў і лесьбіянак на лякальным узроўні. У гетэрацэнтрычным грамадзтве (усе легітымная адзіная мадэль сацыяльных, сэксуальных, эмацыйных адносінаў: мужчына—жанчына) няма місца “сэксуальным дысыдэнтам” [4].
Як ужо адзначалася вышэй, у беларускім гетэрацэнтрычным

[3] **Didier Eribon. Réflexion sur la question gay. С.166.**

[4] **Панятак стабільны францускім пісьменьнікам Дамініцкам Фэрнандэзам, які адзначае**

грамадстве “не існуе гомасэксуальнасьці” праз зьяў кіраўніцтва, а тая публічна прызнаная мадэль сэксуальных эмацыйных стасункаў не называецца наагул, бо “гетэра” лічыцца ўнівэрсальным, базавым, які часьцей за ўсё не патрабуе вымаўленьня — нагэтулькі ён “натуральны” і (сама)дастатковы.

Вось гэтая відавочная (сама)дастатковасьць гетэрасэксуальнасьці якраз і зьяўляецца першаснай гамафобіяй.

Яшчэ Мішэль Фуко заўважыў, што гейская тоеснасьць мажлівай “дзякуючы” гамафобіі, бо апошняя амаль што стварыла, пабудавала новую тоеснасьць, вымусіла лесьбіянак скансалідавацца й вырашаць, як змагацца з гетэранормай. Сучасная амэрыканская дасьледніца гейскасьці Эва Касоўскі Сэдгуік (Eve Kosofsky Sedgwick) [5] таксама лічыць, што менавіта нянавісьць гетэрасэксуальнага грамадзтва да геяў і лесьбіянак сканструявала сёньняшнюю гееўскую й лесьбійскую тоеснасьці.

Парадокс фармаваньня гэтай тоеснасьці заключаецца ў тым, што гей — адначасова і гей, і гамафоб, бо ўключае ў сябе як рысы гееўскага жаданьня, гэтак і імкненьне пазбавіцца яго “брыдкага”, “ненармальнага”, “кепскага” жаданьня. Гамафоб — гей, жыць з партнэрам аднаго полу. І гэта не тэарэтычная выдумка, а адлюстраваньне рэчаіснасьці: амаль кожны гей, кожная гейка калі-нікалі сутыкаюцца з жаданьнем стаць “нармальнымі”, “як усе”, гэта значыць гетэрасэксуальнымі. Гэтая парадаксальная гамафобія сярод геяў тлумачыцца проста: штодзённае змаганьне геяў і лесьбіянак са сваім гомаэратычным жаданьнем у пэўны момант становіцца невыносным, цяжкім. Тады карціць простасьці, “натуральнасьці”, спакою — гэта значыць стасункаў, якія публічна ўспрымаюцца пазытыўна. Напэўна, гэтае адмаўленьне гейскасьці самімі геямі й гейкамі ёсьць адным з вынікаў “сэксуальнага расізму” [6], яшчэ аднога панятку, шырока ўжыванага ў кнізе Д. Эрыбона.

У тэарэтычным пляне трэба адзначыць, што развагі Д. Эрыбона грунтуюцца на філязофіі экзыстэнцыялізму — сартрызьме й бавуарызьме. Нават назва кнігі “Развагі аб гейскім пытаньні” нагадвае Сартравы “Развагі аб жыдоўскім пытаньні”.

Д. Эрыбон часьцяком выкарыстоўвае ўведзеныя ім паняткі

ўсіх гетэрасэксуальных асобаў геяў і лесьбіянак, а тэрміну “гетэра” наогул.

[5] **Didier Eribon. Réflexion sur la question gay. P. 216.**

[6] **Там самае. С. 130.**

“аўтэнтычнае”, “неаўтэнтычнае” жыцьці, “экзыстэнцыйны выбар” альбо “неажыцьцяўляльная тоеснасьць” у развагах аб гейскім пытаньні. Гэта тлумачыцца перш за ўсё супадзеньнем ідэалягічных густаў Д. Эрыбона й Ж.-П. Сартра. Да таго ж Д. Эрыбон адтварыў забытыя ідэі экзыстэнцыялізму на мяжы XIX—XX стагодзьдзяў. У сёньняшнім тлумачэньні гееўскай тоеснасьці шматлікія паняткі, ужытыя Сартрам і Бавуар, цудоўна дапамагаюць агучыць гейскі дыскурс і надаць яму навуковую вагу.

Напрыклад, Сартравы развагі пра парадаксальную чалавечую стараннасьць й неразуменьне праблемаў і турботаў іншых — пра своеасаблівы ўнівэрсальны чалавечы эгаізм — у гейскім пытаньні набываюць асабліва моцнае гучаньне. Так, напрыклад, факт прыналежнасьці да пэўнай загнанай і маргінальнай групы насельніцтва — жыдоў, геяў й геек, мурынаў альбо беларускамоўных беларусаў — не вядзе аўтаматычна да глябальнага разуменьня загнанасьці. Можна быць геем і расістам, геем і жанчынаненавісьнікам, ды ў дадатак беларусафобам.

У гэтым рэчышчы Сартрава (а цяпер і Эрыбонава) асэнсаваньне маргінальнасьці можа быць добра зразуметае ў беларускім кантэксьце, дзе замест сартраўскага прыкладу жыдоў і эрыбонаўскіх геяў і лесьбіянак існуе маргіналізаваная катэгорыя беларускамоўных беларусаў.

Паралелі паміж загнанасьцю геяў і беларускамоўных навідавоку, як, дарэчы, аднолькавасьць парадоксу, што назіраецца сярод шматлікіх геяў з аднаго боку й беларусаў зь іншага, — парадоксу неразуменьня, няўменьня адчуць праблему іншых. Вядома, што сярод беларускамоўных шмат гамафобаў і, наадварот, сярод беларусаў-геяў процьма беларусафобаў.

Дзе ж капраміс? Альбо кампраміс — панятак слабы й адносны ў эпоху тоеснасьцяў? Бо існаваньне пэўнай тоеснасьці прадугледжвае канфлікт, сутычку, мяжу, за якой — іншыя памкненьні, жаданьні, прэтэнзіі. Напэўна, на гэтае пытаньне, як на безьліч іншых, няма адказу. Дый, здаецца, ніводны філёзаф не шукае пэўнага адказу, ён проста разважае, спрабуе зрабіць уласны інтэлектуальны здабытак карысным для пэўных асобаў, групаў, дапамагаючы ім выкараскацца з пасткі нябачнасьці й ігнараваньня.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]

Тадэвуш Канвіцкі

Малы Апакаліпсыс

Тадэвуш Канвіцкі (нар. 1926) — польскі пісьменьнік і кінарэжысэр. Падчас апошняй вайны партызаніў у аддзеле Арміі Краёвай на Віленшчыне, пасьля вайны пісаў сацрэалістычную прозу і публіцыстыку (кнігі "Падчас будовы" (1950), "Улада" (1954). Пачынаючы з 60-х, адыходзіць ад ранейшай эстэтыкі і зьвяртаецца да мэтафарычна-гратэскавых

Пераклад пабачыў сьвет пры дапамозе Польскага інстытуту ў Менску й Польскай фундацыі "©POLAND" Міністэрства культуры й нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшчы.

Гэта надыходзіць канец сьвету. Гэта насоўваецца, набліжаецца ці, хутчэй, падпаўзае мой уласны канец сьвету. Канец майго асабістага сьвету. Але, перш як мой сусьвет распадзецца на аскепкі, рассыплецца на атамы, выбухне ў вакууме, мяне яшчэ чакае апошні кілямэтар маёй Галгофы, апошні круг у гэтым маратоне, некалькі апошніх прыступак уверх або ўніз па лесьвіцы абсурду.

Я абудзіўся ў тую змрочную часіну, якой пачынаецца безнадзейны восеньскі дзень. Ляжу і гляджу ў поўнае хмараў акно, дакладней, поўнае адной хмары, падобнай да счарнелай ад старасьці шпалерыны. Гэта часіна падбіцьця балянсу жыцьцёвага капіталу, часіна штодзённага "пераўліку". Некалі людзі маракавалі апоўначы, перад цяжкім сном, цяпер яны б'юць сябе ў грудзі пад раніцу, абуджаныя тахканьнем надарванага сэрца.

Побач, на століку, ляжыць чыстая папера. Нітраматрыкс сучаснага літаратара, наркатычны парашок зьняволенага індывіда. Можна занурыцца ў плыткае белае жарсамотнае, схавацца ад самога сябе і ад прыватнага сусьвету, які ўжо выбухне і зьнікне. Гэтую безабаронную бель можна запэцкаць злой крывёй, моцным ядам, смуродлівымі, а гэтага ніхто ня любіць, нават сам аўтар. На гэтую бель можна выцадзіць слодыч штучнай згоды, амброзію робленай бадзёрасьці, саладжавы сыроп лісьлівасьці — а гэта любяць усе, нават сам аўтар.

У які бок пахіліць на гэтым апошнім крузе? У горкае ці салодкае права? За акном тая самая хмара або гразь аднастайных хмараў. Па заржавелым падваконьні цягнецца дождж на доўгіх тонкіх нагах. Нешта там некалькімі слівы рух формаў, фарбаў, кавалкаў эмоцыяў. Маё або не. Хутчэй нейкае выдуманае. Зьлепак з прачытанага, нязробленага, старых фільмаў, няскончаных маніфэстаў, легендаў, несасьнёных сноў. Маё жыцьцё. Катлета з касьмічнага пылу.

У гэтай хмары або ў гэтых некалькіх злучаных ўзаемна восеньскіх хмарах патанае Палац культуры, што некалі, часамі маёй маладосьці, быў Палацам культуры імя Іосіфа Сталіна. Агромністая сьпічастая пабудова, якая страх, нянавісьць, несла магічную пагрозу. Помнік пыхі, статуя несвабоды, каменны торт перасьцярогі. А цяпер — вялікі барак, пастаўлены рубам. Зьедзеная грыбком старая прыбіральня, забытая на сярэднеэўрапейскім раздарожжы.

Першае выданьне кнігі ў беларускай мове “Малога апакаліпсысу” (першае выданьне — 1979) друкуецца з ласкавага дазволу аўтара.

Аконца міргае мне некалькімі завялымі флёксамі. Какетуе зь лісьлівай фамільярнасьцю. А хто мяне паставіў рубам? Мяне паклалі на бок. Кінулі на бок. Я ляжу на левым баку і слухаю сваё сэрца, якога не чуваць. І думаю пра той нясьпешны лацужок хімічных рэакцыяў, у выніку якога ў мяне

мастацкіх формаў (раманы-анонкі, “Ніякіх забаў ніколі” (1971), “Пошукі” (1977) і інш.).

У 2001 годзе вынікам гэтых ідэй стаў кнігі Канвіцкім “Rzeczy tam, gdzie było gorąco. Rozmowy z Tadeuszem Konwickim przeprowadzili Katarzyna Bielas i Jacek Sobczak”.

Пераклад на беларускую мову

расплюшчваюцца вочы, у мяне буркоча ў страўніку, у мяне моршчыцца скура на лбе, у мяне скавыча прыглушаным болем незалечаны пухір, у мяне ў галаве або вонках адбываецца рух слоў, уяўленьняў, якія мы называем думкамі, у выніку якога зьяўляецца аблачына хваляў, якая ёсьць нудой або спазмам нянавісьці, што страляе ў касьмічную прастору снарад страху перад вечным няведамым або патрон асалоды пазнаньня долі праўды. У шмат якіх маіх сяброў аднойчы раптам абрываўся гэты ланцужок хімічных рэакцыяў, і я ня ведаю, дзе яны цяпер: ці каюцца ля прыгаршчы фосфару, закапанай у магільную зямлю, ці імкнуцца ў глыб бясконцасьці і адбіваюцца ад чорнай сьцяны канца гэтае бясконцасьці, каб вярнуцца сюды, дзе мяне ўжо ня будзе.

У доме чуваць першыя адзнакі жыцьця. Гэты вялікі лякамабіль у выглядзе прыбытковага дому патроху рушыць у штодзённасьць. І я бяру першую цыгарэту. Найсмачнейшая цыгарэта — цыгарэта перад сьнеданьнем. Яна скарачае жыцьцё. Я шмат гадоў заўзята скарачаю сабе жыцьцё. І ўсе крадком скарачаюць сваё жыцьцё. Нешта ў гэтым ёсьць. Нейкі вышэйшы загад або, можа, закон прыроды перанаселенай плянэты.

Я люблю гэтае лёгкае кружэньне галавы пасьля моцнай зацяжкі горкім дымам. Я хацеў бы годна разьвітацца зь сьветам. Бо я змалку разьвітваюся з жыцьцём і не магу разьвітацца. Забаўляюся на чыгуначных пераездах, хаджу пад сьценамі, дзе падае дахоўка, напіваюся да непрытомнасьці, задзіраюся з хуліганамі. І гэтак набліжаюся да фінішу. Я на фінішнай прамой. Я хацеў бы неяк разьвітацца з вамі. Хачу завыць нялюдзкім голасам, каб мяне пачулі ў найглушэйшым кутку плянэты, можа нават у суседніх галяктыках, можа нават у сядзібе Госпада Бога. Ці гэта марнасьць? Ці гэта абавязак? Ці гэта інстынкт, які, нібы падчас катастрофы, нібы падчас касьмічнай катастрофы, загадвае нам крычаць празь вякі ва ўнізаную зорамі прастору?

Мы сталі фамільярнымі з сусьветам. Космасам выцірае сабе рот прадажны паэт, недалёкі гумарыст, падступны журналіст, таму я і не магу задзіраць галаву ўверх, дзе носяцца заржавелыя спадарожнікі і задубелыя адкіды касманаўтаў.

Хацелася б неяк разьвітацца. Усю ноч сьніў зубы. Трымаў у прыгаршчы купу зубоў, як зерне кукурузы. У адным нават сядзела плёмба, танная плёмба з варшаўскай стаматалягічнай

паліклінікі. Нешта сказаць пра сябе да канца. Не для перасцярогі, не для навукі, не для забавы. Проста сказаць тое, чаго ніхто іншы ня можа выказаць. Бо я перад сном або, можа, у першай мімалётнай аблачынцы сну пачынаю разумець сэнс экзыстэнцыі, сэнс часу і сэнс быцьця па-за жыцьцём. Я разумею гэтую тайніцу за долю сэкунды, за імгненьне далёкіх успамінаў, за кароткую хвіліну прыемных або страшных прадчуваньняў і адразу падаю на камяністае дно благіх сноў. Усе зь неяк так уладкаванымі мазгамі напружваюць рэшту сілаў, каб зразумець. А я ўжо блізка. Гэта значыць, наблізіўся. І аддаў бы ўсё, што маю, да апошняга драбочка, але ў мяне нічога няма, і таму я аддаў бы ўсё гэтае нічога, каб пабачыць таямніцу ва ўсёй яе простасьці, пабачыць раз і запомніць назаўсёды.

Я двуногі, народжаны пад Віслаю немаладымі бацькамі, гэта значыць, што я ўспадкаваў у генах увесь іх двуногі досьвед. Я сам бачыў вайну, гэты страшны шал сысуноў, якія забіваюць адзін аднаго аж да поўнага зьнядужаньня. Я назіраў пачатак жыцьця і яго канец у выглядзе таго акту, які мы называем сьмерцю. Я пазнаў усю жывёльнасьць сабе падобных і ўсю іх надзычайную анёльскасьць. Я прайшоў цярністым шляхам індывідуальнай эвалюцыі, якую завуць лёсам. Я адзін з вас. Я дасканалы ананім гома сапіенс. Таму наравісты выпадак не павінен даверыць мне таямніцу, калі яна наагул паддаецца раскрыцьцю.
Тое, што я кажу, удае на нейкую ўзьнёсласьць, на раскошу латругі або на адхіленьне выраджэнца. Але і ўсе вы, хто часам напружвае свае ляныя мазгавыя зьвіліны, зазнаяце такія самыя жаданьні і амбіцыі. Такія самыя страхі і інстынкты самагубства. Такія самыя бунты і рахманасьць.
Дзьве п'яныя нашэньніцы скінулі высокі стос скрынак з бутэлькамі малака. Цяпер, зьнерухомеўшы, назіраюць вынікі катаклізму, перажываючы складаны, але разам з тым просты працэс трансфармацыі жаху ў легкадумную весялосьць. Празрысты дождж зачапіў крылом наш струхлелы ад старасьці дом. Наш варшаўскі дом эпохі позьняга сталінізму, эры дэкадэнцкага сталінізму, пэрыяду спольшчанага і спарахнелага сталінізму.
Трэба ўставаць. Трэба ўзьняцца з ложка і выканаць пятнаццаць

спраў, над сэнсам якіх нельга задумвацца. Нарост аўтаматычных звычак. Блаславёны рак бяздумнага парадку традыцыі. Але апошняя вайна ня толькі забіла некалькі мільёнаў людзей. Апошняя вайна зьнячэўку і незнарок ператварыла ў друз вялікі палац культуры эўрапейскай маральнасьці, эстэтыкі і абычáю. У “ролс-ройсах”, “мэрсэдэсах” і “масквічох” эўрапейскае людзтва ўехала назад у змрочныя пячоры і ледзяныя гроты.
За акном мой горад пад хмарай, як старая, счарнелая шпалерына. Горад, у які мяне закінуў кон майго ўласнага гораду, якога ўжо ня помню і ўсё менш сьню. Кон загнаў мяне ўсяго на некалькі соцень кілямэтраў, але аддаліў ад няспраўджанай экзыстэнцыі на цэлую вечнасьць рэінкарнацыі. Гэты горад цяпер сталіца народу, які ператвараецца ў нішто. Пра гэта таксама трэба сказаць. Але каму? Тым, каго ўжо няма або хто адыходзіць у нябыт? А можа, тым, хто жарэ асобных людзей і цэлыя народы?
Горад пачынае шумець, як прывадны пас. Ён выходзіць з начнога забыцьця. Ён рухаецца да свайго прызначэньня, якое я ведаю і якому хачу запабегчы.
Павук зьяжджае па невідомай нітачцы з-пад столі. Схуднеў, нябожа, зьмізарнеў, бо мух усё меней. Жыве так з мной зь вясны. У свой час я палегчыў яму ловы. Мы пасябравалі з мусу. У яго чамусьці няма сяброкоў, а мае адышлі з гэтага сьвету.

Таму перш згавару пацеры. За сябе, за блізкіх і памерлых сяброў. Мая малітва, укладзеная мною практычна і сьцісла, выглядае як плаксівы ўльтыматум. Адны жаданьні і крыху куртуазнасьці. Калі я малюся, дзікія блюзьнерскія думкі пабразгваюць каля галавы. Я старанна іх адганяю, хоць яны толькі прымяраюць маю сьціплую веду да агромністай і старасьвецкай канструкцыі рэлігійных аксіёмаў, інкруставаных у гэты пахмурны і мэлянхалічны будынак, узьведзены людзьмі зь сьветлых і цёмных эпохаў, добрых і ліхіх. Потым я доўга хрышчуся, без канца роспачна хрышчуся, каб гэтым рытуальным жэстам адагнаць благія думкі, благія жаданьні і благіх духаў.
Я свабодны. Я адзін зь нешматлікіх свабодных людзей у гэтай краіне нябачнага заняволеньня. Заняволеньня, неахайна пакрытага лякам мадэрнасьці. Я доўга і бяскроўна змагаўся за

гэтую марную асабістую свабоду. Змагаўся за сваю свабоду з спакусамі, з амбіцыямі і голадам, які безвач гоніць усіх да разьніцаў. Да быццам бы сучасных разьніцаў чалавечае годнасьці, гонару і нечага там яшчэ, пра што мы даўно забыліся.
Я свабодны і адзін. Бо адзінота — досыць нізкая цана за гэтую маю невялікую раскошу. Я вызваліўся на апошнім крузе, калі ўжо няўзброеным вокам відаць фініш. Я свабодны ананім. Мае ўзьлёты і падзеньні пайшлі ў шапках-няўгледках, мае посьпехі і грахі паплылі на карвэтах-няўгледках і мае фільмы і кнігі паляцелі скрозьдонна ў сэйфах-няўгледках. Я вольны ананім. Дзеля гэтага я закуру яшчэ адну цыгарэту. На галодны страўнік. Вось надыходзіць мой канец сьвету. Гэта я ведаю пэўна. Мой заўчасны канец сьвету. Хто будзе яго вестуном? Раптоўны пранізьлівы боль пад грудзямі? Жудасны віскат колаў аўто, якое хоча затармазіць? Вораг, а можа, сябар?
А гэтыя бабы за акном дагэтуль яшчэ абмяркоўваюць катастрофу з малаком. Расьселіся на дабітых кантэйнэрах зь цёмна-шэрага пластыку, закурылі цыгарэты і назіраюць, як вадзяністае малако сьцякае ў каналізацыйны люк, зь якога бухае пара, бо, відаць, ізноў памылкова ў вадаводныя трубы пусьцілі гарачую ваду зь цеплаэлектрацэнтралі. І я раптам усьведамляю, што ўжо шмат гадоў ніхто не разносіць малака, што гэтая карціна бабаў-работніцаў няпэўнага веку, якія пхаюць вазкі з бутэлькамі малака, што гэты вобраз асацыюецца ў маёй сьведамасьці з прамінулымі гадамі, калі я быў малады і сьвет быў малады.
Мабыць, здымаюць касьцюмаваны фільм, думаю я і прытуляюся лобам да вільготнае шыбы. Але за акном нармальная, штодзённая брудная вуліца. Невялікія купкі людзей пад сьценамі дамоў сьпяшаюцца па сваіх справах. З Палацу Культуры, як і звычайна раніцай, калі падвышаецца тэмпэратура, адрываецца спарахнелы блёк каменнай абкладкі і з шоргатам ляціць уніз па шчарбатых расколінах будынку. Адно цяпер я заўважаю на сьцяне гэтага гмаху вялікага арла на чорным тле, гэта значыць на чырвоным, але счарнелым ад дажджу. Наш белы арол маецца няблага, бо зьнізу яго трымае агромністы зямны шар, абняты сярпом і молатам. Нейкі вадасьцёк аказваецца глыбокім голасам акарыны. Гэта вецер, можа, яшчэ летні, а можа, ужо зімовы, прыляцеў з плошчы

Дэфілядаў і абяртае таполі срэбным бокам да сонца, якое ўвязла ў мокрых хмарах.

Скончыліся цыгарэты. А калі канчаюцца цыгарэты, чалавека агортвае раптоўнае жаданьне зацягнуцца дымам. І я адчыняю чарговыя шуфляды маёй шафы, дзе хаваю зьняважлівыя лісты і старыя рахункі, сапсаваныя запальніцы і фінансавыя квіты, фатаграфіі з маладосьці і сонныя парашкі. І тут, паміж касмылёў ваты ды ролікаў бінтоў з тых даўніх добрых часоў, калі яшчэ для мяне быў сэнс класьціся на апэрацыю, якраз у гэтай замшэлай ад старасьці каморы знаходжу пажоўклую старонку, праляжалую шмат гадоў бачыну, як узгаловак помніка або як надмагільная пліта, паперу, зь якой я некалі распачаў новую прозу, што ніколі ўжо не атрымае канца. А пачынаў я працу ў тую дзівосную пару на Новы год, адразу пасьля Калядаў, яшчэ з прыемным пахмельлем, якое пульсавала ў здаровай галаве. А пачынаў на Новы год таму, што трымаўся тады забабонаў і хацеў новы біялягічны і астранамічны цыкл ушанаваць працай. Пазьней я зразумеў, што мой уласны Новы год пачынаецца ў канцы лета або на пачатку восені, і, відаць, таму я пакінуў пісаць і ніколі ўжо больш не напісаў ні слова.
Значыць, ляжала тая паперына, некалі белая, а цяпер жоўтая, доўгімі месяцамі, кварталамі і гадамі так і ня скончаная, не запоўненая, з выцьвілым дэвізам, пакліканым блаславіць кранальныя сцэны, узьнёслыя думкі і вытанчаныя апісаньні прыроды. Я зьдзьмухваю пыл варшаўскіх фабрык з гэтага васковага трупа майго ўяўленьня і чытаю словы, якія былі жыцьцявым дэвізам аднаго старога польскага магната ў XIX стагодзьдзі: “Калі інтарэсы Расеі гэта дазваляюць, я ахвотна зьвяртаю пачуцьці да сваёй першай бацькаўшчыны”.
Што тады я меў на ўвазе? Ці я хацеў шораніцы, нашча, чытаць гэтае прызнаньне сваім дзецям? Ці меўся разаслаць яго на сьвяточных паштоўках да сучасных сабе магнатаў навукі, літаратуры або кінэматографу? Ці спрабаваў убіцца ў ласку цэнзару дзеля прозы, памерлай ужо ў ложку анэмічнага натхненьня?
Шыбы ў вокнах хваравіта дзынкнулі. Недзе з суседняй вуліцы выскачыў гістэрычны сыгнал міліцэйскіх аўтамабіляў. Я зірнуў на гадзіньнік, прывезены мне калісьці сябрам, Станіславам Д.,

з экскурсіі па Савецкім Саюзе. Я ведаў, што гэта значыць. Як і штодня ў гэты час, па горадзе ў атачэньні міліцэйскага эскорту імчаў бранявы рэфрыжэратар з прадуктамі для міністраў і сакратароў партыі. Кавалькада машын праляцела пад маім домам, распырскваючы калюгі малака па праезнай частцы. Архаічныя малочніцы, выцягнутыя на гэты дзень зь нейкага дому для састарэлых, затапталі, тайком хрысьцячыся, недакуркі на брудным ходніку.
Раптам азваўся гонг ля маіх дзьвярэй. Я сьцішыўся ля акна, ня верачы сваім вушам. Я быў перакананы, што гэтая прылада не функцыянуе ўжо колькі гадоў. Але вытанчаны гук ксыляфону паўтараўся настойлівей. Нацягваючы на хрыбеціну стары халат, падарунак швагра Яна Л., я асьцярожна рушыў за парог. Прыадчыніў дзьверы. На лесьвічнай пляцоўцы стаялі Губэрт і Рышард, абодва ў сьвяточных гарнітурах, што помнілі сярэдзіну спакойных сямідзясятых гадоў. Губэрт у правай руцэ трымаў палку, а ў левай — грознага выгляду чорную торбу. У мяне хутка забілася сэрца, і не без дай прычыны, бо абодва за цэлы год прыходзілі разы з два і кожны іх візыт азначаў радыкальныя зьмены ў маім жыцьці.
— Можна? Не зарана? — весела запытаўся Губэрт.
Я добра ведаў гэтыя іх штучныя ўсьмешкі, за якімі крыўся ўдар, скіраваны ў мой спакой.
Я таксама звольна ўсьміхнуўся, гасьцінна расчыніў дзьверы і, калі яны цырымонна ўваходзілі ў калідор, у думках пачаў ліхаманкава адгадваць мэту іх прыходу. Дзякуючы ім я падпісаў дзясяткі пэтыцыяў, адозваў і пратэстаў, якія гадамі скіроўваліся да нашага негаваркога ў гэтым сэнсе рэжыму. Я некалькі разоў траціў працу, шмат разоў цішком пазбываўся грамадзянскіх правоў, амаль штодня мне даводзіцца перажываць нейкія дробныя, няяўныя прыніжэньні, пра якія сорам нават успамінаць, але з-за якіх, калі яны назапашваюцца гадамі, перастае хацецца жыць. Таму мы сардэчна абняліся, пхнучыся па цесным калідоры з усьмешкамі старых дружбакоў, але мяне агарнула вялікая напружанасьць і перасохла ў горле. Урэшце мы апынуліся ў маім пакоі і ўселіся на драўляных крэслах, пастаўленых у адзін рад, быццам у самалёце, які ляціць да невядомых і жаданых прыгодаў.
— Ты добра выглядаеш, — гукнуў Губэрт, стаўляючы каля сябе гэтую злавесную кульбу.

— І ты нішто сабе, — зычліва адказаў я.
Нейкі час мы натужна пераглядаліся. Губэрт паклаў жылістыя далоні на кавеньку. Яго сьляпое вока глядзела нерухома, другое вока ён прымружыў, углядаючыся ў мяне ці то прыязна, ці то іранічна. Некалі яго катавала або антыкамуністычнае падпольле, або афіцэры-сьледчыя з службы бясьпекі, і ад таго забытага ўсімі інцыдэнту ён хадзіў заўсёды з кавенькаю ды наракаў на здароўе. Рышард, якога я помніў яшчэ як золатавалосага анёлка, быў паўнаватым лысаватым бляндынам, героем бесьсюжэтных раманаў бяз знакаў прыпынку і без дыялёгаў.
Як на старых дзядзькоў, дык мы яшчэ добра выглядалі, гэта факт. Але паўза трохі зацягнулася і трэ было нешта казаць.
— Можа, возьмеце па чарцы?
— Чарка не зашкодзіць, — гукнуў Губэрт. — Якая ў цябе?
— Чыстая, бульбяная. З імпартнай бульбы.
— Тым больш нельга адмовіцца.
Голас Губэрта быў зычны, быццам настроены на большае памяшканьне, чым мой загрувашчаны пакой.
Калі я даставаў з шафкі пляшку і чаркі, яны абодва з Рышардам цішком аглядалі пакой. Забулькатала вадкасьць з імпартнай сыравіны, я прысеў на край крэсла. Цыгарэта нашча — гэта нездарова, а сотка бульбянай гарэлкі — гэта проста сьмерць. Можа, і лепш. Я падняў чарку ўверх.
— Будзьма!
— Тваё здароўе, — аказаўся нарэшце Рышард і хутка пракаўтнуў зьмесьціва чаркі.
За акном на імгненьне аціх вецер і таполі павярнулі сьпелую буяную зеляніну ў наш бок. Дом быў, як на злосьць, надзвычай ціхі, і наша маўчаньне станавілася ўсё гучнейшым. Але я цьвёрда наважыўся не распачынаць першым размовы і змусіць іх раскрыць карты.
Губэрт разважліва адставіў чарку.
— Ты мала выходзіш з дому, — сказаў ён.
— Але. Восень выбівае мяне з каляіны.
— Дэпрэсія?
— Нешта накшталт.
— Пішаш нешта?
— Во цяпер пачаў.
Ён прыглядаўся да мяне неяк недаверліва. Рышард наліў сабе

наступны кілішак.
— І што гэта будзе?
— Нічога асаблівага. Нешта я падахвоціўся напісаць трохі дурніны пра сябе.
— Ты заўсёды пісаў пра сябе.
— Можа, і маеш рацыю. Але я хацеў пра іншых.
— Найлепшы час.
— Каб забыцца.
Усё гэта ўдавала на экзамен. І я пачуваўся экзаменаваным. Але я ўсё жыцьцё адчуваў сябе экзаменаваным выпускніком, у найлепшым разе — студэнтам.
— Ну што, Рышардзе, — гукнуў раптам Губэрт. — Відаць, час брацца за справу.
Рышард хітнуў галавой.
— Трэба нешта падпісаць? — паслужліва здагадаўся я, зіркаючы на чорную торбу.
— Не, гэтым разам у нас іншая справа. Можа, ты, Рышардзе, пачнеш?
— Гавары, гавары, калі ўжо пачаў, — хапатліва сказаў Рышард.
Ува мне расло нейкае дурнаватае цяпло. Я машынальна ўзяўся за бутэльку. Хацеў наліць і Губэрту заадно.
— Дзякую. До, — ён стрымаў мяне як бы крышку афіцыйна, і я падумаў, што гэта нядобры знак.
Па сутнасьці, мне ўсё адно. Я вольны чалавек, які лунае высока над гэтым горадам і здалёк, з лагодным задуменьнем прыглядаецца да дзіўных людзей і іх дзіўных пачынаньняў.
Я несьвядома ўключыў тэлевізарчык, які стаяў на стале. Пачулася выцьцё ветру, шорганьне нейкіх палотнаў, а праз імгненьне з срэбнага экрану выплыла відовішча ўрачыста ўбранага аэрапорту. Ганаровая варта маршавала ўпоперак экрану, нейкія цывільныя прыкрываліся палітончыкамі ад ветру, а над ганаровай вартай і над цывільнымі як ветразі ўздымаліся чырвоныя сьцягі, якія дзе-нідзе, як бы сарамліва, чаргаваліся зь бела-чырвонымі штандарамі.
— Во-во, — наважыўся перарваць маўчаньне Губэрт. — Даўно мы з табой не гаманілі.
Я ўздыхнуў, саромеючыся свайго ўздыху. Глыбей сеў у крэсла.
— Але. Страчваем паміж сабою кантакт, — сказаў я тонам сьвецкага чалавека. — Нас усё менш.
— Кожны толькі пра сябе думае, — дадаў Рышард.

— Але я бачу вынікі вашай дзейнасьці.
— Якая там дзейнасьць, — махнуў рукой Губэрт. — Падтрымліваем слабы агеньчык.
— Гэта факт. Выглядае так, што гэтая краіна сапраўды як бы памерла, — гукнуў я, ня ведаючы, куды яны хіляць.
— Гэтулькі гадоў мітусьні. Мы пастарэлі, зьмізарнелі, выдаючы свае паўлегальныя бюлетэні, пэрыёдыкі, адозвы, якія мала хто чытае. Хіба толькі моладзь. Але моладзь жэніцца, заводзіць дзяцей, купляе малы “фіят”, атрымвае прысядзібную дзялку, садзіць памідоры. Нас зацягвае мяшчанства, савецкае мяшчанства.
— Канец. Магіла, — дадаў Рышард, наліваючы сабе чарку.

Празь няшчыльныя дзьверы балькону на падлогу праточвалася вада. Трэ было б знайсьці анучу і выцерці, але мне крышку ня хочацца, а крышку я саромлюся сяброў. Цяжка нам даецца гутарка. Нязручна прастарэкаваць аб справах, пра якія мы думаем кожны божы дзень, якія нават сьнім у благія ночы. Некалі гэта выглядала лепей. Мы былі дзецьмі XIX стагодзьдзя. Нашыя бацькі належалі да легіёнаў або да POW *, мы былі ў АК ** або ZWZ ***. Гэта значыць, як гэта сёньня сказаць, гэта значыць, як гэта пасьля гэтулькіх гадоў выказаць, гэта значыць, гэта нічога ня значыць, нічагусенькі, у канцы нашага цудоўнага XX стагодзьдзя, стагодзьдзя тыраніі і расьперазанай дэмакратыі, недарэчнай сьвятасьці і геніяльнага гультайства, нікчэмнага мастацтва і начэпнай графаманіі.
Бачу ўзоранае ў мяне здаровае вока Губэрта.
— Чуеш?
— Так, пэўна ж.
— Мы хочам табе сёе-тое прапанаваць. Ад імя сяброў.
Адчуваю нейкі мароз на сьпіне. Вельмі павольна адстаўляю чарку.
— Што вы хочаце прапанаваць?
— Каб ты сёньня а восьмай вечара ўчыніў акт самаспаленьня ля будынку Цэнтральнага Камітэту партыі.
На экране тэлевізару нічога не зьмянілася. Вецер, вялікае шаргатаньне сьцягоў і чаканьне. Адно цяпер пачынае гучаць музыка з студыі, паважная і ўрачыстая.
Я зь цяжкасьцю праглынуў сьліну, зьмяшаную з гарэлкай.
— Ты жартуеш, Губэрце?

— Не. Не жартую, — ён выцер з лобу нябачны пот.
— Але чаму я? Чаму вы да мяне з гэтым прыйшлі?
— Ну а хто? Нехта гэта мусіць зрабіць.
— Я разумею, усё разумею, толькі не разумею, чаму я?
Губэрт зірнуў на Рышарда.
— Я ж казаў, што так будзе.
Рышард узіраецца ў падлогу.
— Слухай, — пакутліва адгукаецца ён нарэшце, — мы доўга меркавалі. Прааналізавалі ўсе кандыдатуры. Выпаў ты.
На акне стаіць маё дрэўца шчасьця. Адно цяпер я бачу, як яно забуяла апошнім часам, як абрасло маладымі, дужымі лісткамі. Гэтулькі гадоў яно чаўрэла, а цяпер раптам безь ніякай звонку прычыны пайшло ўгору, пусьціла ў бакі шмат магутных вузлаватых галінак.
— Ведаеш, — ціха кажа Губэрт, — такі ўчынак толькі тады будзе мець сэнс, калі ўзрушыць людзей, тут, у краіне, і паўсюль за мяжой. Ты ведамы нашым чытачам, і на Захадзе дзе-нідзе чулі пра цябе. Твая біяграфія і твой характар найлепш адпавядаюць гэтай сытуацыі. Пэўна ж, мы цябе ня можам намаўляць і ня будзем гэтага рабіць, гэта твая справа, твайго сумленьня. Я хачу перадаць табе думку ня толькі маю ці Рышардаву, але ўсяе суполкі, якая спрабуе змагацца. Даруй, што я не ўжываю ўзьнёслых слоў.
— Я сумняюся, што мая сьмерць выканае тую ролю, якая на яе ўскладзеная. Я ведаю такіх, якіх гэткая ахвяра зрабіла б сымбалем у сусьветным маштабе.
Яны зірнулі на мяне зь цікавасьцю. Губэрт настойліва расьціраў сьсінелыя пальцы.
— Пэўна, маеш на ўвазе Яна? — спытаўся ён.
— А хаця б. Яго фільмы ведае ўвесь сьвет, і яго кнігі чытаюць у шмат якіх краінах на правох унівэрсальнай літаратуры. Штогод мы зь біцьцём сэрца чакаем, што ён будзе ўзнагароджаны Оскарам або Нобэлем.
Губэрт ледзь заўважна ўсьміхнуўся.
— Гэта завялікая цана, завялікі кошт для гэтай краіны і гэтага грамадзтва. Ты сам сабе адказаў.
— Добра. А нашыя кінэматаграфісты, а нашыя кампазытары? Я магу адразу пералічыць некалькі прозьвішчаў, гаднейшых ад мяне.
— Ты ў самы раз, стары, — сказаў Рышард і ўзяў бутэльку.

Адчуў, відаць, што слабее, надумаў падбадзёрыцца.
— Жыцьцём і крывёй трэба распараджацца абачліва, — азваўся змучаным голасам Губэрт. — Яны маюць выканаць іншую ролю. У гэтым зьнявечаным народзе кожны геній-самародак мае найвышэйшую цану. Іхная сьмерць не нашмат бы нас узбагаціла і страшна зьбядніла.
— А чаму ня ты, ня Рысік?
Яны незадаволена зірнулі на мяне. Іх прысароміла мая хісткасьць.
— Нашто ж тады нам было да цябе прыходзіць? — спытаўся Губэрт. — Скажам табе адкрыта: твая сьмерць будзе мець на парадак большы эфэкт. Ці ж ты гэтага не разумееш?
— Стары, ты ў самы раз, — дадаў мяккасардэчны Рышард, які мучыўся цяпер разам з мной.
— Паслухай мяне, Губэрце. Я ніколі не мяшаўся ў функцыянаваньне нашага творчага арганізму. У вашыя справы, справы шматпакутнай апазыцыі ў краіне, якая нікога не цікавіць, у гэтыя вашыя справы я таксама ніколі не мяшаўся. Але цяпер мушу табе сказаць, што я пра гэта думаю. Вы выгадавалі глухіх і сьляпых дэміюргаў. Такіх, якія ў цудоўным творчым натхненьні, прадукуючы ўнівэрсальнае прыгожае мастацтва, не заўважалі ні нас, што поўзалі ў брудзе, ні штодзённых мукаў грамадзтва. Яны самааддана пільнавалі распалены ў іх агонь геніяльнасьці і хапатліва карысталіся славай, створанай масавай прапагандай рэжыму, якая штодня імі хвалілася і іх сусьветным прызнаньнем песьціла свае комплексы. Вы, зьнясіленая апазыцыя, таксама ня скупіцеся на пахвалы ім, падмазваючы харызмай маральнае згоды. Яны адкарміліся на нашай паняверцы, на нашых прыніжэньнях, на нашай ананімнасьці. Яны свабодна гойсалі па нівах нацыянальнага мастацтва, адкуль выгналі нас або адкуль мы самі сышлі па ўласнай волі. Калі вы прыходзілі да іх па подпіс пад самым сьціплым публічным зваротам, які не падабаўся расьперазанай кіраўнічай вярхушцы, яны вас нахабна выстаўлялі за дзьверы, міргаючы сваёй прыслузе, што вы правакатары, агенты спэцслужбаў. Іх веліч паўстала з нашага добраахвотнага скурчваньня. Іх геній вырас на нашых творчых магілах. Чаму хто зь іх не павінен заплаціць жорсткай фізычнай сьмерцю за дзесяцігодзьдзі скрадзенай, звышчалавечай велічы?
Я вымыкнуў тэлевізар, у якім цывільныя і вайскоўцы чакалі

некага і не маглі дачакацца. Па бальконе праляцеў град, зрынаючы ў бездань прэзэрватыў, што завяў на жалезнай балюстрадзе. Гэтыя прэзэрватывы для мяне былі нібы букецікі ландышаў, якімі абдорвалі мяне суседзі зь верхніх паверхаў у вольныя ад працы дні.
— Кожнага з нас у большай ці меншай ступені мучае зайздрасьць, — зьбянтэжана сказаў Губэрт, зьбялеўшы і ўсё гарлівей расьціраючы сьсінелыя пальцы. — Але пра гэта сёньня ня будзем гаварыць, можа, калі пасьля.
— А калі ты з мной пагаворыш, калі я зараз выканаю твой загад?
— Ну, ведаеш, стары, — адставіў чарку Рышард. — Гэта нягожыя аргумэнты.
— Я ніколі нічога не казаў, хоць у мне ўсё клякатала. Ці трэба табе, Губэрце, пералічыць тых, хто ўсё жыцьцё ішоў пад руку з урадам, удаючы, што ідзе асобна? А спрытнейшыя ўбралі свае опусы ў адзежкі ўнівэрсальных модаў, сусьветных фрустрацыяў, заходніх мэлянхоліяў і нібыта левых нэўральгіяў. Калі ссаветызаваліся да такой ступені, што і ў нас зьявіўся культ недазволенага, двухсэнсоўная жарсьць лізаньня забароненага, убогая асалода ад палітычнай парнаграфіі, прыбранай у порткі алюзіі, калі і ў нас узьнікла гэтае перакручваньне ўдзелу ў выхітраным пратэсьце для самаапраўданьня за ўсе грахі калябарацыі, то яны першыя, прагныя прызнаньня, ахвочыя да посьпеху, учапіліся за новую каньюнктуру і засьмецілі мастацтва фальшывымі жэстамі нацкаваных Рэйтанаў *, праехаліся ўздоўж і ўпоперак па нашым бедным мастацтве, затапталі ў ім рэшткі сумленьня. Навошта ты перад імі падаеш ніцма, калі яны па тваіх крыжох караскаюцца на залатыя яблынькі, якія сілкуюць іх пыху? Нашто лісьлівіш, калі іх доля разыходзіцца з тваёю доляй?
— Ты сам выбраў сваю долю. Няма часу на такія дыскусіі. Што, Рысю, мо выйшаў наш час? — Губэрт цяжка нахіліўся і выцягнуў зьнізу гэтую чорную торбу, у якой мог ляжаць зварот аб скасаваньні сьмяротнай кары або звычайная бомба, выраблена ў хатніх умовах.
— Пачакай, Губэрце, — я стрымаў яго руку. — Скажы мне асабіста, як чалавек чалавеку, чаму ты выбраў мяне?
Ён вырваў руку з маёй далоні.
— Я нікога не выбіраў. У мяне такія самыя правы, як і ў цябе.

І абавязкі такія самыя.
— Але ў мне мусіць быць нешта такое, чаму я падыходжу, а іншыя падыходзяць менш.
Дождж замгліў шыбы. Нейкае дзіцё па суседзтве грала адным пальцам мэлёдыю, якую я помніў з даўніх, вельмі даўніх часоў.
— Дык жа ты жывеш, апантаны сьмерцю, — ахрыпла шапнуў Губэрт. — Я ніколі не разглядаў твой комплекс як літаратурную манеру. Ты найбліжэйшы да гэтай сьмерці, ты не павінен яе баяцца. Ты вельмі старанна падрыхтаваў сябе і нас да свае сьмерці. Пра што ты думаў да таго, як мы прыйшлі?
— Пра сьмерць.
— Бач, яна ля цябе. Досыць падаць руку.
— Досыць падаць руку.
— Але, гэтага досыць.
— Сёньня?
— Сёньня а восьмай вечара, калі скончыцца паседжаньне зьезду партыі і дэлегаты з усёй краіны будуць выходзіць з будынку.
— А яны ўсе?
— Хто?
— Тыя, патрэбныя народу.
— Яны ў граху і сьвятасьці, у канфармізьме і бунце, у здрадзе і выкупленьні нясуць у вечнасьць душу народу.
— Брэшаш. Задушышся гэтым трызьненьнем. Твае вочы ўжо вылазяць з арбіт.
Рышард зырваўся з крэсла, перакульваючы чарку.
— Пакінь яго! — крыкнуў ён і пачаў шнарыць за пазухаю ў Губэрта, які здранцьвеў, выцягнуў ногі, быццам хацеў абгледзець свае брудныя боты.
Рышард пачаў пхаць яму ў сьсінелыя вусны белыя гарошыны таблетак. Сілком уліў паміж сьцятых зубоў некалькі кропелек гарэлкі. Губэрт паварушыў сківіцамі, прыплюшчыў павекі, потым разгрыз адну таблетку і паспрабаваў яе праглынуць. Нехта пазваніў у дзьверы. Я адшчапіў дрыготкімі рукамі. На парозе стаяў падпіты госьць, трымаючыся за вушак.
— Набярэце вады, бо будзем адключаць, — ад яго сьмярдзела нератраўленым алькаголем.
— Вада мне ўжо непатрэбная.
— Наліце мо ванну і яшчэ што. Адключаем на цэлы дзень.
— Дзякую. Пэўна, труба лопнула?

— Усё лопаецца. Можна, пасяджу ў вас пяць хвілін, ледзьве на нагах стаю.
— Даруйце, але прымлеў прыяцель. Мушу выклікаць хуткую дапамогу.
— Усе цяпер слабыя. Ня буду замінаць. Будзьце здаровы.
— І вы бывайце.
Ён пайшоў стукацца да суседзяў. Я бегма вярнуўся праз калідор. Губэрт, ужо выпрастаны, сядзеў на сваім крэсьле. Натужна ўсьміхаўся, каб схаваць раптоўны спалох.
— Пазваніць лекару?
— Ня трэба. Ужо палепшала. На чым мы спыніліся?
Нібы вялікі паветраны зьмей, па-над дахамі места плыў лапік сонечнага сьвятла. Знаёмы верабей ускочыў на парэнчу балюстрады і дзівіўся, што я яго не вітаю.
— Губэрце, ці ёсьць сэнс? Ці ты верыш у гэты сэнс?
— Ты толькі сёньня пытаешся?
— Чаму ты ўсё жыцьцё быў такі заўзяты? Ва ўсім. Справа ў гармонах ці ў голасе зь нябёсаў?
— Пакінь яго, яму трэба дахаты, — адпіхваў мяне Рышард.
— Мо бліжэй да будынку партыі?
— Бачыш, сьмерць сьмерці не раўня, — здушаным голасам гукнуў Губэрт. — Нам усім трэба ўзьнёслая, шляхетная, сьвятая сьмерць. Ты можаш падарыць нам менавіта такі скон.
— За грахі, стары, — дадаў Рышард і паспрабаваў усьміхнуцца.
— Маеш досыць сваіх і нашых грахоў на сумленьні.
— Але яны ўсе маюць гэтулькі сама, — сказаў я роспачна, бо і мне перадалася гістэрыя таго паскуднага восеньскага дня.
— Іх ужо няма. Ты цяпер сам-адзін з Богам альбо, калі хочаш, з сваім сумленьнем.
— І куды ж яны падзеліся?
— Засталіся далёка, на малой нешчасьлівай плянэце.
— Губэрце, гэта нейкі дурны жарт. Вас нехта на гэта падбіў.
— Не, гэта ня жарт. Ты сам добра ведаеш. Ты шмат гадоў чакаў нас. Годзе сабе хлусіць, скажы, што чакаў.
Ён доўга глядзеў на мяне сваім здаровым вокам, а тады пачаў шукаць торбу, якую ў часе прыступу скінуў пад стол.
— Губэрце, гэта ты мне адкажы, ці верыш ты ў карысьць ад гэтага.
Ён зь цяжкасьцю падышоў, абняў мяне і пацалаваў халоднымі вуснамі ў абедзьве шчакі.

— Аб адзінаццатай ты мусіш быць на вуліцы Вісьлянай, 63. Там цябе чакаюць Галіна і Надзежда. Яны з тэхнікі.
— З тэхнікі самаспаленьня?
— Не ўскладняй справы, стары, — уставіў сваё слова Рышард. Мяне ахапіла раптоўная злосьць.
— І што ты тут мне ўдаеш наіўнага мужыка з-пад піўбару? Лепей ужо, чорт цябе бяры, расстаў усе коскі і кропкі.
Рышард разгубіўся, адступіў да дзьвярэй.
— Табе замінае адсутнасьць кропак? — спытаўся ён няпэўна.
— Бо калі б ты ўжываў знакі прыпынку, дык, можа, ня трэ было б у гэтай краіне паміраць напаказ.
Млявы гром прагрукатаў з аднаго канца места ў другі. Дзьверы балкону зь енкам адчыніліся пад парывам ветру. Я хацеў іх прымкнуць, але клямка адарвалася.
— Стары, і пазыч яшчэ пяць тысяч на таксоўку. Ён ня дойдзе дахаты ў такое надвор'е, — Рышард забраў у Губэрта зачараваную торбу і ўжо паглядаў у змрок калідору.
Я выцягнуў з кішэні пяцітысячную банкноту. Яны ўзялі без падзякі, рушылі ў перадпакой. І тут нас сустрэў нейкі гуд, высокі гук тэлефонных дратоў, які веставаў непагадзь. Гэтым шкляным енкам яны гучалі шмат гадоў таму, калі сьвет яшчэ быў нармальны і спакойны.
Губэрт стаў перад гурбою старых тапак, што назьбіраліся няведама скуль за цэлае жыцьцё.
— Калі ты кінуў пісаць? Ужо ня помню, — сказаў ён, касавурачыся невідушчым вокам на гэтае сьмецьце на падлозе.
— Але ж я пішу.
— Ты зноў пачаў пісаць у гэтую пару. Пішаш свой тэстамэнт. Але я пытаюся пра бэлетрыстыку.
— Ня помню. Можа, пяць, можа, сем гадоў таму. Тады я адным махам пераступіў цераз дзьве цэнзуры, собскую і дзяржаўную. Напісаў апавяданьне ў нейкі самвыдатаўскі часапіс, і гэта быў мой апошні тэкст. Я стаў вольным імпатэнтам.
— Ты нарадзіўся нявольнікам. Няволя цябе вызваліла, дала табе крылы і зрабіла правінцыйным клясыкам. А потым на кару, як злая чарадзейка, усё забрала.
— Няволя заўжды гінула ад рук нявольнікаў, — азваўся Рышард. — Разумееш мяне, стары?
Гэты дзіўны гук, гук, нібы шчуроў забіваюць, зьявіўся ў нашым доме колькі месяцаў таму. Тыднямі шукаў яго крыніцу,

абшукаў гарышчы, скляпы, але нічога не знайшоў. Ён усчынаўся зьнянацку і раптам за колькі дзясяткаў хвілін сьціхаў. Удзень і ўночы. Ён трымаў жыхароў дому ў стане гістэрыкі.
— Але твор гэты я дапішу да канца. Ня твор, жалобны трэн. Напішу ў думках і адразу ж забудуся. Літаратурны твор для аднаго чытача.
— Выбірай словы. Найлепшыя захавай на вечар. Ты будзеш там крычаць з усіх сілаў. Самымі залатымі думкамі. Людзі іх запішуць і будуць перахоўваць, як біблійныя вершы. Твой літаратурны шэдэўр.
Ён знайшоў у цемрадзі маю руку і моцна сьціснуў яе. Мне падалося, што ў ягоным здаровым воку мільгаюць хуткія іранічныя іскры. Мяне зноў агарнула злосьць.
— Хто вас падбухторыў? Які сукін сын нацкаваў вас на мяне?
— Нехта мусіць гэта зрабіць. Мы даём табе шанец. Ты будзеш першы. Апярэдзіш усіх канкурэнтаў. Яны паціху будуць прымяншаць твой чын. Першы раз ты пэўна іх пераможаш.
— Ці варта? Трэба штодня спальваць сябе там, у цэнтры, пад мурамі Крамля. Тамтэйшыя пажары захапляюць разявакаў па ўсім сьвеце. А нашыя рэгіянальныя падпалы раздражняюць міжнародную публіку, дадаюць лішнія дэталі да захапляльнага відовішча барацьбы дабра зь ліхам. Слухай, Губэрце, а можа, наша сонечная сыстэма зышла з свайго вызначанага найвышэйшай воляй шляху і цяперака рушыць у глыб сусьвету, дзе ўсіх нас замірыць няведамы касьмічны кон? Можа, нас чакае супольная перамога альбо супольная параза?
— Што можна выйграць ці прайграць апроч таго, што можам выйграць ці прайграць тут?
— Добра, ідзеце ўжо.

Я адчыніў дзьверы. Яны неяк марудзілі з адыходам. Губэрт пачаў чытаць шыльдачку на дзьвярох суседа. Яны заўсёды цікавалі маё жыцьцё, хоць добрым тонам было пагарджаць ім. Вось ён чытаў гэтую таблічку, нібы візытоўку сакратара ЦК, і ня ведаў, што за гэтымі дзьвярыма ўжо дзесяць гадоў памірае стары пэнсіянэр, штодня з высілкам памірае і ня можа памерці. Згары, па прыступках і па ўскрайках сходаў, падалі брудныя кроплі вады. Гэта наш кансьерж, якога цяпер пачалі называць домакіраўніком, невылечны псых, мыў лесьвічную клетку. Яго

ўжо гэтулькі разоў паказвалі па тэлевізіі, пісалі пра яго ў газэтах, а ён усё працягваў з той жа ўпартасьцю мыць штоквартал нашы сходы, адзіны домакіраўнік у цэлай краіне, які гэта рабіў.
— Не падвядзі, стары, — азваўся Рышард.
— Мне трэба падумаць.
— Яны чакаюць аб адзінаццатай. Галіна і Надзежда, — дадаў Губэрт.
— А калі я гэтага не зраблю?
— То будзеш жыць так, як жыў дагэтуль.
Яны пайшлі ўніз па сходах, падтрымліваючы адзін аднаго, нібы два сьвятыя, нібы Кірыл і Мэтод. А я ж помніў Рышарда здаўна, калі мы былі маладыя. Помню шалёную п'яную ноч у нейкім двары пад Варшавай і супольны начлег у пуні на саломе. Рышард быў тады ці то крытыкам, ці то кіназнаўцам і ляжаў побач, а паміж намі была п'яная дзеўка, якой я потым ніколі не спатыкаў. Мы ляжалі ледзь прытомныя на маім зялёным брызэнтавым плашчы, які я прыслужліва разаслаў, дзяўчына паенквала празь цяжкі п'яны сон, Рышард важдаўся пры ёй, хрыпла сапучы ад раптоўнага юру, таму яна адвярнулася да мяне тварам, а сьпінай да Рысіка. Я адчуваў яе вільготны, сонны подых у сябе на шчацэ. Рышард не адступаўся, непрытомны, але пажадлівы, усё поркаўся пры ёй, ірваў ёй апранахі, гістэрычна дыхаючы, падкладаўся пад яе безуладнае цела. А потым, калі я ўжо затрызьніў, Рысік, відаць, дабіўся свайго, бо раптам заскуголіў, закачаўся ў растрэсенай саломе. Яна, ня чуючы экстазу суседа, абвейвала мяне лёгкім, спакойным подыхам. Толькі наранку, калі ўсе сп'яну ўставалі з той вясковай пасьцелі, я накінуў свой брызэнтавы плашч, машынальна сунуў руку ў кішэнь і з абурэньнем пераканаўся, што гэта мая кішэнь папоцемку стала ахвяраю Рысікавай жарсьці, што юнацкай прагнай любасьцю, можа нават першай любасьцю, ён любіў маю кішэнь.
А цяпер Рысік піша аморфную прозу бяз знакаў прыпынку, ходзіць ад'ютантам пры Губэрту — паважаная постаць літаратурнага сьвету. Я вярнуўся ў свой пакой, каб паглядзець на іх у акно. Якраз нейкім цудам ім на дарозе папалася вольная таксоўка, але яны абмінулі яе і годна пайшлі ў бок Новага Сьвету. Мне было цікава, ці сочаць за імі. Але ніводная машына ня рушыла зь месца і ніхто ня выбег за імі з аркі суседняга

дому. Агенты мелі сёньня важнейшыя справы.
Губэрт раз павесіўся ў шафе, калі яго зацкавалі падчас нейкай акцыі, бо тады, пры канцы шэсьцьдзясятых, рэжым яшчэ любіў жорсткія відовішчы і брутальныя акцыі. Вось Губэрт і павесіўся, але рабіў гэта, пэўна, першы раз у жыцьці і спрыту ня меў. Вяшак абарваўся, шафа перакулілася, і Губэрт выжыў. Так, выжыў, каб праз гады вынесьці мне сьмяротны прысуд.
Ізноў загрымела ў цесным нізкім небе. Я пайшоў у ванну памыцца. Кран балесна захрыпеў, гікнуў, але рэшткі вады яшчэ цяклі. Я машынальна мыўся і думаў, ці добра я раблю, што мыюся і прыбіраюся перад такой пэрспэктывай. Але ж сьмерць трэба прыняць як прычасьце, нашча і ахайна. Ці трэба аднак, памірaць? Ці мяне хто сілком сьпіхне з моста ці абліе бэнзынам? Пастанова ж у маіх руках. Магу годна памерці і нягодна жыць далей.
Ізноў азваўся гонг. Я падумаў, што Рышард з Губэртам забыліся нешта ці вяртаюцца, каб адклікаць прысуд. Сьцякаючы кроплямі вады, я падбег да дзьвярэй. На прыступцы сядзеў стары зь вялікай скураной торбай.
— Вы да мяне? — спытаўся я.
— Так, да вас. У мяне загад адключыць газ.
— Але сёлета ж ужо тры разы адключалі.
— Слухайце, я ня ведаю, загадаюць — адключаю, загадаюць — падключаю. У іх, бач, галавы няма. Штодзень нейкі дом бухае, дык, каб паставіць пракладку, загадваюць адключаць. Добра яшчэ, што вашая кватэра ёсьць, бо ў мяне тут нумары кватэраў, якіх ва ўсім доме няма, — і ён паказаў мне брудную паперку.
— Ну дык вымыкайце за адным махам і электрычнасьць. Мне ўсё адно.
— Вам усё адно, — вымавіў з хітрай усьмешкай стары і спрытна ўскочыў у ванну, — а мне ня ўсё адно. У мяне паўнамоцтвы толькі на газ.
І праўда, ён умомант закруціў вэнтыль, здэмантаваў паклю ў газавай калёнцы і ўжо сядзеў на ўскрайку ванны, прыпальваючы склееную цыгарку.
— У цёплай вадзе добра выкупацца ці хаця б, выбачаюся, сраку памыць, — гаманіў стары, аглядаючыся ў ваньне. — Але што рабіць, загад ёсьць загад. Хіба што пагаварыць з кіраўніцтвам, ну, разумееце. Даць у лапу.
— Не хачу я гаварыць з кіраўніцтвам. Я сёньня памру.

Стары сьлесар весела заўсьміхаўся.
— Што гэта вы акурат сёньня надумаліся? Сёньня такі дзень добры! Гэты іхны расейскі сакратар прыяжджае. Увесь горад прыбраны, ад ранку аркестры паўсюль граюць. Кажуць, што нейкі фэстываль цяпер, вялікае іхнае сьвята, а можа, і нашае. Выкінулі тавары на прылаўкі, паўсюль — пад Палацам культуры, па-над Віслай — людзі зранку стаяць у чэргах, а вы памерці надумалі.
— Дык памру ім на зло.
Сівы майстэрак выцер сьлёзы радасьці.
— Ну вы гумарыст. Калі б можна было памерці ім на зло, дык ужо палякаў на сьвеце не было б. Ведаеце што, я падключу вам газ, але ручкі вэнтыляў заплямбую. Зраблю такую шырокую пятлю, што зможаце газам карыстацца, толькі каб асьцярожна.
— Ня трэба мне газу. Вазьмеце калёнку на ўспамін.
— Крыўдлівы вы. Не дык не. Падпішэце тут, калі ласка.
Я правёў яго ў калідор. Мінаючы, ён памацаў мой плашч, што вісеў пры дзьвярох.
— Добрая воўна. Замежная.
— Бярэце на здароўе.
— А што, магу заплаціць. Пяцьдзясят тысяч дам.
— Аддам задарма. Толькі калі будзеце апранаць гэты плашч, уздыхайце па маёй душы.
— Вы, можа, артыст, га? Любіце пажартаваць, га?
Але спрытна злажыў плашч, паклаў у торбу і ўжо стаяў перад дзьвярыма суседа. З суровым выразам твару націснуў кнопку званка.
Я вярнуўся ў свой пакой, сеў у фатэль, які яшчэ не астыў пасьля Губэрта. Сапраўды, вецер нёс па-над горадам нейкія касмыкаватыя гукі музыкі. Добра, што я аддаў плашч, апрануся лягчэй, лягчэй будзе праскочыць на той сьвет. Так, быццам бы я ад іх атрымаў жыцьцё і гнеўна вяртаў яго ім. Нейкі сымбаль. Яшчэ адзін сымбаль. Для вечнасьці ці для сучасных ідыётаў? Мудрагелісты і нечытэльны жэст. Жэст, які таўруе наш марыянэткавы, згодніцкі рэжым, ці жэст, які зьвінавачвае вечную Русь, схаваную за збуцьвелай шырмай Савецкага Саюзу. Пратэст супраць няволі грамадзкай ці супраць няволі народнай. Пра якую свабоду тут гаворка, за каторую з шматлікіх свабодаў пайду ў агонь, у сьвяты агонь сьмерці? Гэта блазнаваньне ці ўзьнясеньне?

Я заўжды магу ў апошнюю часіну ўскочыць у нейкую мышыную дзірку, суцяшаю сябе, але ведаю, што нікуды я ня ўскочу, апроч як туды, куды мне сказалі. Апранаюся сьціпла, але акуратна. Загадалі крычаць, а гэта для мяне найгоршае. Агонь можа вытрываю, але сораму не пражыву. Змагар павінен быць нахабны й бессаромны. А я шмат эратычных момантаў змарнаваў, бо саромеўся расшпіліць нагавіцы.
Уключаю тэлевізар, трэба ж нешта зрабіць, у мяне дрыжаць рукі, не магу сабрацца з думкамі. На малым экранчыку бачу самалёт, а пад ім двух мажных мужыкоў, якія цалуюцца ў вусны. Гэта наш сакратар і гэты іхны расейскі, цар цароў, гаспадар паловы сьвету. У нашага дабрадушны твар кардынала ці кансьержа, якога сёньня называюць домакіраўніком. Таго гісторыя і гены ўзнагародзілі калмыцкай фізіяноміяй. Памілаваліся і слухаюць гімны. А наш гімн цяперака — *Інтэрнацыянал*. Атрымалі яго па старэйшым браце, як камізэльку.
Хаваю ў кішэню пашпарт. Бяз гэтага ані руш. Прозьвішча, імя, дата нараджэньня, бацька, матка, рост, вочы — усё няважна. Важны мой нумар, колькі літараў і шэраг лічбаў. Такім мяне ведае паліцыя, мясцовыя ўлады, служба аховы здароўя. Такім мяне ведаюць кампутары і пільнуюць, каб ня высьлізнуў, не схаваўся ад прыгнятальнікаў, не адкруціўся ад нахабнага пратэктарату. Пайду з дому. Трэба выйсьці з гэтых чатырох сьценаў. Выхад з кватэры — гэта яшчэ не пастанова. У мяне наперадзе цэлы дзень. За дванаццаць гадзінаў зараблялiся капіталы і зьнішчаліся дынастыі. За дванаццаць гадзінаў паўставалі і гінулі імпэрыі.
Ідучы па сходах, зазірнуў у паштовую скрынку, нават адчыніў яе на ўсякі выпадак. Заскрыгаталі дзьверцы, пасыпалася іржа. Усярэдзіне было трошкі ссохлага павуціньня. Ну й дзякуй Богу. Добрых лістоў пошта не разносіць ужо шмат гадоў.
На вуліцы дала ў вушы музыка. Гучалі магутныя гучнагаварыльнікі, гулі нейкія аркестры, дзесьці грымеў з панурай упартасьцю вайсковы бубен. А перад Палацам культуры, які некалі так захапляў мяне, як урочышча, як страшны курган, дзе пакутуюць злыя духі, — перад гэтым Палацам на эстрадзе гойсала мноства гожых параў у керэзіях і нацыянальных гарсэціках, абшытых цэхінамі, у паўлінавых пёрах і карунках, зробленых у горадзе Жывец. А масавік,

прытупваючы, падпяваў з моцным акцэнтам: “Кракавяк вот так я!”
Па старой звычцы я ўстаў у чаргу да газэтнага шапіка, купіў пачак цыгарэт, але газэт ужо не было. Гэта таксама благі знак. Шчасьлівая купля газэты ўраньні заўжды была нашым першым посьпехам. З газэтай пад пахай чалавек зьвяртаў на сябе ўвагу. Некалі я нават завязаў інтымныя ўзаеміны зь дзяўчынай, якая прагна паглядала на маю газэту. Газэт ніхто не чытаў, хоць раздабыць іх каштавала шмат намаганьняў. Але газэты трэба было мець. Такі ўжо склаўся звычай.
З камяніцы на другім баку вуліцы выйшаў паджылы пан з хваравітымі вачыма на худым твары. Я знаў яго з выгляду, і ўся вуліца яго знала. Ён быў арыгінал і дзівак, апаратнік, які зь невядома якіх прычынаў не збудаваў сабе замкавай вілы ва ўрадавым квартале і працягваў жыць разам з намі, звычайным пээнэраўскім быдлам. Ён паглядзеў на мяне, і я паглядзеў на яго, мы не павіталіся, бо яму не выпадала, а мне гонар не дазваляў. Ён сеў у чорны “мэрсэдэс” і рушыў па вуліцы, за ім памкнулася машына аховы.
У мяне заўжды было нейкае дзіўнае прадчуваньне, што мой лёс спляцецца зь ягоным лёсам. Падазраю, што яму таксама такое прадчувалася. Таму я крадком назіраў за ўбогім жыцьцём апаратніка, ягонымі ад’ездамі і прыездамі, ягонымі нуднымі даўжэзнымі прамовамі ў тэлевізіі, сачыў у газэтах за ягонай службовай кар’ерай, зычліва пераймаўся зьяўленьнем урадавага рэфрыжэратара, які прывозіў яму сэрвэлят, шынку, кумпякі і абястлушчаны тварог. Дапушчаю, што і ён, абняты якою нядобраю думкаю, цікавіўся ўпотай маім гэткім жа нецікавым быцьцём.
Я выйшаў на Новы Сьвет, аброслы кустамі сьцягоў, чырвоных і бела-чырвоных сьцягоў. Але ў нашых бела-чырвоных сьцягох чырвань зь цягам часу павольна расла, а бель меншала. І цяпер нашыя сьцягі таксама былі чырвоныя, але з малой белай стужкай уверсе. Вось жа, гэтыя старыя дамкі, што вылузваліся, як цагляныя лярвы, з коканаў тынку, выпусьцілі зь сябе ліхую кроў сьвяточных сьцягоў і драмалі над каньёнам вуліцы, паўзь якую маршавала школьная дзятва і калектывы ўстаноў і фабрык. А па-над сьвяточным тлумам ляпаў у паветры гіганцкі транспарант з надпісам: “Жыве саракавая гадавіна Польскай Народнай Рэспублікі”.

Я задумаўся, разважаючы аб тым лёзунгу, і гэта прыцягнула ўвагу пэнсіянэра з газэтай пад пахай. Ён усьміхнуўся, нібы разумеючы.
— Вы таксама заўважылі?
— Перапрашаю, што?
— Ну, не прыкідвайцеся.
— Маеце на ўвазе саракавую гадавіну?
— Дадалі сабе добрую пару гадоў, — ён захіхікаў. — У мяне добрая памяць.
— Думаеце, дадалі?
— Я ня думаю, я ведаю.
— Пакажэце газэту. Паглядзім дату.
— Як гэта вы так не заўважалі? Даты ў газэтах ужо ад даўна нейкія такія раздушаныя, быццам хто на літары абцасам наступіў. Гляньце самі.
І ён сунуў мне газэту, а я моцна схапіў яе ў кулак.
— О, што гэта вы, не! — запратэставаў пэнсіянэр. — Жонка яшчэ не чытала.
— Калі ласка, аддайце мне газэту.
Ён пачаў вырываць з маёй далоні тонкі сувой “Трыбуны люду”.
— Пусьці, пусьці, а то выклічу міліцыю.
— Я цяжка хворы, мо пайду ў бальніцу ці наагул памру.
— Усе так кажуць.
У гэты момант газэта разарвалася, і ў маёй далоні засталася каштоўная палова з рэпэртуарам кіно, тэатраў, з праграмай тэлевізіі, зь дзяжурнымі паліклінікамі і аптэкамі, з паведамленьнямі пра імпрэзы і зьліквідаваныя маршруты транспарту. Яму дасталася другая палова, якой ніхто ніколі не чытаў: палітычныя навіны, прамовы, у тым ліку прамовы майго знаёмага апаратніка, нарыс пра распад капіталізму і заклікі да мацаваньня ідэйнасьці.
— Жулік, жулік! — вішчаў пакрыўджаны стары, але ніхто не зважаў на яго, бо ў гэты сьвяточны дзень ўсе нешта гарлалі.
Я хутчэй зьмяшаўся з натоўпам, несучы здабычу. Мне было неяк прыемна, што ён аблаяў мяне гэтай старой лаянкай, якую я помніў змалку. Апроч таго, я трымаў у руцэ праваднік па сёньняшняй Варшаве. Але ў гэты момант мне ветла адсалютавалі два маладыя міліцыянты.
— Пройдземце з намі.
Мы ўвайшлі ў кароткую арку з засіканымі сьценамі. У самую

пару, бо зноў усчаўся дождж.
— Вашы дакумэнты, — папрасіў старшы міліцыянт.
Я падаў яму зношаную кніжачку пашпарту, якая спатрэбілася мне ўжо ў першыя пятнаццаць хвілін майго падарожжа. Падарожжа куды? Мне стала холадна.
— Які сёньня дзень? — спытаўся я.
— А навошта гэта вам? — недаверліва азваўся малодшы.
— Трэба.
Яны пераглянуліся, і старшы сказаў з націскам:
— Дваццаць другога ліпеня.
— Як гэта ліпеня? Ужо ж позьняя восень. Град ідзе.
Старшы, не адказваючы, пачаў перапісваць мае асабовыя зьвесткі. Ніжэйшы разглядаў мяне без зычлівасьці. Таварыш нешта паказаў яму ў пашпарце, а ён хітнуў галавой, што разумее.
— Вас ня дзівіць, што мы перапісваем вашыя зьвесткі?
— Мае зьвесткі часта перапісваюць.
— Гэта нядобра. А куды вы ідзяце?
— У “Сямейны”.
— Што гэта значыць?
— Мой улюбёны малочны бар.
Я хацеў яшчэ спытацца, які цяпер год, але адчуваў, што гэта быў бы ўжо перабор. Нехта падходзіў з мораку пад’езду.

— Здароф, дзядзя,
— ляпнуў ён
мяне
фамільярна, і я
пазнаў Кольку
Нахалава. —
Гэта мой
знаёмы. Пра
што гамана?

— Праходзьце, калі ласка, — з націскам вымавіў старшы.
— Эй, маладец, пацішэ. Гдзе твой номер?
— Што-што?
— Номер должэн быць, — сказаў ён і пацягнуў міліцыянта за рукаво мундзіру.
— Мы зь міліцыйнай школы. З Галяндзінава.

— Всё-такі номер должэн быць!
Трохі зьніякавелыя, сілячыся захоўваць годнасьць, міліцыянты вярнулі мне пашпарт і пайшлі.
— Табе цэглы ня трэба? Добрай, сталінскай?
— Ці ты звар'яцеў? Нашто мне цэгла?
— На лецішча ці на асабняк. Гуту "Варшава" разьбіраюць. Можна танна купіць.
— Не, дзякуй.
— У мяне ёсьць прэзэрватывы з урадавай крамы. Дзяржаўная цана, пяцьдзясят злотых.
— Не ўжываю.
— Ну, можа, хоць паўлітра разап'ём?
— Дзякуй, але я хворы.
— Хочаш, прадам бальзам Шастакоўскага. Проста з Прыбалтыкі.
Я ведаў Кольку Нахалава няведама адкуль. Ён ужо шмат гадоў гойсаў па Варшаве, зарабляючы няясна з чаго. Здаецца, ягоны бацька, генэрал КГБ, быў дарадцам Службы бясьпекі ў Шчэціне. Калі пайшоў на пэнсію, зьняў польскі мундзір, адзеў савецкі, спакаваў рэчы і паехаў зь сям'ёй дадому, у Маскву. А Колька застаўся. Спадабалася яму ў Польшчы, хоць часам сп'яна даставаў ад каго па мордзе.
— Мне трэба ўжо ісьці — сказаў я, каб нешта сказаць.
— Я таксама лячу. Ты куды, налева ці направа?
— Проста. На другі бок вуліцы.
— Ну то будь здаров. Калі што трэба будзе, заўсёды знойдзеш мяне ў "Парадызе".
Ён амаль пабег, а я пры выхадзе з брамы ўбачыў маладога, па-правінцыйнаму апранутага хлопца, які паважлівым паклонам павітаў мяне ці некага за маёю сьпінаю. Але за мной нікога не было, таму я прывітаўся ў адказ з пэўным зьдзіўленьнем. Маладзён нясьмела ўсьміхнуўся, бялявы маладзён з шчырымі вачыма, такіх хлопцаў шмат было падчас вайны ў акоўскім падпольлі.
— І тады прыйшла раптам сьмерць. У тую зімовую зорную ноч прыйшла лютая сьмерць, — пачаў дэклямаваць прыцішаным голасам хлопец з правінцыі.
Усё больш было вар'ятаў, ніхто іх ужо не лячыў, бо псыхіятрычныя больніцы былі перапоўненыя міністрамі, сакратарамі, дырэктарамі. Калі-нікалі трапляліся

апазыцыянэры, якіх туды памяшчалі для перасьцярогі. Але неўзабаве ня стала для іх месцаў, бо спаміж апаратнікаў усталявалася мода хавацца ў вар'ятнях ад апалы, дэтранізацыі або судовага перасьледаваньня.
Удаючы абыякавасьць, я мінуў хлопца і перайшоў на другі бок вуліцы. Унурыўся ў гарачае нутро малочнага бару з назвай "Сямейны", напоўненага ёлкім смуродам. Да касы стаяла вялізная чарга. Гэтая новая няўдача мяне зьбянтэжыла, я няпэўна пакруціўся каля шкляных патрэсканых столікаў і здумаў пайсьці, калі з чаргі нехта паклікаў прыязным голасам:
— Гэй, дружа!
Я хацеў уцячы, бо пазнаў Рышардавага брата, але было ўжо запозна.
— А, гэта вы? — сказаў з прыкрасьцю.
— Што заказаць?
— Можа, гарачае малако і якую булачку.
— Малака сёньня ўжо няма. Але ёсьць масьлёнка.
— Хай будзе масьлёнка.
Чакаючы Рышардавага брата і свайго сьняданку, я мучыўся, прыгадваючы ягонае імя. Аніяк ня мог успомніць. Ліхаманкава перабіраў у галаве славянскія імёны, заходнія, усе імёны антычнага паходжаньня, але ніводнае неяк не пасавала суровай постаці філёзафа-марксіста, якога ўсім сэрцам ненавідзеў Рышард. Браты не сустракаліся, пагарджаючы адзін адным.
За дваццаць хвілін мы ўжо сядзелі пры століку, застаўленым непрыбраным посудам.
— Як маецеся, пане дацэнце? — спытаўся я дзеля ветлівасьці.
Філёзаф аж папярхнуўся масьлёнкаю.
— Прашу мяне так не называць!
— Выбачайце, але я ня меў нічога благога на думцы.
Ён укусіў сухую булку і прачытаў звычную лекцыю.
— Слова дацэнт у цяперашнія часы гучыць абразьліва.
— Я ня ведаў.
— Не перабівайце мяне. Форма заахвочваньня шляхам прызначэньня ў дацэнты ня вытрымала выпрабаваньня практыкай. У нас цяпер цэлая армія дацэнтаў і шмат клопату зь імі. Разумееце, некаторыя ледзьве школу паканчалі, і то з слабымі атэстатамі. А якія амбіцыі. Даводзіцца рыхтаваць іх, давучваць. Мы стварылі адмысловыя курсы ўдасканаленьня дацэнтаў. Я іхны дырэктар. Вы ведаеце, што гэта значыць?

Вялізная праграма, гіганцкі матэрыял, трэба было б дванаццаць гадзінаў штодня праводзіць заняткі, а яны ўвесь час прагульваюць. То на бальнічных, то па тэлефанаваньнях ад жонак альбо, што горш, з Цэнтральнага Камітэту. У мяне ўжо цярпеньня няма. О, якраз, — ён паглядзеў на гадзіньнік. — Празь пяць хвілін пачынаецца лекцыя. Трэба ляцець. Шкада.
— Да дацэнтаў?
— Ат, не. У цэнзуру. У мяне лекцыя ў цэнзуры.
— Там таксама ёсьць дацэнты?
— Ёсьць і дацэнты. Але не пра тое гаворка. У цэнзуры створаны асобны дэпартамэнт алюзіяў. Мне даручана чытаць лекцыі. Алюзія ў мастацкім творы, алюзія ў сродках масавай інфармацыі. Крывіцеся? Вы заўсёды кіслы.
— Масьлёнка перакісла, вось і я крыўлюся.
— Я, ведаеце, прыхільнік алюзіяў. Я стварыў тэорыю функцыяваньня алюзіяў у сацыялістычным грамадзтве. Вы мяне слухаеце?
— Слухаю, слухаю. Трохі задумаўся.
У канцы залі сядзеў той правінцыйны маладзён, і ён ізноў усьміхаўся.
— Дык вось, алюзія ў нашых умовах, — працягваў філёзаф, — выконвае значную ролю. Не называючы рэчаў сваім імем, яе выяўляюць, на яе намякаюць і ўводзяць у падсьвядомасьць успрыманьніка. У выніку гэтага няяўная праўда стаецца праўдай яўнай. Напружаньне, выкліканае прагай праўды, ці, хутчэй, я б сказаў, комплексам праўды, гэтае жудаснае напружаньне ў выніку распружваецца якраз праз умела ўжываную алюзію. Таму алюзійнасьць нельга зьнішчаць, наадварот, яе трэба падтрымліваць, і нават вучыць разумнай, абачлівай алюзіі. Праз пэўны час успрыманьнік будзе намёку на праўду аддаваць перавагу перад самой праўдай. Бо алюзія ёсьць свайго кшталту формай мастацтва. Алюзія — гэта праўда, убраная ў шаты мэтафары.
— Я заўжды захапляўся цэнзурай.
— Прызнаемся шчыра, ня ўсё яшчэ ў нас працуе добра. Увесь час мы сутыкаемся з рознымі прыкрымі хібамі. Але сапраўды, трэба прызнаць, што цэнзура мае пэўныя амбіцыі, і нельга не аддаць ёй належнае — яна ідзе наперадзе ў нашай дынаміцы грамадзкіх пераменаў. А гэта не выпадкова, скажу я вам. Нашая сыстэма ёсьць сыстэмай інтэлектуальнай, створанай

інтэлектуаламі. Хто ж прыдумае лепшую цэнзуру, калі не інтэлектуал?
— У мяне сёньня быў Рышард.
— Які Рышард?
— Ваш брат.
— Ён ідыёт. Маю права на такое слова, бо гэта, урэшце, мой брат. Таму не ўжываю горшага слова — правакатар. Ідыёт зь неўтаймоўнымі амбіцыямі. Дзіва, што яго не зрабілі дацэнтам. Ён марыць пра міжнародную славу. Таму піша бяз знакаў прыпынку апазыцыйную прозу. Але ён не разумее маёй тэорыі алюзіі ў прозе. Таму ягоная проза такая — нібыта праўдзівая, але цалкам непраўдзівая, нібыта сучасная, але цалкам старасьвецкая. Ён асёл, скажу я вам.
Правінцыйны дзяцюк увесь час глядзеў на мяне, ягоныя вусны бязгучна варушыліся. Нехта нахабна скардзіўся ў акно кухні, што яйка нясьвежае. Абражаная кухарка расплакалася, пачала здымаць хвартух і службовы каптур, хочучы кінуць працу. Касірка выняла касу і ў абдымку зь ёй пабегла супакойваць кухарку. На вуліцы загрымеў аркестар, які праходзіў міма. Усе зірнулі ў пацямнелыя ад пылу вокны. Але гэта быў толькі аркестар дашкольнікаў.
— Вы зь імі нават не вітайцеся, — сказаў дацэнт.
— З кім?
— Ну, з гэтымі вашымі апазыцыянэрамі. Яны такія ж апаратнікі, як і дзяржаўныя. Раскормленыя, распанелыя, пажыцьцёвыя. Рэжым прызвычаіўся да іх, а яны да рэжыму. Які рэжым, такая і апазыцыя. Яны косьць ад косьці рэжыму. Пішэце для цэнзуры. Яна вас цэніць. Яна адна вас любіць. У вас здольнасьць да алюзіі. Але алюзія — гэта найвышэйшае прызначэньне мастацтва. Помніце, што казаў Джойс? Што нават за трыста гадоў літаратурныя работнікі не расшыфруюць ягонай алюзіі. У яго не было дзяржаўнай цэнзуры, таму ён стварыў і ўстанавіў над сабой сваю ўласную.
На сьцяне вісеў каляндар, моцна заседжаны мухамі. Ён паказваў травень 1980-га году. І я ня ведаў, ці гэта стары, забыты каляндар, ці новы, дзеяньне якога яшчэ не пачалося. Касірка вярнулася ў касу. Кухарка стала пры печы ў кухні. Пераможаны кліент з роспачу еў нясьвежае яйка.
— Я помню Вас геніяльным маладым філёзафам, — азваўся я пасьля паўзы, а ён чуйна застыў з паднесеным да рота

кавалкам чэрствай булачкі. — Вы круціліся каля маладой каталіцкай інтэлігенцыі. Што вас штурхнула да марксізму? Лянота, так?
Ён з злосьцю кінуў сваю булачку на стол. Яна адляцела ад пустой сальніцы і ўпала на падлогу. Яе адразу ж падабраў знаёмы мне бадзяга, які гнязьдзіўся на нашай вуліцы. Ён абапіраўся на двухмэтровы сьвежаакораны кій, як апостал.
— Я слухаю, працягвайце, — сказаў філёзаф, сілячыся стрымаць абурэньне.
Мы разам паглядзелі на тэлевізар, які вісеў пад стольлю бару. Сярод страшных перашкод паказалася выява машыны, у якой ехалі абодва сакратары, наш і савецкі. Іх якраз затрымалі мэталюргі, апранутыя ў белае, як пекары. З апатычным энтузіязмам яны пачалі цалаваць нашых кіраўнікоў у вусны.
— Вы баяліся адказнасьці за жыцьцё на свой страх і рызыку, — сказаў я, дапіваючы масьлёнку. — Вы баяліся чыстай паперы, баяліся цэнзуры, баяліся канкурэнцыі з боку іншых дынамічных філёзафаў. Вось вы і схаваліся за іканастас партыі, заселі ў калегіях, камітэтах, расьселіся ў дырэктарскіх і сакратарскіх фатэлях. Цяпер вы кіруеце, а іншыя працуюць. Цяпер вы цэнзуруеце чужыя тэксты. Цяпер вы — гнюсны, лянівы, злы бог таленавітых калегаў.
Я ўбачыў кропелькі поту на ягоным ілбе, ён нахіліўся да мяне з паблажлівай усьмешкай. Але ягоныя далоні, хоць і абапертыя на стале, гістэрычна дрыжалі.

— Вы таксама дурань. Ці вы не разумееце, што мы перажываем чарговы патоп? Акіян гаўна з усходу заліў нас ад Буга да Эльбы. І трэба перажыць гэты катаклізм. Уратавацца біялягічна. Захаваць уласную душу. Гэта шчасьце нашае, што расейцы абрынуліся на гэтую зямлю, зьедзеныя праказай камунізму. Штодзень дзякуйце ў малітве сваім багом за тое, што гэтыя расейцы зьнясіленыя ідыёцкай дактрынай, разбэшчаныя вычварным жыцьцём, зьняможаныя крэтынскай эканамічнай сыстэмай. Штовечар дзякуйце небу за тое, што яны маюць графаманскае мастацтва, што ў іх мазгох блукаюць нейкія абрыўкі думак ідэалістаў дзевятнаццатага стагодзьдзя, што яны стаяць у чэргах, што ня маюць моднай адзежы, што чытаюць польскія буржуазныя штотыднёвікі, што, адным словам, качаюцца ў брудзе чалавечых нізоў. Уявеце сабе Расею

вольную, дэмакратычную, з капіталістычнай сыстэмай эканомікі. Такая Расея за колькі гадоў створыць геніяльнае мастацтва, якое паставіць сьвет на калені. Такая Расея напэўна перасягне Амэрыку індустрыйна. А нас Расея ўсмокча, як пыласос павучка. Бяз танкаў, бяз здрады, бяз высылак у Сібір паглыне нас на правох культурнай і цывілізацыйнай вышэйшасьці. Усе будуць імкнуцца туды, як цяпер у Амэрыку. Вы таксама будзеце шукаць спаміж продкаў расейскіх бабуль і дзядуль, вы таксама захочаце паехаць на Камчатку ў рамках гуманітарнай акцыі ўзьяднаньня сем'яў. Глядзеце, яны цалуюць штучна і пад прымусам, — ён паказаў на тэлевізар, дзе абодвух сакратароў цяпер цалавала моладзь. — А павінны цалаваць гэтага калмыка ў ногі з сапраўднай, сьвядомай і глыбокай удзячнасьцю.
Я сядзеў, трохі прыбіты лекцыяй філёзафа. Хацеў запярэчыць яму і шкадаваў, што з мной няма Губэрта. А ён глядзеў на мяне, як вуж на лябараторную мышку. У куткох яго вуснаў засох жаўтаваты шумок ці рэшткі масьлёнкі.
— Скажэце гэта Рышарду, калі надарыцца выпадак, — бэсьціў мяне ён, бачачы маё аслабленьне. — Гэты асёл разам з хеўрай хітрых і дурных сяброў заўзята пілуе галіну, на якой сядзіць. Галіна зламаецца, і яны таксама ўпадуць у велізарную расейскую яму. А летучы ў гэтую дрыгву, і нас усіх пастрасаюць, як ігрушы.
— Вы Касандра. Злая варажбітка польскага нацыяналізму, — сказаў я стомленым голасам. — А наш шавінізм — гэта нуль, плявок на сусьветным шляху. Гэтай дарогай нам не прабіцца, спадары філёзафы ад Паскаля й Сартра. Я нікому не раскажу пра гэтую гутарку. Яе трэба забыцца.
— Вы зрабілі ўсе стаўкі на іх і баіцёся прайграць, — зьдзекліва засьмяяўся філёзаф. — Мне пляваць. Я толькі прадэманстраваў вам яшчэ адно гледзішча. Я — кропля бялку ў акіяне хаосу, які мы называем сусьветам. Мне ўсё адно.
Ён раптоўна ўстаў ад стала, забраў свой кубак, непатрэбны сподак і занёс іх у аконца для бруднага посуду. Ён быў пэдантычны нават ва ўзбуджаным стане. А пасьля выйшаў на вуліцу, не разьвітаўшыся.
Гэты дзяцюк з правінцыі цяпер сядзеў бліжэй, пры суседнім століку. Ён ізноў дэклямаваў, нібы ў мой гонар, аднекуль ведамы мне верш.

— І з глухім грукатам замкнуліся за ім дзьверы, як быццам загарнулі кнігу ці апусьцілі цяжкое века труны.
Я выйшаў з бару. Хлопец таксама падхапіўся ад століка, баючыся выпусьціць мяне з-пад вока. Ён ня быў падобны да віжа. Нашыя сэксоты апранаюцца модна, гэта эўрапейцы, якія абаранілі дысэртацыі па сацыялёгіі альбо праве. А бязвусы твар гэнага быў сама пачцівасьць.
Я ішоў паўз шчыльны натоўп, а ён краўся за мной і рабіў гэта няздарна, сутыкаючыся зь мінакамі, як вясковы мужык. Пасярод вуліцы, разганяючы школьнікаў зь сьцяжкамі, імчала міліцыйная машына. Выхіліўшыся ў адкрытае акно, афіцэр міліцыі даваў нейкія ўказаньні курсантам з Галяндзінава.
Да мяне падышоў малады мужчына, зацягнуты ў модныя бэжы, у люстраных адсонцавых акулярах, хоць, далібог, ужо колькі тыдняў ніхто ня бачыў сонца.
— Агеньчык ё? — запытаў ён, разьмінаючы ў пальцах цыгарку.
— Прабачце, не куру.
— Нічога. Можа, зойдзем у пад'езд?
— А чаму ж у пад'езд?
— А таму, — і паказаў мне мэталёвы значок агента.
— Мяне сёньня ўжо перапісвалі. У пад'езьдзе на другім баку вуліцы.
— Нічога. Перапішам яшчэ раз. Калі ласка, пашпарт.
Я падаў яму свой зацяганы, некалі заліты гарбатаю ці якім соўсам дакумэнт. Ён узяў яго ў рукі і рабіў выгляд, што чытае. На задворках гэтай камяніцы — а гэта быў той дом на Новым Сьвеце, дзе месьцяцца дзьве заалягічныя крамы, — дык вось, на задворках з боку вуліцы Гурскага на асфальтавай пляцоўцы моўчкі стаяў агромністы натоўп. Усе трымалі ў руках слоікі, пластыкавыя торбачкі з вадой, акварыюмы, а ў гэтым судзьдзі сонна варушыліся рыбкі. Чырвоныя, залатыя, шэрыя, чорныя, белыя. Рыбы маўчалі, і гандляры ці, можа, экспэрты, таксама не падавалі голасу. Стаялі вось так з прыгаршчамі вады, у якіх гуляла крыштальнае сьвятло, і прыглядаліся да чужых рыбак.
— Цікава, што заўжды і паўсюль толькі ў мяне правяраюць дакумэнты, — сказаў я агенту, які з посьпехам мог бы сыграць у амэрыканскім фільме.
— Бывае так часам, — адказаў ён суха.
Ягоны тон мог нават падацца прыхільным. З усяго, што можа мадэрнізавацца ў адсталай краіне, першай мадэрнізуецца

паліцыя. Таму гэтая ягоная мадэрновасьць быццам мела элемэнт вышэйшасьці за маю ніжэйшасьць. Я пачуваўся трохі зьбянтэжаным.
Тым часам за маёй сьпінай, на вуліцы, завылі міліцыйныя машыны, раздаўся аглушальны рык матацыклаў ганаровага эскорту, пачуліся рэдкія і нягучныя воплескі. Агент зірнуў панад маёй галавой, зірнуў без узрушэньня і безь цікавасьці, так, як мэханік глядзіць на спраўную працу машыны.
— Хіба я выглядаю як тэрарыст?
— Спытайцеся пра гэта ў сваёй жонкі, — адрэзаў элегантны агент, згортваючы пашпарт. — Дзякуй, можаце ісьці.
Я вярнуўся на вуліцу, мінаючы дзецюка з правінцыі, які гэтым разам яўна на мой адрас задэклямаваў сцэнічным шэптам:
— Памірае зямля гусьляроў і варажбітоў, памірае зямля прарокаў і мэсіяў, што ўжо ня здолелі збавіць сьвету.
Мог бы галаву даць на адсячэньне, што ведаю гэтую цытату. Выглядала гэта як урывак з паэмы Губэрта альбо з аморфнай прозы Рышарда, хутчэй Рышарда, бо Рышард любіў ціснуць без патрэбы на пэдаль патасу.
У плыткай канаве Новага Сьвету плыла вялікая аблачына атрутных выхлапных газаў неадрэгуляваных рухавікоў. Школьная дзятва з аркестрам дашкольнікаў наперадзе адходзіла ў бок вуліцы Сьвентакрыскай. Абодва сакратары, сплеценыя ў абдымках, маячылі недзе ў пэрспэктыве Кракаўскага прадмесьця.
Я выйшаў з дому пад імпульсам рашэньня. Выразна адчуваў нешта і рашуча нечага хацеў. А цяпер усё размылася. Я зь нейкім душным недаверам успамінаў візыт Губэрта і Рышарда. Можа, я іх наагул прысьніў?
Такія рэчы з мной ужо здараліся. Пару гадоў таму я пазваніў раніцой у выдавецтва з просьбай зьмяніць назоў маёй новай кніжкі. Рэдактарка была ветлівая, але зьдзіўленая. Цьвердзіла, што нічога ня ведае аб гэтай пазыцыі, што ня бачыць яе ў пляне, але зараз пойдзе і спраўдзіць, а тады патэлефануе мне. А калі яна скончыла сваю ветлую і падшытую баязьлівым зьдзіўленьнем прамову, я раптам зразумеў, што рэалізую свой сон, прысьнёны пару гадзін таму. Сон, у якім я мучыўся ад сораму з назову кнігі, якой ніколі не пісаў і ніколі не напішу. Я адразу ж выключыў тэлефон, каб яна ўжо не змагла мне пазваніць.

У краме музычных інструмэнтаў паміж трамбонам і талеркамі вісіць каляндар. Ён выразна паказвае кастрычнік 1979 году.
— Скажэце, калі ласка, які сёньня дзень і год? — пытаюся ў дзецюка, што абслугоўвае вулічны сатуратар.
— Слухайце, мне не да жартаў, — груба адказвае ён. — Бачыце, які рух. А газу не прывезьлі.
— Так, замала газу. Наагул замала газу.
Зараз, зараз. Выйшаў зь цьвёрдым рашэньнем. Спаліць сябе ўвечары. Чаму менавіта спаліць сябе? Якраз бліснула зноў сонца. Горад адразу павесялеў. Навошта ўвогуле я іх слухаў? Як зазвычай, ня стала мне характару? А што гэта — характар? Я ж добра ведаю, даўно зразумеў. Характар — гэта нястача сумневу, характар — гэта ўпартае трыманьне свайго намеру, якім бы бессэнсоўным ён ні быў, характар — гэта нястача ўяўленьня, характар — гэта прыроджаная тупасьць, характар — гэта няшчасьце чалавецтва.
Мне ня стала характару. Буду йсьці так аж да вечару. Але я ж магу збочыць. І ў нейкі момант зраблю гэта. Я спыніўся на аўтобусным прыпынку. Каля слупка праходжвалася кантралёрка, ушыркі большая, чымся ўвышкі, жудасная сланіха з гарадзкой транспартнай управы. Яна падазрона прыглядалася да патэнцыйных пасажыраў.
— Прабачце, — нясьмела пытаюся я, — ці ходзіць яшчэ 155-ы аўтобус, бо я чуў, што яго скасавалі?
— А я хіба ведаю. Пазаўчора яшчэ бачыла. Пастойце і пабачыце.
Характар зжыў сябе. У даўнія прымітыўныя часы змаганьня з усёмагутнай прыродай і зь біялягічнай слабасьцю чалавека характар быў дарэчным, прыносіў карысьць, з жудаснымі высілкамі штурхаў наперад цяжкую камлыгу людзкой немачы. Мы навучыліся хваліць, услаўляць характар, падаць перад ім плазам, рабіць зь яго фэтыш. А сёньня ніхто ня мае навагі скампрамэтаваць характар, хоць ён стаўся цалкам псыхалягічнай катэгорыяй, якая тармозіць, цягне назад. У сёньняшнім шматзначным сьвеце характар — гэта дэспатызм, тыранія і татальная нецярпімасьць. Урэшце прыйшоў час, каб услаўляць нястачу характару ды ўнутраную слабасьць чалавека. Нашая эпоха — гэта высакародныя сумневы, гэта блаславёная няпэўнасьць, гэта сьвятая празьмерная ўражлівасьць, гэта боская нястача цьвёрдасьці.

Я ўціснуўся ў перапоўнены аўтобус. Учадзелы ад выпарэньняў стомленых людзей, я спрабаваў успомніць урэшце, што пагаршае маё самаадчуваньне, маю агульную сытуацыю. Пэўна, пахмельле. Агромністае пахмельле нумар адзін. Дзе я прыдбаў яго? Пры якіх акалічнасьцях?

У маёй краіне няма галечы. Мала хто жабруе на рагох вуліц, а калі і робіць гэта, то неяк безь пераканаьня, бяз той нутраной моцы, бяз той маральнай цьвёрдасьці, што ўласьцівая праўдзіваму жабрацтву. Ніхто ня дзеліць запалкі на чатыры часткі і ніхто ня лічыць драбінак солі. Зрэшты, дзяленьне запалак не акупілася б у цяперашнія часы. Ледзьве запаліш тую трэцюю.

Нашая сучасная галеча празрыстая, як шкло, і нябачная, як паветра. Нашая галеча — гэта кілямэтровыя чэргі, гэта нястомнае штурханьне локцямі, гэта злосны чыноўнік, гэта запозьнены без прычыны цягнік, гэта адключаная фатальнымі сіламі вада альбо нястача вады, гэта нечакана закрытая крама, гэта разьюшаны сусед, гэта лжывая газэта і шматгадзінная прамова ў тэлевізіі заміж спартовай трансьляцыі, гэта абавязковая прыналежнасьць да партыі, гэта сапсутая пральная машына, прададзеная ў дзяржаўнай краме, гэта спэцыяльныя крамы, у якіх можна купіць сабе ўсё што хочаш за даляры, гэта манатоннае жыцьцё безь ніякай надзеі, гэта руйнаваньне гістарычных частак гарадоў, гэта выпампоўваньне людзей з рэгіёнаў і атручаныя рэкі. Нашая галеча — гэта міласьціна татальнай дзяржавы, міласьціна, зь якой мы жывём.

Так, гэтае пахмельле мяне аслабляе. А яны ўжылі шантаж. Бо як іначай назваць гэты прыступ Губэрта? Яны старанна зрэжысэравалі сьмяротны прысуд без мажлівасьці апэляцыі. Пэўна, экспэрт-псыхоляг прадбачыў усе мае рэакцыі і навучыў, як іх выкарыстаць. Можа, і гэтае пахмельле на мяне наўмысна навялі. Пахмельле-волат, пахмельле-асілак.

Але ад пэўнага часу бываюць у мяне сухія пахмельлі, пахмельлі без прычыны, пахмельлі самі празь сябе. Пасьля найлепшага дня, пасьля нуднага вечара перад тэлевізарам, пасьля лагоднага засонку абуджаюся ўраньні зь цяжкім пахмельлем. Мала таго, лежачы ціхенька ў ложку, дзякуючы ня ў меру разьвітай фантазіі, у сфэры чыста інтэлектуальнай, даводжу сябе да крайняга пахмельля. Пахмельле — мой найвярнейшы таварыш, пахмельле — мой двайнік.

Ледзьве пасьпелі праехаць праз мост на Павісьле, як аўтобус бяз дай прычыны сапсаваўся. Кіроўца папросту збочыў да бардзюру, вымкнуў рухавік і з помсьлівым здавальненьнем абвесьціў, што далей ня едзе, бо ў яго аварыя. Натоўп ціха, без нараканьня, як рухлівыя палявыя мышкі, пакінуў салён аўтобуса, аблеплены ўрачыстымі лёзунгамі.
Я рушыў да Віслы, мяркуючы, што вуліца Вісьляная павінна знаходзіцца каля ракі. Кіну іх, уцяку ў апошнюю хвіліну куды вочы гладзяць. Але да вечара трэба праяўляць ляяльнасьць. Буду цьвёрда йсьці па тых супынках мукі, якія вызначыў мне таямнічы аэрапаг бунтаўнікоў. Тайнае палітбюро апошніх, хто хворы на бессань у гэтай соннай краіне.
Як напраўду, дык не магу сабрацца з думкамі і яшчэ ня ведаю, што буду рабіць. Калі ўспамінаю той візыт Губэрта і Рышарда, мне здаецца, што гэта быў злавесны ранішні сон. Аднак мне робіцца задушна, бракуе паветра, хочацца ўцячы ў спазьме гістэрыі. Але куды ўцякаць?
Вісла нясе бурую, глеістую, паводкавую ваду. Колькі парусьнікаў, убраных сьцягамі, змагаюцца пасярод плыні зь неспрыяльным ветрам. На другім баку, па-над зьвялымі джунглямі батанічнага саду, запальваецца й гасьне вялізны нэонавы надпіс: “Мы збудавалі сацыялізм!”
Ля ракі я праседзеў шмат цяжкіх хвілін. Гэтыя паламаныя хуліганамі кусты — мой колішні манастыр. Я гадзінамі глядзеў у сьветлую роўнядзь вады, тады яшчэ чыстай, і перажываў у сабе салодкую горыч нейкіх там любоўных паразаў альбо горкую кісьліню літаратурных правалаў. Мае грахі, мае болі, мае сорамы, як купальскія вянкі, адплывалі ў далёкае мора. Добра было б скочыць у ваду назаўжды. Але мае браты па няшчасьці хочуць, каб я скочыў у агонь.
Мне вельмі хацелася доўга, як мага даўжэй шукаць гэты дом на вуліцы Вісьлянай. А ён, як на зло, знайшоўся адразу. Камяніца сталінскай эпохі. Якая чакае канца свайго існаваньня. Прызначаная на знос. Стомленая шматгадовым жыцьцём. Яе ня песьцілі рамонты, яе не ачышчалі ад грыбка, яе пакінулі на волю ўласнаму лёсу, як усе дамы нашых гарадоў. Жылы ўжо толькі адзін паверх. На іншых выбітыя шыбы, выламаныя дзьверы, абдзертыя сьцены. Але гэта нічога, бо на даляглядзе відаць стромыя новыя скрынкі блёчных дамоў, якім наканавана караценькае, цяжкое жыцьцё матылька.

— Польшча, Польша, Польшча, Польша! — скандаваў чэзьленькі грудок, што маршаваў па ўзьбярэжным бульвары, несучы агромністы партрэт узлаванага калмыка, нашага госьця. Вецер ірваў над іх галовамі нацыянальны сьцяг, увесь чырвоны зь белай стужкай угары. На другім беразе йшоў падобны грудок маніфэстантаў. Яны ўбачылі адно аднаго, пачалі махаць адно аднаму партрэтамі й сьцягамі, цалкам парушаючы сцэнар, проста так, каб паблазнаваць.
На рагу Вісьлянай стаяў гэты дзяцюк з правінцыі і няясна ўсьміхаўся. Хадзіў за мною, як сабака. Ён трымаў у руцэ жоўта-чырвоны кляновы ліст.
Я перайшоў вуліцу і хацеў ужо ўвайсьці ў разьбіты пад'езд, калі пранізьліва азваўся міліцыйны сьвісток. Старшы сяржант з дарожнай міліцыі, у белай запэцканай фуражцы, набліжаўся да мяне лянівым крокам.
— Вы перайшлі вуліцу ў недазволеным месцы, — безуважна сказаў ён. — Ваш пашпарт, калі ласка.
— Мяне сёньня ўжо правяралі. Два разы.
Ён паглядзеў трохі зьдзекліва.
— Думаеце, мне да гэтага справа? Я таксама чалавек.
Але абгледзеў безь цікавасьці мой бедны дакумэнт.
— Дык колькі заплацім?
— Колькі скажаце.
— Што вы такі шпаркі? У вас грошай зашмат?
— Зашмат. Ужо не пасьпею патраціць.
Яму не хацелася адкрываць торбы, шукаць блянкі квітанцыяў. Відаць, у яго таксама была кепская ноч. З брыля яшчэ капала вада пасьля апошняга дажджу. Гаварыць ён таксама ня меў ахвоты. Таму толькі пагразіў мне пальцам і вярнуў дакумэнт. Калі я ўжо быў на сходах, ён усё-такі сказаў усьлед зь вялікай цяжкасьцю:
— Будзьце ўважлівымі. Наагул, будзьце ўважлівымі.
Дзесьці ў глыбіні места шумна азваліся аркестры. З Прагі данёсься цяжкі гук. Недзе па суседзтве пасыпаліся шыбы. Гэта, пэўна, быў гарматны салют.
На пляцоўцы паміж паверхамі мяне мінуў стары ў пакамечанай адзежы і з старасьвецкай торбай, аперазаны дзягай. На момант я спаткаўся зь ягоным паглядам, усё яшчэ змрочным, з бліскамі згаслага фанатызму. Гэта быў таварыш Сахер, член Палітбюро з шматгадовым стажам. Я спыніўся, зьдзіўлены, пры патрэсканай

балюстрадзе і глядзеў у сьпіну гэтага нябогі-старога, якога некалі вазілі ў браняваных лімузынах і ахоўвалі, як каралеўскі брыльянт. Паводле ягонага знаку гарады мянялі назву, ляцелі людзкія галовы. Цяпер жа ён быў усяго толькі безабаронным пэнсіянэрам, які, пэўна, ішоў у краму, каб стаць у чаргу па нізкакалырыйную макарону.
Раптам ён абярнуўся і зірнуў на мяне зьнізу тымі вачыма, якія калісьці гіпнатызавалі старых таварышак, адданых рэвалюцыі.
— Дзень добры, — машынальна павітаўся я.
— Дзень добры, — хрыплым голасам адказаў ён і выйшаў на вуліцу.
Я націснуў прысьцебку званка пры дзьвярох, памаляваных у шэра-сіні колер. Доўга ніхто не адчыняў, хоць я чуў за дзьвярыма нейкі ўладны голас, які цадзіў важкія словы, і кароткія выбухі сьмеху. Урэшце дзьверы прачыніліся на даўжыню ланцуга, і я ўбачыў анэмічную безаблічную дзяўчыну.
— Я паводле даручэньня Губэрта. Да Галіны і Надзежды.
Яна зьняла ланцуг, упусьціла мяне ў вітальню, поўную старога хламу, кашоў для непатрэбнага рызьзя, танных рэпрадукцыяў на сьценах і павуціньня паўсюль.
— Вы ў справе тэхнікі?
— Так. Можна назваць гэта так.
— Праходзьце, калі ласка.
Яна не выяўляла ніякай цікавасьці да мяне. Як быццам я прыйшоў з пральні па брудную бялізну. Я адчуў пэўную прыкрасьць. Блаславёную прыкрасьць. Чыніцьму супраціў. Пасіўны супраціў.
Гэты пакой дзіўным спосабам нагадваў часова абстаўленыя пакоі з гадоў нямецкай акупацыі. Нейкія народныя кілімчыкі на сьцяне, нейкая драўляная мэбля народных майстроў, трохі засохлых кветак у гліняным збане. У адным куце сьвяціўся тэлевізар, у другім на тапчане ляжаў чалавек зь белай барадою.
— Я падрыхтавала для вас трохі брашур, — адазвалася дзяўчына.
Яна была худзенькая, дробная, змарнелая, як уся сучасная моладзь, якая засьпела ўжо гатовы, збудаваны намі сацыялізм.
— Якія брашуры? — спытаўся я, зьдзіўлены.
— Якія датычаць тэхнікі. Вашых папярэднікаў. З розных куткоў сьвету. Гэта варта ведаць.
Я ўзяў у рукі колькі кніжачак і ня ведаў, што зь імі рабіць.

Ведаў толькі, што ніколі ў іх не зазірну. З паліцы на сьцяне на мяне шчэрылі зубы пашарпаных хрыбтоў клясычныя творы расейскіх дысыдэнтаў.
— Увага! Ён будзе распранацца! — крыкнуў чалавек зь белай барадой, паказваючы на тэлевізар.
Мы падышлі бліжэй да апарата, дзяўчына пакруціла тумблер, каб павялічыць гук. На вялікім экране старасьвецкага тэлевізара паявіўся прэзыдыюм урачыстага сходу. Пасярэдзіне сядзелі наш сакратар і гэты савецкі з азіяцкімі рысамі ды трымаліся за рукі. Над імі віднелася агромністая рымская лічба “XL”, унізе бег лёзунг па-польску і па-расейску: “Мы збудавалі сацыялізм!”
За сьпінамі прэзыдыюму якраз накіроўваўся да трыбуны чарговы дакладнік, і я адразу пазнаў у ім знаёмага апаратніка, які жыў насупраць майго дому. Ён нясьпешна ішоў да трыбуны, аздобленай зоркай, яшчэ не савецкай зоркай, але ўжо трохі да яе падобнай.
— Таварыш Кабялка, — азваўся ўзрушаны чалавек з тапчана. — Я назіраю за ім ужо шмат месяцаў. Пабачыце, сёньня ён распранецца.
Заля зьезду аціхла, і нам заняло дых. Гэта быў страшны фатум, незразумелая пошасьць, неўтаймоўная эпідэмія, якая абымала ўсю партыю. Ніхто на гэты момант ня ведаў, як яе запабегчы. Яна ўсім зганяла сон з павекаў, паскарала біцьцё сэрца і адначасова зьнясільвала. Удзельнікаў і назіраньнікаў. Супрацоўнікаў дзяржбясьпекі і рэакцыянэраў.
Мой таварыш Кабялка падышоў да трыбуны, трымаючы перад сабой, як алібі, стос паперак з тэкстам прамовы. Вялікімі пакутнымі вачыма паглядзеў у столь, а потым перавёў пагляд на залю і павольна, ледзь заўважна пачаў раскрываць вусны ў агіднай, непрыстойнай, жудаснай усьмешцы.
— Не! Не! — нехта крыкнуў нялюдзкім голасам у залі зьезду.
Але таварыш Кабялка, нібыта кіраваны незямнымі сіламі, захістаўся на трыбуне і павольна, расьцягваючы гэтае дзеяньне, разьдзёр машынапіс прамовы на чатыры часткі і бестурботна выпусьціў іх з рук, а яны з агрэсіўнай хапатлівасьцю пырхнулі на першыя рады дэлегатаў, і акурат з гэтых радоў адразу пачуліся нейкія дзіўныя, гістэрычныя ўсхліпы.
Таварыш Кабялка адкрыў рот, нейкі час мучыў маўчаньнем застылую ў нядобрым прадчуваньні залю, а пасьля звонка і

моцна выгукнуў:
— Таварышы здраднікі! Таварышкі сьвіньні!
У гэты момант пачаліся моцныя перашкоды. Белыя палосы працялі экран, нешта заскрыгатала, карцінка зьяўлялася і зьнікала, як быццам нехта хацеў яе адключыць і зь нейкіх прычынаў ня мог адключыць. Таму таварыш Кабялка паказваўся на імгненьне і адразу ж зьнікаў. А калі паказваўся, дык штосілы варушыў вуснамі, але нічога не было чуваць, бо гук такі ўдалося вымкнуць. І гэтак таварыш Кабялка зьвяшчаў сваю немую прамову, свой вінавальны вырак, да якога рыхтаваўся чвэрць стагодзьдзя, сваё крэда, укладзенае праз мноства няспаных начэй, сваю споведзь, вынашаную ў засохлым горле праз усе пакуты прыніжэньняў, і гэтак таварыш Кабялка крычаў немым голасам, а аўдыторыя на колькі сэкундаў замерла ў звышнатуральнай летаргіі.
Нарэшце, як у сьне, нехта павольна падняўся з адкідной сядушкі, яшчэ нехта адарваўся ад сьцяны, якіясьці рукі трохі ўмольна, а трохі драпежна выцягнуліся зь нерухомай сьцяны прэзыдыюму, і тады карцінка вярнулася да нармальнай жыцьцёвай хуткасьці. Таварыш Кабялка, працягваючы бязголасна крычаць, зьняў пінжак і кінуў яго ў засланы пурпурам праход, разьвязаў гальштук, павесіў яго на мікрафон, не расшпіляючы гузікаў, зьдзёр зь сябе белую ўрачыстую кашулю і нарэшце пачаў сьцягваць нагавіцы. Але агенты былі ўжо блізка. Ён заблытаўся ў спадаючай адзежыне, небясьпечна пахіснуўся, яны накінуліся на яго, схапілі за рукі і ногі, павалаклі за сьпінамі прэзыдыюму за кулісы. А ён драпаўся, выкручваўся зь іх рук, пляваў пенай на ўсе бакі, брыкаўся нагамі, матляў галавой, нібы эпілептык, і гэтак зьнік за пунсовай заслонай, бліснуўшы яшчэ белымі кальсонамі савецкае вытворчасьці.
Раптам паказалася застаўка з двума галубкамі, якія цалаваліся. Адзін быў чырвоны, і другі быў чырвоны, але зь белым хвосьцікам. Пад імі была тая самая магічная рымская лічба “XL”. Пачуліся велічныя гукі пятай сымфоніі Чайкоўскага. Хвіліну мы маўчалі, як над труной, у якую паклалі нябожчыка.
— Гэта мой сусед, — сказаў я ўрэшце.
— А я яго любіў, — прамовіў чалавек з барадой. — Пэўна, ён быў моцны п’яніца.
— Усе п’юць, — азвалася Галіна.

— Але ён піў шчыра. Таму так скончыў, — чалавек з барадой хацеў павярнуцца на другі бок, але па кароткім намаганьні здаўся.
Галіна падышла да дзьвярэй, якія вялі ўглыб кватэры.
— Я на хвілінку адыдуся.
Я застаўся адзін з чалавекам на тапчане. Ён вельмі доўга глядзеў на мяне, урэшце паварушыў вуснамі і вымавіў:
— Гэта вы.
— Але. Я.
— Падыдзеце бліжэй. Сядзьце, калі ласка, каля мяне. Я спаралізаваны, — а калі я прысеў на ўскрайку тапчана, дадаў.
— Часткова. Вы помніце вайну?
— Якую вайну?
— Ну, гэтую нашую. Нашую вялікую вайну.
— Я браў у ёй удзел. Мне здавалася, што не забудуся яе да канца жыцьця. Але ўжо даўно забыўся.
— А я помню. Для мяне яна трывала доўга. Яшчэ дзесяць гадоў па вайне. Я быў у савецкіх лягерах.
Ён уважліва прыгледзеўся да мяне.
— Не, ня тое, што вы думаеце. Мяне пасадзілі не за камунізм. Я быў у акоўскіх лягерах, то бок, ня толькі для акоўцаў, для ўсіх. Лягеры, як бабілёнская вежа. Але нас, акоўцаў, было шмат. Таму я так сказаў.
Патроху раздаваўся патэтычны Чайкоўскі пад покрывам тых двух чырвоных галубкоў, зь якіх адзін меў белы хвосьцік. Стары аковец нэрвова варушыў пальцамі правай рукі, што ляжала на столцы коўдры. Я здагадаўся, што кровазьліцьцё разьбіла правую паўкулю ягоных мазгоў. Гэтая рука жыла сваім уласным жыцьцём.
— Вы хацелі б павярнуцца на іншы бок? — спытаўся я.
— Але. Вы заўважылі?
Я дапамог перакуліць худое і страшэнна цяжкае цела на другі бок. Цяпер ён глядзеў у сьцяну з абдзертымі шпалерамі. І так было лепей.
— Пэўна, баіцёся, — азваўся ён ціха.
— Яшчэ ня ведаю, ці зраблю гэта.
— Страх — гэта людзкая рэч. Я таксама баяўся да таго моманту, калі мне сказалі, што жонка і дачка памерлі ў турме. Ад таго моманту перастаў баяцца. А катаваньні — страшнейшая за сьмерць рэч.

— Наагул, з ранку не магу зьберціся з думкамі. Хачу запыніцца, ясна ўбачыць сваё становішча, хачу наважыцца і не магу.
— А жонка і дачка не памерлі. Жылі на волі. Яны хацелі мяне зламаць, але толькі выпрасталі.
— Ці трэба мне зрабіць гэта?
— Ня ведаю. Тады мы ўсё ведалі, цяпер нічога ня ведаем. Тады сьвет быў просты. Цяпер перакруціўся. Сам сабою перакруціўся, ці яго перакруціў гэты час ідэалёгіі, як ураганы. Можа, гэта слабасьць, а можа — сіла.
— Што будзе слабасьцю ці сілаю?
— Вашая сьмерць.
— Мая незаўчасная сьмерць. Мая сьмерць у пару.
— Мы і так павольна паміраем з хвіліны на хвіліну. Сьвет таксама памірае з намі, праўда?
— Сьвет ня можа памерці. Ужо многім пакаленьням здавалася, што сьвет памірае. Але гэта толькі іхны ўласны сьвет памірaў.
— Добра вы сказалі. Але калі сьвет не памірае, то мусіць зь нечага жыць.
— Што гэта значыць?
— Гэта значыць, што ён патрабуе чалавечай сьмерці.
Застаўка зьнікла. Паказалася карцінка залі паседжаньня зьезду. Нехта прамаўляў, у залі гучалі воплескі, а сёй-той яшчэ выкрыкваў воклічы захапленьня. Усё вярнулася да нормы. Да ненармальнай нормы на пэўны час.
— Вы лежыцё тут і назіраеце гэтую жменьку моладзі, гэтую невялікую купку, на якую нешта зышло. Нешта накшталт згрызотаў сумленьня за грахі бацькоў, нешта накшталт гневу на паскуднасьць быцьця, нешта падобнае да спазму калектыўнай маральнасьці біялягічнага віду. Яны ж плывуць супраць плыні, але стаяць на месцы.
— Страшная ноч. Кашмарны сон. Трэба крыкнуць, каб абудзіць людзей.
— Браце мой па лясох, па лягерох, па паняверцы, па роспачы, па разьдзяўбаным жыцьці, браце, што мне рабіць?
— Сам будзеш ведаць. Калі наблізіцца часіна.
Адчыніліся дзьверы, і я ўбачыў Галіну, якая засланяла сабой другі пакой.
— Можна вас папрасіць?
Я ўвайшоў туды, а яна зачыніла дзьверы. Пры акне, пад сьвятлом, стаяла дзяўчына з пышнымі, нібы зьбітымі ў лямец

валасамі, на якіх палымнеў руды бліск.
— Гэта Надзежда, — сказала Галіна.
Я пакланіўся, але дзяўчына з рудымі валасамі засталася нерухомай. Попельны цень закрываў яе твар.
— Вы ведаеце, дзе гэта мае адбыцца?
— Ля будынку ЦК партыі.
— Не, рашэньне зьмянілі. Перад Заляй Кангрэсаў, дзе адбываецца зьезд.
“Хто зьмяніў рашэньне? — падумаў я. — Гэтыя дзеці, масонская лёжа ці няведамы дэміюрг, прыкуты да варшаўскіх сутарэньняў?”
— Мне ўсё адно, — сказаў я і адразу ж усьведаміў, што гэта словы філёзафа, Рышардавага брата.
Здрыганулася сьцяна, раздаўся гук з боку Віслы. Апошні запозьнены салют. Нехта прасалапячыў, альбо далі збой гарматы.
— Трэба бэнзын і надзейныя запалкі. Вы, я бачу, нічога пры сабе ня маеце?
— Я падумаў, што можна купіць на аўтазапраўцы.
— Трэба мець талёны. Ды, апроч таго, ашукваюць. Даліваюць вады.
— Дык што будзем рабіць? — спытаўся я з пэўнай надзеяй.
— Вы застаняцеся тут. З Надзеждай. Яна вам патлумачыць дэталі. Я тут ведаю гаспадарчую краму, пайду й куплю вадкасьць.
— Але сёньня нацыянальнае сьвята.
— Нічога. Яны праводзяць пераўлік. У нас ёсьць грошы на хабар.
— У мяне таксама ёсьць трохі грошай. Можа, хай будзе за мой кошт?
— Да вечара яшчэ далёка. Яшчэ пасьпееце выдаткаваць, — і раптам усьміхнулася, зусім нечакана, дадаючы: — А Надзеждзіна бабуля была каханкаю Леніна, вы ведаеце?
— Не. Упершыню чую, — я зноў пакланіўся нерухомай дзяўчыне пры акне.
Галіна накінула кароткую куртачку, бо вецер ізноў застукаў у вокны, і выйшла, ціха зачыніўшы дзьверы. Віхор злосна грукатаў аб закітаваныя шыбы. Яшчэ ён даносіў далёкія і размытыя гукі музыкі ці воклічы сьвяточных гурмаў. Мы стаялі адно супраць аднаго, яна бачыла мяне, а я ня мог разгледзець

рысаў яе твару. Мы маўчалі вельмі доўга, але я, о дзіва, не адчуваў няёмкасьці. Мог бы так стаяць да вечара. Нарэшце яна памкнулася ў мой бок, спачатку павольна, нібы сонна, пасьля ўсё хутчэй і ўрэшце ўпала на калені, схапіла маю руку, прытуліла да яе вусны і сказала надзіва нізкім голасам:
— Вы геній.
Я разумеў, што гэта нейкі незаслужаны камплімэнт, хацеў падняць яе, але толькі блытаўся ў яе валасах, сухіх, зблытаных і рудых, як у Леніна ў маладосьці.
Яна бяздонна ўздыхнула і раптам сама падхапілася з падлогі, выбегла ў той пакой, дзе ляжаў сівабароды.
— Ну і хай, — сказаў я сам сабе, бо мусіў нешта сказаць, а нічога іншага мне не прыйшло да галавы.
Разгледзеўся крадком. Гэта, відаць, быў Надзеждзін пакой, бо з усіх сьценаў на мяне паглядалі барадатыя і суровыя фізіяноміі расейскіх дысыдэнтаў.
Яна вярнулася празь якую хвіліну, зь вясёлай усьмешкай, але выціраючы верхам далоні куткі вачэй.
— Вы на мяне не злуяце? — спыталася нізкім, як даўней казалі, гартанным голасам.
— Ай-яй, чаму ж.
— Я заўжды так, зраблю глупства, а потым саромеюся. Не магу прывыкнуць да вашых звычаяў. У нас усё проста. Як хто кахае, то кахае. А як ненавідзіць, то ненавідзіць.
— Што край, то абыча́й, — адказаў я дыпляматычна.
Яна дастала з шафкі пляшку з чорнай вадкасьцю і два кілішкі.
— Вып'ем за згоду? — спыталася яна, яшчэ крыху плачучы, але ўжо заразьліва сьмеючыся.
Натуральна, яна мела зялёныя вочы, шчокі зь ямкамі і ўвогуле была пры целе.
— Дык мы ж і не сварыліся.
Яна наліла ў абедзьве чаркі па вялікай порцыі.
— Гэта мая сібірская наліўка. Прывезла з Масквы і сказала сабе, што вып'ю толькі з самай вялікай нагоды. Ведаеце, я была ў вас закаханая.
— Я ў вас і цяпер закаханы.
— У вас заўжды іронія ды іронія. А я праўду кажу. Некалі мне вас паказалі здалёк, ну, я і закахалася, як вар'ятка.
— Можа, вы мяне з кім блытаеце?
— Не. Я вас нават чытала. У вас нашая душа. Толькі ў ёй

крышачку такога тутэйшага. Як бы непраўдзівага.
Дзякуючы дзіўнаму зьбегу акалічнасьцяў, недзе паблізу, на нейкай эстрадзе пры беразе Віслы, духавы аркестар зайграў стары вальс “На сопках Манчжурыі”. Гэта быў прыгожы і фатальны для мяне твор.
Яна падала мне келіх з таямнічым зёлкавым лікворам, не адрываючы рукі. Гэтак мы трымалі ўдваіх маю шклянку, напоўненую сібірскай агнявой вадой. Я слухаў старасьвецкі вальс, і нешта сьціскала мне сэрца.
— За Ваша здароўе.
— За Ваша здароўе.
— За наша здароўе.
Нейкая прыкрасьць апякла мяне праз імгненьне. Так, тост быў недарэчы. Але што ўжо там, і я нагбом кульнуў сваю цыкуту.
— Можа, прысядзьце, — яна паказала на жалезны ложак, прыкрыты нейкім футрам, пэўна, сібірскім. — Нездарова гэтак стаяць і стаяць.
— Праўду сказаць, здароўе мне ўжо не патрэбнае.
Я глядзеў на дно шклянкі, дзе ляжалі рэшткі зёлак. Бог ведае, на што яны ўплываюць.
— У вас пахмельле. Я адразу зразумела. Вы на мяне не пакрыўдавалі, праўда?
— Пані Надзежда, па-польску Надзея...
— Ах, як вы прыгожа сказалі. Можна, я вас пацалую.
Што сапраўды зрабіла. І я на момант адчуў яе гарачыя, досыць шырокія вусны каля сваіх вуснаў. А аркестар усё граў “На сопках Манчжурыі”, мэлёдыю, пад якую, здаецца, шмат гадоў таму я пабачыў дзённае ці ночнае сьвятло альбо зьявіўся на сьвет.
— Што вы пра мяне падумаеце, — сказала Надзея, закрываючы зьлёгку раскосыя зялёныя вочы.
Я, дарэчы, заўважыў, што пад дзіўнымі празрыстымі адзежамі, якія нагадвалі агромністую хустку ці тэатральнае понча, а хутчэй, досыць рызыкоўную рызу, — што пад гэтымі адзежамі яна ня носіць станіка. Ужо трохі разбэсьцілася нашым паў-Захадам.
— Найлепшае, дачка стэпаў і нерушаў.
— Вам, палякам, нельга верыць.
— Можна яшчэ трохі гэтай амброзіі расейскага народу?
Мы стукнуліся чаркамі. Мэлёдыя старога вальсу плыла над

нашым домам, як белы каўкаскі лебедзь, хоць я ня ўпэўнены, што на Каўказе вядуцца лебедзі.
— Ах, як я вас кахала.
— Вы ўсё ў прошлым часе, любая Надзежда, альбо Надзея.
— Хацела нават сьмерць сабе зрабіць.
Ізноў па маёй сьпіне праляцеў лёгкі мароз. Альбо яна трохі нявыхаваная, альбо неяк занадта прызвычаеная да сьмерці.
— Вашая проза ўплывае на мяне проста фізычна.
— Я ўжо не пішу.
— Ах, Божа мой, чаму?
— Абрыдла.
— Як можа абрыднуць літаратура! Нельга так казаць. Вы ж творца, геній, на вас увесь сьвет глядзіць.
Сібірская наліўка рабіла сваё. Пакой расплыўся ў бакі, нібы запрашаючы да казачка. А аркестар скончыў вальс “На сопках Манчжурыі” і яшчэ раз пачаў “На сопках Манчжурыі”. Але гэтым разам вальней, нібы маючыся ўпісаць кожную ноту ў мае разьмякчэлыя мазгі.
— І як ты пачуваешся, дзіця, у нашай паў-Эўропе? У нашай былой паў-Эўропе?
— Ня надта.
— Іначай уяўляла сабе Польшчу?
— А скуль вы ведаеце?
— Бо я вас ведаю.
— Нас, расейцаў?
— Не, расеек. Расейцаў таксама ведаю.
— А скуль Вы ведаеце расеек? З Тургенева, Талстоя, Ляскова?
— Ты ж сама сказала, што ў мяне вашая душа.
— Я сказала?
— На пачатку.
— Аднак вы іншы.
— І Польшча іншая?
— Іншая.
— Лепшая ці горшая?
— І так, і так.
— Што гэта значыць?
— Я сумую па Маскве.
— Ці можна сумаваць па гэтым месьце?
— Я б басанож па сьнезе пайшла.
— У Маскву?

— Так, у Маскву.
Мне карцела спытацца, чаму ёй не паляцець абутай “Аэрафлётам”, але не спытаўся.
— Ты, Надзейка, патрыётка?
— Гэта вы — польскія нацыяналісты.
— Бачыш, дзіця з раскосымі вачыма, такая наша доля. Што б мы вам ні казалі, заўжды пачуем, што мы — шавіністы.
Яна раптам прытулілася да мяне. Чулыя гукі вальсу майго маленства, як цыгарэтны дым, слаліся па гэтым дзявочым зрасейшчаным пакоі.
— Ах, навошта гэтыя заўсёдныя звадкі паміж намі і вамі. Мы ж усе славяне. Ці ня лепей было б, калі б вы прылучыліся да нас з добрай волі. Мы б разам забыліся пра ўсе гэтыя непатрэбныя крыўды, прэтэнзіі, непрыязьні, якія падзялялі нас гэтулькі стагодзьдзяў. Мы зможам вас любіць, як толькі вы нас палюбіце.
— Але ж вас, расейцаў, ужо няма. Апошніх славянаў, гэта значыць вышэйшыя слаі, выразаў твой дзедушка Ленін. Ад Буга да Хабараўску гуляе Азія.
Яна адштурхнула мяне так моцна, што я паваліўся на падушку.
— Я ведала, што расчаруюся. Божа, якая я няшчасная.
І зноў выбегла з пакою. Я зь цяжкасьцю падняўся, сеў на касьцістым краі ложка. Гэтая сібірская любачка зусім мяне прыбіла. Лучыла на спрыяльную глебу. То бок, сьцякла на маё беднае, безабароннае пахмельле, на маю старэчую хваробу. Так, помню, учора піў сам з сабою. Заслаў абрусікам стол, паставіў талерку, паклаў нож з лыжкаю і відэльцам ды кавалак сыру. Нясьпешна, з годнасьцю, як на званым абедзе, прыняў паўлітра чыстай з айчыннай бульбы. Гаварыў сам з сабою, спачатку ветліва, з гумарам, пазьней, здаецца, крыху лаяўся. За акном да поўначы выпрабоўвалі гучнагаварыльнікі. Уперамежку перадаваліся дзікая музыка і выбачэньні ананімнага дыктара за шум у позьні час.
Яна зноў вярнулася, сьмеючыся і выціраючы раскосыя зялёныя вочы.
— Я ўсё ўспрымаю ўсур’ёз, а Вы пэўна жартавалі.
— Ну-ну, жартаваў, мая Надзея.
— А я Вас зараз удушу і набуду спакой.
— Нельга мяне душыць да пары.
Але яна не зьвярнула ўвагі на маю алюзію. Падышла да мяне,

абаперлася далікатнымі, так, сапраўды далікатнымі каленямі аб мае калені і паклала абедзьве далоні на маю пульсаваную шыю.
— Баіцёся?
— Як і кожны чалавек. Баюся, што буду баяцца ўсё болей.
— Мой аднакурсьнік зрабіў тое самае. Пад Крамлём.
— Шмат людзей ужо гэта зрабілі.
— Хочаце сказаць, што ня варта?
— Ня ведаю, ці ня варта. Мо аднойчы выявіцца, што варта.
— А Вы ніколі не адчувалі, што я пра Вас думаю?
— Я наагул ня ведаў, што ты існуеш, Надзея.
— Ах, няхораша Вы кажаце. Вы такі звычайны, а я думала...
— У звычайнасьці ўся мая сіла.
— Вы згаджаецеся на звычайнасьць?
— Даўно згадзіўся.
— Нельга. Чалавек — дзіўная, нязвыклая, цудоўная істота.
— Асабліва чалавек расейскі. Баганоша.
— Вы зноў пачынаеце.
Я ўзяў запясьці яе рук, якія лёгка сьціскалі маю шыю. А аркестар усё граў на маю згубу “Сопкі Манчжурыі”.
— У гэтай краіне трэба прызвычаіцца да звычайнасьці. Яна здаецца табе тупой, мяшчанскай, пазбытай палёту, але яна мае таксама пэўныя перавагі, якія нярэдка стаюцца патрэбнымі. Пішаш вершы, Надзейка?
— Пішу.
— Штотыдзень?
— Бывае, што й часьцей. Я не магу жыць так нармальна, як вы тут жывяце.
— Мы не жывём нармальна. Жывём так, як нам загадваюць.
— Вы верыце ў Бога?
— Веру. То бок, стараюся верыць.
— Бачыце. Вы толькі стараецеся. Як вы ўсе.
Сорамна казаць, але ад яе біла гарачыня пышнага расейскага цела. Мне здавалася, што сярод каляровых плямак, якімі стрымела яе адзежа, што сярод гэтых пастэльных вочак я бачу таксама міндалёвыя, шырока адкрытыя вочкі яе цыцак. Я згадваў пад празрыстай тканінай масіўныя, жаночыя, гарачыя грудзі. Такія грудзі, якіх на захад ад Віслы ўжо няма. І раптам я пачуў у сваім немаладым, замучаным пахмельлем целе нейкія непрыстойныя флюіды.

— Я б забрала Вас да нас, на старую Русь. Дзе далягляд далёкі, як нідзе больш, і неба вялікае, найвялікшае. Вы працівіцеся велічы, бо ня маеце адвагі. Плюньце на ўсё і ідзеце шукаць Бога.
— Ужо запозна, позьняя Надзя.
Яна адчувала мой пульс, але і я лавіў удары яе крыві ў надзіва тонкіх і крохкіх запясьцях рук. Я з сарамлівасьцю адзначыў, што думкі мае трохі блытаюцца. Што я працінаю вачыма ядваб ці, можа, батыст гэтай дзіўнай рызы. Дысыдэнты з дакорам глядзелі на мяне з усіх сьценаў.
— Ведаеце што, давайце ўцячом, — раптам сказала Надзя.
— Што Вы такое кажаце?
— Хадзем, ніхто нас ня ўбачыць. Уцячом ад людзей.
— Але куды, унучка Чынгісхана?
— Пабачым. Заўсёды знайдзецца трохі месца для нас дваіх.
— Ты пакінеш іх адных? А хто збавіць сьвет?
— Вы цынік. Божа, чаму я ў Вас закахалася. Калі б я ведала...
Нечакана разышліся хмары, адкрываючы яскрава-блакітнае неба. Запалымнела агромнае чыстае сонца і зрабілася горача, як у жніўні. Вялікі прастакутнік сьвятла загарэўся на падлозе. А аркестар усё яшчэ граў вальс “На сопках Манчжурыі”.
— Я пазытыўны цынік. Таму я прыдамся. Мне з вамі па дарозе.
— Вы ня можаце наважыцца на вар’яцтва, так? Ні разу ня здолелі.
— Надзя, дарагая, нядобра рабіць мне такія закіды ў той момант, калі Галіна пайшла купляць гаручае.
Яна хацела нешта сказаць, але прамаўчала. Глядзела на мяне сваімі раскосымі вачыма, якія зусім не былі зялёныя, хоць мусілі быць зялёныя. Гэтыя вочы мелі інтэнсіўную фіялетавую глыбіню, і мне здавалася, што яны крыху фасфарызуюць. Яна прысела перада мной.
— Шкада, што я не насьмелілася пазнаёміцца з Вамі раней.
— Ты мяне зь некім блытаеш.
— Не, далібог. Спытайся ў Галі.
— Ты пачулася спаміж нас згубленай і шукала братняй душы. Кацапскай, дзікай, сумасшэдшай душы.
— За што вы нас так ня любіце?
— Я ўсіх не люблю. Альбо, калі хочаш, усіх люблю. Нават гэтых няшчасных сакратароў, вашага і нашага, якія ў гэтую хвіліну, можа, без ахвоты цалуюцца ў вусны. А цябе, Надзя, я папросту

кахаю. Закахаўся ў цябе зь першага пагляду.
— Ты ўсё-такі польскі пан. Белапаляк.
— Хадзі сюды, сядзь каля мяне.
— Яшчэ чаго. Ужо ўсё прайшло.
— Але так будзе зручней.
— Вы мне абыякавы.
— Добра. Тым больш можаш сесьці на свой дзявочы ложак.
— Адкуль вы ведаеце, што я дзяўчына? Можа, у мяне было ўжо тры мужы?
— Першы быў артыст, другі — кіраўнік сэктару ў ЦК, а трэці — паляк, які вывез цябе з айчыны.
— Гаварэце далей. Я адчуваю агіду. Прынамсі, вылечуся ад ачмурэньня.
Яна пахла хной ці якім сібірскім зельлем. А гэтыя валасы маглі быць водарасьцямі ў таямнічай рацэ Ўсуры. Яна села каля мяне зь сярдзітым выразам твару.
— Надзя, мілая, ты кпіш зь мяне. Вы ўсе трошкі кпіце з паджылага чалавека, прыдатнага ўжо толькі на распалку.
— Я не хачу гаварыць.
— Ты мусіш з мной гаварыць, гэта твой абавязак. Ты павінна мяне заглушаць, аглушаць, зьнячульваць.
Я зь зьдзіўленьнем заўважыў, што гэтыя пышныя валасы, як чапец з чыстага золата, — што гэтыя валасы лёгенька дрыжаць, а яна хавае твар у іх гушчары.
— Не, Надзю, так няможна. Чаму ты плачаш?
Я абняў яе, прыцягнуў да сябе.
— Сама ня ведаю, — усхліпнула яна. — Я такая засмучаная.
Я пацалаваў яе ў шчаку, дзе бег цурок сьлёз.
— Я кахаю цябе. Я пакахаў цябе за гадзіну, на прасторы цэлай эпохі, апошняй эры маёй зямной бясконцасьці. Верыш?
Яна паслухмяна хітнула галавой. Я адчуваў яе гарачы цяжар у сваіх руках. Так было шмат разоў. Як шмат было начэй, заранак, надвячоркаў. Але цяпер мне здавалася, што я трымаю цела, блаславёнае найвышэйшай сілай, магічнае цела кабеты, якое сьніш цэлае жыцьцё.

Цела дзявочае й жаночае, цела-прыгода, цела-прытулак. Мяне проста першы раз агарнула нейкая пранізьлівая жарсьць за маладой кабетай, зьяднанай з мной сястрынскім, а можа, толькі спагадным абдымкам.

Адным словам, мяне абняў няведамы мне дагэтуль настрой чуласьці і трывогі, шчасьлівай палёгкі і нядобрых прачуваньняў. Узмацнялася музыка духавога аркестру за акном, і ўва мне расла хаатычная пажада. А яна ўсё мацней тулілася да мяне, быццам хацела прыціснуць да празрыстай сьцяны няўхільнага.
Таму я пашукаў яе ў гэтай рызе, і знайшоў нечакана махрыстыя прасьветы, і пераканаўся, што яна голая пад гэтым пончам.
Я хацеў уцямна нешта падумаць наконт гэтага, але ня здолеў, бо ўбачыў перад сабой ладныя ўзгоркі яе грудзей, і мне здалося, што першы раз у жыцьці я бачу пекныя жаночыя грудзі, і мяне гэта страшэнна ўразіла, і з заспакаяльнай асалодай я паклаў галаву ў цяністай цясьніне паміж тымі грудзьмі.
Недзе там, за маёй галавой, калаціласа цьмяная сьведамасьць удзелу ў магічным абрадзе, і тая мітусьня, тое зацьменьне, тая гарачка, якая заўжды суправаджае мяне ў гэтыя грэшныя хвіліны, увесь двухзначны анімалізм зьнік у мэлёдыі нашых бязладных шэптаў і пацалункаў.
Пасьля я хацеў увайсьці ў яе і ня мог. Шакаваны, я змагаўся зь яе супрацівам, але гэта ня быў яе супраціў, бо яна мяне хацела, гэта быў супраціў яе бязгрэшнасьці. Урэшце я ўнурыўся ў цёплую, хвалёўную цемрадзь.
— О Божа, — шапнула яна.
І тут пранізьліва зазваніў тэлефон над нашымі галовамі. А мне падалося, што зарагатаў адбойны малаток. Ён стаяў на падваконьні, па-здрадніцку схаваны, і крычаў да нас з усёй сваёй мэханічнай моцы.
Я замёр, яна таксама аціхла. Званок хрыпеў па-над намі настойліва, пакрыўджана, дакорліва.
— Вазьмеце слухаўку! — крыкнуў хворы з другога пакою.
Я падняўся, накрыў яе той рызай, а яна захіліла твар рукой, такой дзіўна прыгожай, якой я ніколі дагэтуль ня бачыў.
Запраўды, згнутая ў локці рука маладой жанчыны ў тое імгненьне падалася мне нейкаю хваравітаю дасканаласьцю. Не адрываючы вачэй ад тых дзівосных авалаў, апраўленых у празрыстыя залацістыя цені, я падняў цяжкую, нібы вясло, слухаўку. А валасы Надзежды, чырванаватыя, неверагодна жывыя і пажадлівыя валасы, рассыпаліся па грубай шэрай коўдры гэтага бальнічнага ці турэмнага ложка.

— Алё! — сказаў я хрыпла.
— Гэта Галіна. Усё ў парадку. Толькі якую вы хочаце каністру? Бо ёсьць выбар. Чырвоную, жоўтую, блакітную?
— Каністру?
— Вы ведаеце для чаго. Дык якога колеру?
— Гэта мае значэньне?
— Ня ведаю. Можа мець. Я падумала, трэба запытацца.
— Добра. Хай будзе блакітная.
— Тады бывайце. Я зараз буду.
Па небе зноў плылі хмары, набрынялыя навальнічнаю чарнатой. Мой аркестар няведама калі змоўк. Пад акном маршавала групка зь некалькіх чалавек, скандуючы няроўнымі галасамі:
— Польшча, Польша!
Яны несьлі пакамечаны транспарант зь літарамі, якія складалі лёзунг: “Хай жыве 22 ліпеня 1999 году!”. Я паклаў слухаўку на відэльцы.
Надзежда раптам устала і, не зірнуўшы ў мой бок, як люнатычка, выйшла з пакою. Трохі ачмурэлы, я глядзеў у серабрыстую патрэсканую шыбу. Убачыў рэшткі той сібірскай наліўкі ў маёй ці Надзеждзінай чарцы. Машынальна паднёс яе да вуснаў, выпіў горка-салодкі зярністы асадак. Я намагаўся апанаваць хаатычныя думкі, знайсьці рацыянальны пачатак у гэтай дзіўнай сытуацыі.
Унізе каля разьбітага вулічнага ліхтара стаяў той хлопец з правінцыі і бавіўся з жоўта-чырвоным кляновым лісьцем. Ён чакаў мяне.
Найлепей было б выйсьці адсюль крадком і дачакацца Галіны на сходах. Але як гэта зрабіць? Пакой меў толькі адныя дзьверы, за якімі былі мая нязбытная Надзея і гэты спаралізаваны стары, які бянтэжыў мяне больш за ўсё. Я лучыў у пастку, як казалі даўнейшыя літаратары. У пастку ўласнай легкадумнасьці. У пастку чараў расейскай дзяўчыны з раскосымі вачыма. І пахмельле мяне трасе, гэтае зароблена ўчора пахмельле.
Дзьверы з трэскам адчыніліся. Увайшла Надзежда, трымаючы ў абедзьвюх далонях шклянкі з гарбатай. Яна ўсьміхалася, як быццам зусім нічога не адбылося, хоць у яе раскосых вачох яшчэ стаялі рэшткі сьлёз.
— Хочаш чаю? — спыталася яна сваім звычайным, гэта значыць

надзіва нізкім голасам.
Я моўчкі ўзяў сваю шклянку. Прастакутнік сонечнага сьвятла ўжо пачынаў караскацца на сьцяну насупраць. Ізноў недзе гралі аркестры, але сярод іх не было нашага, таго, што граў “Сопкі Манчжурыі”.
— Галіна ўжо ідзе, — паведаміла Надзея.
— Ты на мяне злуеш? — спытаўся я няпэўна.
— Можа, і злую, — сказала яна, а пасьля дадала пасьпешліва.
— Злуюся, што наагул цябе спаткала.
Я глядзеў на яе зь цяжкім сэрцам. Яна адкінула на сьпіну цяжкі вэлюм чырвоных валасоў і задумліва піла моцную гарачую гарбату, утаропіўшыся ў затуманеную шклянку.
— Надзею, ты не звар’яцела? — азваўся я ўрэшце.
— Чаму? Ты пра што?
Зьбянтэжаны, я таксама ўтаропіўся ў сваю шклянку.
— Ты ведаеш, пра што я. Я — чалавек прахадны. Заўтра ўжо буду вельмі далёка. Чаму ты гэта зрабіла? Чаму згадзілася?
— Мо таму.
— Як ты наагул захавалася ў гэтым сёньняшнім сьвеце?
— Бачыш, я — руская барышня, — засьмяялася яна і паварушыла лыжачкай гарбату, у якой ужо не было цукру.
— Даўней я б сказаў: як шкада, дзяўчо, што мы не спаткаліся раней.
— Але цяпер ужо ведаеш, што спаткаліся, калі было трэба.
— Нічога ня ведаю, Надзю. У мяне гудзе ў галаве, і я думаю, што гэта ўсё няпраўда. Проста прысьніў вельмі рэалістычна.
— Сёньня ўжо ніхто ня верыць у сны. Сны — гэта сьмецьце благога дня. Сны — графаманскія, не напісаныя вершы.
— Ты ўсё лепей гаворыш па-польску.
— Калі хачу, то вельмі добра гавару па-польску.
— Я гэтулькі хацеў бы табе сказаць. Калі б не засаромеўся і калі б быў час на гэта.
— Я ведаю ўсё, што ты хочаш сказаць.
— Так добра мяне ведаеш?
— Наагул ня ведаю. Сёньня ўбачыла цябе першы раз у жыцьці.
— Ты казала, што чытаеш мае творы.
— Я так казала? Усе палякі і ўсе расейцы пішуць. Я магла так сказаць, але ня мела ўяўленьня, што ты пішаш.
— Надзю, што гэта значыць?
— Гэта значыць, што я закахалася ў цябе за чвэрць гадзіны, як і

ты ў мяне.
— Жартуеш, а расейцы, здаецца, ня любяць жартаў.
— Ёсьць яшчэ колькі сэкунд для рашэньня. Ты маеш адвагу ўцячы?
— Ня збавіўшы сьвет ад няволі?
— Мы будзем вольныя.
— Я ўжо вольны.
— Вось і я стану вольнай. Два чалавекі — пачатак грамадзтва.
У глыбіні кватэры грукнулі дзьверы. Надзя адставіла пустую чарку, падышла да мяне. Паглядзела ў мае вочы сваімі вялізнымі зрынамі, якія ўсё-такі былі зялёныя, як старыя вінныя пляшкі.
Раптам яна абняла мяне.
— Ну што, мілы, што?
— Думаеш, мы былі прызначаныя адно аднаму, хоць разьмінуліся на колькі дзясяткаў гадоў?
— Мы і ёсьць прызначаныя адно аднаму.
— Але якім чынам, дзіця?
— У нас напарадзе яшчэ сем гадзін. Сем гадзін вечнасьці. Добры благі выраз.
Яна пяшчотна пацалавала мяне ў вусны.
— Там добра.
— Дзе?
— Там. Ну, ведаеш. Я там была.
— Што ты зноў кажаш?
— Замерзла ў тайзе, але мяне выратавалі. Колькі хвілін, а мне падалося, што цэлае жыцьцё.
— Надзю.
— Што, мілы?
— Яшчэ нічога ня ведама. Усё ў маіх, усё ў тваіх руках.
— Мы ўжо ня здолеем уцячы. Прасалапячылі апошні момант.
Мы пацалаваліся салёнымі вуснамі.
— Хочаш, я пайду з табой на вогнішча.
Але ў гэты момант пастукалі ў дзьверы. Мы адступілі адно ад аднаго. Увайшла Галя з блакітнай плястыкавай каністрай у руцэ. Зьняла барэт, пачала старанна абтрасаць яго аб ручку крэсла.
— Ізноў дождж ідзе? — спытаўся я, каб нешта сказаць.
— Нават поры году размыліся, — сказала яна. — Усё разам: сьнег, сонца, віхура, дождж. Найлепшае імпартовае гаручае, з

Новай Зэляндыі. Запалкі купім у валютнай краме і пасьля прынясём. Надзя патлумачыла дэталі?
— Так, патлумачыла.
— Можа, у вас ёсьць пытаньні альбо сумневы?
— Я ня ведаю, што мне рабіць з сабой.
— Дык я ж вам дала брашуры.
— Так. Але ня ведаю, што рабіць да восьмай вечара.
— Я таксама ня ведаю. Можа, хочаце разьвітацца зь сябрамі, з горадам.
— Гэта ня мой горад.
— Найлепей выпіць парашок і заснуць. Мы вас пабудзім.
— Дзякуй, я сам дам сабе рады.
— Надзежда, што так стаіш і ў акно глядзіш?
— Задумалася.
Я ўзяў у руку блакітную каністру. Нішто сабе важыў гэты мой падручны багаж у далёкае падарожжа.
— Ну, пайду, — асьцярожна сказаў я.
— Вы будзеце пад нашай апекай. Калі ласка, нічога ня бойцеся. І дакладна а восьмай перад Заляй Кангрэсаў. Мы таксама туды прыедзем.
Я адкланяўся, а бэнзын у пластыкавай пасудзіне гнюсна забулькатаў. Надзя стаяла тварам да акна. Зь яе валасоў імжыла лагодная чырвань, як з пагарэлага вугольля ў печы ўзімку. Я выйшаў у другі пакой.
— Адыходзіце? — спытаўся хворы.
— Так. Ужо пара.
— А я застаюся. Забыўся на мяне Госпад Бог. Я пражыў свой час і сваю легенду. Гэта найбольшая пакута, а я ведаю, што гэта — пакуты. Я вам зайздрошчу.
— Цяпер успамінаю, што калісьці чуў пра вас.
— Маглі чуць. Мае ўспаміны перакладзеныя на трынаццаць моваў. А ў Польшчы імі гандлявалі на чорным рынку. Пасьля прайшлі колькі пакаленьняў і забыліся. Ніхто ўжо ня помніць. Я весела забулькатаў сваёй блакітнай каністрай.
— Пра мяне таксама забудуцца.
— Крый Божа. Думаеце, што мы сьведкі пагібелі нацыі?
— Ніхто гэтага ня ведае. Гэта ўзьнёсла і страшна, што ніхто ня ведае, што азначаюць яе жэсты, учынкі, шаленствы. Мы засмучаемся ад сьмерці нацыяў, а тым часам уся галяктыка ляціць у бездань нябыту. Ізноў град. Што за восень?!

— Па-мойму, яшчэ лета. Не люблю я, ведаеце, прыглядацца да плянэтарных сыстэмаў. Пакуль мы на зямлі, трымаймася за яе кіпцюрамі. Я магу так казаць, бо я трымаюся адным зламаным кіпцікам.
— Значыць, бласлаўляеце мяне на дарогу? — я стукнуў у шурпаты бок каністры.
— Ня варта так далей жыць, — сказаў ён і заплюшчыў павекі. Нягледзячы на белую бараду і пасівелыя валасы, ён выглядаў надзіва молада.
— Ведаеце што. У мяне адчуваньне, што шмат людзей па ўсім сьвеце купляюць бэнзын і шукаюць каністры, як я. Бо ў мяне надзвычайны інстынкт насьледаваньня. Калі я што калі рабіў, выходзіла, што і ўсе гэта зрабілі. Я заставаўся пасярэдзіне. У самай статыстычна сярэдняй сярэдзіне. Так мне не шанцуе ў жыцьці.
— Калі вы ня можаце быць першым, дык будзьце апошнім. Гэта таксама добрая пазыцыя.
Я прыглядаўся да яго без сымпатыі. Я ведаў, што ён таксама назірае за мной праз шчыліны ў павеках. Можа, яго тут паклалі, каб і ён мяне падапхнуў пальцам да майго наканаваньня? Можа, ён ляжыць пад гэтай пакамечанай коўдрай у параднай кашулі і ў сьвяточных нагавіцах, гатовы адразу пасьля майго адыходу паскакаць на ўрачысты банкецік? У тэлевізары ўсё яшчэ паказвалі зьезд. Савецкі сакратар з урачыстай мінай перадаў нейкі штандар ці сьцяг нашаму сакратару, які ўкленчыў і прыніжана пацалаваў край вышыванай матэрыі. У залі — а цяпер паказалі яе — адразу пляснулі ў ладкі. Усе зырваліся зь месцаў, віталі гэтую падзею воплескамі, некаторыя ўзьнялі далоні і нешта крычалі ў экстазе. Але што крычалі, я ня ведаў, бо і ў гэтым доме падчас урачыстых трансьляцыяў паводле старой звычкі адмыкалі гук у тэлевізары.
Сівы чалавек, жывая рэліквія альбо звыклы вэрбоўшчык, гэты сівы чалавек узьняў правую руку ў жэсьце разьвітаньня ці бласлаўленьня.
— Ну, так, — кінуў я і пайшоў.
На сходах я агледзеў судзіну з агняным бальзамам. Літраў пяць яна зьмяшчала. Паспрабаваў адкруціць закрутку. Усё спраўна. Блакітны колер — колер нявіннасьці. Нявіннасьць ня кідаецца ў вочы. Можна йсьці, трэба йсьці. Куды? Па дарозе ўбачым.

На пляцоўцы паміж паверхамі я адламаў кавалак шыбы. Зь няведамай прычыны на шкле была сажа. Я паглядзеў празь яго ў неба, дзе зноў зіхацелі хапатлівыя водбліскі сонца. Але ў гэтыя часы ніхто ўжо не назіраў зацьменьняў сонца і месяца. Збрыдзелі даты і тэрміны людзям ва ўсіх гэтых міждзяржаўных і вайсковых блёках. І я нічога цікавага ня ўбачыў на стомленым небе, зманым кліматычнымі анамаліямі, таму скіраваў пагляд на сьцяну, але і там знайшоў толькі здаўна добра ведамыя антыдзяржаўныя напісы, якіх дзяржава ўжо ня мела моцы сьціраць і замалёўваць.
Я спусьціўся ўніз і там у сенцах сутыкнуўся з Сахерам, гэтым сівым рэвалюцыянэрам з фанатычнымі вачыма. Ён вяртаўся з чэргаў і нёс нейкую здабычу, бо ягоная старая торба надзьмулася, як сыты пітон.
— Я вас аднекуль ведаю, праўда? — затрымаўся Сахер, загароджваючы ўваходныя дзьверы.
— Так, вы мяне ведаеце. Мы спатыкаліся толькі аднойчы, але пры драматычных абставінах.
— Я ўручаў вам ордэн, прэмію ці прызначаў на пасаду?
— Не. Вы выкідалі мяне з партыі.
Ён усьміхнуўся, прыгасіўшы халодныя водбліскі фанатызму ў вачох. Фанатызму неактуальнага, як забыты шнар.
— Я нікога не выкідаў з партыі. Вы памыляецеся.
— Аднаго разу выкідалі. Групу прыхільнікаў прафэсара марксізму.
— А, во каго. За што гэта мы яго?
— Гэта няважна. Важна, што я не трымаю на вас крыўды.
— Мы павінны былі так зрабіць. Гэта было слушна на тым этапе. Потым надышла сумятня. Але тады я шчэ мог уратаваць краіну.
— Што цяпер парабляеце?
— Дзякуй за пытаньне. Я вярнуўся да філязофіі. А калі канкрэтней, дык да гісторыі філязофскіх дактрынаў. Вярнуўся на сваё месца. Я вольны. Нарэшце вольны.
— Вы таксама вольны?
— А што, вы таксама?
— Ясна. Усё часьцей спатыкаю вольных людзей.
— Бо вольным сапраўды можна быць толькі ў няволі. Перапрашаю за банальнасьць, малады чалавек. Вы любіце прахаджацца?

— Напэўна, люблю.
— Шпацыруйце. Шмат. Ня менш за дзесяць кілямэтраў. Тады найлепей думаецца. Назірайце за прыродай, паводзінамі людзей, а нават за небам. На небе таксама адбываецца рух. У простым і пераносным сэнсе. А рух, малады чалавек, калі зьвярнуцца да клясычных філёзафаў... Мо я на вас нуду наганяю?
— А вы шчасьлівы? Не шкада вам улады, беспакаранасьці, зьвязанай з панаваньнем над людзьмі, славы, роўнай славе боскай?
Сахер шчыра расьсьмяяўся, выцягнуў надзвычай чыстую насоўку, каб выцерці вочы.
— Я філёзаф. А філёзаф здольны дараваць і сабе, і блізкім.
— Што дараваць?
— Што ня вытрымалі іспыту. Гэта наш першародны грэх.
— Ведаеце, я дакладна помню вечар, калі, абмацаныя дзясяткамі агентаў, прасьветленыя рэнтгенаўскімі апаратамі, абнюханыя нагляднікамі, мы трапілі ў сьвяцілішча партыі, дзе засядала Палітбюро. Помню вакол круглага стала ўсе гэтыя фізіяноміі, пошлыя выявы якіх я звычайна бачыў на сьценах устаноў. Гэта былі нашы судзьдзі.
— Але ж вы ня маеце крыўды.
— Натуральна. Ваш жэст у мой бок і словы “Вывесьці з радоў партыі” вярнулі мне свабоду.
— Я таксама перажыў гэта празь дзесяць зь нечым гадоў. Ці ў сярэдзіне слуханьняў абвяшчалі перапынак на вячэру?
— Так, вы ўсталі і сказалі неафіцыйным, людзкім голасам: “Час, таварышы, чаго зьесьці”.
— На маёй справе таксама нехта казаў гэта тымі самымі словамі. А якое ў вас было мэню?
— Не ў мяне, а акурат у вас. Мы прайшлі ў другую залю, дзе на сталох, аздобленых кветкамі, стаялі ў ікебанах паляндвіцы, асятры, кумпякі, можа, нават ікра. Мы папівалі імпэрыялістычныя сокі. Разам чмякалі ахвяры й каты, крадком выціралі маянэз з бародаў, разрывалі на долькі сакаўныя апэльсыны, хоць у горадзе справы ішлі няважна, не ставала нават лімонаў для хворых на грып.
— Бач, такі самы набор быў на маёй справе. Хоць ікры ня помню. Можа, гэта й ёсьць той самы сацыялістычны гуманізм, якога ані Вы, малады чалавек, ані я ня ўмелі разгледзець. Дык

што, мы квіты?
— Усё адно, — я зірнуў на сваю каністру, па якой поўз павук.
— Шмат шпацыруйце. Вось мая вам парада. Я лячу дадому, да тэлевізара, бо сёньня па абедзе “Зьвярынец”, мая ўлюбёная перадача, і мае сябры-зьвераняты, што ў ёй выступаюць.
— Не пабачыце Вы свайго бязгрэшнага “Зьвярынцу”. Бо сёньня зьезд партыі. Ад ранку да ночы. У тэлевізіі, у газэтах, у кіно. У кожным доме.
— Божа мой, Вы мяне засмуцілі. Не дык не, пайду на шпацыр. Хай Вам шчасьціць у жыцьці, малады чалавек.
І зноў запаліў свае смалістыя вочы, як кот, што ўступае ў цямрэчу, і з вохканьнем пасунуўся ўгару па вышчарбленых сходах.
Я выйшаў на вуліцу. Нейкая жанчына на добрым падпітку пхала перад сабой вазок зь дзіцем. Для разнастайнасьці адпускала ручку вазка, пасьля даганяла яго, прыкідваючыся, быццам хоча ўбрыкнуць брызэнтавы кодаўб. Яе моцна зносіла ў бок дарогі, засыпанай шматкамі каляровай паперы і адарваных ад транспарантаў літараў.
У гэты момант я раптам убачыў, як з мосту Панятоўскага вырваўся вялікі клуб пылу і сярэдні пралёт, нібы магутны ліфт, велічна асунуўся ў ваду, якая забурліла на нейкае імгненьне. Адно цяпер я пачуў водгук глухога ўдару. Дробныя фігуркі людзей разьбягаліся з рэштак мосту на ўсе бакі.
— Во падла, — з захапленьнем выгукнула нецьвярозая баба. — Во задыміла! Сьпі, маленькі, сьпі, — яна пагушкала дзіця ў вазку. — Першы раз такое бачу.
— Я таксама. Дамы ў мяне на вачох валіліся, але масты — ніколі, — далікатна сказаў я. — Пэўна, дэманстранты йшлі ў нагу.
— Нічога, яшчэ пара мастоў засталася. А што ў Вас у тым збаночку?
— Бэнзын.
— Шкада. Нешта мяне сушыць. Аўтаматы ня робяць, бо газу не прывезьлі. Сьпі, маленькі, сьпі, а то дам плескача.
І лагоднымі зыгзагамі яна пашыбавала ў бок Віслы, дзе пасярэдзіне плыў лёзунг, складзены зь вянкоў і запаленых сьвечак: “Мы збудавалі сацыялізм!” Але канец лёзунгу ўжо быў зьнявечаны, бо трапіў у зону катастрофы пад мостам. Дзьве апошнія літары, моцна пашкоджаныя, адплылі да

супрацьлеглых берагоў. Клічнік тануў, захоплены вірамі.
— А можа, мяне ўтварылі, як аблачыну касьмічнага пылу, вашыя мары, пакуты, смуткі, нягоды.
Я рэзка павярнуўся. Хлопец з правінцыі стаяў перада мной з кляновым лістом у руцэ і нясьмела ўсьміхаўся.
— Што гэта? — спытаўся я.
— Вашыя тэксты. Я ведаю іх на памяць.
— Скуль ты тут узяўся?
— Прыехаў з Старагарду.
— Да мяне прыехаў?
— Так, да Вас. Толькі ня меў сьмеласьці прыйсьці дадому. Частуйцеся, калі ласка, — ён працягнуў мне адкрыты жаўнерскі рэчмяшок, поўны райскіх яблычак. — З нашага саду.
Я ўкусіў салодкі сакаўны плод, нязнаны ці, хутчэй, забыты ў нашай краіне.
— Ты, мусіць, пішаш вершы.
— Не, прозу.
— Але я табе ўжо не дапамагу. Я адышоў ад спраў.
— Мне ня трэба дапамогі. Я толькі хацеў пазнаёміцца з Вамі. Мы чытаем Вас вечарамі. Усёй сям'ёй. Тата казаў, што Вы ў маленстве былі знаёмыя.
— А як цябе зваць?
— Скурка. Тадэй Скурка.
— Ня помню. Можа быць. І чаго ты ад мяне хочаш?
— Нічога. Дазвольце, я буду хадзіць разам з Вамі.
— Благі дзень ты выбраў.
— Я ведаю. Дазвольце. Увечары паеду.
Я крытычна прыглядаўся да гэтага Тадэя з Старагарду, і ў маёй зморанай душы не запішчала фанабэрыя, ня ёкнула пыха, бо я быў стары верабей. Я ўжо добра ведаў гэтых здольных, далікатных, пачцівых хлапчукоў, што хутка выраставалі ў прадажных брутальных хамаў.
— Я панясу Ваш бітон.
— Калі хочаш, можаш несьці. Але няўдала ты, Тадэю, выбраў. Я магу даць табе адрасы важнейшых творцаў, якія табе будуць больш карысныя.
— Дазвольце, калі ласка. Прашу Вас. Гэта для мяне вельмі важна.
І ён адвярнуўся і выцер крадком сьлязу. Але я быў непадкупны. Толькі стаў асьцераж нейшы. Калі хоча, няхай ідзе. Але мяне ён

не разьмякчыць. У гэтыя часы ніхто ўжо не чытае кніжак, як іх чыталі сто гадоў таму. На маіх вачох з аднолькавым захапленьнем гарталі агітацыйныя брашуркі, выдадзеныя рэжымам, і Пруста, амэрыканскае забаўляльнае чытво і Джойса. Гэтыя кілбасы, напханыя чорнымі літарамі, паглыналіся і адразу ж выпаражняліся. Ніхто не страляў сабе ў галаву з нагоды сумнага заканчэньня раману. Наагул ніхто ўжо ня помніў яго на наступны дзень. А гэты тут сыпле цытатамі, якія могуць быць маімі, але могуць таксама быць уласнасьцю ўсякага іншага пісакі.
Бразнула шыба, нехта адчыняў акно.
— Пачакайце! Пачакайце! — гукаў нехта за маёй сьпінай.
Я абярнуўся і ўбачыў Галю, якая высоўвалася праз збуцьвелае падваконьне.
— Пачакайце, калі ласка! Я ўжо спускаюся да Вас!
Мо перадумалі, падумаў я. І раптам мне стала шкада. Шкада гэтага гаручага, шкада маіх нэрваў і шкада нагоды. Я ўжо крышку прызвычаіўся. І якраз час адпаведны. Надыходзяць зімовыя дні, страшныя, чорныя і кароткія дні, перамяшаныя зь яшчэ чарнейшымі, бясконца доўгімі начамі.
А мой абанэмэнт на жыцьцё ўжо даўно вычарпаўся. Я жыву звыш ліміту. Усіх раздражняю, пана Бога таксама.
— Дайце мне бітон, — ціха сказаў Тадэй.
— Трымай, але глядзі, не разьлі, — сказаў я няўпэўнена.
Здамо яго назад у краму. Мо грошы вернуць. Яшчэ хвіліну таму гэта была жахлівая, сьмяртэльная вадкасьць. Цяпер яна падавалася мне не страшнейшай за скіслы ліманад.
Галя выбегла з дому, пасьпешліва нацягваючы зялёны швэдар, які помніў яшчэ вялікую вайну. Да яе прычапіўся нейкі сабачка, бег, быццам бы хацеў схапіць зубамі за лытку, і пранізьліва зьвягаў.
— Губэрту стала блага, — сказала яна задыхана.
— Дзе?
— У кінатэатры “Волга”.
— Зь ім ужо быў прыпадак сёньня ўраньні.
— Ён памірае. Стуль званілі. Трэба пасьпець.
І пабегла бегма ў бок Віслы. Зноў паказалася сонца, як быццам, добра падумаўшы, надыходзіла вясна. У горадзе папісквалі аркестры, гуло таксама, будзячы дзіўнае водгульле, нізкае булькатаньне гучнагаварыльнікаў, нібы магутны голас Бога ў

дзень страшнага суду. Сабачка да нас прычапіўся як смала. Адразу выбраў сабе ў прыяцелі Тадэя.
Але нас спыніў сьвісток міліцыянта. Так, два зусім маладыя міліцыянты на мігі клікалі мяне да сябе.
— Дам нагой у жывот, — сказаў я. — Хай будзе што будзе.
— Нельга паддавацца на правакацыі, — засіпела Галя. — Я Вам забараняю. Я адказваю за акцыю.
— Гэтым разам дам у лыч. Мне ўсё адно.
— Я забараняю вам, — дыхала Галіна.
Яны ня зрушыліся зь месца. Стаялі, чакаючы мяне. Я пайшоў да іх правакацыйна ляным крокам, разглядаючы флярэнтыйскае неба над Варшавай. Наўмысна зашпіліў апошні гузік у куртцы, каб яны бачылі, што я не зьбіраюся шукаць пашпарт.
Але яны ветліва аддалі мне чэсьць, і адзін зь іх сказаў, заікаючыся:
— Праб-бачце, кал-лі ласка, як трапіць на-на плошчу Парадаў?
— Ідзеце проста наперад. На гэты спуск і пасьля далей проста, аж да пляцу. Што гэта вы гораду ня ведаеце? — сказаў я дзёрзка. — Чаго вас там вучаць у гэтых школах?
Бо мільгнула ў мяне думка, што калі б мяне арыштавалі, то праблема зьнялася б сама сабою. Гэта таксама выйсьце. Нават у пэўным сэнсе ганаровае.
Але міліцыянты, замест таго каб адшпіліць ад пасаў мэтровыя дручкі, уведзеныя з нагоды нейкае гадавіны, зьбянтэжыліся яшчэ больш, а заіка зьняў шапку і пачціва, пакорліва, павясковаму пакланіўся мне.
— Мы нетутэйшыя. Ве-вельмі выбачаемся і дзякуем.
— Добра, глядзеце мне, — сказаў я, вяртаючыся да Галіны, якая нэрвова сьціскала пальцы.

Мы беглі пад гару па нейкай старой брукаванай вулцы, якая шмат гадоў зарастала агрэсіўнай травой, называнай у маёй старонцы мацаўніком. Галя выбілася наперад. Я бачыў яе босыя ногі, непрыгожыя, захудыя, парослыя кароткім, колкім валосьсем. Яна паходзіла з гэтых апошніх, слабых фізычна пакаленьняў. Усе яны былі малыя, худыя, зарослыя. Але толькі ў іх тлеў супраціў уладзе, якая зь цягам часу таксама пабрыдчэла, але ў іншы бок, гэта значыць растаўсьцела, разраслася ўшыркі, збабілася. І вось, бегучы за Галяй, я зь зьдзіўленьнем усьведаміў, што яна таксама саміца, але саміца

як бы іншага роду, якая з мной не суадносіцца. Раз-пораз яна азіралася на нас, і я бачыў яе твар, уласна кажучы, нішто сабе. Можа, хто іншы, зь яе роду, угледзеў бы ў ім гатычныя рысы, можа, бізантыйскія. Але для мяне яна была чужая, як чужым было ўсё яе племя, можа быць, племя першых хрысьціян у падупалым Рыме камунізму.
І раптам я пачуўся старым, але сьведамасьць гэтага зусім ня выклікала прыкрасьці. Мой сьвет быў зырчэйшы, сьвет з гіерархіяй, сьвет грамадзкай несправядлівасьці, сьвет крывавай барацьбы за існаваньне. І мая барацьба была іншай, і мая бязьдзейнасьць была іншай. І падзеньні як бы глыбейшыя, і ўзьлёты як бы вышэйшыя. Ведаю, што гэта самаадчуваньне пакаленьня, якое адходзіць у нябыт. Ведаю, што сучаснасьць прымусіць іх да нікчэмнасьці і да велічы, відаць, такіх самых, як нашыя, хоць і прыстасаваных да вымераў будучыні. Але, клянуся Богам, мне шкада іх, а сябе не шкада.
Урэшце мы дабраліся да кіно “Волга”, якое ў мае часы называлася яшчэ “Адхон”. На фасадзе вышчарбленая нэонавая рэкляма анансавала савецкую музычна-сатырычную камэдыю “Сьветлая будучыня”, але я ведаў, што пад гэтай шыльдай цяпер ідзе прэм’ера айчыннага фільму пад назвай “Пераліваньне” рэжысэра Ўладзіслава Булата. Апошнімі гадамі склалася такая практыка, што польскія фільмы, за якія рэжым зь нейкіх прычынаў саромеўся перад Масквой, — што такія фільмы пускалі цішком за шырмаю савецкае карціны. Такім спосабам яны йшлі ў многіх кінатэатрах пры аншлягу, а рэжысэры, шанаваныя рэжымам, замежжам і мясцовай апазыцыяй, знарок стараліся дабіцца такой формы пракату. За гэта нават давалі хабар.
Мой тэстамэнт. Мая апошняя воля. Складаны дакумэнт, бо няма спадчыны, няма чаго пакінуць. Я нічога не зрабіў і нічога не здабыў. Нават памяткі і падарункі ў мяне не затрымліваліся. Ніякіх цікавых лістоў ад выбітных людзей. Ніякіх сувэніраў з падарожжаў, ніякіх сьлядоў літаратурнае вэгетацыі. Адзіную матэрыяльную даброту, калі гэта можна так назваць, — мой труп — з ахвотаю адпісваю празэктарскай Мэдычнай акадэміі для практыкаваньняў маладых хірургаў.
Але ж сорам адыходзіць, нічога не пакідаючы. Нешта трэба адпісаць жывым, каб была хоць найменшая карысьць з майго жыцьця, з майго кароткага пабыту на зямлі, дзе я займаў месца

іншых, дзе я адбіраў смачныя кавалкі з рота блізкіх, дзе я часам псаваў кроў сучасьнікам.
Я ў думках корпаюся ў той пары шуфлядаў, у якіх тояцца мае духовыя й матэрыяльныя здабыткі. Некалькі старых фатаграфіяў, трохі непатрэбных дакумэнтаў, засохлыя асадкі, няспраўнае пяро, якое калісьці прыносіла шчасьце, а пасьля перастала прыносіць. Запінкі да манжэтаў, атрыманыя на нейкія мяніны, лямпачкі няведама да чаго, нечая магістарская праца пра мяне, калі я кароткі час быў модны, нейкі з расьсеянасьці ня зьнішчаны ліст з камплімэнтамі ад непрыемнай мне асобы, пратэрмінаваная таблетка ад павышанай кісьліннасьці, крышыва тытуню, падпаліны ад забытых цыгарэтаў.
Адылі ёсьць нешта, што з пэўнай нясьмеласьцю я мог бы ахвяраваць нашчадкам. Гэта два старыя, шмат карыстаныя рэцэпты, дзьве ружовыя стужкі паперы зь нямодным дапатопным надпісам. Мне іх некалі выпісаў, ужо ня помню калі, мой прыяцель-лекар, які даўно паехаў з краіны, згінуў бязь вестак, выпаў з нашага жыцьця. Гэтыя два рэцэпты выпісаныя для благой, сорамнай немачы. І таму я кажу пра іх з пэўным жалем. Але я ведаю ўсё-такі, што гэтая паскудная, непрыемная, нешляхетная загана толькі дадае клопату. А людзі далікатныя не насьмельваюцца шукаць рады і гадамі змагаюцца з гэткім несымпатычным калецтвам. Таму, ня могучы шмат, хачу быць, на ўзор маіх настаўнікаў, карысным у малым.
Беручыся за справу, адпісваю сваім бедным нашчадкам, што церпяць на пархі, выпрабаваны сродак, які вызваліць іх ад комплексаў, хоць на кароткі час зробіць іх шчасьлівымі.
Вось рэцэпт мазі:
Ac. Salicyl. 2,0
Liq. carb. deterg. Sulfuri ppt. aa. 4,0
Ol. Ricini 6,0
Aelops suille ad 40,0
А вось рэцэпт мікстуры:
Ac. Salicylici 2,0
Ac. biborici 2,0
T-rae chinae 5,0
Ol. Ricini 1,5
Spir. vini 70 ° ad 100,0

Сьпярша пра мазь. Гэтую мазь належыць уцерці ў скуру галавы досыць густа і найлепей на ноч. Каб не запэцкаць падушкі, раю абвязаць галаву старым ручніком альбо папросту надзець якую пластыкавую купальную шапачку ці што падобнае. Мазь павінна заставацца на галаве ўсю ноч. Наранку, прымаючы ванну, вельмі старанна вымыйце галаву, можа, нават некалькі разоў. Зважайце на вочы. Засьцерагайце вочы ад мазі.
Такое лячэньне, нават аднаразовае, абавязкова дасьць станоўчы вынік. Каб дагледжаны стан скуры на галаве захаваўся, рэкамэндую націрaць яе раз на тыдзень другой мікстурай. Калі раптам па нейкім часе хвароба вернецца, трэба паўтарыць лячэньне мазьзю. А мікстуру рэкамэндую штотыдзень, у сярэдзіне прамежку паміж адным мыцьцём галавы і другім. Закрану тактоўна іншае агіднае недамаганьне. Вось жа, нават у найбольш высакародных, найхарашэйшых і найдухоўнейшых асобаў здараюцца гэтак званыя запоры, калі кароткія, спарадычныя, калі жахлівыя, якія вымяраюцца месяцамі. А такі ўпорысты запор, сорам сказаць, здольны зрабіць прыкрым самае ўзьнёслае жыцьцё. Таму і ў гэтай справе далікатна сьпяшаюся на дапамогу. Натуральна, мая парада ня ўсім дапаможа, але можа прынесьці палёгку шмат якім паважным людзям.
Дык вось, раю тым, хто мне давярае, наранку, пасьля абуджэньня, выпіць нашча шкляначку халоднай гатаванай вады. Дужа дапамогуць таксама спажытыя ўвечары, перад сном, сушаныя сьліўкі. У крытычныя моманты, калі ўжо дадушы жыцьцё ня мілае, трэба ў таварыскім атачэньні кульнуць гарэлкі, але зазначаю, што ня менеў за дзьвесьце грамаў, а найлепей так каля трохсот.
Калі мае рэцэпты ў асобным разе не прывядуць да належных вынікаў, што можа здарыцца, вельмі выбачаюся і ў якасьці суцяшэньня прапаную хворым надзвычай дзейсны рэцэпт посьпеху ў картачнай гульні, называнай “ачко”. Мяне гэтаму навучылі ў маленстве, і пазьней мне шмат разоў удавалася бліснуць сярод азартных гульцоў. Гэтую штучку паказаў мне перад сваёй сьмерцю нейкі народны знахар, таямнічы валацуга альбо стары цыган. Ва ўсякім разе, гэта была постаць магічная і нібыта ня з гэтага сьвету.
Падаю два спосабы, бо ў маіх мясьцінах гуляюць у два варыянты “ачка”: калодай ад дзявятак і поўнай калодай. Вось

жа, браце, калі банкуеш у гульні з калодай ад дзявятак, выберы ў два асобныя стосы ўсе карцінкі і асобна дзявяткі зь дзясяткамі. Пасьля патасуй абедзьве гэтыя купкі картаў зь бесклапотнай нахабнасьцю. Ясная рэч, нехта з гульцоў заўважыць твае маніпуляцыі, закіне табе, што ты наўмысна перакладаў карты, вось жа, запрапануй яму, каб ён сам іх патасаваў. А ён з помсьлівай усьмешкай будзе іх доўга тасаваць, часам колькі хвілін, каб зьліквідаваць вынікі тваіх маніпуляцыяў. Глядзі на гэта нібы з страхам, але будзь спакойны. Чым даўжэй ён тасуе, тым няўхільней набліжае сваю паразу. Бо амаль у кожнай разыгранцы, ці прынамсі ў статыстычнай бальшыні, твой праціўнік будзе мець так званы "перабор".
У гульні з поўнай калодай трэба раскласьці на два асобныя стосы карцінкі разам зь дзясяткамі й дзявяткамі ды рэшту ад васьмёрак уніз. Тасаваць як у папярэднім разе.
Скажу шчыра, што ня ведаю, у чым палягае гэтая штука. І ніколі не імкнуўся ўведаць гэта. Я нават уважаю, што лепш не паддавацца спакусе надмернай цікаўнасьці. Досыць таго, што гэты спосаб дзейсны.
Затое можна мець сумневы наконт таго, ці дарэчна, выказваючы апошнюю волю, выдаваць сакрэты картачных махлярстваў. Але я з пакорай мяркую, што тыя, каму ўсё жыцьцё валіць карта, толькі расьсьмяюцца з наіўных забабонаў. Затое няўдачнікі паспытаюць раз, другі майго спосабу і калі-нікалі абыграюць картачных шчасьліўцаў, прыводзячы ў часовую раўнавагу вагі Нэмэзыды.

Каля кінатэатру стаяў немалы гурт людзей, чакаючы немаведама чаго, бо сэанс ужо пачаўся. На другім баку вуліцы ў мясной краме вялізнае акно запаўняла лічба "50", укладзеная з кілбасаў. Мясная прамысловасьць сьвяткавала пяцідзесяцігодзьдзе ПНР. Але кілбасы былі бутафорскімі, зь некаторых, відаць пашкоджаных, нават сыпалася пілавіньне. Пад залаціста-крыштальнымі дзьвярыма драмала чарга бабулек. Сёньня крама была зачыненая з прычыны сьвята, пад дзьвярыма стаяў першы шэраг кліентак на заўтра. Бліжэй да вуліцы Фоксаль хісталася й пагойдвался купка нецьвярозых, што чакалі таксовак. Гэтая стаянка мела спэцыялізацыю,

абслугоўвала толькі п’яных. Сюды пад’язджалі таксісты, якія працавалі з алькаголікамі.
Так гэтыя тры купкі млява дурэлі, патанаючы ў шэрасьці вопраткі і безнадзейнасьці сьвята, да якога нікому не было справы. Нізка над дахамі ляцеў самалёт з турыстамі, што кружляў па-над горадам ва ўрачыстыя дні. Але сёньня нешта ня склалася, і срэбная, над’едзеная іржой машына пікіравала ў бок пляжу на другім баку Віслы зь яўным намерам разьбіцца на залацістым пяску шырокага берагу.
Мы ўвайшлі ў кіно разам з сабакам, які прыбіўся да нас, і з Тадэем, які валок маю каністру. А там у фае вялікі фэст, адкрыцьцё выставы карцін былога міністра культуры і сябра Цэнтральнага Камітэту. Усё сваё працавітае жыцьцё ён гнаіў мастакоў і цкаваў “звыродлівае” мастацтва, а цяпер, калі перайшоў на пэнсію, раптам пазайздросьціў сваім ахвярам і сам узяўся маляваць. Сэанс ужо пачаўся, але групкі заўзятараў музы экс-міністра яшчэ таўкліся вакол гэтых кірмашных карцінак, а на кожным падрамніку — голая дзяўчына з манерна зарэтушаванай поткай, ручкі то закладзеныя за галаву, то ўзнятыя ўгору, то падтрымліваюць вылізаны бюсьцік. І назвы, прыдуманыя падчас бяссонных міністарскіх начэй: “Мроя”, “Прадчуваньне”, “Кліч пачуцьцяў”.
Сам аўтар мітусіцца з чаркай у руцэ каля сваіх гасьцей, гальліва зіркае на нейкіх схуднелых дзевак, якія ня трапілі на сэанс. А гэтыя госьці таксама былі апаратнікамі: генэралы Службы бясьпекі, сакратары ваяводзкіх камітэтаў партыі, начальнікі аддзелаў цэнзуры, намесьнікі міністраў. Яны таксама ўжо ўвайшлі ў склад мастацкай эліты. Пішуць успаміны і дэтэктывы, малююць патрыятычныя карціны, складаюць шлягеры, лепяць бюсты памерлых калегаў. І сваіх дзяцей, тых, што не хацелі палітычнай кар’еры, уладкавалі ў мастацкія школы. Вось жа, рэжым ужо мае ўласнае мастацтва. Ён самадастатковы. Сам стварае рэчаіснасьць і сам яе адлюстроўвае ў мастацтве.
— Перапрашаю, — падыходжу я да аўтара карцінаў, — тут некаму стала блага?
Ён чула бярэ мяне пад ручку.
— Дзе там! Усё цудоўна. Дазвольце запрасіць Вас да стала. Раю вам савецкае віно з Каўказу. Мы недзе бачыліся, праўда?
— Даўнія справы. Я некалі быў вашым кліентам, пане міністар.

— Так я і думаў. Шмат людзей падыходзяць да мяне на вуліцы. Помняць і ўдзячныя мне. Магло быць горш, ці ж не? Шмат дурноты шчасьліва ўдалося ўнікнуць. Бо ведаеце, калега, я заўсёды быў перадусім чалавекам.
— Я ўжо не мастак.
— А я толькі пачынаю, — сьмяецца былы міністар. — Мяне яшчэ запомняць. Вы на мяне крыўды ня маеце?
— Барані Божа.
— Ну то вып'ем і пяройдзем на ты, мяне завуць Лютак.
— Перапрашаю, але я сьпяшаюся. Майму сябру недзе тутака стала блага.
— Гэта ня ў нас. Можа, у глядзельнай залі. Там гарачая атмасфэра. Даходны гэты Булат. Ён умее зь імі, — і паказаў пальцам угару, дзе жыве Бог і кіруе Палітычнае Бюро.
Я памкнуўся паміж пальмамі, якія паставілі некалі на цырымонію адкрыцьця дэкады савецкіх фільмаў і пасьля забыліся. Сабака старанна пільнаваўся маёй нагі.
— Пане, — зьвярнуўся я да білетэра, — я шукаю сябра, які зьнепрытомнеў.
— З мной такія нумары ня пройдуць. Заля ўжо перапоўненая. Вон з кінатэатру, а то выклічу міліцыю.
— Нам званілі, слова гонару. Гэта мой сваяк. Лік ідзе на хвіліны.
Ён завагаўся, сьвідруючы нас недаверлівым паглядам. Але, відаць, сабака зрабіў добрае ўражаньне, бо білетэр марудна рассунуў пунсовую заслону і сурова прамовіў:
— Туды, налева. Спытайцеся дырэктара. Толькі каб ніхто не ўваходзіў у залю.
З чорнай грамадзіны глядзельні густа бубнілі дыялёгі фільму. Мы на дыбачках пайшлі калідорам налева. Нейкія дзьверы былі прачыненыя, і яснае крыло сьвятла падала на падлогу.
— О Божа, — шапнула Галя.
Усярэдзіне памяшканьня на ссунутых крэслах ляжаў Губэрт, галавой на собскай чорнай торбе, якая панесла ў сьвет гэтулькі высакародных зваротаў. Рышард, зьбялелы і ўрачысты, сядзеў на кукішках пры хворым, як бы ловячы ягоныя ціхія словы.
А дырэктар кінатэатру манатонна накручваў тры дзявяткі, нумар хуткай дапамогі.
— Я знаю спэцыяльны сакрэтны нумар начальніка зьмены хуткай дапамогі, — шапнуў я, выходзячы на сярэдзіну гэтай

чыноўніцкай кельлі.
— Усе мы знаем, — буркнуў дырэктар. — Але гэты паўдурак паставіў на аўтаадказьнік: “Апарат часова не працуе. Калі ласка, тэлефануйце дзевяцьсот дзевяноста дзевяць. Дзякуем”.
— Што, Рысю? — я ўкленчыў ля ног хворага.
— Забілі яго, — урачыста сказаў Рышард.
— Хто забіў?
— Чалавеча, яны там на экране вярзуць такія рэчы, што і мне, здароваму, млосна зрабілася, — азваўся дырэктар, прывычна круцячы кружала тэлефона. — Як яны маглі гэта пусьціць?
З другога боку ўкленчыла Галя. За заслонай, на вэрнісажы, выбухнуў сьмех і адразу згас.
— Забілі яго, — паўтарыў Рышард з націскам.
Сабака абнюхваў ногі Губэрта ў старых зношаных чаравіках.
— Я не дазволю. Я зьвярнуся ў Цэнтральны Камітэт, — гучаў голас зь нябачнага экрану.
Я глядзеў на цёмную, сіваватую галаву Губэрта. Здавалася, ён драмаў. Пад павекамі раз-пораз торгаліся вочныя яблыкі. За дзень скуру прабіла чорная шчэць. Яна чорным ценем падкрэсьлівала худзіню і так ужо худых шчок. Адкуль у гэтым худым целе было гэтулькі сілы?
— Каб іх трасца, сукіных сыноў! — ціха выгукнуў дырэктар.
Губэрт вельмі павольна расплюшчыў павекі і ўбачыў мяне.
— Каторая гадзіна? — спытаўся ён ледзь чутна.
— Гэта няважна. Як ты? — сказаў я.
— Тут, — ён паказаў на грудзі, — дзірка, холадна.
Ён паволі прытомнеў. Сабака зьнячэўку заскавытаў, але ніхто яго не супакойваў. Каля галавы хворага па невідомай нітцы спускаўся павук.
— Можа, хочаш сказаць што важнае? — войкнуў Рышард.
Губэрт пазіраў на мяне балюча, з высілкам.
— Пойдзеш туды?
— Так.
— Не зламаешся?
— Я ўжо маю ўсё, што трэба.
Я паказаў вачыма на Тадэя, які дзьвюма рукамі трымаў блакітную каністру. Хлопец, нібы здагадваючыся пра сэнс нашай размовы, забулькатаў каністрай. Губэрт прыжмурыў павекі.
— Бачыш, я цябе апярэджу.

— Не. Зараз прыедзе рэанімацыя. Ты яшчэ напішаш элегію на маю сьмерць.
Ён паспрабаваў усьміхнуцца.
— А дзе Булат?
— На паказе, — умяшаўся Рышард. — Хочаш, каб ён прыйшоў?
Губэрт паказаў павекамі, што хоча. Рышард узьняўся з каленяў.
— Мы ўсе нясём адказнасьць, — выбіваўся з гукавых эфэктаў барытон актора.
— Ты любіш яго? — ціха спытаў я.
Ён ізноў паспрабаваў усьміхнуцца. Галя выцерла насоўкай танюсенькія кроплі поту з лобу хворага.
— Ты зьбярог яго ад сьмерці. Пасылаеш мяне заміж яго.
— Я шчасьлівы, што жыў падчас ягонага жыцьця, — шапянуў ён.
Я зноў адчуў прыкрасьць. Мала таго, што я горшы, дык я яшчэ й мушу адысьці на той сьвет. Ды я ўжо сышоў зь людзкіх вачэй. Даўно аддаў бяз бою рэшткі лёсу. Аднак згадалі пра мяне. Пра мяне заўжды згадваюць у благія часіны.
— Едзе машына! — трыюмфальна выгукнуў кіраўнік. — Я іх напужаў тым, што на прэм'еры сядзіць савецкі аташэ.
Галя прынесла зьнекуль шклянку вады. Зноў сыпанула градам, дробным, як соль. Мы мімаволі паглядзелі на шыбы, у якія хвастаў маразяны вецер.
— Трэба будаваць ня толькі новыя дамы, але і новую маральнасьць, — пачуўся голас зь нябачнага экрану, і яго прывіталі бурныя ўхвальныя воклічы залі, што танула ў цемры.
— Яны прыходзяць у кіно, як на споведзь. Ачысьціцца ад грахоў супольным прычасьцем у абліччы алюзіі. У бясьпечным змроку залі яны падміргваюць аўтару, і ён ім падміргвае. На батыку, які падсунуў рэжысэр, яны вышываюць сваё асуджэньне гвалту. Гэта аднаразовы магнэтычны сэанс, які чэзьне ў тую хвіліну, калі яны выходзяць з кінатэатру, вызваленыя ад згрызотаў сумленьня, ад маральнай мукі, ад здані адказнасьці. Вяртаюцца, каб ізноў грашыць своекарысьлівасьцю, прыслужніцтвам, здрадай.
Ён глядзеў на мяне, але ня слухаў. То бок, слухаў, але ня браў да ведама.
— Тэрор узмацняецца, а пасьля мякчэе, — сказаў ён ледзь чутна. — Колькі ўжо перажылі замарозкаў і адлігаў, лютаваньняў рэжыму і нечаканых дэпрэсій. Найважнейшае, каб

людзі чакалі.
— Хто чакае? Малы адсотак апантаных, непрыстасаванцаў і калекаў з вычварэнскімі схільнасьцямі. Яны пры ўсякім ладзе шукалі б прыдатнага месца для сваіх вычварэнстваў. Запісваліся б у Армію збаўленьня, уступалі б у экстрэмісцкія рэлігійныя сэкты, далучаліся б да анархісцкіх групаў. Маўклівая бальшыня сьпіць летаргічным сном. Неяк уладкавалася, знайшла цёплыя закуткі, абрасла коканамі адноснага дабрабыту. Гэтая вялікая эпідэмія хабарніцтва выратавала сыстэму. Бакшыш і хабар счалавечылі нялюдзкі лад. Усе, ад найвышэйшага сакратара да начнога вартаўніка, бяруць у лапу, і ўсе крадуць. Мы плывём па бязьмежным акіяне санкцыяванага зладзейства. Наш карабель ніколі не разаб'ецца аб прыбярэжныя скалы, бо мы ўжо ніколі ня ўбачым берагу. Гэтая сыстэма пачала сваю кар'еру зь ленінскага лёзунгу "Грабь награбленае!"
— Чуеш, яны зноў пляскаюць, — шапнуў Губэрт. — Яны яшчэ бачаць і чуюць. Ты ўваскрасіш іх сваёй сьмерцю альбо выкупіш іх грахі.
Білетэр зазірнуў у пакой. Праверыў, ці мы яго не ашукалі. Сабака лёг каля мяне і пачаў шукаць зубамі блох вакол посіка. Галя схіліла галаву, заглыбіўшыся ў малітву альбо ў скруху за ўсе нашыя грахі.
— Гэты мужчына апазыцыянэр? — спытаў кіраўнік, канфідэнцыйна набліжаючы вусны да майго вуха.
— Так, але пра гэта ўсе ведаюць. Не турбуйцеся.
— Кепска, падла. Яны й так ужо маюць на мяне кампрамат. Калі такі слабы, дык навошта па кінах хадзіць. Сядзі сабе перад тэлевізарам, халера ясная, — і дырэктар са злосьцю ўключыў тэлевізійны апарат.
У апараце штосьці застагнала, пабеглі белыя і чорныя палосы, усплыла карцінка зьезду партыі. Два сакратары — наш і савецкі — уручылі адзін аднаму нейкія мэдалі, а пасьля пацалаваліся ў вусны.
— Прыйдзе час, калі мы кожнага спытаем: кім ты быў і якому пану служыў, — зьвяртаўся голас з экрану.
Ізноў бухнулі воплескі. Хтосьці непадалёк, сукрыты за пунсовай заслонай, пляскаў гучней за ўсіх. Можа, білетэр ці мастак — былы міністар.
У пакой на дыбачках увайшоў Рышард, ведучы за сабой Булата.

Я даўно ня бачыў кінэматаграфіста. Ён пастарэў, але і пашляхетнеў. Высока нёс галаву з грывай даўгіх сівых валасоў. Горкія барозны абнялі з абодвух бакоў сьціснутыя вусны. Ён наблізіўся да катафалка з крэслаў, узьняў немагучую далонь Губэрта.
— Я тут, даражэнькі, я тут. Ужо едзе дапамога. Выбачай, што мяне не было.
— Ведаю, разумею. Цудоўна прымаюць, праўда?
— Так, няблага рэагуюць. Цешуся, што адпавядаю спадзяваньням.
— Не, не кажы так. Гэта найважнейшы фільм апошніх гадоў, а можа, усяго нашага жыцьця. Упершыню мастацкі твор мудрэйшы ад мяне, ад усіх нас.
Трэба было зашыцца ў якое дупло і перабіцца да вечара. Яны мяне дэмабілізуюць, адбіраюць веру ў сэнс майго вечаровага ўчынку. Што можа значыць мой замах у параўнаньні зь несьмяротнай веліччу мастацкага твору, які будзе ўзрушаць чалавецтва празь вякі. Раптам расхацелася мне гераізму і нікчэмнасьці, ахвярнасьці і баязьлівасьці. Мне папросту ўсяго расхацелася. Я з агідай глядзеў на судзіну з блакітнага пластыку, якую трымаў гэты паўдурак з правінцыі.
— Адыдзіся, — засіпеў Рышард. — Ня бачыш, што яны хочуць пагутарыць бязь сьведкаў.
Я падаўся на крок назад, наступаючы сабаку на хвост. Ён падхапіўся зь віскам і паказаў мне немалыя злосныя зубы. Так, пыха мяне мучае, дэмабілізуе і нявечыць, нібы хвароба. Усе неяк задаволеныя сваімі месцамі, вызначанымі ім найвышэйшай сілай і ланцугом генаў. Сьціпла выконваюць тое, што загадвае ім Вялікая Энтрапія. А я крыўдую на лёс, на сваю абмежаванасьць, на Госпада Бога. Прагну нечага, чаго не магу. Мару аб тым, чаго ня будзе. Тану ў шэсьцьдзесяцёх літрах уласнай атрутнай вады, я, дэфэктыўны дзьвюхногі сысун.
А ці гэта не дарэчны момант, каб скарыцца? Пасыпаць аблыселы чэрап жменяй попелу і ўстаць на агнішча?
Раптам уваходзяць два санітары з насілкамі і лекар-маладзён. Гэты доктар цырымонна расшпіляе Губэртаву кашулю, слухае сэрца, пасьля мерыць ціск. Мы набожна назіраем.
Лекар дае знак санітарам, якія спрытна кладуць Губэрта на насілкі.
— Ва ўрадавую клініку ці ў звычайную больніцу? — пытаецца

доктар.
Мы бездапаможна пераглядваемся. Булат першы парушае маўчаньне.
— Мо лепш ва ўрадавую. Я зараз пазваню ў Цэнтральны Камітэт.
— Ага, — робіць выснову лекар. — Значыць, пакуль едзем у дзяжурную больніцу. Пацыент ня мае прывілеяў.
Булат увесь час трымае Губэрта за руку. Яны глядзяць адзін аднаму ў вочы.
— Дзякуй, Уладзю, дзякуй, — ціха кажа Губэрт.
— І я табе дзякую. Ты шмат даў мне зь сябе, Губэрце.
— Я шчасьлівы, калі гэта праўда.
Яго пачынаюць выносіць. Насілкі не пралазяць у дзьверы. Трэба нахіліць іх. Мы падбягаем дапамагчы. Тады хворы заўважае і мяне.
— Хутка сустрэнемся, — шэпча ён.
— Калі сустрэнемся.
— А калі не сустрэнемся, то так, як быццам бы ўсё-такі сустрэнемся.
Санітары ўжо адолелі дзьверы і выходзяць у цемру калідору.
— Губэрце, я нічога не абяцаю, сам яшчэ ня ведаю! — крычу ўсьлед у чырванаваты змрок кінатэатру.
— Ціха, не галасі. Іншы хто гэта зробіць, — яшчэ чую пагардлівы шэпт Губэрта. — Мы далі табе шанец. Адзін з шматлікіх шанцаў на малую несьмяротнасьць.
Я пабег за ім.
— Губэрце, гэта ўсё, што ты можаш мне сказаць?
— Слухай, ты заўжды ўпадаеш у гістэрыку.
— Бо гістэрыя — гэта маё паліва, гэта мой энэргетычны басэйн.
— Мне моташна. Да пабачэньня. Трымайся. Мусіць жа быць нейкі сэнс. Я цябе не пакіну. Буду з табой. О Божа, я ўжо тану.
Яны панесьлі яго праз фае з голымі дзеўкамі на карцінах былога міністра. Перш як упала крысо парт'еры, я яшчэ пабачыў гасьцей, што сноўдалі з келіхамі савецкага віна ў руках. Яны без асаблівай цікавасьці паглядалі на брудныя насілкі і на нерухомае, спаралізаванае немаччу цела змагара, які шмат гадоў мучыў іхнае сумленьне, наганяў начніцы, адбіраў апэтыт. А можа, наагул ня мучыў, не наганяў, не адбіраў. Быў толькі пунктам, пазыцыяй у рэгулярных справаздачах паліцыі, як прытон алькаголікаў, як

аўтамабільнае здарэньне, як украдзеная бочка селядцоў, як штодзённасьць малой і нешчасьлівай краіны бясконцага кананьня. Нехта стаяў ля парт'еры, што затуляла ўваход у глядзельную залю. Трымаў у руцэ сьціснуты шмат плюшу. Праз шырокую шчыліну быў бачны экран, а на ім — агромністая сьпіна мужчыны, які глядзеў у акно.
— Гэта ты? — шапнуў нехта, і я пазнаў голас Булата.
— Я.
— Даўна ўжо цябе ня бачыў. Я думаў, ты зьехаў, нехта некалі за гарэлкай прысягаў, што ты памёр за мяжой.
— Яшчэ жывы. Гэта ўжо канец фільму?
— Апошняя сцэна. Не люблю яе, але мусіць быць такая.
На экране адчыняецца акно, якое паказваюць звонку. На падваконьне ўзлазіць мужчына неакрэсьленага веку, зарослы, упацелы сьмяротным потам. За яго сьпінай тахкае гадзіньнік ці вада капае з крану. Недзе пад ім, у прадоньні падворку, крычаць дзеці за гульнёй. Мужчына стаіць на падаконьні, трымаючыся за аконную каробку. Ён глядзіць на неба, і мы бачым аблачыны, што хутка плывуць над горадам, ён глядзіць уніз, і мы бачым каменную лагчыну і дзіця на ровары. Пасьля гэты чалавек намагаецца праглынуць сьліну, душыцца ёй, углядаецца ўглыб пакою, урэшце шэпча сабе:
— Хлусьня мяне забіла.
Сонным рухам насоўваецца на камэру, нібы вырываючыся зь нечых рук, і ляціць на нас. І мы бачым зьверху, як ён падае, круцячыся, як матляе яго вецер, як ён вусьцішна павольна падае, нібы ў сьне, як набліжаецца да каменнай зямлі і як застывае на гэтым камені, навечна спынены ў стоп-кадры. Нейкі час трывае пранізьлівая ціша, бо гук згас і ў фільме. Павольна запальваюцца жырандолі і бра. Бухаюць воплескі залі, гледачы ўстаюць зь месцаў, крычаць нешта, нечага просяць, нехта бяжыць паўзь не заслонены яшчэ экран.
— Цябе клічуць, Уладзю, — падштурхоўваю яго за заслону. — Выйдзі, яны хочуць табе падзякаваць.
— Ня трэба. Так будзе лепей.
Ён адступае ў цёмны калідор, цягнучы мяне за сабой. Мы стаім за стэндам з фотарэклямай савецкага фільму "Сьветлая будучыня".
Натоўп валіць праз выхад, таўчэцца, штурхае шкляную вітрыну, але нас ня бачыць. Зь сьціснутым сэрцам слухаем абрыўкі

гутарак, нейкіх уздыхаў, чыіхсьці ўсхліпваньняў.
— Гэта твой трыюмф, — кажу я ў напаўголасу.
Ён машынальна праводзіць рукой па сваіх сівых валасох маладлявага старэчы.
— Я адзін ведаю праўду. Але ня ведаю, ці гэта добрая, ці благая праўда.
Некалі мы сябравалі. Я напісаў для яго колькі сцэнароў, заляцаўся да якойсьці зь ягоных жонак. Хто ведае, ці няма і майго ўдзелу ў ягоным трыюмфе.
— Помніш сваю першую прэм'еру?
— Ох, не нагадвай. Калі пераглядаю ў памяці свае фільмы, мяне так і агортвае задушная паніка. Ды гэты натоўп мусіў бы разьбіць вітрыну і лінчаваць мяне пасярод вэрнісажу нашага былога міністра. Глядзі, я пачаў зь фільму, які няславіў АК, то бок асяродзьдзе, зь якога я выйшаў, потым зьняў карціну, якая ўслаўляла гэтую няшчасную АК. Калі краіна замерла ў маразьме, прыгнечаная безнадзейнай акупацыяй, паўсвабодай, я рабіў псыхалягічнае кіно, хапаў тое і гэтае, стараўся ўтрымацца ля пэўных сусьветных тэндэнцыяў. А тады зрабіў фільм — памфлет на інтэлектуальную эліту, пазьней зрабіў нешта, што сьмярдзела антысэмітызмам, хоць папраўдзе ім не было. Ці ты не знаходзіш у гэтым маім шляху жалезнае лёгікі?
— Ты рабіў тое, што таксама рабілі іншыя.
— Ах не, памыляешся. Мая мастацкая біяграфія — curriculam vitae папутчыка. Мне заўжды здавалася, што я раблю тое, што можна ў дадзены час. Але прыгледзься да гэтага пасьлядоўнага ходу маіх тэзаў і канстатацыяў. Я зрэалізоўваў у колеры лінію партыі, разам зь ёй каціўся ад памылкі да памылкі.
— Не, Уладзю, у цябе кепскі дзень, хоць павінен быць добры. Гэта няпраўда. Публіка заўжды цябе любіла, а гледачы не памыляюцца.
Калідор павольна пусьцеў. Ізноў недзе азваліся аркестры, прабіваючыся праз манатоннасьць вулічных гучнагаварыльнікаў. Чуваць было таксама брэх сабакі-прыблуды. Галя і Тадэй з правінцыі шукалі мяне па закуткох будынку.
— Гледачы мяне любяць, бо я адзін зь іх. Ведаеш што, ведаеш, скажу па-блюзьнерску: Польшчу згвалтавалі. Яна доўга баранілася, кусалася, драпалася кіпцюрамі, пакуль урэшце не скарылася. І знайшла асалоду ў гэтай пасіўнай, неахвотнай

пакоры. І адчула двухсэнсоўную, дзіўную, крыху агідную прыемнасьць ад згвалтаваньня. Яна ляжыць на ростанях Эўропы, і хамы яе пляжаць. Мяне таксама згвалтавалі. Мяне трахае быдла, а я здаюся і ў той жа час не здаюся, ціха паенкваю і кусаюся, дзе магу. Мяне гвалцяць, і я не хаваю, што мяне гвалцяць. Мо таму выбачаюць мне мае фільмы, мо таму іх любяць. Я адкрыў новае вычварэньне пад прымусам, новае адхіленьне па боскай волі. А ты што? Чаму пра цябе не чуваць? Што ты робіш?

За вялікімі бруднымі вокнамі, як фатасполах, бліснула сонца.

— Пішу. Якраз ізноў пачаў пісаць. Сёньня ўраньні.

Булат дрыжаў, заўважыў, што ў яго трасуцца рукі, і засунуў іх у кішэні старога смокінгу, які я помніў зь першых прэм'ераў і першых посьпехаў, нясьмелых, палавіністых, што не вестаўалі вялікай кар'еры.

— Толькі Губэрт, — сказаў ён, гледзячы ў акно. — Толькі Губэрт звабіў мяне на новы, коўзкі, небясьпечны шлях.

— Маеш на ўвазе "Пераліваньне"?

— Маю на ўвазе "Пераліваньне" — ягоны твор, хоць ён не напісаў для мяне ні слова, не падкінуў ані труку. Цяпер буду брыкацца й кусацца штосілы. Гэта значыць, наколькі мне дазволіць цэнзура. А дазволіць больш, чымся іншым, бо я зрабіў сабе імя, бо краіна чакае маіх фільмаў. Бачыш, якая тут узьнікла зваротная лучнасьць. Магу біць партыю ў зубы, бо маю права, а маю права, бо прыслужваў партыі. Што ты хаваеш ад мяне?

— Нічога не хаваю, Уладзю. Што ты маеш на ўвазе?

— Губэрт заклінаў мяне, каб я прыйшоў з акторамі ўвечары пад Залю Кангрэсаў. Ён ніколі не прасіў майго подпісу, ніколі не прымушаў да рызыкоўных жэстаў. А сёньня захацеў, каб я пабыў ля Палацу культуры.

— Можа, ён спадзяецца, што жыцьцё пацьвердзіць твой фільм?

— Скажы ясьней. Я сёньня дужа хвалююся, забыў лекі ўдому. А тут яшчэ гэты Губэртаў прыпадак. Ён выкараскаецца, праўда?

— Мо й выкараскаецца.

— Калі я сёньня стаяў, учапіўшыся ў заслону, я ўпершыню падумаў, што я ўсё-такі патрэбны гэтым людзям. Мушу брацца за работу. Праца мяне ўзвышае, а калі я ўзвышаны, то лепей працую. Зноў выходзіць зваротная лучнасьць. Нешта ўчапілася й не пускае. Я на нэрвах, я пачынаю больш разумець. Бог

вынесе гэтаму ўсяму свой вырак. Бо Бог, здаецца, ёсьць. Я заўсёды паціху так думаў. У благую й добрую часіну.
— А я ўкрыўдаваў, Уладзю.
— На каго ўкрыўдаваў?
— На ўсё. Шмат гадоў не пішу. Страціў веру. Гэта не для мяне. Зашмат узроўняў.
— Якіх узроўняў?
— Ну, гэтых, розных узроўняў быцьця. У нас унізе і там, высака пад стольлю сусьвету. Я выбраў нікчэмнасьць.
— Але ж ты пішаш.
— Пішу. Пішу запавет. Але ня ведаю, ці скончу. Я выбраў іншую дарогу. Можа, горшую ад тваёй, а можа, лепшую. Мы ніколі гэтага ня ўведаем.
— У цябе да мяне ёсьць прэтэнзіі?
— Часам мне здавалася, што ёсьць. Часам — што няма.
— Я табе пакажу маю дарогу. Устань на яе. Яна вельмі простая. Досыць глядзець людзям у вочы і сачыць, ці прымаюць яны гэта. Рабі тое, чаго людзі хочуць.
— Запозна. Я буду рабіць, што я захачу.
— Ты робіш, думаючы, што яны так хочуць, а яны ня хочуць. Паслухай мяне і кінь крыўдаваць. Прыйдзі да мяне, я табе з прыемнасьцю дапамагу. Калі, натуральна, ты мяне прымаеш.
— Якраз ня ведаю, ці я цябе прымаю.
Ён здрыгануўся, выняў рукі з кішэняў і пачаў ліхаманкава іх церці.
— Холадна. Божа мой, як холадна.
Тады раптам згасла сьвятло. Зрабілася шэра, панура ў гэтым прасторным калідоры. З паўслова пачалася хроніка, якая распачынала наступны, ужо звычайны сэанс.
— Сьвятло адключылі! — гукнуў дзесь пад стольлю зь цеснай галерэйкі кінамэханік.
— А каб іх трасца! — крыкнуў у змроку дырэктар кінатэатру.
— Гэй! — гукала Галя, блукаючы ў лябірынце парт'ераў.
— Маэстра! — разам зь ёй крычаў Тадэй з правінцыі.
І раптам я прыпомніў чатырохрадкоўе майго памерлага сябра, Вільгельма М., які калісьці пад раніцу падняў галаву ад недапітай шклянкі і сказаў, гледзячы ў нябачнае неба:

Адзін дзень другі зьмяняе,
Шыю веку скарачае.

Навакол гаўна даволі.
Мы ў няволі, мы ў няволі.
— Ведаеш, Уладзю?
— Ну? — азваўся ён у паўзмроку, усё яшчэ расьціраючы сьсінелыя рукі.
— Гэта няпраўда. Я не пакрыўдаваў. Я папросту ня ўмею альбо, можа, не хачу гуляць мечанымі картамі. Я дзяцюк старога гарту.
— Ня вельмі разумею, пра што ты гаворыш.
— Усё дзеецца супраць мяне. Мой сьвет, ня ведаю, благі ці добры, але мой уласны сьвет, які мяне зачаў, нарадзіў і навучыў правілам, гэты сьвет рассыпаўся ў друз па вялікай вайне. Гэтая чортава вайна скончыла нейкі цыкл, нейкае чарговае кола на дыстанцыі бясконцасьці. А цяпер — фініш на карачках, заняпад, канец перад няведамым пачаткам.
— Ах, усе заўжды наракалі на амаральнасьць сьвету.
— Гэта мяне не суцяшае. Я ўсё яшчэ малы дзяцюк з правінцыі. Імкнуся да мужчынаў. Сапраўдных мужчынаў — з гонарам, з годнасьцю. Стрыманых, мужных, аскетычных рыцараў. А тут паўсюль наўкола кабеткі ў нагавіцах. Мужыкаватыя, патлатыя бабы ў жабо з дэкальтэ. Юрлівыя, сквапныя, бессаромныя бабы з пэнісамі, схаванымі ў карункавых трусах. Уладзю, я прагну мужчын. Маё пакаленьне мужчын вымерла. Я застаўся адзін з паталухамі, бязулямі, салапякамі і гіну, бо ўсё супраць мяне. Усё мяне зьневажае, абражае, выпіхвае з жыцьця.
У глядзельнай залі сьвісталі. За акном вецер гнаў аблачыны залатога лісьця да дзьвюх чэргаў каля мясной крамы і на стаянцы таксовак. Пэрсанал кінатэатру роспачна бегаў па калідорах.
— Ты папросту слабы, — ціха сказаў Булат. — Ты ня ўмееш жыць у сьвеце, пазбаўленым гіерархіі. Не рашаешся выбудоўваць сваю сыстэму вартасьцяў, чапляешся за руіны, якія млын часу мяле на атамы, што стануць пачаткам наступнай цывілізацыі, калі такая наагул узьнікне. Але ж мяне калоціць. Бачыш, я так перажываю гэтыя дзьве страшныя гадзіны маіх новых радзінаў.
— Уладзю, ведаеш, куды я зараз пайду?
— Дадому ці на абед.
— Але ж Губэрт табе сказаў. Навошта ты робіш выгляд?
Ён правёў пальцамі празь сівую грыву і зноў схаваў далоні ў

кішэнях смокінгу.
— Сёньня ўночы я ад'яжджаю ў Паўднёвую Амэрыку. Баюся, што паеду з грыпам.
— Хочаш з мной памяняцца?
— Але ж ты ня можаш за мяне паехаць у Амэрыку.
— Але ты можаш за мяне пайсьці туды, пад Залю Кангрэсаў.
— Ты так думаеш? — працяжна спытаўся ён.
— Папросту пытаюся.
— Выбачай, але гэта твая справа. Твая і іхная. Ад мяне хочуць фільмаў. Я буду рабіць ім фільмы. А пасьля пабачу. Можа, пайду па тваіх сьлядох, а можа, тады ніхто ўжо ня будзе жадаць такіх ахвяраў.
— Чаму я?
— Ня ведаю. Пытайся ў тых людзей у чарзе, пытайся ў Губэрта ці ў Цэнтральнага Камітэту. Найлепей запытай сябе. Я ўсё жыцьцё выступаў супраць сьмяротнай кары. Ад уласнай рукі ці ад рукі ката.
— Ну то бывай.
Ён прыцягнуў мяне да сябе, абняў дрыготкімі рукамі. Хвіліну мы стаялі ў братніх абдымках. Ён, пэўна, думаў аб сваім наступным фільме, можа, я нават падказаў яму задумку добрай сцэны, а я ўсё яшчэ ня мог сабрацца з думкамі да такой ступені, каб зь іхнай магмы выціснуць зьмест галоўнай думкі, яснай і простай, як прыказка.
Забрахаў сабака. Гэта быў наш дварняк на караценькіх лапах-майхрах. Ягоная поўсьць зьзяла ўсімі фарбамі сабачай гармоніі. І я ведаў, што буду называць яго Пікусем, у гонар сабачкі, якога я калісьці ведаў і які згінуў недзе бязь вестак, сапраўдны няведамы сабака.
— Дзе Вы падзеліся? — гнеўна сказала Галя. — Мы Вас ужо ў сутарэньні шукалі.
— Перапрашаю, гэта мая віна, — пакланіўся Булат, а яна адразу палагоднела. Прыемнае аблічча мужчын улагоджвае кабет. І наадварот. — Мы даўно ня бачыліся. Абодва выпраўляемся ў далёкае падарожжа. Гэта мой сябар. Сябар маёй маладосьці.
Ён яшчэ раз прыабняў мяне. З глядзельнай залі чуўся разьюшаны тупат, сьвятло бліснула на момант і зараз жа згасла.
— Можна папрасіць у Вас аўтограф? — Тадэй падсунуў Булату

пакамечаны нататнічак.
Булат уздыхнуў з роспаччу, а пасьля доўга нешта пісаў.
— Ну то пакуль, — сказаў я.
— Пакуль.
Але я ніяк ня мог пайсьці. Пікусь аддана лізаў мне канчукі пальцаў, падскокваючы на сваіх караценькіх лапах.
— Ну, значыць, да пабачэньня, — паўтарыў я.
— Бывай, любачка.
— Усяго.
— І табе ўсяго.
Мы паднялі рукі ў вітаньні капітанаў караблёў, што ідуць на дно. Праўда, гэта мой тануў, а ягоны йшоў баразьніць акіян. Мы насьцярожана разышліся, як два каўбоі з старых вэстэрнаў. Я зноў апынуўся ў залі, дзе праходзіла выстава. Апошнія госьці ўжо ў плашчох жартаўліва перамаўляліся каля выхаду. Мяне заўважыў аўтар, міністар-пэнсіянэр. Падбег да мяне бадзёрым крокам. Ён ужо быў добра паддаты. Узяў мяне пад локаць з прыязнай ласкавасьцю.
— Што, даражэнькі калега, падскочым разам з таварышамі да дзяўчынак?
— Да якіх дзяўчынак?
— Пад Варшавай. Ведаеце, калега, у правінцыі можна яшчэ знайсьці дзевачак, што даюць за нашыя ўлюбёныя польскія злотыя.
— Шмат бяруць?
— Прымальна. Да ста тысяч, але можна знайсьці і за пяцьдзясят.
— Дорага, пане міністар.
— Я сёньня прастаўляю. Хадземце ўжо да машынаў. А што выстава, якія ўражаньні?
— Пазытыўныя.
— Я таксама так думаю. Людзі любяць сёньня такія рэчы. Трохі эстэтыкі, трохі перчыку, і галоўнае, што без палітыкі. Мы, здаецца, ужо на ты.
— Натуральна, пане міністар.
— То хадзі, браце, паедзеш з таварышам Макалугвам. Можа, табе трэба замежны пашпарт, ён табе зараз жа зробіць.
— Не, дзякую, мо іншым разам.
— Іншым разам дзевачкі ўжо будуць за валюту. Але як хочаш. Маеш мой тэлефон?

— Лютак, Лютак! Зьмерзнем у дзьвярах. Хадзі, не адкруцішся! — гукалі таварышы ад дзьвярэй.
— Пашкадуеш. Але не дык не. Пакуль, бывай! — І пабег гэтым сваім дробным сэксуальным крокам да групы таварышаў, што наперад цешыліся з вандроўкі да дзевак з-пад Варшавы.
Я глядзеў на яго бяз гневу. Даўно ўжо згасьлі эмоцыі, як перанесеная ў маленстве ліхаманка. Ён ня помніў тых часоў, і мы ня помнілі яго. У новым кантэксьце ён быў забаўным старым зь нясьмелымі эратычнымі памкненьнямі.
— Вы неяк выкручваецеся, — неахвотна азвалася Галя.
— Я выкручваюся? А цябе, сястра, што, пільнаваць прыставілі?
— Бо мы ўсё ідзём, ідзём і ніяк ня дойдзем.
— А да чаго мы ня дойдзем, можна даведацца?
— Да валютнай крамы. Запалкі купіць.
— Выбачайце, забыўся.
Мы выйшлі на паламаныя сходы перад кінатэатрам. Таварышы заводзілі свае машыны з двухтактавымі рухавікамі. Яны зноў уваходзілі ў нас у моду, бо былі таньнейшыя і прасьцейшыя ў абслугоўваньні. Апроч таго, былі спадзяваньні, што ў іх удасца выкарыстоўваць у якасьці паліва сыроватку.
Па вуліцы Капэрніка, чамусьці перакапанай, шла гурма падлеткаў, капіюючы маніфэстантаў. Дзеці несьлі ці то стары, ці то новы транспарант — усе транспаранты сёньня былі падзертыя ветрам — дык вось, несьлі транспарант: “Жыве трыццаціпяцігодзьдзе ПНР” і крычалі тонкімі ахрыплымі галасамі:
— Польшча! Польша! Чемодан! Польшча! Польша! Барабан!
Мы рушылі за гэтым міні-шэсьцем у бок Ардынацкай. Пад мурамі ляжалі россыпы сьвежага сьнегу альбо граду і хутка раставалі. Тадэй бесклапотна матляў маёй каністрай.
— А Надзежда, — спытаўся я, — а Надзежда скуль тут узялася?
Галя пранізьліва зірнула на мяне.
— Як гэта скуль? Як і ўсе іншыя. Выйшла замуж за нашага дыплямата і паехала ў Польшчу разам зь ім, калі скончыўся ягоны тэрмін працы ў Маскве. У Варшаве разьвялася і выйшла другі раз за журналіста. А цяпер яна нарачоная інжынэра-лесавода, але ня ведаю, ці з гэтага нешта будзе, бо ў яе закахаўся Рышард Шміт.
— Я ў гэта ня веру.
— Чаму Вы мне ня верыце?

— Бо яна ніколі не была замужам. Можа, яе прывезла сюды тая бабка, у якую быў закаханы Ленін.
Галя задумалася на хвіліну.
— Мо й прывезла, — сказала яна ўрэшце. — Вас гэта цікавіць? Расейцаў у Польшчы ўсё болей.
— І ўсё болей палякаў у Расеі.
Я падумаў сабе, што гэтая непрыгожая моладзь таксама, мусіць, займаецца міжсобку каханьнем, хоць гэта падаецца непраўдападобным. Толькі цяпер я заўважыў, што Галя нейкім спосабам помніць пра свае жаноцкія абавязкі. Яе вочы былі далікатна падмаляваныя, а на вузкіх вуснах ляжаў тонкі слой бясколернай памады. Чым даўжэй я на яе глядзеў, тым больш пераконваўся, што яна ўсё-такі можа падабацца. У ёй нават было нешта крыху непрыстойнае, як у маладзенькай манашкі. Яна цяпер таксама паглядала на мяне ласкавей. Адным словам, мы счапіліся невідомай ніткай двухсэнсоўнага паразуменьня, зь якога нічога ня вынікне, але якое дапамагае трываць бытнасьць другога.
— А Вы трохі шавініст.
— Трохі. Старога гарту. А Вы не?
— Мы ўжо не. Нават крыху саромеемся ўсіх гэтых засьцянковых комплексаў, забабонаў, летуценьняў.
— Вы ўнівэрсалісты, праўда?
— А Вы іранізуеце, так?
— Не, я папросту скрупулёзны. Хацеў бы разабрацца.
— Нас цікавіць чалавек. Дзе б ён ні быў і ў якім бы часе ні жыў. Чалавек перадусім. Асобна ўзяты, бездапаможны, самотны.
— Гэта мой партрэт. Асобны, бездапаможны, самотны.
— Вы яшчэ той нягоднік. Я чытала вашыя творы.
— Мяне ўважаюць за памяркоўнага мараліста.
— Добра, добра. Бацькі вырывалі ў мяне з рук Вашыя раманы і білі па пальцах.
Недзе за рогам грымелі сьвяточныя аркестры. А пад небам плылі ланцугі дзіўных каляровых аблокаў.
— Мо зойдзем на каву, Галю? — спытаўся я. — Мне млосна. Учора нешта здарылася з мной, ня помню што.
— Вы як цяпер прачнуліся?
— Не. Ты мне падабаешся ад самага пачатку. Калі ўзьнімаліся да Віслы, я прыглядаўся да тваіх ног.
— Ведаеце, мне недаспадобы такая фамільярнасьць.

— Пэўна, у цябе ёсьць хлопец?
— У мяне было шмат хлопцаў. Гэта Вас не абурае?
— Хутчэй хіба расчароўвае.
Ззаду за аблокамі цягнуўся даўгі надпіс, складзены з каляровых шарыкаў: “Мы збудавалі сацыялізм. Мы построили социализм”. Зьбянтэжанае птушшо трывожна кружляла пад гэтым зыркім караванам.
— Галю, Вам мяне не шкада?
Яна прысьпешыла хаду. Мы былі ўжо блізка да Новага Сьвету, дзе на час сьвята павыстаўлялі кірмашовыя буды, стылізаваныя пад народныя корчмы, славянскія капішчы і расейскія лазьні. Сялянская самадзейнасьць рэзала вуха ўлюбёнымі прыпеўкамі.
— Стары дзед, — буркнула Галя, пазіраючы на мяне бяз злосьці.
У мяне быў шматгадовы прастой, і вось цяпер, як высунуў у сьвет пахмельную галаву, гэтулькі раптоўных спакусаў. Добра, хай купіць тыя запалкі. Ужывём іх, каб распаліць вогнішча ля Віслы.
Мы спыніліся перад валютнай крамай, якую адчынілі на месцы былой яткі. Галіна зазірнула ў сумачку.
— Ізноў Вы за мяне плаціце.
— Ведаеце, гэта ўжо непрыгожа.
І ўвайшла ў краму, а мы засталіся пад крышталёвымі, трэснутымі ўпоперак дзьвярыма. Пікусь усеўся пры маёй назе, пачаў прыглядацца да мяне, нібы пазнаючы з ранейшых часоў.

У абодва бакі валілі сьвяточныя масы. Але яны ня йшлі годна, з узьнятымі галовамі, пазіраючы зычлівымі паглядамі, што я так добра помніў змалку. Гэтыя масы рухаліся, нібы грыбнікі падчас нэрвовага зьбіраньня грыбоў. Сноўдалі па крамах, заглядалі за прылаўкі гандлёвых палатак, утваралі раптоўныя чэргі, якія зь невядомых прычынаў умомант незваротна зьнікалі. Гэтыя масы шукалі корму, нагоды купіць нешта непазьбежна патрэбнае для жыцьця, шчасьлівага выпадку ашукаць хітрую дзяржаву.
О Божа, дзе ж падзеліся колішнія фізіяноміі маіх суродзічаў? Дзе ж тая размаітасьць твараў? Прыгожых і шурпатых, прыстойных і брыдкіх, мілых і крываватых. А гэтыя шурпатыя, брыдкія і крываватыя таксама маглі падавацца цікавымі і прывабнымі. Дзе ж гэтая размаітасьць рысаў, тыпаў,

калярытаў? Дзе ж гэты шарм і чароўнасьць прывабных жыхароў, выраслых на берагох рамантычных рэкаў у цэнтры Эўропы?
Вось плывуць у той і ў гэты бок нейкія прыкрыя пысы. Злыя, неахайныя, утаўраваныя спадчыннай і непераадольнай брыдотай. Часам мільгне між імі авальны кавун морды дзяржаўнага ці партыйнага апаратчыка. Яны адрозьніваюцца нейкай алькагольнай прыпухласьцю, паскуднымі рэдкімі валаскамі, што ляжаць у прыкрых кучаравінках на спацелых чарапох. Іх вылучаюць малыя, хуткія і падазроныя вочкі, пульхныя сітаватыя шчокі, іх адрозьнівае брак вуснаў, заміж якіх яны маюць дзірачку для прамаўленьня дакладаў. Божа мілы, калі гэта здарылася, калі ліхая вядзьмарка на кару ператварыла гэтае грамадзтва ў вялікі табун пячорных людзей? Помню той час, помню гэты страшны пэрыяд зьнявечаньня. Гэта было пад канец шэсьцьдзясятых гадоў альбо на пачатку семдзясятых. Тады ўваходзілі ў жыцьцё штогадовыя канфэрэнцыі з удзелам сакратароў, начальнікаў, міліцыянтаў, цэнзараў, прызначаных зьверху дацэнтаў, дырэктараў турмаў і прадажных мастакоў. На фізіяноміі іх нашчадкаў бязьлітасныя гены перанесьлі паскудзтва бацькоўскіх прафэсій, лішаі маральнай брыды, карбункулы прадажнасьці. Фатальны лёс бацькоў і матак назаўжды зьнявечыў нутро дзяцей. Ніхто ўжо не апявае ў песьнях хараства полек, ніхто ўжо нідзе не захапляецца шляхетным рыцарствам палякаў.
— І я зразумеў, што ўжо няма краіны майго маленства. Што жыве яна толькі ў мне і разам з мной рассыплецца ў пыл у гадзіну, што надыходзіць зь нічога, — азваўся раптам правінцыял Тадэй.
— Гэта зь мяне?
— Так, з Вас.
— У Вас удома цяпер, мабыць, капусту квасяць? Бацька расьсьцілае яблыкі на саломе перад зімой?
— Зарана. Яшчэ ж толькі сярэдзіна лета.
— Якое лета, хлапчына? Ня бачыш сьнегу ў вадасьцёку?
— Кліматычная анамалія. У нас кажуць, што ідзе ледавік.
— Мо ледавік усё наладзіць? Ледавік справядлівы, як думаеш?
— Вы хворы. Можа, лепей пойдзем дадому. Гэта недалёка.
— Трэба нешта зьесьці. Каб падсілкавацца. Я цябе запрашаю, хлопча, што піша вершы.

З крамы выйшла Галя з ладнай пушкай запалак. Пікусь вітаў яе, нібы добрую знаёмую.
— Швэдзкія. Найлепшыя, якія былі, — сказала яна.
— Швэды таксама ўжо робяць тандэту.
— Забавілася, бо ня мелі рэшты. Атрымала ў інданэзійскай валюце. Вы папярэдне спраўдзьце гэтыя запалкі.
— Спраўджу на сабе, Галю.
— Цяпер я Вас пакіну. Але Вы будзеце пад нашай апекай. Да пабачэньня.
— Дык мы яшчэ пабачымся? — спытаўся я зь дзіўнай надзеяй.
Упершыню яна пачціва ўсьміхнулася.
— Ня бойцеся. Пэўне ж, пабачымся.
— Галю, — прытрымаў я яе за руку, — я хацеў нешта сказаць, але ня ведаю што. Вам трэба йсьці?
— Трэба.
— А што з Губэртам?
— Я тэлефанавала з крамы. Ён у рэанімацыі. Стан крытычны, — і раптам адвярнулася.
— Галю, Галю, — завагаўся я. — Вы яго любілі?
— Вы зашмат пытаецеся.
— Мяне зь ім шмат зьвязвае. Яго з мной меней. Мне сёньня фатальна кепска, а я ж павінен быць дакладным, як гадзіньнікавы майстар. Галю, што гэта ўсё значыць?
— Ідзеце ўжо. Усім цяжка. Вельмі цяжка.
Яна павярнулася і пайшла проста ўглыб таго натоўпу, які нічога пра яе ня ведаў і ніколі не даведаецца. Яе шэрая куртачка хутка зьнікла ў вялай штурханіне.
— Запрасіць цябе на абед? — спытаў я Тадэя.
— Але, вялікі дзякуй.
— І цябе, Пікусю, запрашаю. Пойдзем у “Paradyz”, у якім некалі, калі ён яшчэ называўся “Paradis”, я пачынаў сваё гаўнячае жыцьцё. Вас ня гідзіць брыдкаслоўе?
— Трохі непрыемна, — адказаў Тадак. — Мая сям’я Вас вельмі шануе.
— Бач, я таксама не люблю брыдкіх слоў. Але грубае слова часам — як глыток сьвежага паветра. Ведаеце, хлопцы, гэткая рэзкая зьмена настрою, нешта накшталт раптоўнага асьвяжэньня. Але я вас абодвух палюбіў, таму буду ўнікаць пэўных выслоўяў, хоць, далібог, так і просяцца на язык.
— Можа, лепей пасядзім хвілінку. Адпачнём.

— Ня трэба. Я ведаю свой арганізм. Бач, хлопча, я ўраньні піў масьлёнку, пасьля мяне пачаставалі сібірскім бальзамам. Звычайна гэта азначае катастрофу, а я, бачыш, стаю на нагах, хоць мне і дзіўна. Ну то хадзем на абед. І пільнуй мой бітон.
— Пільную, пільную.
І мы рушылі ў бок пляцу Трох Крыжоў, а Пікусь нас вёў, увесь час правяраючы, ці пасьпяваем мы за ягонымі крывымі лапамі. Ад Ерусалімскіх алеяў рухалася гурма немаладых дзецюкоў, пераапранутых у газэтнікаў. Гэта былі нейкія актывісты, пэўна, моладзевай арганізацыі. Яны раскідвалі экстранны выпуск "Трыбуны люду", сарамліва гукаючы:
— Польшча адзначана ганаровым званьнем Першага Кандыдата на ўступ у склад Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!
— Экстранны выпуск! Польшча — першая кандыдатка на ўступленьне ў Савецкі Саюз!
— Вялікая падзея ў нашай гісторыі на парозе новага тысячагодзьдзя. Экстранны выпуск!
Ніхто не падымаў гэтых газэтак зь зямлі, але ніхто і не таптаў у гневе. Дальназоркія, нахіляючы галовы, спрабавалі ўкрадкам прачытаць перадавіцу, надрукаваную чырвонымі літарамі. Новы Сьвет, аздоблены транспарантамі і сьцягамі, выглядаў весела. Не відаць было адпалага тынку і разьбітых вадасьцёкаў. Толькі камяніца — ля якой расла славутая бярозка, што помніла часы нямецкай акупацыі, — толькі тая камяніца пад напорам нявіннага дрэўца абвалілася, неяк пасунулася, але ў гэтым чорным праломе ўсталяваўся кіёск з вырабамі народных промыслаў і правінцыйны ганчар, ачмурэлы стары, няўпэўнена круціў босай нагой ганчарнае кола.
Так мы дайшлі да пляцу на скрыжаваньні Новага Сьвету і Алеяў. Тут я раптам убачыў сваіх сяброў, Анджэя М. і Юзафа Г., якія йшлі на традыцыйную праходку ў бок Акольніка. Юзаф Г. жэстыкуляваў, напіраў плячом на Анджэя М., заступаў яму дарогу. Ён быў гэтак захоплены сваімі штодзённымі сьціплымі адкрыцьцямі. Анджэй М., трохі згорблены, нібы яму выдалілі страўнік, слухаў высновы таварыша з хваравітай мінай, відаць, занураны ў свае думкі. Гэтак яны шыбавалі за дваццаць крокаў ад мяне і не заўважылі нас, бо мы рушылі ў іншы бок. Мы заўжды разам хадзілі на гэтыя праходкі. Сёньня яны пайшлі безь мяне. І нічога ня здарылася. Можа, нават пачуваліся меней

скутымі.
Пад пастарэлым, патрэсканым дзе-нідзе Домам партыі было сьвяточна і ціха. Агенты Бясьпекі, пераапранутыя для адводу вачэй у міліцыянтаў з дарожнай інспэкцыі, апатычна бадзяліся каля рагоў гмаху. На даўгой сьцяне калыхаўся агромністы напіс “Мы збудавалі сацыялізм”, які, шматкроць паўтараны, напэўна, павінен быў разьвеяць сумневы сяброў партыі.
Неяк зьнянацку і бяз дай прычыны мне захацелася паглядзець на сьвет наўкола і на восеньскую ці летнюю прыроду, на тое нешта, што, здаецца, памірае і што шмат гадоў таму аплаквалі, перш як яно стала будзіць толькі абыякавасьць. Вось жа, я стаў каля будынку аддзяленьня цэнзуры, прыстойнага дому, ня так даўна памаляванага звонку алейнаю фарбай, і глядзеў у бок мосту Панятоўскага, які — во бяда! — абваліўся пару гадзін таму. Але бяды ня будзе, бо ёсьць яшчэ іншыя масты. І я глядзеў у бок Віслы і бачыў счарнелыя верхавіны дамоў на Павісьлі, бачыў плыні атручанай ракі, пляжы Прагі і ўскалмачаную, пажоўклую расьліннасьць Грохава і Гацлаўка, вялікі палогі поплаў, які не паддаваўся вадзе. Паволі чаўрэючы, яна штогод паўзла да мітусьлівага гораду. Гэты скалечаны пэйзаж, брыдкі, але разам з тым і ладны, бо адзіны, які нам застаўся, — гэты краявід, смутны, авеяны віхурай, сьцябаны шточвэрць гадзіны градам, усё ж мяне падбадзёрыў. Пікусь круціўся каля маіх ног, скавытаў і прасіў есьці.
Так, па абедзе пачытаю той шматок газэты, які я ўраньні вырваў у старога. Прагледжу нэкралёгі, а з нашых нэкралёгаў, хоць іх таксама прагледжвае цэнзура, можна даведацца аб жыцьці больш, чымся з статыстычных штогоднікаў. Тады пабачым.
Мае прыяцелі ўжо расталі ў паўзмроку вуліцы Смольнай, за тым помнічкам, здаецца, матцы партызана, помнічкам, што нагадвае масянжовае прэс-пап’е на пісьмовым стале сакратара. У нашым горадзе рэдка які помнік нешта азначае або прысьвечаны якому славутаму чалавеку ці ўсім ведамым падзеям. Нашыя помнікі пастаўленыя ідэям, абстракцыям, мэтафарам. Таму ніхто пра іх, бедных, ня помніць, нават рэжым, іх расьсеяны заснавальнік, цалкам забываецца пра гэтыя ўбогія тоны чыгуну.
— Дай каністру, — сказаў я.
Тадэй аддаў рэзэрвуар, рэзэрвуар чаго? Я пабоўтаў судзінай.

Бэнзын непрыстойна рыгнуў. Мы рушылі да нядаўна выбітых шкляных дзьвярэй рэстарацыі “Парадыз”.
Так, апошнія два сябры мінулі мяне, не павітаўшыся. Астатнія параць косьці на могілках. Паволі, неўпрыкметку я застаўся адзін на зямлі. Калі забірае туга, няма каму пазваніць. Бяру слухаўку, баўлюся яе дротам, накручваю нейкія выпадковыя лічбы і зноў кладу на месца эбанітавую белую косьць. Але ж урэшце ўсе ці амаль усе застаюцца адны на сьвеце. Неяк гэта вытрымліваюць. Бо і паскардзіцца няма каму. Тыя, хто зразумеў бы, даўно адышлі, тыя, хто застаўся, яшчэ ня ведаюць.
Гардэробнік ветліва кланяецца, хоць мог бы ўвогуле не адказваць на вітаньні. Бо гардэробнікі ў нашым краі — мільянэры. Таямнічыя ўладары нашых начных слабасьцяў.
— Пане маёр, — кажу я, — я б хацеў пакінуць маю біклагу і майго сабаку.
— Ну і бутэлечка, — сьмяецца гардэробнік, хаваючы каністру пад стойку.
— Во-во. А мо для сабачкі знойдзецца якая костка? Хадзі, Пікусь, да пана. Пан маёр любіць зьверанятак.
— Як Вы ўгадалі. У мяне дома басэт. Прыяцель-міністар прывёз мне з камандзіроўкі. Я Пікуся не пакрыўджу.
Я прыглядаюся да сябе ў люстры. У мяне былі прыстойныя бацькі, а дарма: фізіяномія выйшла ня надта. Прыстасаваўся да атачэньня. Прынамсі, ніхто не крытыкуе мяне, што я застары альбо замалады. Запрыгожы альбо забрыдкі. Я папросту ў самы раз на гэтыя часы. О Божа, вечар набліжаецца. У што я ўблытаўся. Галава цяжкая, думкі разбэрсаныя. Я ўсё-такі прачнуўся ў пэўнай псыхалягічнай аўры, можа, паскуднай, але ж добра знаёмай, звычнай і, урэшце, бясьпечнай. Цяпер страшнае чаканьне, хаос роспачаў ды беспадстаўных суцяшэньняў. У выніку ўсё нелягічнае, бяз пэўнасьці, непаважнае. Непаважнае? У кішэні швэдзкія запалкі, у гардэробе пяць літраў бэнзыну. Тым горш, што непаважнае.
Тадэй вяртаецца з прыбіральні, абцягваючы на сабе правінцыйную куртку.
— Нейкі пан просіць, — кажа ён зь нясьмелай усьмешкай.
— Каго просіць? — пытаюся я.
— Вас. Там у калідоры.
— Пачакай мяне. І ты, Пікусю, які шчасьліва знайшоўся, таксама пачакай. Пікусю, які знайшоўся, каб суправаджаць

мяне ў апошнія гадзіны. Ці не зашмат я гавару, пане маёр?
— О, вы любіце гаварыць, — сьмяецца мардасты гардэробнік.
— У нас заўжды знойдзецца нагода пагаманіць.
Дзіўна сказаў. Вешчым тонам. А я папросту хачу загаварыць гэты калючы камяк, які расьце ў мне. Камяк, якога я ня змог праглынуць.
— Зараз вярнуся, хлопцы, — кажу я і занураюся ў блакітную сутарэнную цемру калідорчыка.
Каля маладой, какетлівай клязэтнай бабулькі стаіць мужык з азызлым тварам, у стандартным гарнітуры.
— Туды, калі ласка, — паказвае мне на чырвоныя дзьверы, як быццам мяркуе, што я ў курсе справы.
Я штурхаю прачыненыя дзьверы, уваходзім у белы калідор, якія бываюць у сутарэньнях найпрыстойнейшых варшаўскіх камяніц. Ён выпярэджвае мяне, круціць жалезны вэнтыль у мэталёвых дзьвярах. Свой альбо чужы. Ахова альбо агент, які правярае дакумэнты ў валютчыкаў. Ён упіхвае мяне ў прасторны пакой, дзе колькі мужчынаў з-за вялікага стала глядзяць на ўрачыстую залю зьезду, якую паказвае каляровы замежны тэлевізар.
— А, гэта вы? — зьдзіўляецца рослы тып, прыстойны, але з сапсаванымі зубамі.
Ён апрануты ў цьвідавы пінжак з тых, якія зноў увайшлі ў моду. Выглядае ён як мастак, што пакутуе на дэпрэсію. Мэлянхолія і занядбаньне на твары.
— Што добрага? — дадае ён, не адводзячы вачэй ад тэлевізару.
— Усё па-старому. Зайшоў паабедаць.
— Паабедаць зайшоў? — рытарычна і з злавеснай фамільярнасьцю перапытвае кіслы франт.
Хвілю ўсе глядзім на прамоўцу, які старанна чытае зь вялікага стосу паперак. Дрэнна вымаўляе словы, паслугуецца дзіўным народным акцэнтам, якога народ не ўжывае. Але ён захоплены. Ахвота аж пырскае зь ягоных шпаркіх вачэй.
Франт пераводзіць на мяне ледзяністы пагляд. Глядзіць доўга, і цяжка ўгадаць ягоны дыягназ.
— Абшукай госьця, Зэнак.
Той, што мяне прывёў, — майстар. У вокамгненьне я апынуўся ля белай шурпатай сьцяны з паднятымі ўгару рукамі. Нешта праляцела па маёй сьпіне, пад пахамі, нават паміж ног.
— Грошы без гаманца, ключы ад кватэры, кавалак газэты і

імпартныя запалкі, швэдзкія, — канстатаваў, як для пратаколу, Зэнак.
— А цыгарэты? — спытаўся франт.
— Няма.
— Дык нашто запалкі?
— Скончыліся цыгарэты. Хацеў купіць у гардэробе, — сказаў я абыякавым тонам, каб не разьвіваць інцыдэнту.
— Пакажы газэту, — сказаў франт і неахвотна пачаў праглядаць абрывак “Трыбуны люду”.
Паспрабаваў скласьці гэты кавалак краямі адзін да аднаго, як таемную шыфроўку.
— Ну што з табой рабіць? — уздыхнуў ён, пакідаючы газэту.
Я асьцярожна маўчаў. Акон у сутарэньні не было, хоць выглядала яно як часовае жытло. У куце стаяў нават тапчан, накрыты коўдрай. Я здагадаўся, што гэта явачная кватэра.
— Як думаеце, калегі, адпусьціць грамадзяніна? — запытаўся ён у таварышаў.
Яны невыразна ўсьміхнуліся, відаць, прызвычаеныя да шэфавага стылю.
— Але ж трындзіць гэты лысы хрэн. Зэнак, зрабі цішэй.
Зэнак паслухмяна падышоў да апарата і перасунуў рэгулятар.
— Халера, нават гаварыць як сьлед ня ўмее. Цябе гэта, відаць, шакуе? — ён зьвярнуўся да мяне.
— Я не прыслухоўваўся.
— Ага. Пішаш што цікавае?
— У думках.
— У думках пішаш? — засьмяяўся франт. — Во прыкаліст, га? І пра што ж ты пішаш?
— Як заўсёды, пра жыцьцё.
— Ну, ну, доўгі перапынак у цябе быў. Мы ведаем, наведваліся да цябе пару разоў. Помніш, як ты паведамляў у паліцыю аб крадзяжох? Раз мы выпілі ў цябе каньяк, раз забралі часопісы парнаграфічныя. Га?
— Што — га?
— Не зьдзіўляла цябе, што злодзеі такія дасьціпныя?
— Мяне ўжо нічога не зьдзіўляе. Нават тое, што вы зьвяртаецеся да мяне на “ты”, хоць маглі б быць маім сынам.
Ён паглядзеў на калегаў, тыя няпэўна ўсьміхнуліся.
— Я да ўсіх так зьвяртаюся. Прывычка.
— Калісьці даў бы ў пысу за такую прывычку. Але цяпер мне

ўсё адно.
Зэнак і сьвіта пры стале замерлі ў жаху. Побач у клязэце гучна пайшла вада. Цётачка, што зьбірае плату за карыстаньне туалетам, крычыць камусьці ўсьлед абурана:
— За дзьвесьце злотых высрацца хоча, скнара!
Франтаваты шэф устаў гэтак вальяжна, як гэта яны любяць, усе яны ва ўсім сьвеце, нясьпешна ўстаў з гэтай злавеснай цырымоннасьцю разьюшанага паліцая, падышоў да мяне, хвілю ўпарта прыглядаўся.
— Навошта вы выступаеце? — сказаў я сонна. — Я за сваё жыцьцё меў прыемнасьць пазнаёміцца з гестапа, НКВД і нашай колішняй ветлай міліцыяй, якая ненавідзела гэтак званых інтэлектуалаў. Вы мяне стамляеце.
— Дык вы нас параўноўваеце з гестапа?
— Гэта вы самі параўналі, ня я.
Ён зьнянацку ўдарыў мяне ў сківіцу, і я адразу адчуў цёплы салёны смак крыві ў роце. Даўней дзясны ў мяне былі лепшыя. Цяпер крывавяцца нават ад зубной шчоткі.
— Зэнак, надзень на затрыманага наручнікі. Ён паводзіць сябе па-хуліганску.
Дабіўся я таго, што ён перастаў мне тыкаць. Ягоны падначалены з прафэсійным спрытам надзеў мне кайданкі.
— Дык на чым мы спыніліся? — сказаў франт, вяртаючыся да стала.
Ён цадзіў словы, як і дагэтуль, але я бачыў, што ён трохі зьбіўся з рытму. Ён, відаць, ня ведаў, што я пакінуў сваю вяроўку ў гардэробе. Мяне агортвала нейкае падступнае, помсьлівае задавальненьне ад выгляду гэтага небаракі, які разыгрываў нейкую старасьвецкую дзею перад сабой і калегамі, і ад успаміну пра маіх апекуноў, што штурхаюць мяне на шлях сьвятасьці.
Сьвіта пачціва маўчала. Але гэтае маўчаньне нейкім спосабам абарочвалася супраць яго. “Адны ўланскія цюкі бяз бульбы!” — крычаў нехта за сьцяной. Шэф перабраў у штучным задуменьні чыстыя аркушы на стале.
А калі б ён мяне забіў тут на месцы, падумаў я зь дзівацкай надзеяй. Умела, бяз болю, умомант. Для яго гэта дробязь, а для мяне вялікая палёгка. Мае б ня так шмат згубілі. Дый нейкая карысьць капнула б зь сьмерці затрыманага літаратара. А я, бедны, замучаны пахмельлем, ня мусіў бы туляцца аж да

вечара і перажываць тысячу разоў сваю будучую сьмерць.
— Што вы сёньня рабілі? Прашу расказаць усё па парадку, — сказаў ён урэшце, сядаючы за стол.
— Прачнуўся не ў гуморы. Ляжаў у ложку, думаючы аб сабе, аб сваіх няўдачах і аб тым, што, уласна, жыць ня варта. Уявіў сабе, як бы было добра, калі б выпадак альбо ўмелая асоба, калі б нехта ці нешта пазбыў мяне гэтага нуднага, паршывага жыцьця.
— Ну, а далей.
— Далей мыўся, займаўся туалетам, працягваючы блукаць у пэсымістычных роздумах.
— Ці вас хто наведваў?
— Так, сьпярша домакіраўнік. Раіў набраць вады, бо адключаць.
— А потым?
— Потым водаправоднік, каб адключыць газ.
— І за што ж гэта так на вас узьеліся?
Тады адзін з памочнікаў зарыпеў крэслам і сказаў:
— Там ва ўсім квартале адамкнулі ваду. У мяне таксама. Мыўся ў канторы. Няма паратунку на гэтых лайдакоў.
— Усю вуліцу Фоксал раскапалі, — уставіў другі.
— А ўвесну капалі Новы Сьвет, — уставіў Зэнак, — дык выпадкова парвалі тэлефонны кабэль. І я ўжо каторы месяц мушу бегаць у аўтамат. І што, думаеце, тая будка заўжды працуе? Хрэн, празь дзень нягоднікі вырываюць слухаўку зь мясам.
— А ў нас на Коле, — пачаў другі памочнік, — у корпусе трэснула сьцяна. Ад даху да лёху.
— Добра, добра, — раздражнёна перабіў шэф, бо гэтая плынь скаргаў пазбаўляла допыт велічы. — Вернемся да справы. Больш вас ніхто не наведваў?
— Ніхто. Пасьля я пайшоў.
— Навошта?
— На сьняданак. Сталуюся ў бары “Сямейным”, вы мо ведаеце. Каля валютнай кандытарскай, дзе даўней была фірма Бліклага.
— А па сьняданку?
— Па сьняданку прагуляўся трохі і зазірнуў на прэм’еру фільму “Пераліваньне”. Цікавая карціна, шмат моцных выказваньняў, аж дзіўна, што прапусьцілі. І вам раю. Варта паглядзець.
У падземных трубах прагучала колькі тактаў Пракоф’ева.
— Вам дрэнна? — спытаў раптам шэф.

— Так сабе. Мучае мяне пахмельле невядомага паходжаньня.
— Зэнак, зрабі пану ўкол.
Мяне імгненна прыкулі да крэсла. Гэтым разам дапамагалі абодва асыстэнты шэфа. У вокамгненьне мне падцягнулі рукавы курткі і кашулі. Нехта шлангам перавязаў плячо, а Зэнак ужо мацаў з задавальненьнем маю далікатную жылу.
“Пратэстую!” — хацеў я закрычаць пранізьлівым тэнарам, але толькі жаласна закашляўся. Я ведаў, што моцны, гучны крык — эфэктыўная форма змаганьня з самавольствам. Але ва ўсёй гэтай забягалаўцы стаяў крык, і на вуліцы крычалі маніфэстанты, і дэлегаты ў тэлевізары выгуквалі прозьвішчы абодвух сакратароў, нашага і савецкага. На крык, у прынцыпе, ня варта было разьлічваць.
Зэнак энэргічна ўбіў голку ў жылу. Краем вока я згледзеў, што шпрыц аднаразовы. Ва ўмовах агульнага дэфіцыту гуманнасьці хоць гэта, прынамсі, было гуманным. А я ведаў, што нават у прыстойных шпіталях выкарыстоўвалі ўжываныя, ледзьве памытыя ў цёплай вадзе бінтамі.
Ён укалоў мне ладную дозу цалкам, а я нічога не адчуваў. Была імавернасьць, што ампула трапілася бракаваная. Пападаліся такія ўколы, адно з фізрастворам, бязь лекаў. Фармацэўтычная прамысловасьць таксама ўжо шмат гадоў пражывала крызыс. Зэнак, пэўна, прачытаў на маім твары недавер. Ляпнуў жылу брудным кавалкам ваты і пяшчотна сказаў:
— Добры ўкол. Сапраўдны. Амэрыканскі.
— Ты хацеў сказаць “савецкі”, — паправіў шэф.
— Так, савецкі.
Яны адышліся ад мяне. Я ссунуў рукаў на руку. Яна пабольвала.
— Ну, пачнём спачатку, — сказаў шэф. — Хто вас наведаў?
— Домакіраўнік, а потым водаправоднік.
Франт узьняўся, звыклым, нармальным крокам падышоў і ляпнуў мяне канцамі двух пальцаў па шчацэ, як быццам хацеў стрэсьці павучка, а я завыў, падрываючыся на ногі. Мне здалося, што невідочныя абцугі спрабуюць сарваць маю бедную галаву зь вінта хрыбта.
— Ну бачыце, укол дзейнічае, — фамільярна сказаў Зэнак. — Лепей казаць праўду.
— Вы цяпер як вялікае яйцо, вам нават ад проймы забаліць, — шэф вярнуўся за стол. — Дык хто вас адведваў ураньні?

— Губэрт і Рышард Шміт.
— Вельмі добра, — пахваліў шэф. — І хто яшчэ?
— Толькі яны двох.
Шэф узьняўся з крэсла і рушыў у мой бок.
— Губэрт і Рышард! — крыкнуў я. — Толькі яны.
— Праўду кажа? — спытаў франт сваіх кампаньёнаў.
Яны ўнікліва сьцепанулі плячыма, але ён вярнуўся на сваё месца.
— Хай будзе так. А каго вы спаткалі падчас шпацыру?
Ён камечыў аркуш паперы ў шарык, пазіраючы на мяне дзелавітым, халодным паглядам.
— Спаткаў цюцьку. Пікуся. Ён згубіўся шмат гадоў таму, жыў сярод чужых людзей, пэўна, пакутаваў і тужыў па нас, а цяпер я яго знайшоў на Павісьлі.
Ён пстрыкнуў у мяне папяровым шарыкам, які трапіў мне ў лоб. Я завыў і паваліўся з крэсла. А боль падзеньня быў зусім нязносным. Я доўга падбіраўся з бэтоннай падлогі.
— Падчас шпацыру я спаткаў знаёмую дзяўчыну.
— Як яе завуць?
— Я няправільна сказаў. Я хацеў сказаць, што падчапіў яе ў часе шпацыру. Ня ведаю яе прозьвішча.
— А імя?
— Галіна.
— Галіна, — паўтарыў шэф і паглядзеў на кампаньёнаў.
Недзе, за нейкаю сьцяной, чуўся гвалтоўны шум, як быццам нехта прабіваўся да нас па трубах. “Ратуйце, мяне атруцілі! Божа, дзе тут прыбіральня!” Нармальнае водгульле нашых рэстарацыяў.
— Млосна вам, — канстатаваў франт.
Яго нават можна было назваць прыстойным, калі б ня гэтыя зубы. Відавочна, хлопец баяўся дантыста альбо ня меў часу.
— Млосна, — прызнаў я. — Блага сёньня пачуваюся.
— Як вы думаеце, чаму мы запрасілі вас на гутарку?
— Ня ведаю, — сказаў я апатычна. — Усіх выклікаюць на гутаркі.
— Вам у нас не падабаецца, праўда?
— Прыкрае месца, далібог.
— Не. Я пытаюся наагул.
— Наагул мне таксама не падабаецца.
— Во і я аб тым. Мне таксама шмат рэчаў не падабаецца. Вам

таксама, хлопцы, слушна кажу? — яны няўпэўнена пацьвердзілі. — Напрыклад, мне не падабаецца мая праца. Гэта выдумка розных там пісакаў, што чалавеку прыемна катаваць іншага чалавека. Мяне ўжо ванітуе ад гэтай працы. Ня верыце мне?
— Трохі сумняюся. Я, пэўна, перачытаўся тых пісакаў.

Ён ізноў устаў, задуменна запаліў цыгарэту маёй швэдзкай запалкай. Прыгледзеўся да яе зыркага імпартнага агеньчыка, а потым задзьмуў яго. Падышоў да мяне, як занепакоены лекар, і пырнуў мяне ў грудзі ўказальным пальцам. Я завішчаў, падрываючыся на ногі.
— Ня ведаю, якое прозьвішча, але ведаю, дзе жыве.
Ён засьмяяўся нармальным сьмехам, ужо зусім не дэманічным, і хацеў мяне ляпнуць, але апомніўся.
— А вы думаеце, што мы ня ведаем? Я вас крануў, каб спраўдзіць, ці ўкол дзейнічае. Дык на чым мы спыніліся. Ага, ужо ўспомніў. Вось жа, мая праца агідная і вартая ганьбы. Але яе можна выконваць і так, і гэтак. Я якраз выконваю яе гэтак, праўда, хлопцы? — і затрымаў на іх пагляд, яны з гатоўнасьцю кіўнулі. — Пастаўлена задача, каб на кожным узроўні былі нашыя людзі, гэта значыць такія, як вы і я. Бо мы апазыцыянэры, хоць вы — нэгатыўны апазыцыянэр, а я — пазытыўны. Вы адкідаеце цырыманіял, надбудову, эстэтычную форму, я — прагматыку, штодзённасьць, функцыяваньне інфраструктуры. Вы рэпрэзэнтуеце шляхетную пасіўнасьць, я — трывіяльнае дзеяньне.
Ён пагладзіў мяне па валасох, і я заенчыў.
— Калі ласка, не саромейцеся. Вашыя крыкі, енкі, плач даводзяць, што мы працуем эфэктыўна. Нас таксама кантралююць, і мы мусім зважаць, каб у нашыя шэрагі ня ўбіўся хто каньюнктурны, хто з-за кола ідэйных апазыцыянэраў.
— А савецкія дарадцы? — спытаўся я і адразу страціў прытомнасьць.
Я абудзіўся на шурпатай падлозе. Зэнак паліваў мяне вадой зь вядра. У левым вуху гучалі нейкія альпійскія вадаспады, нейкія тарнада Індыйскага акіяна. Вушніца апухала, разрываючы скуру галавы. Зэнак, крэкчучы, падняў мяне з падлогі і пасадзіў на крэсла.

— На гэтыя тэмы мы гутарыць ня будзем, — сурова сказаў шэф.
— Спадзяюся, што вы гэта запомніце.
— Так, пастараюся, — я дзьмухануў кутком роту ў бок распухлага вуха.
На экране тэлевізара карыфэй польскага мастацтва, амаль стогадовы стары, які нагадваў нежывую чарапаху, прысягаў на вернасьць правадыром абедзьвюх партыяў. З аднаго боку яго падтрымліваў — на маё зьдзіўленьне — Булат, з другога — маладая таленавітая піяністка. Уласна кажучы, яны несьлі яго, сьціскаючы сухія, як яйкі, локці, а ён манатонна хітаў лысай схіленай галавой. Прэзыдыюм рытмічна пляскаў у далоні, пачцівы стары ў такт гэтых воплескаў падрыгваў даўно памерлым чэрапам.
— Скажу вам больш, — азваўся франт. — Першы сакратар — таксама наш чалавек. Ён належыць да вялікага войска пазытыўных апазыцыянэраў, хоць і не кіруе ім. — Ён ізноў засьмяяўся і ўзьняў палец, якім перад гэтым ударыў мяне. — І тут мы сутыкаемся з спэцыфічнай дыялектыкай нашай, так бы мовіць, часасыстэмы. Вы з трывогаю паглядаеце на маіх супрацоўнікаў? Ня бойцеся, калі ласка, яны верныя і ляяльныя. Апроч таго, яны б не асьмеліліся данесьці, зьлякаліся б паўтарыць, у іх гэта ў горле захрасла б. Яны становяцца хаўрусьнікамі праз суўдзел. Так, як і вы.
— Ці можна задаць адно пытаньне?
— Валяйце.
— Дык чаму ж мы ў няволі?
Ён вярнуўся да стала, сеў, схіліўшыся над стальніцаю. Корпаўся там, нібыта шукаючы патрэбнае паперкі.
— Бо такі расклад. Тэктанічны расклад глябальнай палітыкі.
— Самі сябе ўзялі ў палон і трымаем за кратамі? — здагадліва спытаўся я.
Ён ухвальна бліснуў вачыма.
— Вось у тым і рэч. Мы апярэдзілі прыгнятальніка. Перахітрылі яго. Мы вольныя дзякуючы таму, што самі сябе ўзялі ў палон.
— Нас прыгнятае гісторыя?
— А вы б хацелі, каб гэта хто быў?
— Я хацеў бы, каб гэта была гісторыя, бо гэта больш ганарова.
— Гісторыя, гісторыя, — ён усьміхнуўся, тушачы цыгарэту аб падэшву, бо папяльнічкі не было, — таямнічая незнаёмка. Рухі людзкіх масаў, тэктанічныя зрухі эканомікі, эпідэміі

псыхалягічных траўмаў, памкненьні сапсаваных бунтоўнымі генамі індывідуумаў і гэтая мэтафізыка часу, безь якой не было б гісторыі. Мы тут языкамі мянцім, а вы, відаць, марыце пра абед. Ну дык што, можа, пабачымся вечарам?
Я моўчкі спрабаваў устаць з крэсла.
— Зэнак, дапамажы пану. Значыцца, да вечара?
— Ня ведаю, што вы маеце на ўвазе?
— Час пакажа, вось што, гісторыя пакажа. Бачыце, усё прайшло гладка. Я нават не патрабую ад вас ніякіх абяцаньняў што да захаваньня таемнасьці. У даўнія, пячорныя часы ў нас падсоўвалі на подпіс паперкі, якія прымушалі маўчаць. А я толькі пацісну вам руку. Мы з аднаго племя, альбо, калі вам лепей падабаецца, ад адной нівы.
І сапраўды падаў мне руку, але я адразу адступіў.
— Дарэчы. Чаму вы ня пішаце?
— Думаеце, варта пісаць?
— Разумнікі кажуць, што ня варта. А калі разумнікі так кажуць, то значыць, што варта. У мяне нават ёсьць пэўная ідэя. Пішэце для канкрэтнага чытача, гэта заўжды лепей. Прыкладам, для мяне. Адкіньце цэнзуру, забудзьцеся пра дзяржаўны лад, усялякія страхі і пішэце, як вольны для вольных. Вы заўжды былі славалюбным, але не марнаслаўным. Велічыня накладу ня мае для Вас вялікай ролі. Лепей адзін разумны чытач з сапраўднай літаратурай у руках, чым дзясяткі тысяч кішачнаполасьцевых з туалетнай паперай у жмені. У мяне вашая кніжка ня згіне. Толькі ў маіх руках яна мае шанец на выжыцьцё, на вечнасьць.
Ён падаў мне руку асьцярожна, баючыся дадаць болю.
— Да пабачэньня.
І, о дзіва, пайшоў перада мной, першы выйшаў з гэтага пакою. Тады наблізіўся Зэнак, далікатна паваліў мяне на падлогу і пачаў зь дзівоснай лагоднасьцю біць мяне па скабах, але рабіў гэта так умела, быццам толькі хацеў носікам чаравіка паправіць столкі маёй пакамечанай курткі. Лёгка зносячы гэтую ці то пяшчоту, ці то катаваньне, я прыглядаўся да аднаго з памочнікаў шэфа, які гэта вельмі прафэсійна здымаў, безупынна пстрыкаючы бліскавіцай. Пасьля Зэнак падняў мяне з падлогі, абтрос маю вопратку, зьняў кайданкі і моцна штурхнуў мяне ў бок выхаду. Скончыўся нейкі заблытаны спэктакль, і ход гэтага спэктаклю стаўся неспадзяванкай як для

мяне, так і для маўклівых рэжысэраў.
Я ўвайшоў у калідорчык каля прыбіральні, хацеў скіравацца да залі рэстарацыі, але мяне спыніў суровы голас досыць харошай цётачкі, што сядзела на ўваходзе.
— З вас шэсьцьсот.
— Я не карыстаўся прыбіральняй.
— Поўгадзіны праседзеў і не карыстаўся.
— А за што аж шэсьцьсот?
— За тое самае. Усе брэшуць, каб адкруціцца. Сораму няма.
Я даў тысячу і націснуў на прыадчыненыя дзьверы, увайшоў у рэстарацыю, але гэта была не рэстарацыя. Дзьверы гучна замкнуліся за мной з прыкрым скрыгатам нейкага мэханізму.
Я апынуўся ў пачакальні з фатэлямі і засохлымі кветкамі. На адным з фатэляў паўляжаў мой знаёмы апаратчык, таварыш Кабялка. Відаць, апраналі яго прымусам, бо кашуля была вывернутая на ліхі бок, боты не зашнураваныя, а гальштук зьвісаў зь сьпінкі фатэля.
Але ён паглядзеў на мяне цьвярозымі вачыма.
— Дзень добры, суседзе, — сказаў стомленым голасам.
— Дзень добры. Вы мяне пазналі?
— Заўсёды пазнаваў, штодзень, але Вы самі разумееце, тады я ня мог вітацца. Дзе Вы распрануліся?
— Я не распранаўся. Я прыйшоў паабедаць у “Парадыз”.
— Вы памыліліся. Хто Вас сюды пусьціў?
— Мабыць, Зэнак.
Ён уважліва паглядзеў на мяне і зрабіў запрашальны жэст у бок фатэля.
— Значыць, вас дапытвалі. Пэўна, у зьвязку з маёй справай?
— Не. З маёй уласнай.
— А Вы не распраналіся?
— Прыпушчаю, што я па іншай лініі.
— Вам зрабілі ўкол?
— Зрабілі.
— Мне таксама. Але ўжо амаль не баліць, — ён шчыпнуў сябе ў руку. — Хочаце цукерачку зь зьезду?
— Я б лепей пайшоў паабедаў.
— Ну, паспрабуйце, — сказаў ён, хітаючы галавой.
Я падышоў да дзьвярэй, націснуў клямку. Нават не зварухнулася. Ударыў бокам у панэль дзьвярэй. Як аб камень.
— Бачыце, якія штучкі. І хочацца ж ім. Я ведаю, чаму тут сяджу.

Чакаю машыны, але я толькі трэці ў чарзе. Фатальны дзень. Штогадзіну нехта распранаецца. Ведаеце, гэта вісіць у паветры. Аднойчы зьбярэцца, як перад бурай. Людзі не вытрымліваюць. Велізарная напружанасьць.
Ягоныя вочы крывава блішчэлі, але ў іх не было фанатызму. Хутчэй дзікасьць, гістэрычная адвага.
— Ведаеце, суседзе, я адчуваю палёгку. Першы раз за шмат гадоў я пачынаю разьнявольвацца. Я стомлены, слабы, але мне добра. Ня сплю тыдзень. Сёньня ўраньні, калі Вы мяне бачылі, я ледзьве-ледзьве стрымліваў сківіцы, каб зубы ня ляскалі. Я чакаў гэтага дня з часу папярэдняга зьезду. Я напісаў тэкст у строгай таямніцы, ня дома, ведаеце, проста на паляваньні. Трымаў яго ў дупле і штонядзелю езьдзіў вучыць яго на памяць. Вучыў і забываўся. Бо раптам падчас канфэрэнцыі, нарады альбо на пленуме я з жахам усьведамляў, што такія словы ня пройдуць праз мае вусны. Вось жа, я забываў іх і пісаў новыя, пасьля ў парыве сьмеласьці альбо роспачы сьціраў з памяці гэтыя новыя і аднаўляў старыя. Так, даражэнькі суседзе, я вагаўся добрых колькі гадоў. Начамі я ў думках сам сабе чытаў гэтую прамову. Зь зьдзекам, гнеўна, месцамі з патасам. Рабіў паўзы, чакаючы воплескаў, уздымаў голас да крыку, каб перакрыць лямант і галас няўхвалы. Усё сам перад сабой уначы. На тым зьезьдзе я важыў дзевяноста пяць кіляў. А цяпер мяне тут узважылі, і ўгадайце колькі?
— Цяжка сказаць. Восемдзесят.
— Шэсьцьдзесят сем, — трыюмфальна захрыпеў Кабялка. — Як савецкі каляровы тэлевізар.
— Відаць, усё ж на тры кіляграмы болей.
— Я, суседзе, дзеяч старога гарту. Усё ператрываў, але гэтых часоў не магу трываць. Вычарпалася трываньне, і ўсё тут. Патрымаюць мяне ў вар'ятні, але напэўна ва ўрадавай, патрымаюць з паўгоду і адпусьцяць на пэнсію. Можа, нават дадуць пашпарт на выезд у іншае ваяводзтва.
Ён бесьперастанку гаманіў, і было відаць, што ён няхутка спыніцца. Плынь слоў і хаатычных думак, якую гэтулькі гадоў стрымлівалі, цяпер вылівалася на маю бедную пахмельную галаву. Пахмельную — добра, але з чаго?
Кабялка зырваў сухі ліст і пачаў нэрвова жаваць яго.
— Вы, суседзе, таксама на пэнсіі? Я бачу ў акно, што Вы цэлыя дні альбо дома, альбо на шпацыры.

— Я сам сабе вызначыў пэнсію. Але цяпер вяртаюся да дзейснай службы.
— Ці Вы звар'яцелі? Ім ужо канец, ну так, ім канец, — апошнія словы ён вымавіў павольна і неяк безь перакананасьці. — Гэтулькі гадоў я казаў гэта сабе ў думках. У першага сакратара і ў прэм'ера, а таксама на прэзыдыюме рады міністраў. Думаеце, ім канец?
— Усяму канец. Вада канчаецца, вугаль канчаецца, і канец сьвету блізка.
— Слабое суцяшэньне. А я, суседзе, такі падкаваны, такі вучоны, а запнуўся, халера. Выкрыкнуў гэтыя словы, вы, мусіць, чулі: "Таварышы лайдакі, таварышкі сьвіньні". Можа, такі зварот — кепскі густ, пэўна, нават нядобра, неяк зусім непаважна, але я прызвычаіўся. Папросту ня мог сабе адмовіць. Вось жа, выгукнуў гэтыя эпітэты і запнуўся, халера. Аніводнага наступнага слова ня помніў. Што я кажу: слова! Складу ня помніў, халера, тэмы ня помніў. Горача і вата ў галаве. Ну і пачаў крычаць з гэтай галавы, з гэтай ваты, абы толькі ім дапячы. Можа, гэта і было недарэчна, дарагі суседзе, але, я чуў, у тэлевізіі гук вымкнулі. Дык няма чаго маркоціцца, людзі толькі бачылі, што я пратэстую, праўда?
— Супакойцеся. Калі ласка, дыхайце павольна, рытмічна.
— Я супакоюся разам з вар'ятамі. Але ж там вар'ятаў няма. Адны калегі. Хто ведае, як там будзе, але хіба ж ня горш, чымся ў міністэрстве.
Ён на момант замаўчаў, каб выплюнуць зжаваны дашчэнту аб'едак ліста. Дрыготкімі пальцамі саскроб яго зь языка і намагаўся стрэсьці на падлогу.
— Ня ведаеце, якая сёньня насамрэч дата? — скарыстаўся я з нагоды.
Ён паказаў вялікім пальцам на суседнюю сьцяну.
— Яны толькі ведаюць. Бясьпека. А мо і яны ня ведаюць. Толькі міністар альбо тайная калегія. Імпартны каляндар вісіць у сэйфе, вялікім, як цэлы пакой. Штодзень міністар з захаваньнем цырыманіялу ўваходзіць туды ў строгай таямніцы і адрывае старонку, а аўтамат спальвае яе ў попел. Ніхто ня ведае даты, бо цэлыя гады то выконвалі тэрміны датэрмінова, то завальвалі. То гналіся, гналіся за Захадам і пераганялі, а іншы раз гналіся і заставаліся ззаду. Кожная галіна прамысловасьці, кожная ўстанова, кожны дзяржгас меў свой

каляндар і зь ім змагаўся. Пяць месяцаў наперад, тады дванаццаць назад. 1974-ы ў 1972-м, пасьля 1977-ы ў 1979-м. І ўсё паблыталася. Ніхто нічога ня ведае. Па сонцы, суседзе, неяк яшчэ жывём. Але бардак поўны.
— Можна спраўджваць па Захадзе. Даўно ня слухаў вольнага радыё.
— Можна, — засьмяяўся Кабялка і адразу страшна закашляўся.
— Яны прынялі выклік. Пачалі то ўцякаць ад нашай пагоні, то запавольвацца, калі мы адпускалі. Яны таксама зьбітыя з панталыку. Таксама ідуць ураскіраку.
— Скуль тады гэты каляндар у Міністэрстве бясьпекі?
Кабялка бездапаможна разьвёў рукі.
— А вось гэтага і я ня ведаю.
Я падышоў да дзьвярэй і прыслухаўся. Недзе за чырвонымі дзьвярыма аднастайна шумела вада, як вясковы ручай.
— Усё гэта яшчэ трымаецца, — спрабаваў рацыяналізаваць свой унутраны хаос няшчасны Кабялка, — усё гэта яшчэ трымаецца на вяровачцы, на шпагаце айчыннай вытворчасьці, на павуцінцы надзеі. Мы дэмаралізавалі капіталізм. Ушчэнт і дазваньня. Страшным прыкладам. Мы так пазьвязвалі іх гаспадарчымі, навуковымі, культурнымі, спартовымі і якімі хочаце іншымі дамовамі, так іх пазьвязвалі, як калючым дротам, каб яны і далей завальвалі тэрміны, фальшавалі якасьць, недаплачвалі грошы, ашуквалі і напіваліся гарэлкай, што па нейкім часе і ў іх ашчэрыў зубы наш уласны, намі вынайдзены і выгадаваны татальны сацыялістычны бардак. А Вы, дарагі суседзе, зьвярнеце ўвагу на тое, што пэўны час ад нас выпускалі людзей за мяжу. Што яны там рабілі? Псавалі тэлефонныя аўтаматы, езьдзілі зайцам у мэтро, улазілі паўсюль без чаргі, кралі прыборы ў рэстарацыях, не плацілі па рахунках у гатэлях, спойвалі тубыльцаў, забруджвалі грамадзкія прыбіральні і дзе толькі маглі разбэшчвалі тамтэйшых жанчын. Суседзе, калі гэта ўсё зьберці і падсумаваць, дык хто ж зьдзівіцца, што гэтак званы вольны сьвет робіцца ўсё больш падобны да сьвету савецкага? Вось гэта, дарагі суседзе, і ёсьць апошняя не адыграная дактрына, можа, самога Ільліча: калі мы не дагонім капіталізму, то капіталізм сам нас пачакае.
Ён скончыў свой маналёг і панура задумаўся. За сьцяной гучала музыка. Гладкая, спраўная, у пэўным сэнсе панадчасавая і ўнівэрсальная карчомная музычка. Усё-такі мы

знаходзіліся паблізу ад рэстарацыі. Толькі як у яе трапіць? Я абнюхаў дзьверы. Дзьверы як дзьверы, бруднаватыя, патрэсканыя сям-там, з банальнай клямкай, а зачыненыя — як жалезная брама. Нейкі сабачка брэша ў пашчы гэтага Гадэсу, пэўна, мой Пікусь.
— Ляжце ямчэй, — сказаў я Кабялку. — Такое перажыванне магло Вас забіць. Трэба сябе ашчаджаць.
— Я, суседзе, просты, прыстойны чалавек. Я не філёзаф. Бачу, што чорнае, то й кажу, што чорнае. А як белае, то белае. А яны, Вы ж заўважылі, увесь час філязафуюць. Чым горш жывецца, тым больш філёзафаў. Чым відавочнейшы абсурд, тым глыбейшыя думкі. Чым больш бяспраўя, тым лепш разьвітое права. Чым больш усюды хаосу, тым больш замілаванья сымэтрыяй. Панапісвалі цэлыя купы філязафічнага хламу. Ды якія купы — цэлыя горы, цэлыя Гімалаі. Калі б гэтымі гіпотэзамі, тэзамі, аксіёмамі, ісьцінамі і догматамі пачаць паліць у печах, дык энэргіі хапіла б да канца сьвету.
— Але ж Вы таксама філязафуеце.
— Я філязафую? — зьдзівіўся Кабялка. — Я толькі кажу, як ёсьць. О Божа ўсёмагутны, хутка я ўжо адпачну. Адзенуць мяне ў цёплую, ватную зьмірэнчую кашулю, лягу я на падлозе ў зацішным пакойчыку, абітым тоўстай матэрыяй, буду глядзець у столь, драмаць, думаць пра ўсіх тых паненак, якіх некалі не прыгарнуў, бо не выпадала, калі-нікалі абуджуся з забыцьця, паблюзьнеру ўдосталь, выкрыкну пару брыдкіх польскіх і расейскіх матаў, якія мне даўно карціць ужыць. Суседзе, у нас пачынаюць ужо шанаваць вар'ятаў, як у Расеі. Даўней, дарагі суседзе, кожнага падшыванца, што выступаў супраць ураду, садзілі на псыхіятрычнае абсьледаваньне. Маўляў, раз ён супраць народаўладзьдзя — значыць, ён вар'ят. Цяпер гэта і ўявіць цяжка. Палічы, суседзе, колькі нашых прэм'ераў, сакратароў, прафэсараў марксізму-ленінізму гасьцюе ў дурдомах. У наш час вар'ятні сталі як бы філіямі нацыянальных акадэміяў.
Кабялку яўна цешыла ўяўленьне пра ягоную будучую кар'еру. Але ў гэтым самасьцьвярджэньні ўсё-такі прысутнічаў пэўны непакой. Я маўчаў, думаючы пра свае справы, і гэта ўрэшце абудзіла падазрэньні.
— А мо я кепска зрабіў? — заенчыў ён раптам. — Чым гэта дапаможа? І так мур галавой не праб'еш. Ці ж гэта мне

збаўляць сьвет? Чаму мне, а не, прыкладам, Бахенку? Урэшце, жылося ж неяк, нават іншым людзям мог дапамагчы.
— Бахенак таксама распранецца, — сказаў я катэгарычна.
— Вы думаеце? — праныў Кабялка.
— А Вы прыгледзьцеся калі да ягоных вачэй.
— А пры чым тут вочы?
— Вочы найперш. Калі такія баязьлівыя, хваравітыя, сьлязьлівыя, то, значыць, распранецца.
— Я б шмат даў, каб гэты сукін сын распрануўся, — уздыхнуў Кабялка. — Думаеце, ня варта шкадаваць?
— Ні аб чым ня варта шкадаваць. Вы толькі прысьпешылі бег гісторыі.
— О, халера, — зьдзівіўся Кабялка.
У гэты момант заскрыгатаў замок. Дзьверы лёгенька адчыніліся, нібы ядвабная фіранка, і ўвайшоў Зэнак.
— У імя Айца і Сына, — прамовіў ён, зьдзіўлены сустрэчаю з мной. — Што вы тут робіце? Там абед стыне.
— Я думаў, гэта ўваход у рэстарацыю. Памыліўся.
— Дык трэба было выйсьці. Праўду кажучы, вам і нельга тут быць.
— Я ня мог адчыніць дзьвераў.
— Што вы, дзіцё? — ён тры разы закрыў і адкрыў дзьверы знутры, нібы штукар. — Вельмі проста.
— Як зваць Вашага шэфа? — спытаўся я няведама нашто.
— Гэта не таямніца. Жорж, даўней Жоржык. Калі быў малады.
Кабялка ўпаў на сьпіну на вылінялы фатэль, вырачыў вочы, пачаў брыкаць нагамі і хрыпець: “Гы, гы!” Зэнак паглядзеў на яго пагардліва.
— Няма чаго выдурвацца, вас ужо залічылі да вар’ятаў. Быў званок з ЦК.
— Праўда? — ажывіўся Кабялка. — Тады вялікі дзякуй.
— Няма за што, — я падышоў да дзьвярэй, націснуў яшчэ цёплую ад Зэнакавай далоні клямку.
— Я ўжо магу ісьці? — спытаўся я.
— Хвіліначку, — сказаў Зэнак і наблізіўся да мяне, корпаючыся за пазухай. — Ведаеце, я здумаў прачытаць што з Вас. Шэф казаў, што справа вартая, а я Вас упадабаў. Праўда, у мяне яшчэ няма Вашай кніжкі, але вось мой нататнічак, мо вы дасьцё мне аўтограф?
І падсунуў мне каляндарык з чыстай старонкай, на якой быў

толькі адзін напіс: “Гэля 63-24-71”. Я падпісаўся пад Гэляй, ён паціснуў мне руку.
— Бачу, ужо не баліць, — ён зычліва ўсьміхнуўся. — Для вас як для брата. Ну, той укол.
— Да пабачэньня, пане Кабялка.
Сусед сумна ўсьміхнуўся.
— Я ўжо Вас не пабачу.
— Можа, і я Вас не пабачу.
— Пабачыцеся, пабачыцеся, — засьмяяўся дабрадушна Зэнак.
— У нас усе сустракаюцца.
— Бывайце здаровыя, — сказаў я.
— Шчасьліва, — адказаў Кабялка.
Я ўжо быў у дзьвярах, калі Зэнак ізноў паклікаў мяне пальцам-сьвердлам.
— Дазвольце, калі ласка. У мяне для вас нешта ёсьць.
І падаў мне пушачку швэдзкіх запалак, якой пакарыстаўся шэф Жоржык.
— У нас нічога не губляецца.
На ніжэйшых узроўнях яшчэ загаворваюць зубы, падумаў я, выходзячы нарэшце з гэтай залі чаканьня. Яны яшчэ помняць даўнія часы і даўнія практыкі свайго ордэну. Тады яны былі артыстамі, цяпер — філёзафы.
— Гэй, вы зноў не заплацілі! — крыкнула маладзенькая цётачка-касірка.
Я вярнуўся да яе службовага століка, на якім замест касы стаяла талерка.
— Мілае дзіця, — сказаў я ёй. — Я ж выходжу з гэтых дзьвярэй, а не з даручанай вам кабінкі. Я хацеў бы таксама нагадаць, што ўжо аднойчы пакінуў тысячу.
— А, прабачце, памылілася.
— Толькі дзіўная ў вас стараннасьць. Такое прыгожае, мілае дзіця, а такое агрэсіўнае.
— Бо я тут на практыцы.
— На якой практыцы?
— На студэнцкай.
— Ад якога факультэту?
— Ад археалягічнага. І маю працу тут кантралююць, ведаеце.
Аднаго разу пракраўся камэндант нашага будатраду, такі паскудны дацэнт, а я ня згледзела і пасьля былі непрыемнасьці. А калі атрымаю шмат пунктаў за гэтую практыку, то мяне

вызваляць ад здачы прапэдэўтыкі філязофіі.
— Ну, Зосенька, гэта іншая рэч.
— А скуль вы ведаеце маё імя?
— Я ўсё ведаю. Можа, яшчэ наведаюся. Але прыватна. Можна?
— Ох, ня ведаю. А калі прыйдзе кантроль?
— То схаваюся ў кабінцы.
Урэшце бліснулі ўсьмешкай яе вочы. Гэтая інтрыга падабалася маладой цётачцы.
— Калі ласка, прыходзьце, толькі асьцярожна.
Я пагладзіў яе па галаве, шорсткай, як карона снапка. Трапляюцца яшчэ ў нас прыгожыя дзяўчаты, але ўсё радзей. Неўзабаве перастануць падабацца хлопцам, бо нетыповыя, у іншым стылі, як бы чужыя біялягічна. Шкада, што мяне ўжо ня будзе.
У гардэробніка вочы былі мутныя, ён зь цяжкасьцю трымаўся за стойку. Паволі ўзыходзіў на арбіту. Відавочна, любіў пачынаць у гэты час.
— Вы ўжо выходзіце? — спытаўся ён.
— Не. Я толькі прыйшоў.
— А мне здаецца, што вы ўжо былі і нешта пакінулі. Нават помню што.
— Маеце рацыю. Я выскачыў на хвілінку і во вяртаюся.
Ён быў зычлівы, і разам з тым суровы. Ягоная стрыманасьць у дачыненьні да кліентаў была абгрунтаваная, бо шмат гасьцей чакалі месца ў чарзе, што ўздымалася па сходах угору і канчалася на вуліцы.
Я ўвайшоў у залю, якую ня бачыў колькі гадоў, хоць менавіта тут я некалі пачынаў сваю біяграфію. Мусіць, яе шмат разоў перабудоўвалі, але яна захавала сваю першапачатковую форму глыбокай студні, аблямаванай угары галерэяй, дзе сядзелі горшыя госьці, усякія саплякі камандзіровачныя. Цяпер “Парадыз” прэзэнтаваў стыль мадэрн у стане руіны. Гэта значыць, паводле архітэктуры і дэкору ён пасьпяваў за сусьветным стандартам, але пры гэтым нагадваў руіны, якія вось-вось паваляцца. Такім, зрэшты, быў стыль усяе дзяржавы. Як быццам усе гэтыя людзі чакалі хуткага пераезду ў новую краіну.
Але ўсе столікі былі занятыя. Афіцыянты зь цяжкасьцю праціскаліся вузкімі прасекамі ў бок змрочнай кухні. На пляцоўцы для танцаў рухаліся некалькі параў. Граў узорны

аркестар інвалідаў сталічнага саюзу кампазытараў. Пра гэта паведамляла шыльда на калёне з штучнага пясчаніку. Іншы надпіс абвяшчаў, што афіцыянты заступілі на сацыялістычную вахту.
Але месцаў не было. Я стаяў на ўскрайку і ўглядаўся ў блакітна-чырвоны паўзмрок. Урэшце я ўбачыў Кольку Нахалава, які сядзеў за прыстойным столікам зь нейкай бляндынкай з надта моцна начасанымі валасамі, чаго нашы старыя ніколі ня бачылі. У яе быў вялікі чырвоны твар з энэргічнымі зморшчынамі, дужыя вусны, павялічаныя яшчэ багатай, чырвонай, як кроў, памадай, дый бюсту ёй таксама не бракавала. Іншага дадзена не было, мне давялося шукаць падтрымкі ў Колькі.
Я падышоў да століка, цырымонна пакланіўся.
— Шукаеш месца? — спытаўся Нахалаў. — Сядай, братку, не саромся. Дазвольце пазнаёміць: мой сябар, слынны літаратар.
— Відаць было, што яго цешыць гэтае знаёмства, што яно ўзвышае яго ў аччу бляндынкі.
— Вялікі дзякуй. Я толькі на хвілінку. Зьем што і адразу ўцяку.
— Можаш заставацца хоць да ранку, праўда, пані Госю?
Яна элегантна схіліла залацісты начос, як асінае гняздо, а я пацалаваў ёй ручку, аздобленую чарнявым рабаціньнем.
— Гэта добрае знаёмства, братку, — сказаў Колька. — Пані Гося загадвае кінэматаграфіяй.
— Ого, — ветла зьдзівіўся я.
— Яна спэцыялізуецца на арэндзе ў дзяржавы прадпрыемстваў-банкрутаў. Калісьці гэта былі фабрыкі, гандлёвыя дамы, а цяпер перакінулася на культуру.
Пані Гося міла ўсьміхнулася.
— Колька перабольшвае, як заўсёды. Ведаеце, я выкупляю ў Міністэрства культуры кінутыя фільмы. Разумееце, такія, якіх не ўдалося скончыць. Бо ім вытворчасьць усё цяжэй даецца. Рэжысэр, апэратар змагаюцца пэўны час з агульнай бяздарнасьцю. З тым, што людзі спазьняюцца, не дастаўляюць рэквізыту, забываюцца пра тэрміны, губляюць зьнятую стужку і ўвесь час п'юць. Вось жа, праз пару тыдняў вытворчасьць сама сабою згасае. Усе зьнікаюць, застаецца пустое бюро і рэжысэр у стане, блізкім да самагубства. Тады зьяўляюся я, купляю фільм за паўцаны і канчаю з сваёй групай.
— Гэта яна закончыла "Пераліваньне", — пахваліўся Колька.

— Бо я плачу. У мяне ня трэба красьці.
— Гэта цудоўная вынаходка.
— Каб вы ведалі. У маёй групе праводзяць дасьледаваньні прафэсары Галоўнай школы плянаваньня і статыстыкі. Я паддосьледны трус, — засьмяялася яна, паказваючы зубкі, вымазаныя той самай памадай.
Колька паклікаў афіцыянта. Гэта быў змрочны брунэт у заплямленым халаце. Ён злосна чакаў з алоўкам, прыціснутым да чэкавага блякноціка.
— Я б узяў рагу, — сказаў я няпэўна, — але з чаго гэтае рагу?
— Я ня ведаю. Гэта не да мяне пытаньні. Ёсьць у мэню рагу і добра. Што я вам, буду хадзіць у кухню і ў гаршкі заглядаць? — узьвіўся афіцыянт.
— Вы разнэрваваліся, — я хацеў яго ўласкавіць.
— Вас гэта зьдзіўляе? Усе ядуць, а я працую.
— Тады рагу, калі ласка.
— Усё? Бо я не зьбіраюся да вас сто разоў падыходзіць.
— Дзякуй. Усё.
Афіцыянт пайшоў некуды ў цемру. Колька загадкава ўсьміхнуўся.
— Ён заўжды такі спачатку. А пад ранак ставіць гасьцём “залатую восень”. Дарэчы, вып’еш келіх?
— Паспрабую, — сказаў я.
Ён напоўніў крышталёвы кілішак да краёў чыстай з імпартнай бульбы. З боку па чарцы пачалі сплываць срабрыстыя кропелькі.
— Ну то ня будзем длякаць, — сказаў Колька. — Шліфавальнік разануў твой келіх ад душы, таму ён і цячэ. За шліфавальніка.
Мы асьцярожна стукнуліся чаркамі. У мяне ўжо было мокра ў рукаве. Мяне вярнула ад гэтай вадкасьці, але я перасіліў сябе і праглынуў пякучае зьмесьціва кілішка.
— А можа, будзе добра, — ціха сказаў я.
— Пэўна, будзе. Чаму ж ня будзе, — прамовіў Колька.
Аркестар іграў цяпер нейкі амбітны твор сучаснага айчыннага кампазытара. У краіне бракавала валюты на тант’емы. Ніхто не пратэставаў, усе былі прызвычаеныя. Пары з пляцоўкі для танцаў разышліся да столікаў. Я заплюшчыў вочы, і мне здалося, што цяпер усё так, як тады. У той вечар таксама нехта граў на фартэпіяна ўласны твор. А я сядзеў зь дзяўчынай, якая пасьля стала маёй жонкай.

— Я вас, здаецца, аднекуль ведаю, — азвалася пані Гося.
— Я ўсім некага нагадваю. Дакладней кажучы, кожнаму нагадваю некага іншага. Гэта так, як бы мяне наагул не было. Мяне адзінага, індывідуальнага, з уласным непаўторным генэтычным кодам. Я кожны з вас, шаноўная, шараговы чалавек з вуліцы, трохі Колька, трохі афіцыянт, а можа нават, цешуся, трохі вы, паважаная прадусарка “Пераліваньня”. Толькі цяпер я заўважыў, што дзе-нідзе пад сьценамі стаяць кінутыя транспаранты дэманстрантаў, якія схаваліся ў “Парадызе”.
— Ці гэта новая сэкта, ці наагул новая рэлігія? — пытаецца Гося.
— Даруйце, не дачуў.
— Тое, што вы кажаце.
Патрэсканыя сьцены, заржавелая пазалота, міргатлівае сапсаванае асьвятленьне. Сучаснасьць, якая памірае ад інфаркту. Блакітна-чырвоны паўзмрок, поўны разбэшчаных твараў. Кожнае рыла — сьмяротны грэх. Кожная пыса — блюзьнерства. Гуд у мурох, гул у галаве, выцьцё на паддашках. Голас божага гневу.
— Так. Ведаю. Я ўспамінаў.
— Што вы ўспаміналі?
— Чаму ў мяне пахмельле.
Аркестар перастаў граць і адразу ж упаў у дрымоту. Папросту абаперлі галовы на інструмэнтах і ўжо сьпяць.
— Вып’ем, — кажа Колька. — Пайду высьветлю, чаму не нясуць есьці.
Цяпер пайшло гладка. Масьлёнка, сібірскі эліксыр, кубак каўкаскага віна, ну, і наша родная бульбяная. Яшчэ жыву, але ўжо даганяю лёс. Колька, хістаючыся, устаў ад стала і рушыў у бок таямнічага змроку кухні, дзе блукаюць нябачныя духі нашай гастранаміі.
— Вы бунтар, — кажа напаўголасу пані Гося. — Заўжды ўяўляла сабе бунтароў дзікімі маладымі людзьмі з даўгімі валасамі.
— Што ж вы хочаце, рэжым пастарэў і мы пастарэлі. Задоўга ўсё гэта трывае. Ва ўсім гэтым спэктаклі ёсьць расьцягнутасьці. Драматургія кульгае.
— Вы засноўваеце ці ўжо заснавалі новую сэкту?
— Мая сэкта — гэта я сам. Я сам у кожным з вас. Бо мяне

рэальнага, біялягічнага, з адрасам і жыццярысам, наагул няма. Я жыву ў вас, як вірус, маральны вірус, альбо як бактэрыя сумленьня. А можа, як фэрмэнт граху. Рэч у тым, што я адсутны, дакладней, што я не існую. Вы чуеце тэксты з гучнагаварыльніка, хвалі, што заблукалі ў этэры, нікім наўмысна не перадаваныя, папросту нейкія водгульлі, рыкашэты вашых хваляў, манатоннае мурканьне з боскага горла.

— Калі вы гэта прыдумалі?

— Я гэтага не прыдумляў. Гэта было мне зьвеставана.

— Сёньня? У самы поўдзень, калі прагучалі гарматныя салюты?

— Не. Учора ўночы. Таму ў мяне пахмельле.

У авале нішы мне была відаць частка гардэробнай стойкі. Пікусь якраз ускочыў на сьцёртую стойку і, любоўна гледзячы ў мой бок, даваў знакі агрызкам хваста, што ён тут і чакае. Я паказаў яму, што яшчэ не пара.

Падплыў Колька Нахалаў, паружавелы на адно адценьне мацней.

— Дазволь, Госю, шэф-кухар цябе запрашае.

— Перапрашаю, я на хвілінку, — яна ўзьнялася з крэсла, і я ўбачыў, што яна ў нагавіцах; поўныя кабеты любяць нагавіцы.

Наўкола стаяў такі гоман, як у Язафатавай даліне перад канцом сьвету. Усе галасы зьліваліся ў адзін пранізьлівы, жалосны енк. Зьверху, нібы з чысца, за намі назіралі твары злосных анёлаў. Але гэта былі толькі горшыя госьці з правінцыі, тыя, якім удалося зрабіць пашпарты на выезд у сталіцу ў дзень найвялікшага сьвята стагодзьдзя.

— З кім ты сядзіш? — пачуў я зьдзеклівы голас.

Гэта быў Рышард Шміт, толькі цалкам пераменены. Ён нібы схуднеў, нібы ў яго дадалося срэбных валасоў.

— З такімі людзьмі, якія маюць грошы. Сядай, праставяць і табе.

— Мне ня трэба, — сказаў ён ганарліва і сеў. — Можна? — Ён паказаў на пляшку жытняй з імпартнай бульбы.

Даліў у чарку содавай, выпіў і загледзеўся ў мае вочы.

— Ён памёр, — сказаў ён.

— Калі гэта здарылася?

— Яго яшчэ тармосяць гэтыя рэанімацыйныя машыны, але я ведаю, што ён не жыве. Ён ужо бачыць Госпада Бога. Вырачыў

вочы і ня можа надзівавацца. Ён ужо на тым баку.
Музыкі раптам абудзіліся і пачалі граць перайначаны варыянт вальса “На сопках Манчжурыі”. Каб не плаціць тант’ему.
Я расчуліўся яшчэ больш.
— Я б хацеў яго пабачыць. Ведаю, што ён не сказаў мне ўсяго.
Ён усё жыцьцё быў скупы на галоўныя словы.
— Неўзабаве пабачыцеся.
Наблізіўся афіцыянт з талеркай.
— Вы заказвалі рагу?
— Так. Дзякую.
— Калі ласка, картку на мясныя стравы.
Я выцягнуў жменю, прызначаную на цэлы месяц.
— Можаце забраць усе. Мне ўжо не спатрэбяцца.
Афіцыянт узьняў чорныя як смоль бровы.
— Я вам што, жабрую тут? — спытаў ён. — Можаце здаць у фонд барацьбы з каляніялізмам.
Ён старанна выбраў адну картку, рэшту кінуў перада мной на стол. Яны ляжалі там бессаромна, як ганебныя грошы.
— Даруйце, — сказаў я.
Але ён ужо вяртаўся ў кухню, гнеўна штурхнуўшы нейкага кліента з правінцыі.
— Ён такі толькі цяпер, — азваўся я. — Колька абяцае, што пад ранак ён паставіць “залатую восень”.
— Табе сапраўды ня трэба гэтыя карткі? — спытаўся Рысік.
— Я даўно мяса ня ем. Сьветапаглядная настанова. Капрыз паджылага дзядзькі.
— Мяса дае моц.
— Мне ўжо ня трэба моцы.
— А дзеўкі? Ты заўжды быў ласы. Хаця дзейкаюць, што ўсяго толькі ласы.
— Бачу, што табе хочацца, дык бяры. Табе прыдасца моц.
— Калі дазволіш, вазьму. Навошта ж дабру прападаць.
Сарамліва аглядаючыся, ён схаваў чырвоныя карткі ў нутраную кішэню. Нейкія пары пагойдваліся на мікрапляцоўцы для танцаў.
— А якая гадзіна? — схамянуўся я.
— Палова на трэцюю.
— Шмат часу. Цэлае жыцьцё.
— А дзе, ну ведаеш, бэнзын? — шапнуў Рышард Шміт.
— Ня бойся, ёсьць. Ён чакае ў халадку гардэробу.

Настойваецца.
— Божа мілы, Губэрт, няшчасны Губэрт.
Аркестар цілікаў вальс, які асацыяваўся ў мяне з Надзеждай. Мне зрабілася прыкра, але і дзіўна прыемна. Ці я яшчэ спаткаю яе? Хіба пабачу, маю такое прадчуваньне. А мае прадчуваньні што да кабет ніколі мяне не падманвалі. Благія і добрыя.
Рышард Шміт пісаў элегантную, інтэлігентную прозу. Ён трымаўся годна і ўмела ствараў вакол сябе атмасфэру, трохі, зрэшты, старасьвецкую атмасфэру артыстызму. Ураньні ён граў душу-хлопца, зычліўца, але гэта была тактыка і мяне гэтая штучная сардэчнасьць не падманула. Рышард трохі пагарджаў маімі творамі. Любіў мяне, але маёй прозы не цаніў. Ён быў прафэсіяналам, я — аматарам. Прафэсіяналы ня любяць аматараў. Ён таксама ведаў, што я ведаю, што ён піша кніжкі, адмыслова намагаючыся, каб яны былі лёгкія для перакладу. Рышард зацяўся і ўсё жыцьцё прысьвяціў таму, каб зрабіць міжнародную кар'еру. Ён так гэтага прагнуў, што ўрэшце дасягне гэтага.
А цяпер ён глядзеў, як я бяз смаку дзяўбу дзіўную страву, названую капрызным словам рагу.
— Ён сябе спаліў, — сказаў я.
Рышард здранцьвеў. Замёр з пляшкай у руцэ.
— Хто?
— Губэрт спаліў сябе ўнутрана. Ён жыў на страшных абаротах. Ведаеш, не магу ня толькі сабрацца з думкамі, але і з сваім самапачуцьцём. Я нібы зырваўся з ланцуга. Вецер ірве мяне на ўсе бакі. Я павінен упасьці на зямлю і завыць. А я жую гэтае рагу.
Рышард глядзеў уверх у бок чысца, дзе серабрыліся попельныя водбліскі дзённага сьвятла.
— Слухай, слухай, — сказаў ён павольна. — Там сядзіць Чабан. Ён хоча з табой пагутарыць.
— Дзе, я ня бачу.
— На галерэі. Непадалёк ад вокнаў. Галіна табе пакажа.
— Якая Галіна?
— Ну гэтая, якую ты ўжо ведаеш. Глядзі, чакае на сходах.
На прыступках за сьпінамі аркестру сапраўды стаяла Галіна. А музыкі ўсё яшчэ гралі "Сопкі Манчжурыі", і мне падавалася, што яны так граюць ад ранку. Я ўстаў, пралез за сьпіны інвалідаў.

— Так, ён хоча з вамі пазнаёміцца, — сказала Галіна шэптам.
Я ішоў за ёй і, ідучы, прыглядаўся да мажнага мужчыны ў скамечаным флянэлевым убраньні, які самотна сядзеў пры круглым століку каля акна, завешанага празрыстым цюлем.
Я ўвайшоў у дзённае сьвятло, у пушыстае сьвятло восеньскага паполудня.
— Гэта ён, — паказала Галіна на мяне, калі мы спыніліся пры століку. Я хацеў папрасіць, каб яна засталася, але яна адышла ў бок залатых дзьвярэй без крышталёвай шыбы.
— Сядайце, — сказаў ён паўголасам, у якім, аднак, гучаў мэтал.
Я слухмяна ўсеўся, хоць і быў старэйшы ад яго на добрыя дзесяць гадоў. Столік быў пусты. Стаяла толькі вялікая папяльнічка, напоўненая недапалкамі ад папярэдніх гасьцей.
Ён зусім мной не цікавіўся. Глядзеў за акно, на счарнелы й нехлямяжы гмах партыі, над якім трапятаў агромністы чырвоны сьцяг зь ядвабу.
— Не люблю інтэлектуалаў, — азваўся ён праз хвіліну.
Я зірнуў на яго ў зьдзіўленьні. Але ён заставаўся нерухомы, павернуты да мяне профілем. Ізноў якаясьці групка нецьвярозых маніфэстантаў ішла пасярод дарогі ў бок Алеяў. Несьлі нейкі транспарант зь нейкай нечытэльнай датай.
— Яны гістэрыкі. Занадта ўражлівыя бабы.
— Вы хацелі з мной пагутарыць.
— Я і гутару.
Ён быў нахабны ад усьведамленьня сваёй місіі, прызвычаены да слухмянасьці. З асалодаю разыгрываў дыктатара. А гэтая пашарпаная флянэль на ім падавалася каралеўскімі шатамі.
— Я слухаю, — сказаў я.
— Вас як перамкнула на шмат гадоў. Самацэнзура не дазваляла?
— Чаму самацэнзура? Мноства розных акалічнасьцяў.
— Ну якіх, прыкладам?
— Я мушу перад вамі спавядацца? — спытаўся я трохі вастрэй.
Ён бліснуў бялком у куце вока, але не павярнуўся ў мой бок.
— Чаго вы баіцёся?
— Як гэта чаго?
— Ну, вы баіцеся вязьніцы, допытаў, пратрусаў?
— Я палохаюся не за сябе.
— Ну, ну, — падганяў ён. — Дык за каго? За нас? За цэлы

край? Што нас струць зь зямлі з прычыны вашай кніжкі?
Я глядзеў на яго і ня верыў уласным вачом. Ён меў нешта ад тых. Ананімны вульгарны твар і празрыстыя вочы.
— Ведаеце, я прывык да іншага падпольля.
— Да якога?
— Такога, што гартавалася ў паўстаньнях, баявой арганізацыі Польскай Партыі Сацыялістычнай, аж да АК. Вы пачалі ад іншай печы.
— Што гэта значыць?
— Вас стварыў гэты рэжым. Вы ёсьць выдзяленьнем гэтай сыстэмы, рабрынаю зь цела гэтай тыраніі. Вы з "Д'яблаў" Дастаеўскага, а не з апавяданьняў Жаромскага ці Струга.
Ён нарэшце павярнуўся ў мой бок. Я пабачыў твар, ужо не такі вульгарны і безаблічны. У яго вачох, сапраўды даволі бледных, зьявіліся іскры ці ня ўсьмешкі.
— І што ж вы раіце? — спытаўся ён.
— Ня ведаю, што раіць. Гэта не мая справа. Я сам сабою, я паза сыстэмамі. І такім хачу застацца да сваёй апошняй хвіліны. Калі жадаеце парады, магу прапанаваць адну. Будзьце падобныя да даўніх падпольнікаў. Грамадзкая падсьведамасьць помніць тыя архетыпы. Яны сталі ўласнасьцю супольнай памяці. Толькі яны будуць дзейсныя.
— Калі ласка, удакладнеце такі архетып.
— Першае — добраахвотнасьць. Вы любіце шантаж, паскудны, душны маральны шантаж. Другое — бескарысьлівасьць. Вы любіце, каб адразу былі ўзнагароды, вы дзелавыя. Трэцяе — згода на прайгранку. Вы ня любіце прайграваць. Ня любіце зусім. Вы — плод свайго часу. Вы непрыгожыя, як час, які выдаў вас на сьвет.
— Ёсьць трошкі рацыі ў тым, што вы кажаце. Мусіць, мы такія, як наш час. А якімі яшчэ мы маглі быць? Як мы маглі пераскочыць абумоўленасьць часам, грамадзкай мэнтальнасьцю, палітычнай сыстэмай, асаблівасьцямі фазы гістарычнага працэсу, маральным уціскам альбо паслабленьнямі часоў ці эпохі? Як жа мы можам быць з XIX стагодзьдзя, калі мы замыкаем стагодзьдзе дваццатае? Як мы можам быць антыкапіталістычнымі, калі мы антыкамуністычныя? Вы рамантык ці дурань?
— Вы гаворыце жвавай моваю марксіста. Вы не заўважаеце няяўных маральна-ідэйных фактараў, якія абумовілі лёс гэтага

народу. Вы толькі ценявы кабінэт гэтай сыстэмы.
— Ну, тады вам ня варта турбавацца. Я чуў, што вы наагул капрызіце, рэзанёрыце. Такіх нам цяпер ня трэба. Можа, калі-небудзь, калі будзе добра, тады будзе час на філязафаваньні. Цяпер жа няма калі. Цяпер шмат людзей і шмат народаў канае. Гэта апошні званок. Запрашэньне на вечаровую імшу. Вы вызваленыя ад свайго слова. Вы нам не патрэбныя. Можаце вяртацца дадому.
Я ўстаў ад стала, але не адыходзіў.
— А хто ж гэта даў табе права маніпуляваць маім жыцьцём?
Я іду на вогнішча павольна і цяжка, як ішоў бы любы чалавек.
А чаму ты думаеш, што мой маральны інстынкт слабейшы за твой ці за ваш? А хто гэта сказаў, што я мушу ў цябе прасіць дазволу на сьмерць?
Ён ізноў глядзеў праз закураны цюль на той гмах, у якім сьвяцілася невялікая колькасьць аконных прастакутнікаў. Сьціснуў вусны, ссунуў бровы, і выглядала, быццам ён стрымлівае выбух гневу альбо папросту ўсхліпваньне. Я думаў, што ён мне адкажа, але ён нічога не сказаў. Мне зрабілася прыкра, я хацеў азвацца, але не азваўся.
Я вярнуўся да століка. Аркестар усё граў гэны вальс і ніяк ня мог спыніцца.
— Ну што? — спытаўся Рышард.
— У мяне была нядобрая гутарка.
Я змоўк, і ён таксама маўчаў. Нехта пры бары абярнуўся ў наш бок. Гэта быў Рышардаў брат, гэны філёзаф ад алюзіі. Не вітаючыся, ён насьмешліва глядзеў на нас. Шміт, відавочна, адчуў братаў пагляд, бо падняў галаву і паглядзеў у бок бару.
— Толькі гэтага яшчэ не ставала, — вохкнуў ён. — Што тут робіць гэтая манда?
— Мы сёньня спаткаліся ў малочным бары. Ён праводзіць у цэнзуры сэмінар у пытаньнях палітычнай алюзіі. Зайшоў па-суседзку на келіх.
— Эдзік-пэдзік, каб яго чэрці ўзялі.
— Вы блізьняты?
— Але разнаяйкавыя. Ён ад іншага бацькі.
— Што ты вярзеш? Гэта немажліва.
— Не хачу тлумачыць. Спытай якога лекара. Ёсьць такая магчымасьць, калі кабета цягам пары гадзінаў мае сувязь з рознымі мужчынамі і калі сыдуцца два яйкі. Не хачу гаварыць

аб гэтых сьвінствах. Мама, сьвяці Божа над яе душой, гэта быў добры фокус. Але дзякуючы яму Эдак — толькі мой далёкі сваяк.
— Ты гэта выдумаў, Рышард. Прыдумаў у часе бяссані, седзячы з мэдыцынскай энцыкляпэдыяй у руках. Як можна так ненавідзець уласнага брата?
— Ён мне ня родны брат, паўтараю яшчэ раз. Ён мне толькі стрыечны брат, к чорту яго.
Эдак-філёзаф ужо кульнуў келіх і мала таго, што глядзеў на нас зьдзекліва, ён яшчэ і пагардліва ўсьміхаўся.
— Не зьвяртай на яго ўвагі, — шапнуў Рышард. — Прыкінемся, што мы занятыя гутаркай.
— Ведаеш што, Рышард, я вяртаюся дадому. А ты забяры каністру з гардэробу сабе. Мо знойдзеш іншага ахвотніка.
— Ты што, звар'яцеў?
— Усё гэта такое двухсэнсоўнае. Я двухсэнсоўны, вы двухсэнсоўныя, увесь сьвет двухсэнсоўны. Мне кепска, і ўсё на гэтым.
— У пэдзікаў пад носам гаўно. Яны пагарджаюць усім на сьвеце, — наракаў Рышард, якога калоў пагляд брата. — Мо даць яму ў морду?
— Слухай, я вяртаюся дадому, — і я падняўся з крэсла, але тут паказаўся Колька Нахалаў, які асьцярожна вёў пані Госю.
Яны пяшчотна перасьміхаліся, ён нёс яе торбу, вялікую, як банкаўскі сэйф. Яны не марнавалі час на кухні, ад іх ішоў рэзкі пах няведамага алькаголю. Яны набліжаліся да нас пад пранізьлівы енк гіганцкай флейты, але гэта толькі заела сынтэзатар у інвалідзкім аркестры. Музыкі адставілі свае інструмэнты і прыглядаліся да змаганьня калегі з таямнічай гукавой прыладай.
— Гэта мой прыяцель, — прадставіў я Рышарда, але яны не зьвярнулі ўвагі на майго таварыша.
— Усім, усім, усім! — трубіў Колька праз складзеныя далоні. — Найвялікшая нагода перад сапраўдным канцом сьвету. Пані Гося запрашае, Госенька просіць, Госечка частуе. За мной. Наперад. Да перамогі.
Ён пачаў падштурхоўваць нас у бок кухні пры чыннай дапамозе пані Госі. Па дарозе мы перакулілі два столікі. Нехта хацеў умяшацца, але адразу дастаў у пысу ад чарнявага афіцыянта, які з ранку чакаў такой нагоды.

А ў кухні нас вітаў харавы сьпеў. Кухары, кухцікі і астатні пэрсанал кухні, усе разам, але вельмі няроўна — вось жа, усе разам выцягвалі ў вышнія рэгістры слынную песьню бурлакоў з-над Волгі, “Дубінушку”. Шэф-кухар — агромністы вясёлы мужык з памідорам, размазаным па высокай белай шапцы сьпераду, танцаваў сола пры катле, які небясьпечна пускаў пару з-пад накрыўкі. А гэны раздушаны памідор выглядаў як рубінавы гуз на гетманскім каптуры. Пабачыўшы нас, шэф узьняўся з прысяду, рубануў кулаком па накрыўцы катла:
— Маўчаць! Морды ў вядро! Я гавару!
Але сказаць ён нічога не сказаў, толькі зрабіў глыбокае па, перакульваючы вядро з бульбай.
— Эй да ухнем!
Пасьля спыніўся на раскірачаных нагах і пачаў падклікаць нас агромністым пальцам:
— Хадзеце, хадзеце, мае вы сальтысончыкі. Пакажыся, рулецік.
І раптам схапіў пані Госю на рукі і неўспадзеўкі панёс да цёмнага ўваходу ў няведамае памяшканьне. Абнятыя радасным страхам, мы рушылі за ім. Гэта была вялікая сьпіжарня, поўная пуставатых паліцаў. Закураная лямпачка гойдалася пад нізкай стольлю.
Шэф паставіў Госю на бэтонную падлогу.
— Цыц! Я загадваю!
З загадкавай усьмешкай ён пачаў корпацца ў кішэнях пад белым фартухом. Урэшце выцягнуў зьвязак каляровых ключыкаў. Прыклаў вялікі палец да вуснаў і ўзьняў густыя чорныя бровы.
— Цссс. Ведаеце, што гэта? — і бразнуў ключыкамі.
— Ура! — лісьліва крыкнуў Нахалаў. — Палкоўнік, пад вашым загадам!
Шэф-кухар схапіўся за край паліцы з таматнай пастай. Таргануў з моцай літоўскага мядзьведзя. І сапраўды, паліца піскнула ў нябачных завесах і адкрыла акуратныя мэталічныя дзьверы, падобныя да тых, што ўжо перад мной адчыняліся. Палкоўнік-кухар, цягнучы “Дубінушку”, паўвіхаўся каля замка, панаціскаў кнопкі, якія сьвяціліся, нешта заскрыгатала, недзе бліснула нейкае сьвятло, і вось мы ўжо памкнуліся ўглыб нізкага, нібы штольня, калідору.

Мой рахунак сумленьня. Мой акт скрухі. Шкадаваньне аб грахох. Мая біяграфія колеру пасярэднасьці. Сьпярша я ненавідзеў гэтую пасярэднасьць, пагарджаў ёй, а ўрэшце ў ёй знайшоў здавальненьне. Веліч у пасярэднасьці. Пасярэднасьць як найвышэйшая форма арыстакратызму. Пасярэднасьць як аскеза, як гордая самота ў звычайнасьці, шэрая рыза пыхлівага манаха. Пасярэднасьць як апошняя стадыя ўзвышэньня.
Ці пасярэднасьць бязгрэшная і нявінная? Я быў чыстым да той часіны, калі абудзіліся інстынкты, ізноў стаў чыстым, калі інстынкты пачалі паволі засынаць. Мая эпоха грэшнасьці — гэта дзясятак зь нечым гадоў, гвалтоўна гнаных неўтаймоўнай біялёгіяй. Нейкі дасьледнік прышчапіў мне інстынкты, памкненьні, рэфлексы, а пасьля глядзеў, што з гэтага будзе. Я быў паддосьледным трусом. Ці трус адказвае за экспэрымэнт?
Я пільнаваў, каб не пераступіць тэмпэратуры пасярэднасьці. У ахалоджаным мікраклімаце маёй уласнай пробы я не ўпадаў у крайнасьць і гэтак сапсаваў экспэрымэнт, распачаты на маёй асобе Найвышэйшым Розумам. Можа, я зграшыў адсутнасьцю граху?
Пасярэднасьць была актам маёй волі. Але разумовыя і фізычныя ўмовы для задавальненьня пасярэднасьцю я ўспадкаваў па генэтычным ланцугу, перадаваным праз стагодзьдзі і тысячагодзьдзі нейкімі нязнанымі мне асобамі, панамі, тыпамі, пра якіх я нічога ня ведаю і не хачу ведаць і якія ніколі не маглі ўявіць сабе пэўнага літаратара, што прыме на кароткі час гэты генэтычны код і, можа быць, пашкодзіць яго, сапсуе ці перайначыць. Таму і пасярэднасьць, гэтая дзёрзкая, пыхлівая пасярэднасьць таксама трохі накінутая мне. Ці ёсьць пасярэднасьць, атрыманая супраць волі, хоць прызнаная мной актам свабоднай волі, — ці ёсьць гэтая пасярэднасьць бязгрэшнай?
Я ня ўкраў вялікіх грошай, ня кінуўся ў любоўнае шаленства, не парушыў законаў прыроды, не ўчыніў злачынства. Трымаўся статку і быў статку паслухмяны. Пільна слухаў нячутны голас людзкога статку, які мы называем грамадзтвам. Я дапускаў дробныя парушэньні, што не разбурала агульнага працэсу, і адразу ж затушоўваў іх, бо мяне папраўляла нябачнае грамадзкае вока. Аднак я маю пачуцьцё грэшнасьці і я грэшны. Можа, першародны грэх — гэтая рыбануклеінавая кісьля, якую

я пераняў невядома па кім? Гэты таямнічы шыфр, стрэляны з далёкіх гіганцкіх галяктык грэшнасьці? Можа, грэх — гэтая зацятая цікаўнасьць, страшэнная прага пазнаньня неспазнавальнага, распусная спакуса сарваць чорную заслону, што хавае Найдасканалейшае Існаваньне альбо мёртвае нішто? Можа, грэх — сусьвет зь мільярдамі галяктык, більёнамі сонцаў, трыльёнамі зораў, што нараджаюцца ў болі і ў болі канаюць?
Адлятаюць у міжплянэтную прастору ў ветры часу водбліскі хвіляў, што ёсьць маім конам. Момант, калі я патануў у асьветленай сонцам летняй рацэ з горкім пахам зёлак у роце. Сэкунда, калі ўбачыў дзікі, дзівосны акт злучэньня мужчыны і жанчыны. Імгненьне, калі стрэліў у сябра ў маразяную зорную ноч, поўную воўчых сьпеваў. Хвіліна, калі здрадзіў сабе і сваім сябром. Найкарацейшая вечнасьць, калі чакаў на крывацёк аргазму ў вачох чужой жонкі. Мільганьне роспачных самагубных начэй. Ляцяць гэтыя водбліскі хвіляў, як сьветлякі ў вечнай цемры, якіх нясе вецер часу. Адзін падобны да другіх, да сотых, да мільённых. Такія самыя, непазнавальныя, аднолькавыя. Млечны Шлях з драбінак нашага існаваньня. Вялікі шум людзкога быцьця.
Можа, абыякавасьць, дзіця пасярэднасьці — гэтая лятучая, як цемра, матэрыя, якая камянее ў валунох, зграмаджаецца ў скалы, вырастае горным масівам аж да неба, прыгнятаючы нашае марнае жыцьцё? Можа, празрыстая, бясколерная, бяз паху і кшталту, млявая, усюдыісная, прытульная, мілая і нявінная абыякавасьць — адзіны грэх, які затрымлівае сіта Наканаваньня? Можа, толькі за гэты грэх-нягрэх нас будуць судзіць у дзень Страшнага Суду?

Трымаючыся за сьцены, спатыкаючыся, пасьміхаючыся, як на школьнай экскурсіі, мы валакліся праз старанна абліцаванае сутарэньне з пэдантычным асьвятленьнем, з стрэлкамі, намаляванымі ў двух колерах: белым і чырвоным. Белыя вялі нас, чырвоныя паказвалі зваротны шлях.
— Слухай, справа пахне оргіяй, — шапнуў мне Рышард у спацелы карак. — Ад некага пра нешта такое я ўжо чуў.
— Мусіць, мы ідзём пад вуліцай. Я чую наверсе крокі маніфэстантаў.

— Але пад якой вуліцай? Няўжо пад Новым Сьветам? Слухай, ты здагадваешся?
Я пачуў за сабой рэха крокаў. Машынальна абярнуўся і пабачыў, што гэта ня рэха, што нашым сьледам паўзуць жывыя людзі. Пэрсанал кухні рушыў за сваім правадыром.
— Ты тут? — пытаўся сьпераду Колька.
— Тут.
— Не пашкадуеш пра сваю сьмеласьць. Ведаеш, колькі гэтая інтурыстаўская вандроўка каштуе? Увесь даход ад фільму “Пераліваньне”. Госька такая. Ты яе ня знаеш, але яшчэ спазнаеш.
— А куды мы ідзём, Колька? У мяне сустрэчы.
— Ведаю тваю сустрэчу. Пасьпееш. Усе пасьпеюць на свае сустрэчы.
Перад намі запішчала пані Гося.
— Палкоўнік! Тут пацук!
— Рулецік, хадзі да мяне, во так! Хадзі, дзіцятка.
— А вы моцны.
— Мая моц дорага каштуе.
— Езус, але ж не за бюст, дзядуля.
— Мушу ж я за нешта трымацца, рулецік.
Нас гнаў тупат ног пэрсаналу і ўпарты голас той флейты, на якім заела арган.
— Вандроўка ў пекла, — ціха сказаў я.
— Не, у рай, — захрыпеў сьпераду Колька. — Варта пабачыць. Бо, можа, ня трапіцца больш такой нагоды. Нават па сьмерці.
Нешта затрымала наш паход. Пані Гося ўсё папісквала:
— Толькі бяз рук, палкоўнік. У мяне дарослыя дзеці.
— Гу-гу! — гудзеў палкоўнік-кухар. — Мне аж язык сьвярбіць пад’ялдыкнуць цябе на гэтую тэму.
— Калі ласка, у мяне ўразьлівыя грудзі, я зараз раззлуюся.
— Ціха, ша, цяпер ні мур-мур, — прашаптаў загадным басам палкоўнік. — Кліенты, падыдзіце бліжэй, я нешта вам скажу. Пачакаў, пакуль мы ўсе сталі перад такімі самымі дзьвярыма, якія мы бачылі на пачатку.
— Каго там халера нясе? — ён з гневам глядзеў углыб калідору за намі. — Вось нягоднікі. Кінулі кухню без нагляду. У вас нешта было ў сумачцы, шыйка ты мая вэнджаная?
Ён забулькатаў, як дубовая бочка, абцёр вусны рукавом белага халату і ўсадзіў пляшку з рэштай напою ва ўласную кішэнь.

— Папярэджваю, нічога ня браць і рукамі не чапаць. Глядзець можна, але каштаваць забараняю. Чуеце?
— Пане палкоўнік, каму вы кажаце? Вы ж запрашаеце мастакоў, сьведкаў эпохі.
— Я некалі працаваў у аддзеле мастакоў. Аднаго так адчысьціў, што ён, выбачайце, душою рыгнуў. Але гэта адступленьне. Дык вось, ня тыкаць пальцамі і не шумець. Усе зразумелі?
— Усе, усе, — сказаў Колька.
— А гэты пугач? — шэф паказаў на маю сьціплую асобу, пыхкаючы пад вушакамі дзьвярэй. — Што ў цябе вочкі так выпучыла?
— Пахмельле, ойча, пахмельле цяжкое.
— Можа, ты, няшчасны, рагу зьеў?
— Зьеў, ойча.
— То выпі нагбом мерку за тры глыткі, — ён падаў мне фляжку, якую вымантачыў у пані Госі. — Гатаваць, каханыя, я папраўдзе ня ўмею. Ня ўмею і не люблю.
— Палкоўнік, нам душна, — заныла Гося.
— Адмыкаю, адмыкаю.
Ён загрымеў ключамі, панаціскаў каляровыя кнопкі і адчыніў жалезную браму. Мы зноў апынуліся ў сьпіжарні, але гэтым разам добра дагледжанай. На высокіх паліцах ляжалі, пераліваючыся каляровымі этыкеткамі, вялікія пушкі кансэрваванай шынкі. Па правым баку стаялі скрыні з бутэлькамі, якіх нашыя вочы ня бачылі шмат гадоў.
— Не глядзець, не глядзець, — падганяў шэф-кухар. — Марш на сходы.
Перад намі былі стромыя каменныя прыступкі, што ўздымаліся пад чорную столь. Палкоўнік затрымаўся наверсе й сказаў сам сабе:
— А калі мне галаву адсякуць? Толькі тры гады засталося да пэнсіі.
— Палкоўнік, — нецярпліва азваўся Колька Нахалаў. — Мы толькі зірнём і на дыбачках выйдзем. Далібог, навошта гэтая важданіна.
— Твой тата быў маім настаўнікам, — супакойваў сябе кухар-палкоўнік. — Як сьвята, дык сьвята. А ворагаў якіх, дывэрсантаў няма спаміж вас? Ну добра. У такі дзень хіба можна.
Ён урачыста ўздыхнуў, агледзеў пад сьвятлом аплеценай

дротам лямпачкі найважнейшы ключ, пацалаваў яго, як рэліквію. А пасьля пачаў прыладжваць яго да дзіркі ў замку звыклых белых дзьвярэй з аблезлай фарбай. На ягоным занадта вялікім твары, нібы павялічаным у выніку невядомага біялягічнага катаклізму, на гэтым твары, які быў адначасова сымпатычным і агідным, на гэтым калясальным рыле зьявіўся выраз нейкай непрыстойнай асалоды. Ён корпаўся ў шчыліне замка і ўсё больш чырванеў. З глыбіні калідору аж сюды, да гэтай каралеўскай сьпіжарні далятаў перакручаны гук сынтэзатара. Урэшце замок весела цокнуў і наступныя дзьверы былі пераможаныя.
— Паўгоду не адмыкаў, — з палёгкаю сказаў палкоўнік. — Раз на паўгоду правяраю. Але толькі сам. Яшчэ ні разу не прыйшлося гэтай дарогай скарыстацца. Дай Божа, каб ніколі і не прыйшлося.
Мы стоўпіліся ў цесным памяшканьні, поўным старых венікаў, пустых бутэлек з-пад пасты для паркету і пашкоджаных частак пыласосаў.
— Усе гатовыя? — спытаўся кухар, выпростваючыся перад апошнімі дзьвярыма.
— Гатовыя, — урачыста шапнула пані Гося.
Тады ён паклаў руку на пазалочаную клямку апошняга замка. Ён павольна паварочваў яе ўлева, а мы ўжо чулі чароўную музыку, якую граюць у касьцёлах альбо крэматорыях. Дзьверы нясьпешна адкрывалі цудоўную залю, вялікую, як капліца. Сьцены і калёны былі абкладзеныя мармурам, праўда, дзе-нідзе патрэсканым, але гэтыя трэшчыны дбайная рука старанна закітавала адпаведна падабраным кітам. З высокай столі, аздобленай ляпнінаю ў стылі клясыцызму, цяжка зьвісалі залацістыя жырандолі, што пераліваліся вясёлкаю дарагога крышталю. Але ўсё гэта было нічым у параўнаньні з сталамі. Яны нагадвалі часы Радзівілаў альбо саксонскіх каралёў на польскім троне. Накрытыя гістарычнымі абрусамі, аздобленыя зелянінай, абцяжараныя цудоўным музэйным сэрвізам, яны згіналіся пад цяжарам незвычайных страваў і пляшак з напоямі.
— Гэта вы самі нагатавалі? — спытаў агаломшаны Колька Нахалаў.
— Я ня ўмею гатаваць, — адказаў узрушаным голасам кухар-палкоўнік. — Цэлы сьвет гатаваў, смажыў, тушыў, пёк гэтыя

цуды. Нашая партыя ўжо два гады ашчаджала кожны замежны цэнт на гэты таемны банкет для найвышэйшага кіраўніцтва. Ведаеце, кліенты, што ўжо тры месяцы міністар замежных спраў ня можа выехаць у ААН, бо ня мае грошай на падарожжа? Толькі сёньня паступілі першыя даляры — нехта купіў у валютнай краме швэдзкія запалкі, нейкі араб набыў тры тузіны прэзэрватываў, — і ўрэшце ўдалося заплаціць задатак за білет для міністра. Калі ласка, уваходзьце асьцярожна, бо падлога коўзкая, і толькі глядзеце, крый Божа, нічога не кранайце. Папярэджваю, што ў мяне добрыя вочы.
На дыбачках мы ўвайшлі ў банкетную залю, якая, хоць і асьвятлялася жырандолямі ў стылі эпохі Ёсіфа Вісарыёнавіча, заставалася ў залацістым паўзмроку, што ў нэфах паміж калёнамі пераходзіў у таямнічую цемру каралавых гротаў.
— Здагадваешся, дзе мы? — шапнуў Колька Нахалаў.
— Я ўжо ўпэўнены. Сьвятая сьвятых. Каўчэг запавета. Запавета паміж партыяй-каралевай і партыяй-служкай.
— Хадзем, пагледзімо.
А з уваходу ў камору ўсё яшчэ выскоквалі нейкія новыя постаці — кухонная абслуга і падпітыя госьці, а нават сёй-той з музыкаў, хто валодаў нагамі. Цудоўная музыка, няведама кім напісаная, тачылася з схаваных гучнагаварыльнікаў. Можа, яе разам прыдумалі партыйныя рэктары ўсіх музычных вучэльняў.

Мы затрымаліся пры галоўным стале, дзе на ложы зь пятрушкі ляжаў вялізны асяцёр, цар-асяцёр, абкладзены бледа-зялёным мігатлівым жэле, што нагадвала глыбіні Байкальскага возера. Ён глядзеў на нас годным і мудрым вокам, крута згатаваным. Непадалёк стаялі выдзеўбленыя камлыгі блакітнага лёду, у якіх схавалася чырвоная і чорная ікра. Пры абодвух канцох стала сьціплей уладкаваліся старапольскія шынкі з аголенай залацістай косьцю, як княскім дзяржальнам. А паміж гэтымі гігантамі кулінарнага мастацтва нясьмела палежвалі старажытныя блюды з паляндвіцай, грудзінкай, ліцвінскай **"шуйскі боец" —** кілбасой. На гэтым стале было досыць шмат стравы, **кудзеяцыйны** ніколі ня бачылі за ўсё наша доўгае жыцьцё. **меч.**
— У Крамлі такі банкет апошні раз бачылі за Сталіным. Перш чым звар'яцець, ён загадаў прыгатаваць падобную бяседу. Нікога не запрасіў. Сам еў, і піў, і гутарыў з душамі расейскіх імпэратараў. А потым замкнуўся ў адзіночнай камэры, якую

збудаваў для сябе, і там у самоце ногі апрастаў, — голас Колькі Нахалава зьлёгку дрыжаў.
Толькі цяпер я згледзеў, што пры галоўнай сьцяне стаіць невялікі подыюм, а на ім спачываюць каранацыйныя рэгаліі польскіх каралёў разам з славутым “шчэрбцам” *. На сьцяне партыйны обэрхавальнік павесіў абразы, рэліквіі гэтае нацыі. Колька Нахалаў заўважыў, што я разглядаю гэты блюзьнерскі алтарык.
— Хай кацапы ведаюць, каго купляюць. Ясную пані Рэч Паспалітую. Рымскую блядзь.
Ён сказаў гэта і сам спужаўся свайго голасу. Але яшчэ гучала тая годная музыка, якую шмат месяцаў зацьвярджаў і адкідаў Аддзел прапаганды Цэнтральнага Камітэту. Але ўжо нейкі прыбылы з сутарэньня падпіты дух знайшоў гукаадтвараль ную прыладу, ужо майстраваў пры агромністым магнітафоне.
— Ох, цягне мяне да гэтага асятра, — вохкнуў Коля Нахалаў. — Палкоўнік ня бачыць, хадзем, скубнём з карку драбочак мяска.
— Колька, гэта ж шаленства. Зараз уварвецца варта і расстраляе нас пад гэтымі калёнамі.
— Ніхто не ўварвецца, бо ўсе дзьверы апячатаныя звонку. Толькі безь пяці восем камэндант гмаху абарве плёмбы камісіі. Мы схіліліся над сталом у тым месцы, дзе ў чвэрць на дзявятую будуць стаяць абодва сакратары, наш — каралевіч — і тамтэйшы — цар. Колька рассунуў тонкую ядвабную скуру на карку асятра, выкалупаў кавалак залаціста-ружовай мякаці і падаў мне з захаваньнем найвышэйшай асьцярожнасьці. Я пачакаў, пакуль ён прыгатаваў сабе такую ж порцыю. Мы заплюшчылі вочы, каб не псаваць адчуваньняў пабочнымі ўражаньнямі. З цырымоннай павольнасьцю, як аплатку прычасьця, мы палажылі на языкі экзатычны прысмак.
Але Колька Нахалаў адразу закашляўся, атрымаўшы па сьпіне цяжкога ляшча ад палкоўніка шэф-кухара.
— Нельга! Колькі разоў паўтараць? Пайшлі прэч! — крычаў ён прыглушаным голасам.
Колька ўпусьціў апэтытны кавалак на падлогу, а вось я свой пасьпеў праглынуць. Мы схаваліся за мармуровай калёнай, зацыраванай імпартнай замазкай, а там нейкі тып цягнуў французскі каньяк проста з бутэлькі. Палкоўнік з злосным мармытаньнем пачаў агромністым пальцам заштукоўваць заглыбленьне ў карку асятра. Аднак рабіў ён гэта так няўмела,

што разадраў хрыбет рыбы аж да першага плаўніка. Урэшце агледзеўся наўкола, ці хто ня бачыць, і праглынуў прыстойны кавалак мяска, які быў скаціўся на жэле. А як закусіў, то ўжо машынальна схапіўся за пляшку арманьяку.
Невядомы кухонны дух, што быў пры магнітафоне, знайшоў на якойсьці стужцы танцавальную музыку. Нейкае гвалтоўнае танга раптам напоўніла нутро гэтай сьвятыні ў духу fin-de-siécle. Падпіты Рышард працаваў пры горшых сталох. Жор вяндліны, пакідаючы на блюдах мае карткі на мясныя стравы. Нехта, на жаль, ужо ванітаваў пры суседняй калёне.
З залацістага паўзмроку выплыла пані Гося. Яна змагалася зь перапоўненай торбай, якая не хацела замыкацца. Я адчуў прыкрасьць з прычыны такой нетактоўнасьці. Каштаваць далікатэсы — гэта адно, а выносіць шынку ў торбе — гэта ўжо нешта іншае.
— Я хутка змываюся, хоць забава тут толькі раскручваецца. Але ў мяне банкет з нагоды фільму. Прадаём купцом з Аўстраліі “Пераліваньне”. Бо мы, разумееце, атрымалі дазвол на распаўсюджваньне за мяжой толькі для іншых кантынэнтаў, па-за Эўропай. І як тут не абурацца?
Яна падхапіла пранізьлівыя смычковыя гукі танга, выканала колькі па з сваёй торбай, як з партнэрам.
— Непаўторны настрой, — шапнула яна мне. — А што вы скажаце, як вам, малады чалавек? Ці праўда, што вы забаўляецеся бунтарствам?
— Я не забаўляюся, шаноўная пані. Застары я ўжо, каб забаўляцца.
Яна ўзяла мяне пад руку, пацягнула за сабой у таямнічы паўзмрок калянады. Я ішоў годна, нібы з жонкай сябра Палітычнага Бюро. Рытм танга дадаваў велічы нашым крокам.
— Мне трэба вам сёе-тое сказаць. Гэта мой абавязак старой бабы... — яна завагалася на момант. — Ну, можа, не такой старой, але дасьведчанай. Слухайце ўважліва. Я ня веру ва ўсю гэтую апазыцыю. Сьцеражэцеся яго, — яна паказала пальцам на Рышарда Шміта. — Яны ўсе на дзяржаўным утрыманьні. Гэта ўсё — адна вялікая правакацыя. Ці вас ня дзівіць, што гады лятуць, а яны спакойна, як мужыкі ўвесну, урабляюць гэтыя свае пратэсты, рэзалюцыі, публікацыі, дэманстрацыі. Пасівелі, патаўсьцелі, ну і што? Рэжым таксама патаўсьцеў і пасівеў. Крумкач крумкачу вока ня выдзеўбе. Вас шкада. У вас спрытнае

вока. Мне патрэбны дырэктар фільмаў. У мяне можна зарабіць. Божа, якая цудоўная музыка. Мне трэба ўжо ўцякаць. Але што мы пабачылі, тое пабачылі. Ніхто ў нас гэтага не адбярэ. Вы ведаеце, што, падобна, канец сьвету блізкі. Чаму ўсё валіцца? І Ўсход, і Захад. Пачатак канца сьвету. Але гэты канец можа трываць доўга. Цэлыя стагодзьдзі.
— Адыдзі, карова, — сонна адказаў я. — Я тваю пысу бачу штодня з усіх бакоў. Пысу народна-дэмакратычнай мяшчанкі, якая любіць пажэрці на нашым пахаваньні.
— Хамло!
— Хто хамло? — з-за калёны, пахісткваючыся, выйшаў шэф-кухар. — Я хамло? Я камэндант эвакуацыі ЦК.
— Мяне тут абражаюць. Калі ласка, пакажэце мне выхад, пане палкоўнік.
— Ах, тваю мачалку-качалку. Мы не дазволім ані абражаць, ані выходзіць. Але ж і цыцкі ў цябе, баба, можна сказаць, савецкія.
— Палкоўнік, апрытомнейце, калі ласка.
— Патанцуем, кіця. Пасьля нас хоць патоп. Бачыш, мы некалі чыталі кніжкі. Тарараля-бум-бам-бом.
— Пардон, перапрашаю, — нехта цягнуў мяне за крысо курткі ў іншы бок. — Я доктар Ганс-Юрген Гансёрак. Дзе тут туалет, вы ня ведаеце?
— Ня ведаю. Патрывайце пакуль. Пазьней пашукаем.
— Я згубіўся. І сябры згінулі, — ён гаварыў без памылак, але з моцным нямецкім акцэнтам. — Ня помню нават, як называецца мой гатэль.
— А вы з гэтага гмаху ці звонку?
— З той кухні, што была на пачатку.
Наблізіўся Рышард Шміт зь селядцом у адной руцэ і шклянкай, поўнай джыну, у другой:
— Пра што гамана?
— Гэты пан шукае прыбіральні. Можа, я сьпярша вас пазнаёмлю? Пан Шміт, літаратар, пан Гансёрак, доктар.
— Вельмі прыемна, — сказаў скрыўлены немец. — Я кіраўнік дэлегацыі на перамовах з польскім урадам у справе купляньня зеленагурскага ваяводзтва. Даўнейшага Грунбэргу.
Усё больш параў кружылася ў залатым змроку, выконваючы складаныя фігуры клясычнага танга. За вокнамі, закрытымі парчовай заслонай, грымела апошняя сёлетняя навальніца.
— А, гэта вы? — з-за бліжэйшага стала падняўся Эдак Шміт. —

Што за наканаваньне лёсу! Я экспэрт польскай камісіі ў справах продажу зеленагурскага ваяводства.

— Доктар Ганс-Юрген Гансёрак.
— Дацэнт Эдвард Шміт *.
— Я вас ужо пазнаў.
— Гэта быў мой брат, блізьнюк.
Рышард выкінуў селядца ў цемру нэфу.
— Я сыходжу. Канец. Кропка. Годзе на сёньня.
Філёзафа трохі зьнесла ў бок стала.
— Братку, пачакай. Пойдзем разам. Цэлы дзень дажджу цябе.
— Дазвольце, калі ласка, — умяшаўся доктар Гансёрак, падтрымліваючы Эдварда. — Вы і ёсьць гэты ліцэнзіят? Я чытаў пра вас у газэтах.
— Гэта той небарака. Мой брат-блізьнё. А я ва ўладзе, гер доктар. Заўтра, як працьверазеем, спаткаемся за сьнеданьнем сталом.
— Я б не хацеў сёньня гутарыць пра справы.
— Чаму, доктар? У маіх жылах ёсьць нямецкая кроў.
— А ў маіх — польская.
Рышард замахнуўся і кінуў у глыбіню залі пустую пляшку з-пад віна. Мы чакалі, пакуль яна гучна разаб'ецца аб мармур, але яна нібы занурылася ў ваду.
— У вас, халера, зашмат нашай крыві і замала нашага сумленьня. Дайце я выйду.
Але ён не выходзіў. Цяжка абапёрся на мармуровую калёну і цёр заліты потам лоб.
— Мы, немцы, перажылі вялікі гістарычны шок, — балесна азваўся доктар Гансёрак, — і я рэпрэзэнтую іншую, а дакладней, новую Нямеччыну. Мы ўжо ніколі не ўжывём гвалту.
Філёзаф Шміт хацеў затанцаваць трапака, але мусіў адмовіцца ад свайго намеру.
— Лухта, — сказаў ён, укленчыўшы на адно калена, — нашая мяжа праходзіць праз прадмесьці вашай сталіцы. Ёсіф Вісарыёнавіч павесіў нам на шыю неблагі камень. Рышард, што я кажу. Братку, пільнуй мяне. Я ж тут адзіны рэпрэзэнтую інтарэсы дзяржавы. Заўтра лекцыі, не, паседжаньне камісіі, а тут балюе рэакцыя, Таргавіцкая канфэдэрацыя пераапранулася ў мастакоўскія ўборы, грашаробы, нахлебнікі, што не да тых

* **Тут гульня слоў: немцу з польскім прозьвішчам Гансу-Юргену Гансёраку (Hans-Jürgen Gonsiorek) супрацьстаўляецца радавы з нямецкім прозьвішчам (Edward Schmidt).**

прымазаліся. Спаілі мяне, лайдакі. На калені, галота! І ты, немец грашавіты! Гэта нашая нацыянальная базыліка, храм дынастыі Пястаў, п'едэстал Свантэвіта! Варта, сюды! Таварышы і таварышкі!
— Рышард, ён пачне распранацца, — сказаў я з жахам.
— Я б яму дапамог, але ён не распранецца. У яго чэлес памерам з напарстак. Мама нават давала на імшу, але нічога не дапамагло.
Спаміж параў, што танчылі, узнік палкоўнік-кухар, камэндант эвакуацыі. Ён панура ішоў у наш бок з расшпіленымі нагавіцамі і расхінутым халатам.
— Што тут дзеецца? — грозна спытаўся ён. — Дзе Госька? Хто забраў у мяне дзяўчыну? Няўжо той піжон у пэнснэ?
— Гэта таварыш немец. А вы станьце на зважай. Я сябар рэвізійнай камісіі.
— Я вас усіх паразганяю. Разбусурманіліся, разбэсьціліся, вам толькі дармовую гарэлку жлукціць і салтысоны красьці. Танцуюць мне тут цяпер. Бяры немца пад пахі і прэч адсюль, бо мазгаўню разьнясу, — і ён раптам выцягнуў з-пад кашулі вялікі аблыселы наган, нейкую, пэўна, дарагую памятку з даўніх часоў. — Ану, пайшлі ў скокі! Эй да ухнем!
— Хто, я?
— Ты, хрэн ты галяндзкі.
Ён груба штурхнуў Эдварда, а той слухмяна абняў за талію доктара Гансёрка. Яны пачалі падрыгвацца на месцы, бо мэлёдыя танга такі была ўчэпістая.
— Пане палкоўніку, — даверліва прамовіў я. — Там у куце, здаецца, Гося. Нейкі тып пры ёй аціраецца.
— Во паскуднік! — памкнуўся ў змрок ашалелы палкоўнік. Шугануў крывавы пошуг, выгукнуў стрэл, нехта пачаў уцякаць упоперак залі з хвастом асятра ў руках.
— Абарвуць плёмбы і выламаюць дзьверы, — сказаў я Рышарду. — Тут пральецца кроў.
— Вяртаемся. Я за цябе адказваю.
— А мо застанёмся? Апошнія Пэтроніі апошняй перадсьмяротнай хвілі тысячагодзьдзя.
Ён пацягнуў мяне да той істопкі. Па дарозе нам давялося пераступаць цераз Кольку Нахалава, які спаў на падлозе. Ён спаў, але гаманіў нешта сам да сябе на мове свайго дзяцінства.
— Ідзі, ідзі, я цябе даганю. Толькі вазьму бутэлечку.

Чаму я ненавіджу гэты горад? Не, гэта няпраўда. Я яго толькі не люблю, у адрозьненьне ад усіх гэтых аслоў, якія зарабляюць на любові да Варшавы. Зранку, пэўна, стымулююць сябе наркотыкамі, а пасьля аж да вечара любяць, любяць і хочуць, каб ім за гэта плацілі. Я больш як паўжыцьця пражыў у гэтым разбэшчаным месьце. У горадзе, зьнявечаным ад самага пачатку, гвалтаваным акупантамі, чвартаваным захопнікамі, душаным арканам азіяцкіх ордаў.
Некалі я ўпоўз у ягоны труп. Места зь цяжкасьцю аджывала, і я ўпершыню ў жыцьці павольна вяртаўся да жыцьця. Мы равесьнікі. Нас зьвязаў выпадак. І аказалася, што зьвязаў на жыцьцё і сьмерць.
Маім апошнім літаратурным творам будзе гэты апошні дзень жыцьця. Дзень сьціплага гепэнінгу. Але нешта зламалася. Мяне агортвае стома і немач. Маё жыцьцё паўтараецца, і я паўтараюся. Заміж непаўторнасьці — сэрыйнасьць. Маю творчасьць, і маё жыцьцё таксама, можна кроіць на кавалкі, як кілбасу. Так урэшце выходзіць.
Над мной толькі мой горад сьвежых помнікаў і старых сучасных гмахаў. Нічога апроч гэтага няма. Супольная мова, супольныя пакуты, супольнае неразуменьне. У чым вінаватыя яны і ў чым вінаваты я?
Я спускаюся ў эвакуацыйны калідор. Цяпер мяне вядуць чырвоныя стрэлкі. Нейкая пара ціскаецца ў нішы з пажарным кранам. Нехта дрэмле, абапёрты на сьцяну, нібы мумія ў старажытных катакомбах. Выглядае так, як быццам я ўзьнімаюся на паверхню зямлі, а я ж спускаюся ў сутарэньні “Парадызу”.
Маё места нагадвае слаўны Іркуцк. Некалі яно было зьнявечаным эўрапейскім местам, цяпер — здаровы азіяцкі кішлак. Я ў няволі гэтага места. Альбо, слушней, тут я выбраў сабе дом няволі.
Уваходжу на кухню, спустошаную, як па татарскім набегу. Выпатрашаныя катлы, пабітыя талеркі, з адкручаных кранаў цячэ вада. Нейкі пацук плыве “па-сабачаму” праз акіян кухні. Ведаю прычыну свайго пахмельля. Цяжкога пахмельля. З мной здараецца часам. Нейкім благім часам. А тады я гуляю зь лёсам у косьці на жыцьцё. Ня ў косьці, але ў шклянку вады і ад трох да пяці сонных парашкоў. Гэта рулетка белых людзей. У яе гуляюць прэзыдэнты і прастытуткі, духоўнікі і паэты,

пралетары і капіталісты.
Аркестар арцелі інвалідаў грае папуры з амэрыканскіх мэлёдыяў, а для непазнавальнасьці грае задам наперад, каб не плаціць валютных тант'емаў. Нехта ласкава тыцкаецца ў маю нагу.
— Пікусю, ты мяне шукаў? Я ўжо тут. Хутка пойдзем далей.
А ён скача высока, намагаецца лізнуць маю руку. З нуды вымыў футра і цяпер выглядае як новы. Руды сабачка з нагамі, як махры.
— Марш, Пікусю, у гардэроб! Пільнуй той бітончык, які гаспадар носіць з сабой, як кроў для пераліваньня.
Пікусь робіць сумныя вочы, падкурчвае абгрызак хваста, вяртаецца да гардэробніка, які смачна сьпіць, якому не замінае музыка, не замінаюць крыкі, не замінае канец сьвету, што будзе трываць колькі мільёнаў гадоў, якому наагул нішто не замінае.
Я сядаю пры нашым століку. Тут качавалі чужыя плямёны. Чужыя недапалкі, чужыя сьляды памады, чужы разьліты ліманад. Наўкола сонны рух. Адны сьпяшаюцца праз кухню ў спаскуджанае сьвяцілішча партыі, іншыя вяртаюцца, замочаныя да каленяў, наеўшыся распусты. Блакітныя твары, чырвоныя твары. Прадаўгаватыя, авальныя, шурпатыя твары, што льсьняцца ад поту. Мэлянхалічныя і разбэшчаныя.
Зь цяжкасьцю ўздымаюся з-за століка. Уздымаю руку, каб суцішыць аркестар. Разяўляю як мага шырэй рот.
— Людзі! — рыкаю я. — Антыхрыст сышоў на зямлю. Скочыў няўдала з суседняй галяктыкі. Можа, хацеў куды ў іншае месца, але трапіў да нас.
Нейкі дзядзька робіць мне знакі.
— Там прыбіральня, сябра. За гардэробам.
А я ўздымаю ўгору абедзьве рукі.
— Людзі, паглядзеце на сябе. Ён разьдзяліўся на вас усіх і на мяне. Не чакайце Антыхрыста, бо ён ужо на зямлі. Антыхрыст распушчаны, раздробнены, грануляваны. Мініантыхрыст у кожным з вас і ўва мне.
Аркестар іграе шосты кавалак, нехта танцуе, нехта дрэмле. Міргае чырвонае і блакітнае сьвятло. Угары — бледыя пысы памочнікаў Люцыпара. Чакаюць сваёй гадзіны.
— Ніхто мяне ня слухае, — з роспаччу кажу я. — Антыхрыст укараніўся ва ўсіх нас, і таму яго няма. Ніхто мяне ня слухае.
— Я слухаю, — вылазіць Эдак Шміт, ускалмачаны, зь

перакрыўленым гальштукам. — Афу, як блага. Нейкае ненавуковае, старасьвецкае глупства. Як вам ня сорамна.
Пры бары сядзіць Жорж, даўнейшы Жоржык. Сядзіць нядбайна на высокім зэдліку, матляе адной нагой. Цэдзіць нешта з шклянкі праз пагнутую саломку.
— Дацэнце, я ўчора пяць парашкоў запіў шклянкай гарэлкі. І пару гадзін ня мог заснуць. Бо гэта лятарэя. Альбо адразу зваліць з ног, альбо паскудна працівіцца. То бок, пару гадзін засынаў і не засынаў. Пераступаў парог і адступаў назад. І кожнага разу ўваходзіў у іншы сэктар гэтага няведамага вымярэньня. Уступаў у лагоднасьць успамінаў маладосьці, уступаў у цень згрызотаў сумленьня, уступаў у чырвань ночы зласьлівых дэманаў. А аднаго разу ўступіў у яснасьць сьведамасьці, у яскравую яснасьць, скрэсьленую выразнымі знакамі. І ўсё зразумеў, і ўсё стала відавочным, зразумелым, як мае быць. Аднак тады нехта мяне пакараў і ў апошні момант, за імгненьне перад крыкам трыюмфу і палёгкі, сьпіхнуў у чорную бездань сну бяз сноў.
— А ты ведаеш, на што жыве Рышард, мой брат-блізьнё?
— Ня ведаю. Я адышоў ад літаратурных спраў і страціў амбітнасьць. Чакаю свайго тэрміну.
— А варта ведаць. Рышард жыве з малой кніжачкі, напісанай у даўнія пракаветныя часы, калі ён яшчэ быў руплівым сынам партыі і засядаў у розных інстанцыях, у якіх цяпер засядаю я. Можа, помніш яе назву? Кніжачка гэная, напісаная не бяз таленту, не бяз пэўнай іскры, услаўляе гвалт, апраўдвае зьняволеньне, згаджаецца зь ліхой часовасьцю. Кніжачку гэную перавыдаюць два разы на год і ўсоўваюць кожнаму дзіцяці ў школе, каб яна атруціла гэтае дзіця, каб разбурыла першы маральны інстынкт, калі ён зьявіцца, каб навучыла падвойнай бухгальтэрыі і першай асалодзе цынізму. Дзякуючы гэнай кніжачцы Рышард ходзіць жывы й здаровы па горадзе. Дзякуючы ёй жыве, папівае наранку малачко, а ўвечары гарэліцу. Дзякуючы гэтаму твору Рысік можа аддавацца бескампраміснаму змаганьню з рэжымам і будзіць нашае млявае сумленьне. І тут мы ў другі раз сутыкаемся з дыялектыкай нашых часоў, дарагі сябра.
— А дзе доктар Гансёрак?
— Згінуў. Пэўна, згінуў у туалеце.
— Божа, усё згінула ў чэрні. Засталося пахмельле, якое ня хоча

згінуць.
— Мы ёсьць адно драбінкамі бялку ў лютым крэмнева-агнявым сусьвеце.
— Аднак вы верыце ў Бога.
— Калі веру, то ў іншага, чымся вы, дурні.
Жорж шныраў вачыма па залі. Шукаў новае ахвяры. Я хацеў схавацца за пакамечаным бюстам філёзафа, але было запозна. Ён згледзеў мяне, загадкава ўсьміхнуўся і саскочыў з зэдліка. Уцякаць не было як, бо ён заступаў мне дарогу да сходаў.
— Вы яшчэ тут? — спытаўся ён, бесцырымонна адсоўваючы дацэнта. — Гэта нядобрае месца. Забягалаўка з благой рэпутацыяй.
— Вось якраз хацеў расплаціцца. Але афіцыянты недзе падзеліся.
— Дарэчы, наконт рахунку. Ведаеце, дурная справа. Можа, нават не выпадае да вас з гэтым. Мне не стае на рахунак.
— Колькі?
— Няшмат. Дваццаць тысяч.
Я намацаў у кішэні столькі, колькі трэба. Я ведаў такіх тыпаў. Як убачаць стос банкнотаў, адразу просяць больш.
Ён кемліва апусьціў руку, я намацаў у цемры гэтую касьцістую далонь і ўсунуў дзьве банкноты. Ён добра прыняў маю далікатнасьць, паціснуў руку ў адказ.
— Заўтра наранку дашлю з кур'ерам, — сказаў ён напаўголасу.
— Але ж вы добра ведаеце, што заўтра ня будзе крэдытора.
Ён засьмяяўся, паляпаў мяне па плячы.
— Калі б ведаў пэўна, то стрэльнуў бы больш.
І вярнуўся да бару, кінуў на стойку мае грошы, як свае ўласныя. Бармэн падаў новую шклянку, але з той самай, пагнутай саломкай.
З гардэробу, б'ючыся аб сьцены, валокся Ганс-Юрген Гансёрак.
— Herr Gott, я ўжо нічога не хачу. Хачу толькі ў гатэль, — енчыў ён, трымаючыся за жывот.
— А там, у тым сьвяцілішчы?
— Там канец сьвету. І тут канец сьвету. Я хачу дадому.
— Да вашага дому таксама набліжаецца канец сьвету.
— Але хай ён мяне засьпее ў маім собскім ложку.
Тут я бачу, што Рышард стаіць пры бары і папівае з шклянкі Жоржа, які забалакаўся з бармэнам.
— Рышард! — паклікаў я трохі загучна, бо змоўк аркестар.

Шміт паважна паглядае на мяне, гасіць недакурак у Жоржавай шклянцы і падыходзіць хісткім крокам.
— А, ты зноў тут, Эдзік-пэдзік. Пэўна, ганіў мяне за маёй сьпінай. Ведаеш, што ён абыдзень ляжыць ніцма ля Сьвятога Крыжа. Паміж нарадай у ЦК і выкладам у цэнзуры ляціць да касьцёлу, падае плазам і набіраецца моцы для наступных паскудзтваў. Глядзі, як прывучыў пана Бога.
— Спадарства, я пад аховай дыпляматычнага імунітэту, — скардзіцца доктар Гансёрак.
— А мы плявалі на імунітэты, — кажа Эдвард Шміт.
— У нас вы толькі так можаце паехаць у Сібір, — дадае Рышард Шміт.
Але тут доктар раптам цьверазее, хітра ўсьміхаецца.
— Я магу паехаць на Канарскія астравы альбо ў Каракас, але не ў Сібір. У Сібір цяпер не вывозяць. Гэта стратэгічная тэрыторыя.
І, дражнячы, грае ружовымі пальчыкамі на сваім салідным носе, акупаваным залатым пэнснэ. Адначасна раздаецца бляшаны грукат у аркестры. Музыкант, здаецца, пэркусьнік, зваліўся з крэсла і качаецца з боку на бок, ударaючы галавой па талерках. Ніхто не сьпяшаецца яму на дапамогу, толькі тып ад сапсаванага сынтэзатара ляніва зрушыўся з свайго месца.
— Ці ёсьць у залі лекар? — нясьпешна пытае ён кліентаў з найбліжэйшых столікаў.
Уздымаецца адзін спадар, засьцерагаючы, што ён толькі біёляг. Узлазіць на подыюм, пачынае круціць на ўсе бакі ачмурэлым ударнікам.
— Напіўся. Ударнікі любяць набрацца, — мяркуе Эдвард Шміт.
— Філёзафы любяць набрацца, — зь нянавісьцю шыпіць Рышард. — Каб заліць гора. Гэты чалавек замлеў. Усе млеюць у няволі.
— О Езус, — уздыхаю я. — Мне ўспомніўся Губэрт. Мы тут жлукцім, а яму там корак у горле. Адзін з апошніх маіх сяброў. Людзі, я сірата. Сірата на чужой плянэце.
Паміж столікамі паўзе Колька Нахалаў, пакідаючы мокрыя плямы на падлозе. Ён плыўма пераправіўся праз патоп у кухні. Зморaны, падае ў чужы фатэль.
— Хлопцы, пазычце запалак. Ты, здаецца, маеш швэдзкія. Падпалю гэты бардак.
— А чаму ты хочаш падпаліць? — працягла пытаецца Рышард.

— Хай усё згарыць. Датла. Увесь бруд, увесь грэх, усё гэтае сатанінскае насеньне.
Рышард б'е яго рабром далоні ў лоб. Колька перакульваецца разам з фатэлем, а пасьля моўчкі ўздымаецца з падлогі.
— Ты ўдарыў Кольку Нахалава, — кажа прыглушаным голасам.
— Так, я ўдарыў Кольку Нахалава.
— Мой бацька праліваў за вас кроў.
— Твой бацька падарыў нам сацыялізм.
— Расейцы да сёньня ядуць гнілую бульбу, каб вам было добра.
— Дык ідзеце адсюль да д'ябла. Будзеце есьці вустрыцы.
— Во гэта ўдзячнасьць. Доктар, вы сьведка. Вы яшчэ мяне ўспомніце.
Умешваецца Эдвард Шміт.
— Таварыш Нахалаў...
— Я табе не таварыш.
Я дапамагаю яму ўсесьціся ў фатэлі, але ён гнеўна адпіхвае маю руку.
— Колька, — кажу я, — ён хацеў як лепей.
— Як гэта — лепей?
— Мы павінны з вамі трохі паспрачацца. Белапалякі ўтрымліваюць вас на нагах. Комплекс палячышак дадае вам імпэту. Сьвятое пакліканьне расеізацыі Польшчы, перадаванае ад Івана Каліты, вядзе вас праз гісторыю, як праводная зорка. Хочаш, каб мы адразу паддаліся? Хочаш усё сапсаваць?
Колька Нахалаў глядзеў на мяне доўга і з намаганьнем. Урэшце засьмяяўся, паспрабаваў падняць цяжкі жывоцік з фатэля.
— Я цябе люблю. Ты найфальшывейшы, а я цябе кахаю. Дай буську, зямляк.
Але да пацалунку не дайшло, бо зьявілася Зосенька, туалетная касірка на практыцы.
— Да вас нехта прыйшоў, — сказала яна.
— Да мяне? — спытаўся я, зьдзіўлены. — Я нікога не чакаю.
— Ніколі ня знаеш, чаго чакаеш.
Я пайшоў папарадзе, таруючы дарогу паміж спустошаных столікаў і драмлівых гасьцей.
— Няма аб чым шкадаваць, — суцешыла яна мяне. — Ужо сканчаецца першая зьмена. Зараз іх усіх выкінуць з рэстарацыі. Трэба прыбраць для арабаў. Яны пачынаюць а шостай.
— Зосю, любачка, зьбіраўся да цябе, зьбіраўся і неяк ня выйшла.

— Нашто гэта. Я ўжо ўсё ведаю. Вось вашыя шэсьцьсот злотых. Вы не карысталіся кабінкай, але я з злосьці на вас напала.
— Не, не, кінь гэта.
Але яна ўсунула дробязь мне ў руку. У гардэробе абуджаны маёр ляніва глядзеў у пераносны тэлевізар, дзе прыежджы сакратар, звышсакратар, супэрсакратар якраз скончыў прамову і прымаў авацыі. Колькі ўбраных у чорнае дзядзькоў каранавалі яго шахцёрскай шапкай з урачыстым плюмажам. Але карцінка ішла нема. І маёр, паводле звычкі суайчыньнікаў, вымкнуў гук.
— Маёр, папрашу багаж і сабачку. Адплываю ў далёкія краі.
Ён падняў бітон, забулькатаў ім, каб паказаць, што нічога ня згінула.
— Усё ў парадку? — спытаўся ён.
Я сунуў у ягоную спацелую далонь Зосіну дробязь.
— Пікусю, хадзем.
Сабачка жвава выскачыў з-пад стойкі, гатовы да дарогі. За нашымі сьпінамі панесьлі некуды ўдарніка.
— Помні! — крыкнуў з глыбіні залі Рышард.
Я падняўся на першую прыступку, паперадзе старанна бег Пікусь. Абярнуўся да Зосі, якая абаперлася на вушакі сваёй установы.
— Да пабачэньня. Можа, зайду да цябе калі ўвечары.
— Напэўна, ня зойдзеце, — сказала яна, аглядаючы свае пазногці.
Я рушыў угару па сходах, накрытых чырвоным дываном, заплямленым рознага кшталту нераträўленымі стравамі. А наверсе, пры шкляных дзьвярох з выбітымі шыбамі, стаяла Надзежда.
— Выкідаюць нас, — сказаў я. — Увечары гэта рэстарацыя для нафтадаляравых арабаў.
Яна з жалем круціла рудой галавой.
— Хіба гэта гадзіцца? Трэба вас з кнайпы выцягваць. Як вы выглядаеце!
Я сарамліва прыгладзіў ня надта густыя валасы на цемені. А Пікусь ужо абнюхваў яе поўныя, але не затоўстыя ногі, такія, якія мне падабаюцца і якія адразу спадабаліся яму.
— Гэта ваш сабака?
— Маіх сяброў. Некалі згубіўся, колькі гадоў мы яго аплаквалі, ён нам сьніўся ў чульлівых снох, падшытых згрызотамі сумленьня, а цяпер ні стуль ні сьсюль знайшоўся. Пікусь, дай

пані лапку.
— Вы пілі?
— Трошачкі. А што я еў! Крамлёўскі ланч. Нават калі б расказаў, то вы б не паверылі.
Мы выйшлі на вуліцу, дзе ўжо чакалі арабы. Яны стаялі малымі групкамі, апранутыя амаль аднолькава, і гаманілі міжсобку гартаннымі галасамі. Яны неяк не мяшаліся зь мясцовым насельніцтвам, жылі ў Варшаве сваім жыцьцём, ні ў кога не пытаючыся дарогі, не шукаючы ні дапамогі, ані сяброўства. Толькі псавалі што ёсьць сілы надвісьлянскіх паненак, і гэта быў, апроч валюты, адзіны прыкметны сьлед іхнага пабыту.
— Надзежда, пачакай, які цудоўны дзень.
Сапраўды, хмары разышліся па далёкіх гарызонтах, вецер сьціх, сонца зычліва грэла гэтае згорбленае, беднае, хоць і сьвяточнае места. У гарачым паветры бавіліся рэшткі нейкіх мушак, і нават патрапаны матыль праляцеў над дарогай у бок Дому партыі.
— Дом партыі, — сказаў я сабе, і ў мяне сьціснулася сэрца. Агенты, пераапранутыя ў дарожных міліцыянтаў, знуджана прытупваюць сабе пры рагох гмаху, а ўсярэдзіне, у самым сэрцы, Садом і Гамора. Ці здолее хто ў пару сабраць таго асятра, аднавіць выпатрашаныя вяндліны, даліць вады да надпітых бутэлек, прыбраць запаскуджаную падлогу? Бедны шэф-кухар у рангу палкоўніка, апошні зух сталіцы!
— Надзея, я вас вазьму пад руку.
— Можа, хочаце супакаяльны сродак? У мяне ўсё з сабой.
— А навошта ж мне супакойвацца?
— Пастарайцеся працьверазець.
— Я цьвярозы.
— З вамі адна бяда.
— Але Чабан вызваліў мяне ад слова.
— Ці Чабан можа вас вызваліць? Ці вам трэба вызваленьне? Ці вас хто калі здолеў да чаго прымусіць?
— Надзежда, вы мне лісьлівіце.
— Ён, зрэшты, шкадуе аб той гутарцы. Бывае, што мужчыны сварацца бяз дай прычыны.
Мы міналі прадуктовую краму. Сьпешна павыцягваная з дамоў каманда магазыншчыц прыладжвала ў крывым акне вітрыны мадэрнізаваны герб айчыны — маленькага арла, абкладзенага вялікімі снапамі збожжа.

Мы вышлі на пляц Трох Крыжоў. На бэтоннай пляцоўцы, побач з старажытнай прыбіральняй, палежвала групка нецьвярозых дэманстрантаў. Яны падлажылі сабе пад галовы транспарант зь нечытэльным лёзунгам і пашкоджанай датай.
Паміж моцных яшчэ дамоў была відаць адна руіна. Гэта дом, у якім шмат гадоў мясьцілася рэдакцыя сатырычнага штотыднёвіка “Шпілька”. Неяк увесну ён чамусьці абваліўся, і ўсё ніхто ня мог узяцца за адбудову.
— Хадзем, Надзею, сядзьма тут і паглядзім на божы сьвет.
Я пацягнуў яе да сходаў перад руінай. Мы ўселіся на нагрэтай прыступцы. Пікусь скурчыўся ў клубок пры маіх нагах.
А маніфэстацыі нібы паволі, хоць і заўчасна, заціхалі. Аднекуль зь Віслы ці, можа, з пляцу Дэфіляд яшчэ чуліся аркестры, недзе ў плыткіх каньёнах вуліц вырваўся нейкі вокліч, можа, праўрадавы, а можа, п’яны. Аднак апатыя ўжо зноў накрывала мой горад сваім мультановым саванам.
— Гэта добры знак, што мы зноў пабачыліся, — сказаў я.
Яна маўчала, гледзячы перад сабой, у імжыстую пэрспэктыву Ўяздоўскіх Алеяў.
— Ведаеш, учора ўначы мне было зьвеставаньне. Табе скажу, бо цябе я ўжо не саромеюся. Дык вось, мне было зьвеставаньне, як старой бабе, але не зусім, бо маю прыгоду можна зрацыяналізаваць. Таму мне сёньня так баліць галава. А я чакаў гэтага зьвеставаньня ўсё жыцьцё. Хацеў яго бескарысьліва пераказаць грамадзтву. Так завяшчаюць музэям неацэнныя карціны альбо статуі.
— Ты прысьніў Антыхрыста.
Я так і замёр з рукой у кудлах Пікуся.
— Адкуль ты ведаеш?
— Ня ведаю. Я прысьніла Антыхрыста. Ня першы раз. Гэты сон мне паўтараецца. І заўжды каляровы. Хоць не, аднаго разу, колькі дзён перад ад’ездам у Польшчу, прысьніла чорна-белы.
— Але сёньня ўжо нічога ня помню. Нібы сякерай нехта адцяў. Толькі неяк баюся людзей. Не баюся так, як чалавек звычайна баіцца, але адчуваю страх перад людзьмі.
Яна раптам палажыла галаву мне на плячо. Чырвоную, пушыстую, лёгкую галаву.
— Ох, мілы мой.
— Што, Надзею, што?
— Ох, цяжка жыць.

— І цяжка памірaць.
Яны прыціснулася да мяне. Самотны балёнік, які згубіў свайго гаспадара, блукаў высока пад сьвежавымытым небам.
П'яны маніфэстант раптам абудзіўся, падняў цяжкую галаву і закрычаў у гэтае неба ахрыплым голасам:
— Польшча! Польша! Ваша маць!
Паўз усходні бок пляцу вярталіся з шпацыру мае таварышы, А.М. і Ю.Г. Несьлі ў руках папяровыя кветкі, кінутыя маніфэстантамі. Таму выглядалі сьвяточна, хоць Ю.Г. ня мог жэстыкуляваць і напіраў на А.М., што ўскладняла літаратурную дыскусію. Я глядзеў на іх здалёк, як бы зь неба. Пяшчотна і немачна.
Сонца было нізкае, слала амаль гарызантальнае праменьне. Раптоўная летняя вечаровая сьпёка, хоць лужок, уздоўж якога йшлі мае прыяцелі, даўно зрудзеў і памёр. Толькі сыстэма клюмбаў з кветкамі, адмыслова ўкладзенымі ў лічбу LX, яшчэ жыла, інфармуючы, што гарадзкі аддзел азеляненьня выканаў усе пляны датэрмінова і адзначае шасьцідзесяцігодзьдзе ПНР. А на гэтым лузе, пасьля зносу паваенных руінаў, хтосьці меўся будаваць нешта важнае. Але пасьля забыліся, хто і што.
Па маёй каністры бегаюць у пярэпалаху, як па няведамай плянэце, малыя чорныя мурашы. Пэўна, мурашкі фараона альбо Пяста Стальмаха. Гэтая блакітная каністра для іх — злосная, непрыхільная плянэта альбо папросту гіганцкі атамны рэактар.
— Надзею, сьпіш?
— Так, заснула на хвілінку. Пакінула цябе аднаго, мілы, на імгненьне.
— Зло як цемра. Трывае вечна. А дабро — гэта водбліск, гэта нетрывалая перамога над цемрай. Дабро сьмяротнае.
— Думаеш пра нашыя сны?
— Думаю, што рабіць. Маім апошнім літаратурным творам будзе гэты дзень. Ці шліфаваць кожнае слова і кожную сытуацыю на ўзор старых майстроў, ці аддацца стыхіі, графаманскай, хаатычнай спантаннасьці? Не, Надзежда, жартую. Напраўду думаю пра цябе. Наранку пазнаўся з апантанай, паэтычнай, зьлёгку стукнутай расейскай дзяўчынай, а цяпер...
— А цяпер?
— А цяпер сяджу з маёй жанчынай. Ты мая жанчына?

— Ну.
— Хоць гэта няхораша гучыць.
— Хоць гэта трывіяльна гучыць.
— Як прыгнятае, як жа зьневажае тое, што ўсё зводзіцца да тых некалькіх пытаньняў з маналёгу Гамлета. Мінулі стагодзьдзі, загінулі цывілізацыі, адышлі ў нішто гэтулькі пакаленьняў, а нічога не зьмянілася, і гэтае праклятае наканаваньне адбірае ў нас прывіднае задавальненьне першынства, пазбаўляе аўтарства, робіць нас вечнымі плягіятарамі.
— Што цябе мучыць, мілы?
— Грэх набыў выгляд цноты. Рысы маральнасьці вылінялі, а з-пад іхнага малюнку выявіліся, як на перафарбаванай матэрыі, рысы амаральнасьці. Амаральнасьць карыстаецца маральнымі правамі, ужывае маральную намэнклятуру, будуе свае пазытыўныя сыстэмы, узнагароджвае сьвятасьцю і зрынае ў пекла. Зло ўлучылася ў нашыя этычныя коды і стала дабром. Фатальным, ра́кавым дабром.
— Шкадуеш, што далучыўся да нас? Што не падаў просьбы на атрыманьне ўрадавай ліцэнзіі на ўмераны пратэст, на неагрэсіўную абарону годнасьці чалавека, на бяскроўнае змаганьне з гвалтам і няволяй?
— Я мусіў да вас далучыцца. Так мне было наканавана.
— Тады не наракай на сваю пыхлівую годнасьць. Няхай даводзіцца цярпець, зайздросьціць, пакутаваць.
— Усё адно.
— Ня ўсё адно.
— Думаеш, што можна выкупіць? Што можна ўзрушыць сумленьне Госпада Бога?
— Трэба спрабаваць. Аж да канца сьвету.
— Вы любіце грэх.
— Хто?
— Вы распусна качаліся ў граху, каб дабіцца блаславёнага дараваньня. Бо ня можа быць дараваньня бяз грэшнасьці, так?
— Ты блытаеш літаратуру з жыцьцём.
— Як ты сказала?
— Блытаеш блюзьнерскія мроі роспачных людзей зь іхнымі ўчынкамі ў штодзённасьці.
— Блытаю літаратуру з жыцьцём. Сваю звычайную біяграфію абвяшчаю літаратурным творам.
Пікусь спагадліва лізнуў мяне ў голую лытку. Высока па-над

дахамі лёталі ластаўкі, што даўней веставаля пагоду, а цяпер нічога не вястуе. Раптоўная сьпёка. Можа, гэта канец лета ці пачатак будучай вясны?
— Пакажыся, Надзея.
Яна ўзьняла галаву, чырванаватыя валасы, пэўна, ленінскія валасы, рассыпаліся вакол яе твару, упалі на плечы. Адно вока было відавочна зялёнае, але другое — відавочна фіялетавае.
У суме мая прыгожая Надзежда, трывожна і рызыкоўна прыгожая. А я ў гэтым знаю толк.
Я моцна абняў яе. Яна заплюшчыла вочы, і я заплюшчыў.
Навобмацак сустрэліся вуснамі. Яе рот жыў уласным жыцьцём, такім агрэсіўным і пяшчотным, што мурашкі папаўзьлі ў мяне па сьпіне.
Гадзіньнік недзе прабіў час. Біў так доўга, што ўрэшце мы расплюшчылі вочы. Але гэта быў не гадзіньнік. У касьцёле сьвятога Аляксандра звон заўчасна клікаў на вячэрню.
Нічога ня кажучы, безь ніводнага слова мы ўсталі з бэтоннай прыступкі, якая ўжо набрыняла вечаровым холадам, і ўвайшлі ў зацішны нэф зруйнаванай рэдакцыі. Толькі сходы зьвісалі ў гэтай пустой прасторы, нібы скамечаны дыван. Рэшта сьценаў, пярэгарадак, скляпеньняў ляжала пасярод будынку ў маляўнічых купах, нібы задуманых рамантычным архітэктарам. Надзіва пышная расьліннасьць аплятала гэтыя абломкі бэтону, каменьне цаглінаў і выдмы выветранай вапны. Гарызантальнае сьвятло сонца награвала профілі вялікіх чарнаватых лопухаў, залаціла мажныя папараці, распальвала кусты воўчых ягадаў. Нават восеньскія астры пракраліся ў гэты чароўны сад, што буяў на сьметніку былой рэдакцыі.

Гэтыя сходы запрашалі да неба, якое пералівалася інтэнсіўнымі колерамі над нашымі галовамі. Я скінуў нагой зь першай прыступкі засохлае лісьце і кавалкі тынку. Падаў ёй руку, яна ўзышла на першую прыступку. Я ачышчаў перад ёй дарогу, яна паслухмяна рушыла за мной, пакуль мы не апынуліся на лесьвічнай пляцоўцы з рэшткамі драўлянай падлогі. На самотным невялікім дрэве сядзела неймаверна вялікая чарада вераб'ёў. Яны голасна раіліся аб нечым, схаваныя ў пажоўклым лісьці. З гэтай гаманы паўставала гучная і несамавітая музыка, аднастайны мэталёвы енк пранізьлівага неспакою.
Надзежда абаперлася сьпінай аб шчарбатую сьцяну.

Заплюшчыла вочы і чакала. Я зноў пацалаваў яе ў вусны, якія ўжо пасьпелі астыць. Знайшоў яе вялікія грудзі, мае ўдзячныя знаёмкі. Надзежда сьцялася, нібы баючыся мяне альбо, можа, лякаючыся раптоўнага павеву холаду няпэўнасьці. Агромністыя смочкі натапырыліся спазматычнай шорсткасьцю, запахла нагрэтым на сонцы садам, я адчуў востры, вабны пах бярозавага лісьця. Надзежда сказала шэптам нешта, чаго я не зразумеў. Яна ацяжэла, я мусіў прытрымаць яе, каб яна ня ўпала на збуцьвелую падлогу.
Мы чулі роспачныя ўдары пульсу. Чулі таксама той шматгалосы крык птушак, які ўсё мацней прысьпешваў. Я разьвёў каленямі яе ногі, усьпяўся ў яе. Усьпяўся высока.
Яна нешта бязгучна казала, нібы чытала літаньне. Сплюшчыла вочы, што аж зьбялелі павекі. У верасовай ружовасьці вуснаў сьвяціліся драпежныя вострыя зубы.
— Надзею, — шапнуў я. — Надзею, гэта я.
— Ведаю. Гэта толькі ты. І назаўжды ты.
Яна ўперлася сьпінай у сьцяну, нібы хацела адштурхнуць яе аж да гарызонту, дзе сонца рыхтавалася заходзіць. Схапіла маю руку абедзьвюма рукамі, каротка крыкнула здушаным голасам і стала такой цяжкай, што я ня мог яе ўтрымаць. Яна асунулася на падлогу, хаваючы твар у чырвоным прадзіве валасоў.
Аднекуль з рэштак столі крапала вада. Заблукалая аса прыляцела з саду. Пачала кружляць над галавой дзяўчыны. Я паспрабаваў прагнаць яе, схіліўся па сьцябло зрудзелай крапівы, але ў гэты момант пачуўся шоргат крокаў па шкле. У пройме дзьвярэй стаяў немалады тып у чырвонай шапачцы з даўгім брылём і з скураной торбай на жываце, якія носяць вартаўнікі стаянак. Адсалютаваў двума пальцамі да брыля шапкі, аздобленай няведамай мне эмблемай. Толькі цяпер я заўважыў, што ў другой руцэ ён трымае чырвоную картку, падобную да квітка.
— Дзень добры, — сказаў той бадзёрым голасам. — Дзесяць тысяч злотых.
— Дзесяць тысяч злотых? За што? — спытаўся я.
— За ажыцьцяўленьне палавога акту ў грамадзкім будынку.
— А што, гэта забараняецца?
— Можна, але за плату.
— Гэта штраф?
— Не, гэта такая такса. Набыла моц зь першага чысла. Калі б

вы да мяне зьвярнуліся, то было б зручней, бо я пазычаю надзіманыя матрасы.
Аслупянелы, я стаяў над скурчанай Надзеяй. Аса лётала цяпер каля маёй галавы.
— Людзей шмат, кватэраў мала, вось дзяржава і пайшла насустрач, — інфармаваў чыноўнік. — Зь цягам часу будзе больш камфорту. Увядуць тэнты для маскіроўкі і падушкі. Вы плаціце ці клікаць міліцыянта?
— Плачу, плачу, — неахвотна сказаў я, спускаючыся на першы паверх. — Але адкуль вы ведаеце, што мы тут рабілі?
— У нас на працу бяруць толькі спэцыялістаў. Вы ж ня будзеце спрачацца? Я вас аднекуль ведаю, га? Можа, вы выступалі ў тэлевізары?
— Можа, і выступаў. Ня помню, — я знайшоў дзесяцітысячную банкноту.
Ён ветліва, але цьвёрда ўзяў яе з маіх рук.
— Бо я, перш як пайшоў на пэнсію, быў дырэктарам на тэлевізіі.
Ён падаў мне чырвоную кардонку з шматзначным напісам: “Гарадзкі білет”.
— Можаце заставацца тут колькі захочаце. Я папільную.
Ён пачціва адсалютаваў, засунуў банкноту ў торбу і выйшаў на вуліцу.
Недзе ў глыбіні цэнтру зноў азваліся аркестры. Былі чуваць адзінкавыя пранізьлівыя крыкі па суседніх брамах. Крыкі, што нагадвалі зімовае выцьцё ваўкоў. Але ваўкоў ужо не было на Зямлі. Засталіся толькі людзі. Места, як звычайна пад вечар, пачынала піць.
— Надзежда, абудзіся, — я патрос яе плячо.
Яна не адказвала, стоячы на каленях у кратавіне старога попелу, з галавой, затуленай рукамі, нібы яна стрымлівала жудасны, нераадольны боль.
Я пачаў паднімаць яе, страшэнна цяжкую і апоўзлую. Побач сыпаўся выветраны тынк. Аса неадчэпна зьвінела, увіхаючыся каля майго вуха.
— Надзя, — шапнуў я ў чырвоную пасму яе валасоў.
Яна раптам пахіснулася, упала на сьцяну. Праз імгненьне я пабачыў яе вочы, зьдзічэлыя ў нейкай ледзь заўважнай разьбежнай касавокасьці. Зьнянацку яна штурхнула мяне і пачала ўцякаць па тых патрэсканых сходах. Пасьля кінулася

ўбок, у самы гушчар чароўнага саду, пэўна, зачапіла старую бляху, бо з дрэва выбухнуў раптоўны цень, які засланіў неба. А гэта толькі зырваліся вераб'і і з аглушальным груканьнем памкнуліся ўглыб места.

І зноў адкрылася неба, такое нявіннае й чыстае, як некалі, калі было напраўду нявінным і чыстым. Сёньня гэтае неба засьмярдзелі ракеты, рупліва спляжылі філёзафы ў шуканьнях праўды, якой, можа, і няма. Але цяпер, на гэты адзіны надвячорак, неба ўбралася, падмалявалася, прырумянілася і выглядала як маладое.

— Надзя! — нягучна закрычаў я.

Абтрапаны матыль, можа, той самы, што ляцеў да ЦК, цяпер нясьпешна ляцеў над харошым кустом чартапалоху, выпрастаным, як гусар. Павуціньне серабрылася ў ахутаных бурым ценем кутох.

Яна зьявілася раптоўна, згодна з сваёй звычкай. Ішла, калыхаючыся, з-за дрэва, якое пакінулі вераб'і. Ішла сваім уласным, зграбным, хоць ацяжэлым крокам, нібы плыла чоўнам паўз хвалістую паверхню возера.

Ужо здалёк усьміхалася мне, верхам далоні выціралa куткі вачэй. Я чакаў яе, стоячы па пояс у папарацях, абсыпаных белымі таямнічымі вусамі, якія засталіся ім з даўніх добрых часоў, калі яны былі на зямлі дрэвамі.

Падышла, абняла за шыю, схавала галаву на маім плячы.

— Я стамілася, — шапнула. — Хто гэта прыходзіў сюды?

— Дзядок, які даўней працаваў у гэтым доме. Зычыў нам шчасьця і блаславіў.

— Я так і хацела, каб нас хто блаславіў. У вас таксама ёсьць добрыя, мудрыя старыя людзі.

— Бывалі і ў нас высакародныя, разумныя, годныя старыя людзі.

Яна круціла галавой, што ад пышных валасоў здавалася большай. Божая кароўка сьпяшалася па шырокім кудзеры, сьвятлейшым на сонцы.

— Слухай, — сказала яна шэптам.

— Слухаю, Надзею.

— Я пайду з табой.

— Куды, каханая?

— Туды, да Палацу культуры. Зраблю тое самае, што ты, мілы.

— Не, Надзежда, я рэжысую сваё апошняе апавяданьне. Зь

меркаваньняў кампазыцыі і настрою лепей будзе, калі ты застанешся, сумуючы па мне да канца жыцьця.
Яна ўзьняла галаву, захопленая маёй задумкай. Паглядзела на мяне вялікімі іскрыстымі вачыма, зь якіх адно было зелянейшым, а другое — больш фіялетавым. Малымі чародкамі вераб'і вярталіся на дрэва, дзе месьціўся іхны парлямэнт. Ледзь кранаючыся, я пацалаваў яе левае вока, тады правае.
— Запраўды ня хочаш?
Я адмоўна пакруціў галавой. Яна зноў схавала твар на маім плячы.
— Пачакай, мне трэба падумаць, — шапнула яна.
Я абняў яе, адразу знайшоўшы тыя дзівосныя грудзі, такія зычлівыя і прыхільныя да мяне. Яны таксама былі стомленыя, сагрэтыя чулай соннасьцю.
— Не. Ня трэба, — яна адсунула мяне локцямі. — Хай так застанецца. На ўсё жыцьцё.
— Я буду чакаць цябе ў панурым, барадатым праваслаўным небе.
Яна мацней прыціснула твар да мае курткі, абкручанай празрыстым павуціньнем.
— Што мне рабіць? — спыталася яна. — Усё разбурылася за пару гадзін. Але я ведала пра гэта. Здагадвалася, што спаткаю цябе.
— Такіх, як я, шмат. Я ў кожным зь іх. Мяне асобнага няма. Ты абдымаеш манэкен, адзеты ва ўнівэрмагаўскія нагавіцы і куртку.
— Ты — гэта ты. Я ведаю. Я сьніла Польшчу з зруйнаванымі палацамі і цябе з заплечнікам на даўгой зьвілістай дарозе.
— Мы мусім расстацца, Надзею.
— Да сустрэчы.
— Там.
— Альбо яшчэ тут. Хочаш супакаяльнага парашку?
— Не. Ужо не. Я спакойны, хоць ня ведаю, што зраблю.
— Зробіш, як захоча Бог, у якога верыш.
— Найлепш, аднак, калі б надышоў канец сьвету. Пайшлі б разам, абняўшыся, у чысьцец. Разам з ворагамі і сябрамі. З валізачкай сьвятасьці і з вагонам грахоў.
— Так, добра было б, калі б быў канец сьвету, якога людзі чакаюць паўмільёна гадоў.
— Надзежда, мне трэба зрабіць яшчэ пару апошніх справаў.

Яна прыцягнула мяне да сябе. Я зноў пачуў ледзь чутны пах засыханых бярозавых галінак. А тады зьлёгку адштурхнула на адлегласьць дыханьня.
— Дык ідзі, мілы. Я буду маліцца за цябе.
Перахрысьціла мяне праваслаўным расейскім крыжам, а я пацалаваў канчукі яе пальцаў. Вераб'і зноў усчалі свой брынклівы кітайскі харал. Хмары камароў узьвіліся над кустамі саду, цяпер поўнага золата і смалянай чарнаты.
— Пачакай тут, пакуль я сыду, — сказала яна, гледзячы некуды ўбок. — Абяцаеш?
— Абяцаю.
Яна перавяла пагляд на мае вочы. Зрэнкі расшырыліся ў ледзьве заўважнай усьмешцы, а ў кутох павекаў бліснула раптоўная вільгаць.
— Абдымі мяне. Вельмі моцна, яшчэ мацней.
— Мацней ужо не магу.
— Мацней, мілы, каб я запомніла.
Мы пацалаваліся мокрымі й салёнымі вуснамі. А потым яна адвярнулася з роспачнай цьвёрдасьцю, пабегла трохі ацяжэлым і дзіўна плаўным крокам у глыбіню сонечнай вуліцы.
Я машынальна агледзеўся, шукаючы каністры. Але маёй прылады катаваньня нідзе не было. Раптам я адчуў цяжар у галаве, змучанай пахмельлем і ліхімі думкамі. З глыбіні саду прыляцела тая аса, якой я нядаўна спадабаўся. Зноў таўклася каля маіх шчок, каля маіх вушэй. Разам зь ёй я выйшаў на вуліцу.
А там, каля разваленых муроў грамадзкай прыбіральні, стаяў, усьміхаючыся, Тадак з Старагарду з блакітнай каністрай у руках.
— Бо, можа, некалі, у чарговым коле бясконцасьці, я яшчэ буду кахаць. Гэта таксама з вас, — сказаў ён, матляючы бітонам. — Я ўзяў бэнзын з сабой. Вы пакінулі яго на вуліцы.
П'яныя маніфэстанты абуджаліся ад пасьляабедавае дрымоты на бэтоннай пляцоўцы. Адзін зьдзіраў з палатна транспаранту папяровую літару "L", каб абкруціць палец, зь якога цякла кроў. Я перайшоў дарогу, што сьмярдзела расплаўленым асфальтам, і падышоў да Тадка з правінцыі, які ўсьміхаўся. Ён падняў бітон, хацеў уручыць яго мне. Але я без папярэджаньня ўзяў яго за вушы каўнеру флянэлевай кашулі, сьціснуў іх на ягонай худой шыі так, што яго дурнявыя пачцівыя вочы вылезьлі з

арбіт.
— Ты, нягоднік, вывеў мяне на Жоржа. Колькі ты на іх працуеш?
Пералякана адпіхваючы мяне рукамі, ён невыразна забулькатаў:
— Тры гады.
Я трэснуў яго наводліў па гэтай пазбаўленай расьліннасьці пысе. Ён упаў на калені, але неяк так спрытна, каб не пашкодзіць каністры. Схапіў маю руку і пачаў цалаваць яе паскудна мокрымі і сьлізкімі вуснамі. Толькі цяпер я заўважыў, што ён не такі ўжо й малады. Было нешта па-старэчаму хітрае ў гэтым інфантыльным, безбародым твары.
— Колькі табе гадоў, сьвінтух?
— Трыццаць тры, — выстагнаў ён, пакрываючы маю далонь адданымі пацалункамі.
Я ўдарыў яго яшчэ раз. Тады ён абцёр рукой нос, каб спраўдзіць, ці не цячэ кроў, і заенчыў:
— Сорак. Богам клянуся, я не маню.
— Як цябе завэрбавалі?
— Я пішу ім вершы. Выдумляю таксама досьціпы. Для аддзелу прапаганды і дасьледаваньняў настрояў насельніцтва.
— Уставай, нягодніку. І не ламай мне тут камэдыі, бо скажу людзям, хто ты такі.
Ён узьняўся з каленяў, хліпаючы носам. Старанна ачысьціў рукавом край бітона. Такі ён быў адданы мне.
— Што гэта за вершы? — спытаўся я і зноў схапіў яго за каўнер агіднай, прапацелай кашулі.
— Сатырычныя. На розных апазыцыянэраў, бунтароў, наагул на ворагаў.
— А досьціпы?
— Досьціпы — гэта на людзей з ураду. Два віды анэкдотаў. Адныя пробныя, каб спраўдзіць, як натоўп рэагуе, а другія супраць дзеячоў, якія выходзяць у тыраж.
— Пачвары. Усё-такі крыкну людзям, каб цябе лінчавалі.
Ён ізноў укленчыў і схапіў сваімі лапкамі яшчаркі маю руку.
— Малю вас, прабачце мне, калі ласка. Я ж прызнаўся. Што мне было рабіць? Што мог зрабіць чалавек з Старагарду і да таго ж убогі? Дваццаць гадоў я пісаў вершы, і ніводзін сабака мне слова добрага не сказаў. Усе лісты з выдавецтваў і рэдакцыяў пачыналіся словамі “З жалем паведамляем”. Урэшце я

зьненавідзеў пошту. Вы мяне зразумееце і выбачыце. Іншыя займаюцца і горшым сьвінствам. Прашу вас у імя маіх бацькоў, бо я сірата.
— Табе гэтулькі ж гадоў, як ПНР, і ў табе гэтулькі ж падступнасьці. Можа, яшчэ што працытуеш з маіх тэкстаў?
— Калі ласка, — усьцешыўся прадажны Тадзік. — У мяне ўжо ёсьць адпаведная цытатка. “Я падняў кулак, каб ударыць, а ён скурчыўся і заплакаў”. Я ж і праўда захапляюся вашай прозай. Адно з другім ня мае нічога супольнага. Я пад вашым літаратурным уплывам. У маёй паэзіі адчуваюцца вашыя ўплывы. Кіраўніцтва аддзелу нават упікае мяне, што я натхняюся вашай творчасьцю. Я вас люблю. Не магу жыць бяз вас.
П’яніцы непрыхільна назіралі за мной. З боку магло падацца, што я жорстка абходжуся зь непаўналетнім.
— Уставай, шчанюк старагардзкі. І зьнікні з маіх вачэй.
Ён узьняўся з ходніку, выціраючы нос і вочы.
— Я сёньня перажыў шок, — сказаў ён плаксіва. — Даруйце мне, калі ласка. Я пачынаю новае жыцьцё. Па абедзе я адмовіўся ад працы ў аддзеле. Я такі ж самы чалавек, як і вы.
Я сьціснуў кулак і зрабіў крок у ягоны бок, а ён засланіўся бруднымі рукамі.
— Ты, мудак, пакінь малога! — крыкнуў маніфэстант, паднімаючы кій ад транспаранту.
— Добра, — сказаў я. — Давай бітон і чашы адсюль.
— Я буду насіць за вамі, — разрыдаўся Тадак.
Я зірнуў у бок абуджаных п’яніц. Яны няцьвёрда ўставалі на ногі.
— Як добра, што я вас спаткаў. Гэта быў пералом. У маім жыцьці і ў маёй творчасьці. Вы ўратавалі чалавека. Ці можа быць важнейшая справа на гэтым сьвеце?
— Заткні рот і хадзем адсюль, бо нас паб’юць, — буркнуў я.
Я рушыў на Новы Сьвет, а саракагадовы Тадак — за мной. Цяжка цьверазеючы, дэманстранты праводзілі нас падазронымі, неласкавымі вачыма.
— Гэтулькі змарнаваных гадоў, — бедаваў Тадак за сьпінай. — Так, я зграшыў, ня буду адпірацца. А нашыя сучасныя клясыкі не грашаць? Вы паглядзеце, калі ласка, — ён схапіў мяне за руку і пацягнуў да вітрыны крамы з галянтарэяй.
А там сярод лёзунгаў стаяў разладжаны тэлевізар. Ня так,

праўда, сапсаваны, каб нельга было ўбачыць чарговай падзеі зьезду. Цяпер на вернасьць абодвум сакратаром прысягалі старшыні творчых саюзаў. Старшыня мастакоў быў адзеты ў фартух па модзе дзевятнаццатага стагодзьдзя, на галаве ў яго быў вялізны аксамітны барэт, у руцэ ён трымаў палітру і пэндзаль. Другі, у белым каптане, нёс вялізнае гусінае пяро і сувой паперы. Трэці, у рымскай тозе, трымаў перад тварам грэцкую маску. Чацьверты, зь вянком на галаве, пашчыпваў струны ліры. Але адзін зь іх быў у цывільнай адзежы, ня меў сымбалічнага рэквізыту і ўсё ж, як і астатнія, укленчыў на адно калена перад сакратарамі. Мяне заінтрыгаваў гэты цывільны старшыня, раптам мне аж-аж-аж захацелася даведацца, каго ж гэты рэпрэзэнтуе. Тадак, пэўна, ведаў, але пытацца не выпадала.

— Бачыце, ім гэта можна? Яны ўсё маюць. Грошы, прыгожых жанчын, славу ў краіне і за мяжой, а ўкленчылі перад гэтымі ёлупамі. Дык што вы ад мяне хочаце?

— Тадак, ты паскуда, — уздыхнуў я.

— Ці ж гэта мая віна? Я хацеў бы выглядаць, як вы. І што я магу зрабіць, калі Госпад Бог меў іншы намер.

Я кашлянуў, ня ведаючы, што адказаць.

— Аддай бітон, — сказаў я ўрэшце.

— Тады я заб'ю сябе.

— Можаш ісьці з мной, калі хочаш, але аддай бітон.

— Вы мной грэбуеце?

Я кінуўся ў яго бок, а ён чуйна адскочыў.

— Аддай каністру, сукін сын!

Ён раптам пакрыўдаваў і падаў мне бітон, дзяржальна якога было мокрае ад яго паршывага поту.

— Думаеце, я нічога ня ведаю, — сказаў ён шматзначна.

Каля "Парадызу" было пуста. Арабы ўсярэдзіне ўжо мацалі нашых дзяўчат у такт усходнім мэлёдыям. Я затрымаўся перад крыштальнымі дзьвярыма, у якіх некалі выбілі крыштальныя шыбы. Пад лёгкім надвячэрнім ветрам гайдалася кардонка з надпісам "Усе месцы занятыя".

— Ведаеце, — прымірэнча азваўся саракагадовы Тадак. — Арабу досыць даткнуцца да нагі белай кабеты, і ён ужо спускае.

— Цяпер будзеш мне тут нейкія брыдоты верзьці? — крыкнуў я.

— Гэта праўда, шчырая праўда. Спытайцеся ў дзяўчатаў.

Я пайшоў у бок плошчы. Гмах партыі сонна ляжаў на вялікай

каменнай плятформе. Стары стомлены зьвер з асьлеплымі вачыма. Лёгкія дрыжыкі праляцелі па маёй сьпіне, бо я зноў успомніў таемны банкет для найвышэйшага кіраўніцтва, пазначаны крыптонімам ТБДНК. Ці мае таварышы па алькаголі здолеюць замесьці сьляды? А мой рахунак? Я забыўся заплаціць за рагу. Не дык не, можа, яно патанула ў агульных стратах.
На плошчы драмаў пусты трамвай. Усе пасажыры атачылі кіроўцу, які стаяў каля транспартнага сродку і адмахваўся ад неадчэпных кліентаў.
— Я сказаў, што не паеду, значыць, не паеду.
— Але ж, залаценькі, што здарылася?
— Папросту расхацелася мне і ўсё. Я іду дадому.
— Спадару кіроўца, але ж у вас цяпер карацейшы маршрут. Толькі да мосту Панятоўскага, які паваліўся.
— Пляваць мне, што карацейшы маршрут.
— О Божа, чалавеча, ну будзьце ж чалавекам.
— А я не хачу і ня буду тлумачыць. Расступіліся, калі ласка.
— Мілы, я еду з абедам да хворай маці.
— А мне што да гэтага?
— У мяне ёсьць чвэртка сальтысону. Хочаце?
— А пайшлі вы. Мне нельга. Мне нічога нельга, кажу вам як людзям. Дайце прайсьці.
— Хрыстом Богам просім, ну будзьце ж вы палякам.
— Палякам, першым кандыдатам? — спытаў кіроўца трамваю.
Раптам зрабілася ціха. Нехта закашляў, яшчэ нехта адкашляўся. Нейкае дзіцё расплакалася.
— Аа, іці вашу маць, — уздыхнуў кіроўца. — У мяне сэрца мяккае. Завязу, але толькі да пляцу Нарутовіча, і ўсё. Сядайце, палякі.
Мы жвава ўскочылі ў зруйнаванае нутро трамваю. Я чуў за сабой задыханага Тадка. Трамвай злосна зазваніў, і мы з скрыгатам паплылі пад сонца, што заходзіла за гарызонт.
— Да таго ж ты яшчэ блытаеш мяне зь нейкім іншым літаратарам, качан капусны, — буркнуў я, гледзячы ў зарослае пылам акно.
— Як гэта? Я ж добра ведаю. Вы Рышард Шміт, праўда?
Мне захацелася даць яму высьпятка, у азадак, наўздагад.
— Ты цытаваў мяне, дурню.
— А гэта вашыя тэксты? Мне здавалася, што спадара Рышарда.
Я павярнуўся. Гэты бязвусы, хлапчукаваты і зморшчаны твар

усьміхаўся з фамільярнай паблажлівасьцю.
— Ня бойцеся. Гэта вашыя залатыя думкі, і я ведаю, хто вы.
— Можаш цытаваць каго хочаш. Мне гэта да лямпачкі.
— Добрыя тэксты, хоць вам не паталаніла да канца. Але я за вас адпомшчу, калі атрымаю Нобэля.
Я ціха заенчыў, павяртаючыся да акна. Ён прысеў на ацяпляльны канал і чула ўзяў з мае рукі блакітную каністру. Абняў яе каленямі, весела глядзеў перад сабой, загадкава міргаючы.
Тады я адчуў, што нехта далікатна тыцкаецца ў маю правую нагу. Натуральна, гэта быў Пікусь. Ён аддана глядзеў мне ў вочы і віляў смутнай рэшткай хвосьціка.
— Пікуся, дзе ты зноў падзеўся?
А ён учапіўся сваімі лапкамі-махрамі ў мае нагавіцы, папіскваў зь вялікай любасьцю, шчасьлівы: маўляў, зрабіў мне прыемнасьць тым, што неспадзявана знайшоўся.
— Адвядзём цябе, цюцька, да тваіх блізкіх каля пляцу Збаўцы. Яны ўжо гэтулькі гадоў ня могуць цябе забыцца. Яны любяць жывёлаў. І людзей таксама.
Пікусь цешыўся, мітусьліва круцячыся вакол свайго хваста, якога, уласна кажучы, не было. Мы мінулі колца на скрыжаваньні Маршалкоўскай з Алеямі. Цяпер у вітрынах і вокнах кватэраў паказаўся адбітак каменнай гары Палацу культуры. Бліскала сьвятло вайсковых пражэктараў. Паміж іхнымі промнямі пульсаваў надпіс, складзены з падсьветленых плястыкавых дзіцячых ванначак: “Мы збудавалі сацыялізм!” Але ванначкі забралі з забракаваных тавараў, прызначаных на экспарт, таму яны былі дзе-нідзе патрэсканыя, паказвалі сукрытыя ў іхным нутры лямпачкі, бальшыня зь якіх ужо перагарэла.
Нешта прымушала мяне азірнуцца і паглядзець на гэты будучы мой гіганцкі надмагільны помнік, аздоблены старым сымбалем Польшчы і сучасным — савецкай дзяржавы. Мне нават было цікава, ці ўжо абклалі нашага арла гербавымі снапкамі збожжа, перавязанага стужкай зь лёзунгам “Пралетары ўсіх краінаў, яднайцеся!”. Але я не абярнуўся, спаралізаваны нейкім забабонным ці магічным супрацівам. Пагляджу на гэты гмах тады, калі будзе трэба. Пагляджу ўвечары а восьмай, калі наагул пагляджу.
За сьпінай, праз скрыгатаньне трамвая, я чуў водгульле

гучнагаварыльнікаў і размытыя гукі аркестраў. Па маіх руках праскоквалі трупныя фіялетавыя водбліскі сьвятла вулічных ліхтароў. Пікусь спаў пры маёй назе.
Мы мінулі Цэнтральны вакзал, які стаяў у возеры тоўчанага шкла з апошніх шыбаў, што вылецелі ад гарматнага салюту. У гэтай патрэсканай шкляной гладзі адбівалася сонца, што хілілася за гарызонт. І вось, ледзь мы мінулі крывавы разьліў вакол счарнелага вакзальнага бункеру, наш трамвай закалаціўся, нібы імкнучыся парваць ланцуг, пачаў трашчаць у жалезных змацаваньнях і ўрэшце сьціхнуў і плыў яшчэ колькі дзясяткаў мэтраў, нібы карабель, які прыбівае да берагу. Урэшце спыніўся, таргануўся наперад і назад ды канчальна замёр.
Пасажыры беглі да пярэдняй кабіны, зь якой вылазіў, хістаючыся, кіроўца.
— Шаноўны, вы ж абяцалі да пляцу Нарутовіча.
— Абяцаў, бо гонар маю. Але вымкнулі электрычнасьць. Ох, людзі, як мяне сушыць, — ён абмахваўся масянжовым дзяржальнам, якое забраў з пульту кіраваньня.
— Брэша! Зноў яму расхацелася. А я вязу абед для хворай маткі! — гукнула нейкая кабета.
— Калі ласка, — пакланіўся кіроўца, стрымліваючы ікаўку. — Бярэце дзяржальна і едзьце.
Колькі маладзёнаў ужо шнырыла па ягонай кабіне.
— Праўду кажа. Няма току! — закрычалі яны.
Загучала ня надта дынамічная лаянка. Натоўп пачаў расплывацца па суседніх вуліцах. Кіроўца сеў на пярэдні буфэр, падставіў сіні твар сонцу і з палёгкаю прыплюшчыў вочы.
— Хадзем, хлопцы, на пехату, — прапанаваў я.
Пікусь рушыў папарадзе, я — усярэдзіне, а Тадак зь бітонам — у канцы. Мы ўвайшлі на вуліцу Вочкі, якую заліваў чырваньню захад. Ішлі панурым каньёнам паміж магільнымі дрэвамі. Мы ведалі, што за гэтым турэмным мурам месьцяцца гарадзкія празэктарскія і трупярні. Але тут мы пачулі за сабой гістэрычнае выцьцё сырэны. Пасярод дарогі імкнула машына хуткай дапамогі з папсаванай, нядзейнай мігалкай. Таму кіроўца ўвесь націск зрабіў на кляксон. Машына мінула нас, зрываючы з асфальту аблокі засохлага лісьця, і раптам гвалтоўна затармазіла. Яе трохі занесла ў бок бардзюру, але шафёр запыніў машыну і праз сэкунду даў задні ход. Заднія

дзьверцы адчыніліся, і зь іх паказаўся ўзрадаваны Кабялка.
— Бачыце, якая ў мяне форма, — паказаў ён сваю беззаганна чыстую зьмірэнчую кашулю. А трохі варушыць рукамі ён мог, бо яму па блаце свабодна зьвязалі рукавы на сьпіне. — Урэшце дачакаўся машыны. У іх была аварыя. Ну а цяпер, дзякуй Богу, усё ў парадку. Ляцім у Творкі. Можа, вас падкінуць па дарозе?
— Дзякуй, суседзе, — сардэчна сказаў я. — Нам недалёка. Уласна кажучы, мы ўжо прыйшлі.
— І што робіце?
— Па-ранейшаму. Сьвяткуем.
— З дня на дзень зраўнуемся з Захадам. Гэта значыць, Захад з намі зраўнуецца. Тады будзе лепей. Наагул будзе лепей.
— Чаму вы думаеце, што можа быць лепей?
— Таму, дарагі суседзе, што мы ўсе пачнём ад пачатку. Гэта значыць, адаб'ёмся ад дна, сьціснула кажучы, сьвет адаб'ецца ад татальнага дна, як ад касьмічнай падлогі. Перапрашаю, суседзе, але я ўжо аптыміст. Маю ўласны вольны, незалежны дом, — і ён эўфарычна ўдарыў даланёй у дах машыны. Кіроўца адразу ж хацеў ехаць, але Кабялка скамандаваў зычным голасам:
— Стоп! Стоп! Яшчэ момант. Я б вас абняў, дарагі суседзе, але бачыце, што ўбраны я неадпаведна.
— Добрага вам здароўя.
— Здароўе ў мяне добрае. Шчасьця, пане, нам усім трэба зычыць у новым коле часу, у будучай эпосе, у наступным сьвеце. Помніце, што я вас усіх заўжды любіў! — ён убачыў Пікуся, які зь цікавасьцю заглядаў у машыну. — І жывёлаў вашых любіў! Гэтая любасьць мяне згубіла! Што я кажу, гэтая любасьць зрабіла мяне вольным! Хай жыве вольная, незалежная Польская Савецкая Рэспубліка!
І прабарабаніў нейкі афрыканскі дробат на заржавелым даху машыны ўрадавай псыхіятрычнай бальніцы. А падштурхнула яго да гэткай дэманстрацыі хіба тое, што праз бакавое аконца выглянуў Зэнак і пільна прыслухоўваўся да прамовы пацыента. Машына хвацка рушыла, буксуючы коламі на засланай кляновым лісьцем дарозе, і памкнула ў бок вуліцы Груецкай.
— Ты бачыў шчасьлівага чалавека, ёлупень, — сказаў я Тадку Скурку. — Дай каністру.
— Але навошта?
— Бо яна мне будзе трэба. Я тут зайду ў бальніцу, а вы

пачакайце.
— Калі ласка, асьцярожна, я вас вельмі прашу. Я таксама люблю вас, як бацьку.
Я хацеў яму ўрэзаць, але ён спрытна адскочыў.
— Я за вас адпомшчу. Сьвет нас яшчэ ўспомніць, — ён змагаўся з кішэняй, сілячыся выцягнуць нейкі пакет. — Я пачаў пісаць прозу. Маю ўжо тры разьдзелы. Сьвет яшчэ ня бачыў такой прозы.
Я ў роспачы рушыў да ўваходу ў бальніцу. Колькі нецьвярозых хворых ляжала на парослых травой сходах. Я хацеў засьцерагчы іх ад запаленьня лёгкіх, але яны глядзелі на мяне варожа, так, як хворыя глядзяць на здаровых.
— Антыхрыст, — сказаў я. — Антыхрыст пад абліччам віруса. Эпідэмія. Як грып ці халера. Эпідэмія з нутра космасу.
Я йшоў калідорам, асьветленым маленькімі лямпачкамі, якія загараліся і гасьлі. Для бальніцы электрычнасьць выраблялa аўтаномная дынама-машына. Па гэтых паўцёмных закуткох сноўдаліся падпітыя пацыенты. Лёгка хворыя без энтузіязму абслугоўвалі цяжка хворых. Санітараў і сядзелак ужо даўно не відаць у нашых бальніцах. Выйшлі з моды.
Урэшце я ўбачыў шкляную сьцяну рэанімацыйнай залі. У ёй стаялі тры фатэлі ці ложкі, а найхутчэй — рахітычныя катафалкі, на якіх падрыгваліся тры непрытомныя целы. Дзьверы былі не зачыненыя да канца, таму я бязь цяжкасьці ўвайшоў у зеленаватае памяшканьне, напоўненае мэханічнымі гукамі тахканьня, сычэньня, брынчаньня. Міргалі каляровыя агеньчыкі, з крана цякла вада, у паветры плыў цяжкі пах карболкі ці мо валяр'янкі.
Я па чарзе прыгледзеўся да трох абяскроўленых твараў. Той, што пасярэдзіне, цёмна-сіваваты, нібы з трохі мурынскімі рысамі, мог бы быць Губэртам. Яго апляталі нейкія шлянгі, драты, а ў горла ўбілася тоўстая рыфленая трубка. Ён гістэрычна падрыгваўся, падкіданы рытмам апаратаў, і глядзеў на мяне тым адным сьляпым вокам, якое ня бачыла. Ашчэрыў павялічаныя дзіўным чынам зубы, але ашчэрыў, відаць, даўно, бо ў кутох старых вуснаў застыў жоўты шум. Ён глядзеў на мяне гэтым сьляпым вокам і нічога не казаў, бо ўжо ня мог гаварыць. Мне раптам падалося, што тут сьмярдзіць трупам. Што ў гэтым шкляным кіёску, у якім не прыбіралі тыднямі — што ў гэтым зеленаватым чысцы пахне сьмерцю.

Я ня мог трываць яго пагляду, то бок ня мог трываць гэтага белага вока, што сьвідравала мяне салатавым, фасфарычным слабым сьвятлом. Таму я ўкленчыў пры нагах ложка, бачыў перад сабой васковыя стопы Губэрта, абцягненыя нежывой скурай, касьцістыя, жылістыя, нібы прэпараваныя ў фармаліне.
— Ну што, Губэрце? — сказаў я напаўголасу. — Набегаўся ты па сьвеце ў сваім сярэдняй даўжыні жыцьці. Набегаўся па нашым малым мікрасьвеце места, што канае пасярод Эўропы. Што цябе гнала наперад, якая сіла, якая вера?
Нехта жаласна ўздыхнуў. Я падняў галаву, але гэта адно якаясьці з машынаў, можа, штучнае лёгкае, штучная нырка альбо штучнае сэрца, якісьці з штучных чалавечых органаў зьмяніў рытм, быццам зьмяніў натруджаную руку.
— Ну і што, манах эпохі заняпаду, Саванарола канца старога сьвету? Ты пражыў марнае жыцьцё, тваё існаваньне нікчэмнае, а лёс няшчасны. Ты заўжды быў супраць, і казалі, што ты ўвесь час мяняеш погляды. Ты душыў у сабе людзкія парывы, а можа, філістэрскія звычкі, і ў блізкіх зьнішчаў абываценя й філістэра. Мала хто цябе любіў, шмат хто цябе ненавідзеў. Любілі цябе абы як, ненавідзелі з усяе сілы. Сьпярша быў заслабы, няздарны, марыянэткавы рэжым супраць вялікага, тады яшчэ спраўнага народу. Потым быў заслабы, мізэрны, зганьбаваны народ супраць усёмагутнай паліцыі, супраць запанелай партыйнай арыстакратыі, супраць таталітарнай дзяржавы. Якая ж маральная лёгіка кіравала тваімі ўчынкамі, мая бледная, непахісная, нялюдзкая згрызота сумленьня?
У гэты момант аднекуль з паўзмроку падлогі высунуўся Пікусь, які трапіў сюды аднаму яму ведамымі дарогамі. Пачаў абнюхваць з насьцярожанымі вушкамі высокія, вычварныя ногі гэтых ложкаў, нейкія начоўкі, сувоі бінтоў. Машыны мерна саплі, міргаючы слабымі агеньчыкамі.
— Калі ты пачаў друкавацца на эміграцыі і ў айчынным падпольлі, урадавыя мастацкія салёны зьдзекліва запасьміхаліся: маўляў, ты шукаеш кампэнсацыі, падлабуньваешся да вольнага Захаду, на палітыцы спрабуеш збудаваць сваю кар'еру літаратара. Калі начамі студэнты размнажалі цябе на гектографах, калі старыя маньячкі выстуквалі крадком на машынках твае эсэ, калі разыходзіліся твае творы, твае роспачныя думкі і безнадзейныя надзеі — калі яны разыходзіліся па краі накладам у колькі дзясяткаў

асобнікаў, твае калегі, твае верныя сябры, вартаўнікі нацыянальнага агнішча, вясталкі агню бацькаўшчыны — яны заглыбляліся ў двухсэнсоўны, але выгадны флірт зь бязмозглым рэжымам. Лезьлі ўперад па краіне, заграбаючы грошы і прызнаньне, перлі ўвысь за мяжой, карыстаючы з падтрыманьня рэжыму, з дыпляматыі, грошай, зь вялікай дзяржаўнай машыны. Шматзначна міргаючы, яны намякалі ў вольным сьвеце, што рэпрэзэнтуюць маральную моц прыгнечанага краю, што твораць гэтую маральную моц і кіруюць ёй. А табе, небарака зь сярэднявечным выхаваньнем, а табе не шкадавалі высьпяткаў ані адныя, ані другія. Ты націскаеш вагар, які спыняе тваё існаваньне. І зь якім сальда? Ці хто папрыгажэў у гэтых нашых казэматах, апроч мяне? Ці хто ня спаў начэй, катаваны сумленьнем, апроч мяне? Ці хто скочыў у агонь, каб зграшыць і абразіць пана Бога, апроч мяне? Пікусь сеў пасярод залі. Ён не глядзеў на мяне, не глядзеў на паміраньне. Падняў галаву і ўтаропіў вочы, як пацеркі, у зеленаватую кафляную столь, у зеленаваты колер безнадзейнай надзеі.

— Слушна робіш, шантажыст, што памі раеш. Звальваеш цішком, як сантэхнік, які ня здолеў адрамантаваць крана. Сьвет выраўнаўся. Няма злых і добрых. Ёсьць вялікі няшчасны натоўп людзей, што топчуць адзін аднаго па нагах. Высахлі, усмакталіся ў пясок забыцьця жыватворныя крыніцы колішняй маральнасьці. Няма скуль чэрпаць, няма такога месца, дзе можна было б асьвяжыцца. Няма прыкладу, няма натхненьня. Ёсьць ноч. Ноч абыякавасьці, ноч апатыі, ноч хаосу.

На століку пад нядзейснай лямпай стаіць настольны каляндар. Пажоўклы, з загнутымі рагамі, пакрэсьлены нечай рукой. Ён паказвае дату 22 ліпеня 1979 году, яшчэ адна дата з мноства датаў, якія нас атачаюць.

— Зарана ты памі раеш, Губэрце. Яны ўсе, сьведамыя лёкаі часу альбо гісторыі, яны ўсе чакаюць тваёй галавы. Яны жадаюць, каб ты перад імі скарыўся і прызнаў іхную рацыю. Яны скальп з тваёй галавы хочуць павесіць сабе на грудзі, як яшчэ адзін ордэн. А можа, ты ўжо скарыўся? Можа, плаціш жыцьцём за капітуляцыю?

Гіпсавыя ногі Губэрта лягенька дрыжалі. Край прасьціны паволі ссоўваўся, паказваючы валасатыя мёртвыя лыткі. Недзе грукнулі дзьверы, але Пікусь не зьмяніў сваёй пазыцыі пасярод

залі. Схіліўшы галаву, ён глядзеў у столь альбо ў нешта, што было па-над стольлю.
— Губэрце, мы з табой былі найдалейшыя і найбліжэйшыя адзін да аднаго. Мне блага было б безь цябе на зямлі. Табе было б блага безь мяне на тым сьвеце. Пара разьвітацца на кароткую хвілю, на імгненьне мёртвага вока Госпада Бога.
Я ўстаў, падышоў да галоваў. Машыны не замоцна торгалі гэтую сіваватую галаву з тварам, сьцятым болем ці чаканьнем. Я схіліўся, дакрануўся вуснамі да халоднага й мокрага лобу. Мне не хацелася гэтага рабіць, але я ведаў, што так трэба. Тады Пікусь пачаў выць. Ён выў на гэтыя зялёныя кафлі надзеі, як на месяц. А я чамусьці баяўся забараніць яму гэтак выць. Таму я зь сьцятым сэрцам слухаў жалобны гімн Пікуся, які згубіўся і неспадзявана знайшоўся. Нехта няцьвёрдым крокам падыходзіў да нас па калідоры. Гэта быў малады лекар у нясьвежым халаце. Відавочна, мы абудзілі яго, бо ён ад душы пазяхаў, так што аж трашчала ў сківіцах.
— Хто вам дазволіў? Ды яшчэ з сабакам? — ён абдаў мяне водарам мэдычнага сьпірту. — Гэта ж палата рэанімацыі.
— Бачыце гэты каляндар? — спытаўся я.
— Бачу, — зьдзіўлена адказаў ён.
— Ці гэта сёньняшняя дата?
— А я ведаю? Вы павінны пакінуць залю.
— Я прыйшоў разьвітацца зь сябрам. Ён быў прарокам. Хацеў вывесьці нас з дому няволі.
— Каторы гэта?
— Гэты, пасярэдзіне.
— Ага. Шчыра кажучы, гэта машыны ствараюць уяву жыцьця. Ён ужо далёка. Вы разумееце.
— Не, гэта быў не прарок. Гэта быў пачцівы чалавек, а можа, маньяк. Гэта была сьціплая згрызота сумленьня, а можа, здань сумленьня, якая нам часам трызьніцца. Папросту адарваны кавалак нашай супольнай біяграфіі. Ах, як мне баліць галава.
— Мне таксама баліць, — уцешыў лекар. — І слушна, бо што было б, каб пасьля гулянкі не балела. Мусіць жа быць нейкая справядлівасьць на сьвеце?
— Так, у канцы, недзе ў невядомым канцы, мусіць быць справядлівасьць.
— Я ня буду яго мучыць, хоць яму ўжо нічога не баліць, — малады лекар паказаў на замучанага Губэрта. — А сёмай

выключу.
Пікусь трохі прыціх, балесна скавытаў, паглядаючы ў наш бок.
— А вы не маглі б а восьмай?
Лекар паказытаў Губэртавы цьвёрдыя стопы і цьвяроза паглядзеў мне ў вочы.
— Вы яшчэ маеце надзею?
— Не. Але мне вельмі патрэбна, каб а восьмай.
— Шкада апаратуры.
— Я вас вельмі прашу. Гэта невялікая просьба. Можа, лёс вам аддзячыць.
— Кажаце, а восьмай?
— Так. Дакладна.
— Ну добра. Пастаўлю будзільнік. Але прашу вас выйсьці адсюль. Сабака, пэўна, блохі нанёс.
Ён выпіхнуў нас на калідор, зачыніў дзьверы і сам зьнік у дзяжурцы. Я яшчэ паглядзеў праз шыбу з адбіткамі пальцаў, як у камісарыяце міліцыі — паглядзеў яшчэ на гэтыя тры фатэлі-катафалкі ў арэоле зіхаценьня сыгналізацыйных агеньчыкаў.
— Я так шмат меў сказаць табе. Мне здавалася, што пра жыцьцё, але выходзіць, што толькі пра сябе. Пра сябе ў табе. Альбо, хутчэй, пра цябе ў мне. Як разьвесьці ўласныя, як той казаў, гарманальныя роспачы ды няўдачы ды агульныя, унівэрсальныя, якія мне прышчапіў мой час, мой урывак гісторыі? Я пакланяюся справядлівасьці, як жабрак, а колькі разоў я сам быў справядлівы? Крычу пра маральны парадак, а колькі гадоў я яго парушаў? Выю, скарджуся да Бога, а ці веру я ў яго так, як трэба верыць?
Я махнуў рукой. Нехта тупаў дзесьці ў глыбіні бальніцы. Чырвонае сьвятло захаду шчыльна запоўніла калідор.
— Я паўтараюся. Ты гэта ўсё ведаеш. І мяне таксама ўжо нудзіць. Даруй.
Я адышоўся на колькі крокаў углыб калідору і спыніўся, агорнуты ліхой думкай.
— І ганаровыя хаўтуры ў цябе забяруць. Я ў цябе забяру, твой выпадковы брат. Даруй.
Пікусь вёў мяне беспамылкова. Ён ужо запомніў дарогу. Мы мінулі колькі калідораў, напоўненых ложкамі зь цяжкахворымі, увайшлі ў няхлюйны хол.
— А бэнзын? — спытаўся я сам сябе. — Тут, гаворыць-булькоча ў блакітнай каністры.

Мой запавет. Мае шчодрыя запісы для блізкіх. Безнадзейная эпоха ў дзеях. Не, не эпоха. Часіна, сэкунда, якіх шмат было. Было жыцьцё перад намі, будзе жыцьцё пасьля нас. То лепшае, то горшае. Можа, заўтра будзе лепшае. Досыць аднаго незаўважнага штуршка, дробнага зруху ў таямнічым сусьвеце грамадзкай псыхалёгіі, у гэтым гіганцкім банку калектыўнага ўспрыманьня. Эпідэміі благога самаадчуваньня, усеагульнае дэпрэсіі, татальнага зьняверанъня раптам прыходзяць і раптам зьнікаюць, нібы зьмеценыя жыцьцядайным сонечным ветрам. Мы няўдала патрапілі, ня ў той прамежак бясконцага бегу часу альбо быцьця.
Мы маем жывёльнае цела, але боскія памкненьні. Гармоны перасягнулі бар'еры, пастаўленыя ім біялёгіяй, правам сьвету жывёлаў. Нашыя гармоны выраблюць фэрмэнты голаду, які нельга сьцішыць, мараў, якія няможна зрэалізаваць, тугі, якую няможна заглушыць. І я ў самай гушчы, зь вялікай пустой галавой, з успухлым сэрцам без крыві, з разрэджанай душой антыматэрыі. Стомлены сабой і сваім часам. Стомлены абмежаваньнем, немаччу, неспасьціжэньнем. Я — сярэдняе статыстычнае Вялікага Рахунку.
Што адпісаць жывым, апроч нясплачаных пазыкаў? Вялікія інтэлектуальныя тэстамэнты ідуць у архівы, не дачытаныя да канца. Узьнёслыя маральныя заклікі стаюцца словамі песень. Таму мая чуласьць цішком імкнецца да розных гэтых няўклюдаў, недарэкаў, недалугаў. Я хацеў бы шапнуць ім на вуха добрую параду, хацеў бы ўмацаваць іх словам падбадзёрваньня, запаліць іх да супраціву наканаваньню. Слухайце, браты гаротнікі. Падыдзеце бліжэй і настаўце вушы, бо я зноў раскажу пра саромныя справы, якіх лепей каб не было, але якія ўсё-такі ёсьць. Хадзеце сюды, небаракі, што мучаюцца начамі з жонкамі і каханкамі. Я чытаў вашыя лісты ў рубрыках сэксалягічных парад. Вы скардзіцеся, што жонкі і сяброўкі незадаволеныя, што наракаюць, што высьмейваюць. Пытаецеся, залітыя страшнай чырваньню мужчынскай ганьбы, як гэта працягнуць, як гэтым авалодаць, як давесьці да шчасьлівага канца.
А ці хацелі б вы, мае спрытныя зайчыкі, непаседлівыя трусікі, прынамсі ў начной цішы, спадабацца мужнасьцю, характарам, посьпехам? Тады спытайце мяне, зычлівага старога. Не

шукайце ратунку ў сэксолягаў, жонак якіх бамбераць усе сябры і знаёмыя.
Перадусім раю мець упартасьць і трываньне. Няма моцных у гэтай канкурэнцыі, ёсьць толькі трывалыя і працавітыя. Трэба старацца ўсякаю парою, ураньні і па абедзе, увечары і на сьвітаньні, і доля ў нейкі момант шчодра ўзнагародзіць. На гэтым полі, сапраўды ваярскім полі, правіла такое, што посьпех нараджае посьпех. Што першая перамога выклікае ланцуг наступных перамог.
Як ва ўсякім мастацтве, і тут для пачаткоўца абавязковая шчырая пакора. Сьціплы чалавек, які не разьлічвае на лёгкі посьпех, які падрыхтаваны да прыкрых няўдач, мае больш шанцаў, чымся які саманадзейны, эгацэнтрычны, прагны адразовых ляўраў тыпчык. Пакорлівыя і руплівыя ўзьнесьлі на вышыню цяжкае мастацтва каханьня.
Харошым часам для гэтай рызыкі ёсьць час пахмельля, ужо памякчэлага, лагоднага вечаровага пахмельля. У гэтую лянотную пару, падшытую мэтафізычным страхам, шмат сярэдніх паводле натуры спаборнікаў дасягалі вялікіх вынікаў. Гарэлка капрызная й непрадказальная. Пахмельле ласкавае, дабрадушнае. Яно ўзбуджае.
Гэтае мастацтва розьніцца ад іншых тым, што ня церпіць гонкі за эфэктам, фанабэрыстых дэманстрацыяў і звыклай нахабнасьці. Нельга пачынаць дзеля таго, каб паказацца, каб пахваліцца ці спадабацца. Калі не адчуваеш патрэбы, не пачынай. Калі можаш унікнуць сутычкі, унікай. Толькі немінучыя двубоі, блаславёныя нябёсамі, маюць посьпех.
Я хацеў бы тут дадаць рэцэпт майго сябра Зьдзіслава М. Гэты мэтад навукова спраўджаны і наагул безадмоўны. Вось жа, Зьдзісь даў наступную параду свайму сябру актору, ведамаму посьпехамі ў гэтых рэчах: “Каб авалодаць справаю, трэба нечым заняць галаву, думаць аб абстракцыі. Прыкладам, добра паўтараць самому сабе якісь тэкст. Табе, як актору, гэта будзе няцяжка. Які-колечы тэкст, даўгі, ты б мог цішком дэклямаваць сам сабе?” — “Можа, “Пана Тадэвуша?” — спытаўся нясьмела актор. “Вельмі добра, — пахваліў Зьдзісь. — Дванаццаць кніжак. Добрая дыстанцыя”. Праз тыдзень яны спатыкаюцца выпадкова. “Ну і як?” — пытаецца Зьдзісь. “Ішло дасканала, але пры “gdzie panieńskim rumieńcem dzięcielina pała” * выпала ў мяне слоўца з галавы, забыў тэкст, — кажа актор. — Ну, і

катастрофа”.
Таму разьвівайма памяць перадусім.

Вось і пад’езд. А гарызонт выглядае як домэнная печ. Заўтра будзе вецер, можа, нават ураган. Заўтра будзе для жывых.
— Я паўтараюся, — шапянуў я. — Паўтараюся, бо сытуацыя паўтараецца. Тая самая сытуацыя штодня.
— Вы сам з сабой гаворыце? — пачуў я нечы голас.
Я павярнуўся ў бок Алеяў, дзе з поўначы вырысаваліся на далягляцзе чорныя хмары. Перада мной стаяў Сахер зь неабсяжнай тэчкай. Сутоньне прыгасіла фанатычнае полымя ў вачох старога.
— Усё меней зычлівых суразмоўцаў.
— Што праўда, то праўда. Вы ўваходзіце ці выходзіце?
— Выходжу.
— Ну то давайце на хвілінку зойдзем. Бо я туды да сябра з даўніх часоў, старога рэвалюцыянэра і старога ўпарціўца. Яму належыцца ляжаць ва ўрадавай клініцы, а ён цішком скок да хворага прасталюду — і ў выніку шчасьлівы.
— Мне здаецца, — іранічна сказаў я, — што ягоныя дзеці па пратэкцыі сплавілі яго на цяжкое і доўгае кананьне.
— Ну, ведаеце, ён у някепскай форме. Ого-го, той яшчэ бык. Але, можа, зойдзем у хол, бо ветрык узьняўся? Вы, я бачу, паслухаліся маёй парады і шпацыруеце па месьце.
Ён уцягнуў мяне назад у панурае фае, поўнае шкляных шапікаў, запэцканых пярэгарадак і неактуальных лёзунгаў. Давяральна прыцягнуў мяне за гузік курткі. Пільна паглядзеў мне ў вочы.
— Гэта вы мяне выключалі з партыі?
— Не. Вы выключалі мяне і маіх сяброў з партыі.
— Можа быць. Я пераблытаў, — сказаў ён, зьбянтэжаны. — Але ў мяне да вас нейкі інстынктыўны давер. Ведаеце, — ён падазрона агледзеўся наўкола, — я пішу ўспаміны. Увесь час нашу іх з сабой, у гэтай тэчцы, бо за мной сочаць. У краму, на шпацыр, да знаёмых — усюды з тэчкай. Баюся пакінуць дома. Яны ўлезуць і зьнішчаць. Вы чулі пра такія выпадкі?
— Усе пішуць, і ніхто не чытае.
— Што, ня чую? — ён прыклаў далонь да вуха, зь якога тырчалі кусьцікі сівых валасоў.

— Можа, дзякуй Богу, што хоць хто яшчэ хоча чытаць. Ірвецца да незакончанага рукапісу. Гэта толькі чытацкая жарсьць.
— Ведаеце, мне трэба адданы чалавек. Гэта пытаньне жыцьця і сьмерці. Для пільнаваньня рукапісу. Я так падумаў... так падумаў за абедам...
— Дзяржавы робяцца таталітарнымі, футбол зрабіўся таталітарны і ўвесь сьвет ужо таталітарны. Чаму б літаратуры ня быць таталітарнай?
— А можа, вы, малады чалавек? Будзеце вартаваць праўду. Адзіную праўду пра нашыя часы. Цяпер пішу разьдзел пра Бога. Бога, адрынутага партыяй. Досьлед спаборніцтва двух бостваў. Вівісэкцыя татальнай зайздрасьці й нянавісьці.
— Проза з ужыцьцём усіх дапушчальных і недапушчальных сродкаў. Проза, якая выходзіць за паперу, кульмінацыя якой — крывавая разьвязка ў жыцьці. Сьмерць у машынапісе мёртвая, у жыцьці жывая, агаламшальная і праўдзівая. Што, дзядулю, якую прозу ты пішаш? Нагледзеўся крайнасьцяў. Ніякіх там узыходаў і захадаў сонца, ніякіх парачак, што мілуюцца, ніякіх усхліпаў старых бабаў. Толькі падаюць галовы. Дзёрзкія, дурныя, баязьлівыя, сьвятыя галовы лятуць з эшафоту. Пакажы сваю прозу, дзядулю, паглядзім, што ты там носіш у сваёй зашмальцаванай торбе.
— Вон! — ён тузануў тэчку, вырываючы яе з маіх рук. — Вы хворы. Вяртайцеся ў бальніцу!
— Зараз, зараз. Я праўдашукальнік. Шпацыруюю туды-сюды і шукаю праўдзівае праўды. Адкрыйце торбачку, якая некалі насіла сьмяротныя выракі. Я панюхаю і буду ведаць, якая гэта праўда.
— Што вы ўсё з гэтай сьмерцю? Што вы пра яе ведаеце, гаўнюк? Я дзесяць гадоў, седзячы ў Палітычным Бюро, адчуваў, як на шыі сьціскаецца вяроўка, зашмарга. Сьмерць — мая сястра. Толькі пад старасьць выпусьціла з абдымкаў, адышлася недалёка й чакае.
— Мне баліць галава. Учора ўначы на кароткае імгненьне я ўсё зразумеў. Ад пачатку да канца. Вы паглядзеце ў неба. Будзе зорная ноч. Можа, пачакаць, можа, паўторыцца тое аб'яўленьне, той агаламшальны бляск спасьціжэньня цэлага ў складанай простасьці альбо простай складанасьці?
— Я ўжо ня ведаю. Надыходзіць мой канец сьвету.
— О, даруйце. Гэта канец майго сьвету надыходзіць.

— Мне трэба йсьці. Сябра чакае. Пачытаю яму першы разьдзел. Генэзыс ягоны і мой. Заспакою яго добрым успамінам, перш як забяруць у мяне маю праўду. Я навучыў іх, як гэта рабіць? Вы памыляецеся.
— Антыхрыст. Ніякае, прасякнутае ніякім, дае зло. Халера, што за хмары. Госпад Бог засоўвае юшку, ці, хутчэй, покрыва. Пакідае нас сам-насам зь ім, разумееце?
— Ня маю часу. Гэта значыць, маю ўжо мала часу. Да пабачэньня, да пабачэньня, — і пабег, падрыгваючыся, дробнай крывой хадой углыб чорнага калідору, дзе падпітыя хворыя раўлі непрыстойныя песьні.
Пікусь, крыху ўзрушаны, глядзеў на мяне з чаканьнем. На вуліцы вечарэла. З поўначы валілі магутныя чорныя хмары, якіх ня бачылі з запамятных часоў.
— Хадзем, цюцька, — я памахаў каністрай, гэтым маім падарожным сакваяжам.
Пікусь гаўкнуў і рушыў у цемру. Але недалёка мы адышлі. З сквэру Старынкевіча асьцярожна высунулася пара згорбленых постацяў.
— Рукі ўгору! — скамандаваў адзін зь іх і штурхнуў мяне ў бок абрэзам.
Я ўбачыў, што ў іншых былі скаўцкія нажы, прычэпленыя да модных плеценых пасак. Я падняў рукі, у тым ліку правую, абцяжараную каністрай.
Завадатар абшукаў мае кішэні і адразу забраў грошы.
— А дзе партбілет? — спытаўся ён грозна.
— Я не парцейны.
— Ён не парцейны, — зьдзекліва паўтарыў завадатар, хацеў вытнуць мяне прыкладам, але я зрабіў рух, каб унікнуць, і ён зачапіўся абрэзам за супольніка.
— А вы хто такі, калі можна даведацца? — спытаўся я.
— Мы — гарадзкая герылья. Ня чулі?
— Быццам нешта чуў. Але хіба не пра польскую.
— Пра польскую, пра польскую. Яшчэ пачуеце. Што ў вас там у каністры?
— Бэнзын.
— Зараз праверым. Калі ласка, наперад, туды, да гарадзкой прыбіральні.
— Але яна не працуе ад дзясятага зьезду.
— Нічога.

Мы сышлі па сходах, заваленых часовым сьметнікам. Сапраўды, дзьверы былі забітыя дошкамі, якія нехта старанна паламаў. Адзін з партызанаў запаліў ліхтар, іншы адкрыў гермэтычную накрыўку бітону.
— Бэнзын. Расчыняльнік. — змрочна пацьвердзіў ён.
Цяпер завадатар скіраваў струмень сьвятла мне ў вочы.
— Навошта вам бэнзын?
— Каб абліць сябе і падпаліць.
Зьбянтэжаны, ён пагасіў ліхтар.
— Вы што, звар'яцелі?
— Хадземце, браткі, разам абальёмся. У мяне добрыя швэдзкія запалкі.
Я схапіў завадатара за балахон. Ён намагаўся вырваць вопратку з маіх рук, але я трымаў моцна.
— Ратуйце! — крыкнуў ён. — Псіх!
— Дайце, хлопцы, каністру, будзьце ласкавыя. Хлапец тоўсты, падатлівы.
Але я ўжо толькі чуў тупат ног у гушчары кустоў. Мая ахвяра таксама кінулася наўцёкі. Я ня здолеў утрымаць зламысьніка. А ліхтар, кінуты на сходах, сьвяціў проста ў счарнелае неба.
Я знайшоў каністру, падняў ліхтар, які, можа, яшчэ прыдасца. Перагледзеў кішэні. У мяне забралі нават той шматок "Трыбуны люду", які я здабыў ураньні.
— Ну й засалапячыўся ты, Пікусіку, не бараніў гаспадара.
Ён засаромеўся, скочыў з брэхам у кусты.
— Пакінь. Мо яны дабра хацелі. Мо робяць першыя крокі, як атрымліваецца. Антыхрыст, кара божая, ужо сам ня ведаю што. Я б лёг і заснуў. Назаўсёды.
У гэты момант зь цемры выйшаў Тадак Скурка. Гэтым разам чамусьці без цытаты.
— І што, паскуднік? — спытаўся я.
— У іх сховішча там, на гарадзкой фільтравальнай станцыі, — ён паказаў на чорныя купы за пляцам Старынкевіча. — Жульлё звычайнае. Дайце каністру. Вы стаміліся.
— А ці маеш ты, асёл, копію таго ліста ў свой аддзел? У цябе ёсьць нейкае пацьверджаньне, што ты адмовіўся ад працы?
— Натуральна.
— Ну дык пакажы.
Ён закруціўся, пачаў адганяць невідочнага камара.
— Не саромся. Пакажы.

— Але ў мяне яго няма.
— Гэта значыць, што ты не прасіў аб звальненьні?
— Не прасіў, — прызнаўся ён бессаромна. — Але заўтра падам.
— Бачыш, Тадак, які ты. А я ўжо хацеў табе паверыць.
— Дык сёньня сьвята. Аддзел кадраў ня робіць. Заўтра звольнюся, далібог.
— Гэта значыць, што ты ходзіш за мной па службе.
— Дзе там. Зусім прыватна. Як аматар вашай прозы. Вашага апошняга аповеду. Таталітарнай навэлы.
Праляцела ў пярэпалаху чарада нейкіх лясных птушак. Усё больш дзікіх жывёлаў гарнулася да зьдзічэлых гарадоў.
— Я малады, — ціха сказаў Тадак. — У мяне шмат сілы. Ну, і ваш досьвед дзеля мяне. Я не зраблю вашых памылак. Куплю пачак паперы і паеду заўтра ў Старагард. Праз год усе пра мяне пачуюць. Я закончу вашую справу.
— Ты сапраўдная пачвара. Мне яшчэ пашчасьціла.
— Я страшная пачвара, — шчыра прызнаў ён. — І гэта мой крыж. Вы былі за крок ад пачварнасьці, але ў пана Бога задрыжэла рука зь літасьці. Рэшту вы самі зрабілі. Усё жыцьцё вы хавалі сваю пачварнасьць, удаючы эстэта. Але я за вас адпомшчу. За нас абодвух адпомшчу.
— Чорт ведае. Можа, я насамрэч быў баязьлівы. І цяпер баюся, баюся блюзьнерства, сьцерагуся пагарды. Толькі пыхі ў мяне досыць.
— Я таксама пыхлівы, — спакойна сказаў Тадэк. — Можа, нават пыхлівейшы за вас. Таму дазваляю вам усе гэтыя няхітрыя абразы. Вашая пыха ўжо застанецца галоднай назаўжды, а я сваю накармлю.
Я пасьвяціў на яго ліхтаром. Ён стаяў з каністрай, выпрастаўшыся, годны, і нават не прымружваў вачэй ад сьвятла. На нейкую хвілю мне падалося, невядома чаму, што ён хіба мае рацыю. Нейкую сваю неразгаданую рацыю. Нават Пікусь вырачыў на яго зялёныя фасфарычныя вочы.
Я ўжо зусім разгубіўся. Галава пранізьліва балела, быццам нехта скруціў мне шыю. Галава балела, бо гэта было для яе найлепшым выйсьцем. Недзе ўгары адчынілася акно, маладая кабета выплюхнула нешта на ходнік. У пашарэлай белі аконнай праймы на момант мільганула чырвань яе даўгіх валасоў. Але гэта была не Надзея, і валасы ў гэтай кабеты не былі чырвоныя. Газьніца ў чырвоным абажуры асьвятліла акно

чырваньню, як у даўнія часы, калі нарадзіўся гэты мой кепскі сьвет.
Я пайшоў у бок Алеяў, а яны за мной. На другім баку вуліцы пачыналіся гароды, закладзеныя на месцы былой аўтамабільнай стаянкі. Гэтую стаянку збудавалі ў канцы семдзясятых на велізарнай пліце, што прыкрывае тунэль Цэнтральнага вакзалу. Аўтамабільная манія аслабла, стаянку зьліквідавалі, і прывілеяваныя грамадзяне пачалі прывозіць на гэтую бэтонную пліту грузавікі садовай зямлі, пачалі садзіць пладовыя дрэвы, памідоры і капусту. Наколькі добра расла гародніна на гэтай пляскатай скале, кампэнсуючы дзяржаўны дэфіцыт зеляніны, настолькі аказаліся ўпартымі яблынькі, грушы, сьлівы — не хацелі расьці пасярод места, што здалося на волю лёсу. Гэта значыць расьлі, але неахвотна, безь перакананьня, і ніводнае з гэтых дрэваў не сягнула ўвышкі больш за паўтара мэтра. Таму ўладальнікі дзялянак, каб схавацца ад надакучлівых вачэй разявакаў, мусілі ўвесь час прысядаць на кукішкі. Адсюль, мусіць, і паўстала назва Кучкі, якой ахрысьцілі гэты раён.
З боку Старога вакзалу зыгзагамі каціў міліцыйны “газік” з адным асьлепплым ліхтаром. Прытармазіў каля нас. Знутры высунуўся захмялелы міліцыянт.
— Мо вас падкінуць? Дорага ня возьмем.
За ягонай сьпінай нехта ляжаў як нежывы, у паўзмроку кодабу, слаба асьветленага цыфэрблятамі прыборнай дошкі.
— У мяне няма грошай. Хуліганы адабралі.
— А ня трэба швэндацца па цёмных вуліцах. Магу падкінуць за які заклад.
— Дзякуй. Мне недалёка. Іду забаўляцца да Палацу.
Міліцыянт адразу пацьверазеў. Абгледзеў мяне з ног да галавы. Але ў гэты момант з-за яго сьпіны выглянуў бледны непрытомны твар Жоржа.
— Схапіце яго! — прахрыпеў ён. — Ён хоча горад падпаліць. Гэта Антыхрыст!
Міліцыянт абняў Жоржа, пачаў запіхваць яго ўсярэдзіну “газіка”.
— Спакойна, палкоўнік. Калі ласка, не падымайце галавы, бо зноў зробіцца млосна.
— Нягоднікі! Я вас заўтра згнаю! Зважай! Рукі па швам!
Цяпер кіроўца, які дагэтуль маўчаў, абярнуўся і ўдарыў

палкоўніка кулаком у мазгаўню.
— Глядзі, курва, які паліглёт, — сказаў ён і завёў матор.
Наш міліцыянт засьмяяўся прымірэнча, прыкладаючы два пальцы да брыля шапкі.
— Перабраў меру. Ну, усё-такі сьвята. Кожны мае права, праўда?
— У нас кожны мае права на чарку, — згадзіўся я.
— Таму можна жыць.
— Таму можна жыць аж да сьмерці.
Газік ад'ехаў, збочыў у бок Макотава. Досыць доўга мы маўчалі. Урэшце азваўся задумлівы Тадак з Старагарду:
— Вы бачылі, як папіхаюць чалавекам? Усё міністэрства трасецца перад ім.
— Сёньня яны папіхаюць, заўтра ён будзе папіхаць. Яму ўжо даўно б быць генэралам, але любіць выпіць і трохі паскандаліць. Мастацкая натура.
— Так, мастакоў зашмат.
— Дык таму што мастакі ўсё гэта прыдумалі. Ведаеце вершык Сталіна пра вясну?
Мы перайшлі на другі бок шырокай пустой вуліцы. Плыткай канаўкай імкнулася пеністая вада з лопнутай недзе трубы. Пікусь зацікавіўся паламанай абгародкай. Пільна абнюхваў зарослыя зелянінай слупкі і падымаў штохвіліны нагу.
— Я ведаў гэты вершык на памяць, але цяпер забыўся, — сказаў Тадак, перакладаючы каністру з адной рукі ў другую.
— Маю прозу пачаў вучыць.
— А каб вы ведалі. Гэта цікава, у вас сустракаюцца падобныя параўнаньні ў апісаньнях прыроды.
Я не падтрымаў дыскусіі. На гародах было цёмна. Паміж ліліпуцкімі дрэвамі стаялі маленькія альтанкі, замкнутыя наглуха. Але недзе ў глыбіні трапятаў нейкі агеньчык. Калі мы падышлі бліжэй, аказалася, што на адной дзялянцы гарыць вогнішча, вакол якога сядзяць нейкія скурчаныя постаці. Толькі тут мы адчулі вечаровы халодны вецер. Ён ляцеў з паўночнага захаду, несучы на сьпіне агромністыя разваліны злавесных хмараў.
Зараз, зараз. У мяне ж было некалі дзяцінства, маладосьць. Дзяцінства і маладосьць на іншай плянэце. Што сталася з той плянэтай, гэтак падобнай да Зямлі, па якой я хаджу, і гэтак абсалютна непадобнай? Калі б я напяўся, то ўспомніў бы, як

рабіў нешта невядома навошта падчас гэтулькіх няспаных начэй. Газоўка, вогнішча з марудным дымам, што распаўзаецца па лугох, вецер, што гоніць страшныя хмары па небе, яшчэ нікому ня ведамым. Начны страх перад жыццём, якое чакае недзе за гарамі, лясамі, павольнае мястэчка, якое будзе існаваць вечна да найбліжэйшай вайны, штодзённыя пацеры дзядулі й бабулі, ланцуг грозных і прыгожых закляццяў, складзеных з урачыстых і незразумелых словаў, сьвісток цягніка ў аднолькавыя поры дня, каханьне да дзяўчыны зь яшчэ іншай плянэты, бо тады дзяўчаты паходзілі зь іншых, таямнічых плянэт, жывёльная, жудасная прага жаночага цела, у якім жыў і сатана, і белакрылы анёл, прага будучага нязвыклага жыцьця, нейкія сантымэнтальныя настроі падчас блуканьня ў лесе, нейкія незабытыя пахі мацыёлы і вольных дзікіх зёлак, нейкія буры, якія штолета вставалі канец сьвету, нейкія смуткі, нейкія раптоўныя надзеі і весялосьці, нейкі жах ад магічнай сьветлавалосай галавы месяца з фальшывымі рысамі добрага дэмана. Дзе гэтая мая плянэта, шчыльна ахутаная атмасфэрай дробных прадчуваньняў, малых радасьцяў, крохкіх надзеяў? Можа, ляціць, як голуб, спаміж далёкіх і чужых галяктыкаў?

Чаму я мучыўся гэтулькі гадоў? Я мучыўся ня толькі цяжкасьцямі жыцьця, але і ягонымі радасьцямі. Я мучыўся, гледзячы на пранізьліва харошы ўзыход сонца і кахаючы роспачна жаданую жанчыну. Мучыўся, прымаючы з рук лёсу мімалётны посьпех і з удзячнасьцю молячыся Богу. Мучыўся нават у снох, калі адрываўся ад зямлі і выпраўляўся да далёкіх выспаў абяцанага раю. Але з мной мучыліся ўсе іншыя людзі, з выняткам тых, што ня мучыліся. А найдакучлівейшай у гэтым мучэньні была пакута сьведамасьці, што ўсё гэта — банальнае, ужо даўно адкрытае і перажытае памерлымі пакаленьнямі, сэрыйнае і паўторнае, як з генэтычнай матрыцы. Што сусьвет напоўніўся да самага канца енкамі, падобнымі адзін да аднаго, як дзьве ноты, што гэтыя асобныя енкі ўтварылі адзін вялікі енк, падобны да віску вераб'інага вясельля, і гэты енк стаў міжзорнай гаманой, нячутным стогнам старэючага космасу.

— Гэй, — гукнуў нехта за абгародкай.

— Гэй, — сказаў я.

— Чаму спазьніўся?

— Я спазьніўся?

— Бачыш, забыўся. Хто з табой?
— Малады паэт і сабака.
— Заходзьце. Мы чакаем.
Мы пералезьлі дзіравую абгародку. За мэтровай сьлівай стаяла Люцына ў старым плашчы і ў капелюшы зь пер'ем. Пераапранутая ў дзяўчыну дваццацігадовай даўніны.
— Мы якраз пячом бульбу з градкі, варожым на вугольлі і ўспамінаем Казіка. Бо сёньня гадавіна нашага шлюбу.
— Твайго з Казікам?
— Майго з Казікам. Ня помніш?
Я помніў, што Казік памёр шмат год таму. Яна ўзяла мяне за руку, правяла да вогнішча. Мы йшлі алейкай, вузкай, быццам кладка, паміж гародаў памеру птушыных клетак. Ад Палацу культуры йшоў фіялетавы, нібы ад бліскавіцы, якая замерла на вякі, бліск вайсковых пражэктараў. Мы міналі кусьцікі парэчак, зарасьнікі малінаў, занядбаныя грады зь цьвятнымі капустамі, морквай, часныком, якія нагадалі мне могілкі. Міналі падпёртыя галінкамі ці засохлымі сьцяблінамі дрэвы, на якіх не памясьціўся б нават голуб, але якія радзілі мініяцюрныя плады. Увайшлі ў цёплае кола вогнішча, зь якога вецер зрываў іскры і нёс у згусьцелую цемру.
— Я сьпяшаюся, каторая гадзіна?
— Раньняя гадзіна. Сёмая надыходзіць. Глядзі, пазнаеш?
Вакол вогнішча сядзелі больш за дзесяць кабет. І мне падалося, што я сплю і ў сьне падводжу грэшны рахунак сумленьня. Бо гэта ўсё былі кабеты, якіх я некалі кахаў і зь якімі, сорамна сказаць, жыў. Адных кахаў драматычна і самаддана, другіх кахаў, бо так выйшла і не выпадала іначай, а трэціх кахаў наіўна, з страхам і ашчадна, нібы прыняў небясьпечны эліксыр. Жыў зь імі таксама шмат дзе, па ўсёй краіне і ў некаторых закуткох Эўропы, часам удала, часьцей не, альбо сам да сёньня ня ведаю як.
Яны глядзяць на мяне з набожным жахам. Усе яны — удовы, разьвядзёнкі, старыя дзявулі з бурлівым мінулым. Дзякуй Богу, што адна ня ведае пра іншую ўсёй праўды, таму, можа, унікну выкрыцьця і лінчу. Але за што ж лінчаваць пасьля гэтулькіх гадоў, якіх, можа, нават не было.
Ледзь заўважна кланяюся, каб не зьвяртаць на сябе ўвагі.
— Сядай, — кажа Вуля, якая мела некалі прыгожыя грудзі бяз смочкаў, ладны бюст, адораны індывідуальнасьцю.

Я сядаю, вельмі разгублены, на халодным камяні. Пікусь вываліў язык за маёй сьпінай і яхае ад цікаўнасьці. А Тадак з Старагарду ўжо складае Малгосі прымітыўныя камплімэнты, якія яна з захапленьнем выслухоўвае.
— Трымай, вось твая порцыя, — кажа Рэня, зь якой у мяне слаба пайшло шмат гадоў таму, і дае мне шкляначку, напоўненую да краёў. — Чакала цябе, ажно зьмерзла.
— Ну то за Казіка, — салютуе сваёй чаркай Люцына.
— І за цябе, — кажу я.
Нельга мне піць, але вып'ю. Яны ўжо расслабіліся. Колькі спарожненых пляшак валяюцца паміж кустамі. Божа, зрабі так, каб не вярталіся да мінулага, каб даравалі гэтыя мэандры алюзіі, фаервэркі няўчасных лучнасьцяў. Палац культуры непрыстойна сьвеціць гэтым сваім шпілем у нізкае пахмурнае неба. Над Віслай рассыпалася першая пробная ракета.
— Нядаўна бачыла цябе на вуліцы, — кажа Лідка, якую я некалі цягаў па ўсіх раённых гатэлях.
— Так, я часам хаджу па вуліцах.
З змроку выступае Касін твар.
— Чаму хаваешся ў кут? Хадзі сюды, да нас. Атрымаеш гарачую бульбіну.
У гэтай Касі быў такі апэтыт, што яна ледзь не давяла мяне да сухотаў. Усё ёй было мала. Людзі, я іх сапраўды кахаў, бум сантымэнтальнай і падуладнай натуральным інстынктам прыроды. Няма нічога заганнага ў гэтых водбліскаў маёй зьбянтэжанай памяці. Жыцьцё было папросту жыцьцём.
— Мо запяём? — прапануе Воля, у якой былі залатыя валасы і чорнае футра.
Я заплюшчваю вочы, каб ужо нічога не ўспамінаць.
— Здурэла. Адразу ж міліцыя прыляціць. Сёньня нельга пяяць кампаніямі.
На шчасьце, вецер усё часьцей заглядае ў гэты гародчык. Шамаціць дрэвамі, нібы яны сапраўдныя, зрывае лісьце і нясе яго да слаба асьветленага вакзалу.
— Ёсьць у цябе якая дзяўчына? — пытаецца Рыся, пра якую лепей ня буду ўспамінаць.
— Кіньcя, — кажу я. — Страшная ноч надыходзіць.
Яна схіляецца, цалуе мяне каля вуха.
— Я цябе вельмі любіла.

— Я цябе таксама.
— Неяк ты гэта мімаходзь сказаў.
Мяне вызваляе Тадак. Ён п’е зь Люцынай на брудэршафт. Сьціпла цалуюцца, але я ўжо нічому ня веру.
— Я цябе некалі сьніла, — гукае цераз невялікі агеньчык Кася.
— Ого, і пры якіх абставінах? — пытаецца нехта.
— А не скажу, адгадайце.
— Дзяўчаты, ваша здароўе, — я падымаю недапітую шклянку.
— Ён ашуквае. Далеце яму, бабы.
— Факт, адзіны наш мужчына.
— А я? — улазіць Тадак, які ўжо разышоўся.
— Ты замалады. Сядзі ціха.
— Я замалады? Я вам зараз пакажу.
Зь цемры выходзіць Ганя, якая дзеля мяне хацела пазбыць сябе жыцьця. Гэткая ж таямнічая і гістэрычная, як тады.
— Гэй! — вітае яна мяне.
— Гэй.
— Здаецца, ты зрабіў кар’еру. Людзі па канторах шэпчуцца пра цябе ў абедзенныя перапынкі.
— Можа, блытаюць мяне з кім іншым?
— Ты заўжды быў сама сьціпласьць.
— Кінь.
— Баішся ўспамінаў. Ну, давай сьмялей, скажы: “Адчапіся, старая баба”.
— Ты цудоўна выглядаеш, далібог.
— Ты заўжды быў сьвіньня, але я цябе кахаю.
Мне робіцца горача, трохі не стае паветра, хоць вецер дзьме моцна, нясе тоны жыватворнага азону.
— Можа, згуляем на яго? — крыху загучна прапануе Кася.
Я ўглядаюся ў цемру, каб спраўдзіць, ці не падслухоўвае нас хто. Але места дрэмле, падпітае з нагоды сьвята. Калі сьціхае вецер, ад Віслы прабіваецца слабы, анэмічны голас эстрадных аркестраў, што забаўляюць валацугаў і люнатыкаў. Зь вежы Палацу раптам падае камлыга пескавіку, абрываючы гірлянду лямпачак. Гэта значыць, што надвор’е будзе мяняцца.
Адна з маіх былых дзяўчат кінула мне бульбіну. Перакідаю з рукі ў руку паршывы недапечаны клубень. Айчынная. Ня надта ідуць справы ў маіх дзяўчат.
— Дык што? Згуляем на гэтага адзінага мужчыну?
— Але ўва што?

— Не турбуйся.
— Мо ў бутэлечку?
— Я ня буду.
— Я яго бяру без бутэлькі.
— А дулю. Чаму ты?
— Тады гуляем.
— Тадак, пашукай бутэльку.
— І не падумаю. На мяне таксама можна згуляць. І мне гадоў нямала.
— Не сьмяшы мяне.
— Дзе ж гэтая бутэлька?
— Пачакайце, трэба яго запытаць. Можа, сам ужо каго выбраў.
— Ён ня выбера. Нясьмелы. Ненаважны.
— А скуль ты яго так добра ведаеш?
— Сяброўка мне расказвала.
— Не выдурвайцеся, Люцына плача.
— Ня плача, ёй толькі попел трапіў у вока.
— Ну дык што, гуляем? Божа, як сумна!
— У мяне таксама быў цяжкі дзень.
— Усё цяжэй жыць.
— Ураньні паглядзела ў люстра.
— Лепей не глядзець.
— Ох, дзе нашыя хлопцы.
— Гэта ўжо мінула, зьнікла.
— Чаму? Я ў душы яшчэ маладая.
— У Гені трыццацігадовы.
— У мяне ўжо няма моцы.
— Кіньце вы. Годзе вам наракаць. Вып'ем, дзеўкі.
— За нашу маладосьць.
— Але ж мы маладыя.
— Што ты, дурніца, равеш?
— А ты чаму плачаш?
— У мяне туш пацякла зь веек.
— А ў мяне ўсё пацякло.
— Дык гуляем на яго?
— Я супраць. Што нам, бабы, гуляць на прыблуду? Ён нас мінуў і пайшоў далей. Дурная Люцына за ім пабегла.
— Казічак яго любіў.
— Я яго таксама любіла.
— Дзіўна, бо я таксама.

— Ня можа быць, што вы кажаце?
— Можа, скажаш, ты — не? Увесь горад пляткарыў.
— Вось жа тып.
— Яшчэ той сьвінтух.
— З адной канчаў, з другой пачынаў.
— Зь дзьвюма адразу шашалі круціў. Колькі я, дурная, сьлёз выплакала.
— Ведаеце, давайце яго адлупцуем.
— За нашую й вашую крыўду.
Некалькі зь іх, хістаючыся, ужо ўставалі ад вогнішча. Рэна выломлівала з засохлай яблыні сук.
— За якую крыўду? — спытаўся я, уздымаючыся з каменя. — Дзяўчаты, я ж стараўся. Хацеў вас кахаць, як ніхто на сьвеце. Можа, калі б ня вы, сёньня я быў бы Шэксьпірам. Так, гэта праўда. Дзеля вас змарнаваў паўжыцьця.
— Бессаромны.
— Яшчэ й папракае нас.
— Ну, гэта ўжо занадта.
— Хай ідзе к чорту.
Я выцягнуў з агню галавешку, як паходню. Трохі для эфэкту, трохі для абароны. Вецер разьвяваў невялічкае полымя, нібы абрэзак ядвабу.
— Мае каханыя, найдаражэйшыя. Яшчэ цэлая ноч перад намі. Успомніце тыя вёсны, леты, восені і нават зімы. Ранкі, поўдні і вечары. Ядвабныя пасьцелі, лясныя імхі і кухонныя закуткі. Прадумайце ўсё справядліва і толькі потым выдайце вырак самасуду.
— Я яго, уласна, амаль ня ведаю, — азвалася праз хвіліну Рэна.
— А я яго ведала толькі з выгляду, — дадала Рыся.
— Больш дыму, чымся агню.
— Вып'ем, дзяўчаты.
— За вясну.
— За Новы год.
— За заўтра.
Я незаўважна адклаў асмалены сук. Асьцярожна, крок за крокам схаваўся за нізкую грушу. І нібы ў лесе ў грыбох, прыгнуты да зямлі, пабег на другі бераг гародаў. А калі дрэвы і кусты ўжо засланілі вогнішча і маіх азяблых дзяўчат, я выпрастаўся — быў вольны.
— Гэй, — гукнуў нехта ціхесенька.

— Гэй!
Яна падышла да мяне, стройная ў цемры, прыгожая ў цемры, маладая ў цемры. Узяла мой твар у абедзьве рукі, нібы каб разгледзець яго ў сьвятле раптоўнага месяца, што выглянуў спаміж разарваных хмараў.
— Я кахаю цябе дагэтуль, — шапнула яна.
— А хто ты?
— Твая былая дзяўчына.
Я намагаўся пазнаць яе паводле голасу, але яна гаварыла шэптам. А шэпт — толькі рэха голасу.
— І я цябе кахаю.
— Згадаеш мяне часам у ліку іншых і ня ведаеш, што гэта я.
Яна пацалавала мяне ў вусны маладымі вуснамі.
— Ведаеш, я пайду.
— Я ведала, што ты пойдзеш.
— Пайду на той бераг.
— Што ты кажаш? Што здарылася?
— Стала так трэба.
— Што гэта значыць?
— Што жартам канец. Маім жартам канец.
— Я сасьніла пра цябе благі сон. Ты нёс да мяне малое дзіця. Ні тваё, ні маё.
— Я заўжды буду цябе помніць.
— Але ж ты ня ведаеш, хто я.
— Буду помніць цябе маладой, таямнічай, зацененай летнім моракам, як славянскую мадону. Хочаш?
— Добра, помні мяне такой.
— І ты мяне добра ўспамінай.
— Увесь час буду ўспамінаць.
— Калі я што табе даў.
— І калі я магла табе што даць.
Мы пацалаваліся, доўга і сардэчна, як двое пакрыўджаных людзей. Вецер ужо лётаў па-над гародамі ў восеньскім шале, зрываў дахі з альтанак, куляў рэшткі абгародкі, выў ненатуральным голасам у прасеках алеек.
— Гэй, — сказала яна.
— Гэй.

І яе ўжо не было. Я пастаяў хвіліну, зьбіраючы думкі. Галава нібы трохі набрыняла і апухла пасьля гэтай шкляначкі жаночай

самагонкі. Я рушыў на поўнач, перасякаючы цясьніну гэтага карлікавага саду.
Гэта няпраўда. Я ўвесь час помню пра Надзею. На гэтых руінах каханьняў альбо раманаў перад маімі вачыма стаіць выява Надзежды. З распушчанымі чырвонымі валасамі, з выцягнутай да мяне рукой, з адкрытым для крыку ротам. Мне страшна шкада нечага. Што гэта? Што здарылася ў апошнія гадзіны перад апошняй ноччу?
Нічога ня здарылася. У мяне шмат сьведкаў, з навукай біялёгіяй уключна, што нічога не магло здарыцца. Я выпадкова спаткаў дзяўчыну, якой мог наагул не спаткаць. Дзяўчыну з чырвонымі валасамі ад уяўнага дзядулі, дзяўчыну пры целе, беласкурую, з поўным шырокім ротам, з адным вокам салатавым, а другім — блакітнавата-фіялетавым, з спарадычнай разьбежнай касавокасьцю, каля пяцідзесяці васьмі кіляграмаў вагі. Пяцьдзясят восем кіляграмаў — вада з дадаткам вапны, фосфару, жалеза і невялікай колькасьці іншых мінэралаў. Пяцьдзясят восем кіляграмаў вады і жменька элемэнтаў табліцы яе земляка Мендзялеева. Дзесяць вёдраў вады, ажыўленых вялікай эвалюцыяй альбо нашым засьцянковым Богам.
Нічога ня здарылася. Мы выпадкова спарыліся, гнаныя жывёльным інстынктам, у ціхім разбураным доме, на апаганеных п'янствам сходах. Я ўвёў у яе палавы орган свой палавы орган, яна завісла на зьнямелых нагах за мілімэтар над спаленым паркетам, рытмічна раскідвала нямоглымі нагамі крышыва тынку, што валяўся на падлозе. З-пад яе сьпіны сыпалася вапна, у яе целе адбывалася хуткая хімічна-электрычная рэакцыя, вакол яе цела ўтваралася адмысловае магнэтычнае поле, якое ўзаемадзеяла з маімі біятокамі. Пасьля надышло інстынктыўнае разьняволеньне нэрвовых сыстэмаў, і нічога ня здарылася, нічога ня здарылася.
Мы разышліся сваімі сьцежкамі ў джунглях, якія высыхаюць і пусьцеюць перад гібельлю. Можа, мы ўжо ніколі не спаткаемся, і нашыя неспатканьні гэтаксама нічога ня значаць, як нашыя адзінкавыя альбо шматкротныя спараваньні. Нічога ня здарылася. Дзякуй Богу, што нічога ня здарылася. Гэта няпраўда. Нешта ўсё-такі здарылася. Яна ішла да мяне зь мільёна выпадкаў, абмінаючы мільёны альтэрнатываў, і я йшоў да яе такім жа спосабам. Шмат зораў запалілася і згасла за той

час, калі мы ішлі насустрач адно аднаму. Шмат малых сусьветаў нарадзілася і сканала, перш як мы спаткаліся ў доме, прызначаным на знос, дзе ляжыць спаралізаваны ўдзельнік вялікай вайны альбо наступных войнаў, што рытмічна скаланаюць наш мініятурны глёбус. Нішто сабе “нічога ня здарылася”.
Здарылася фатальнае. У апошнюю хвіліну. Можа, скочыць у мышыную дзірку на гэтых могілках? Зьвіць гнязьдзечка, у якім ужо нічога не народзіцца? Ох, Надзею, мая Надзея.
— Гэй, — пачуў я перад сабой, — вы бітона не згубілі?
Тадак і Пікусь стаялі на бруднай разьежджанай дарозе каля платоў, якія атачалі пакінутыя новабудоўлі. Тут некалі мусіў вырасьці квартал хмарачосаў. Некаторыя вырасьлі не да канца, іншыя памерлі ў зародкавай стадыі.
— І што? — запытаў я сам сябе.
— Яна ў мяне закахалася.
— Хто?
— Люцына. Я ня еду ў Старагард, бо дамовіўся на заўтра аб спатканьні.
— Тадак, ну ты і нябога.
— Выбірайце словы. Яшчэ пабачым, хто нябога. У мяне было тры жонкі, усе сакратаркі. Я палову партыі паймеў у Старагардзе.
— Можа, ужо разьвітаемся? Ці ты яшчэ абавязаны за мной хадзіць?
— Абавязаны. Я зьбіраю матэрыялы аб вашым апошнім шляху. Я зраблю вас несьмяротным.
Я абышоў яго зь левага боку па ходніку з прагнілых дошак. Ніколі ня ведаў добра гэтага раёну, але ведаў, што траплю ў яго калі-небудзь. Тут здаўна вечарамі не запальвалі сьвятла з шматлікіх прычынаў, а перадусім з ашчаднасьці.
— Калі ў вас ёсьць якія нататкі, пачатая проза альбо цікавыя лісты, пакіньце іх мне, — дапякаў ззаду Тадак Скурка. Пікусь выбіўся наперад, умела вёў мяне празь бездараж. Мне даводзілася часам сьвяціць сабе ліхтаром.
Урэшце я пабачыў людзей, што сядзелі на бэтонных трубах. Некаторыя зь іх трымалі касьцельныя абразы і харугвы. Колькі дзяўчат, убраных у белае, засланялі ад ветру агеньчыкі старажытных сьвечак з воску. Побач стаялі насілкі з гіпсавай фігурай сьвятога. Усе муркаталі соннымі галасамі павольную

рэлігійную песьню.
— Патушэце сьвятло! Не сьляпеце! — пачуў я дзіўна знаёмы голас. Пікусь пачаў прыязна брахаць, я схаваў у кішэнь трафэйны ліхтарык.
— Каго я бачу? — зь цемры ўзьнік Колька Нахалаў з падбітым вокам. — Што вы тут робіце, мушкетэры?
— Вяртаемся зь невялічкага банкету. Можа, сходзіш туды? Дзеўкі чакаюць на садовых участках.
— Не-а, не магу. Я ноччу іду з паломнікамі ў Чанстахову.
— Ты ўвераваў, Колька? Калі? Можа, Шміты цябе навярнулі?
— Ды не, я атэіст. Сустрэў сябра з моладзевай арганізацыі. Ён цяпер ксяндзом. Возіць паломнікаў і мае замежны пашпарт з калектыўнай візай. Я далучыўся, бо ў Чанстахове якраз будуць дэмантаваць гуту імя Берута. У нас цяпер вялікая каньюнктура на заводы. Ня трэба канвэртэрную печ?
Зь цемры ўвесь час нехта цішком выходзіў і, назваўшыся ксяндзу, далучаўся да вернікаў, якія чакалі.
— Зютак, можна цябе на хвілінку? — паклікаў Колька.
Малады ксёндз з трэбнікам, ксёндз з празрыстымі вачыма, якія хоць не глядзяць, ды ўсё падрабязна бачаць, гэты новага набору ксёндз нясьпешна падышоў да нас.
— Пазнаёмцеся. Гэта сябры з банкету, але нявіннага. Можа, блаславіш іх, бо блукаюць уночы, як грэшныя душы.
— Колька, бяру цябе пад умовай, што будзеш сябе паводзіць прыстойна. Ты ня ведаеш меры, у нас могуць быць непрыемнасьці.
Мы абмяняліся паклонамі. Ксёндз нібы мімаходзь, але ўважліва разгледзеў Тадака.
— Можа, возьмем па чарцы? — запрапанаваў Колька, тыкаючы пальцам успухлую на грудзёх марынарку. Пэўна, сьцягнуў пляшку з ЦК.
— Пазьней. У дарозе. Я цябе папярэджваю, Колька. Вернікі глядзяць, — сурова сказаў малады ксёндз.
— Ну, шчасьлівай дарогі, — сказаў я.
— І вам, — сказаў Колька, а ксёндз пачціва пакланіўся.
Мінулі зборны пункт паломнікаў, рушылі ў бок вуліцы Сьвентакрыскай. Збоку стаяў вялікі белы слуп Палацу культуры.
— Аднекуль я ведаю гэтага ксяндза, — сказаў Тадак. — Мае бацькі былі рэлігійныя. Я дык ня надта. Часам веру, часам ня

веру. А гэты, што распрануўся на зьезьдзе, падобна, хацеў злучыць марксізм з рэлігіяй.
Аднекуль зь неабсяжных прастораў наляцеў віхор і ледзь не паваліў нас. Мяне страсянуў раптоўны холад. Можа, у мяне тэмпэратура? Можа, і тэмпэратура. Усё адно.
Перайшлі Сьвентакрыскую. На чорных узвышшах места граў аркестар. Гучнагаварыльнікі змоўклі, толькі вецер прысьвісьтаў у іх мёртвым закратаваным нутры. Ці вы заўважылі, якое вялікае кола я раблю вакол гэтага выбеленага пражэктарамі Палацу, зь якога лушчацца каменныя пліты, нібы з гіганцкай рыбіны? Як я не выпускаю яго з вачэй, як я пільную яго і адначасова ўтрымліваю дыстанцыю? У мяне здаўна было прачуваньне, што гэта мой надмагільны помнік.
А вось і Янаў дом. Дапатопная камяніца, але цалейшая за новыя. У вокнах — трупная здань майго Палацу. Дом дрэмле. Усе дамы ў гэтую пару дрэмлюць. Людзі таксама дрэмлюць. Апроч тых, якім нельга, якія мусяць забаўляцца і сьвяткаваць.
— Пачакайце мяне хвілінку, — кажу я сьвіце.
— Але ж холадна. Зараблю катар, — кажа Тадак. — А я дамовіўся аб спатканьні зь Люцынай. Ведаеце, яна мяне ўражвае. Шыкоўная кабета, хоць у мяне непрыязнасьць да ўдоваў.
— Схавайцеся ў пад'езьдзе, — камандую я.
Але на сходах нас затрымлівае пэнсіянэр, якога паставілі дзяжурыць тутэйшыя жыхары.
— Я да спадара Яна, — кажу я.
— Гэнага з другога паверху?
— Так. Вы адгадалі.
— Усе?
— Не, яны пачакаюць.
— Але, калі ласка, ціха. Там часта гамана. Нейкія людзі прыходзяць, быццам бы прыстойныя, а пасьля — крыкі і сьпевы.
— Я толькі на хвілінку.
— Помніце, калі ласка, што а дзявятай мы засоўваем браму на ноч.
Я ўздымаюся на другі паверх. Паўсюль сьмярдзіць сікунамі, хоць дом вартуюць дзяжурныя зь ліку жыхароў. Званю ў знаёмыя дзьверы, у якія званіў гэтулькі разоў у жыцьці. Адчыняе паштальён у службовай шапцы на галаве.
— Не зачынена, — кажа ён. — А вы, можа, тут жывяцё?

— Сябар.
Ён праводзіць мяне ў Янаў кабінэт. Сьцяна над пісьмовым сталом абвешаная фатаграфіямі і паштоўкамі. Фатаграфіі сяброў і дзяўчат розных пакаленьняў, якія былі закаханыя ў Яна альбо якіх Ян некалі мімаходзь кахаў. На паштоўках — краявіды экзатычных гарадоў і ўнікальных куткоў сьвету, у якіх пабывалі ягоныя сябры альбо якія ён наведаў сам. Старыя дзівачлівыя рахункі, ужо неактуальныя лісты ад ведамых інстытуцыяў, ад слынных людзей. Вялікі архіў чалавека, які імкнуўся ў сусьветную эліту і так і не прабіўся ў яе на самай справе. Пасярод пакою сычыць электрычны ўвільгатняльнік паветра, бо Ян хварэе на астму.
— Ведаеце, у мяне непрыемнасьці, — азываецца паштальён. — Я прынёс пэнсію — а я адумысна прыношу пад вечар, бо гаспадар звычайна сьпіць па абедзе. Ну і трэба ж, во няшчасьце, гаспадар хіба захварэў. Замкнуўся ў лазенцы і не выходзіць.
Я стукаю, грукаю, клічу. Бяз выніку.
— Можаце аддаць яе мне.
Паштальён прыглядаецца да мяне, поўны сумневу.
— А вы хто?
— Сябар. Блізкі сябар. Вы мяне тут ня бачылі?
— Можа, і бачыў. Але гэта вялікая пэнсія, для заслужаных. За мільён злотых пераваліла.
Я заўважаю пад акном тэлевізар. Ён працуе. Вялікі каляровы тэлевізар, які прыслалі Янавы сябры з Захаду, калі на Захадзе яшчэ было што слаць. На экране ў поўным парадзе колераў — ізноў прэзыдыюм зьезду і зноў дзеці. Цяпер дзеці начныя, а ўраньні былі дзеці ранішнія. Начныя дзеці абвязваюць шыі чырвоных вяльможаў чырвонымі хусткамі, хоць вяльможы ўжо абвязаныя ранішнімі дзецьмі. Кожны засядацель прэзыдыюму бярэ сваё дзіця на рукі і цалуе ў вусны. А некаторыя дзеці — гэта ўжо дзяўчаты з грудзямі. Найдзябёлейшую дзяўчыну прыставілі да сакратара-госьця. Вочы ў яго ўжо мутныя, бо пасьпеў хапіць у часе перапынку, а яшчэ ў яго фізіяномія пэдзіка, нейкая такая апушчаная, як у пэдзікаў, фізіяномія, але ён мусіць цалаваць у вусны нашае дзіця зь неблагімі цыцкамі. Карцінка ідзе бяз гуку. Нехта вымыкнуў гук, бо паўсюль вымыкаюць гук падчас такіх трансьляцыяў.
— Можа, паказаць вам пашпарт? — пытаюся я засмучанага паштальёна, якому карціць пазбыцца грошай, якія

абцяжарваюць яго.
— А вы падпішацеся ягоным прозьвішчам?
— Натуральна. Ужо ня раз падпісваўся.
Ён спраўджвае мой пашпарт, пазіраючы на каністру. Каністра, невядома чаму, пераважвае сумневы.
— Пішэце, — кажа паштальён з уздыхам.
Пасьля адлічвае мільён дзьвесьце тысяч злотых новымі банкнотамі, старанна сьлінячы пальцы.
— Шкада чалавека, — муркае ён сам сабе. — Даўней гэта быў прыстойны дом. Але як уцякла жонка, гэтая акторка, то пачалі розныя сюды прыходзіць. Маўляў, мастакі. Я ведаю мастакоў. Мой швагер парцаляну клеіць. Пакуль цьвярозы, большага мастака ня знойдзеце, але як дарвецца да гарэлкі, то хавайся ў бульбу. Пералічэце, калі ласка.
Я раблю выгляд, што хутка лічу. Зь пісьмовай машынкі на стале тырчыць аркуш зь некалькімі радкамі літараў. Бачу таксама розныя распачатыя рукапісы, няскончаныя малюнкі, нават нотную паперу. Бо Ян займаецца шмат якімі мастацтвамі. Зусім як Леанарда да Вінчы. У малых краінах вялікія мастакі ўсебаковыя. Чым меншы край, тым большая ўсебаковасьць.
— Усё ў парадку, — кажу я і ўсоўваю адну тысячу ў цьвёрдую рэўматычную руку паштовага службоўца.
— Шчыра дзякую, — кажа ён з палёгкай, бо пачуў ува мне чалавека, а такі не паквапіцца на чужыя грошы. — Добрай вам ночы.
Ён выходзіць, а я замыкаю дзьверы на ключ. Колькі ж дзён і начэй я прабавіў у гэтым доме, які быў то заможны, багаты, з каньякамі, ласосямі, дзічынай, а то ўбогі, ледзьве на нагах, з гарэлкай, печанай грудзінкай і варанымі бабáмі. Цяпер гэты пакой стаіць перада мной аголены, поўны сораму. Магу зазірнуць у рукапісы, магу адкрыць шуфляду стала, магу схаваць у кішэню грошы.
Ян быў нашым старцам Зосімам. Бо яго сапраўды ніхто ня ведаў маладым. Можа, у яго наагул не было маладосьці. Можа, ён адразу зьявіўся на зямлі сіваватым, сухім сталым дзядзькам з агромністым ілбом, на якім з посьпехам можна зьмясьціць прыстойных памераў навэлу альбо лірычны вясковы пэйзаж. Да Яна прыходзілі па маральную падтрымку, па чарку гарэлкі альбо па камплімэнт. Ніхто ніколі нічога не прынёс Яну, усе заўсёды нешта ад яго выносілі.

Падыходжу да дзьвярэй ванны, далікатна стукаю.
— Яне, гэта я.
Ціша, нават вада не застогне ў трубах.
— Яне, я прыйшоў разьвітацца.
Ванны пакой нібы засыпаны друзам. Адно ззаду за акном гойсае віхор з выцьцём, енкамі, тупаньнем.

Націскаю клямку. Дзьверы зь сярэдзіны не зачыненыя. Адчыняюцца з лагодным рыпеньнем. На краі ванны трапеча агеньчык сьвечкі, спаленай амаль да канца. Вялікія падцёкі стэарыну зьвісаюць аж да падлогі. Пэўна, лямпачка перагарэла ў гэтым доме, што паступова ператвараецца ў руіну.
Наступаю на нейкія анучы, якія валяюцца на падлозе. Толькі цяпер бачу, што Ян ляжыць у ваньне. На ім кашуля, трохі задзёртая, так што пад ёй відаць жалосная сарамота старога чалавека. Абмяклыя рукі датыкаюцца прыкурчаных ног, аблітых нейкай вадкасьцю — можа, лекамі, а можа, недапітай гарэлкай.
І Ян глядзіць на мяне з-пад прымружаных павекаў. Глядзіць, але не рэагуе. Ані цешыцца, ані саромеецца, ані засмучаецца.
— Як маешся, Яне? Адпачываеш? — пытаюся я, каб неяк распружыць гэтае ненатуральнае становішча.
Ён маўчыць, але выразна глядзіць сваімі касымі шчылінкамі проста мне ў вочы.
Я схіляюся над ім:
— Табе кепска?
Ён пярэчыць лёгкім рухам галавы. Я сядаю на край ванны каля сьвечкі, што курэе чорнай сажай.
— Можа, табе трэба дапамога?
Ён нерухома глядзіць на мяне. На шчокі і бараду вылезла белая худая шчэць. Малое полымя ў газавай калёнцы перадражнівае агеньчык сьвечкі. Абое трапечуць, кожнае па-свойму.
— Ведаеш, Яне, мне трэба прыняць страшную пастанову.
Ён пачынае варушыць асьмяглымі вуснамі. Толькі цяпер я заўважаю, што сьцяна ванны за ім аблепленая ванітамі. Нейкаю пачварнаю субстанцыяй з страўніка, напоўненага адно алькаголем.
Я прыслухоўваюся да ягонага шэпту і чую:
— Мы заблукалі ў вялікім лесе нікчэмнасьці народаў і асобных людзей.

— Ясю, чаму ты так бязьлітасна сябе забіваеш, у растэрміноўку на цэлыя гады?
— А ты?
— Я выпрабоўваю лёс час ад часу. Калі прыходзіць найгоршая гадзіна.
— Зямля, татальны распад. Няспынная вечная агонія. Расьцягненая сьмерць. Плянэта сьмерці.
— Яне, мы ўсе зь цябе. Ты карміў нас, прыграваў, вучыў нас адвеку. Што здарылася?
Гэтулькі гадоў я баяўся Яна. Кожны свой учынак я, перш як учыніць, у думках падаваў яму на ўхвалу. Колькі разоў я казаў “так”, колькі разоў я думаў пра Яна, колькі разоў я казаў “не”, колькі разоў я бачыў перад сабой Янаў твар. А цяпер мне ўжо ня трэба баяцца. Ён ляжаў перад мной голы, апаганены, пазбыты людзкасьці. Нават бяз гэтай найжаласьнейшай годнасьці, годнасьці сьмерці.
— Ясю, я хачу падняцца ў апошні палёт, каб упасьці ў ледзяную бездань. Бачыш гэтую каністру? Гэта бэнзын. Пайду да Палацу культуры, бо я ўжо пастанавіў, і там у болі скончу сваё жыцьцё. Я, упаўнаважаны дурных і мудрых, хітрых і наіўных, махляроў і сьвятых. Скажы, ці варта? Ці не шкада майго мізэрнага жыцьця для высокіх ідэяў?
Ён намагаўся праглынуць сьліну. Я падняў ягоную галаву з срэбнымі валасамі, якія ліплі, як мышыная поўсьць.
— Гісторыя, — прашаптаў ён, — гісторыя зблізку агідная, блазенская, дурная. Толькі з адлегласьці яна трагічная, харошая і велічная.
— Што мне рабіць, Янку?
Ён з высілкам узьняў павекі, але і цяпер я бачыў толькі часткі чырвоных хворых вочных яблыкаў. Ён глядзеў напружана, нібы пераадольваючы ў сабе жудасны боль. Калісьці ён таксама быў пыхлівы. Пыхлівейшы за ўсіх нас. Рэшткі людзей у маёй краіне ўсё яшчэ чакаюць ягонага слова.
— Нехта мусіць перарваць летаргію, Яне. Дзікім крыкам абудзіць тых, хто дрэмле.
Ён намагаецца хітнуць галавой. У суседзяў спускаюць ваду ў туалеце. Малы вадаспад пралятае па трубах каля скроні гэтага старэчы, які ніколі ня быў старым, хоць ніхто ня ведаў яго маладзёнам.
Сам зьдзіўляючыся сабе, я паднімаю ягоную мокрую брудную

руку з надзіва даўгімі пальцамі. Цалую ценкую скуру рукі. Рука, калі я яе пускаю, ляціць па сьцяне ванны, пакуль не знаходзіць свайго месца на задзёртай кашулі каля пахвіны, парослай зеленаватымі валасамі.
— Да пабачэньня, Яне. Маліся, калі здолееш, калі праясьніцца ў цябе розум, калі добры анёл прыйдзе да цябе пад ранак з благой навіной.
Кнот сьвечкі замяніўся ў калюжыну стэарыну. Неўзабаве згасьне. Хай гасьне.
Я прыкрываю дзьверы ванны, пакідаючы прыстойную шчыліну: хай Ян бачыць свой пакой, сваю камэру сьмяротніка і хай тыя, хто, можа, прыйдзе, знойдуць нашага старца Зосіму.
Хачу яшчэ раз разгледзець і запомніць назаўжды малы сусьвет Яна. Яго кніжкі на ўсіх мовах, кніжкі, якіх ніхто не чытаў, рэклямныя плякаты фільмаў, якія праваліліся ў студыйных кінатэатрах усіх пяцёх кантынэнтаў, палотны карцінаў, якія да сёньня не выстаўляліся на публічны агляд. Пуставатыя сьцены, прызначаныя для ляўраў, якія ніхто зь неба не паслаў.
У гэты момант зазваніў тэлефон, што дзіўна, бо я ня помніў, каб у гэтым доме быў тэлефон. Але ён стаяў пры тэлевізары на падаконьні і настойліва бомкаў.
Я зьняў слухаўку.
— Алё?
— Гэта нумар 8713? — спытаў нехта на ненайлепшай польскай.
— Так, — я зірнуў на кардонку, прычэпленую да кодаба апарату. — Правільна.
— Можна пагаварыць з гаспадаром?
— На жаль, ён цяжка хворы.
— А вы хто?
— Я ягоны сябар.
— Ага, ясна. Гэта Крулік, загадчык аддзелу публіцыстыкі агенцтва “Associated Press”. Я хацеў запытацца, што сёньня чуваць у Варшаве?
— Нічога цікавага. Невялікае сьвяточнае бязладзьдзе.
— Ага, ясна. Гэта як у нас. Невялікае штодзённае бязладзьдзе. Дзякуй. Да пабачэньня.
— Дабранач.
Я паклаў слухаўку. Трэба было сьпяшацца. Старшыня паседжаньня зьезду чытаў прывітальныя тэлеграмы, якія яму падавалі зь вялікага стосу. Неўзабаве прасьпяваюць

“Інтэрнацыянал” і паедуць на банкет за кошт нашай партыі. Але зноў зазваніў тэлефон.
— Алё?
— Зь якім нумарам вы гутарылі? — спытаў нэрвовы, агрэсіўны мужчынскі голас.
— Бог ведае. Я толькі ведаю, што з Амэрыкай.
— Гэта і мы ведаем. Калі ласка, назавеце дакладны нумар, інакш адключым тэлефон і нумар забяром.
— А адключайце і засуньце яго сабе ў адно месца.
— Куды-куды?
— Туды-туды.
У мэмбране нешта пранізьліва заскрыгатала, а я паклаў слухаўку. За акном безь фіранак, за голай шыбай, пазначанай аспаватымі сьлядамі ад кропляў дажджу, ціхенька скурчыўшыся, ляжаў горад. Калі б ставала моцы зроку, я б мог убачыць Жалібаж і Бяляны, вялікі абшар марных, крыва пабудаваных дамоў і зьдзічэлай зеляніны. Бо гэтае места стагодзьдзямі будавалі пад бізуном і гэтае места падпальваў кожны, хто хацеў. Я ня надта люблю гэтае места, ня так моцна, як тыя зграі лёкайскіх мастакоў, што любяць моцна, да шаленства, любяць за грошы, выцягваныя з сантымэнтальных жыхароў, якія мусяць любіць сваё места, бо ім больш няма чаго любіць, і за грошы, выцягваныя з хітрай партыі, якая атаясамілася зь местам, дзяржавай і Богам.
Недзе там, у бездані ночы, памірае Ўкраіна, канае Літва, выпускае апошні ўздых Беларусь, у далёкае падарожжа да Магамэтавага раю адыходзіць Татарыя. Недзе там, на балотах, на багнах малой, як атам, зямлі паміраюць людзі і канаюць заўчасна нешчасьлівыя народы. Міжзорны звон б’е на вечаровую імшу. Сэрца космасу б’е ў звоны.
Спускаюся ўніз, дзе ля ўваходных дзьвярэй чакаюць мяне Тадак і Пікусь.
— Сканчаецца яшчэ адна бясконцасьць. Мінае чарговая вечнасьць, — вітае мяне цытатай паджылы хлапчук з Старагарду. — Але ж мы скалелі. Бачыце, што робіцца?
Бачу, і ня веру сваім вачом. Зь неба падаюць рэдкія камякі сьнегу. Пасьля сьпякотнага душнага дня надыходзіць кароткая начная зіма. Пікусь ганяецца за сьняжынкамі, што павольна падаюць, нагадваючы яму вясёлыя сабачыя Каляды.
Тадак канфідэнцыйна прысоўваецца да мяне, нясьмела бярэ

мяне за рукаво.
— Я ведаю, — шэпча з жахам, — я ўсё ведаю. Вы хочаце зрабіць сабе сьмерць з прычыны нястачы посьпеху.
Недзе на суседняй вуліцы нешта павалілася з магільным грукатам. Але, на шчасьце, без ахвяраў, бо не чуваць людзкога крыку.
— Я за вас адпомшчу.
Я моўчкі ўваходжу ў цагляную загарадку для сьмецьцевых кантэйнэраў, якіх ніхто ўжо не вывозіць. Пад пірамідай сьмярдзючых адкідаў знаходжу здаровую цагліну.
— Тадак, можна цябе на хвілінку?
Зацікаўлены паэт з Старагарду даверліва ўваходіць у гэтую сьмярдзючую крэматорыю. Я стаўлю каністру ўбок, бяру Тадка за мокры каўнер куртачкі.
— У чым справа? — ён спрабуе вызваліцца ад майго захвату.
— Ведаеш што, ведаеш што, — задумліва кажу я, — я ўрэшце надумаў забіць цябе. Можаш крычаць колькі ўлезе. Ніхто нават у акно не зірне. У мяне грубая цагліна. Добрая варшаўская прылада для аглушэньня. Перарвём тваё марнае жыцьцё навукова.
— Вы жартуеце. Вы любіце забіваць у аповесьцях.
— Не, Тадку, не жартую. Досыць уявы, досыць фікцыі. Зьдзейсьнім звыклае, банальнае злачынства.
— Бачыце, я не крычу, не хапаю вас за горла. Вы рэпэтуеце.
— Не. Глядзі, падымаю цагліну ўгору, зараз разаб'ю твой рабаціністы лоб. Пабачым, як гэта выглядае ў жыцьці, напраўду.
Тадак глядзеў бяз страху на шчарбатую цагліну, якую я трымаў у яго над галавой:
— Мне вельмі хочацца, страшна хочацца выпрабаваць лёс. Аж нейкія дрыжыкі пайшлі па сьпіне. І пасьля адразу ж спаткаемся, добра? Буду чакаць вас за пяцьдзясят кілямэтраў дакладна панад шпілем Палацу культуры, там, дзе, пэўна, канчаецца нашая атмасфэра, нашая мілая земнасьць. Але вы гэтага ня зробіце, бо дзьве тысячы гадоў таму адзін арамеец сказаў сваім лютым сучасьнікам: "Не забівай у ахвяру ягнё, суседа альбо свайго брата, складзі ў ахвяру самога сябе". Ува мне ёсьць сем атамаў Антыхрыста, але ў вас прынамсі семдзесят сем.
— Глядзі, Тадку, як лёгка забіць чалавека. Праз паўгоду ў рамках суботніку цябе б вывезьлі разам зь сьмецьцем у

прыгарадны лясок, дзе растуць апошнія паганкі і апошнія атрутныя травы. Як лёгка перарваць чужое жыццё.
— А сваё ўласнае?
Ён узяў з маёй рукі гэтую цагліну, узважыў на далоні.
— Забяру з сабой на памяць. Гэта будзе мой талісман. Кавалак пятлі. Можа, вы галодны? У мяне ёсць два кавалкі цукру.
— Што ты вярзеш?
— Вам трэба выцерці хусткай твар. Але няма хусткі.
— Гэта была апошняя станцыя нашых пакутаў?
— Так. Перад намі ахвярны алтар, — ён паказаў рукой на белы, задуменны, высокі аж да неба іканастас Палацу.
— Чаму я цябе не забіў, калі мог забіць?
— У мяне няма ў кішэнях сярэбранікаў. Маім ганарарам будуць пяць старонак прозы, калі па дарозе не ўкрадуць тэмы. Ведаеце, як гэта сёньня бывае. Я працую ў поце чала ад ранку, вяду вас, нібы сьляпца, да наканаваньня, а ў апошнюю хвіліну выскачыць якая спрытная манда і падбярэ галоўную думку, апошняе пасланьне, усю мэтафару.
— Тадку, дарую табе жыццё.
— Добра, добра. Ужо пара. Нельга спазьняцца.
Мы хуткім крокам рушылі нацянькі ў бок Палацу Культуры. Мне давялося пашукаць у кішэнях ліхтарык, каб сьвяціць на гэтым бездарожжы. Пікусь тактоўна счакаў нашыя разборкі і цяпер жвава бег перада мной, выбіраючы бясьпечную дарогу. Сьнег усё болей гусьцеў.
Тады да нас зьвярнулася нейкая зьбянтэжаная кабеціна:
— Ці вы ня ведаеце, дзе тут збор паломнікаў да Чанстаховы?
Голас падаўся мне знаёмым. Я на кароткае імгненьне пасьвяціў ёй у твар. Пабачыў вялікую галаву, усю пакорпаную энэргічнымі зморшчынамі, з размазанай на ўсе бакі яскравай памадай.
— Непадалёк, пані Госю. Трэба пайсьці направа, туды, дзе тыя недабудаваныя высоткі.
— А, гэта вы, — сказала яна безь зьдзіўленьня. — Ладная забава, нічога ня скажаш. Гэты хам мяне згвалціў.
Я зганьбаваная. За мае ўласныя грошы.
— Але ксёндз, які вядзе паломнікаў, таксама выглядае падазрона.
— Нічога. Ксёндз, можа, і фальшывы, абы каята была праўдзівая. У вас нейкая акцыя пад Палацам?

— Хто гэта вам сказаў?
— Ужо ня помню. Бедная мая галава. Гэтулькі прыкрасьцяў адразу. А вы ведаеце, які там шлях да Чанстаховы? Палова дарогі — пустыня, што засталася пасьля паразрываных кар'ераў. Панізілі грунтовыя воды, зруйнавалі экалёгію, паўсюль выдмы і дзікія сабакі. Даўней туды было тыдзень ісьці, а цяпер, можа, нават да Новага году будзем паломнікаваць. Я збанкрутую.
— Памалецеся, калі ласка, і за маю душу.
— Ня ведаю, ці адкуплю сваю. А гэты хам, а які ж здаровы. Ледзь жывая выйшла.

Яна адышлася, не разьвітаўшыся, праклінаючы кухара-палкоўніка. Пікусь хацеў быў забрахаць, але перадумаў. Толькі ашчэрыў свае ня надта прыгожыя зубы і гыркаў, гледзячы ў цемру.
Абы каята была праўдзівая. Вось насоўваецца зь цемры Палац культуры, сьвеціць, як месяц, чужым сьвятлом пражэктараў. Набліжаецца да нас, ідзе да нас празь лятучыя аблокі завеі. Я ўжо бачу ўмантаваныя ў атык над Заляй кангрэсаў сталёвыя слупы, вялікі палісад дзеля абароны дэлегатаў ад неспадзяванага паданьня вялікіх блёкаў пясчанікавае абкладкі. А на гэтым палісадзе расьцягнулі агромністую вясёлку з каляровых лямпачак, якая трымае на сваёй дузе крывавы надпіс "Мы збудавалі сацыялізм".
Яшчэ магу ўцячы ў мышыную дзірку. Яшчэ маю апошнюю хвіліну часу. Схавацца ў якую дзірку, прыкладам, у Старагардзе, зьмяніць прозьвішча, уступіць у партыю, стварыць новую сям'ю. Уратаваць колькі гадоў для Надзежды, альбо Надзеі. Але акурат тады я страчу яе. Яна памрэ ў мяне на руках альбо ў мяне ў думках. Надзежда зь вялікімі грудзьмі, стэпавы эліксыр жаноцкасьці, добрае супакаеньне, аб якім я тужыў усё жыцьцё. Бо толькі цяпер я раптам зразумеў, што гэта, гэты таямнічы фэміністычны элемэнт, які нясуць з нутра космасу сонечныя вятры. Я спаў з паўбабамі-паўмужыкамі, песьціў бялковыя муляжы, кахаў бесьцялесныя біялягічныя манэкены. Я хацеў бы пакласьці галаву на ўлоньне Надзеі і заснуць назаўжды.
Перада мной той самай сьцяжынай ішлі на вогнішча будысцкія манахі, адзін чэх, нейкія літоўцы. Перада мной ішлі гэтай

распаленай сьцежкай людзі розных расаў, моваў, рэлігіяў. Чаму адзінотнае самагубства — жалюгодны грэх? Чаму публічнае самагубства ў велічы рытуалу — узьнясеньне на неба? Чаму самотная сьмерць ад уласнай рукі ёсьць грэшным парушэньнем боскіх законаў, а сьмерць на вачох блізкіх — пераможным выклікам пану Богу?

Дзе вы, пакутныя душы, што немачна суправаджаеце нас у гэтай зямной мітусьні? Я гутару з вамі ад ранку, тку аповесьць, якая будзе памнажэньнем паўтораў. Паўтараюся мімаволі, бо няволя паўтараецца штодня. Я занудзіў і вас, таму вы моўчкі чакаеце кульмінацыі, калі я ўвайду ў кола грэшных пакутных душаў, якія нікога ня страшаць па начох, якіх ніхто жывы не палохаецца, якія ніколі яшчэ не ўстрымалі жывога ад злачынства.

Я не стварыў за сваё жыцьцё паважнай, эпічнай, аб'ектыўнай, усёабдымнай, шматзначнай і зьмястоўнай прозы, як Біблііі ці Караны. Мяне мой час прымушаў да манатоннасьці, да аднастайнага плаксівага мармытаньня, да агіднай гістэрыі, да мітусьлівай балбатні, да аднабокіх скаргаў, да непрывабнай брыдоты. Прымушаў мяне, безыменнага літаратара, невядомага чалавека, дасканалую пасярэднасьць эпохі заняпаду, пасярэднасьць зь неўтаймаванымі амбіцыямі.

Чакай, спыніся. Ці не шкада хоць бы гэтых некалькіх месяцаў ці пары восеньскіх дзён, якія можа падарыць табе кон? Гадзінаў, прасякнутых надзеяй, а нават нястачай надзеі, бо нястача надзеі таксама ёсьць панураю адменаю надзеі. А раптам здарыцца нешта, чаго Зямля чакае мільёны гадоў?

Мы ўжо на пляцы Дэфілядаў. Перад намі вышчарбленая калянада Залі Кангрэсаў. Вакол яе расстаўленыя пражэктары, скіраваныя на рад уваходных дзьвярэй, альбо, можа, на тую каменную плятформу, што чакае мяне, як родная зямля. Бачу дзьве камэры, падобныя да кулямётаў, гатовых да расстрэлу. А пасярод лягеру апэратараў стаіць Булат у вялікім кажусе. Ён адклаў ад'езд у Амэрыку, і слушна зрабіў. Будзе здымаць выхад дэлегатаў, а здыме маю сьмерць. Гэтыя пару дзясяткаў мэтраў стужкі з кадрамі сьмерці чалавека зробяць яго несьмяротным. Заўважаю маіх блізкіх. Надзежду з валасатым хлопцам, Рышарда Шміта, пахмурнага Чабана, зь якім я пасварыўся, калі на дварэ яшчэ было лета, заўважыў таксама таго бадзягу з майго раёну, мужчыну неакрэсьленага веку, з лысым чэрапам, з

шырокай барадой, з пастухоўскім кіем у руцэ. Дацэнт Эдвард Шміт, мыкаючы ад асалоды, балбоча сярод натоўпу, што апошнім часам уваходзіць у паўсюдны звычай. Потым усе стаяць у ажурным паўколе разявакаў, сярод актыву дэманстрантаў, сярод дэлегацыяў соннай грамадзкасьці, сярод рухавых, як верабейчыкі, дзяцей. А перад гэтай грамадзкасьцю выстаўленыя колькі маніцораў, якія транслююць паседжаньне зьезду. Якраз уздымаецца прэзыдыюм, за ім заля. Няроўнымі галасамі зацягваюць “Інтэрнацыянал”. Наш сакратар сплятае руку з рукой найвышэйшага сакратара, які кіруе ўсім сьветам. Але хто сапраўды кіруе ўсім сьветам? Бо я нявольнік, нявольнік наш сакратар і нявольнік гэты ўладар імпэрыі з крыху апушчаным калмыцкім тварам. Намі і ўсім сьветам кіруе палітычнае бюро вампіраў, ячэйка прывідаў, чразвычайка грэшных парэшткаў Сталіна, Дзяржынскага, Жданава, Берыі і ўсяе рэшты, схаваных у магільным мораку.
Нехта абдымае мяне ззаду. Гэта Чабан. Нічога ня кажучы, цалуе мяне ў плячо, як некалі цалаваліся палякі. Трасе мяне, адубелага ад холаду, і адыходзіць убок. Падбягае Надзежда. Пачынае ўсхліпваць, чапляючыся за маё рукаво.
— Ня трэба плакаць. Цяпер ужо нават нельга, — кажу я.
Енк “Інтэрнацыяналу” прабіваецца праз муры аж да нас. Гучыць як скарга жыўцом замураваных людзей.
— Я пайду з табой. Можа, табе будзе лягчэй, — шэпча празь сьлёзы Надзежда.
— Не, ты застанься. Нехта мусіць застацца. Возьмеш Пікуся. Пса-вандроўніка. Ён ужо ўсё пра мяне ведае.
Падыходзіць той маладзён, зарослы, як апостал Ян Хрысьціцель.
— Калі ласка, адкрыйце запясьце, — загадвае ён.
— А навошта? Пакіньце мяне цяпер у спакоі.
— Марак замяняе Галіну. Яе папаўдні арыштавалі, а яго выпусьцілі, — шэпча Надзежда.
Перш чым я пасьпеў запратэставаць, ён падцягнуў рукаво і засадзіў мне пад скуру голку. Я нягучна крыкнуў, а ён ужо прыляпваў сьлед ад уколу мокрым тампонам.
— Абязбольвальны сродак, — паведаміў ён.
— Гэта ўжо другі ўкол сёньня.
Яна бярэ маю руку. Цалуе халоднымі вуснамі ранку. Стой, спыніся. Ці не шкада гэтага марнага сьвету? Ці не шкада

штодзённых жыццёвых няўдачаў, няўдалых каханьняў, вечнага страху перад няведамым?
— Ува мне сядзяць усе пакутныя душы, — шэпча ззаду Тадэк.
— Вы шукаеце іх. Чакаеце іхнага знаку. Гэта я, гэта я. Як рыпеньне падлогі ўночы, як месяцовая здань, як здушаны крык у страшным сьне.
На маніторах уся заля, сплеценая ланцугом рук, пяе песьню, якая некалі, у маладосьці, была прыгожай, а пад старасьць гучыць як плач нявольнікаў. І наш сакратар пяе, але нібы млявей ад іншых, робіць перапынак, пазірае назад, глытае сьліну, урэшце пускае руку савецкага сакратара, пускае сваё апірышча і пачынае валіцца тварам дагары, проста на другі рад прэзыдыюму, і вось ужо непрытомна ляціць пад стол зь мёртва вытарчанымі вачыма. Але ззаду яго падхапляе пільны начальнік асабістай аховы, вялікі дзядзька з тварам вепрука і надзіва тонкім ды сьпічастым носам, нібы хто доўга цягнуў яго за гэны орган. Хапае пад рукі, падскокваюць іншыя, па кароткай валтузьні цягнуць яго за кулісы. Але па дарозе перадумваюць, садзяць у вольны фатэль, і тут карцінка залі зьнікае, а зьяўляецца застаўка зь дзьвюма чырвонымі птушачкамі, адна зь якіх мае белы хвосьцік.
— Ён таксама ўрэшце прымлеў. Усе млеюць, — азываецца Рысік Шміт. — Слухай, стары, каб не было непаразуменьняў. Помніш, што казаў Эдвард пра гэтую маю рэжымную кніжку, зь якой я жыву і апазыцыя жыве? Гэта мая кара, штраф, прызначаны злоснай дзяржаве, кантрыбуцыя, спагнаная нявольнікам з прыгнятальніка.
Нехта зь зьбянтэжаных гледачоў пачынае скандаваць тонкім голасам:
— Польша! Впер'ёд! Польшча! Наперад!
— Пара ўжо, — шэпча Чабан.
— Не, не, — мяне засланяе мая Надзея.
Яна роспачна плача, а я гладжу яе па мокрых валасох, якія ўдзень чырванаватыя.
Сьнег сыплецца, нібы хоча ўлагодзіць, зьнячуліць, усоніць. Чорнае места глядзіць на мяне невідушчымі вачыма. А ўсё-такі гэта маё места. Яно мяне мучыла, і я яго не бярог. Места нявінных грэшнікаў, падобных да грэшнага мяне.

Калі ступлю нагой у магілу,

Як знак пашаны да мяне,
Хай тыя, да каго я меў агіду,
Не панясуць мой прах у труне.
Так напісаў да мяне перад сьмерцю мой сябар, мой апякун, мой хросны бацька паэт Антоні С. Яго несьлі самыя блізкія, і я яго нёс. Улезу да вас сілком, троху заўчасна, як прымеце мяне, сябры? Увайду да вас абсмалены, з страшнай плямай сьмяротнага граху на чале. Божа, зь любові да Тваіх законаў парушу гэты Твой найсьвяцейшы закон.
Каністра арошаная сьнегам, як сьлязьмі. Запалкі ў дрыготкай руцэ. Зьвініць у галаве. Вадаспад рассыпаных думак, люстраныя водбліскі падзеяў, сьпеў як енк, енк як песьня. Запальваюцца ўсе агні ў паўколе калянады. Агенты пачынаюць адчыняць цяжкія дзьверы ў пекла альбо неба. Зрушыліся кінакамэры, міргаючы чырвонымі вочкамі кантрольных лямпачак.
Моцна цалую Надзею ў вусны, якія адкрываюцца ў бязгучным плачы. Хачу закрыць іх сваім ротам, каб змоўклі і не нагадвалі пра недакончанае жыцьцё, недакончаныя мроі, недакончаныя каханьні.
Бачу краем вока, што Тадак укленчыў у расталым сьнезе. Пікусь гойсае, вагаючыся, хоча бегчы за мной, але нейкая раптоўная мудрасьць кажа яму застацца спаміж жывых. Рышард Шміт апусьціў галаву, камякі неспадзяванага сьнегу сыплюцца яму за каўнер. Чабан уздымае руку, нібы даючы знак, а можа, бласлаўляючы.
— Бывай, Надзею. Калі не па мне, дык па кім з наступных паэтаў, работнікаў ці студэнтаў прыйдзе раптоўная свабода, як нечаканы пачатак лета.
— Я кахала цябе ўсё жыцьцё.
— І я цябе, мілая, буду кахаць так доўга, як здолею.

Азарэньне азарэньнем. Так, бачу, помню ўчарашнюю ноч. Неспадзяваная сьветліня на парозе восеньскай ці летняй ночы. Раптоўная, усёабдымная пэўнасьць, што гэта мы, людзі, гэтая рака біялягічнай матэрыі, якая плыве зь ніадкуль у нікуды, што гэта мы стварылі Бога. Не за сем дзён, але за вякі ледавікоў і тропікаў, за вякі нараджэньня кантынэнтаў і высыханьня мораў, за вякі разьвіцьця паўкуляў мозгу і адміраньня шчэлепаў, за злыя і добрыя вякі, за ўяўленыя і дагэтуль

пакрытыя таямніцай эры, за ўсю нашую людзкую вечнасьць — з высілкам, з болем, з пакутай стварылі нашага Бога, Бога міласэрнасьці і дабра, каб ён бараніў нас ад зла сусьвету, космасу ці, прынамсі, гэтага блакітнага неба, якое б'е нас перунамі. Каб ён бараніў нас ад нас.
Бог існуе. Бог, вылеплены з нашых электрамагнітных ці якіх іншых хваляў, хваляў, выпраменьваных нашымі пакутамі, нашай роспаччу, нашым гневам. Бог проці іншых Багоў.
Наш Бог мацнее, апаноўвае найдалейшыя галяктыкі, урэшце запануе над усім сусьветам, нашым сусьветам, бо мы нічога ня ведаем пра іншыя сусьветы, і зробіць нас абраным родам з запаветнай зямлі. Бог міласэрнасьці. Бог людзей.
Я пачынаю павольна ісьці да каменнай плятформы над невысокімі сходамі. Ногі цяжэюць, і галава цягне да зямлі, зь якой я некалі паўстаў і да якой мушу вярнуцца сваёй воляю.
Людзі, дадайце мне моцы. Людзі, дадайце моцы кожнаму ў сьвеце, хто ў гэты час ідзе разам з мной на самаспаленьне.
Людзі, дадайце моцы. Людзі...

Пераклаў з польскай Алесь Пяткевіч
пры ўдзеле Валера Булгакава
паводле Tadeusz Konwicki. Mała Apokalipsa.
Warszawa: Niezależna Oficyna Nowa, 1996.

Заўвагі
POW — Polska Organizacja Wojskowa (Польская вайсковая арганізацыя) — тайная вайсковая арганізацыя, створаная з ініцыятывы Ю. Пілсудскага ў кастрычніку 1914 году ў Варшаве, аб'яднала Polskie Drużyny Strzeleckie і Związek Strzelecki. Дзеяла ў Каралеўстве Польскім, пасьля — таксама на Галіччыне, Украіне, Расеі, Летуве. Спачатку галоўнай мэтай POW было ажыцьцяўленне выведча-дыверсійнай дзейнасці супраць Расеі; у 1915—1917 гадах, пасьля намецкай акупацыі Каралеўства Польскага, перайшла на напаўлегальны стан; у 1915 г. частка чальцоў POW уступіла ў I Брыгаду легіёнаў польскіх. Заняла варожую пазіцыю ў дачыненні да кастрычніцкага пераварота ў Расеі; удзельнічала ў перайманні ўлады ў Галіччыне і раззбраенні немцаў у Каралеўстве Польскім.
Галоўнакамандуючы — Ю. Пілсудскі, а пасьля ягонага арышту (ліпень 1917) — Э. Рыдз-Сьміглы. Назад

АК — Армія Краёва — канспірацыйная вайсковая арганізацыя, падпарадкаваная польскаму эміграцыйнаму ўраду ў Лёндане. Узьнікла 14 лютага 1942 г., распушчаная 19 студзеня 1945 г. Назад

ZWZ — Związek Walki Zbrojnej (Зьвяз збройнай барацьбы) — канспірацыйная вайсковая арганізацыя, створаная польскім эміграцыйным урадам на пачатку 1940-га. Галоўнай мэтай прызнавалася дыверсійна-сабатажная дзейнасць. Галоўнакамандуючы — ген. К. Сасноўскі (з чэрвеня 1940). У 1942 годзе перайменавана ў Армію Краёву. Назад

Тут намёк на Тадэвуша Рэйтана (1742—1780), удзельніка барскай канфэдэрацыі (1768—1772), у 1773 г. дэпутата Сойму ад Наваградчыны. Рэйтан рэзка пратэставаў супраць стварэньня на сойме канжэдэрацыі пад кіраўніцтвам князя А. Паніньскага, дзякуючы якой стала магчымым зацьвярджэньне дамовы аб першым падзеле Рэчы Паспалітай і прыняцьце навязанага Польшчы краінамі-агрэсарамі дзяржаўнага ладу. Калі на прапанову старшыняванага Паніньскага дэпутаты скіраваліся да выхаду, Рэйтан кінуўся на парог, стараючыся загарадзіць дарогу тым, хто выходзіў (пакіданьне залі паседжаньняў азначала згоду дэпутатаў на прызнаньне канфэдэрацкіх пастановаў). У 1775 г. пасьля заканчэньня сойму страціў розум і неўзабаве зрабіў сабе сьмерць. Назад

Тут алюзія на радкі з "Пана Тадэвуша" (Частка 1, Гаспадарка):

Gdzie bursztynowy świerzop, gryka jak śnieg biała,
Gdzie panieńskim rumieńcem dzięcielina pała,
A wszystko przepasane jakby wstęgą, miedzą
Zieloną, na niej z rzadka ciche grusze siedzą.

(У беларускім перакладзе Язэпа Семяжона):

Дзе ў ярыне сьвірэпа — россыпам бурштыну,
На ўзьмежках дзяцельнік — румянамі дзяўчыны,
А ўпрокідку ў палетках, быццам вартаўнічкі,
Стаяць і ціха шэпчуцца ігрушы-дзічкі. Назад

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

Лісты Яна Станкевіча да Антона Адамовіча

*Я*н Станкевіч пазнаёміўся з Антонам Адамовічам у акупаваным немцамі Менску. Знаёмства перарасло ў дружбу і супрацоўніцтва. Незадоўга да прыходу Чырвонай Арміі ў Менску была выдадзеная іхная сумесная праца — “Маленькі маскоўска-беларускі (крывіцкі) слоўнічак фразэолёгічны і прыказкаў ды прывітаньні, зычэньні і інш”. Канец вайны Станкевіч зь сям’ёй сустракае ў Празе, дзе займаецца амаль выключна навуковай дзейнасьцю. Адамовіч з сваімі бацькамі атабарыўся ў Бэрліне, дзе працуе ў беларускай калябарацыйнай прэсе. Час яшчэ ваенны, і таму абодвух навукоўцаў цікавіць перадусім распрацоўка беларускай вайсковай тэрміналёгіі для практычных патрэбаў. Яна патрэбная для беларускіх вайсковых фармацыяў, якімі апякуецца Беларуская Цэнтральная Рада, “эвакуяваная” ў Бэрлін.

Ліставаньне ішло цяжка: лісты не заўсёды знаходзілі свайго адрасата, асабліва калі важылі больш за 20 грамаў, іх напэўна пераглядала вайсковая цэнзура (менавіта ёй адрасаваныя пазнакі “Weissruthenisch”). Імклівыя ваенныя падзеі, капітуляцыя нацысцкай Нямеччыны паставілі ў ім кропку, але

не перапынілі творчага альянсу Яна Станкевіча і Антона Адамовіча — ён распадзецца толькі ў 60-х гг. у выніку асабістых непаразуменьняў між гэтымі асобамі.
У рэдакцыю “ARCHE” рукапісы былі перададзеныя доктарам Вітаўтам Кіпелем і супрацоўнікам Нью-Ёрскай публічнай бібліятэкі Лявонам Юрэвічам.

Weissruthenisch
13.XI.44
Дарагі сябру,
ліст із 3.XI. і грошы 100 рм. я адзержыў, дзякуй.
Я пісаў Вашэці аб пераезьдзе ў Прагу тады, калі думаў, што Ваша яшчэ ня ўладзіўся з працаю. А як цяпер Ваша ўжо ўладзіўся, дык, разважыўшы ўсё чыста, мне здаецца, што ня варта рабіць стараньнеў дзеля пераезду сюды; бо шмат няведамых, стараньнеў шмат, а рэзультат ня пэўны, а калі-б удалося, дык і то выглядае, што ляпей Вашэці там застацца. Слоўнікаў папытаю, але абяцаць цяжка.
Ст. Ст. аб “кутку мовы” я напісаў, але чамусьці ён не адказуе. Ці ня выехаў ён із Бэрліну на якісь час?
А шкада, што Ваша ня хочаш пісаць працы на прошаную мною тэму. Можна было-б на толькі напісаць агульна, што нашым мучаньнікам ня шкодзіла-б.
У гэтай-жа справе я зьвярнуўся да Т. Лебяды на адрыс: 5b Salfeld, Ostpreussen, Sadlauken, Peter Schirokoff, што прыслала мне Арсенева, але ліст па двух тыднях зьвярнуўся мне назад із подпісам, што адрысат няведамы. Мо Ваша ведаеш лепшы адрыс ягоны? Калі-б ведалі, дык прышлеце мне, а каб барджэй было, дык напішэце і яму самі.
Парадзьце да каго зьвярнуцца ў Бэрліне з просьбаю напісаць пропагандную кніжку проці бальшавікоў, а найляпей ад майго імяні ці ад сябе самога зьвярнецеся самі. Апрача ўменьня пісаць павінен такі чалавек умець дзяржаць язык за зубамі. Пазаўтра будуць два тыдні, як выдавецтва адзержыла ад мяне заказаны ім Sprachführer і адразу паслала ў цэнзуру, але дагэтуль адказу няма. Ці няма там у цэнзуры якога парадніка-шкодніка зь беларусаў?
У лісьце з 21.X. я між іншага пісаў Вашэці, што працу аб мове “Аль-Кітабу” скончыў і якімі навуковымі тэмамі манюся заняцца далей. Паўтару гэта тут у іншай рэдакцы. З гледзішча

практычна-крывіцкага найпатрабней было-б заняцца навуковым і практычным сынтаксам крывіцкім (бо практычны быў-бы на аснове навуковага).
Але з гледзішча навуковага і ідэйна-крывіцкага надта трэба давесьці, што вокаўска-донскае (“южно-великорусское”) ёсьць абмаскалелым нарэччам крывіцкіх Вяцічаў і што нарэчча пскоўскае з гісторычнага гледзішча таксама крывіцкае. Адале надабе было-б грунтоўна апрацаваць мову — фонэтыку і морфолёгію — Ігуменшчыны, ці тачней, “Краёвага слоўніка Чэрвеншчыны” Шатэрнікавага — дзеля добрае мовы ягонае і дзеля таго што мова Ігуменшчыны наагул належыць да цэнтральных гаворкаў крывіцкіх, што ляглі ў васнову старой і новай мовы літаратурнай. Праўда, мова Ігуменшчыны ляжыць на самым захадзе цэнтральных гаворкаў і даволі далёка на паўдня і дзеля таго мае, прынамся ў паўдзённа-заходняй сваёй часьці, некаторыя асаблівасьці паўдзённа-заходніх гаворкаў. Але гэта пакуль што лятункі, тым-жа часам я, як “вольнай часіною” дарваўся да свайго навуковага слоўніка крывіцкага, дык не магу ад яго адарвацца. Сядня я лучыў на адно слова Вашэці патрэбнае. Гэта “шрубава́нка” = м. винтовка, падае Нікіфароўскі. Напару, здаецца мне, я буду магчы служыць Вашэці некаторымі словамі. “Лад” радзіў-бы ўжыць дзеля перакладу м. “строй”, ладзіць, зладзіць, ладзіцца, зладзіцца — строить, -ся, построить, -ся. Здаецца мне, што гэта быў-бы клясычны тэрмін. А калі ня “лад”, дык “шых” (але ня “шыхт”), шыхаваць, -ца, шшыхаваць, -ца, бо “шых” ёсьць у даўнейшай мове літаратурнай, хоць відавочна, у яе лучыў ізь якоесь мовы чужое. А “шыхт” (з *m*) нейкі жарганізм. Слова “радоўка” добра было-б ужыць для “шеренга”, бо “радоўка” і ё ланцуг, складзены з радоў. Як у даўнейшай мове, “сьцяг” мае значыць ня толькі “знамя”, але і вайсковую адзінку, найляпей “батальён”, але дзеля таго што няма слова для м. “рота”, дык словам “сьцяг” можна было-б перакласьці гэтае апошняе. Падобна ў мове чэскай, дзе батальён мае назоў “пра́пор”. Але “харугаў” ё такжа дзеля назову вайсковае адзінкі, дык роце даць назоў “харугаў”, а баталёну — “сьцяг”, “полк” так і застаўся-б.
Вашэці я радзіў-бы заняцца крыху моваведаю. На пачатак прастудыюйце царкоўна-славянскую граматыку Лескіна (Leskien). Радзіў-бы такжа прачытаць “Введение в историю рус.

языка” Дурново, выдана ў Бэрне ў 1927 г. Дзеля гэтых студыяў карысна было-б Вашэці пазнаёміцца ў Бэрліне з проф. Фасмэрам (адрыс: Vasmer, Berlin, Dorothenstr. 6, Slavische Institut). Я зь ім пазнаёміўся ў пачатку студня 1943, будучы ізь Сівіцам у Бэрліне. Дзе цяпер Сівітца? Дзе Антон Лёсік? Подле маіх запісаў Вашэці засталіся мне **цяпер** вінны 118 рм. Але пэўнейшыя запісы ў Вашага айца, дык ляпей верыць ім. Мо’ Ваша знаў у Менску Ганну Южыкевіч’анку? Гэта інж. хіміі і вынаходніца. Зь ёй сталася няшчасьце. Уцякаючы ад бальшавікоў, яна задзержылася да часу ў сваіх знаёмых пад Варшаваю, а прыехаўшы ў Варшаву, якраз лучыла на мамэнт, калі ўзьнялося паўстаньне, дык яна не магла выбрацца з Варшавы і пасьля разам із таўпою была эвакуавана ў табар (падаю адрэс: Anna Južykiewič, Gemeinschaftslager I, Sportplatz, Stahmeln 10, bei Leipzig № 26 Hinderburg str. 96). Астроўскі казаў мне, што як вызваліць із табару за колькі дзён, а тымчасам ужо прайшло тры тыдні. Мо’ Ваша меў-бы яе наўвеце. Яна цэнны чалавек і сьвядомая Крывічанка. У менскай управе яна працавала ў ваддзеле контролі, а апошні час (звыш году) была дырэктаркаю бровару ў Радзівілімонтах ля Нясьвіжу. Прывітаньне бацьком.
Жыве Крыўя!
P. S. Мо’ ведаеце адрыс Пануцэвічаў, дык прышлеце мне.

Weissruthenisch
У Празе, 27.XII.44
Дарагі сябру,
я на сходах чысьціні мовы ў Вільні (гл. “Як правільна...”) * правілам аб *й* ня думаў абняць усіх чыста прыпадкаў пераходу *і* ў *й*, бо ўважаў, што ў правапісе гэта былі-б лішнія тонкасьці (прыпадкі Лёсікаўскія годзяцца ў экспэрымэнтальны**Маецца на** фонэтыку, а ня ў правапіс). Ішло мне аб тое, каб**увазе** правапісе прыпадкі пераходу *і* ў *й* абсалютна пэў**ныя**, незалежныя ані ад мясцовых, ані індывідуальны**Вільні (1937)** гаворкі і тут я на’т із асьцярожнасьці не дадаў **пераклад** = *такжа*. Апрача таго здавалася мне, што ё ня ў**Празе (1941)** не пераходзіць *і* ў *й*, тамчасам у такім-жа палажэ**брашуру** пераходзіць. **правільна**
Прачытаўшы цяпер Вашэцева сформулаваньне, я **пісаць** пэўнасьці, што яно ня лепшае за маё і дзеля таго **дзеяна ў** **Бэрліне** **Вашэці** **Вашэцева** **Вашэцевы** **Вашэцеў** **Вашэцам** **Вашэцем** **Вашэцеве** **Вашэцевай** **Вашэцевага** **Вашэцевае** **Вашэцевы** **Вашэцевых** **Вашэцевым** **Вашэцевымі** **Вашэцевую** **Вашэцевае** **Вашэцевай** **Вашэцевай** **Вашэцевай

Хачу адно зацеміць аб двух слабых мясцох у ім: **на беларускую** на практыцы ўстанаўляць, калі злуч *і* ё націсьнены, але гэта, хіба, на практыцы ня выкліча вайны; в) націсьненага *у* на пачатку слова (і складу) у нашай мове на'т у чужых словах ніколі ня бывае, перад ім заўсёды ёсьць *в* (*вурна, вуня*) і дзеля таго прыклад "*на стале стаяла урна*" трэба выкінуць.
Што да зацемкаў ("заўвагі") да правіла, дык можа толькі быць, што "У вершах дзеля рытмікі і па **самагуку** папярэдняга слова можа быць *у, і*, але ніколі па **сугуку** папярэдняга слова ня можа быць *ў, й*, бо ў такім палажэньню іх нельга вымавіць".
Што да паўстаньня літ. мовы, дык у вадказ пішу цэлы рэфэрат і ўжо дайшоў да канчатку (але не да канца). Сядня-заўтра скончу й пашлю.
Прывітаньне бацьком. Жыве Крыўя!
Я. Станкевіч

Weissruthenisch
Дарагі сябру!
1. NB. У мове ўкр. ё ня толькі *питву*, але такжа *шитву*, *їству*, *житву*. Синявський: Норми 118.
2. NB. Сядня я лучыў на картачку із запісамі слова **маць**, **маю** у Віцебску, дык можна думаць, што гэтая хорма будзе й па ўсёй Віцебшчыне.
3. **Спакмень**... "цйміць" паходзе ад *цемя*; **кеміць** і **кемны** паўсталі ад **цеміць** заменаю *це* на *ке*. Сваім паходжаньням *спакмень* із гэтымі ня мае нічога супольнага.
Спакмень < *sъ-po-k-m-епь*, у каторым карэнь *м*, суфікс *ень*, *sъ* і *ро* — прыстаўкі і *к* устаўное. Гэтае слова таго-ж караня, што й **прымета**, м. заметка, п. przymiot, przymiotnik. Ластоўскі на б. 551 падае *закмець*, *прыкмець*, паклікаючыся на Сержы. Дык было й *спакмець* і ўсе яны значаць "згледзіць, зацеміць".
Дзеля свайго ўстаўнога *к*, каторае стаіць у сувязі з такім-жа ўкраінскім і ведамае толькі паўдзённым гутаркам (няго-ж прыкмета ёсьць у Ігуменшчыне?), **спакмень** ня ёсьць вельмі добрым словам, але, як няма лепшага, а яно шмат лепшае за *прадмет*, каторае зусім дрэнь (створана Палякамі дзеля пераданьня лац. *об'ект*, у польскай мове добрае, але ўжо ў маск., куды было пазычана ад палякаў, прыстаўка *пре* можа адчувацца толькі як царкоўна-славянізм, якіх у Маскалёў шмат, а нашай мове, ня маючай царк. сл., яно ані не падыходзе), дык

я ўважаю, што яго трэба ўжываць. Была ў мяне калісь думка зрабіць яму маленькую опэрацу — выкінуць *к* (бо суфікс *-ень* зусім добры наш), але ўважаючы, што ня можна перарабляць створанага народам, я пакінуў гэтую думку.

Значыцца было-б так, што *спакмень*, хоць і не такое ўжо дзеля свайго *к* добрае слова, то ўсё-ж такі арыгінальна-прыроднае, хоць і з радні ўкраінцам і асобнае ад іншамоўных (дал'ь украінскага) назоваў гэтага пайма, дык, ужываючы яго, будзем маці ладную выгранку. Ведама, мусіць быць і **спакмены**, **спакменнасьць**, **спакменьнік**, але й толькі. **Набалюдаваючы** **назіраць** (аб гэтым я маю маленькае дасьледаваньне. У прышлю Вашэці), **заметить** і пад. — **зацеміць** і пад., а што да **паймо**, дык і значаньне “спакмець” далёкае ад "хоману" або "хомана".

4. Ваша абмыліўся: *ячме́нь* у вадз. ліку скланяецца ў сім ня ячме́ню (бо-ж матар’яльны спакмень, дык у р. мусіць быць *ячмя́ню*), дав. ячме́ню і г.д. — націск на ме́, а ў множным значаньні ячмянёў, ячмянём і г.д. Гэтак у нас ля Крэва, у Нікифоровым - Насовіча 496 пад “приварокъ” і Шатэрніка (“Пасьпеку вас жмені зь дзьве ячменю — запісана ў Старыні). Ня ноў, як гэтак будзе скланяцца й **спакме́нь**, р. -ме́ню, дав. -ме́ню і г.д., але мн. спакмяні́, спакмянёў і г.д.

5. Што да націску ў спакменьнікаў на -а́р, а ў гэтым ліку й *сьвятар*, дык ня ведаю. Колькіх прыкладаў на гэта мала. Надабе адумысловае дасьледаваньне, хіба, выходзячы із стану прасл. Магчыма, што ўжо хтось із чужнікоў яго зрабіў для моваў слав. наагул.

Я не этымолёг, але, здаецца мне, што немагчыма, каб у словах “**сьветлы**” й “**сьвяты**” быў тый самы карэнь. Тый самы карэнь можа мець розныя ступені самагукаў, але ў ступені **таго самога караня** ня ўходзяць *м* (ђ) і *ę* ці тыя, зь якіх яны паўсталі, знач. *oi* і *en*.

Дастаў я ўжо ліст Вашэцеў із 12.I., дзякуй. Адказую на пасьпешную часьць яго, знач. на вайсковыя тэрміны.

6. **Калённа, сьцяг, радоўка**. Аказуецца, што я запраўды ня ведаў, што такое калённа! “Сьцягам” “шеренги” не завеце, бо ўжо й так у вайсковай тэрмінолёгіі “сьцяг” будзе маці два значаньні — “баталён” і “знамя”. З матар’ялу, які маем, найляпей было-б “**калённу**” назваць “**гуж**”, а “**шеренгу**” — **радоўка**. А калі не, завеце **калённу** “**радоўка**”, але тады ня будзе слова для “шеренга”.

Lautsprecher, м. громкоговоритель., пол. głośnik. Вось што сулю. Маем словы: **гаворка**, **гутаркá**, **гамана** й **гамонка**.
Гутарка — гэта спаважная (“серьезная”) гаворка. Паміж *гаманá* й *гамонка* розьніца адно ў хорме — *гамонка* зьм. ад *гаманá*, а гэтыя абедзьве — **гамонка** й **гаманá** — або маюць значаньне зусім тое самое, што **гаворка**, або абазначаюць гаворку галасьнейшую. Але маем яшчэ **гоман**, каторы ў Шатэрніка значыць “говор, оживленный разговор” — у хаце гоман, аж нічога не разабраць; у Насовіча а) “говор, разговор вообще”, б) “шум, крик”; у Даля: “Гомонъ, м. юж. и зап. гомъ, галсъ, громкій говоръ, крикъ, шумъ” *. З гэтага і з таго, што самі беспасярэдне ведаем, можам тое й сказаць, што **гоман** у вадных прыпадках мае значаньне — “повышенный разговор”, а ў другіх адумысловы (спэцыяльны) “крык, шум”, паўсталы з галоснай, або на’т вельмі галоснай гаворкі. Цяпер пытаньне, як-бы мы (Крывічы) назвалі чалавека, ці снадзіва, снасьць, замяняючую чалавека, каторы робіць такі **гоман**, накш кажучы, як утварыць спакменьнік ад **гоман**? Зацемлю, што ад **абарона** ё народнае **абароньнік** (“защитник”), ад **абаранка** — народнае **абараньнік** — тый, што пячэ або прадае абаранкі. Дык той, хто робе **гоман,** будзе **гамоньнік**, -а. Зацемлю, што ад **гамана** й **гамонка** таксама будзе **гамоньнік**. Дык *Lautsprecher* — **гамоньнік**.
Зацемлю яшчэ: а) ёсьць і прозьвішча “Гоман”, б) радыё наагул добра было-б назваць **далягоман**.
У сувязі з гэтым дазволю сабе зацеміць, што маем ня толькі **гутарка**, але й **гутар**, наймя ё прозьвішча **Гутар** (у Наваградчыне). “Гутар” гадзілася-б вельмі да таго, каб ізь яго ўтварыць крыв. назоў для тэлефону — **далягутар**, як гэта ёсьцека панямецку *Fernsprecher*.
Зацемлю яшчэ да *Lautsprecher*: дзеля таго што ё прозьвішча “Гоман”, значыцца чалавека завуць **гоман**, дык *Lautsprecher* можна было-б зваць проста **гоман**, а каб адрозьніць ад звычайнага гоману, дык **іскрагоман** (ляпей праз злучок **іскра-гоман**), скланяцца будзе толькі другая часьць — іскра-гоману і г.д. А радыё можна было-б назваць **іскраўнік**, наагул ад іскра, прыр. ням. *Rundfunk*.
“Pionier” пачэс. *zákopnik*, ад *zákop* — акоп. Папольску *saper*, *pionier*. Ня ведаю, што пасуліць.
Feldwebel пачэску *šikovatel*, ад *šik* — “строй”. У нас магло-б быць

ладзьбіт або **ладжаньнік**, асабліва добра тады, калі-б **лад** значыла “строй”. У такім прыпадку **ладзіць** — “строить”, ладзіцца — “строиться”, **ладзьба** й **ладжаньне**, ад чаго **ладзьбіт** або **ладжаньнік**. А калі не, дык няхай будзе фэльдфэбэль.
Gefreiter — старшы жаўнер або дзесятнік.
Leutnant — ня ведаю.
Палкоўнік — хай так і застанецца, бо хіба-ж **полк** будзе.
“Гимнастёрка” — **вайсковая кашуля**, скарочана — **вайскоўка**.
Gepäck — гэта **дарожны** сутнік або **дарожны** кухрык, або **дарожны** зьвязак, хатуль. Дык ад **дарожны** надабе ўтварыць спакменьнік, будзе — **дарожнік** (суфікс **-нік**, як у **сутнік** і пад.). **Дарожнік** значыў-бы тый сутнік і пад., што бяром із сабою ў **дарогу**.
Рэквізыца й **асыгнаца** — ня ведаю, могуць так і быць.
Дадам ад сябе, што **путёвка** згодна із старой нашай моваю літаратурнай будзе **дарожны ліст**.
Аснада. *Ausrüstung* пачэску *výprava*, *výzbroj*, папольску: *uzbrojenie*, *zaopatrzenie* і чужое — *wyekwipowanie*. У нас часткава было-б **узброеньне**. Ластоўскі “снащаться” перакладае: **снадзіцца**, **аснада**, рас.: “оснастка”. А Даль *“оснастку”* гэтак выясьняе: ж. об. действіе по гл. *оснастить* и самыя вещи, коими судно снастится: снасти вервяныя, цепи, блоки, гаки (крюки), коуши (кованцы), паруса и проч.”
Снадзіцца, **аснада** таго-ж караня, што **снадзь**, **снадзіва** “инструменты, принадлежности, приборы”. З гэтага выглядае, што яго (аснады) Ласт. ня выдумаў і што **аснада** балей меней годзіцца для “снаряжения”. Падумаўшы, дадаю: годзіцца, калі ў “снаряжении” будзем маці дачыненьне зь менаванымі рэчмі, як струменты і пад., а калі не, дык аснаду ўжыць няможна. У такім прыпадку, калі ня будзеце маці чагось лепшага, дык ужывеце чахізм **выправа**, знач. тое, з чым жаўнера выпраўляюць. Зацемлю, што “снаряд”, з чаго “снаряжение”, значыць нават “вопратка”.
7. Хачу выясьніць некаторае незразуменьне мяне: 1) Калі я напісаў, што ня можна прыймаць слова дзеля таго толькі, што яно “падабаецца”, дык пішу ня дзеля таго што Ваша ўжыў слова “падабацца”, але дзеля таго, што ня маем даволі да яго прыйма аргумэнтаў у мове; 2) Пішучы, я маю наўвеце, што зь пісанага ў лістах мо’ давядзецца кажнаму з нас, а прынамся мне, з часам

скарыстаць пры якойсь моўнай пісьменнай рабоце, а дзеля таго, калі ўжо што ё на языццэ, дык пішу й тое, што Вашэці не патрэбна; дзеля таго-ж я пачаў пісаць алавіком пад кальку. А, з другога боку, пішацца ўсё-ж такі не да друку і шкада часу на абдумаваньне **хормы**. Дзеля апошняга ў маіх **лістох** зварочайце ўвагу адно на словы, а на іх парадак (сынтакс) не, за яго не адказую. Але за зьвярненьне ўвагі на словы — барбарызмы, хормы морфолёгічныя буду ўдзячны. Калі я Вашэці зьвярнуў на гэта ўвагу, дык ня дзеля таго, каб упікнуць, а каб памагчы тэй-жа мове. Якраз тут выйшла з гутаркі, дык зацемлю. Чаму Ваша ня ўжываеш “наўвеце” — “ввиду”? Гэта наша найчыстшае й найорыгінальнейшае слова, зап., між іншага, у Дзісеншчыне.
Гэтым цяпер кончу, а на іншае адкажу ажно за тыдзень, бо буду надта заняты.
8. Адно зацемлю аб Крывічу = Крыўя. Тут Ваша лучыў палцам у неба, бо: 1) Ня мае ніякага значаньня напісаньня **Крывичъ** ці **Крывичь**, бо спачатна *ч* заўсёды было мяккое, а як ацьвярдзела, дык было цьвярдым на канцу незалежна ад роду; гэта проста мяшаньне на пісьме знакоў ъ а ь — і толькі.
2) Няма нічога супольнага паміж *Пціч*, хоць-бы яна й была з *Птичья*, што ня мусіць быць, а *Крывіч*, бо ў *Крывіч* суфікс *іч* із **itjos*, а ў Пціч можа быць *ч* з толькі *к* (Птіца < *Птіка);
3) Няма нічога супольнага паміж **Русь**, **Рус**, **Русін** а **Крывіч**. Ад слова “Рус” паўстала з аднаго боку імя зборнае **Русь**, ад чаго пасьлей **Русь** = зямля Русі, а, з другога боку, сын Русаў — **Русін** (значыцца, адзін **Русін**, бо **-ін** паказуе адз. лік, а шмат — зборнае Русь, таксама як адзін **Ліцьвін**, а шмат зборнае *Літва* і такжа **весь**, **чудь**, **жмудь**, **голядь**).
Правільна **Русін**, але **рускі**, як **Сэрбін**, але сэрбскі (не сэрбінскі).
4) У Крывіч маем суфікс **-іч**, які абазна[ча]е сына і наагул патомка (як у Адамовіч, Станкевіч, Смоліч і пад.), а нідзе й ніколі словы з гэтым суфіксам ня сталі імянем зборным і ня сталі абазначаць Краю.
Лацінскі хронікар (дакладней: хронікар палацінску пішучы) ад назову народу Крывічы ўтварыў назоў зямлі *Crivitiae*.
Хормы Крывíч і **Крывічанíн** аднолькава добрыя, першая нормальная, а другая аналёгічная подле такіх, як **Палачанíн** і пад. Ад Крывічанін лепшая жаноцкая хорма **Крывічáнка**,

чымся **Крывічка** (ад **Крывіч**) і зразумела чаму, бо **Крывіч** гэта спэцыфічна муская хорма.
Крывія — гэта такая самая добрая хорма й слова-назоў, як **Італія**, **Гішпанія** і **зусім такая** як **Скандынавія**, а **Крыўя**, як **Італя**, **Гішпаня**, **Скандынаўя**, праваслаўе, **сям'я** (радзіма з гледзішча бацькоў або дзядоў, ад "семя") і **зусім добрая**.
Напару можна ўжыць і "Крывіччына", як Турэччына.
9. Выбачайце й ня злуйцеся (а я сядня ані ня маю злосьці). Уважаю за сваю павіннасьць да Вашэці і да нашае мовы й справы заявіць наступное: мне прыкра, калі Адамовіч піша падобныя рэчы, як гэта аб "Крывічу", што зусім у стылю Ластоўскага. Дык вось дзеля гэтага, а яшчэ балей дзеля таго, што Ваша маеш запраўдныя здольнасьці стацца поўным (а не палавічным, як цяперака) моваведам і найлепшыя маеш магчымасьці навукова пазнаць родную мову, Ваша павінен стацца запраўдным моваведам крывіцкім. У праціўным прыпадку аб нашай мове будуць пастанаўляць такія, як Жарскі (запраўдны лінгвісты, хоць слабы), што й дзесятае часьці ня мае ані тае здольнасьці, ані ініцыятывы, ня кажучы ўжо аб волі, упорыстасьці.
10. *Sprachführer* прайшоў ужо Смаршчка й міністэрства, выдавецтва здало яго ў друк. Якія "патрэбныя зьмены" зрабіў у ім Смаршчок, даведаюся, як адзяржу карэктуру, а дагэнуль ня можна нікому казаць ані аб Смаршчку, ані аб *Sprachführeru*.
11. У 1942—43 гг. Астроўскі быў за "Крывічоў". Калі ён цяпер проці, дык мо' ў яго ёсьцека якія маскаляфільскія тэндэнцы й пляны, што было-б у духу авантурніцкай натуры Ягонай.
У сувязі з гэтым цікаўна, што "Кіраўнік Вайск. Спраў БЦР палк. Езавітаў" рассылае паведамленьні, у каторых між іншага піша: "Генэрал Уласаў зрабіў абмылку, што гутарыць не з арганізацыямі, якія праўна рэпрэзэнтуюць народы Ўсходу Эўропы, а толькі з паасобнымі адзінкамі".
Прывітаньне бацьком! Жыве Крыўя!
19.I.45 Я. Станкевіч
Працяг будзе.

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

Анатоль Сідарэвіч

Вечна жывы Купала

Янка Купала. Выбраныя творы. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2002.

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ (нар. 1948) — філёзаф, літаратуразнаўца. Сталы аўтар “ARCHE”. Апошняя публікацыя ў часопісе — артыкул “Да гішпанскага сябра. Лісты пра мэтад і гонар” (ARCHE, №4-2001).

Дзіўная рэч: сёлета, калі адзначаецца 120-годзьдзе Янкі Купалы (не юбілей; юбілей усё-такі 125-я ўгодкі), ніводнае дзяржаўнае выдавецтва ня выпусьціла хоць якога зборніка выбраных твораў паэта. На паліцах кнігарняў я бачыў толькі кнігу санэтаў разам зь іх перакладамі. Наша родная дзяржава занятая больш важнымі справамі: ператварэньнем літаратурна-мастацкіх часопісаў у чатыры новыя “Политические собеседники” (меў рацыю Валянцін Блакіт, калі казаў, што дзеля гэтага й ствараецца холдынг Касьцяна), ліквідацыяй выдавецтва “Юнацтва”, скарачэньнем штату ў выдавецтве “Мастацкая

літаратура” — карацей, разбурэньнем даробку ўсіх паваенных гадоў.
Між тым, кнігі клясыкаў павінны быць на паліцах кнігарняў. Зайдзіце, да прыкладу, у якую варшаўскую кнігарню. Вы абавязкова ўбачыце тамы й томікі Міцкевіча, Славацкага, Норвіда, Жаромскага, Пруса, Рэймanта, Сянкевіча, Мілаша ў мяккіх вокладках — недарагія. Паляк, асабліва ж госьць, турыст заўсёды павінен мець мажлівасьць купіць тое, што ёсьць нацыянальнай каштоўнасьцю і як найлепш прэзэнтуе Польшчу. На сёньня мы маем тое, што маем: адзіная кніга выбраных твораў Янкі Купалы выйшла ў недзяржаўным “Беларускім кнігазборы”. Том даволі ёмісты: 31 улікова-выдавецкі аркуш. Укладальнікі Ўладзімер Гніламёдаў і Алеся Шамякіна імкнуліся прадставіць у зборніку вершы, паэмы, драматургію, публіцыстыку і эпісталярную спадчыну песьняра.
Ці мусіла кніга быць гэткай ёмістай? Ці прэзэнтаваны ў ёй Купала як вялікі паэт? Перш чым адказаць на гэтыя пытаньні, невялікае адступленьне.
Летась у часопісе “Тэрмапілы” акадэмік Радзім Гарэцкі пісаў, як падчас стварэньня беларускае Акадэміі навук Янка Купала ды Цішка Гартны выступілі супраць уключэньня ў яе склад аўтара клясычнае “Гісторыі беларускае літаратуры” Максіма Гарэцкага. Акадэмік патлумачыў гэткую непрыхільнасьць да ягонага дзядзькі тым, што той аднаго разу не сустрэў Купалы з Гартным на станцыі Пагодзіна ды асабіста не завёз іх у Горкі, дзе мелася адбыцца сустрэча менскіх гасьцей з выкладчыкамі й студэнтамі тамтэйшай сельскагаспадарчай вучэльні. Мабыць, М. Гарэцкі быў у той самы час на лекцыі ці сэмінары, і таму на станцыю прыехаў Юрка Гаўрук. Менскія госьці абразіліся, у Горкі не паехалі, а тысяча студэнтаў і выкладчыкаў марна чакалі іх у прызначаны час.

Такая была вэрсія акадэміка Гарэцкага. Прачытаўшы ягоны артыкул у “Тэрмапілах”, я паспрабаваў даць сваё тлумачэньне, чаму Купала й Гартны выступілі супраць кандыдатуры М. Гарэцкага. Ведама, выпадак на станцыі таксама адыграў сваю ролю, але трэба й “Гісторыю беларускае літаратуры” разгарнуць ды паглядзець, што Гарэцкі пісаў пра Гартнага й Купалу. Для вывучэньня пытаньня найбольш прыдатныя трэцяе (Вільня, 1924) і чацьвертае (Менск, 1926) выданьні. Дык вось, у

трэцім выданьні аўтар пашкадаваў для Гартнага асобнага параграфу: падвярстаў яго разам зь іншымі — і не на першым месцы — у разьдзельчык “Матар’ял аб творчасьці яшчэ некаторых нашаніўскіх і сучасных паэтаў і пісьменьнікаў”. У чацьвертым жа выданьні Гартны разам з Алесем Гурлом, Янкам Журбой, Міхайлам Грамыкам, Янкам Нёманскім, а таксама Міхасём Чаротам ды іншымі маладнякоўцамі падвярстаны ў параграфе “Пасьлякастрычнікавы пэрыяд”.
Ня мог не пакрыўдаваць на Гарэцкага й Купала. Узяць хоць бы тое, што ў трэцім выданьні “Гісторыі...” параграф пра яго — пасьля параграфу пра Коласа. Вартае ўвагі і тое, што піша Гарэцкі пра лірыку паэта: *“Лірычных вершаў у Купалы дужа многа (што шкодзіць іх мастацкай вартасьці)”*. Цікава таксама параўнаць, што піша М. Гарэцкі ў чацьвертым выданьні пра Максіма Багдановіча й Купалу. А ён адзначае высокую паэтычнасьць твораў Багдановіча ды наяўнасьць філязофскай думкі ці ня ў кожным зь іх. *“Творчасьць яго — праца мысьленьніка, апранутая прыгожай слоўнай шатай. Мысьлячы, ён усюды шукае красу, харaство, гармонію. Красу ён чуе сваёй прыродаю і цэніць сваім разьвітым розумам”*. Пішучы ж пра Купалу, ён ізноў адзначае, што ў паэта дужа многа лірычных вершаў, але здымае заўвагу пра тое, што гэта шкодзіць іх мастацкай вартасьці (Купала — ужо “народны паэт БССР”, і ягоныя творы па-за эстэтычнай крытыкай). Адзначаючы магутны талент Купалы, М. Гарэцкі ўсё ж ня мог стрымацца, каб не напісаць: *“Вершы пачатковай пары яго творчасьці, пэўна ж — слабейшыя па форме, затое сярод пазьнейшых вершаў ёсьць вельмі мастацкія”*. А ёсьць і ня вельмі мастацкія — можам зрабіць мы выснову. Дык вось, калі паўстала пытаньне, быць ці ня быць М. Гарэцкаму акадэмікам, Купала мог прыгадаць, што́ той пісаў пра ягоны творчы даробак. Ведама, і выпадак на станцыі Пагодзіна не забыўся.
Дастакова высока ацэньваючы сябе (а ён саманазваўся ўладаром беларускае песьні), паэт добра памятаў, як “крыўдзілі” яго крытыкі. Так, пішучы пасьля трохгадовага маўчаньня санэт “Для Бацькаўшчыны” (восень 1918), Купала перш-наперш пытае, як прымуць ягонае граньне на жалейцы “сваякі-суседзі”: *“Ці бласлявяць, ці ўтопчуць гідка ў гаць?”* Здаецца, і ня ўтоптваў ніхто ніколі ягонай песьні, была пара-другая ўшчуваньняў ад Сяргея Палуяна ды таго ж Багдановіча,

а вось, бач ты, запомніліся яны Купалу як зьнявага...

Акадэмік Гарэцкі расказаў мне, што пасьля таго горацкага эксцэсу М. Гарэцкі ўзяў ды выразаў з Купалавых кнігаў, што меліся ў яго, дэдыкацыі, пісаныя рукою паэта, і адправіў іх па пошце аўтару.

Што Купала — паэт вельмі няроўны, што высокія ўзьлёты майстэрства й думкі спалучаюцца ў яго з творчымі праваламі — ведае кожны, хто чытаў ягоныя творы ўзапар. Мусіць, таму й хадзіла ў народзе эпіграмка: “Янка Купала піша як папала” (Якуб Колас, паводле іншае эпіграмкі, “піша ўголас”). Неахвоту ж да чытаньня Купалы выхоўвала савецкая школа, бо ў чытанках друкаваліся ня самыя лепшыя з паэтычнага пункту гледжаньня і ня самыя шчырыя паэтавы творы. Сядзіць сялянскі сын ды чытае вершык: *“Я — калгасьніца // Маладая, // Жыву весела, // Ані дбаю”*. Бацька, які рапаруе хамут і слухае, пытаецца ў сына: “Хто гэто напісаў?” — “Купала”. — “Мантун твой Купала”. (“Мантун” у нас, у Задуб’і Ганцавіцкага раёну, — хлус). Мы й самі, жывучы ў вёсцы з пустапарожнімі працаднямі, адчувалі ніякаватасьць за народнага песьняра, калі чыталі пра тое, як *“На нашым полі, // Полі калгасным, // Дзянькі праходзяць // Весела, ясна”*. Мая цётка Прося сваю працу на калгасным полі ўголас параўноўвала з паншчынай і казала, што пры Польшчы ў суседняй Плотніцы (Пінскі раён) парабкі пана Завадзкага жылі лепш за калгасьнікаў. Гэта западала ў памяць, каб застацца ў ёй назаўсёды.

Запаўняючы школьныя чытанкі вершамі такога кшталту, бальшавікі правакавалі недавер ня толькі да Купалы — да ўсіх беларускіх пісьменьнікаў. (Тут дарэчы будзе сказаць, што і аўтарытэт настаўнікаў у вёсцы падаў у першую чаргу праз тое, што яны хлусілі дзецям і бацьком ды прапагандавалі атэізм.)

Праблема ідэалягізацыі Купалавай творчасьці адчувалася ўжо на пачатку 30-х гадоў. Каб апраўдаць паэта ў вачах беларускага чытача, у Заходняй Беларусі другі раз выдалі зборнік “Шляхам жыцьця” (1935; першы раз — у 1923 годзе), дзеля таго ж з адмысловымі публікацыямі выступалі Антон Луцкевіч ды іншыя крытыкі. Яны стваралі вобраз Купалы — пакутніка ад бальшавікоў. Гэта сталася магчымым, бо ў Заходняй ня ведалі абставінаў спробы Купалы забіць сябе. Дастаткова прачытаць артыкул А. Навіны (псэўданім А. Луцкевіча — **рэд.**) “Ян

Луцэвіч — Янка Купала (1882 — 25.VI. — 1932)" у "Беларускім звоне" ад 30 ліпеня 1932 году, каб пераканацца ў гэтым:
*І вось пачаўся чыста інквізытарскі націск на Купалу, каб ён "пакаяўся" ў сваіх "нацыянальных грахох" і адрокся ад сваей нацыянальнай ідэалёгіі. Купала мужна адбіваў гэты націск, але ўрэшце, бачачы, як паддаюцца вонкавай сіле другія, паддаўся ёй і ён — **апошні**. Купала падпісаў сваё "пакаяньне" адначасна з праф. Ігнатоўскім, трымаўшымся таксама дастойна да канца. Але тады ГПУ і зрабіла ім абодвум сьмяротны ўдар: на падставе "дабравольнага прызнаньня" ў "процісавецкіх грахох" абодва былі абвешчаны "грамадзкімі шкоднікамі", арыштаваны і пасаджаны за краты. Вось тады і выявілася духовая веліч гэтых стойкіх барцоў за беларускую Ідэю: у знак пратэсту проці фізычнага і маральнага гвалту, фізычных і маральных зьдзекаў над імі з боку абнаглеўшых маскоўскіх чырвоных нацыяналістаў, Купала і Ігнатоўскі **налажылі на сябе рукі**. Ігнатоўскі памёр у вастрозе; Купалу адратавалі, і цяпер ён жыве — на волі.*
Апошнім актам Купала сьцьвярдзіў сваю духовую веліч ня толькі як паэта, але і як грамадзянін. Як раней у паэзіі, так цяпер у грамадзкім жыцьці, выявіў сябе ў ім Князь-Дух. Счэзла колішняя разбежнасьць між Янам Луцэвічам і Янкай Купалай: **Купала — перамог**.
Гэткая ж вэрсія самазабойства У. Ігнатоўскага і замаху на суіцыд Я. Купалы выкладзена А. Навіной і ў артыкуле "Крытычныя моманты ў жыцьці Купалы і Коласа — паводле іх твораў" (часопіс "Novaja Varta", 1934, № 3). Пасьля словаў, што Купала быў адратаваны, крытык піша:
Купала астаўся далей жыць. Але якое гэтае жыцьцё, пры панаваньні таго ж процібеларускага курсу, каторы загнаў лепшых сыноў беларускага народу ў пятлю, а ў мінулым годзе прынёс Маскве новую гэкатомбу з паўцякаўшых з Польшчы ў Менск "грамадаўцаў" і "змаганцаў". Дык ня дзіва, што тая "іскра Божая", якая так цудоўна зьзяла ў душы Паэты, тухне з дня на дзень, і Купала ўжо нічога новага ня творыць. Ён замоўк, бо таго, што крыецца ў глыбіні ягонае душы, у Саветах голасна гаварыць нельга, а "казённым" пяўцом Паэта стацца ня хоча й ня можа.

Як бачым, у абодвух выпадках Луцкевіч ідэалізуе Купалу. Аднак сам Купала выбіваў козыры з рук ягоных

заходнебеларускіх прыхільнікаў і спачувальнікаў: ён стаў-такі “казённым” песьняром. (Так, ён не любіў Сталіна й ягоных парадкаў, пра гэта сьведчыў Броўка, але ж і маўчаў пра тое, зацята маўчаў, нават гуляючы ў лесе, маўчаў гадзінамі, як сьведчыў літфондаўскі лекар Якаў Нэйфах.) Па-другое, сам Купала напаў на свайго адваката й прапагандыста Баўпшасава, калі савецкі друк зрабіў Луцкевіча галоўным аб’ектам нападаў, якія падпявалі заходнебеларускія камуністы. Асабліва гэтакай выклікала лекцыя “Янка Купала як прарок адраджэньня”, чытаная ўвесну 1932 году ў Вільні, Рызе і Дзьвінску, апублікаваная ў жніўні і верасьні ў “Беларускім звоне”, пазьней як 23 верасьня выдадзеная (за грошы аўтара) як брашураю. Гнеў выклікала і непрыняцьце Заходнімі рэформы правапісу ў 1933 годзе. У той год, як Луцкевіч друкаваў сваю працу пра Купалу й Коласа ў “Новай Зямлі”, пясьняр публічна клеймаваў яго, ксяндза Станкевіча і *“паслугачоў польска-нямецкага фашызму ў Заходняй Беларусі”* ў артыкуле “Што было сном, тое стала явай” [1]. А праз год ён у артыкуле “Ўспаміны” ён назваў братоў Луцкевічаў *“бясчэсным”* і параўнаў іх з царскімі цэнзарамі [2].

І ўсё ж зробленае заходнебеларускімі крытыкамі мела свайго значэньня. Луцкевічава характарыстыка Купалы як прарока адраджэньня атрымала статус неаспрэчнай ісьціны і для нацыяналіста Станіслава Станкевіча, які не апублікаваная марксіста Антона Луцкевіча, і для пакручастага гісторыка Антона Адамовіча, якому былі ўласьцівыя антыкамуністычныя настроі [3]. Гэтая ж характарыстыка сталася й крыніцай Купалавых твораў для зборнікаў выбраных твораў эмігранты перанялі эстафэту ў заходнебеларускіх дасьледчыкаў Купалы. Яны выкарысталі таксама Купалавы творы з архіву Браніслава Эпімаха-Шыпілы, апублікаваныя ў 1929—1930 гадах. Вынікам іхняга “выбар паэзіі” Янкі Купалы “Спадчына”, які выйшаў у 1955 годзе пад шыльдаю Беларускага інстытуту навукі і мастацтва. “Выбар” гэты ўключаў інфармацыйную зацемку ангельскай, нямецкай, французскай ды гішпанскай моваў, уводнае слова ад БІНіМу, артыкул Ст. Станкевіча ды, ведама ж, паэтычныя творы паэта, што друкаваліся ягоных арыгінальных зборніках (“Безназоўным” закончыўшы), шостым томе Збору твораў (1932) ды іншых выданьнях.

1. **Рэцэнзія Баўпшасава на выданьні твораў Купалы ў 8-мым томе Збору твораў Купалы і ягоная зборніку “Шчыменнікі БССР” пад рэформе ніпрыняцьцё правапісу беларускай мовы (Менск, 1934).**

Спадзяюся, Купала не забавe будзе ціны і апублікаваная гісторыя гэтая нерэцэнзіі Мяне, якія “савецкія” Купалы, зь якімі ён пісаў, 1955 падпісаў, правакуе ён не рабіў, але й не выбіваўся супраць.

2. Цэлая

Паводле маіх падлікаў, зробленых на падставе Поўнага збору твораў, Купала напісаў 895 паэтычных твораў: 867 вершаў, 17 баек, эпіграмаў, шарадаў, у тым ліку твораў, укладзеных у цыклы, 24 паэмы [4] і 4 драматычныя паэмы. У “Спадчыне” зьмешчана 300 паэтычных твораў Купалы: 286 вершаў і 11 паэмаў і 3 драматычныя паэмы. У кнігазбораўскім томе налічваецца 290 паэтычных твораў Купалы: 285 вершаў, 4 паэмы (тры цалкам і адна — “Безназоўнае” — частка), драматычная паэма. Супастаўляючы “Спадчыну” і новы зборнік выбраных твораў, адзначым, што Б. М. Сачанка вершы ў 10 разьдзелаў, назвы якіх часткова супадаюць з назвамі разьдзелаў у зборніку “Шляхам жыцьця”, але ён падаў іх у адным разьдзеле і ў храналягічным парадку.

На жаль, выбіраючы творы для “Спадчыны” і для кнігазбораўскага тому, укладальнікі абедзьвюх кніг мала дбалі пра эстэтычныя крытэры сэлекцыі. Прыкладам, Купалу не ўдаваліся вершы, прымеркаваныя да датаў. Узяць “Памяці Шаўчэнкі (25 лютага 1909 г.)”, такі вершык не пусьціў бы ў друк ніводзін рэдактар, з эстэтычны густ. Не нашмат лепшыя й “Памяці Шаўчэнкі”, напісаны ў тым самым годзе з тае самае нагоды, як “Памяці Канапніцкай” і “Памяці Вінцука Марцінкевіча”, а таксама “Лірнік вясковы” з прысьвячэньнем “Памяці Ул. Сыракомлі”. Пра верш “Сьветлай памяці Ўладзіслава Эпімах-Шыпілы” можна сказаць, што сваімі мастацкімі якасьцямі ён не перасягае празаічнага нэкралёгу, пісанага рукою дасьведчанага Калі браць творы, у загалоўках якіх прысутнічае слова “памяці”, дык да творчых удачаў можна аднесьці толькі верш “Памяці Сяргея Палуяна”. Ужо першыя радкі гэтага верша жывое:

Куды ідзём?.. куды пракляцьце нас вядзе?
Якія далі здабываем?
Дзе гарт, надзея, вера ў будучыню — дзе?
Чым сэрцы, думы акрыляем?

Магчыма, некаторыя далейшыя радкі трэ было б адрэдагаваць, пэўныя — скасаваць, але відаць, што верш гэты напісаны ўражаным чалавекам, якога ўсхвалявала сьмерць на восем гадоў маладзейшага за яго С. Палуяна.

Пазбаўленыя ўласна эстэтычнага зьместу вершы, прысьвечаныя сучаснай беларускай літаратуры, часта выглядаюць **штучнымі, надтыньцьце царкаймаўкі і нязвыклымі. Станкевіча, Лучкевіча й Міцкевіча** — **нацыянал-фашыстаў** — **да** **паслугачамі фашызму (мусіць, польскага), нямецкага, а** **таксама** **Сыракомлі** **Ул. Сыракомлі** **Ул. Сыракомлі** **Ул.

калегам па цэху: “Аўтарцы “Скрыпкі беларускай” і “За пасьвяшчэньне, вершык харошы...”. Тое ж можна сказаць і пра верш “Прафэсару Б. Эпімах-Шыпілу з Новым 1910 годам”. Апісальным можна назваць верш “Ігнату Буйніцкаму”. Зноў такі, калі падыходзіць да твораў не з гістарычнага, а з эстэтычнага, дык ніякага эстэтычнага мастацтва не нясуць таксама вершы “Нашай Долі” й “Беларускай быццё суполцы “Загляне сонца і ў наша ваконца”. Іх нельга ўнаць зь вершам “Нашай Ніве”, які стаўся песьняю “Не ўпасьцю зоркі ў небе...”. З прысьвечаных угодкам “Нашай Ніве” нельга не згадаць і верша “Роднае слова” (1910), які істотна ўпадае хрэстаматыйнаму “Роднаму слову” 1908 году (“Мы слова, ты, роднае слова!”). Але ўкладальнікі зьмясьцілі ў адным томе выбраных твораў...

У савецкія часы была мода сьвяткаваць кожнае пацыбкоў, жыцьця ці дзейнасьці прыкметных дзеячоў (відаць, толькі ня прадчуваньне іх кароткага жыцьця, гвалтоўных сьмерцяў, будучай няславы) і кожныя ўгодкі “рэвалюцыйных датаў”. І Купала стаў пісаць панэгірыкі. У кнізе выбранага ня глядзяцца недарэчна. Такі твор, як “Цішку Гартнаму”, пацешыць самалюбства гэтага ня самага таленавітага. Ад нашаніўскіх паэтаў, мог аздобіць ягоны альбом, але ніяк не належыць да найлепшых у Купалавым даробку. Нельга назваць творчаю ўдачаю і верш “Наш летапісец”, прысьвечаны У. Ігнатоўскаму. Толькі гістарычна-літаратурную цікавасьць выклікае “Летапіснае”, прысьвечанае 10-м угодкам БССР. І нават самапрысьвячэньне “Шляхам гадоў”, якое Купала напісаў да 20-х угодкаў свае творчае дзейнасьці, можна ахарактарызаваць словам “юбілейшчына”.

З Купалавых вершаў, напісаных пасьля 1920 году, у кнігазбораўскім томе надрукавана трыццаць сем, у тым ліку з напісаных у 1930—42 гадах — адзінаццаць. Кідаецца ў вочы, што адсутнічаюць “На сьмерць Сьцяпана Булата” і “Голад”. Асабліва прыкрая адсутнасьць двух шэдэўраў, якія нарадзіліся ў апошні год перад усталяваньнем таталітарнае сыстэмы: на пачатку году — шэдэўр пралетарскае паэзіі “Дыктатура працы”, пры канцы яго — верш-разьвітаньне “Сыходзіш, вёска, зь яснай явы...”. У “Дыктатуры працы” вытрыманы і мэтар, і рытм, выдатны гукапіс, няма словаў неабавязковых, словаў са

У сьлед за БІНУМ. Ўсім адпаведна пагамаў “Забытую скрыпку”, “У Купальскую ніч”, “Чараўніка”, “Мы пацілуем чага й пару ліпоў”, а ня толькі тыя творы, што названы паэмамі ў Поўным зборы твораў.

зьмененым націскам, устаўленых у радкі дзеля запаўненьня пустаты, дзеля таго самага мэтру і рытму. І гэта дасягаецца пры жорсткіх правілах гульні: кожны зь пяці катрэнаў заканчваецца словамі “дыктатура працы”, а другі радок кожнае страфы рыфмуецца з чацьвертым. Верш напісаны на адным дыханьні. Даволі складаная задача стаяла перад Купалам і ў вершы “Сыходзіш, вёска, зь яснай явы…”, які напісаны пяцістопным ямбам, пяцірадкоўямі з рыфмоўкай abaab. І ніхто не аспрэчыць, што паэт выдатна вырашыў гэтую задачу. Дарэчы, я лічу, што ідэнтычныя першы і шэсьцьдзесят другі радкі гэтага верша павінны друкавацца ў той рэдакцыі, у якой яны запісаныя ў аўтографе (гл.: Энцыкляпэдычны даведнік “Янка Купала”, с. 581). У гэтым аўтографе папраўлена адно-адзінае слова, а першы радок чытаецца гэтак: “Як сон і смутны і жаданы…” (а не “Як сон маркотны, нежаданы”, што тыражавалася ўва ўсіх савецкіх выданьнях).
Савецкія ідэолягі пераконвалі нас, што й пры таталітарызьме Купала ствараў выдатныя вершы. Так зьявіўся панятак “ляўкоўскі цыкл” (гэта 18 вершаў, напісаных у 1935 годзе). Вось і ў 2002 годзе нам прапанавалі 7 вершаў зь ляўкоўскага цыклу: “Сосны”, “Госьці”, “Вечарынка”, “Алеся”, “Хлопчык і лётчык”, “Лён”, “Шоў я пушчаю…”. Добра, што не ўключылі “Беларусі ардэнаноснай” ці “Маё мне сонца правадыр”. Цікава, якімі эстэтычнымі вартасьцямі вызначаецца верш “Вечарынка”, у якім рыфмуюцца даяркі і сьвінаркі? Мажліва, гэты верш друкуецца дзеля яго пазнавальных вартасьцяў: зь яго можна даведацца, што на калгасных вечарынках у 30-я пілі і жанкі, і мужчыны, што на вечарынку прыходзілі ня сьнедаўшы і, пэўна ж, не абедаўшы (*“П’е суседка да суседа, // Хто ня сьнедаў, тут дасьнедаў”*). Ну, чым не матэрыял для артыкулу ў духу д-ра Ст. Станкевіча “Крытыка Купалам бальшавіцкага ладу”? Верш “Хлопчык і лётчык” безь пяці крамлёўска-сталінскіх радкоў чытаецца, а вось кананічны тэкст можа служыць узорам хіба што сэрвільнае паэзіі. А верш “Госьці” ўжо ў сярэдзіне 1950-х можна было аднесьці да ўзораў лякіровачнага мастацтва.

Мінаю тут “страшылку” “Шоў я пушчаю…”, у якой, як пісаў Мікола Грынчык, *“першыя 3 страфы асацыіруюцца са змрочнай рэчаіснасцю дакастр. часу, наступныя — з новай сацыяліст. явай”* [5], мінаю “палітінфармацыйны” верш “Іспанія будзе

свабоднай”, каб сказаць, што з прапанаваных укладальнікамі дзесяці вершаў 1930-х для зборніка выбраных твораў Янкі Купалы, якіх арганічна спалучаецца эстэтычнае, грамадзянскае і агульналюдзкае) больш-менш падыходзяць “Сосна” і “Алеся” ды “Генацвале”.

У цэлым адбор вершаў для кнігі пазначаны савецкім комплексамі. Але ж і ў савецкі час выйшаў быў адзін добры зборнік Купалавай паэзіі, укладальнік якога кіраваўся насамперш эстэтычным крытэрам. Дваццаць гадоў таму ў газэце “Літаратура і мастацтва” мелася рубрыка “Кнігапіс” (у ёй друкавалі здымкі кніг, а пад імі — анатацыі). Тады ж я хваліў у гэтай рубрыцы Алеся Разанава за тое, што ён пастараўся сабраць пад адною вокладкай найлепшыя з найлепшых дазволеных на той час цэнзураю паэтычных твораў Янкі Купалы. Гэты зборнік — “Выйдзі з сэрцам, як з паходняй!..” — выйшаў у сьвятое памяці выдавецтве “Юнацтва”. У той кніжцы было надрукавана 109 вершаў і 3 паэмы (“Курган”, “На Куцьцю” ды “Ў Купальскую ноч”, якую Інстытут літаратуры за паэму не ўважае). Ведама, можна было наракаць на паэта, што ў зборніку няма паэмы “Яна і я”, але больш важна адзначыць, што А. Разанаў зьмясьціў у ім толькі 14 вершаў, напісаных пасьля 1920 году, і зь іх толькі два — напісаныя ў 30-я гады. (“Дзе крыўда адвечная сьпела”, а таксама “нэўтральную” “Алесю” з усяго “ляўкоўскага цыклу”). Як гэта ўдалося А. Разанаву (Брэжнеў яшчэ жывы, Савелі Паўлаў з Іванам Антановічам ідэалёгіяй ды культурай з ЦК кіруюць!), лепш запытацца ў яго ды ў аўтара прадмовы Анатоля Вярцінскага.

Што датычыць падбору паэмаў, дык у кнігазбораўскім томе надрукаваныя, як кажуць, самыя-самыя: “Курган”, “На Куцьцю”, “Яна і я”. Зрэшты, аўтар прадмовы да кнігі — Ніл Гілевіч — знаходзіць высокія словы і для “Бандароўны”, і для “Магілы льва”. З драматычных паэмаў ён вылучае, акрамя “Адвечнае песьні”, “Сон на кургане”. На жаль, апошняй не знайшлося ў кнізе месца. Вось і думаецца: калі б укладальнікі не забываліся на словы М. Гарэцкага пра тое, што “лірычных вершаў у Купалы дужа многа” і што гэта шкодзіла іх мастацкай вартасьці, хапіла б месца і “Сну на кургане”. Магчыма, і “Раскіданаму гнязду”.

Том выбранага мог бы аказацца больш цэльным, калі б ягоныя

5. Янка Купала: Зянонкі лапедычны даведнік. Менск, 1986. С. 668.

ўкладальнікі ўлічылі досьвед складальнікаў “Спадчыны” 1955 г. і “Выйдзі з сэрцам, як паходняй!..”. Укладальнік першага зборніка, ігнаруючы паэзію таталітарнага пэрыяду, мо зашмат увагі аддаў сацыяльнай тэматыцы ў творчасьці Купалы, а ўкладальнік другога ня мог надрукаваць забароненых у БССР вершаў песьняра. У У. Гніламёдава ды А. Шамякінай меліся магчымасьці пераадолець недахопы абедзьвюх кніг-папярэдніц і стварыць кнігу, са старонак якое б Купала паўставаў як сапраўды вялікі паэт.
А скончу тым, з чаго пачаў. Нам трэба, каб добрыя кнігі выбраных твораў клясыкаў, а насамперад Купалы й Коласа, заўжды ляжалі на паліцах кнігарняў. Марна спадзявацца, што пра гэта паклапоціцца дзяржава.

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/01/20**
[image]

Даніла Жукоўскі

Погляд сьпераду і погляд ззаду

Леанід Маракоў. Непамяркоўныя. Т. 1, 2, 3. — Менск: Athaeneum, 2001.

Вінцэсь Мудроў. “Іду на таран”, “Калодзеж”, “Дарога ў 20 крокаў”. http://www.knihi.com

---

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ (нар. 1969) — публіцыст, крытык літаратуры. Выпускнік Ленінградзкага тэхналягічнага інстытуту імя Ленсавету. Сталы аўтар “ARCHE”. Апошняя публікацыя ў часопісе — артыкул “Літаратура для добраахвотнага чытаньня” (№2 за 2002 г.).

Адціснутая біялогіяй з пазіцыі навукі нумар адзін, фізіка апошнім часам збліжаецца з філасофіяй. Адклаўшы ўбок інтэгральныя раўнанні, “яйкагаловыя” заняліся агульнымі пытаннямі развіцця і эвалюцыі, вылучыўшы, між іншым, азначэнне панятку **падзеі**, аднолькава прыдатнае да выкарыстання што ў дакладных навуках, што ў гуманітарных. Падзея выклікае змену кірунку эвалюцыйнага развіцця сістэмы. У прамежку ад падзеі да падзеі кожны стан задаецца пачатковымі ўмовамі і пралічваецца з поўнай дакладнасцю. Калі ж настае момант падзеі, вынік загадзя невядомы, прадказаць яго з папярэдняга развіцця са стопрацэнтнай дакладнасцю немагчыма. Гэтак у фізіцы [1]. У чалавечым жыцці і ў мастацкай літаратуры з падзеяй спалучаюцца пытанні ўдзелу, адказнасці і салідарнасці, уяўленні пра паходжанне сілаў, якія кіруюць жыццём, пра межы ўдзелу і шырыню кола адказных. Ісландскія сагі апавядаюць пра ўсе найважнейшыя падзеі ў жыцці пэўнай супольнасці на працягу нейкага часу. Сёння поле ўвагі пісьменнікаў нашмат шырэйшае, але павароты пункты развіцця нязменна выклікаюць цікавасць. Адвечная праблема свабоды выбару вымушае аўтараў вызначыцца: ці дапускаць увогуле — і калі дапускаць, то ў якім выглядзе — гэтыя дыскусійныя матэрыі ў тэкст.

У цэнтры дыялектычнасці — асоба героя. Вырашэнне пытанне ўдзелу героя ў лёсавызначальных падзеях адмоўна, частка пісьменнікаў проста не ўмешваецца ў ягонае жыццё. На ўзроўні існавання індывіда падзеі адмаўляюцца ў прынцыпе: асоба не можа браць у іх чынны ўдзел.

Гаворка не пра замкнёнасць у штодзённым побыце, а пра стаўленне да ініцыятывы героя, ягонай здольнасці рабіць свой выбар. У апавяданні У. Някляева “Хайбах” выключна жудасныя здарэнні не мяняюць напрамку развіцця падзей, якія ідуць, нібы наканаванасць. Герой выглядае нявольнікам лёсу — ён удзельнік чужых войнаў, няздольны (нават дзеля таго, каб выратаваць жыццё) вырвацца ў мірны свет, які мог бы стацца ягоным светам.

Такі фаталізм паўстае з нясталасці героя, няздольнасці адрозніваць добрае ад благога, істотнае ад дробязнага. Таму й ідзе ён у апошні бой у Чачэніі, не палічыўшыся з

[1] "Паводле азначэння падзеі не могуць выводзіцца з дэтэрміністычнага закону… Падзея, як бы мы гэта ні разумелі, азначае, што тое, што адбылося, не абавязкова павінна было адбыцца". Пригожин И., Стенгерс И. Время, хаос, квант. Пер. с англ. Москва: Издательская группа "Прогресс", 1994.

папярэджаннем, атрыманым раней ад былога баявога таварыша, а цяпер — праціўніка. Таму й спатыкае страшэнны здзек і калецтва ды гіне потым на радзіме ад рук наймітаў-бандытаў, нікчэмны, пазбаўлены ўсяго, што людзі лічаць каштоўным. Няма ў ягонай біяграфіі ніводнага моманту, калі б ён нешта важкае вызначыў сам.

Удзел у фармаванні ўласнага лёсу ў такім ракурсе выглядае немагчымым, адказнасць са сферы ўчынкаў перамяшчаецца ў сферу асабістых маральных перакананняў. Выбар захоўваецца адно ў форме самаацэнкі і не адбіваецца на паводзінах. Спачуваць такому чалавеку яшчэ можна, хаця б на грунце агульначалавечай еднасці, але салідарнасць з ім наўрад ці магчымая.
Больш вытанчаны спосаб ставіць пад сумнеў свабоду асобы перад сілай лёсу — тактыка расчаравання. Героя праводзяць праз выпрабаванні, змушаюць напружвацца, рабіць выбар, цярпець паразу, каб потым давесці, што ўсе высілкі былі марнымі, бо вышэйшая сіла загадзя накрэсліла ягоны жыццёвы шлях. Свабода выбару выглядае як прыгожая, але памылковая канцэпцыя, кшталту флагістону ці вечнага рухавіка. Гэтак, на жаль, часта выглядаюць героі беларускіх гістарычных твораў — у нашай гісторыі лёгка адшукаць змрочныя прыклады.
Сярод тых, для каго чалавек як крыніца падзеі — рэч магчымая і вартая разгляду, можна выдзеліць два тыпы. Адны перакананыя, што чалавек здольны ствараць падзеі аднаасобна і адпаведна здольны ў найвялікшай ступені кіраваць сваім лёсам, іншыя разглядаюць падзею выключна як феномен калектыву, улады, сістэмы.
Леанід Маракоў прыхільнік першага падыходу. Вінцэсь Мудроў — другога. Аб'ядноўвае іх наяўнасць у творах персанажа, якога ўмоўна можна назваць **Прадстаўніком улады**. Гэта агент, або сімвал, вялікае моцы, якая выпрабоўвае волю і здольнасць герояў кіраваць сваім лёсам. Ён можа быць даішнікам, вайскоўцам, працаўніком выканкаму, а можа і бандытам-рэкецірам, ці мытнікам-вымагальнікам ("Інтуіцыя"), ці ўвогуле статуяй Айца ўсіх народаў ("Дарога ў 20 крокаў"). Істотна тое, што ён увасабляе моц Сістэмы, якая імкнецца падначальваць асобныя чалавечыя існаванні. Гэта супольнае, далей — розніца. Падзеі ўздзейнічаюць на герояў апавяданняў Маракова

жорсткімі адраснымі выпрабаваннямі, і тыя таксама адказваюць дзеяннямі. Абставіны не дазваляюць героям адрэфлексаваць кожнае здарэнне пад шоргат восеньскага лісця. Яны раскрываюцца перад намі ва ўчынках, з якіх мы даведваемся і пра іхнія ідэалы, і пра разуменне навакольнага свету.
У творчасці Маракова вылучаюцца тры галоўныя тэмы: сталінскія рэпрэсіі; савецкае грамадства пасля Сталіна, сужыццё ў ім пацярпелых і катаў; постсавецкі “перыяд пачатковага назапашвання капіталу”. Усе апавяданні аб’ядноўвае тэма супрацьстаяння асобы і ўлады (адсюль і назва “Непамяркоўныя”). Улада гэтая — не безаблічная моц, а людзі, якія свядома выконваюць сваю ролю.

Героі імкнуцца займець жаданае месца ў грамадстве, а грамадства актыўна адмаўляе ім у праве на гэта. Сітуацыя аднолькавая, сродкі ўціску розныя: сталінская машына рэпрэсіяў, брэжнеўскія “органы бяспекі” ці крыміналітэт часоў перабудовы. Амбіцыі герояў не надзвычайныя. Гэта людзі, чые жыццёвыя арыенціры вызначае не манія велічы або ўладалюбства, а імкненне жыць годна, незалежна ад чыіхсьці капрызаў — у светапоглядна-інтэлектуальным, эмацыйным, фінансавым плане.
Маладыя пісьменнікі даваеннай Беларусі, ахвяры рэпрэсій ці прадпрымальнікі апошняга дзесяцігоддзя аднолькава імкнуцца рэалізаваць свае мары, не ставячы за мэту кінуць выклік грамадству ці ўладзе. Іхні лёс лішні раз даводзіць: прынцыпы павагі да асобы ў гэтай краіне пераважна заставаліся толькі лозунгамі. Вызначаючы асабістую годнасць у якасці каштоўнасці, чалавек аўтаматычна абірае сабе лёс змагара. Заслуга Маракова ў тым, што ён даводзіць: такое змаганне, калі яно вядзецца асэнсавана, дае чалавеку шмат. Нават калі яно канчаецца трагічна.
Праграмным можна лічыць невялікае апавяданне “Канікулы”. Ягоныя героі — маладыя беларускія пісьменнікі, якія адчуваюць навіслую над імі лапу НКВД. Выпадак перашкодзіў галоўнаму герою выкарыстаць падчас арышту спецыяльна набыты на такі выпадак пісталет, але выпадак не зламаў маладых людзей, якія не здрадзілі сваім таварышам.
У апавяданні “Настальгія” галоўны герой, эмігрант, пад чужым

прозвішчам едзе ў СССР і сустракае там смерць на роднай зямлі. Але паездка ў значнай ступені сталася здзяйсненнем ягоных найглыбейшых мараў: ён пабачыў маці, Радзіму, перахітрыў на мяжы і ў Маскве гэбістаў і нават пабачыў у больніцы свайго былога ката, сімвалічна адпомсціўшы яму. У “Яблыні” былы вязень ГУЛАГу забівае даносчыка і гіне сам — але з пачуццём выкананага абавязку, лёгкай душой і радасцю ў сэрцы.
Героі не проста трапляюць пад каток гісторыі, але выбіраюць, як дзейнічаць, творачы свой уласны лёс. Гэта асабліва выявілася ў апавяданнях “бізнесовага” цыклу. У лагерным цыкле выбар — часам выбар безнадзейна вузкі, як у тых жа “Канікулах”, — застаецца матываваным выбарам самога героя, пазначаючы гэтым зігзаг лёсу, стварэнне падзеі:
Не ведаў Андрэй Александровіч, што сам ён выжыў толькі таму, што Тодар Кляшторны… Валеры Маракоў… і іхні сябра Васіль Каваль за год катаванняў у “амерыканцы” так і не “ўспомнілі” яго прозвішча.
Акт выбару робяць і чытачы Маракова. Ім прапануецца вызначыцца, ці істотныя для іх катэгорыі гонару, годнасці, незалежнасці, свабоды. Гэта наймацней адчуваецца ў апавяданнях пра часы сталіншчыны: кожнае з іх мае нейкую прывязку да сучаснасці. Сталінскія злачынствы не адышлі ў нябыт, сцвярджае аўтар. Яны засталіся з намі і ўплываюць на грамадства дагэтуль. Падзея, якая закрэсліла б вызначаны імі шлях эвалюцыі грамадства, яшчэ наперадзе.

Цэнтральнае месца займае апавяданне “1975-ы”. Галоўнаму герою, у якім пазнаюцца рысы аўтара, даводзіцца за кароткі час пабачыць розныя бакі савецкае рэчаіснасці, такія, з якімі чалавек мог і за ўсё жыццё не сутыкнуцца. “Прафілактычная гутарка” ў КДБ за цікавасць да Салжаніцына, падарожжа ў Маскву і нечаканае знаёмства з бессаромным светам высокае наменклатуры, паездка ў Карэлію і магчымасць на свае вочы ўбачыць палітычных вязняў ды паглядзець свабоднае фінскае тэлебачанне… Не тое каб патаемныя, але прыхаваныя бакі савецкага жыцця праходзяць перад дапытлівым маладым хлопцам, незваротна робячы яго ворагам рэжыму.
Пісьменнік ушчыльную падыходзіць да раскрыцця таго, як псіхалагічныя траўмы ахвяраў і паслугачоў рэжыму паўплывалі

на фармаванне менталітэту савецкага чалавека “эпохі развітага сацыялізму”. Фармаванне гэтага менталітэту, паводле Маракова, таксама адбываецца ў выглядзе ўдзелу — удзелу ў крывавай спадчыне. Верны свайму credo, аўтар паказвае гэта праз учынкі і падзеі (юнацкае дысідэнцтва ў “1975-м”), праз сутыкненні людзей, рубам ставячы пытанне пра адказнасць. Свядомыя людзі, кажа пісьменнік, дзейнічаюць з уласнай волі. Кат катуе, бо хоча катаваць, “чаўнок” рызыкуе, бо вырашыў рызыкаваць. Ніякай містыкі, ніякай абстракцыі. Леанід Маракоў не пакідае сумненняў у непазбежнай адказнасці кожнага за свае учынкі, у здольнасці чалавека вызначаць свой лёс.
А вось у Вінцэся Мудрова дзейнічаюць зусім іншыя людзі. Збольшага яны не дзейнічаюць, а функцыянуюць.
У ягоным апавяданні “Іду на таран” героі вядомай казкі карантышкі на паветраным шары трапляюць у паветраную прастору Беларусі. На базе СПА пачынаецца паніка, бо стан яе бясконца далёкі ад баявой гатовасці. Паказаныя з найвышэйшай ступенню гратэску вайскоўцы звяртаюцца па дапамогу да хлопца, які ў перабудовачнай мітусні захапаў сабе самалёт. Калі не ўдаецца знішчыць таямнічы аб’ект стрэламі з кулямёта, лётчык мужна ідзе на таран. Карантышкі гінуць. Вайскоўцы паведамляюць, што гэта была амерыканская шпіёнская акцыя.
Свядомыя дзеянні персанажаў (не хочацца называць іх без патрэбы героямі) вызначаюцца самымі прымітыўнымі матывамі — голадам, юрам, пачуццём небяспекі. У астатнім яны дзейнічаюць як шрубкі незразумелага ім механізму, не- або напаўсвядома функцыянуюць як чальцы грамадства, начальнікі на адказных пасадах, вайскоўцы і да т.п.
“Іду на таран” — шматгранны твор, да таго ж вострасатырычны. Аўтар пакідае магчымасці для разнастайных інтэрпрэтацый. Знаёмства з іншымі тэкстамі В. Мудрова пераконвае, аднак, што ягоны сарказм не распаўсюджваецца на вышэйзгаданую асаблівасць паводзінаў ягоных персанажаў. Ягоную пазіцыю лепей акрэсліць словам “спачуванне”.

У нестандартнай сітуацыі персанажы нагадваюць робатаў. Падзея ўрываецца ў прастору іхняга існавання, але не выклікае спробы суўдзелу. Яны спачатку дранцвеюць, потым аднекуль з

пазасвядомасці загружаецца невядома кім распрацаваная праграма, і… яны далей выконваюць свае функцыі. Як грамадскія казуркі.
Адказнасць закранае героя Мудрова толькі часткова. Яна кладзецца найбольш на абстрактна-безаблічную Сістэму, крыніцу праграм-загадаў, якая ў Мудрова заўсёды застаецца за кадрам. (У “Калодзежы”, што праўда, на сцэну выходзяць “кіраўнікі раённага звяна”, але колькі іхняе рэальнае дзейнасці мы бачым?)
Калі ж надараецца сапраўды цяжкі момант, героі пад іранічным вокам аўтара звяртаюцца да рэзерваў маладаследаванай народнай душы. Таямнічыя сілы абуджаюцца, ствараюць цуд, ратуюць Сістэму — і засынаюць ізноў.
Прыхаваная за сатырычным флёрам містыфікацыя грамадскіх стасункаў у Мудрова ці іх рашучая дэмістыфікацыя ў Маракова выразна ўплываюць на мову твораў. У Маракова яна лапідарная, ашчадная. У Мудрова кожнае слова моўных карункаў нясе індывідуальны сатырычны запал.
“Лейтэнантавы голас зноў казытнуў сапрэлае вуха”.
Прысутнасць у тэксце дэталёвых апісанняў другасных справаў выдатна падкрэслівае іманентную несамастойнасць герояў Мудрова. Ад іхняй волі нішто значнае не залежыць, паводзіны жорстка дэтэрмінаваныя — індывідуальнасць можа выявіцца адно ў справах другасных, нязначных.
Найбольш актыўныя персанажы аповесці “Іду на таран” — не людзі. Голас *“скаланае мембрану”*, душа *“адтайвае”*, зубы *“йграюць польку”*, паветра тушыць запальнічкі і даносіць — да вушэй (!) — пытанні, порсткі ветрык даймае карацельку-спадніцу… Гэтая адушаўлёная анатомія, гэтая РЭЧА-ІСНАСЦЬ ёсць прасторай адноснае свабоды. Што ж тычыцца людзей, то яны — шрубкі Сістэмы. Вартыя апісання хіба іхнія рукі, азадкі, сцёгны, вочы, вусны… Адносную свабоду людзі маюць толькі на ўзроўні задавальнення першасных інстынктаў: голаду, юру, сну.
Падзея ў Мудрова паўстае як праява пазасістэмных сілаў (таксама амаль ананімных, абстрактных: у “Іду на таран” — казачных персанажаў, у “Калодзежы” — замежных, у “Дарозе…” — з мінулага). Гэта — умяшанне ў функцыянаванне Сістэмы, канфлікт дзвюх Сістэмаў, але не вынік дзеяння асобаў. Воля асобнага “малога” чалавека не ў стане парушыць

наперад зададзенай прадвызначанасці.
Ніхто не будзе аспрэчваць, што здольнасць асобнага чалавека супрацьстаяць сістэме вельмі абмежаваная. Але ў Маракова сутыкненне некалькіх асобаў можа выклікаць стварэнне незапраграмаванай сітуацыі (як у “Мальбара-Лайтс”: герой трапляе ў лапы вымагальнікаў, але ратуецца і нават знішчае бандыцкае логвішча), хоць Сістэма нібыта і выключае такую магчымасць. Здарэнне, якое выбіваецца з Сістэмы ўжо тым, што не паддаецца прагназаванню, кваліфікуецца як найвышэйшая пагроза. Таму й гінуць няшчасныя карантышкі.
Усё гэта цесна лучыцца з пытаннем волевыяўлення, свабоды выбару і, адпаведна, адказнасці. Хто забіў паветраплавальнікаў-карантышак? У кантэксце твору пытанне выглядае недарэчным. Яны загінулі? Няма сумневу. Хто іх забіў?.. *“Хто сшыў касцюм, я ў вас пытаюся?!”* — усклікаў карыфей савецкай сатыры Аркадзь Райкін.

Нават у быццам бы самастойных, выкліканых асабістымі амбіцыямі ўчынках героі Мудрова застаюцца паслугачамі Сістэмы. Апошнія радкі апавядання “Іду на таран” пры ўсім гранічным камізме не могуць схаваць уражання, што адбываецца чарговае забойства, на гэты раз — рытуальнае. Выдрапваючы надпіс “Made in USA” на корпусе лятальнага апарата, палкоўнік Бурзачыла не толькі змагаецца за ўзнагароду. Ён забівае прывід падзеі. З’яве надаецца выгляд, зразумелы на мове Сістэмы. Падобная сітуацыя ў апавяданні Маракова “Дарвін не памыляўся” (або “Іваноў” // Крыніца. 2001. № 1.) павернута зусім іншым бокам. Падзея (паспяховыя ўцёкі вязня з лагеру) пакідае шнар на твары Сістэмы ў выглядзе выпаленага на фанеры ягонага партрэта, вывешанага адміністрацыяй на лагернай сцяне як напамін ахове. Адметна, што, як зазначае аўтар, апавяданне грунтуецца на рэальнай гісторыі.
Сістэма не любіць падзеяў. Вострая рэакцыя ўладнай машыны не толькі на рэальную, але нават на патэнцыйную падзею выяўляецца і ў зацятасці, з якой пераследуюцца іншадумцы-непамяркоўныя ў Маракова, і ў палахлівай бессардэчнасці персанажаў Мудрова. Чалавеку дакрануцца да падзеі ці, крый Божа, стварыць яе небяспечна. Маракоў апраўдвае такую рызыку, лічыць адпаведны спосаб паводзінаў адзіна вартым

чалавека. Мудроў схільны да суцэльнага песімізму. На ўсё жыццё Матруны Апалонік, галоўнай гераіні “Калодзежу”, наклала адбітак здарэнне з часу акупацыі: нямецкі доктар добра паставіўся да яе і ейнае сястры. Потым яго забілі партызаны, а на Матруну лягло чорнае таўро. На ўсё жыццё — бо месца на падзеі ў ім больш не знайшлося.
Мітусня начальства вакол падзеі, якая МОЖА АДБЫЦЦА (магчымы прыезд сына таго немца), якасна не адрозніваецца ад мітусні герояў апавядання “Іду на таран”. Выразней відаць у “Калодзежы” еднасць улады з народам, які на свой лад, але таксама працуе на сістэму. У гэтым выпадку — кідаючы свой камень у без віны вінаватую Матруну Апалонік.
Героі Маракова таксама нясуць свой крыж, але ў іхнім светапоглядзе няма пасіўнасці. Толькі адна падзея мае канчатковую моц, кладзе крэс самавызначэнню асобы — гэта смерць. Прысутная ва ўсіх апавяданнях, гэтая тэма хіба найвыразней гучыць у “Настальгіі”.
Іншая светапоглядная пазіцыя патрабуе іншай мовы. Акцэнтуецца тое, што можа мець непрадказальны вынік. І важна, каб апавядальнік быў пераканаўчы ў сітуацыі выбару паміж аднолькава магчымымі здарэннямі. Неабходна абмежавацца тым, што чытач можа “ўбачыць на ўласныя вочы”. Казытанне сапрэлага вуха было б тут не да месца: учынкі маюць перавагу перад інтымнымі адчуваннямі. Кожная дэталь павінна быць матэрыялізаванаю, павінна намацоўвацца, верыфікаваць сама сябе, бо ўсё ў апавяданнях ёсць удзельнікам непаўторнага працэсу.
Маракоў выконвае гэтыя патрабаванні мо нават залішне дакладна. Даведзеная да мяжы магчымага лаканічнасць надае кожнай дробязі важкасць, у абавязковым парадку далучаючы яе да дзеяння. Усё спрасавана да апошняй мяжы, мінімум лішніх словаў. Такім чынам пісьменнік падкрэслівае для чытача: гаворка ідзе пра рэчы надзвычайнай важнасці.

Вышэй вялося пра тэму адказнасці ў творах Маракова. Злачынствы вымагаюць пакарання. Але салідарнасць з героямі нараджаецца не толькі з абстрактнай справядлівасці, але й са старанна выпісанага дадатнага вобразу. Дадатныя героі пры ўсёй незвычайнасці іх лёсу — гэткія ж людзі, як і мы. З імі лучацца такія каштоўныя для нас справы, як развіццё

беларускай культуры, стваральная праца, нацыянальная годнасць. Але самымі прыцягальнымі іх рысамі ёсць пачуццё ўласнае годнасці і цэльнасць асобы, з якіх натуральна (але не заўсёды, не абавязкова) выплывае сацыяльна значная актыўнасць. Пачуццё ўласнае годнасці нараджае тую нязмушаную шчырасць, якая выклікае сімпатыю і пачуццё салідарнасці.

За мудроўскімі кепікамі ляжыць безнадзейнасць. У Маракова, нягледзячы на жорсткасць апісаных жыццёвых калізій, амаль усё магчыма, абы людзі захацелі. Падыход Мудрова — ад антысаветчыкаў-эмігрантаў, ад слыннага "Салдата Чонкіна": сатырычны запал твору скіраваны на чытача, зануранага ў жыццё стабільнага эвалюцыйнага грамадства, дзе кожны наступны стан, як і папярэдні, вызначаны пачатковымі ўмовамі. Ініцыятыва асобы тут аніяк не можа граць ролю. Але ж часы такога грамадства — прайшлі!

У гуманістычным запале, з якім Вінцэсь Мудроў малюе постаць Матруны Апалонік, увасобілася ідэя А. Салжаніцына "жить не по лжи". Карантышкі з апавядання "Іду на таран" увогуле ўвасабленне нявіннасці і слабасці. Унутраная свабода — мяжа эмансіпацыі асобы ад усёмагутнае Сістэмы. Прыгожа на свой час. Але ж Сістэма ўжо даўно не тая! У фінале "Дарогі ў 20 крокаў" пісьменнік паказвае магчымасць адыходу ад пасіўнага існавання. Трахім з кувалдай ідзе нішчыць помнік "Айца ўсіх народаў", які стаў прычынаю смерці чалавека пасля таго, як статую ў часе перабудовы выцягнулі з балота паляўнічыя за каляровым металаломам. Герой робіць учынак, але гэта толькі псіхалагічны пералом, сцверджанне нязгоды са старым ладам жыцця, а не свядомае дзеянне ва ўласных мэтах.

Творы ж Леаніда Маракова цалкам належаць "постсавецкаму часу". Нават у цыклах, прысвечаных мінуламу, герой — чалавек дзеяння, самастойны ў сваім выбары, а савецкія рэаліі апісваюцца як нешта канчаткова прамінулае. "Бізнесовы" ж цыкл расстаўляе кропкі над "і". "Самы Ніжні Тагіл", "Інтуіцыя", "Пах Энвула" напісаны чалавекам, які дакладна ўсвядоміў сваё месца ў сацыяльнай іерархіі — прыналежнасць да сярэдняга класу. З гэтай пазіцыі нават на цяпершчыну Маракоў глядзіць як на нешта трохі прамінулае. Ён увесь там, дзе палымнее светлая будучыня "ягонага" стану.

Вінцэсь Мудроў відавочна глядзіць на дзень сённяшні і ўчарашні зусім іначай. Ягоныя творы ўваскрашаюць у памяці інтэлігентаў-дысідэнтаў з іхнім высокім ідэалізмам, бедаваннем над станам народу, сарказмам у адносінах да ўлады. Смех быў іхняй адзінай зброяй, і як зброя апошняга шансу ён **быў** вельмі эфектыўны. Ці настаў час адкласці гэтую зброю разам з калектывісцкімі забабонамі ды паставіць у покуць культ актыўнасці і асабістае адказнасці? Як даказваюць творы Маракова, жыццёвая філасофія буржуазіі не вычэрпваецца культам багацця. Ёсць у ёй і цікавасць да нацыянальнай ідэі, да правоў асобы.
Леанід Маракоў за два гады актыўнай літаратурнай дзейнасці заявіў пра сябе як першы буржуазны пісьменнік у незалежнай Беларусі. (Мог бы на гэтую ролю прэтэндаваць і Адам Глобус, але зашмат у ягонай творчасці багемнасці, замала ўслаўленага Максам Вэберам суворага пратэстанцкага духу.) Вінцэсь Мудроў, магчыма, апошні ў беларускай літаратуры антысаветчык. Могуць, што праўда, з'явіцца наступнікі. Маракоў малюе нам з сярэдзіны свет асобы, эмансіпаванае ад масы, асобы, якая пачуваецца самастойным самадастатковым чальцом грамадства і роўным — па статусе, калі не па моцы — **прадстаўніку ўладаў**. Мудроў, таксама знутры, даследуе архаічны, закансерваваны сацыялізмам калектывізм. І адно, і другое прысутнічае ў сённяшняй беларускай рэчаіснасці, але калі свет Маракова асацыюецца з вітрынамі менскіх крамаў і рэкламнымі плакатамі на вуліцах, то для Мудрова важнейшыя шыльды з назвамі гэтых вуліц: Камуністычная, Свярдлова і г.д. — знакі з'яваў, з якімі ён змагаецца.
Знаёмства з творамі гэтых пісьменнікаў вяртае нас да няскончаных спрэчак пра змест Перабудовы. Ці былі падзеі лёсавызначальнымі, ці стварылі трывалую новую якасць? Мудроў піша гэтак, быццам нічога такога векапомнага не адбылося. Маракоў схіляецца да супрацьлеглай пазіцыі. Выбіраць чытачу. Калі ён спадзяецца на дадатнае развіццё, на Адраджэнне, героі Маракова будуць яму бліжэйшыя, нягледзячы на ўсе іхнія няшчасці, на тое, што іх пераследуюць, забіваюць, рабуюць. Калі заўтрашні дзень бачыцца пашкоджанай копіяй учарашняга, тады задавольмася шчасліва-задуменнымі палкоўнікамі, зайздрослівымі суседкамі-самагоншчыцамі, мажнымі буфетчыцамі і незлічонымі

шэрагамі п’яніц, алкаголікаў, выпівохаў… Які малюнак пяшчотней лашчыць твае змучаныя вочы, чытач?

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]

Андрэй Курэйчык

Выканаўца жаданьняў
Фантастычная камедыя ў двух актах

АНДРЭЙ КУРЭЙЧЫК — малады беларускі драматург, палітоляг-юрыст паводле адукацыі, асьпірант журналісцкага факультэту БДУ. Ягоная апошняя публікацыя — п’еса “Загублены рай” (“Полымя”, 1-2002). Купалаўскі тэатар рыхтуе спэктакль паводле яе. У ARCHE друкуецца ўпершыню.

*Д*зеючыя асобы:

Б а г д а н.
М а р ы н а, ягоная жонка.
А л я к с е й, ягоны сябар.
Н а т а ш а, жонка Аляксея.
П а л ю б о ў н і к Марыны.
В ы к а н а ў ц а ж а д а н н я ў.

АКТ ПЕРШЫ

Дзея першая

На сцэне з’яўляецца В ы к а н а ў ц а ж а д а н н я ў. В ы к а н а ў ц а ж а д а н н я ў. *(Звяртаецца непасрэдна да публікі. Можа прамаўляць столькі, колькі дазваляюць ягоныя аратарскія здольнасці і цярпенне публікі.)* Што, сабраліся? Месцаў усім хапіла? Так, зала ў нас вялікая. Месцаў шмат...

значна болей... чым гледачоў... Усё, цішэй, цішэй... Добры вечар. Як жыццё? Добра, а што далей рабіць будзем? Я так разумею, вы пацешыцца сюды прыйшлі. Праўда? Якая наіўнасць. Ну, наконт вас не ведаю, а я дык пацешуся. *(Глядзіць на гадзіннік.)* Так, тры хвіліны спектаклю ўжо прайшлі — засталася яшчэ гадзіна пяцьдзесят сем хвілін. Вось... Ды вы не хвалюйцеся, я адсюль не пайду. Вось так і буду... А што, ідэя новая, цікавая: сядзець вось так, балбатаць дзве гадзіны — авангард, эксперымент. Толькі вось чым вас заняць? Не, не. Зараз што-небудзь прыдумаем. Як знарок, забыў у грымёрцы зборнік анекдотаў. Можа, схадзіць? А-а-а, ведаю я вас. Варта толькі на хвіліну пакінуць, потым і крэслаў не знойдзеш. Можа, у каго-небудзь з сабою выпадкова ёсць? Зборнік ці газета… Не? Вы не бераце ў тэатр газетаў? А што вы тут робіце? Толькі не кажыце, што атрымліваеце асалоду ад мастацтва. Я вам гэтага не дазволю. Разнявольцеся, уладкуйцеся ўтульней у крэслах, паспіце... Мы святло выключым. *(Робіць знак —— у зале выключаюць святло.)* Што можа быць лепш, чым дзве гадзіны здаровага сну. Такі тэатр нават Арто не сніўся! Ну, а тым, у каго бяссонніца, я раскажу адну гісторыю. Між іншым, гісторыя гэтая хоць і фантастычная, але даволі банальная. Сюжэт няновы, заезджаны. Ды я нават фільм нейкі бачыў з такімі ж прыкладна паваротамі. Ну і што з таго? Усё роўна лепш, чым нічога. *(Глядзіць на гадзіннік.)* Вось ужо дзесяць хвілін прайшло. Як прыемна ўсведамляць, што такая колькасць дарослых людзей цэлыя дзесяць хвілін слухалі ўсялякую лухту, ды яшчэ і грошы за гэта заплацілі. Гэта ж не публіка, а скарб. *(Паўза.)* Для махляра. Дык вось, гісторыя гэтая пра сямейныя каштоўнасці, як мяркуе той ідыёт, які напісаў мне тэкст. Гісторыя пра маладую сям'ю, якая пражыла пэўную колькасць гадоў у шлюбе. І пра некаторыя загадкавыя метамарфозы. Увогуле, гэтага не растлумачыш — гэта трэба бачыць. Я пакажу вам, тым больш што размаўляць мне з вамі ўжо надакучыла. Карацей, глядзіце... *(Выходзіць.)*

Дзея другая

Марына прыбірае пакой, збірае раскіданыя рэчы мужа.
Потым садзіцца і адпачывае.
Уваходзіць Багдан.

Багдан. Здарова.
Марына *(холадна)*. Здароў.
Багдан. Што чуваць?
Марына. Усё нармальна.
Багдан. Што новага?
Марына. Нічога.
Багдан. Хто-небудзь тэлефанаваў?
Марына. Не.
Багдан. Марына, ты не ў гуморы?
Марына. Я ў гуморы.
Багдан. Ты не ў гуморы.
Марына. Ды не, усё нармальна.
Багдан. Гэта нармальна?
Марына. Нармальна.
Багдан. Так... Што здарылася?
Марына. Усё добра.
Багдан. Я бачу. Толькі, калі так кажуць, звычайна ўсміхаюцца.
Марына *(ненатуральна ўсміхнуўшыся)*. Так добра?
Багдан. Для здымкаў у серыяле “Свет драпежнікаў”.
Марына. Багдане, што табе ад мяне трэба?
Багдан. Ты думаеш, што вось так — гэта ўсё добра? Так? Не, адкажы. Я прыходжу дадому. З працы, практычна... І што? Ты паводзіш сябе, нібы я чужы чалавек. Што я табе зрабіў?
Марына. Нічога.
Багдан. Не, што я табе зрабіў? У чым прычына?
Марына. А што ты на мяне крычыш?
Багдан. Гэта я крычу?
Марына. Што я табе зрабіла, крычыш на мяне і крычыш...
Багдан. Пачакай, я цябе чым-небудзь пакрыўдзіў?
Марына. Не.
Багдан. Ты за штосьці на мяне крыўдуеш... Я ж бачу. Ну, скажы. Ну, скажы як ёсць. Я твой муж, я маю права ведаць, урэшце, што адбываецца? Маю?
Марына. Нічога не адбываецца. Вось менавіта нічога і не адбываецца. Усё адно і тое самае, адно і тое самае, кожны месяц. Нібы жывём ужо гадоў сто разам.
Багдан. Я не разумею, чаго ты хочаш ад мяне.
Марына. Вядома, не разумееш.
Багдан. Ну, растлумач мне.
Марына. Ты не разумееш, што патрэбна кожнай жанчыне.

Багдан. Грошы?
Марына. Увага! Багдане, кожная жанчына жадае толькі аднаго: каб пра яе клапаціліся, каб яе песцілі, любілі… Увага, разумееш?
Багдан. Вось дык раз, а я што, на цябе не зважаю?
Марына. А ты лічыш, што зважаеш?
Багдан. Я так разумею, ты лічыш, што не зважаю.
Марына. Калі? Ты прыходзіш з працы — ты стомлены.
Багдан. Я працую...
Марына. Але ты стомлены. Ты жадаеш паглядзець тэлевізар. Кожны дзень ты прыходзіш і глядзіш тэлевізар. Утаропішся ў яго...
Багдан. Мне трэба адпачыць. Любы чалавек мае права на адпачынак. Што ў гэтым такога?
Марына. Нічога. Ясна, адпачываць з тэлевізарам табе прыемней, чым са мной. Як жа мы прапусцім нашых тэлепузікаў? *(Пачынае яго крыўляць.)* “О, навіны, пакінь, пакінь, пакінь... О, кіно, адыдзі. О, мульцік...” Футбол! Дваццаць два мужыкі ў трусах ганяюць туды-сюды адзін мячык!
Багдан. Не кажы так! Футбол —— гэта святое...
Марына. Тэлевізар, тэлевізар, тэлевізар. Са мной ты ўжо не адпачываеш. Я магу голая па кватэры шастаць — ты нават увагі не звернеш!
Багдан. Ну чаму, звярну.
Марына. Калі патраплю ў рэкламную паўзу.
Багдан. Я ж табе кажу, на працы вельмі стамляюся. Працую. Для цябе ж грошы зарабляю.
Марына. Тваіх грошай нам ледзьве хапае на прадукты. Я і так ва ўсім сабе адмаўляю. Вось, паглядзі, у чым я хаджу. Паглядзі...
Багдан. У адзенні.
Марына. Ты здзекуешся!
Багдан. Чаго ты ад мяне хочаш? Грошай табе мала — знайдзі працу.
Марына. Ну, ясна, я цябе кармлю, даглядаю, я раблю ўсю хатнюю работу — а ты за ўвесь час нашага сямейнага жыцця і пальцам не зварухнуў. І я яшчэ павінна грошы зарабляць?! Так?
Багдан. Ты проста сцерва — вось што я табе скажу. І колькі б я ні зарабляў — хоць мільён, хоць сто мільёнаў, — табе ўсё роўна будзе мала.

Марына. А ты паспрабуй, зарабі...
Багдан. Не збіраюся я высвятляць з табой адносіны з-за тваёй сквапнасці.
Марына. Ясна, ты заўсёды ўнікаеш адказу.
Багдан. Пра тое, што жанчыны — гэта ненажэрныя, драпежныя істоты, прагныя да крыві, мяне папярэджвалі. Папярэджвалі!
Марына. Што ж ты не паслухаўся "добрых" парадаў? Навошта тады жаніўся?
Багдан. Таму што спадзяваўся на лепшае. Так, спадзяваўся. Тым больш што да вяселля ўсё інакш было. Памятаеш? Памятаеш, як ты сябе паводзіла? Ніводнага скандалу. Ніводнай істэрыкі. Ніводнага папроку. І ўсё з такой сціпласцю, усё з мілай, пяшчотнай усмешкай. "Багдане, я кахаю цябе такім, які ты ёсць... Я зраблю ўсё, каб табе было добра..." І гэтак далей. Які мужык не возьмецца на такую прынаду? А варта было толькі пярсцёнак надзець — і на табе: Асвенцым... Пякельныя колы Дантэ — курорт у параўнанні з маім жыццём.

Марына. Ах, бедненькі... Як жа ты не памёр ад такіх пакутаў, а ўсё тлусцееш і тлусцееш? Ахвяра Асвенцыма!..
Багдан. Вось такія здзекі мне і даводзіцца цярпець.
Марына. А мне? А мне?! Што мне даводзіцца цярпець, ты падумаў? Між іншым, ты таксама да вяселля сябе інакш паводзіў. Памятаеш? Запрашаў мяне ў кіно, тэатры, вершы чытаў. Рамантыка, свечкі, прагулянкі зімовымі вечарамі... А цяпер? Успомні, калі ў апошні раз ты падарыў мне кветкі?
Багдан. Калі?.. Ну?..
Марына. Не старайся, не ўспомніш. Я таксама не памятаю.
Багдан. Мне ўвогуле не падабаецца нічога дарыць. Асабліва кветкі — ты ж ведаеш. Дый не разбіраюся я ў гэтым.
Марына. Успомні, калі ты стараўся зрабіць мне штосьці прыемнае. Не сабе — а мне? Калі? Чаму да іншых жанчын як да жанчын ставяцца, а я сама павінна сабе і кветкі купляць, і марожаным частавацца, і прыдумляць, як правесці вечар?
Багдан. Вось ты таксама не разумееш...
Марына. Я не разумею?
Багдан. Ты не разумееш, што нельга мужчыну прымушаць.
Нельга. Ты стварыла сабе ў галаве нейкі ідэал: маўляў, з'явіцца чароўны прынц на белым кані і будзе ўсё сваё жыццё дагаджаць тваім жаданням. Так? Табе ж гэта трэба?

Марына. Не.
Багдан. Вось і не будзе гэтага! Таму што гэтая планета населена не ідэаламі, а рэальнымі людзьмі. Разумееш? Рэальнымі! Са сваімі праблемамі, са сваімі жаданнямі, са сваімі ўяўленнямі пра сям'ю, якія, між іншым, таксама не заўсёды могуць быць ажыццёўленыя ў рэальным жыцці. Але ж я праз гэта не пачынаю істэрыкі. Не спрабую сапсаваць табе жыццё дробнымі скандаламі.
Марына. А што тут псаваць? Скажы, што ў маім жыцці такога добрага, што можна сапсаваць?
Багдан. А што дрэннага?
Марына. А што добрага?
Багдан. Ну, нічога ж дрэннага.
Марына. Ды проста жах!
Багдан. Ну, ізноў ты перабольшваеш. Жах… Многія яшчэ горш жывуць.
Марына. Дзякуй, Багдане, ты заўсёды ведаеш, чым суцешыць.
Багдан. Проста ты не ведаеш, чым сябе забавіць, вось і шалееш…
Марына. Гэта я не ведаю?
Багдан. Не ведаеш.
Марына. А ты запытай, што мне трэба!
Багдан. Э-э, не. Ведаю я, што будзе.
Марына. Кожная жанчына жадае, каб пра яе клапаціліся, каб яе кахалі. Каб ёй рабілі падарункі, каб ёю захапляліся. А ты ўжо забыўся, калі казаў мне кампліменты. І ўвогуле з табой сумна!
Багдан. Затое з табой весела. Ха-ха-ха, гэта падобна да пякельнага смеху?
Марына. Дурны. Гэта не жыццё, гэта мяшчанства! Такая пустата…
Багдан. О, чэхаўская гераіня. А чаму я павінен цябе весяліць? Муж — гэта што, персанальны клоўн? Ці ты ўяўляеш сабе сямейнае жыццё як цыркавое прадстаўленне?
Марына. Не, што ты, мілы, — я ўяўляю сабе жыццё як могілкавы спакой.
Багдан. Ну вось, бачыш? Нам ужо весялей.
Марына. Блазнюк.
Багдан. Марына, ну што ты ад мяне хочаш? Хочаш, каб я на галаве перад табой хадзіў?
Марына. Мне сумна!

Багдан. Ізноў здароў!
Марына. Ты проста не ўяўляеш, што значыць для жанчыны такое стаўленне. Я… я і так для цябе ўсё раблю. Думаеш, гэта лёгка? І за ўсё гэта я маю толькі адно — абыякавасць, абыякавасць, абыякавасць...
Багдан. А ты не ўяўляеш, што значыць такое жыццё для мужчыны, калі яго прымушаюць выконваць жаданні сцярвознай жонкі. Адны абвінавачанні і нараканні, і так цэлыя дні. Ты кажаш, што не адчуваеш увагі, — а я не адчуваю сябе мужчынам!
Марына. Пабыў бы ты ў маёй скуры.
Багдан. Пабыла б ты ў маёй. Так што не трэба, не трэба...
Марына. Нягоднік! *(Плача.)*

Званок у дзверы.

Дзея трэцяя
Марына *(выцірае слёзы)*. Што стаіш? Ідзі адамкні.
Багдан. Ну, супакойся. Давай, давай, прывядзі сябе ў парадак.
Марына. Я ў парадку. У гэтым доме ўвогуле ўсё ў парадку.
Багдан. Праўда?
Марына. Адмыкай...

Багдан адмыкае дзверы,
уваходзіць Выканаўца жаданняў з велізарнай валізкай у руках.
Багдан. Чым магу...
Выканаўца жаданняў. Добры дзень. Дазвольце прадставіцца — Зміцер.
Багдан. Вельмі прыемна — Багданер. Жартую. А вы, уласна, па якой справе?
Выканаўца жаданняў. А я, уласна, па вашай.
Багдан. Па якой нашай?
Марына. Вы хто?
Выканаўца жаданняў. Зараз вам усё стане зразумела.
Дазвольце. *(Праходзіць на сярэдзіну сцэны.)* Вялікі дзякуй. *(Марыне.)* Як вы цудоўна выглядаеце.
Багдан. Ты гэта... Асцярожней...
Выканаўца жаданняў. Спяшаюся вас узрадаваць, дарагія сябры! Нарэшце вам у гэтым жыцці пашанцавала!
Багдан *(насупіўшыся)*. Чаму?

Выканаўца жаданняў. О, як я вам зайздрошчу...
Багдан. А вось я табе не пазайздрошчу, калі зараз жа не раскажаш, што...
Выканаўца жаданняў. Разумею. Я гандлёвы прадстаўнік сусветна вядомай міжнароднай карпарацыі “Вішыз Рэалізэйшн ЛТД”. І, як я ўжо сказаў, у вас сёння шчаслівы дзень, паколькі суперкамп’ютэр карпарацыі, які знаходзіцца ў штаце Вісконсін, ЗША, абсалютна выпадкова выбраў вашу сям’ю для бясплатнай дэманстрацыі паслуг карпарацыі “Вішыз Рэалізэйшн”! Ах, як я вам зайздрошчу!
Багдан *(скептычна)*. Бясплатнай?
Выканаўца жаданняў. Абсалютна. Сеанс — усяго пяцьсот рублёў.
Марына. Я нічога не разумею...
Багдан. Гэта коміваяжор, дарагая. А мы яго ўпусцілі ў дом. Цяпер усё, нам гамон.
Марына. Вы чымсьці гандлюеце?
Выканаўца жаданняў. О, пацэлі ў самую дзесятку! Прыемна бачыць такіх разумных людзей. Я гандлюю прадукцыяй фірмы “Вішыз Рэалізэйшн”, якой, несумненна, знойдзецца ўжытак у вашай утульнай кватэры. І для пачатку — пыласос.
Багдан. Ён намякае, што ў нас бардак.
Выканаўца жаданняў. Наадварот, мая задача ў іншым: зрабіць жыццё кожнай жанчыны, кожнай гаспадыні максімальна камфортным і зручным. Ніякая праца не павінна яе абцяжарваць, найперш занудная, брудная, ад якой баліць спіна і псуюцца рукі. Цяпер вы можаце забыць пра гэтыя пакуты, калі, натуральна, набудзеце найноўшы суперпыласос “Вішыз Рэалізэйшн Супер’З”. Гэта трэба бачыць. Зараз я пакажу вам, як ён працуе. *(Дастае з валізкі пыласос.)*
Багдан. Можа, не трэба?
Марына. Няхай пакажа, цікава ж.
Багдан *(сабе)*. Галоўнае — схаваць грошы...
Выканаўца жаданняў. Вы можаце заліць ваш дыван кетчупам… *(Ілье на дыван кетчуп.)*
Багдан. Дарагая, ён сапсаваў нам дыван.
Выканаўца жаданняў. *(Працягвае.)* ...засыпаць пылам *(сыпле)*, выцерці аб яго брудныя ногі *(выціpае)*, вымазаць яго ваксай *(мажа)*, плюнуць...
Багдан. Я яго зараз заб’ю...

Выканаўца жаданняў. Разбіць яйка *(б’е яйка)*. І пасля гэтага дыван можна...
Багдан. Выкінуць.
Выканаўца жаданняў. Не, не выкінуць. Проста ўзяць суперпыласос “Вішыз Рэалізэйшн Супер’З”, і ён ізноў зробіць ваш дыван бездакорна чыстым. *(Пачынае пыласосіць).*
Багдан *(крычыць праз шум).* Толькі ты май на ўвазе...
Выканаўца жаданняў *(таксама крычыць).* Што?
Багдан. Кажу, ты май на ўвазе, што, калі гэты пыласос будзе не такі ўжо супер, ты адсюль не выйдзеш.
Выканаўца жаданняў. Дзякуй, я ўжо папіў гарбаты... *(Выключае пыласос.)* Паглядзіце!
Марына. Цудоўна, праўда, Багдане?
Багдан. Праўда, толькі вушы крыху закладвае. У яго, напэўна, рухавік ад самалёта.
Марына. Як чыста. А колькі каштуе?
Выканаўца жаданняў. Для вас увогуле скідка. Дваццаць — не! Трыццаць — не! Трыццаць пяць працэнтаў! Плюс бясплатная дастаўка і гарантыя. Усяго 499 долараў, можна па курсе...

Марына пачынае жаласліва глядзець на Багдана.
Багдан. Не глядзі на мяне так. Калі мы купім гэтага монстра, у нас ніколі не будзе ні кетчупу, ні яек. Навошта нам яго купляць, калі нам усё роўна няма чым яго карміць? Дый небяспечна гэта: раптам засмокча...
Выканаўца жаданняў. Як добра, што вы ўзгадалі пра ежу.
Багдан. Я ўзгадаў? Табе падалося...
Выканаўца жаданняў. Дык вось, ежа — гэта найважнейшая частка жыцця кожнага сучаснага чалавека. Вы ведаеце, што, па статыстыцы, восемдзесят працэнтаў мужчын паміраюць заўчасна ад няякаснага харчавання?
Багдан. Ага, а астатнія дваццаць працэнтаў, відаць, халасцякі...
Марына. Багдан! Ой, вы не звяртайце на яго ўвагі. Не, мы гэтага не ведалі...
Багдан. Натуральна, навошта ж на мяне звяртаць увагу, я ж усяго толькі муж. Хто на мужа цяпер звяртае ўвагу?
Выканаўца жаданняў. Дык вось, толькі ў гэтым месяцы карпарацыя “Вішыз Рэалізэйшн” прапануе сваім кліентам унікальны камплект посуду “Кітчэн Вішыз”. Такога вы яшчэ не

бачылі. У ім можна гатаваць абсалютна без тлушчу…
Багдан. І без газу…
Выканаўца жаданняў. Гэта дазволіць вам зэканоміць пятнаццаць працэнтаў вашага прадуктовага бюджэту.
Марына. Гэта цудоўна, Багдане, праўда?
Багдан. Зараз даведаемся. Колькі каштуе?
Выканаўца жаданняў. Пачакайце, пачакайце. Вы ж яшчэ не ведаеце пра гэты ўнікальны камплект кухоннага посуду “Кітчэн Вішыз”…
Багдан. Ён яшчэ і ў шахматы гуляе?
Марына. Чаго мы яшчэ не ведаем?
Выканаўца жаданняў. Ох, мне падабаецца вашая зацікаўленасць. Яна сведчыць пра вялікі інтэлект. Вы цікавіцеся, таму што вы жанчына. А гэта значыць, што толькі вы па-сапраўднаму ведаеце, чаго вартыя ўсе гэтыя кухонныя клопаты. Гадзіны жыцця на кухні толькі дзеля таго, каб ваш муж прыйшоў і адным махам знішчыў плён вашай працы. І так дзень пры дні, месяц за месяцам, з году ў год…
Марына. Гэта жахліва, праўда…
Багдан. Як жахліва! Так, так, так… І вось дзіўна, ізноў муж ва ўсім вінаваты!
Выканаўца жаданняў. Колькі намаганняў. І як прыгожа гэта выглядае на талерцы…
Багдан. Вось жа д’ябал, знайшоўся змагар за правы жанчын. Роза Люксембург.
Выканаўца жаданняў. Дык вось, карпарацыя “Вішыз Рэалізэйшн” знайшла спосаб дапамагчы вам. Гэта не жарты. З гэтым унікальным посудам вы будзеце траціць на прыгатаванне ежы на трыццаць працэнтаў менш часу, а мыецца ён — удвая хутчэй. Вы толькі ўявіце сабе…
Марына. Багдане, давай купім, а?
Багдан. Колькі?
Выканаўца жаданняў. З улікам сезонных скідак, а таксама таго, што суперкамп’ютэр абсалютна выпадкова…
Багдан. Слухай, прыхільнік жаночага розуму, хочаш, я пакажу табе свой суперпрадукт — біту бейсбольную звычайную?
Выканаўца жаданняў. Усяго 299 долараў.
Багдан. Колькі?!
Марына. Багдане, ну не так гэта і дорага. Затое колькі часу зэканоміцца…

Багдан. У гэтыя патэльні што, тэлевізар убудаваны? Трыста долараў за каструлю і пару патэльняў! Ды я лепей сырое мяса есці буду.
Марына. Ну, калі ласка, Багдане. Я так стамляюся ад гэтага гатавання, кожны дзень... Мы маглі б больш часу праводзіць разам...
Багдан. Ды падумай ты галавой! Выходзіць, я павінен два месяцы толькі на твае патэльні працаваць!
Марына. Ізноў ты думаеш толькі пра сябе!
Багдан. А ты ўвогуле не думаеш.
Марына. Ты проста не ўяўляеш сабе, што значыць пратырчаць паўдня каля пліты!
Багдан. А ты не ведаеш, што значыць зарабляць грошы. Гарбацішся цэлы месяц, каб ты магла ўсё збаёдаць на нейкую патэльню!
Марына. Быў бы ты ў маёй скуры!
Багдан. А ты ў маёй!
Выканаўца жаданняў. Мне здаецца, што вам сапраўды сёння пашанцавала! Пыласос, кухонны посуд, супернажы і сродкі для догляду мэблі — гэта толькі пабочныя тавары, якія прапануе “Вішыз Рэалізэйшн”. Галоўнае я пакінуў на дэсерт.
Багдан. Што, дыван-самалёт?
Выканаўца жаданняў. Нашмат, нашмат лепшае. Толькі сотні шчасліўчыкаў па ўсім свеце карпарацыя “Вішыз Рэалізэйшн” прапануе бясплатна — о, як я вам зайздрошчу! — выкананне жадання!
Багдан. Жаданне?
Выканаўца жаданняў. Жаданне.
Багдан. Бясплатна?
Выканаўца жаданняў. Бясплатна.
Багдан. Угаварыў. Хачу, каб ты праваліўся. О! Не дзейнічае.
Выканаўца жаданняў. Мне падабаецца вашае пачуццё гумару.
Марына. Багдане, не блазнуй. Заўсёды ты выстаўляеш сябе ў самым ідыёцкім святле. *(Выканаўцу жаданняў.)* А што вы маеце на ўвазе?
Выканаўца жаданняў. Гэтую паслугу вам не прапануе больш ніводная кампанія свету, акрамя хіба што “Санта-Клаўс Карпарэйшн”, але ў іх яна мае выключна сезонны характар. Дык вось, тое, што я вам сказаў, — гэта абсалютная праўда: мы выконваем жаданні, не любыя, вядома...

Багдан. Ну натуральна.
Выканаўца жаданняў. Усё-такі і ў нас ёсць прафесійная этыка. Дый магчымасці нашыя не бязмежныя. Але... я бачу па вачах, вы мне не верыце.
Багдан *(саркастычна).* Ну чаму ж...
Выканаўца жаданняў. Не, не верыце.
Багдан. Веру, веру, веру... *(Марыне.)* Выклікай “хуткую дапамогу”: ён шызік.
Выканаўца жаданняў *(сумна).* Не верыце...
Багдан. Ну як жа ў гэта не паверыць? Ты прыйшоў нам прапанаваць абсалютна бясплатна за чатырыста долараў пыласос, патэльні і яшчэ выканаць якое-небудзь нашае запаветнае жаданне. Што ж тут незразумелага?
Марына. А як гэта?
Выканаўца жаданняў. Добра, зараз вы самі ва ўсім упэўніцеся. Наколькі я памятаю, вашым апошнім жаданнем было зразумець, што адчувае ваш партнёр п0а сваёй гендэрнай ролі.
Багдан. Сам ты гендэрны. Дзякуй за ўсё, давай цяпер ідзі адсюль.
Марына *(злосна*). Багдане!
Багдан. А што, ён сам першы пачаў. Чула, як ён сказаў?
Выканаўца жаданняў. Што ж, кампанія “Вішыз Рэалізэйшн” з радасцю выканае вашае жаданне і дасць бясплатную гарантыю якасці на тры месяцы. Тры месяцы! Дзякуй за тое, што скарысталі з паслугаў нашай кампаніі. З вас пяцьсот рублёў за прэзентацыю. Сума будзе ўключана ў ваш рахунак за тэлефонныя перамовы. Спадзяюся, вы застаняцеся задаволеныя.

Поўная цемра. Моцны гук.

Дзея чацвёртая

Запальваюць святло.
Выканаўцы жаданняў ужо няма.
Багдан і Марына, здзіўленыя, стаяць адно насупраць аднаго.
Багдан. Што гэта было?
Марына. Не ведаю.

Глядзяць адно на аднаго, затым — кожны на сябе.

Доўгая паўза.
Багдан. А-а-а! У мяне грудзі!
Марына. Багдане, што са мной?
Багдан. Ты глядзі, глядзі! У мяне грудзі!
Марына. Багдане, я мужчына... *(Глядзіць на сябе, а потым пачынае нястрымна рагатаць.)* Я мужчына, Багдане!
Багдан. Чаго ты смяешся, дура? І што ў цябе з голасам? *(Глядзіць на яе.)* А-а-а! Ты — гэта я. Ты — гэта я! А я хто? Чые гэта грудзі?
Марына. Мае.
Багдан. Я звар'яцеў.
Марына. Слухай, а што гэта ў цябе?.. *(Глядзіць уніз.)*
Багдан. Гэта жах!
Марына. Так, гэта жах. А як ты ходзіш? Гэта ж нязручна...
Багдан. Пакінь яго ў спакоі, дурніца! Ты што, не разумееш, што адбылося?
Марына. Ну, што адбылося, Багдане? Мне здаецца, ён выканаў тое, што абяцаў.
Багдан. Ён нас забіў — трэба выклікаць доктара! "Хуткую дапамогу"! І святара! Так, так, так, гэта вядзьмарства... Гэта клінічная смерць. Мы спім... Я недзе чытаў пра такое.
Марына. Паслухай, гэты коміваяжор — ён сказаў, што выканае нашае жаданне.
Багдан. Божа, дапамажы мне. *(Спрабуе пайсці, але падае.)* Д'ябал, як можна хадзіць на такіх абцасах!
Марына. Багдане, у цябе такі голас. Такое ўражанне, што я праглынула трамбон. *(Смяецца.)* А-а-а. О-о-о.
Багдан. Затое ты, відаць, пішчэлкай падавілася. Гаворыш, быццам ката душыш.
Марына. І слухай, Багдане, у цябе ў роце такі смак… Што ты ясі?
Багдан. Я п'ю. Зараз мы і цябе паправім. Трэба выпіць. Трэба шмат выпіць.
Марына. Алкаголік!
Багдан. Адчапіся, белая гарачка! Я звар'яцеў. У мяне грудзі. Мне трэба выпіць. Зараз, зараз мне будзе добра... *(Бярэ пляшку.)*
Марына. Не лі гэтую дрэнь у маё цела!
Багдан. А ну адсунь маё цела ад свайго цела. Дурніла! Мордаварот! Хто я табе, у рэшце рэшт? Муж!

Марына. Не крычы на мяне, хам! *(Дае яму поўху. Ён адлятае.)* Ой, Багдане, прабач, прабач, я зусім забылася, што ў мяне цяпер усё зусім іншае. Фу, дурная Марына, вось ёй па руках, вось...
Багдан. Нішто сабе.
Марына. Я зусім забыла, які ты ў мяне дужы, якія мускулы... Памацай.
Багдан. Я трапіў у пекла.
Марына. Ну што ты, мілы, усё выправіцца. Паглядзі на мяне, ну паглядзі, ну паглядзі — гэта ж я, твая маленькая Марына. Ну, твая жонка, твая ластаўка, твая котка, твая мышка. Ну, ты мяне пазнаеш?
Багдан. Не.
Марына. Усё будзе добра, ты верыш?
Багдан. Не.
Марына. Ты такі песіміст...
Багдан. Я песіміст? Што будзе добра? Я жанчына!
Марына. Дарэчы, не самая брыдкая. Нават вельмі нішто сабе жанчына. Шукай ва ўсім перавагаў. І ўвогуле, па-мойму, гэта вельмі цікавы эксперымент. Ён нейкім чынам зменіць нашае жыццё. Нешта новае...
Багдан. Цешыць толькі адно, мазгі ў цябе засталіся твае! Нешта новае?! Эксперымент?! Ды гэта катастрофа! О, Божа, я жанчына, у мяне грудзі, і жонка цяпер важыць дзевяноста кілаграмаў... За што мне ўсё гэта?! Я пайду. Я пайду адсюль. *(Паўза.)* Не, я не пайду. Куды я магу выйсці ў такім выглядзе? Мяне ж усе засмяюць?
Марына. Не засмяюць.
Багдан. Ты паглядзі на гэтыя ногі. Выходжу на вуліцу, а мне: “Багдане, ты сёння неяк дзіўна выглядаеш на гэтых абцасах, а каса — проста цуд...” А я ім: “Ды не, хлопцы, усё нармальна, толькі на некаторы час я памяняўся з жонкай целам”. Ты ўяўляеш, што будзе?
Марына. Нічога, калі ты не будзеш паўсюль крычаць, што ты Багдан.
Багдан. А хто ж я?
Марына. Ты — Багдан. Але цяпер ты — гэта не ты. Падрыхтуйся як след да таго, што я зараз скажу.
Багдан. Мне ўжо дрэнна.
Марына. Ты — Марына.

Багдан. Марына, так?
Марына. Ну, выходзіць... А я, як бы табе гэта сказаць, а я, значыць, Багдан.
Багдан. Хто?
Марына. Багдан. Але гэта толькі для іншых.
Багдан. Давай паставім усе кропкі над “і”. Значыць, я —
Марына. Ты — Багдан. Вар’яцтва. Ды ты смяешся з мяне!
Я, здаровы мужык, — Марына?
Марына. Ну хто з цябе смяецца, дурненькі? Хто з цябе смяецца? Ну падумай сам сваімі мужчынскімі мазгамі. Што нам цяпер застаецца рабіць? Усё жыццё ў кватэры не праседзіш. Паглядзі на сябе ў люстэрка, урэшце. Нічога не зробіш, мілы, гэта рэальнасць.
Багдан. *(Крычыць пранізліва і адчайна, затым раптам спакойна кажа.)* Яго трэба знайсці.
Марына. Каго?
Багдан. Гэтую скаціну з пыласосам. Ох, знайду — падсмажу на ягонай патэльні, без солі і тлушчу. Пяцьсот долараў на гэта не пашкадую. У мяне цяпер настрой драпежніка, хачу задушыць гэтага нягодніка!
Марына. *(Смяецца.)* Мілы, ты такі смешны бываеш, калі злуеш. Асабліва ў такім выглядзе...
Багдан. Ты думаеш, я жартую? Я не жартую! Гэта проста немагчыма! Зрабіць такое з абсалютна безабароннымі людзьмі. Гэта жахліва. Я яго заб’ю! *(Думае.)* Не. Тады мяне пасадзяць у жаночую калонію. Не, я яго не заб’ю, я яго засуджу! Я падам на яго ў суд. За здзекі з майго гонару і годнасці!
Марына. О, на гэта варта будзе паглядзець. Марына патрабуе, каб яе зрабілі мужчынам. Памятаеш, як у нейкім фільме: “Хачу быць мужчынам! Хачу быць мужчынам!” *(Смяецца.)*.
Багдан. Колькі трагізму ў гэтых словах. Дзе табе, тваімі курынымі жаночымі мазгамі, зразумець гэта. Зразумець, што значыць для чалавека страціць сваю мужчынскую годнасць.
Марына. А што значыць яе набыць...
Багдан. Злыдня!
Марына. А я ні ў чым не вінаватая. Не вінаватая я, не вінаватая.
Багдан. Досыць блазнаваць. Гэта ўсё ты!
Марына. Я?
Багдан. Ляпнула, што, маўляў, калі б ты ведаў, як гэта быць жанчынай... І ля-ля-ля! Не выношу вось гэтай ідыёцкай

жаночай манеры казаць тое, чаго не просяць!
Марына. А сам, а сам... *(Пачынае плакаць.)*. Гэта ўсё з-за таго, што ты яму хаміў.
Багдан. Дык гэта ты мяне завяла!
Марына. Ды цябе і заводзіць не трэба: шалееш ад кожнай драбязы. А-а-а... Крычыш на мяне. *(Плача.)*
Багдан. Ну, ну перастань, мая маленькая. Мая дзяўчынка.
Марына. Злуешся на мяне дарма.
Багдан. Дарма, па-твойму?!
Марына. Ну, усё ж не ў балонку цябе ператварылі...
Багдан. Як называлася гэтая ідыёцкая фірма? “Вішыз Дурнілізэйшн”?..
Марына. Нешта накшталт...
Багдан. Не, не, неяк па-іншаму! З галавы вылецела! Ну, давай, давай, давай! “Вішыз Ля-ля-лейшн”, “Вішыз Афігейшнз”, дапамагай, дапамагай, “Вішыз Афанарэйшнз”. А-а-а! Не памятаю! Каб яно ўсё выпрахла! Казаў я, нельга гэтых коміваяжораў пускаць у дом!
Марына. Не казаў.
Багдан. Казаў.
Марына. Не казаў.
Багдан. Ды я якраз хацеў гэта сказаць, але ты мяне перабіла. Ясна, нам жа пра пыласос цікава паслухаць. Што рабіць? Што рабіць?
Марына. Папі вадзічкі.
Багдан. Дактары. Так, дактары могуць дапамагчы. Да каго ісці? Да ўролага? Гінеколага?
Марына. Да псіхіятра.
Багдан. Не, дактары не дапамогуць. Што могуць дактары? Нам патрэбны ведзьмары, шаптуны. У нас жа недзе ёсць гэтыя...
Марына. Хто?
Багдан. Ну, гэтыя, для паранармальных з’яваў. Шаманы... Ці да бабкі якой звярнуцца? Яны ведаюць, яны на руку плюнуць, замову прамармычуць, зёлак дадуць... Ты ведаеш якую-небудзь такую бабку?
Марына. Бедненькі, зусім розум страціў...
Багдан. Нічога, нічога, я што-небудзь прыдумаю. Нейкае выйсце ёсць. А-а-а. Выйсця няма!..

Дзея пятая

Марына. Галоўнае — не вешаць носа. Што здарылася, тое здарылася. Ну што мы з табой можам зрабіць? Трэба неяк змірыцца з новымі абставінамі... Чуеш, дарагі?
Багдан. Гэта праўда. Нельга цяпер раскісаць! Мужык я ці не, урэшце?! Досыць. Багдане, вазьмі сябе ў рукі. Мужчыну адрознівае не цела, не моцныя рукі і валасатыя грудзі, а… зусім іншае.
Марына. Што?
Багдан. Маўчы, жанчына. Табе ніколі гэтага не зразумець. *(Падыходзіць да люстэрка. Паўза.)* Так...
Марына. Што-небудзь не так?
Багдан. Слухай, як можна жыць з такім целам?
Марына. А што? Табе ж раней яно падабалася...
Багдан. Ды я не пра гэта. Ніводнага нармальнага мускула. Нейкія курыныя ногі. Божа, а дзе ў вас цэнтр цяжару?
Марына. Затое ў мяне ёсць цудоўная магчымасць адчуць сябе малпай.
Багдан *(глядзіць на спадніцу)*. Ну-ну... Але пад спадніцу паддзімае!
Марына. Уяві сабе, што ты шатландзец.
Багдан. Шатландцы не носяць станікаў. У цябе які памер? Трэці?
Марына. Чацвёрты...
Багдан. Цікава.
Марына. Слухай, ты такі валасаты. А там...
Багдан. Рукамі не чапай! Ох, адчуваю сябе па-ідыёцку. На гэтых абцасах — як страўс. Ну, добра, я разгледзеў гэтае цела — з ім усё зразумела. Што будзем рабіць далей?
Марына. Я табе ўжо ўсё сказала. Адзінае, што нам цяпер застаецца, калі мы не жадаем трапіць у бальніцу...
Багдан. Знайсці бабку.
Марына. Далася табе, Багдане, гэтая бабка... Паслухай, нам трэба зрабіць выгляд, зрабіць выгляд...
Багдан *(з разуменнем)*. А-а-а... Не выйдзе.
Марына. Чаму?
Багдан. Ніхто не паверыць.
Марына. Яшчэ як павераць. Урэшце, мы столькі пражылі разам. Няўжо не зможам сысці адно за аднаго?
Багдан. Ты не зможаш.
Марына. Чаму?

Багдан. Таму. Не зможаш, і ўсё. Табе харызмы маёй не стае.
Марына. Ой, ой, ой, харызматык. Абыдуся і без харызмы. Акрамя таго, у нас усё роўна няма іншага выйсця. Ну, Багдан, калі ласка, ну дай мне шанец.
Багдан *(думае)*. Добра, давай паглядзім, на што ты здольная.
Марына. Я гатовая, я гатовая. Ой, як гэта цікава! А што мне рабіць?
Багдан. Значыць, так: уяві сабе, што ты — мужык. Уяўляеш? Значыць, ты — мужык.
Марына. Ага. Я адчуваю.
Багдан. Гэта самае галоўнае. Словамі тут не раскажаш — гэта трэба адчуваць.
Марына. Я адчуваю.
Багдан. Толькі не размаўляй такім ідыёцкім голасам.
Марына. Гэта твой голас.
Багдан. Я ведаю. Але не трэба вось гэтак: “Ах, я адчуваю, дарагі”. Цьфу! Брыдота! Мужна скажы. Ты мужык, ты моцны, грубы. Зразумела?
Марына. Зразумела. Ой, прабач. *(Гыркае.)* Зразумела. Ну як, атрымалася?
Багдан. Пойдзе. Значыць, уяві сабе, ты ідзеш па вуліцы. У-у-у, сексменшасць нейкая... Ты нармальна ідзі. Клубамі не віхляй. Лепей, лепей... Вось ты так ідзеш, ідзеш і, дапусцім, прыходзіш да мяне на працу. І каго ты там сустракаеш? Гэтых свалачуг, маіх супрацоўнікаў ты там сустракаеш. Ага. І што ты ім кажаш? Напрыклад, я твой напарнік. Кажы што-небудзь.
Марына *(прыветна)*. Добры дзень, Сярожа.
Багдан. Вось так скажаш — і ўсё. Можаш знайсці вяроўку, намыліць яе і павесіцца...
Марына. А што, нешта не так?
Багдан. Не, не, усё дарэмна. У цябе нічога не атрымаецца.
Марына. Я здолею, Багдане, праўда. Ты мяне навучыш. Ну, калі ласка, дай мне шанец.
Багдан. Як быццам у мяне ёсць выбар. Добра, паспрабуем яшчэ раз.
Марына. Можа, для пачатку ты пакажаш, як трэба?
Багдан. Давядзецца. Значыць, ты — мой напарнік Сяргей Сёмушкін.
Марына. Так, так, я твой сябар.
Багдан. Раздалбай. Ну добра. Я цябе сустракаю, глядзі. “О,

Серы, здароў. Што чуваць? Усё о’кей? Учора зноў забухалі?”
Марына. А мне што адказваць?
Багдан. А я ведаю? Ну скажы, маўляў, вечар быў супер. Супер-пупер, нават потым не рыгаў.
Марына. Фу, якая брыдоціна. Няўжо вы так размаўляеце? Жывёлы.
Багдан. Ну прабачце, прабачце... Хочаш стаць мужыком — трэба гаварыць як мужык.
Марына. Добра, добра, я зразумела. Відаць, давядзецца ўсё ж апусціцца да вашага ўзроўню. Цяпер я паспрабую.
Багдан. Давай.

Багдан і Марына ідуць насустрач адно аднаму.
Марына. Ну, здароў, карыфан.
Багдан. Стоп. Дзе ты гэтага паскудства набралася? Ты ўсё ж у прыстойнай канторы працуеш. Яшчэ раз.
Марына *(спрабуе зноў)*. Здароў, Серы. Што чуваць? Усё о’кей?
Багдан. Лепей, лепей... Але на сёння хопіць. Потым яшчэ патрэніруешся. Потым... О божа, як гэта ўсё цяжка.
Марына. А цяпер ты.
Багдан. Што я?
Марына. Ты пакуль таксама не падобны да прыстойнай дзяўчыны.
Багдан. Ай-ай-ай... Як шкада. Мяне хлопчыкі любіць не будуць.
Марына. Не блазнуй. Думаеш, быць сапраўднай жанчынай лёгка?
Багдан. А што тут складанага? Строй сабе вочкі, уздыхай — вось так. Можна зрабіць што-небудзь сексуальнае...
Марына. Бессаромнік! І ўвогуле, адкуль у цябе такое ўяўленне пра жанчын? Гэта проста абражае!
Багдан. Я дзяўчына цнатлівая, а вы хаміце.
Марына. Цьфу.
Багдан. Валасатая жывёла.
Марына. Што?! У мяне няма словаў.
Багдан. Вось бачыш, а ты казала, у мяне не выйдзе. Не так ужо гэта і складана. Галоўнае — знайсці цэнтр цяжару...
Марына. Сапраўды, Багдане, што з мяне мужчына, што з цябе жанчына. Ну што ж, жыццё пакажа, куды ўсё гэта прывядзе. Хадзем...
Багдан. Як усё ж такі гэтая фірма называлася? “Вішыз

Адурнейшнз”, “Вішыз Атупейшнз”...
Марына. Ну, супакойся, дарагая.
Багдан. Ідзі да д’ябла, дарагі.

Выходзяць.

Дзея шостая

Мінуў тыдзень.
Выходзіць Багдан, садзіцца і спрабуе зрабіць макіяж.
У яго гэта выходзіць не вельмі добра.
Багдан. О божухна! Як яны гэта робяць? Дык у люстэрку тое, што злева, — справа. А тое, што справа, — злева... Сам чорт галаву зломіць. *(Спрабуе нафарбаваць вейкі, але трапляе тушшу сабе ў вока.)* Ай, д’ябал. Гэтыя жаночыя штучкі. Божа, і так кожны дзень, кожны дзень. Якія пакуты. *(Спрабуе прыпудрыцца, чхае.)* Цьфу!

Уваходзіць Марына.
Марына. Што ты з сабою зрабіў! Гора ты маё. Я ж табе колькі разоў паказвала! І не трэба дзьмуць на пудру...
Багдан. Я не дзьмуў. Я проста ў люстэрка глядзеўся.
Марына. Ты носам дыхай.
Багдан. А яшчэ… Ты не будзеш на мяне крычаць?
Марына. Што яшчэ?
Багдан. А яшчэ я адны калготкі парваў. Я не вінаваты, праўда. Яны самі рвуцца… Глядзі. І ногі ад іх свярбяць.
Марына. Ты не чухай.
Багдан. Не магу. *(Чухае.)*
Марына. Што, што ты робіш?
Багдан. Ой, цяжка...
Марына. Мама родная, гэта ж італьянскія калготкі. Ты мяне даканаеш. Проста немагчыма. А гэта што?!
Багдан. Што?
Марына. Вось гэта! *(Паказвае на ягоную галаву.)*
Багдан. Гэта валасы.
Марына. Што ты зрабіў з маімі валасамі? Варвар. На што яны сталі падобныя?!
Багдан. Я проста іх памыў.
Марына. Ідыёт, ты павінен карыстацца маім шампунем. І маёй

парфумай… Разумееш?
Багдан. Ды я разумею, разумею. Проста складана прывыкнуць.
Марына. Давядзецца прывыкаць хутчэй. У нас з табой сёння першае сур'ёзнае выпрабаванне.
Багдан. Што за выпрабаванне? Ты мяне не палохай.
Марына. Кінь блазнаваць, да нас сёння прыйдуць госці.
Багдан. Госці? Якія госці?
Марына. Сябры нашы. Аляксей прыйдзе з жонкай. Яны тэлефанавалі ўчора.
Багдан. Калі?
Марына. Калі ты ў туалеце мачыўся стоячы.
Багдан. Не згадвай, не згадвай. Я не знарок.
Марына. А яшчэ…
Багдан. А вось гэтага ўвогуле не будзем успамінаць.
Марына. Не?
Багдан. Не варта…
Марына. Дык вось, яны прыйдуць сёння.
Багдан. Чаму ты ім не сказала, што мы захварэлі?
Марына. Я ім сказала, што мы, ну, не ў сабе.
Багдан. Калі яны прыйдуць, яны пераканаюцца, што гэта праўда. Калі іх чакаць?
Марына. Гадзіну пад сёмую. Прыгатаваць трэба што-небудзь.
Багдан. Ну што ты на мяне глядзіш, Марына? Добра, пойдзем, пакажаш мне, што ды як.

Выходзяць.
Праз секунду чуваць звон пабітага посуду.
Прабач.
Марына *(з кухні).* Ах ты недарэка, гэта быў мамін сталовы сервіз!

У хуткім часе з'яўляюцца зноў і кідаюцца пераапранацца.
Давай, давай, час ужо.
Багдан. Мне не падабаюцца твае сукенкі.
Марына. Апранай.
Багдан. Не хачу гэтага апранаць. У светлым я падаюся таўсцейшай.
Марына. Ах, які пераборлівы. Ты што? Гэта ж мая найлепшая сукенка! Мне ўсе казалі, што я ў ёй выглядаю проста цудоўна.
Багдан. Праўда?

Марына. У ёй ты будзеш самай сексуальнай жанчынай, якую я бачыла.
Багдан *(апранае і глядзіцца ў люстэрка)*. Няблага, няблага. Сапраўды, варта прызнаць, ува мне ёсць нейкая абаяльнасць, шарм, я б нават сказаў — грацыя. Не, зусім няблага...
Марына. Ах, які ты нарцыс.
Багдан. Табе таксама няма чаго скардзіцца.

Харашыцца перад люстэркам. Чуецца званок.
Марына. Званок. Я адамкну.
Багдан. Стой, стой! Не адмыкай! Калготкі!
Марына. Што?
Багдан *(ліхаманкава нацягваючы калготкі)*. Як яны надзяваюцца, д'ябал? Дзе мае туфлі?
Марына. Вось, гора ты маё. Чуеш, як звоняць...
Багдан. Пажраць ім не церпіцца. Нічога, пачакаюць. Ну, як я?
Марына. Бліскуча.
Багдан. Я гатова, запускай.
Марына. Памятай, хто ты.
Багдан *(нахабна)*. Багдаша, адчыняй.

Марына адчыняе, уваходзяць госці.
Добры вечар! *(Ідзе ім насустрач, але няўдала ступае на абцас і падае*). Б...
Марына *(паспешліва)*. Дарагая, ты не ўдарылася?
Багдан. Задралі мяне гэтыя туфлі. *(Паўза)*. Як я рада вас бачыць.
Марына. Праходзьце, мы вас ужо зачакаліся...
Аляксей. Вітаю, Багдане. Марына, ты цудоўна выглядаеш.
Багдан. Дзякуй.
Наташа. Добры вечар, Марыначка. А для мяне з яго і абцугамі камплімента не выцягнеш. Але гэта праўда, ты сёння такая незвычайная.
Багдан. Ага. Надзвычай.
Наташа. Ты не ўдарылася? Гэта так небяспечна. Можна шчыкалатку зламаць.
Аляксей. Багдане, ты чаму не тэлефануеш? Зачыніліся тут у сваім логаве — не дастаць вас ніяк.
Марына *(праз зубы)*. З намі ўсё нармальна. Мы проста... хварэлі.

Наташа. Абое? На што?
Марына. Ой, цяпер такі грып ходзіць.
Багдан. Ага, з вельмі дзіўнымі наступствамі.
Наташа. Ой, а ў вас заўсёды такі парадак, Марыначка. Ты такая цудоўная гаспадыня. Працуеш і працуеш.
Багдан. Літаральна дзень і ноч.
Наташа. І ніхто табе не дапамагае. Багдане, як ты можаш так здзекавацца са сваёй жонкі. Ды на ёй жа твару няма. Кат ты.
Марына. Гэта я здзекуюся? Наташа...
Наташа. Ды годзе, Багдане. Ведаю я, што ты скажаш. Вось усе мужчыны так, Марына. І мой, ты ведаеш, таксама, — каб ён што-небудзь у доме зрабіў... Прасцей месяц з неба дастаць.
Багдан. Так, так... Чыстая праўда. Яны абсалютна да жыцця не прыстасаваныя. Існуюць толькі дзякуючы нам, жанчынам.
Марына. Багдан.
Багдан *(да Марыны)*. Гэта тваё імя.
Аляксей. Ай, Багдане, не спрачайся ты з імі. Самому ж даражэй будзе.
Марына. Не ўжо, пачакай...
Багдан. Вядома, Наталка, такая ўжо нашая жаночая доля.
Марына *(да Багдана)*. Ах ты бессаромнік!
Аляксей. Кінь, Багдане. Пойдзем пагутарым, пакурым. Няхай папляткараць. Што ў жанчын за размовы — адны плёткі.
Марына. Добра, я з ім, м-м-м, ёй, я з ёй потым пагавару.

Адыходзяць на іншы канец сцэны.
Наташа. Ну, як ты, Марыначка, — раскажы.
Багдан. Не, лепей ужо ты, Наталка.
Наташа. А ў мяне што? У мяне ўсё па-старому. На працы завал. Вось я там і не з'яўляюся.
Багдан. Не з'яўляешся?
Наташа. Час ад часу. Ды там што? Справаздачы, справаздачы, справаздачы... Да нас нейкая праверка прыйшла з міністэрства. Наш Уладзімір Аляксандравіч, ну, Валодзька з трэцяга аддзелу, ты ж яго ведаеш...
Багдан. Брунет...
Наташа. Шатэн. Дык ён жаніўся.
Багдан. Ты глядзі?
Наташа. Жаніўся.
Багдан. Які дурны.

Наташа. Чаму дурны? Разумны чалавек. Дзяўчына нібыта нармальная, з канцылярыі. Праўда, кажуць, студэнтка яшчэ. Апошні курс. Кажуць, што па каханні. А яна дзяўчынка мілая, кемлівая. З характарам. Гэта самае галоўнае. Значыць, за сябе здолее пастаяць, яго крыху розуму навучыць. Вунь як ты свайго вымуштравала.
Багдан *(устрывожана).* Як?
Наташа. Ён жа што быў да вяселля?
Багдан. Што?
Наташа. Бомж, алкаш, брудны, няголены, нямыты. Ты прабач, вядома, што я так пра твайго мужа...
Багдан. Нічога, нічога...
Наташа. Але гэта ўсё праўда. А ты яго хоць у парадак прывяла. Да чалавека стаў падобны.
Багдан. А мне здаецца, ён і быў нічога...
Наташа. Але пагадзіся, што тое, што ён уяўляе з сябе цяпер, і тое, чым ён быў тады, — гэта два розныя бабуіны.
Багдан. Ну, наконт цяпер і тады — гэта сапраўды.

Яны адыходзяць на задні план.
Увага пераносіцца на Марыну і Аляксея.
Марына. Ты кажаш, грошы схаваў?
Аляксей. Схаваў, а яна знайшла. Нюх як у сабакі. Яны заўсёды так: лакатары свае натапыраць — і шнараць, і шнараць, і шнараць, і шнараць, абнюхваюць цябе і прасвечваюць... Я табе кажу — у іх нюх на грошы.
Марына. Праўда... Мая вось таксама.
Аляксей. Табе я ўвогуле не зайздрошчу.
Марына. Чаму?
Аляксей. Тваёй у крымінальным вышуку працаваць трэба. А ты дзе ад яе грошы хаваеш?
Марына. Я хаваю?
Аляксей. Ты ж сам казаў. Не памятаеш ці што?
Марына. Пачынаю прыгадваць. І многа хаваю?
Аляксей. Ну, пагуляць у рэстаране хопіць. Ды ты што, Багдане? Ну дык дзе хаваеш?
Марына. Дзе я ад жонкі грошы хаваю? Вось гэта цікавае пытанне. Дзе ж я, сапраўды, грошы хаваю? Трэба будзе ў жонкі запытацца...
Аляксей *(смяецца).* Ну ты жартаўнік, Багдане. Бачыў, як учора

нашы з аўстрыйцамі змагаліся?
Марына. А што, нейкі канфлікт?
Аляксей. Ды яны нашых проста раздушылі!
Марына. Які жах, Аляксей... Усіх?
Аляксей. Усіх.
Марына. Так шкада іх, родных...
Аляксей *(устрывожана).* Багдане, у цябе ўсё ў парадку?

Наташа і Багдан зноў выходзяць наперад.
Наташа. Я спачатку думала фланелю купіць. Убачыла ў нашым універсаме. Бэжавы колер. Думаю, якраз будзе пасаваць да маёй карычневай блузы. Памятаеш яе?
Багдан. Каго?
Наташа. Блузу. Ну, мы яшчэ з табой яе па “Бурдзе” шылі. Памятаеш?
Багдан. Па чым шылі?
Наташа. Слухай, Марыначка, з табой штосьці не так.
Багдан. З чаго ты ўзяла?
Наташа. Ты мне штосьці недагаворваеш.
Багдан. Ды не, што ты.
Наташа. Вы пасварыліся.
Багдан. Хто?
Наташа. Вы.
Багдан. З кім?
Наташа. Ён б’е цябе.
Багдан. Ды хто?
Наташа. Багдан.
Багдан. Я? Ды не, канечне. Мы ўвогуле жывём, як кажуць, нага ў душу... Гэта значыць… Ну, ты разумееш. Ты прабач, у мяне проста цяпер нейкая затрымка. Як кажуць, затрымка пакуль толькі ў галаве. *(Смяецца.)* Не ведаю, Наташачка, я так стаміўся.
Наташа. Стаміўся?
Багдан. Ну стамілася — якая розніца? Дык што ты там казала пра гэтую...
Наташа. Пра што?
Багдан. Пра фігню.
Наташа. Пра што?!
Багдан. Ну, фігня, байда. Па якой мы з табой гэтую кашулю

дурную...
Наташа *(шакавана)*. Марыначка...
Багдан. Хадзем есці. Ну што ты глядзіш на мяне, Наташа? Есці хачу. Згаладалася. *(Аляксею з Марынай.)* Хлопчыкі, калі ласка, да стала.
Наташа *(Аляксею)*. З Марынай штосьці не тое.
Аляксей *(Наташы)*. З Багданам таксама.
Наташа *(Аляксею)*. Яны пасварыліся, ён яе б'е.
Марына. Ну што ж вы не сядаеце? *(Багдану.)* Прашу вас, Марыначка.
Багдан. Ага, сядайце, Багданчык.

Усе садзяцца, пачынаюць есці.
Наташа. Смаката. Ммм... Марыначка, толькі ты ўмееш так гатаваць. Проста чараўніца. А што ты паклала ў гэтую салату? У яе такі ўсходні смак.
Багдан. У гэтую?
Наташа. Угу.
Багдан *(глядзіць на салату)*. Памідоры.
Марына. Каляндру.
Аляксей. Багдане, ты што, таксама палез у кулінарыю? Не чакаў ад цябе...
Марына. Ды ты што! Ты ведаеш, Аляксею…

Багдан штурхае яе ў бок.
Лёха, я ненавіджу гатаваць.
Багдан. Гэта я яму сказала.
Аляксей. А-а-а...
Наташа. Не, вось пагадзіся, Аляксею. Праўда, Марына — проста золата, і Багдану невыказна пашчасціла?
Аляксей. Тут няма пра што і спрачацца.
Багдан. Я павінна ўмяшацца. А ці ведаеце, як мне пашанцавала з маім мужам? Гэта ж проста фантастыка. Чым я заслужыла такое шчасце?
Марына. Ну не трэба, не такое ўжо і шчасце...
Багдан. Проста ён такі сціплы, мой Багдан. Ніколі пра сябе добрага слова не скажа. І я, вы ведаеце, так рэдка кажу праўду пра яго. Можна сказаць нават, ніколі не казала. Але цяпер час прыйшоў.

Марына штурхае яго пад сталом.
Не трэба, Багдане. Не стрымлівай мяне. Ён такі сціплы. Дык вось, я хачу сказаць, што ён цудоўны, працавіты, няхай не заўсёды гэта відаць, але працавіты, чулы...
Марына. Самазакаханы...
Багдан. Кахае мяне вельмі. Ведаеш, Наташка, я самая шчаслівая жанчына ў свеце, бо ў мяне ёсць такі муж. Але я яго так мала цаню. Мне так сорамна...
Марына. Ну супакойся, дарагая, папі вадзічкі. А мы з табой потым абмяркуем мае пекнасці і недахопы.
Багдан. Тут няма чаго абмяркоўваць. Багдан — ідэальны.
Аляксей *(Наташы)*. А ты кажаш — "пасварыліся"...
Наташа *(Аляксею)*. Нічога не разумею...
Аляксей. А ці не выпіць нам чаго-небудзь?
Багдан. Цудоўная ідэя, я...
Наташа. Марыначка, ты ж не п'еш.
Багдан. Я... я не п'ю? А, так. Я не п'ю. *(Марыне.)* Ты п'еш.
Марына *(спалохана)*. Я?
Аляксей. Вядома, Багдан вып'е. Калі ён адмаўляўся ад чарачкі? Правільна, ніколі!
Марына. А можа...
Багдан *(ціха Марыне)*. Пі, інакш усю справу праваліш.
Марына. Але я...
Багдан. Пі, сказаў!
Аляксей. Ну, за сустрэчу.

П'юць.
Багдан *(ціха Марыне)*. Ну як, жывая?
Марына. Нармальна.
Аляксей. Яшчэ па адной? А то, як у нас кажуць?
Багдан *(устрывожана)*. Можа, не трэба?
Марына. Не ўжо, давай.
Аляксей. За мір.

П'юць.
Наташа *(Багдану)*. Ах, Марыначка, дарэмна ты яго так расхвальвала. П'е ж.
Марына. Што? Каго я дарэмна рас-хва-ль-ва-лі-на-лі-вай...
Багдан. Памаўчы, даражэнькі. Ах, казала я, не давядзе гарэлка да дабра. Колькі я сябе памятаю, заўсёды на гэтым стаяла.

Марына *(Аляксею.)* Слухай, Лёха. Давай яшчэ вып’ем, га? Як гэта вядзецца ў нас, сапраўдных мужыкоў. А потым і песенькі запяём. *(Раве.)* Ой, сівы конь бяжыць...
Наташа. Марына, нейкі ён дзіўны сёння ў цябе.
Багдан. Во дзе гуманоід. Гэта даюцца ў знакі наступствы дзіцячай траўмы чэрапа... З вазка выпаў, галавой стукнуўся.
Марына. Алёша, Алёша, давай вып’ем яшчэ.
Наташа. Не, відаць, нам ужо час ісці.
Аляксей. Сапраўды, я ўспомніў, у мяне сёння яшчэ справа адна ёсць.
Багдан. Разумею.
Аляксей. А вам бы адпачыць як след, чуеш, Багдане? Багда-ан.
Багдан. Ён чуе, чуе.
Наташа. Ну, дзякуй табе, Марыначка, за стол. Усё было вельмі смачна. Я табе патэлефаную вечарам. Лёша, ты гатовы?
Аляксей. Гатовы. Будзь, Багдане.
Марына *(п’яным голасам).* Да па-ба-чэн-ня.
Багдан. Дзякуй, што зайшлі. Усяго добрага.
Марына *(пачынае спяваць)*. Я мужчына! Я мужчына!
Багдан. Я сама спраўлюся.

Наташа і Аляксей выходзяць.
Марына *(працягвае спяваць).* Я Марына! Я мужчына! Я мужчына і Марына!
Багдан. Ну што, нажлукцілася? А?
Марына. Я падтрымліваю імідж. Вып’еш?
Багдан. Каб мне выпіць прапаноўвала мая ж уласная жонка — дзеля гэтага варта было жыць.
Марына. Я табе не жонка.
Багдан. А хто?
Марына. Я табе муж! Гы-гы-гы.
Багдан. Хто?!
Марына. Муж. *(Стукае кулаком па стале.)*
Багдан. Вось што робіць алкаголь. Хоць зараз у псіхдом.
Марына. Дык вып’еш?
Багдан. Налівай.
Марына. Ты жанчына, табе палову. За моцную сям’ю.

П’юць.
Багдан. А цяпер спаць. *(Бярэ яе пад руку і выводзіць.)* Што будзе,

што будзе? Не, я мірыцца не згодны. Трэба нешта рабіць, трэба змагацца! Я буду змагацца! Ты ідзеш?
Марына. Іду.
Багдан. Змагацца за гордае імя мужчыны!
Марына. Я мужчына!
Багдан. Не трэба.
Марына. Добра.
Багдан. Я буду змагацца! Бо мужчына — гэта не цела, не рукі і ногі...
Марына. А яшчэ...
Багдан. Я ведаю. Не, я не страчу свой гонар. Я застануся мужыком да канца! *(Выводзіць яе ў спальню.)*
Марына *(са спальні).* Тыца-дрыца-дра-ца-ца...

Дзея сёмая

Багдан выходзіць са спальні.
Багдан. Не, мы яшчэ не гатовыя як след. Праўда, варта прызнаць, што магло быць і горш. Мне хочацца выпіць. Клятыя туфлі... Тупаеш, як на хадулях. Вой, блін, ізноў калготкі парваў. Жонка заб'е. *(Налівае сабе, раптам — званок.)* Што за людзі, нармальна выпіць не дадуць. Хто там? Можа, гэтыя што забыліся? *(Ідзе адмыкаць, спыняецца.)* Д'ябал, я ж забыў, хто я. *(Прымае належны выгляд.)* Зараз, зараз, іду, іду...

Адчыняе дзверы; у пакой уваходзіць Палюбоўнік.
Палюбоўнік. О, нарэшце... *(Хапае Багдана і цалуе яго.)*
Багдан *(зусім ашаломлена).* Прабачце...
Палюбоўнік. Дзе ён?
Багдан. Хто?
Палюбоўнік. Твой муж.
Багдан. Тут.
Палюбоўнік. Як, не на працы?
Багдан. Не на працы. Спіць...
Палюбоўнік. Я як ведаў! О, ты не ўяўляеш, як я знемагаў без цябе. Цэлы тыдзень без тваёй пяшчоты. Гэтая клятая камандзіроўка! Кожная клетачка майго цела сумавала без цябе. Я ўвесь час думаў пра цябе, дзень і ноч. Кожную хвіліну. А ты?
Багдан. Што я?
Палюбоўнік. А ты думала пра свайго галубочка, пра свайго

прынца, пра свайго Казанову? *(Ізноў хапае Багдана і прыціскае яго да сябе.)*
Багдан. Ну, як сказаць...
Палюбоўнік. Ён моцна спіць?
Багдан. Думаю, моцна.
Палюбоўнік. А чаму не на працы?
Багдан. Х-х-хварэў.
Палюбоўнік. Ну і д'ябал з ім. Ах, Марыначка, радасць мая, як я сумаваў. Я ведаю, я ведаю, гэта вар'яцтва — прыходзіць да цябе вось так, без званка, без дамовы. Але я не мог стрымацца. І акрамя таго, калі што — я з ЖЭСу, правяраю столь... на вільготнасць, а таксама на наяўнасць насякомых. "Дзень добры, ггаждане, насякомыя ў кватэгы ёсць?" *(Смяецца.)* Ну як?
Багдан. Няблага. Дык значыць, на наяўнасць насякомых...
Палюбоўнік. Ведаю, нагода дурацкая. Але і ён у цябе не Ламаносаў.
Багдан. Хто?
Палюбоўнік. Муж. Ён праглыне. Ты ж сама казала, што ён дурны, як даўбешка.
Багдан. Праўда? А што я яшчэ казала?
Палюбоўнік. Ну, што ён самазакаханы асёл, што, нават калі ён у ложку нас заспее голымі, яму дастаткова сказаць якое-небудзь глупства, і ён паверыць. Галоўнае, каб мы яму тэлевізара не засцілі. Што абвесці яго вакол пальца вельмі проста. І вось цяпер ён так блізка.
Багдан. Нават бліжэй, чым ты сабе можаш уявіць.
Палюбоўнік. Слухай, Марына, ты нейкая дзіўная. Ты што, не рада мяне бачыць?
Багдан. Наадварот, ты нават не ўяўляеш, у які ўдалы момант ты прыйшоў. Я проста саромеюся. Сарамлівая я...
Палюбоўнік. Не заўважаў.
Багдан. Вып'еш?
Палюбоўнік. Ты ж ведаеш, што я не п'ю, у адрозненне ад твайго жлаба-мужа.
Багдан. Ах, прабач, забылася. У апошні час такая няўважлівая стала, мой коцік, забываю літаральна ўсё. Уяўляеш, нават не памятаю, калі мы з табой пазнаёміліся.
Палюбоўнік. Ну як жа! Тры месяцы таму ў бібліятэцы...
Багдан. А-а-а, вось чаму я так часта ў бібліятэку стала хадзіць. Хадзіла і хадзіла, хадзіла і хадзіла... Дысертацыю магла б ужо

напісаць. А гэта, аказваецца, мы з табой... *(Нервова смяецца.)* Як гэта міла.
Палюбоўнік. Сапраўды, цудоўна. А памятаеш наша апошняе спатканне тут?
Багдан. Ты прыходзіў да мяне дадому?
Палюбоўнік. І мы кахалі адно аднаго ў тваёй спальні, на сямейным ложку.
Багдан. Мы спалі на сямейным ложку?!
Палюбоўнік. Ты што, не памятаеш?
Багдан. Як жа, як жа... І часта?
Палюбоўнік. Марына, што з табой? Праўда, ты крыху не ў сабе, але нічога, зараз я цябе вылечу. Твой супермен прынёс табе лекі. Хадзі, ходзь да мяне, дай я цябе пацалую, дай абдыму.
Багдан. А раптам муж прачнецца? Ён у мяне раўнівы.
Палюбоўнік. Але ж дурны.
Багдан. Але вельмі раўнівы. А магчыма, не такі ўжо і дурны...
Палюбоўнік. Ну хадзі да мяне, я ўжо знемагаю ад жадання.
Багдан. Бачу, бачу. Але давядзецца пачакаць літаральна адну хвіліначку.
Палюбоўнік. Але чаму? Няўжо ты не прагнеш мяне?
Багдан. Прагну, прагну. Вельмі прагну. Толькі мне ў кладоўку трэба схадзіць. Я хутка.
Палюбоўнік. У кладоўку? Навошта?
Багдан. Па сякеру.

Смяюцца.
Па варэнне, мой галубочак.
Палюбоўнік А можа, потым сходзіш?
Багдан. Не, не, зараз. Толькі ты мяне дачакай. А потым я табе такое пакажу… У-у-у, адразу ўсе твае жаданні спраўдзяцца.
Палюбоўнік А што ты мне пакажаш?
Багдан. Сюрпрыз. *(Выходзіць.)*
Палюбоўнік Нешта тут не так. А, зразумела. У іх госці былі. Яна выпіла. Зразумела...

Выходзіць заспаная Марына, бачыць яго.
Палюбоўнік. Дзень добры, я з ЖЭСу...
Марына. Ты што тут робіш? Ён жа можа ўбачыць цябе! Ах, як я па табе сумавала, мой любы! *(Хапае Палюбоўніка і палка цалуе яго.)*

Палюбоўнік *(ашалела)*. А-а-а... Што, што такое?..
Марына *(не адпускае яго)*. Я ўвесь час думала пра цябе. У гэтым жыцці ты — мая адзіная ўцеха, мая радасць. Толькі нельга, каб ён цябе ўбачыў!
Палюбоўнік. Хто?
Марына. Муж.
Палюбоўнік. А... вы хто?

У гэтую хвіліну ўбягае Багдан з сякерай.
Багдан. Ага! Я вас застукаў — вы цалуецеся!
Палюбоўнік. Гэта не я — гэта ён!
Багдан. Дрэнь, сволач, шлёндра! Заб'ю!
Марына *(Палюбоўніку)*. Любы, бяжы.
Палюбоўнік *(Багдану)*. Марына, ты што, гэта ж я, твой любы.
Багдан. Я ведаю. *(Спрабуе ўдарыць яго сякерай, але прамахваецца)*.
Палюбоўнік. Яна з глузду з'ехала!
Багдан. Распусніца!
Марына *(Багдану)*. Любы, ты няправільна зразумеў. Ён з ЖЭСу.
Багдан. Я правільна ўсё зразумеў. У бібліятэку яна хадзіла! Хай будзе выкляты той, хто навучыў цябе чытаць! У бібліятэку! Я цябе заб'ю! Цябе і твайго палюбоўніка!
Палюбоўнік. Марына, ды я яго першы раз бачу!
Марына *(Багдану)*. Ды ты сам давёў мяне сваёй абыякавасцю!
Багдан. Здрадніца! Значыць, я дурань? Так? Я асёл? Я жлоб? Я не заўважу? Праўда?
Палюбоўнік. Што яна такое кажа? Гэта ж вар'ятня!
Багдан. Стой, скаціна. Я ж табе абяцаў асалоду!
Марына *(адчыняе яму дзверы)*. Любы, бяжы, бяжы, ратуй сваё жыццё.

Палюбоўнік паварочваецца, каб уцячы,
але Марына хапае яго і яшчэ раз на развітанне цалуе.
Палюбоўнік *(канчаткова збіты з панталыку)*. Каб яно ўсё згарэла! *(Уцякае.)*
Багдан. Усё роўна я цябе заб'ю, манюка... *(Ад бяссілля губляе сякеру.)* Падманула. Нягодніца! Я табе так верыў, а ты... *(Пачынае плакаць.)*
Марына. Ну, Багдане, ну... Ты проста давёў мяне. Я ж табе казала, а ты нічога... Я жанчынай перастала сябе адчуваць. Што

мне было рабіць? Так выйшла...
Багдан. Так выйшла?.. Здрадніца! Усё, толькі развод!
Марына. Немагчыма. Ад цябе ніхто не прыме заяву. Юрыдычна — гэта ты мне здрадзіў.
Багдан. Нягодніца. Мы, мужчыны, такія даверлівыя...
Марына. Затое можаш радавацца. Пасля гэтага мой раман, я думаю, можна лічыць скончаным.
Багдан *(усміхаецца)*. Сапраўды.
Марына. Толькі б бедны хлопец розум не страціў. Думаю, не ў кожнага нервы вытрымалі б такое. *(Смяецца.)*
Багдан. Няхай падзякуе, што жывы застаўся. Калі б я быў у сваім целе...
Марына. Ты б ні пра што не даведаўся. *(Глядзіць навокал.)* Ох, колькі тут прыбіраць...
Багдан. Слухай, Марына, ты што, сапраўды мяне лічыш такім дурным?
Марына. Ну што ты, што ты, мой саколік. Вядома, не. Гэта я так... Любому мужчыну падабаецца, калі ягонага суперніка паліваюць брудам. Гэта мужчынская псіхалогія. Нічога асабістага... Учора ты дурны, сёння — ён.
Багдан. Ну вы, жанчыны, і сволачы.
Марына. Уставай, пойдзем.
Багдан. Ты ведаеш, я сёння першы раз у жыцці пацалаваўся з мужчынам.
Марына. І што?
Багдан. Мне спадабалася.

Заслона

АКТ ДРУГІ
Дзея першая

Прайшоў тыдзень.
Выходзіць Марына, падыходзіць да люстэрка і глядзіцца.
Марына. Здароў. Та-ак... Нарэшце ў гэтым гарадку з'явіўся сапраўдны каўбой. А нядрэнны, праўда? Я вось так магу. А яшчэ вось так! І вось так! А, не бачылі такога? Та-ак... Такі патэнцыял прападае. Непарадак. Трэба патрэніравацца. Я на вуліцы, іду, іду, іду, бачу класнага маладога чалавека. Не, цяпер умовы не тыя. Бачу класную маладую дзяўчыну. Дзякуй

Богу, я іх ведаю як свае пяць пальцаў... Ідзе яна. А я... “Даражэнькая, не падкажаце, дзе тут найбліжэйшы валютны банкамат?” А яна мне...

У пакой урываецца Багдан.
Багдан. Пайшоў да д’ябла, казёл! *(У яго падбітае вока і брудная, разарваная сукенка.)*
Марына *(ашаломлена)*. Багдан!
Багдан. Каб ён праваліўся, гэты горад, гэтая планета, з усімі мужыкамі на ёй! А-а-а!
Марына. Божачкі, дарагая, Багдане, што з табой?
Багдан. Не трапляйся пад руку! Папярэджваю, я цяпер за сябе не адказваю! О, які я злосны! О, які я злосны! Я раз’юшаны!!!
Марына *(з жахам)*. Багдан, што ты зрабіў з маім целам? Яно ж сапсаванае...
Багдан. Спакойна. Затое я яму таксама морду набіў. Ці набіла... Увесь час блытаюся! Ну, але ж не важна. Ты разумееш, ён мяне схапіў. А я яму ў нос! Потым каленам. У сківіцу! Па шыі! Ізноў у нос! Яшчэ каленам! Хук! Бакавы... Бачыш? *(Паказвае руку.)* Гэта сляды ягоных зубоў у мяне на кулаку.
Марына. Чые сляды?!
Багдан. Ды кажу ж — ягоных зубоў!
Марына. Я пытаюся, чыіх зубоў?
Багдан. Ды мужыка гэтага. Чыіх яшчэ? О! *(Дастае немалы пачак грошай.)* Нядрэнна, а?
Марына. Што гэта? Багдан, ты ў кагосьці іх скрала? Навошта?
Багдан. Выйграла! Усё справядліва. Зараз раскажу... Эх, дагэтуль кулакі гудзяць. Ты ведаеш, іду сёння з працы, і раптам такі сум па старым жыцці... Хоць вый. Дай, думаю, хоць у піўнуху зайду, як у былыя часы. Усё-такі гэта найлепшае месца для настальгіі... Вырашыў па-старому — піва альбо гарэлачкі...
Марына. Мяркуючы па паху, і піва, і гарэлачкі...
Багдан. Ну, мне дрэнна было. Самотна... Душа балела, што я мог зрабіць? А там усё па-старому. Усё тыя ж морды... Толькі на мяне неяк дзіўна паглядзелі спачатку... А потым — нармальна, выпілі, разгаварыліся... Ты ведаеш, я там, аказваецца, карыстаюся вялікім поспехам. Праўда... Мне нават у каханні тры, не, чатыры алкаголікі прызналіся...
Марына. Сапраўды, гэта дасягненне.
Багдан. Табе такое і не снілася, праўда? Карацей, выпілі, слова

за слова... І ўсё роўна душа чагосьці просіць! Хочацца чагосьці такога... Вось такога! Ну, я і кажу: маўляў, стаўлю паўсотні, што наб'ю морду любому мужыку з гэтай піўнухі! Уяўляеш? Я зразумела, чаго мне не хапала...
Марына. Цяпер, спадзяюся, ты задаволены.
Багдан. Ты нічога не разумееш. Табе ўвогуле не дадзена зразумець, што патрэбна сапраўднаму мужыку. Гм, яны думалі, што я дзяўчына, што я размазня... Але я ім усім даказала! Я ім даказала, што ў гэтым свеце яшчэ ёсць жанчына, здольная пастаяць за сябе. *(Паўза.)* Шкада толькі, што жанчына — мужчына. Карацей, я выйграла пяцьдзесят да аднаго. Што, няслаба?
Марына. Ты паглядзі на сябе ў люстэрка, тэрмінатар.
Багдан. Д'ябал з ім. Жанчына можа быць жаданай у любым выглядзе. Галоўнае — шарм... Затое хоць на хвілінку адчуў сябе ранейшым. Так, я — Багдан. І гэта гучыць горда!
Марына. Ідзі пераапраніся, гераіня.
Багдан *(выходзячы, задаволена)*. І ўсё-такі, я яму два зубы выбіла! *(Выходзіць.)*
Марына. Не хапае мне толькі байцовай жонкі. *(Бярэ тэлефон і набірае нумар.)* Алё, Лёха, здароў. Слухай, я сёння не прыйду. Ведаю, ну перапрасі там у хлопцаў. Не, я футбол па тэлеку пагляджу. Не магу, жонку трэба даглядзець. Нічога сур'ёзнага. Яна проста пабіла кагосьці ў піўной. Не, навошта з нагоды? Для асалоды... Ну, і за грошы. Увогуле, гэта складана растлумачыць... Але ты павінен мяне зразумець. Наташы толькі не кажы, добра? Ну, пакуль. *(Кладзе слухаўку. Крычыць.)* Багдане, Багдане, як ты там? Вока не баліць?
Багдан *(са спальні.)* А ты ідзі сюды, разумнік. Я табе пакажу, як з беднай жанчыны здзекавацца...

Марына выходзіць.

Дзея другая

Прайшло тры месяцы.
Багдан падыходзіць да люстэрка і прафесійнымі рухамі пачынае рабіць макіяж.
Багдан. Дрэнная туш! Ізноў вейкі зліпаюцца. *(Крытычна аглядае сябе.)* Нішто сабе... *(Крычыць Марыне.)* Дарагі, дарагі,

час прачынацца. Чуеш мяне, Марыначка? На працу спознішся... Уставай.

Выходзіць заспаная Марына.
Прачнуўся?
Марына. Чаго?
Багдан. Пракалупай вочы і паглядзі на гадзіннік. Час уставаць, на працу спознішся.
Марына. Нічога. Перажыве праца. Есці хачу.
Багдан. Сняданак на стале.
Марына. Малайчына, Багдане, цудоўная ты ў мяне жонка.
Багдан. Я ўвесь ранак на кухні правяла... І ты толькі гэта можаш сказаць?
Марына. А дзе піва?
Багдан. Марына, якое піва з ранку? Ты ж не алкаголік нейкі, а прыстойны малады чалавек. Падумай сам.
Марына. Не жаночая гэта справа, Багдане, меркаваць пра такія рэчы. Хто ў нас гаспадар у сям'і, урэшце, — ты ці я? Акрамя таго, у нас на працы ўвогуле так прынята. Забылася ці што?
Багдан. Ах, гэтыя мужыкі. Часам сапраўдныя жывёлы.
Марына. Учора начальнік прыйшоў, усё дапытваўся, чаму офіс хістаецца. Хацеў тэлефанаваць у архітэктурную ўправу. Але сакратарка адгаварыла. Ты ведаеш, ён спрабаваў пералічыць супрацоўнікаў — атрымаўся дроб. Так што ўсё нармальна.
Багдан. Звярынец. Якая я шчаслівая, што там ужо не працую. Не ведаю, як мне магло гэта падабацца? Дзякуй Богу, на маёй працы такога няма — дзяўчаты ўсе прыстойныя, добрыя...
Марына. Ага, языкі без касцей. Цьфу, выносіць гэтага не магу. Бабскія размовы.
Багдан. Марына, у цябе тыповы мужчынскі штамп. Не такія ўжо мы і пляткаркі. Проста навіны. Што ў гэтым дрэннага? Мне пасуюць гэтыя завушніцы?
Марына. Новыя? Я іх не насіў. Багдан, ты купіў сабе завушніцы?
Багдан. А ты лічыш, я павінна даношваць твае старыя рэчы? Хочаш, каб я хадзіла ў абносках? Вось як ты пра мяне клапоцішся! Гэта называецца муж? Так, Марына?
Марына. Добра, добра, твае штучкі мяне не цікавяць.
Багдан. Раней цікавілі. Я табе купляла і сукенкі, і ўпрыгожанні.

Марына. Раней у мяне ўвогуле былі дурныя інтарэсы.
Багдан. Ты называеш нашы жаночыя інтарэсы дурнымі? Але я імкнуся быць прыгожай для цябе...
Марына. Лухта.
Багдан. Добра, мой даражэнькі. Не гарачыся. Хочаш што-небудзь на вячэру?
Марына. Галубцы.
Багдан. Я яшчэ не ўмею.
Марына. Што? Я цябе вучыць больш не буду. Даволі! Ты — жанчына, ты і гатуй!
Багдан. Але, дарагі, некаторым жанчынам мужы дапамагаюць на кухні. Гэта так цяжка... Паглядзі на мае рукі.
Марына. Ты мне не дапамагала, калі была мужчынам.
Багдан. Але я не ведала.
Марына. Вось і даведалася.
Багдан. Але Марына! Сапраўды, я была чэрствай, бессардэчнай! Але цяпер я ўсё зразумела. Усё зразумела. Магчыма, ты даруеш мне. Марына, ты апошнім часам перастала быць пяшчотная са мной. Увесь час праводзіш з маімі, ну, сваімі сябрамі. П'еш. Мне зусім дрэнна без тваёй пяшчоты. Мне самотна. Я ведаю, я не маю права цябе абвінавачваць. Я сама была такім мужам. Але ўспомні, табе ж таксама было дрэнна ад маёй абыякавасці, ты плакала, няўжо ў цябе зусім няма суперажывання? Няўжо табе зусім мяне не шкада? *(Плача.)*
Марына. Добра, добра... Ну не плач, не плач... Ну, што ты. Божа, жаночыя слёзы гэта проста жах. Асабліва калі плача такая жанчына, як ты, Багдане.
Багдан. Мне самотна. Я стамілася ад гэтай кухні...
Марына. Ну супакойся. Я з табой.
Багдан. Праўда?
Марына. Вядома. І не важна, муж я табе ці жонка. Я кахаю цябе.
Багдан. Я цябе таксама.
Марына. Хочаш, я навучу цябе гатаваць галубцы?
Багдан. Праўда, навучыш?
Марына. Шчыра кажучы, я таксама крыху засумаваў па кухні... Слухай, гэта цудоўныя завушніцы.
Багдан. Яны так пасуюць да тваёй шэрай сукенкі.
Марына. Толькі ты ведаеш, я падумаў... Не называй мяне больш Марынай.
Багдан. Чаму?

Марына. Не трэба. Глупства гэта нейкае. Урэшце, я мужчына. А тут такое імя — Марына. Учора новы кліент зайшоў. Запытаў, як маё імя. “Марына”, — кажу. І ўжо няма ў нас гэтага кліента. Карацей, калі ўжо мы памяняліся целамі, дык і імёнамі варта карыстацца адпаведнымі. Так я лічу.
Багдан. Магчыма, ты і маеш рацыю. Мне таксама крыху нязручна. Паслухай... Багдан.
Марына. Што?
Багдан. Я паглядзела па календары. Сёння ж наш юбілей.
Марына. Які юбілей?
Багдан. Сёння роўна тры месяцы з таго часу, як ты — мужчына, а я — жанчына. Памятаеш?
Марына. Праўда? Як час хутка ляціць! Хаця ты ведаеш, мне часам здаецца, што я ўсё жыццё быў мужыком. Што ў мяне ўсё жыццё была эрэкцыя ўранку і валасатыя ногі.
Багдан. А я ніяк не магу прызвычаіцца да рэгулаў. Па-ідыёцку сябе адчуваю...
Марына. Ага, цяпер табе зразумела, што значыць у такі час ідыёцкая просьба кшталту “пойдзем куды цямней”.
Багдан. Цяпер я шмат пра што ведаю.
Марына. Слухай, а гэты тып, ну, коміваяжор… Што ён тады сказаў наконт гарантыі?
Багдан. Якой гарантыі?
Марына. Ну, што, маўляў, гарантыя на паслугі тры месяцы. Сёння гарантыя заканчваецца.
Багдан. Гэта значыць, што мы ўжо не зможам запатрабаваць нашыя грошы назад. Я так і не змагла згадаць назву гэтай дурной кампаніі.
Марына. У любым выпадку, гэта варта адзначыць.
Багдан. Толькі рамантычна; добра, Багдане? Няхай гэта будзе рамантычна. Я толькі цяпер зразумела, якою цудоўнай бывае рамантыка. Я зраблю галубцы. І калі я сабе не адрэжу рукі ці што-небудзь яшчэ, мы адкаркуем бутэльку віна, а потым, потым... Што потым? Мне спаць з маім былым целам? Не тое, вядома, каб я была ў захапленні. Не ведаю, як ты, а я не надта ўзбуджаюся ад свайго выгляду. Але з іншага боку...
Марына. Добра, добра... Няхай будзе як ты пажадаеш, мая радасць. Д’ябал, колькі часу? Мне трэба бегчы... Бывай...
Багдан. Я буду чакаць цябе, Багдане.
Марына. Бягу, бягу, бягу...

Багдан *(бярэ тэлефон).* Алё. Наташа? Добры дзень, дарагая. Як маешся? Так, так... Мой таксама на працу пайшоў. Ты не ўяўляеш... так, пагаварыла. Ды нібыта зразумеў, але ты ж іх ведаеш — кажуць адно... Кажуць, што кахаюць, што будуць ласкавымі, пяшчотнымі, што будуць клапаціцца... Абяцаў мне рамантычны вечар. Так, так, з працягам... А ты чым займаешся? У краму збіраешся? А навошта? Дублёнку хочаш купіць? Гм, я таксама хачу. Дублёнку, кажу, хачу. Муж ніколі ж не паклапоціцца — гэта я па сабе ведаю. Пайду, вядома. Што, грошы? Ёсць, я заклад выйграла. Як? Ну, ты не зразумееш. Так, сустракаемся каля крамы. Ну бывай, Наташачка. *(Кладзе слухаўку. Думае, затым бярэ нататнік і набірае іншы нумар.)* Алё... Прывітанне, гэта я... *(Там кладуць слухаўку.)* Алё, алё!.. Падлюга. *(Набірае зноў, нясмела.)* Алё, прывітанне. Не кідай слухаўкі! Не кідай... Гэта я. Я вырашыла патэлефанаваць і папрасіць прабачэння. Я не хацела ганяцца за табой з сякерай. Я была не ў сабе. Не, я нічога гэтым не мела на ўвазе. Ты пакрыўдаваў, мой саколе? Не разумею, на што тут крыўдаваць... Ах, на мужа? Так, ён дзіўны. Але ён таксама быў не ў сабе. Але цяпер усё прайшло. Так, абодвух... Ты ведаеш, я адчуваю сябе такой вінаватай перад табой. Мне хочацца загладзіць віну... Магчыма, мы сустрэнемся з табой, мой коцік? Не, не сёння... Заўтра. Так, гэта пачуццё... Я таксама хачу... Што ты зробіш са мной? Куды?!.. *(У бок.)* Божа! *(У тэлефон.)* І ў мінулы раз я засталася жывая пасля такога? Дзіўна... Добра, паспрабуем. Усё, а цяпер мне трэба бегчы. Так, я табе яшчэ патэлефаную. Я цябе таксама цалую, мой супермен. Пакуль... *(Кладзе слухаўку.)* Гм, але як гэта? Гм, цікава...
Выходзіць.

Дзея трэцяя

Наступная раніца.
Выходзіць заспаны Багдан.
Ён ізноў мужчына, але на ім жаночая начная сарочка і касметычная маска.
Ён садзіцца і аўтаматычна пачынае фарбавацца.
Багдан. Гэтая касметыка абы-якая! Ну што такое! Толькі ўчора маску накладала, а сёння скура як наждак. Гэтая маска нічога ня вартая. Трэба паспрабаваць зрабіць з маласольных агуркоў. *(Кліча.)* Багдане! Багда-а-ане! Сонейка маё, прачынайся! Ты

быў цудоўны. Я адчуваю сябе... Я адчуваю сябе... Неяк не так я сябе адчуваю. Але якая была ноч! Суцэльная рамантыка... Ах! Нарэшце я адчула сябе па-сапраўднаму жанчынай... Гэта так цудоўна — адчуваць сябе жанчынай... Адчуваць сябе такой слабай, безабароннай у дужых руках мужчыны. Што ні кажы, у гэтым ёсць свой шарм. Хочацца адчуць гэта зноў. Сёння раскажу дзяўчатам — вось яны мне пазайздросцяць. Багдане! Багдане! Коцік мой, прачынайся... Соня. І ўсё ж, што ў мяне з тварам? Нічога не разумею... Выглядаю, як пудзіла. Даражэнькі, ты спіш? Я ўчора так крычала, што голас сарвала. Прастудзілася ці што...

Выходзіць Марына ў сямейных трусах і майцы,
яна зноў жанчына, і яна адразу ідзе да стала.
Марына. Паспаць не дадуць. Слухай, жонка, сёння ж субота.
Багдан. Правільна, дарагі, субота.
Марына. Значыць, футбол. Неяк я сябе не так адчуваю. Жывот баліць, ці што? *(Глядзіць на сябе.)* Марына, ідзі-тка сюды.
Багдан.Што такое?
Марына. А ну, паглядзі.
Багдан. Што? Майка брудная?
Марына. У мяне грудзі.
Багдан. У цябе што?
Марына. У мяне грудзі. Дзве.
Багдан. Дзе?
Марына. Вось.
Багдан. Так, сапраўды. У цябе грудзі. Дзіўна. А ў мяне?
Марына. А ў цябе няма.
Багдан. Як няма? А дзе яны?
Марына. І ўвогуле, штосьці ў табе не так.
Багдан. І ў табе штосьці не так.
Марына. Што мы ўчора пілі?
Багдан. Віно.
Марына. Падазрона... Значыць, так: давай заплюшчым вочы, расплюшчым і зноў паглядзім на сябе… Пачакай, не адкрывай. На раз, два, тры!
Багдан. Гэта мая начнушка. А ногі не мае. Нейкія валасатыя. Страшныя ногі. Я — не я. *(Глядзіць уніз.)* Д'ябал, я мужчына! У мяне...
Марына. А ў мяне якраз няма.

Багдан. Гэта нешта азначае.
Марына. Гэта азначае... Гэта азначае, што я зноў жанчына. А ты — мужчына. Вось і ўсё, што гэта азнача-а-е! *(Пачынае стагнаць.)* Я зноў жанчына-а-а...
Багдан *(з радасным лямантам пачынае скакаць)*. Я мужчына! Я мужчына! Якое шчасце! Цяпер усе даведаюцца, які я мужчына! Так, я заўсёды верыў, што гэта рана ці позна пройдзе. Бо сапраўдны мужчына застаецца мужчынам у любой сітуацыі! Нават у гэтай ідыёцкай сарочцы. А галоўнае што? Галоўнае — годнасць. Не дарэмна я захоўваў яе, хаця гэта было і нялёгка... А з іншага боку...
Марына. Так, з іншага боку… *(Уздыхае.)*
Багдан. З іншага боку, як жа я цяпер без касметыкі?
Марына. А я — без галення?
Багдан. Як я цяпер буду насіць завушніцы?
Марына. Так, ізноў давядзецца мяняць усё жыццё. Перавучвацца. Прывыкаць да іншага імені. Спаць са сваім былым целам.
Багдан. І што мы цяпер будзем рабіць?
Марына. Сёння субота. Пойдзем на футбол.
Багдан. А потым я прыгатую вячэру.
Марына. Ты хацеў сказаць — я прыгатую.
Багдан. Не, мне падабаецца гатаваць. І шыць. Я звязала… звязаў швэдар для цябе. Гэта меўся быць прыемны сюрпрыз. *(Паўза.)* Ён мне павінен спадабацца...
Марына. У любым выпадку, дзякуй.
Багдан. Ты ведаеш, я думаю, усё-такі нядрэнна, што так яно выйшла. Мы шмат чаму навучыліся. Я шмат што зразумеў.
Марына. Спадзяюся.
Багдан. Асабліва гэтыя менструальныя мігрэні... Нешта жахлівае.
Марына. Ну, хоць гэта зразумеў.
Багдан. І ўсё-такі адна рэч мяне бянтэжыць.
Марына. Што?
Багдан. Я цалаваўся з мужчынамі.
Марына. Глупства. А я — з жанчынамі.
Багдан. З якімі?
Марына. З табой.
Багдан. Гэта наводзіць на роздумы.

Пачынаюць смяяцца.
Марына. Ну і хто мы пасля гэтага?..

Смяюцца.
Я зараз вярнуся...

Багдан адзін.
Званок у дзверы.
Багдан аўтаматычна адмыкае.
Там Палюбоўнік.
Палюбоўнік. Э...
Багдан. Заходзь. *(Паўза.)* Гарбаты, кавы, гарэлкі? Не?
Палюбоўнік. Марына... Марына, Божа... Да гэтага часу не веру... Як у гэта можна паверыць? Ты тэлефануеш мне і мужчынскім голасам расказваеш гэтую фантастычную гісторыю. Гэта ж фантастыка! Проста неверагодна! Як гэта — перасяленне... Так, так, так, я чытаў пра гэта. Відавочнае-неймавернае, астрал, рэінкарнацыя, марсіяне...
Багдан. Ага.
Палюбоўнік. Фантастыка... У жыцці б не паверыў. І не паверыў! Думаю, пакуль сам, на ўласныя вочы не пабачу... Гэта і праўда ты?
Багдан. Я.
Палюбоўнік. Які жах.
Багдан. А то...
Палюбоўнік. Ну і як табе?
Багдан. Нармальна.
Палюбоўнік. Ты не падумай, Марына, я буду кахаць цябе ў любым выглядзе.
Багдан. Праўда?
Палюбоўнік. Ну... так бы мовіць, платанічна.
Багдан. Малайчына.
Палюбоўнік. А можа, мы застанёмся проста сябрамі?
Багдан. Што?
Палюбоўнік. Жартую... Марына, ты мне лепей раскажы вось што: як табе ў тваім мужу... жывецца. Я ўявіць сабе не магу: ты — такое мілае, трапяткое стварэнне — у клетцы гэтай калматай, бруднай пачвары. Скажы, гэта вельмі балюча?
Багдан. Не вельмі.
Палюбоўнік. Але, напэўна, так непрыемна. Ты прабач за той

інцыдэнт. Я тады ўсё расказаў твайму мужу. Але я ж не ведаў! Я не ведаў! Адкуль я мог ведаць? Гэтая сволач скарыстала тваё цела! Адкуль я мог ведаць?
Багдан. Справядліва.
Палюбоўнік. Больш за тое, ён сам спрабаваў мяне спакусіць!
Багдан. Праўда?
Палюбоўнік. Сур'ёзна! Уяўляеш? Маньяк! Я, калі даведаўся, калі ты мне патэлефанавала і расплюшчыла вочы, я... У мяне няма словаў! Жах... Як падумаю... Я таму і прыйшоў. Я прыйшоў яму сказаць… Ведаеш што, Марына, ведаеш, што я яму скажу проста ў твар?
Багдан. Ну?
Палюбоўнік. Я скажу: сапраўды, я з табою спаў, але ты мяне падмануў, скарыстаўшы цела той, якую я кахаў, кахаю і буду кахаць. Ведай, скажу я яму...
Багдан. Ну, ну…
Палюбоўнік. Ведай, я буду кахаць тваю жонку ў любым абліччы. Так! Паколькі для мяне галоўнае — яе душа, яе ўнутраная прыгажосць, яе абаяльнасць, яе каханне! О, Марына, даруй мне, калі зможаш! Прабач, я здрадзіў табе, але здрадзіў з тваім мужам! Ці зможаш ты дараваць мне пасля таго?! О Марына! *(Падбягае да Багдана і спрабуе яго абняць.)*
Багдан. *(Не падпускае яго.)* Пачакай.

Уваходзіць Марына.
Марына. Сонца маё, у нас што, госці?
Багдан. Ага.
Палюбоўнік. Што гэта значыць? *(Паўза.)*
Багдан. Сядайце, малады чалавек, зараз будзем размаўляць.
Палюбоўнік. Ды я...
Багдан. Сядай, сядай, мой коцік, пагуляем у адгадайку...

Нямая сцэна. Зацямненне.

Фінал

(Выходзіць Выканаўца жаданняў, а за ім выбягаюць Багдан і Марына.
Марына. Стойце...
Багдан. Гэй... Пачакай ты...

Выканаўца жаданняў. Ды адчапіцеся ад мяне!
Багдан. Ну паглядзі на мяне. Пазнаеш? Ну паглядзі!
Выканаўца жаданняў. Ды я вас бачу першы раз.
Марына. А мяне?
Выканаўца жаданняў. І вас. Такі мілы твар я б ніколі не забыў... *(Спрабуе пайсці.)*
Багдан. Але ж ты да нас заходзіў, тры месяцы таму. Тваё імя Зміцер. Ты — коміваяжор. З фірмы з гэтай ідыёцкай, “Вішыз Гм-лізэйшн”. Ну, ці нешта накшталт таго... Ты нам патэльні прапаноўваў...
Марына. Пыласос.
Багдан. Так. Пыласос. Памятаеш? З рухавіком ад самалёта... А потым жаданне нашае выканаў. Ну, паслуга такая ў гэтай фірмы. Нас камп’ютэр выбраў. Па вачах бачу — памятаеш.
Выканаўца жаданняў. *(Б’е сябе па лобе.)* А-а-а!
Багдан. Ну...
Марына. Ён успомніў!
Выканаўца жаданняў. Скажыце праўду, вы з псіхушкі? Так?
Багдан. Ты не памятаеш?
Выканаўца жаданняў. Я прыехаў у горад месяц таму, я доктар, маё імя Аляксандар, і я вас ніколі ў сваім жыцці не бачыў.
Багдан. Я разумею, ты баішся нам адкрыцца. Ты думаеш, мы на цябе раззлаваліся пасля таго. Ну, сам разумееш...
Марына. Сапраўды, нам шмат чаго давялося вынесці...
Багдан. Напрыклад, абцасы. Я падаў разоў трыста. А потым — станікі, панчохі, пазногці.
Марына. А мне — галенне, валасы пад пахамі і “маланку” на прарэсе...
Багдан. Але мы на цябе зусім не злуём. Гэта ж дробязі. На што тут злавацца?
Марына. Адкрыйцеся нам...
Выканаўца жаданняў. Мне сапраўды час ісці. Вы, вядома, прыемныя людзі, але, дзякуй Богу, у мяне якраз важная справа... *(Ізноў спрабуе пайсці.)*
Багдан. *(Кідаецца яму ў ногі і крычыць.)* А-а-а... Вярні ўсё назад! Калі ласка! Калі ласка! Я ўсё дарую. Я заплачу. Мы заплацім. Вярні ўсё назад.
Выканаўца жаданняў. Што вы робіце? *(Уцякае.)* Псіхі!
Марына. Стой...
Багдан. Ну, пачакай. Як там цябе... Эй! Чакай! Мы купім твае

патэльні...

P. S.

Прайшоў нейкі час.
Выходзяць Марына і Багдан.
Марына. Што ў цябе?
Багдан. Усё нармальна... Не, сапраўды... Вось толькі адно мяне непакоіць.
Марына. Што?
Багдан. Не, ты не палохайся, нічога страшнага... Мне сёння было дрэнна.
Марына. І што?
Багдан *(паўза)*. І вельмі хочацца салёненькага…

Нямая сцэна.
Парад Але
Пераклала з расейскай Таццяна Команава

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/01/20
[image]